# КАТЭХІЗІС

**гэта значыць**

**старадаўняя хрысьціянская навука, сабраная ў пытаньнях і адказах са Сьвятога Пісаньня для простых людзей мовы беларускай**


КАТИХИЗІСЪ.

ТО ЕСТЪ,

НАУКА СТАРОДАВНАЯ ХРІСТІАНЬ
СКАЯ Ѡ СВЕТОГО ПИСМА, ДЛЯ ПРО
СТЫХЪ ЛЮДЕЙ ЯЗЫКА РУ-
СКОГО, ВЪ ПЫТАНІЯХЪ И Ѡ-
КАЗЕХЪ ЗЕБРАНА.

Ѡ ПЕРЪВАГО СВЕТОГО АПОСТОЛА
ПЕТРА ПОСЛАНІА ЗАЧАЛО

Готови присно къ ѿвѣту всакому въпрошающему вы,
слово ѿ вашемъ уповании съкротостію и страхо,
совѣсть имаще благу и прочая.

# КАТЭХІЗІС

Помнік беларускай Рэфармацыі
XVI стагодзьдзя

*2-е выданьне*

Мінск
Юніпак
2005

УДК 282
ББК 86.375
К29

Рэдакцыйная калегія:
Н. Кабелка (навуковы рэдактар)
С. Акіньчыц (адказны за выданьне)
Ю. Бачышча
А. Кандратовіч
К. Унучак
Д. Шэіна

Усе цытаты зь Бібліі пададзены ў перакладзе Ул. Чарняўскага

К29 **Катэхізіс**: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. / Адаптаваны тэкст, пер. з старажыт. бел. мовы Н.Кабелка; Рэд. кал.: Н.Кабелка (навуковы рэд.) [і інш.]. – 2-е выд.– Мн.: Юніпак, 2005. с. 312.

ISBN 985-6745-54-3

Нясьвіскі "Катэхізіс" 1562 г. – выдатны помнік беларускай Рэфармацыі XVI стагодзьдзя. Гэтае выданьне ўтрымлівае адаптаваны тэкст "Катэхізіса" і яго пераклад на сучасную беларускую мову.

Адрасуецца навукоўцам, аспірантам, студэнтам, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй і культурай.

УДК 282
ББК 86.375

ISBN 985-6745-54-3

© Н. Кабелка. Пераклад, 2005
© С. Акіньчыц. Укладанне, 2005
© Афармленне. «Юніпак», 2005

# КАТИХИЅІСЪ.

## ТО ЕСТЪ,

НАУКА СТАРОДАВНАЯ ХРІСТІАНСКАЯ Ѿ СВЕТОГО ПИСМА, ДЛЯ ПРОСТЫХЪ ЛЮДЕЙ ЯЗЫКА РУСКОГО, ВЪ ПЫТАНІЯХЪ И ѾКАЗѢХЪ СЪБРАНА.

Ѿ ПЕРЪВАГО СВЕТОГО АПОСТОЛА
ПЕТРА ПОСЛАНІА ЗАЧАЛО ѮЗ.

Готови присно къ ѿвѣту всякому въпрошающему вы,
слово ѿ вашемъ уповании съ кротостію и страхо,
совѣсть имаще благу и прочая.

# ДА ЧЫТАЧА

Вы трымаеце ў руках
чацьвёртае выданьне кнігі "Катихисісъ,
то естъ наука стародавная хрістіаньская
от Светого Писма для простыхъ людей
языка руского въ пытаніахъ и отказехъ събрана".
Першы раз яна пабачыла сьвет
у Нясьвіжы ў 1562 г.
"Катэхізіс" у XVI ст. быў шырока вядомы
ў Вялікім Княстве Літоўскім, у Польшчы,
у Маскоўскай Русі, нават у Швэцыі.
Вядома, што ў 1628 г. "Катэхізіс"
быў перавыдадзены ў Стакгольме.
Аднак сёньня "Катэхізіс" С. Буднага зьяўляецца
бібліяграфічнай рэдкасьцю,
зь якой маюць магчымасьць азнаёміцца
толькі нешматлікія дасьледчыкі.
Таму ў 2002 г. ў межах праграмы
па сьвяткаваньні 450-годзьдзя Рэфармацыі
ў Беларусі распачалася праца па адаптацыі
тэксту "Катэхізіса" і перакладу яго
на сучасную беларускую мову,
каб ня толькі людзі вучоныя, але і паспалітыя
маглі пазнаёміцца зь ідэямі і вучэньнем
беларускіх рэфарматараў XVI ст.
Трэцяе ў гісторыі выданьне "Катэхізіса"
пабачыла сьвет у выдавецтве «Юніпак»
у чэрвені 2005 г.
Цяперашняе перавыданьне робіцца
па шматлікіх прозьбах чытачоў.
Мы з радасьцю прадстаўляем
шаноўнаму чытачу
плён працы многіх людзей,
"каб прагнучыя мелі разуменьне
ўсіх Словаў Божых і Ягонай праўды,
каб гэтаму і самі вучыліся,
і дзяцей сваіх навучылі".

# ПАДЗЯКА

Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі за мікрафільм "Катэхізіса" 1562 г.

Усім, хто сваёй руплівай працай спрычыніўся да падрыхтоўкі гэтага выданьня, асабліва:

Вадзіму Васілеўскаму,
Аглаі Вількоцкай,
Кірылу Кацалапу,
Алегу Ліцкевічу,
Марыі Савушкінай,
Сяргею Турбінскаму,
Андрусю Унучаку,

а таксама:
Царкве Ян Прадвесьнік (Менск),
Царкве Ісуса Хрыста (Менск),
Эвангелічнай Рэфармацкай Царкве (Менск),
МГА ЗБС "Бацькаўшчына"

## Сымон Будны і “Катэхізіс” 1562 г.

У другой палове XVI стагодзьдзя Беларусь была ахоплена шырокім грамадзка-рэлігійным рухам – Рэфармацыяй. Ад сярэдзіны гэтага стагодзьдзя значныя колы тагачаснага беларускага грамадзтва сталі часткай агульнаэўрапейскай плыні рэфармаваньня царквы. У Вялікім Княстве Літоўскім рэфармацыйны рух падтрымала большасьць беларускіх і літоўскіх магнатаў і шляхты. Да іх далучылася таксама мяшчанства. Рэфармацыю прынялі як каталікі, так і праваслаўныя. Гэта была ня толькі грамадзянская і культурна-сьветапоглядная пазіцыя, але і намаганьне захаваць самастойнасьць і сувэрэнітэт Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага падчас Лівонскай вайны з Маскоўскай дзяржавай, і пэўнае адасабленьне ад кіруючых каталіцкіх колаў Польшчы. Менавіта беларуска-літоўскія магнаты, большасьць зь якіх складалі пратэстанты, выступалі ў 1569 годзе супраць падпісаньня Люблінскай уніі на ўмовах польскага боку, баронячы незалежнасьць сваёй дзяржавы.

Адным з галоўных кіраўнікоў рэфармацыйнага руху ў Беларусі быў выдатны грамадзкі дзеяч Мікалай Радзівіл Чорны, віленскі ваявода і канцлер Вялікага Княства. Дзякуючы яго намаганьням у 1550-я гады былі рэфармаваны цэрквы ў Нясьвіжы, Клецку, Койданаве, Ляхавічах, Навагрудку, Берасьці, пазьней у Менску, Полацку, Віцебску, Оршы, Смаргоні, Глыбокім, іншых гарадах і мястэчках. Пры пратэстанцкіх абшчынах адчыняліся школы, друкарні, шпіталі. Рыхтаваліся ў Беларусі і Літве свае прапаведнікі, запрашаліся і з Польшчы.

Адным з дзеячаў Рэфармацыі, асьветнікам і філосафам быў Сымон Будны (каля 1530 – 1593), які з 1558 г. выкладаў на беларускай мове катэхізіс у пратэстанцкай школе ў Вільні, сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. У 1560 годзе ён быў запрошаны ў Клецк (адзін з цэнтраў радзівілаўскіх маёнткаў у Беларусі), дзе заняў пасаду прапаведніка. Сымон Будны разам з Лаўрэнціям Крышкоўскім і Мацьвеем Кавячынскім заснавалі Нясьвіскую друкарню, дзе 10 чэрвеня 1562 г. быў выдадзены на беларускай мове “Катэхізіс”, а ў наступным годзе Сымон Будны выдаў твор “Аб апраўданьні грэшнага чалавека перад Богам”.

“Катэхізіс” Сымона Буднага меў пашыраную назву “Катихисіс, то ест наука стародавная хрістіанская от Светого Писма, для простых людей языка руского, в пытаніах и отказех собрана». Ён быў падрыхтаваны як дапаможнік для агульнага рэлігійнага навучаньня вернікаў, для выкладаньня асноваў хрысьціянскага веравучэньня ў выглядзе пытаньняў і адказаў. Пры распаўсюджаньні Рэфармацыі Марцін Лютэр у 1529 г. надрукаваў свой “Малы катэхізіс”. Калі пачалася Контррэфармацыя, то і папская курыя выдала ў Рыме ў 1566 г. “Рымскі катэхізіс”, у якім была выкладзена каталіцкая дактрына.

“Катэхізіс” Сымона Буднага меў вялікі ўплыў на шырокія колы тагачаснага беларускага грамадзтва – магнатаў, шляхту, мяшчан. Сам аўтар тлумачыў, што ён выдаў сваю кнігу, каб перашкодзіць распаўсюджанью “хлусьлівых” вучэньняў – “злых рэчаў, якія перамаглі ў Царкве”. Ён, як асьветнік, сваю мэту бачыў у тым, каб данесьці сэнс Слова Божага да ўсіх жадаючых.

Трэба таксама адзначыць, што ў XVI і XVII стагодзьдзях , як і раней, “рускай” называлася беларуская мова. Тагачасная мова Маскоўскай дзяржавы называлася на Беларусі “маскоўскаю”.

Перавыданьне “Катэхізіса” Сымона Буднага зьяўляецца значнай зьявай у справе вяртаньня беларусам аднаго з твораў нашай гістарычнай, культурнай і рэлігійнай спадчыны.

*Анатоль Грыцкевіч,*
доктар гістарычных навук, прафесар

# Хрысьціянскае вучэньне ў пытаньнях і адказах

“Катэхізіс, гэта значыць старадаўняя хрысьціянская навука, сабраная ў пытаньнях і адказах са Сьвятога Пісаньня для простых людзей беларускай мовы” зьяўляецца, побач зь Бібліяй, выдадзенай Францішкам Скарынай, і Статутамі Вялікага Княства Літоўскага, выдатнейшым помнікам беларускай культуры, сьведчаньнем беларускага Адраджэньня XVI стагодзьдзя, Залатога Веку нашай краіны. Але ня толькі як помнік культуры мае каштоўнасьць гэтая кніга. “Катэхізіс”, выдадзены ў 1562 г. у Нясьвіжы Сымонам Будным, Лаўрэнціем Крышкоўскім і Мацьвеем Кавячынскім, зьяўляецца сьведчаньнем веры нашых продкаў, веры, якая абапіралася на Слова Божае – Біблію.

“Катэхізіс” складаецца з чатырох частак: “Дзесяць прыказаньняў”, “Вызнаньне веры”, “Малітва” і “Таямніцы Хрыстовыя”. У першай частцы распавядаецца пра Дзесяць прыказаньняў, дзеля чаго яны дадзеныя і ў чым заключаецца выкананьне гэтых прыказаньняў, гаворачы словамі Сымона Буднага, “каб кожны ведаў, што ёсьць грэх, а што – добрая справа, і як маем да Бога ставіцца і як бліжняга любіць патрэбна”.

Другая частка паказвае, як мае хрысьціянін у Бога верыць і веру вызнаваць. У гэтай частцы падрабязна разглядаецца апостальскае вызнаньне веры, якое вызнаюць усе хрысьціяне і якое дазваляе адкінуць розныя нехрысьціянскія вучэньні.

Трэцяя частка распавядае пра малітву, пра тое, як і пра што хрысьціяніну належыць маліцца. Таксама падрабязна разглядаецца малітва “Ойча наш”.

У апошняй частцы “Катэхізіса” разглядаюцца таямніцы Хрыстовыя – сьвяты хрост і Вячэра Госпадава.

Словы хрысьціянскага вучэньня, якія гучалі на беларускай зямлі чатыры з паловаю стагодзьдзі таму, не згубілі сваёй актуальнасьці і ў XXI стагодзьдзі. Эвангельская Царква ў Беларусі прапаведуе ня нешта новае, але старадаўнюю хрысьціянскую навуку, якая моцна ўгрунтавана на Сьвятым Пісаньні. “Катэхізіс”,

выдадзены ў 1562 годзе, і цяпер мае практычнае значэньне, хоць некаторыя асьпекты веравучэньня, асабліва тыя, што разглядаюцца ў чацьвёртай частцы, беларускія эвангельскія хрысьціяне сёньня разумеюць крыху інакш, чым іх папярэднікі ў XVI стагодзьдзі. Кожны служыцель з радасьцю дасьць гэтую кнігу сваім родным, суседзям, знаёмым, каб яны змаглі "Слова Божае, абедзьвюма рукамі прыняўшы, трымаць і згодна зь Ім жыць".

*Сяргей Хоміч,*
Епіскап Саюза Хрысьціян Веры Эвангельскай
у Рэспубліцы Беларусь

# КАТИХИСІСЪ.

ТО ЕСТЪ,

НАУКА СТАРОДАВНАЯ ХРІСТІАН-
СКАЯ Ѿ СВЕТОГО ПИСМА, ДЛЯ ПРО-
СТЫХЪ ЛЮДЕЙ ЯЗЫКА РУ-
СКОГО, ВЪ ПЫТАНІЯХЪ И Ѿ-
КАЗѢХЪ СЪБРАНА.

Ѿ ПЕРЪВАГО СВЕТОГО АПОСТОЛА
Петра посланіа Зачало ѯ҃.

Готови присно къ ѿвѣту всякому въпрошающему вы,
слово ѡ вашемъ упованіи съ кротостію и страхомъ,
совѣсть имуще благу и прочая.

## КАТИХИСІСЪ,

**то естъ наука стародавная хрістіаньская**
**от Светого Писма,**
**для простыхъ людей языка Руского**
**въ пытаніахъ и отказехъ събрана**

От Перъваго Светого Апостола Петра
посланіа зачало 60:
«Готови присно къ ответу
всякому въпрошаюшчему вы,
слово о вашемъ упованіи
съ кротостію и страхом,
совесть имяшче благу»
и прочая.

# КАТЭХІЗІС,

## гэта значыць старадаўняя хрысьціянская навука, сабраная ў пытаньнях і адказах са Сьвятога Пісаньня для простых людзей мовы беларускай

Зь Першага лісту
Сьвятога Апостала Пятра:
«Будзьце заўсёды гатовыя
да абароны адносна кожнага,
хто патрабуе ад вас адказу
аб прабываючай у вас надзеі,
у спагаднасьці і страху Божым...»
ды так далей.

*Освецоных княжатъ и пановъ Их Милости пановъ Миколаевъ Радивиловъ, Княжати на Олыце и Несвижу, Воеводы Виленьского, навышшего Маршалька и канцлера Великого Князьтва Литовъского и далей, а Княжати на Дубинках и Бержахъ, Воеводы Троцкого, Великого Гетьмана Великого Князьтва Литовъского и далей, сыномъ перьворожонымъ Ихъ Милостямъ, Княжатомъ молодымъ, паномъ Миколаемъ Миколаевичом Радивиломъ*

*от Бога Отца черезъ Христа, Единого Сына Его, въ Духу Святомъ, утешителю, ласки, покою и вечного благословенья верьного Христового збору братья а слуги Ихъ Княжацъких Милости, верьне жедають.*

Бог всемогучий, освецоныя а милостивыя Княжата, потому ся всегды напротив грешному человеку заховал, ижь хотя жь самъ от Него отходилъ, предся его дивным обычаемъ от блуда и греховъ вырывалъ. Тако ся напервей ко онымъ першим родителемъ нашимъ показалъ. Сихъ бо, – по оном ихъ тяжкомъ упадку а по утраченью оного образа и подобеньства Божіего, на который были створени въ оной первой невинности, святости, справедливости и оу правде, – зъ особливого милосердья Своего, въ гневе Своим не рачилъ зоставити, але, ужалившися надъ их упадком, рачил имъ, заразом и всему потомству их, предивный ратунокъ урадить а таковое племя обецать, черезъ которое мела быть стерта голова проклятому противнику сатане, и оный упадак знову мелъ быть направлен, и оная первая невинность и справедливость привернена, которое то обетници, о сосланю того светого насенья, ухватившися верою, первые родители наши оною ся ажь до смерти тешили и оною жь приверъненого благославеного живота доступили.

Так же сыновъ и потомства их, колько кроть, коли хвала Панская нарушена бывала, николи припоминат не рачилъ. А потому жь, по оном грозном всее плоти через потоп зглаженю Ноя, а потом Авраама, Исаака, Якова, Патриарховъ святыхъ и всих дванадцати поколени Израильских, которые вывелъ з Египту, Тот же от вековъ милосердный Богъ занехати не рачилъ, але имъ опят оную Свою обетницу о насенью благославеном якобы знову отновилъ, в котором мели быти благославены вси народы людьские. А тое насенье, водлугъ выкладу Апостольского, называется Христос.

*Яснавяльможных Князёў ды паноў Іх Міласьцяў паноў Мікалаяў Радзівілаў: Князя на Алыцы і Нясьвіжы, Ваяводы Віленскага, найвышэйшага Маршалка і канцлера Вялікага Княства Літоўскага і іншае; і Князя на Дубінках і Біржах, Ваяводы Троцкага, Вялікага Гетмана Вялікага Княства Літоўскага і іншае, — сынам першародным Іх Міласьцям Князям маладым панам Мікалаям Мікалаевічам Радзівілам —*

*ад Бога Айца праз Хрыста, Адзінароднага Сына Яго, у Духу Сьвятым Пацяшыцелю, ласкі, супакою і вечнага дабраславенства верна жадаюць браты праўдзівага Хрыстовага збору і слугі Вашых княжацкіх Міласьцяў.*

Бог усемагутны, яснавяльможныя і міласьцівыя Князі, у тым заўсёды аб'яўляў Сябе грэшнаму чалавеку, што, хаця чалавек сам ад Яго адыходзіў, Бог усё адно ў цудоўны спосаб ратаваў чалавека ад памылак і грахоў. Такім Ён паказаў Сябе ад пачатку нашым прабацькам. На тых бо, – пасьля іхняга цяжкага граху ды страты вобразу і падабенства Божага, на якое яны былі створаны ў той першароднай цнатлівасьці, сьвятасьці, справядлівасьці і праўдзе, – з асаблівага Свайго міласэрдзя Бог не застаўся ў гневе. Ён зьлітаваўся над іхнім адпадзеньнем, даў ім і ўсяму іхняму патомству цудоўны ратунак і такое насеньне абяцаў, Якое скрышыць галаву праклятаму ворагу д'яблу, наверне іхняе адпадзеньне ды адновіць іх у першароднай цнатлівасьці і справядлівасьці. Прабацькі нашыя, схапіўшы вераю гэтае абяцаньне аб прыйсьці сьвятога насеньня, цешыліся ім аж да сьмерці ды ім жа дабраславёнага жыцьця даступіліся.

Таксама сынам і патомству іхняму, колькі б разоў яны не адступаліся ад хвалы Божай, Бог ніколі потым ня помсьціў. Ды гэтаксама, грозна зьнішчыўшы патопам кожнае цела, Той жа спрадвек міласэрны Бог не пакінуў Ноя, а потым – Абрагама, Ізаака, Якуба, сьвятых патрыярхаў і ўсіх дванаццаць кален Ізраэльскіх, якіх вывеў з Эгіпту ды зноў аднавіў ім тое Сваё абяцаньне пра дабраславёнае насеньне, у якім мелі дабраславіцца ўсе народы. А насеньне тое, паводле навукі Апостальскай, ёсьць Хрыстос.

А такъ явне ся и з Старого и з Нового Закону оказуеть, ижь Панъ Богъ всякого человека упалого опушчати не рачил, а опять ни через жадного иншого збавити не хочеть – одно через Христа Пана, оное вечное а благославеное семя, спочатку в раю обецаное, а водлугъ выполненя часовъ, с пречистое девицы нароженое.

Так жеть и теперь, освецоные а миластивые Княжата, намъ, остатнему потомству отцовъ нашихъ, и пред остатнымъ днемъ, содравши слепоту от сердц и очъю нашихъ, черезъ Духа Святого и светлость Евангелия Сына Своего, Отецъ оный всего милосердья учинити рачилъ, же намъ оную выпольненую вечную обетницу Христа Пана, которую намъ былъ сатанъ въ пропасти Римского и Греческого Вавилона затмил, Слово Его святое нарушилъ и тайны посквернилъ, знову праве объяснити, а яко пальцомъ оказати. А нас, с тое Содомы антихристовой выръвавши, опять знову ку истинъному Збавителю притегнути рачилъ, Которого тутъ, въ тыхъ малыхъ новое кузни книгахъ, онымъ славнымъ, здавна далеко росъширенымъ словеньским языкомъ суть накоротце пописаны права.

А Вашимъ Кнежацкимъ Милостям, яко тыхъ двухъ въ той Речи Посполитой славныхъ одного коренья филяровъ, сыномъ не иншимъ жаднымъ умысломъ, одно яко и оного часу (абы нихто иначей не судил) и святый Лука евангелистъ побожьному а зацному Феофилу двое книгъ своихъ приписалъ для много слушныхъ причинъ, – поданы и приписаны, а звлашча для, зараз з млодости в сердцах их зачатья и занятья милости ку Слову Божiему. К тому тежь и для того, абы ся Ваши Княжацкие Милости не только в чужоземскихъ языцехъ кохали, але бы ся тежь Ваши Княжацкие Милости и того здавна славного языка словенъского розмиловати и онымъ ся бавити рачили. Слушная бо речь естъ, абы Ваши Княжацкие Милости того народу язык миловати рачили, въ которомъ давъные предъки и Ихъ Княжацъские Милости панове отци Вашихъ Княжецскихъ Милости славне преднейшие преложеньства несуть.

А такъ Онъ, Который Самъ всего початкомъ и единымъ от вековъ збавенья поводомъ ест, Панъ Богъ всемогучый, и Ваши княжацские Милости ешче в молоденстве и знайти рачилъ. Рачте ж прото Его доброти святое въдячными быти а такого гостя з отвороными сердцы приняти, яко бы есте были с такого навеженья вдячьными сыны узнаны. Ботсе Вашим Княжацкимъ Милостям, яко се вышей доложило, тотъ перворοдный в томъ языку плодъ (овоцъ) только для самога того офяровалъ, абысте Ваши Княжецские Милости зацного стану Княжата а передънейшых вожов сынове, всимъ иншим съ себе добрый взор а приклад давать рачили, ижь бы ся много иншихъ прикладами Вашихъ Княжацкихъ Милости будовати могли а тая Отчизна и Речъ Посполитая зъ Ваших Княжацких Милости благославеное надеи ожидать могла.

Яко есте тогды Ваши Княжацъские Милости с одного коренья леторосли, рачте жь ся зачать и въ томъ одномъ правдивомъ верномъ

Таксама і са Старога, і з Новага Закону ясна бачна, што Госпад Бог не пакідае аніводнага грэшнага чалавека і, зноў жа, аніяк па-іншаму збавіць ня хоча, адно толькі як праз Хрыста Госпада, — тое вечнае і дабраслаўлёнае насеньне, спачатку ў раі абяцанае, а як прыйшла поўня часу, з прачыстае дзевы народжанае.

Таксама і зараз, яснавяльможныя ды міласьцівыя Князі, нам, апошняму патомству нашых айцоў, перад апошнім днём гэты Айцец усякай міласэрнасьці, зьнішчыўшы сьлепату нашых сэрцаў і вачэй праз Духа Сьвятога і сьвятло Эвангельля Свайго Сына, зноў тлумачыць і нібы паказвае тое споўненае абяцаньне, — Хрыста Госпада, — Якога нам д'ябал у бездані рымскага ды грэцкага Бабілёну зацьміў, Слова Ягонае сьвятое схаваў і таямніцы спаганіў. Вырваўшы з тае Садомы антыхрыставай, Бог зноў вядзе нас да праўдзівага Збавіцеля, Чые законы сьцісла выкладзены тут, у гэтай малой новадрукаванай кнізе на слыннай і здаўна далёка пашыранай славянскай мове.

А Вашым Княжацкім Міласьцям — сынам тых двух у нашай Рэчы Паспалітай нашчадкаў аднаго кораня – прысьвячаем гэтую кніжку дзеля многіх слушных прычынаў з тым жа самым намерам (каб ніхто не судзіў інакш), што і некалі сьвяты эвангеліст Лука прысьвяціў дзьве свае кнігі пабожнаму ды высакароднаму Тэафілу, а найбольш дзеля таго, каб у вас з маладосьці любоў да Слова Божага ўзьнялася і расла. Таксама і дзеля таго, каб Вашыя Княжацкія Міласьці ня толькі чужаземнымі мовамі захапляліся, але і каб тую здаўна славутую мову славянскую палюбілі ды ёю захапляцца пачалі. Слушная бо справа, каб Вашыя Княжацкія Міласьці любілі мову таго народу, на чале якога здаўна славута стаяць даўнія продкі і Іх Княжацкія Міласьці айцы Вашых Княжацкіх Міласьцяў.

Ды так Госпад Бог усемагутны, Які Сам спрадвек ёсьць пачаткам і адзінай прычынай збаўленьня, знайшоў Вашых Княжацкіх Міласьцей яшчэ ў маладосьці. Будзьце ж удзячнымі за Яго сьвятую міласьць ды прыйміце Такога госьця з адкрытым сэрцам, каб вы па такім наведваньні былі прызнаныя за ўдзячных сыноў. Бо Вашым Княжацкім Міласьцям (як ужо ўзгадана вышэй) першы на гэтай мове плён я толькі дзеля таго ахвяраваў, каб Вашыя Княжацкія Міласьці — высакароднага стану князі і першых у дзяржаве правадыроў сыны — давалі ўсім іншым добры ўзор і прыклад, каб шмат яшчэ хто насьледаваў прыклад Вашых Княжацкіх Міласьцяў ды каб Бацькаўшчына і Рэч Паспалітая маглі чакаць ад Вашых Княжацкіх Міласьцяў дабраслаўлёнай надзеі.

Як раней Вашыя Княжацкія Міласьці паходзілі з аднаго кораня, так і зараз у тым праўдзівым і верным адзінстве дужэйце ды ўзрастайце, каб Вашыя Княжацкія Міласьці заставаліся ў адзінстве ня толькі паводле абавязку сваяцтва, але і былі ў адзінстве вызнаньня рыцарамі і братамі адзінага гетмана Ісуса Хрыста ды сынамі адзінага найвышэйшага Бога! У гэтым Вашых Княжацкіх Міласьцяў няхай памножыць і дабраславіць Бог Айцец праз Хрыста, Адзінароднага Сына Свайго, у

сполъку множить и рость, абы есте Ваши Княжецъские Милости были не только с повинности одное крови, але и зъ единости одного гасла, единого Гетмана Христа рыцерями и братьею а сынми единого навышшего Бога! В чомъ Ваши Княжецские Милости рачъ помножить и ублагославить Богъ Отецъ через Христа, единого Сына Своего, въ Духу Святомъ, утешителю нашимъ. Того мы Вашымъ Княжацъскимъ Милостямъ от Него жь Самого сердечне жичимо.

А то, што ся на тотъ часъ, хотя не с таковое годъности, яковое бы святые таблицы Божие достойны были, але зъ якого жь колвекъ даного таланъту веръне от веръного Христового збору братьи, а слугъ Вашихъ Княжацких Милости, на том новомъ початку накоротъце выдать могло, просимо: «Рачъте, Ваши Княжацские Милости, дотуль з ласкою завдячне пріимовати, покуль Панъ Богъ до чого большого допомочи будеть рачил!»

Данъ з города Несвижьского, от въплошченья Христова в року тисячномъ пятьсотномъ шесдесятомъ и второмъ, месяца іюня, дванадцатого дня.

Вашихъ Княжацских Милости повольные слуги:

Матфей КАВЕЧИНЬСКІЙ,
Симонъ БУДНЫЙ,
Лаврентей КРИШКОВСКІЙ.

Духу Сьвятым, нашым Пацяшыцелю. Гэтага мы ад Яго Самога сардэчна зычым Вашым Княжацкім Міласьцям.

А тое, што на гэты час (хаця і не з такой годнасьцю, якой былі б вартыя сьвятыя Божыя табліцы) зь якога ж кольвек дадзенага нам таленту было праўдзіва надрукавана братамі праўдзівага Хрыстовага збору і служкамі Вашых Княжацкіх Міласьцяў, — просім: «Прыйміце, Вашыя Княжацкія Міласьці, ласкава і ўдзячна, пакуль Госпад Бог дапаможа што большае ўчыніць!»

Дадзена з гораду Нясьвіскага ад Нараджэньня Хрыстова ў годзе тысяча пяцьсот шэсьцьдзесят другім, месяца чэрвеня дванаццатага дня.

Вашых Княжацкіх Міласьцяў дабравольныя слугі:

Мацьвей КАВЯЧЫНСКІ,
Сымон БУДНЫ,
Лаўрэнці КРЫШКОЎСКІ.

# КЪ ВСЕМЪ БЛАГОВЕРНЫМЪ ХРИСТИАНОМЪ ЯЗЫКА РУСКОГО ПРЕДЪСЛОВІЕ ВЪ КАТИХИСІЮ

Катихисісъ – слово естъ греческого языка, сказует же ся на словенскую речь – Оглашеніе или гласомъ ученіе.

Ведомо бо меть быти, ижь Апостоли и ихъ оученници не тако скоро и не такъ латве, от Еллинъ или от Жидовъ к вере Христовой приступуюшчих, тайнами святыми служили.

И окрестил убо Петръ и иншіи Апостоли на день съшествіа Святого Духа от людей Ізраилевыхъ три тисечи, але умилившихся сердцем и любезно приемшихъ Слово (Деан. 2:14-47). Окрестилъ Филиппъ, иже от седми діаконъ царици Муринское каженика или скопца, але аже изъ Муринъское земли въ Еросолимъ поклонитися пріехавъшаго (Деан. 8: 26-40), а наболей черезъ анъгела показаного, от себе научоного и ешче веру о Христе, ижь Сынъ Божий естъ, исповедавъшаго.

Окрестилъ Петръ ешче Корънилиа, але оного, которого молитвы и милостини възыдоша пред Богомъ (Деан. 10:1-48). Оного, о котором гласъ Божій въ виденіи по три кратъ рече: «Яже Богъ очистилъ естъ, ты не скверъни», оного, на которого Духъ Святый видимымъ образомъ ешче научаюшчу Петру напалъ.

Окрестилъ Апостолъ Сила сторожа темъничъного въ Филипъпусехъ (Деан. 16: 16-40), але ажь перъвей къ Апостоломъ каючися поведелъ: «Господие, што ми подобаеть творити, да спасуся?!» Але аже перъвей Павелъ и Сила глаголаста ему Слово Господне; ешче аже перъвей понялъ их въ дом свой и омылъ их раны. Инъшие места опушчаю. Досытъ бо явъно, ижь Апостоли никого от поганъ и от жидовъ не крестили, аже перъвей оного наоучили и въ вере искусили.

Потомъ пакъ и труднейшее искушеніе было настало на хотяшчихъ креститися. Находимъ бо въ посланіах учительских и въ некоторихъ правилехъ, ижь которіи ся крестити хотели, перъвей черезъ немалый часъ повинъни были опричь въ церъкви стояти, на колена припадати, чтеніе Еванъгельское услышавъши, а наболей, коли уже мелася Вечера Господня зачинати, вънъ изъ церъкви выходити, певъный часъ

# УСІМ ДАБРАВЕРНЫМ ХРЫСЬЦІЯНАМ МОВЫ БЕЛАРУСКАЙ ПРАДМОВА ДА КАТЭХІЗІСУ

Катэхізіс – слова з грэцкай мовы, перакладаецца ж на мову славянскую – Абвяшчэньне, ці Навучаньне ўголас. Ведама бо мае быць, што Апосталы ды іхнія вучні ня так скора і ня так проста дапускалі да сьвятых Таямніцаў тых, што з грэкаў ці зь юдэяў прыходзілі да веры ў Хрыста.

Ахрысьціў Пётр ды іншыя Апосталы ў дзень спасланьня Духа Сьвятога з народу Ізраэльскага тры тысячы, але толькі замілаваўшыхся сэрцам і зь любасьцю прыняўшых Слова (Дзеі 2:14-47). Ахрысьціў Піліп – адзін зь сямі дыяканаў – эўнуха, або скапца валадаркі Мурынскае (Дзеі 8). Але той эўнух з Мурынскае зямлі прыехаў пакланіцца ў Ерузалім, быў Піліпу праз анёла паказаны, Піліпам навучаны ды вызнаў веру ў Хрыста, што Той ёсьць Божым Сынам.

Ахрысьціў Пётр яшчэ Карнэля, але таго, чые малітвы і міласьціны ўзыйшлі перад Богам, пра якога Пятру голас Божы ў бачаньні тройчы прамовіў: «Каго Бог ачысьціў, таго не лічы нячыстым» (Дзеі 10: 1-20), на якога Дух Сьвяты зыйшоў відочным чынам яшчэ падчас навучаньня Пятра.

Ахрысьціў Апостал Сіла вартаўніка вязьніцы ў Філіпах, але перш той, каючыся, запытаўся ў Апосталаў: «Гаспадары, што мне трэба рабіць, каб збавіцца?!» (Дзеі 16:16-34) Але раней Паўла і Сіла казалі яму Слова Божае; а потым ён прыняў іх у доме сваім і абмыў іхнія раны. Іншыя падобныя прыклады ня ўзгадваю. Досыць бо яўна, што Апосталы нікога з паганаў ці зь юдэяў не хрысьцілі, перш не навучыўшы і ў веры ня выспрабаваўшы.

Потым насталі яшчэ больш цяжкія выпрабаваньні для тых, хто хацеў ахрысьціцца. Знаходзім бо ў лістах вучыцеляў і ў некаторых правілах: тыя, што хацелі хрысьціцца, перш павінны былі немалы час асобна ад іншых у царкве стаяць; на калені прыпадалі, пачуўшы чытаньне Эвангельля; перад пачаткам Вячэры Госпадавай вон з царквы выходзілі; таксама вызначаны час пасьцілі і кожны тыдзень ў чацьвер «Веру ...»

поститися и на каждой недели въ четвергъ «Верю...» пред Епископом или пред Презвитеромъ исповедати. А докулъ таковые речи кто выпольнилъ, крешчонъ не былъ, але такового звано Оглашенымъ, а погречески – Катикуменосъ. Науку пакъ их таковую Оглашеніемъ, погречески – Катихисісъ.

Был то обычай вельми потребный и пожиточъный, бо затымъ многые и въ познаніе Бога и Его правды приходили, и въ святомъ житью росли и укреплялися. Къ тому и учители мусели своего уряду быти пильными. Лечь діаволъ не допустил сему обычаю дольго межи христіанъми стояти, спяшчимъ бо человекомъ, по Слову Еванъгелскому, пріиде и въсеялъ плевелы (Матф. 13: 24-30), се есть, коли ся ленили учити людей, научилъ их діаволъ, абы верили, иж безъ наоуки, безъ веры и безъ исповеданіа можеть человекъ спасенъ быти, тольки бы водою въ детинъстве окрешчонъ былъ, а пришедши къ розуму, только бы въ певъные дни мяса не елъ, милостину хотя жь от злого набытя давалъ, святым ся молилъ и таковые речи заховалъ.

А на остатокъ на тое ся спушчали, естли кто мелъ, што бы попомъ по души дал, абы тело на посвяшченой земли положили, проводили, поминали, третины, деветины, полсорочины, сорочины, польгодины и годины и инъшие таковые вымыслы чинили. Для того именья, села, места отписовали, монастыри и будованые церъкви надавали або знову будовали, колоколы, потиріоны, дыскосы, ризы, иконы или балъваны куповали, надеваючися для таковыхъ справъ спасеніа, Царствіа Божіего и живота вечъного.

Все тое, мовлю, затым въ церъковъ Христову вошло, ижь онъ святый обычай, которого ся перъвая церъковъ по повеленію Христову держала, допустили діаволу вывести, а шкодливы онъ плевелъ въсеяти. Христос бо рече: «Шедшеи, наоучите вся языки, крестяшче их» (Матф. 28: 16-20). Тіи пакъ не только не научають, але и сами мало правъды знають и онымъ, которіи бы учити хотели, забраняють. Не иначе, но яко пред тымъ законъники жидовъские. О нихъ же Господь рече: «Горе вамъ, законъникомъ, яко взясте ключь разуменію: сами не внидосте и въходяшчимъ взъбранисте!» (Лука 11: 42-46). Ненадобе о томъ много писати, вси бо ведаемъ, яковыхъ теперь учителей маемъ.

Ведаеть весъ светъ, яко на свои степени въступають. Не тайно теже, яко на нихъ стоять и справуются. Лепъшей плакати, нежели их норовы выписовати. Оно певная речь, ижь напрасно их поправленіа в науце или въ житіи ждати. Лучшей, абы каждый, кто не хочеть згинути, иншого собе лекарства за часу искалъ, а таковымъ пастыромъ покой далъ. Тако бо повелеваеть Господь, где къ Апостолом, се есть всемъ учителемъ, рече: «Вы есте соль земли. Ашче же соль обуяеть, чимъ осолится? Ни в что же будеть к тому, точію да иссыпана будеть вонъ и попираема человекы» (Матф. 4: 18-5: 20). Солью називаеть всехъ учителей, яко бо соль заховуеть, што ею посолится, абы не

перад епіскапам ці прэсьвітэрам вызнавалі. І пакуль гэтыя ўсе ўмовы не былі выкананыя, ніхто ня мог быць ахрышчаным, але звалі яго «абвешчаным», што азначае па-грэцку «катэкумэнос». Навуку ж такую называлі «Абвяшчэньнем», па-грэцку – «Катэхізіс».

Быў той звычай вельмі патрэбны і карысны, бо такім чынам многія прыходзілі да спазнаньня Бога і праўды Ягонай, у жыцьці сьвятым узрасталі і ўмацоўваліся. Да таго ж і вучыцелі мусілі быць пільнымі. Але д'ябал не дапусьціў, каб гэты звычай доўга трываў сярод хрысьціянаў. Да сьпячага бо чалавека, паводле Слова Эвангельскага, ён прыйшоў і пустазельле пасеяў (Мц. 13: 25). Гэта значыць, калі вучыцелі ленаваліся вучыць людзей, навучыў іх д'ябал, каб паверылі, што чалавек можа збавіцца без навучаньня, бязь веры і без вызнаньня, абы толькі ў дзяцінстве быў ахрышчаны вадою, а прыйшоўшы да сталага розуму, толькі каб у пэўныя дні мяса ня еў, міласьціну, хаця б і са скрадзенага, даваў, да сьвятых маліўся ды, паводле звычаяў, рабіў падобныя справы.

А нарэшце дапусьціліся таго, што хоць якую маёмасьць папам давалі, каб тыя цела ў пасьвячанай зямлі пахавалі, праводзілі, паміналі ды спраўлялі трацíны, дзевяціны, паўсарачыны, сарачыны, паўгодкі і гадавіны ды іншыя падобныя прыдумкі. Дзеля гэтага завяшчалі маёнткі, вёскі, мястэчкі; ахвяравалі на манастыры і цэрквы або іх будавалі; куплялі званы, патырыёны, дыскасы, рызы, іконы і балваноў, спадзеючыся такімі справамі збавіцца ды заслужыць Валадарства Божае і жыцьцё вечнае.

Усё гэта, кажу, таму ў царкву прыйшло, што той сьвяты звычай, якога першая царква трымалася паводле загаду Хрыста, дазволілі д'яблу зьвесьці ды шкоднае пустазельле пасеяць. Хрыстос бо казаў: «Ідзіце і навучыце ўсе народы, хрысьцячы іх!» (Мц. 28:19) Тыя ж ня толькі ня вучаць, але і самі мала праўду ведаюць і тым, якія б маглі навучыць, забараняюць. Няйначай, як перад тым законьнікі юдэйскія. Пра іх Госпад сказаў: «Гора вам, законьнікі, бо ўзялі ключы ад разуменьня і самі не ўваходзіце, і іншым забараняеце!» (Лк. 11: 46) Няма патрэбы шмат пра гэта пісаць, усе бо ведаем, якіх цяпер маем вучыцелей.

Ведае ўвесь сьвет, як яны прыходзяць на свае пасады. Вядома таксама, як яны свае абавязкі выконваюць. Лепей плакаць, чым казаць пра іхнія норавы. Адно пэўная рэч – дарэмна чакаць ад іх выпраўленьня ў навуцы ці ў жыцьці. Лепш, каб кожны, хто загінуць ня хоча, іншыя лекі сабе, пакуль ёсьць час, шукаў, а такім пастырам супакой даў. Так бо загадвае Госпад Апосталам, гэта значыць, усім вучыцелям кажа: «Вы – соль зямлі! Калі ж соль згубіць сілу, то чым зробіш яе салёнаю? Яна ўжо ні на што не прыдасца, хіба толькі выкінуць яе вон на патаптаньне людзям» (Мц. 5:13). Сольлю называе Ён усіх вучыцеляў, бо як соль захоўвае тое, што ёю пасолена, каб не сапсавалася, так і вучыцель праз пакараньне, навучаньне і напамінаньне захоўвае людзей ад духоўнае гнілі. А калі так ня робіць, загадвае Госпад такога вон выкі-

провоняло, тако и учитель наказаніемъ, поученемъ и напоминаньемъ заховуеть людей от духовное гнили. Але если того не чинить, повелеваеть Господь вонъ его выкинути и потоптати, яко соль, естли бы одурела, або силу свою утратила. Чого жь для непослушни есмо того повеленіа Самого Сына Божіего?

Зайсте бы непотреба сего слова мало важити. Повинни бы есмо и на оное слово паметати: «Ашче слепецъ слепца водить, оба въ яму въпадетася» (Матф. 15:12-20). Слышиш ли, възлюбленый мой брате, ижь тя Самъ Господь остерегаеть, абы есь в яму не упалъ? Упадетъ всяк, кто ся слепому водити допушчеть. Чого жь для от таковыхъ слепцовъ не бежим? Чому ся имъ водити допушчаемъ?

Смилуйся уже каждый надъ собою Бога для. Въстани от сна, уже пора обачитися. Досыть есмо вже спали, коли есмо за справою сих слепцовъ ни Бога знали, ни о спасеніи своемъ на чимъ лежить ведали. Нехай то былъ часъ гнева Божиего за грехи предковъ нашихъ, который ся за преданіа, або лепей за сны и стареческие басни, взявши, Слово Божіе были опустили. Мусило тако быти. Бо и святіи Апостоли о томъ прорекли и написали. Наболей Павелъ, сосудъ изъбранъ Христовъ, тако к Солуняномъ пишеть: «Послеть, рече, Богъ деаніе льсти, веровати въ лжоу, да судъ пріимутъ вси неверовавшіи истинне, но благоволиша неправду» (2 Сол. 2:1-12).

Розъсмотри, молю ти ся боголюбче, естли ся сіа речь святога Апостала, мовлю, бывшихъ часовъ не збыла? Апостолъ зде пишеть, яко Богъ мелъ послати деаніе льсти. Сіа лесть чіа быти мела? Хиба оного, который ешче в раи родителей наших прельстилъ? А как же тогды прельстил; толко ижь Евву от Божіего Слова отвелъ? Иншимъ обычаемъ ему прельстити нельзя. Докуле бо человекъ держится Слова Божіа, дотуле заблудити не можеть, поневажь свечу, которою собе светить, маеть. По оному Слову: «Светилникъ ногамъ моимъ – Закон Твой, и светъ стезямъ моимъ» (Псалом 118).

Але естли тоую свечу потеряеть, мусить кождый заблукатися и, яко слепецъ, дорогы роукою шчупати, яко и Апостолъ поведаеть. Прото Пророк рече: «Ашче не былъ Господь Саваофъ оставилъ намъ семени, яко Содомъ убо были быхомъ.» Семенемъ Слово Божіе называеть. Тымъ ти обычаемъ діаволъ прельшчаеть. Ведаеть бо, ижь скоро люди отступять Слова Божіего, уже все, што онъ схочеть, учинять. Для того и сих часовъ на тое былъ привелъ, ижь Слова Божіего учители не казали. Зачимъ всякие злы речи въ церкви силу взяли.

Лечь ныне Богъ милостивый, ужалившися насъ, открыл намъ грешнымъ Слово Свое правдивое и штодень значней открываеть. Оучителей ачьколвекъ зредка веръныхъ посылаеть. Прото годится и намъ всемъ метися къ тому самымъ, абы есмо тое неизъреченное ласки вдячни были, Слово Божіе обема, яко мовять, руками приняли, держали, по Ему жили и иныхъ къ Нему приводили.

нуць і патаптаць, як соль, якая сапсавалася ці моц сваю страціла. Чаму ж мы ня слухаемся загаду Самога Сына Божага?

Сапраўды, ня трэба адкідваць гэтае слова. Павінны бо мы і вось гэтае слова памятаць: «Калі сьляпы сьляпога водзіць, абодва ў яму ўваляцца» (Мц. 15:14). Ці чуеш, умілаваны мой браце, што цябе Сам Госпад перасьцерагае, каб ты ў яму не ўваліўся? Бо ў яму ўваліцца кожны, хто дазваляе, каб яго вёў сьляпы. Чаму ж ад такіх сьляпцоў мы не бяжым? Чаму згаджаемся, каб яны нас вялі?

Зьлітуйся, у імя Бога, кожны над самім сабою. Паўстань зо-сну, ужо час абудзіцца. Досыць ужо мы спалі, калі за справаю гэтых сьляпцоў ані Бога ня ведалі, ані таго, на чым палягае нашае збаўленьне. Няхай тое быў час Божага гневу за грахі нашых бацькоў, якія адкінуўшы Слова Божае, ухапіліся за паданьні, або — яшчэ лепш — за сны ды старэчыя выдумкі. Мусіў за гэта прыйсьці гнеў Божы, бо і сьвятыя Апосталы пра гэта прарочылі і казалі. Найбольш Паўла, выбранае начыньне Хрыстова, так да Тэсалонцаў піша: «І за гэта пашле ім Бог дзеяньне подступу, каб яны паверылі хлусьні; каб былі засуджаныя ўсе, не паверыўшыя ў праўду, але палюбіўшыя няпраўду» (2 Тэс. 2: 11-12).

Разгледзься, малю цябе міласьцю Божай, ці не збылося ў апошнія часы гэтае слова сьвятога Апостала? Апостал тут піша, што Бог пашле дзеяньне подступу. Гэты подступ чый мусіў быць? Хіба ж не таго, хто яшчэ ў раі падмануў нашых бацькоў? А як бы тады іх падмануў, калі б не адвёў Еву ад Божага Слова? У іншы спосаб ня здолеў бы падмануць. Дакуль бо чалавек трымаецца Слова Божага, датуль заблукаць ня можа, бо мае сьвечку, якою сабе сьвеціць, як напісана: «Слова Тваё – сьветач для стоп маіх і сьвятло на сьцежцы маёй» (Пс. 118).

А калі тая сьвечка згубіцца, кожны мусіць заблукаць і, як сьляпы, ісьці навобмацак, як Апостал піша. Таксама Прарок кажа: «Калі б Госпад Магуцьцяў не пакінуў насеньне, мы былі б як Садома». Насеньнем ён тут называе Слова Божае. Таму д'ябал цябе і падманвае. Ведае бо: як хутка людзі адыйдуць ад Слова Божага, дык адразу зробяць усё, што ён захоча. Дзеля гэтага і зараз ён зрабіў, каб вучыцелі не казалі Слова Божага. Вось чаму ўсялякія ліхія справы ўзялі моц у царкве.

Аднак зараз міласьцівы Бог пашкадаваў нас, адкрыў нам, грэшным, праўдзівае Сваё Слова і штодня больш адкрывае. Вучыцеляў верных, хаця б зрэдку, пасылае. Таму трэба і нам усім імкнуцца быць удзячнымі гэтай невымоўнай міласьці: Слова Божае абедзьвюма, як кажуць, рукамі схапіць, трымаць, згодна зь Ім жыць ды іншых да Яго прыводзіць.

А паколькі «жніва многа, а працаўнікоў мала» (Мц. 9: 37-38), дзеля таго я, недастойны, у сьвятой царкве служка найменшы, склаў і напісаў гэтую кніжку паводле Божых Пісаньняў, каб прагнучыя мелі разумень-

А ижь «жатва многа, делатель мало» (Матф. 9: 27-10: 15), того для азъ недостоинъ, от святыя церкви служителей наменший, сію книжку от божественныхъ писаній събрахъ и написахъ, абы вси Слова Божія и истины разуменіа жаждушчіи мели, чого бы ся и сами учили и детокъ своихъ научали.

Знаю тое, ижь бы потреба сію науку достаточней выписати, але тако и часъ и приуменіе наше знесло. А веже напотомъ, естли будеть Божіа воля, может ся ширей у другое управити. Наболей четвертая часть, се ест о святомъ крешченіи и о Вечери Сына Божіего, помыслити можемъ опричную книжку выпустити. Ласка Господа нашего Ісус Христа съ всими верными. Аминь.

Писанъ у Клецку под леты въплошченіа Господа и Спаса и Бога нашого Ісус Христа 1562, іюніа 10 дня.

не ўсіх Словаў Божых і Ягонай праўды, каб гэтаму і самі вучыліся, і дзяцей сваіх навучылі.

Ведаю, што патрэбна было б гэтую навуку выкласьці падрабязьней, але так нам і час, і ўменьне нашае дазволілі. Да таго ж і пазьней, калі будзе Божая воля, можна яе шырэй справіць. Перадусім чацьвёртую частку, — што пра сьвяты Хрост і Вячэру Сына Божага, — можна было б надрукаваць асобнай кніжкай. Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі вернымі. Амін.

Пісана ў Клецку у год ад Нараджэньня Госпада і Збаўцы і Бога нашага Ісуса Хрыста 1562, месяца чэрвеня 10 дня.

# КАТИХИСІСЪ
## для детокъ хрістианьских языка Руского коротко выложена

**ПЫТАНЬЕ**
Што есь ты?
**ОТКАЗЪ**
Человекъ есмь сътворенье Божие розумъное, Богомъ по образу Его сътворенное.

**ПЫТАНЬЕ**
Чого деля Господь Богъ тебе сътворилъ?
**ОТКАЗЪ**
Не для того, абы безъ мене быти не могъ, але абыхъ Его позналъ, любилъ, Ему Самому служилъ, а потомъ съ Нимъ на веки жилъ.

**ПЫТАНЬЕ**
Которое веры еси ты?
**ОТКАЗЪ**
Хрістианьское веры.

**ПЫТАНЬЕ**
По чому ты еси Христианинъ?
**ОТКАЗЪ**
По тому, яко въ Хріста верую и крестилъся есмь въ имя Его.

**ПЫТАНЬЕ**
Што виненъ оумети Хрістіанинъ?
**ОТКАЗЪ**
Чотыри речи умети и водле того жити маеть. Первая – Законъ або

# КАТЭХІЗІС
## для дзетак хрысьціянскіх мовы Беларускай коратка выкладзены

**ПЫТАНЬНЕ**
Хто ты ёсьць?
**АДКАЗ**
Я – чалавек, разумнае Божае стварэньне, Богам на вобраз Ягоны створанае.

**ПЫТАНЬНЕ**
Дзеля чаго Госпад Бог цябе стварыў?
**АДКАЗ**
Не дзеля таго, што безь мяне Ён абыйсьціся ня мог, але каб я Яго спазнаў, любіў, Яму Самому служыў, а потым зь Ім навечна жыў.

**ПЫТАНЬНЕ**
Якой ты веры?
**АДКАЗ**
Хрысьціянскай веры.

**ПЫТАНЬНЕ**
Чаму ты Хрысьціянін?
**АДКАЗ**
Таму, што веру ў Хрыста ды хрысьціўся ў імя Ягонае.

**ПЫТАНЬНЕ**
Што павінен ведаць Хрысьціянін?
**АДКАЗ**
Чатыры рэчы ён мае ведаць ды паводле іх жыць: першая рэч –

заповеди. Другая – вызнанье веры. Третая – молитва Господня. Четверътая – Тайны Хрістовы.

**ПЫТАНЬЕ**
Колько ест заповедей Божіихъ?
**ОТКАЗЪ**
Десять, и для того е зовуть Десятословиемъ, по гречески Декалогосъ.

**ПЫТАНЬЕ**
Говори десятеро Божие приказанье.
**ОТКАЗЪ**
Тако пишеть Мойсей въ второй книзе, которую Исходомъ зовоуть: «Рече Господь Богъ вся слова сия: Я есмъ Господь Богъ твой, Который тебе вывелъ изъ земли Египетъские изъ дому неволи. Не будешь мети боговъ чужіихъ передо Мъною (1).

Не учинишь собе образа, ни всякого оуподобиа, которое на небесехъ высоко, ани которое на земли низъко, ани которое въ водахъ подъ землею. Не поклонишься имъ, ани имъ послужишь. Я бо есмь Господь Богъ Твой силенъ, ревнивъ, Который отдаю грехы отець на дети до третего и четвертого роду, которыи ненавидять Мене, а чиню милость надъ тисечми, которыи Мене любять и заповеди Моих стерегоуть (2).

Не возмешь имени Господа Бога твоего вътшче. Бо не пустить Господь оного безъ каранья, который бы взялъ имя Его на прасно (3).

Помъни день соуботный святити, шесть дни делати будешь, и всякие дела твоя оучинишь, а седъмого дня соубота есть Господа Бога твоего. Не оучинишь ни какова дела ни ты, ни сынъ твой, ни дочька твоя, ни паробокъ твой, ни неволница твоя, ни скотъ твой, ни пришлецъ, который межи воротъ твоихъ. Бо въ шести дний сътворилъ Богъ небо и землю, море и вся, што въ нихъ, и отпочиноулъ Богъ въ седмый день. Сего деля Господь день соуботный благославилъ и посвятилъ его (4).

Чти отца твоего и матку твою, абы есь долго жилъ на земли, которую Господь Богъ твой дасть тобе (5).

Не оубий (6).

Не чужоложи (7).

Не кради (8).

Не посведчишь на ближного твоего сведества лживого (9).

Не похочешь дому ближного твоего, не похочешь жены ближного твоего, ни паробка его, ни осла его, ани чого колве, што есть ближного твоего (10)"».

**ПЫТАНЬЕ**
Для чого Господь Бог далъ Закон или заповеди Свои?
**ОТКАЗЪ**
Абы кажный ведалъ, што есть грехъ, а што доброе дело. Тако бо Апостолъ пишеть: «Греха не разумехъ, точію Закономъ» (Рим. 7:1-13). А на иномъ месте рече: «Закономъ познанье греха» (Рим. 3:19-27).

Закон або прыказаньні, другая – вызнаньне веры, трэцяя – малітва Госпадава, чацьвёртая – Таямніцы Хрыстовы.

**ПЫТАНЬНЕ**
Колькі ёсьць прыказаньняў Божых?
**АДКАЗ**
Дзесяць, і дзеля таго іх завуць Дзесяціслоўем, па-грэцку – Дэкалог.

**ПЫТАНЬНЕ**
Гавары дзесяць Божых прыказаньняў.
**АДКАЗ**
Так піша Майсей у другой кнізе, якую называюць «Выхад»: «Сказаў Госпад усе гэтыя словы: "Я – Госпад Бог твой, Каторы вывеў цябе зь зямлі Эгіпецкай, з дому няволі. Ня мей другіх багоў побач Мяне (1).

Не рабі разьбы і ніякай выявы таго, што ўверсе ў небе, ані што на зямлі ўнізе, ані што ў вадзе ніжэй зямлі. Не пакланяйся ім і не служы ім, бо Я – Госпад, Бог твой, Бог зайздросны, Які карае дзяцей за няправасьць бацькоў да трэцяга і чацьвёртага пакаленьня адносна тых, каторыя Мяне ненавідзяць, і аказвае міласэрдзе аж да тысячнага пакаленьня тым, каторыя любяць Мяне і спаўняюць прыказаньні Мае (2).

Не гавары імя Госпада, Бога твайго, легкадумна, бо Госпад не пакіне бяз кары таго, хто прызывае імя Госпада, Бога свайго, надарэмна (3).

Памятай, каб сьвяткаваць дзень суботы. Шэсьць дзён будзеш працаваць і выконваць усе працы твае, а сёмы дзень – субота Госпада, Бога твайго. Не працуй ты, і сын твой, і дачка твая, нявольнік твой і нявольніца твая, жывёла твая і чужынец, каторы жыве ў цябе. Бо ў шасьці днях стварыў Госпад неба, і зямлю, і мора ды ўсё, што на іх ёсьць, і супачыў у сёмы дзень. Дзеля таго дабраславіў Госпад дзень суботы і ўсьвяціў яго (4).

Паважай бацьку твайго і маці тваю, каб быў ты даўгавечны на зямлі, якую дасьць табе Госпад, Бог твой (5).

Не забівай (6).

Не чужалож (7).

Не крадзі (8).

Не гавары фальшывага сьведчаньня на бліжняга твайго (9).

Не квапся на дом бліжняга твайго. Не жадай жонкі яго, ані слугі, ані вала, ані асла, ані нічога, што да яго належыць (10)"».

**ПЫТАНЬНЕ**
Дзеля чаго Госпад Бог даў Закон ці Свае прыказаньні?
**АДКАЗ**
Каб кожны ведаў, што ёсьць грэх, а што – добрая справа. Так бо Апостал піша: «Але я пазнаў грэх не інакш, як праз Закон» (Рым. 7: 7), а ў іншым мейсцы кажа: «Бо праз Закон грэх пазнаецца» (Рым. 3: 20).

**ПЫТАНЬЕ**

На колько частей делиться десятеро приказанье?

**ОТКАЗЪ**

На две части Самъ Господь розделилъ заповеди Свои. Бо чотыри заповеди далъ на первой дошчце каменной. А шесть — на дроугой дошчце.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого такъ розделилъ Богъ заповеди Свои?

**ОТКАЗЪ**

Того для, абы есьмо по тому знали, што есьмо Богу, а што ближному повинни. Бо насъ первая дошчъка тому навчаеть, яко ся къ Богу заховати маемъ. Другая пакъ указуеть, яко ближного любити потреба.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори первоую заповедь.

**ОТКАЗЪ**

«Не будешь мети боговъ чужихъ предо Мною».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого потреба къ вырозуменью тое заповеди?

**ОТКАЗЪ**

Хто хочеть заповеди Божіе достаточьне вырозумети, надобе ему чотыри речи паметовати. Первая речь — што Богъ чинити велить. Другая – чого заказуеть. Третяя – яко тыхъ караеть, которыи Ему непослушнии. Четвертая речь, яко оныхъ любить, которыи заповедей Его остерегають.

То есть, при каждой заповеди знадобе паметати тые чотыри речи: добрые дела, грехи, казьни и обетницы.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко маю тое розумети: «Не будешь мети боговъ чужихъ»? Чи ли много ест боговъ?

**ОТКАЗЪ**

Богов нетъ многих, развей одинъ Богъ, Которому бы вси служити и на Него ся надевати мели. Нижли люди, опустивши Бога, на иншие ся речи надеваютъ, а тако собе многие боги на сердцахъ своих чинять. Бо у чомъ кто надежю маеть, тое Богъ его естъ. Яко естъли кто надеваеться на маетъности, вже е собе на месте Божимъ поставилъ. Прото Апостолъ лихоимяніе або лакомство ідолослуженіемъ, а лихоимца – ідолослужителемъ називаеть (Ефес. 5: 1-8, Кол. 3: 4-11). Потомоу жь и о иныхъ розоумей. Яко кто бы ся на свою силу надевалъ або на што инъшого.

Тако жь она речь естъ чужій Богъ, для которое кто правдивого Бога опоушчаеть. Для того Апостолъ на противъ лживым учителемъ пишючы (Филип. 3: 8-20), чрево ихъ богомъ называеть. Бо они только для чрева урядъ учительский на себе брали, а не для Божией славы.

**ПЫТАНЬНЕ**

На колькі частак дзеляцца дзесяць прыказаньняў?

**АДКАЗ**

На дзьве часткі Сам Госпад падзяліў Свае прыказаньні, бо чатыры прыказаньні даў на адной каменнай дошцы, а шэсьць – на другой дошцы.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго Бог так падзяліў Свае прыказаньні?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, каб мы такім чынам ве̇далі, што павінны Богу, а што – бліжняму. Бо першая дошка нас навучае, як маем да Бога ставіцца. Другая ж паказвае, як бліжняга любіць патрэбна.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары першае прыказаньне.

**АДКАЗ**

«Ня мей другіх багоў побач Мяне».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што патрэбна, каб зразумець гэтае прыказаньне?

**АДКАЗ**

Хто хоча Божыя прыказаньні разумець дасканала, мусіць памятаць на чатыры рэчы. Першая рэч – што Бог загадвае рабіць, другая – што забараняе, трэцяя – як непаслухмяных Яму карае, чацьвёртая – як любіць тых, хто Ягоных прыказаньняў пільнуецца.

Значыць, пры кожным прыказаньні трэба памятаць на гэтыя чатыры рэчы: добрыя ўчынкі, грахі, пакараньні ды абяцаньні.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як маю гэта разумець: «Ня мей другіх багоў»? Хіба ж багоў многа?

**АДКАЗ**

Багоў ня многа, адзін ёсьць Бог, Якому ўсе маюць служыць і на Якога ўсе маюць спадзявацца. Аднак людзі, пакінуўшы Бога, на іншыя рэчы спадзяюцца ды так сабе у сваіх сэрцах многіх багоў ствараюць. Бо тое, на што чалавек мае надзею, і ёсьць ягоным богам. Калі хтосьці спадзяецца на маёмасьць, то на мейсца Бога сабе яе ставіць. Дзеля гэтага Апостал называе хцівасьць або сквапнасьць балванахвальствам, а хціўца – балванахвальцам (Эф. 5: 5; Кал. 3: 5). Тым жа звычаем мяркуй і пра тых, хто на сваю моц спадзяецца ці на што іншае.

«Другі бог» – гэта таксама справа, дзеля якой хтосьці пакідае праўдзівага Бога. Таму Апостал, калі піша супраць фальшывых вучыцеляў, чэрава называе іхнім богам (Флп. 3: 19). Бо яны толькі дзеля чэрава, а не дзеля Божай славы бралі на сябе вучыцельскі абавязак.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми, чого по насъ Богъ хочеть у томъ слове перъвом, або которые суть добрые дела того слова?

**ОТКАЗЪ**

Тые соуть добрие дела, которихъ по насъ Господь Богъ хочеть у той заповеди. Напервей абы есьмо только Его Самого за Бога мели, въ Него веровали, упованіе и надежю покладали. Потомъ Его ся бояли, любили, взывали, Ему ся кланели. На остатокъ для Него абы есьмо вси речи, если бы к тому пришло, ради опушчали.

**ПЫТАНЬЕ**

Которые соуть дела противу тому приказанью, которихъ Богъ заказуеть?

**ОТКАЗЪ**

Много ест греховъ напротиву тому первому слову, але наболей тые, которые соуть напротивъ веры и страха Божіего.

Яко первый грехъ нечестивыхъ епикуреи, то есть оныхъ, которыи не верують, абы Богъ былъ, або бы ся нами опекалъ.

Другый грехъ идолослужителей, то есть которыи або много боговъ быти верують, або створенію яко Створителю слоужать, яко было у старихъ еллинъ, которыи людей славныхъ по смерти за боги мели и оным ся молили. Яко Діаермію, Аполлона и иныхъ. Опять, теперь у томъ же блуде суть, который ся святымъ вже усопшимъ молять.

Третіий грехъ есть жидовъ и всих Бусоурманъ, которыи не такъ о Бозе розумеють и не такъ Его исповедують, яко Онъ Самъ велелъ, але яко они собе вымышлили. Тое жь розумей о еретикахъ.

Четвертый грехъ волхвовъ, то есть чародейниковъ, которыи бесомъ верують.

Пятый – оныхъ, которыи Бога къ певнымъ местомъ яко бы привязують, домнемаючи, абы бордзей на одномъ месте выслухалъ, нежели на другомъ. Прошчами тое зовуть. Лечь противъ тому мнеманью пророкъ Ісаіа пишеть, поведаючи, иже Богъ везде заровно человека, который ся каетъ, слышить. Сице бо рече: «Тако глаголеть Господь: “Небо – престолъ Мой, а земля – подножье ногама Моима, кый храмъ съградите Мне? или кое место покоя Моего? Все бо сътвори рука Моя, и се ест все Мое, — глаголеть Господь. — И на кого възрю? Но на смиренаго и млъчаливого и трясушчаагося словесъ Моихъ”» (Ісаіа 66, Деан. 17: 16-18: 20).

Шестый грехъ противъ первому слову Божіему есть лицемереи, которыи ся о правды Бога и Его суда не боять. Тежь которыи болей богатества и телесные сласти любять, нежели Бога, а предъся пред людми указуються побожными.

Седмый грехъ – не уповати на Бога а гневатися на Него, яковъ былъ царь Ізраилъский Саоулъ.

Осьмый – розумети велми высоко о своей правде, або справед-

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы мне, чаго ад нас Бог хоча ў гэтым першым слове, або якія ўчынкі, паводле гэтага слова, добрыя?

**АДКАЗ**

Вось добрыя ўчынкі, якія ад нас Госпад Бог хоча ў гэтым прыказаньні. Перадусім, каб мы толькі Яго Самога мелі за Бога, у Яго верылі, надзею на Яго ўскладалі. Потым – каб Яго баяліся, любілі, да Яго зьвярталіся, Яму пакланяліся. Нарэшце, каб дзеля Яго ўсе справы, калі пра тое зойдзе, з радасьцю пакідалі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ўчынкі супярэчаць гэтаму прыказаньню і Бог іх забараняе?

**АДКАЗ**

Шмат ёсьць грахоў супраць гэтага першага слова, перадусім тыя, што супраць веры ды страху Божага.

Першы грэх – бязбожных эпікурэйцаў, значыць тых, якія ня вераць, што Бог ёсьць, або ня вераць, што Ён пра нас клапоціцца.

Другі грэх – балванахвальцаў, значыць тых, якія або вераць, што ёсьць шмат багоў, або служаць стварэньню як Творцы. Так было ў старажытных грэкаў, якія слынных людзей пасьля сьмерці лічылі за багоў ды ім маліліся, напрыклад, Гермэсу, Апалёну ды іншым. Зноў жа, зараз так грашыць той, хто моліцца памерлым сьвятым.

Трэці грэх – юдэяў ды ўсіх мусульманаў, якія ня так пра Бога разважаюць ды Яго вызнаюць, як Ён Сам загадаў, але так, як яны сабе выдумалі. Гэтаксама пра герэтыкоў мяркуй.

Чацьвёрты грэх – валхвоў, значыць, чарадзеяў, якія бесам вераць.

Пяты грэх тых, хто Бога да пэўных мейсцаў нібыта прывязвае, мяркуючы, што Ён хутчэй у адным мейсцы выслухае, чым у другім. Прошчамі гэтыя мейсцы яны называюць. Але супраць такога меркаваньня піша прарок Ісая, кажучы, што Бог паўсюль аднолькава чуе чалавека, які каецца. Гэтак бо сказаў: «Так кажа Госпад: “Нябёсы ёсьць Маім тронам, зямля ж – падножкам ног Маіх. Які ж гэта дом, што Мне пабудуеце, ды якое гэта мейсца на Мой адпачынак? Усё гэта зрабіла Мая рука, ды ўсё гэта ёсьць Маё, – кажа Госпад. – Але Я гляджу на таго, хто бедны і прыгнечаны на духу, і хто са страхам шануе слова Маё”» (Іс. 66: 1-2; Дзеі 17: 24-25).

Шосты грэх супраць першага слова Божага – грэх крывадушнікаў, якія не баяцца праўды Божай ды Ягонага суду. Таксама і тых, хто больш за Бога любіць багацьце ды асалоды цялесныя, хаця на людзях здаецца пабожным.

Сёмы грэх – не спадзявацца на Бога ды гневацца на Яго, такім быў валадар Ізраэльскі Саўл.

Восьмы – думаць надта высока пра сваю праведнасьць або справядлівасьць, як той фарысэй, што на малітве хваліўся перад Богам сваёй справядлівасьцю ў такія словы: «Божа, дзякую Табе, што я

ливости. Яко онъ фарісей, который у молитве правду свою вычиталъ пред Богомъ сими словы: «Боже, хвалу Тобе вздаю, яко несмъ яко прочіи человеци, — неправедници, хишчници, прелюбодеи или яко сей мытарь, пошчуся двойчи на суботу» (Лука 18: 10-14). Таковыи лицемерыи совито грешять. Наперед, иже неправе розумеють, што естъ судъ Божій, и для тое причины не от правды ся Бога боять. Надъ то службу Божію собе приписують. Прото Хрістос Своихъ тако учить: «Егда сътворите повеленнаа вамъ, глаголите: яко рабы неключими або не потребны есмы, им же дольжни бехомъ, створихомъ» (Лука 17: 3-11).

Девятый грехъ – сомънитися а не доверяти благодати Божіей, але помышляти, яко бы Богъ о насъ не дбалъ и отпустити намъ греховъ не хотелъ. Таковъ былъ Каин, который верити не хотелъ, абы ему Богъ отпустити мелъ, иже брата своего убилъ (Быт. 4). Тое жь и о Іуде, который Хріста продалъ, розумети маешь (Матф. 27: 3-10).

Десятый грехъ – не терпети а непріимати завдячьне, што Бог допушчаеть, або Богу неправду и немилость приписовати.

Одинадцатый грехъ – не дбати о Божіе Слово, або ся его откинути або къ воли людемъ, або для страха, яко Петръ учинилъ.

Дванадцатый – уповати на свою силу, мудрость або на иного што. Яко Сеннахирим, на свою силу уфаючи, хотелъ вывернути царество Іудейское (Ісаіа 36).

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи, яко Богъ караеть, кто грешить напротивъ первому слову?

**ОТКАЗЪ**

Напервей караеть Бог помстою духовною. Яко Апостолъ пишеть, иже ідолослужителие Царствія Божія не наследять (Гал. 5:11-21). Караеть теже и зде Богъ ідолослуженіе голодомъ, войнами, моровымъ поветриемъ, полоненьемъ и иншими таковыми язвами. Яко у Старимъ Законе людъ Ізраильский часто svaралъ Богъ ни для чого только для того, иже Его опушчали, а чужимъ богомъ служили.

И ныне всех хрістианъ скаралъ, некоторих слепотою, иншихъ неволею подъ Турецскимъ або подъ Антихрістомъ Римскимъ. А мусить так быти. Бо тако Богъ обецалъ, даючи Свое приказанье, где рече: «Я есмъ Господь Богъ твой крепокъ и ревнивъ, отдаваючи безакониа отцевъ на чада до третиего и до четвертого роду ненавидяшчимъ Мене».

**ПЫТАНЬЕ**

Што Богъ обецуеть темъ, которыи тоее заповеди остерегають?

**ОТКАЗЪ**

Яко на незбожных двоя помста, потому же и тым, которыи заповедей стерегуть, двоя маеть быти заплата: одна — вечная, а другая дочасная. О вечной Хрістос тако рече: «Ашче хочешь внити въ животъ, заховай заповеди» (Матф. 19:16-30). А зде потому жь рече: «Чиню милосерьдие надъ многими тисечьми любяшчими Мя и храняшчими заповеди Моя».

не такі, як іншыя людзі: рабаўнікі, несправядлівыя, чужаложнікі або як гэты мытнік. Пашчуся два разы ў тыдні» (Лк. 18: 11-12). Такія крывадушнікі двойчы грашаць: перадусім яны няправільна мяркуюць, які ёсьць суд Божы, ды з гэтай прычыны ня маюць страху Божага; апроч таго заслугі Божыя сабе прыпісваюць. Дзеля гэтага Хрыстос так Сваіх вучыць: «Так і вы, калі споўнілі ўсё, што вам загадана, кажыце: "Слугі мы не зарадныя, што павінны былі зрабіць, зрабілі"» (Лк. 17: 10).

Дзевяты грэх – сумнявацца ды не давяраць ласцы Божай, думаючы, што Бог пра нас ня дбае ды ня хоча нам грахоў прабачаць Такім быў Каін, які не хацеў верыць, што Бог даруе яму забойства брата (Роду 4). Гэтаксама мяркуй пра Юду, які прадаў Хрыста (Мц. 27: 3-10).

Дзесяты грэх – ня зносіць ды не прыймаць удзячна тое, што Бог дапускае, або няпраўду ды няміласьць Богу прыпісваць.

Адзінаццаты грэх – ня дбаць пра Слова Божае або яго выракацца ці то па волі людзей, ці то, як Пётр, дзеля страху.

Дванаццаты грэх – спадзявацца на сваю моц, розум або на што іншае, як Сэнахірым, на сваю сілу спадзеючыся, хацеў зьнішчыць валадарства Юдэйскае (Іс. 36).

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы, як Бог карае тых, хто грашыць супраць першага слова?

**АДКАЗ**

Найперш карае Бог помстай духоўнаю, як Апостал піша, што балванахвальцы не атрымаюць Валадарства Божага (Гал. 5: 11-21). Таксама і ў гэтым жыцьці Бог карае балванахвальства голадам, войнамі, пошасьцю, палонам ды іншымі падобнымі плягамі. У Старым Запавеце Бог часта караў народ Ізраэльскі не дзеля чаго іншага, як дзеля таго, што Яго пакідалі ды чужым багам служылі.

І зараз усіх хрысьціянаў Бог скараў: адных – сьлепатою, другіх – няволею пад Турэцкім або пад Рымскім Антыхрыстам. І мусіць так быць, бо так Бог абяцаў, даючы Сваё прыказаньне, калі сказаў: «Я – Госпад, Бог твой, Бог зайздросны, Які карае дзяцей за няправасьць бацькоў да трэцяга і чацьвёртага пакаленьня адносна тых, каторыя Мяне ненавідзяць».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што Бог абяцае тым, хто захоўвае гэтае прыказаньне?

**АДКАЗ**

Як бязбожным падвойная помста, так і тым, хто прыказаньні захоўвае, падвойная мае быць узнагарода: адна – вечная, а другая – дачасная. Пра вечную Хрыстос так казаў: «Калі хочаш увайсьці ў жыцьцё вечнае, спаўняй прыказаньні» (Мц. 19: 17). Ды ў гэтым прыказаньні таксама сказаў: «Аказваю міласэрнасьць аж да тысячнага пакаленьня тым, каторыя любяць Мяне і спаўняюць прыказаньні Мае».

Милосерьдие чинить Богъ над нами, коли намъ грехи отпушчаеть, а изъ грешныхъ праведъными чинить, абы есмо достойны вечного живота были. А тые речи соуть вечные заплаты. Лечь над то и на симъ свете таковых Богъ не опушчаеть, которыи Его приказанья стерегуть, Ему Самому служать, яко, наприкладъ, Даніилъ, Іереміа и инъшихъ много.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори вторую заповедь.

**ОТКАЗЪ**

Вторая заповедь естъ: «Не учинишь собе образа ани всякого уподобия, которое естъ на небеси высоко, и которое на земли низъко, и которое в водахъ подъ землею».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко тое маю разумети? Чи ли и собе чинити образа Богъ заказуеть, чи ли только поганьскихъ кумировъ?

**ОТКАЗЪ**

Напервей такъ разумети маешь, иже яко у первой заповеди заказуеть Богъ духовного идолослужениа, а Собе духовную службу зоставляеть, тако въ второй заповеди заказуеть и теломь образомъ служити. А на тое пытанье, где еси пыталъ, естъли бы только поганьских балъванов чинити боронилъ Господь, тако тобе отказую, иже не только ложным богом образа Богъ чинити заказуеть, але и Собе, и ангеломъ, и людемъ ачь пакъ святымъ. Бо ясне рече: «Ни всякого уподовиа».

О чомъ ешче доводней в Пятых книгахъ тако заповедуеть Мойсей: «Не видисте никакова уподобиа в той день, егда глаголалъ к вамъ Господь Богъ на горе Ориве от среды огня, да некогда прельшчены, учинили бы есте собе кумира, или уподобление мужеска пола, или женьска, или образъ всякого звера, иже на земли, или птиць, или гадов» (Втор. Зак. 4). Бачишь ли, што говорить Мойсей? Иже для того Богъ, говорячи къ сыномъ Ісраилевымъ, не явилъся имъ ни въ одномъ какимъ образе, абы потомъ собе образовъ не чинили?

**ПЫТАНЬЕ**

Ино на оный часъ только жидомъ не годилося мети образовъ, понеже ни какова образа Божиа не видели, лечь потом Сынъ Божій, пришедши и тело принявши, бысть людемъ Богъ видимый, прото годиться намъ вже образы мети?

**ОТКАЗЪ**

Правда естъ, иже ся Богъ сталъ видомый в Сыну Своимъ. Бо и Самъ Хрістос поведелъ къ Филиппу: «Видевый Мене, виде Отца, яко Азъ въ Отци и Отець въ Мне естъ». Лечь предъся оного первого заказанья не отнялъ, ани отставилъ, але болей потверьдилъ, где ко самараныне рече: «Жено, вероуй Ми, яко грядеть часъ, егда ни въ горе

Міласэрнасьць чыніць нам Бог, калі прабачае грахі ды з грэшных робіць нас справядлівымі, каб былі вартыя жыцьця вечнага. Гэта вось узнагароды вечныя. Але да таго і на гэтым сьвеце не пакідае Бог тых, хто прыказаньняў Ягоных пільнуецца ды Яму Самому служыць, як, напрыклад, Ён не пакінуў Данііла, Ярэмію ды многіх іншых.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары другое прыказаньне.

**АДКАЗ**

Другое прыказаньне: «Не рабі сабе вобраза і ніякай выявы таго, што ўверсе ў небе, ані што на зямлі ўнізе, ані што ў вадзе ніжэй зямлі».

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэта маю разумець? Ці ж і Сваю выяву Бог рабіць забараняе, ці толькі паганскіх балваноў?

**АДКАЗ**

Перадусім так разумець гэта мусіш: як у першым прыказаньні Бог забараняе духоўнае балванахвальства ды Сабе пакідае духоўнае пакланеньне, гэтаксама ў другім прыказаньні Ён забараняе целам пакланяцца выявам. А на тое тваё пытаньне, ці Госпад забараняе рабіць толькі выявы паганскіх балваноў, так табе адказваю: Бог забараняе ствараць ня толькі выявы багоў фальшывых, але і Свае выявы, і анёлаў, і людзей, нават сьвятых. Бо ясна сказаў: «Ніякай выявы».

Пра гэта ў Пяцікніжжы яшчэ больш пераканаўча запаведуе Майсей: «Ня бачылі вы ў той дзень ніякага вобразу, калі гаварыў да вас Госпад на гары Гарэб пасярод агню, каб вы не сапсуліся і не зрабілі сабе ідала, вырабляючы яго на падабенства мужчыны або жанчыны, або выяву якой-небудзь жывёліны, каторая знаходзіцца на зямлі, або птушкі, што лётае ў небе, або паўзуноў» (Паўт. Зак. 4). Ці бачыш, што кажа Майсей? Ці ж не дзеля таго Бог, гаворачы да сыноў Ізраэля, не зьявіўся ім у нейкім вобразе, каб потым яны не стварылі сабе балваноў?

**ПЫТАНЬНЕ**

Можа, на той толькі час гебраям не дазвалялася мець выяваў, бо яны ня бачылі аніякага Божага вобразу. Аднак потым Сын Божы, прыйшоўшы ды цела прыняўшы, стаўся бачным для людзей Богам, дзеля гэтага можна ўжо мець нам выявы?

**АДКАЗ**

Праўда, што Бог стаўся бачным у Сваім Сыне, бо і Сам Хрыстос казаў да Піліпа: «Хто бачыў Мяне, той бачыў Айца, бо Я ў Айцы і Айцец у-ва Мне». Аднак таго папярэдняга прыказаньня Госпад не адмяніў, але яшчэ больш яго сьцьвердзіў, калі сказаў самаранцы: «Жанчына, павер Мне, што набліжаецца час, калі ані на гэтай гары, ані ў Ерузаліме ня будзеце пакланяцца Айцу» (Ян 4: 21). А крыху ніжэй да той жа жанчы-

сей, ни въ Іерусалимехъ поклоните ся Отцоу» (Іоан 4: 5-46). А мало нижей къ той же жене мовить: «Духъ есть Богъ, и иже кланеють ся Ему, Духомъ и истинною достоить кланетися».

Се видишь, яко зверховные речи отставляеть Господь. Але абы есь ведалъ, иже и по воплошченью Сына Божіа не хочеть Богъ, абы Ему образы чинены, прочти речь святого Апостола Павла, которую мелъ къ Афиньским, где межи иными словы тако рече: «Бог, сътворивый миръ и вся, яже в немъ, сей небу и земли Господь сый (святый), не в рукотвореныхъ храмехъ живеть, ни от роук человеческыхъ оугоженіа приемлеть» (Деан. 17: 16-18: 41). Изъ которихъ словъ явно естъ, иже Апостол не о ложнымъ якимъ бозе говорить, але о Самомъ истиннымъ живымъ. Бо такъ рече: «Богъ, створывый миръ», а предъся ясне придалъ, иже тотъ Богъ оугоженіа от рукъ человечихъ не приемлеть.

Образы пакъ, або яко е зовоуть, иконы, што иного суть, естъли не оугожение, то естъ служба, от рукъ человечихъ? Прото мало подалей тамъ же Павелъ мовить: «Родъ убо сушче Божій, не должни есмо непшчевати (домнимати) злату и сребрю или каменію, начертанію хитрости и смышленію человека, Бога быти подобна». Зде ясне видишь, иже Апостолъ Самому таки живому Богу заказуеть чинити уподобления такъ от золота або сребра, яко от каменья и от всее человеческой хитрости. Хотя жь пакъ вже тогды Хрістос, Сынъ Божій, принялъ былъ зракъ человечи.

Надъ то, ачь Богъ явилъ ся намъ въ Сыну Своемъ, лечь намъ образовъ таковыхъ чинити не велелъ. Маемъ бо на томъ образе перестати, который намъ Богъ подати рачилъ, то естъ на Самомъ Сыне Божіимъ. Той естъ единый образ Божій, которому ся кланети маемъ Духомъ и истинною. Ачьколвье и Адам первый по тому же образу былъ созданъ, але и тогды жь утратилъ, заповедь Божію проступивши.

**ПЫТАНЬЕ**

Што на тое откажешь, што некоторіи говорять, яко бы Хрістос Свой образъ царю Агварю послалъ?

**ОТКАЗЪ**

Напервей на тое тако отказую, иж о томъ ни одинъ евангелистъ не пишеть. А чого у Святомъ Писмени не выписано, а яко тому верити кто можеть? Не подобна бо речь, абы такъ великого чюда святіи евангелисты не вспомянули, если бы так было, поневажь и меншие речи припоминають.

Ведаю теже, яко о томъ Дамаскинъ написалъ, иже бы царь едеський Агварь посылалъ иконописца ко Христу, абы Его лице написалъ, а коли дей иконикъ написати не могъ, Самъ чусто Хрістос, взявши обрюсъ, къ лицу приложилъ и тако образъ нерукотворенный учинилъ. Тако о томъ пишеть Дамаскинъ, але на тое жадного доводу не маеть и самъ за непевную речь пишеть. Прото жь такъ не певным речам не годиться верити, яко и Апостолъ Тімофею пишеть, рекучи: «Старечьских басен отрицайся» (1 Тім. 4: 4-5: 10).

ны Ён кажа: «Бог ёсьць Дух, і тыя, што пакланяюцца Яму, павінны аддаваць Яму спахвалу ў Духу і праўдзе». Вось бачыш: усякія выявы адмяняе Госпад.

Але каб ты ведаў, што і пасьля ўцелаўленьня Сына Божага Бог ня хоча, каб Яму ствараліся выявы, прачытай навучаньне сьвятого Апостала Паўлы Афінянам, дзе ён, між іншым, так сказаў: «Бог, Каторы стварыў сьвет ды ўсё, што на ім, Госпад неба і зямлі, не жыве ў сьвятынях, рукою людзей пабудаваных, ды не патрабуе паслугі рук людзкіх» (Дзеі 17: 24-25). З гэтых словаў выяўляецца, што Апостал не пра фальшывага нейкага бога гаворыць, але пра Сапраўднага і Жывога. Так бо сказаў: «Бог, Каторы стварыў сьвет» ды ясна растлумачыў, што Той Бог не прыймае паслугі рук чалавечых.

Выявы ж, ці, як іх называюць, іконы – што іншае, як не паслуга, гэта значыць, служэньне рук чалавечых? Дзеля таго там жа, крыху ніжэй, Паўла кажа: «Дык, будучы з роду Божага, не павінны мы думаць, што Боства падобнае да золата, або срэбра, або каменя, разьбы мастака, або да твору розуму чалавечага». Тут ясна бачыш, што Апостал забараняе ствараць падабенства нават Самога Бога жывога як з золата ды са срэбра, так і з каменя ды з твораў розуму чалавечага, хаця тады Хрыстос, Сын Божы, ужо прыняў выгляд чалавека.

Больш за тое, хаця Бог і адкрыўся нам у Сыне Сваім, аднак нам не загадаў рабіць такіх абразоў. Маем бо на тым вобразе спыніцца, які нам Бог паказаў ласкава, значыць, на Самім Сыне Божым. Ён – адзіны вобраз Божы, Якому мусім аддаваць спахвалу ў Духу і праўдзе. Хаця і Адам перш быў створаны на гэты ж вобраз, але тады ж яго страціў, парушыўшы Божае прыказаньне.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што адкажаш на тое, быццам бы Хрыстос, як некаторыя гавораць, паслаў Сваю выяву валадару Агвару?

**АДКАЗ**

Перад усім так адкажу: пра гэта ніводзін эвангеліст ня піша. А як нехта можа верыць у тое, што не напісана ў Сьвятым Пісьме? Бо не падобна, што сьвятыя эвангелісты не ўзгадалі б пра такі вялікі цуд, калі яны і пра меньшыя справы ўзгадваюць.

Ведаю таксама, як пра гэта напісаў Дамаскін: нібыта эдэскі валадар Агвар паслаў да Хрыста іканапісца, каб той намаляваў Ягоную выяву. А паколькі іканапісец, маўляў, намаляваць ня змог, тады Сам Хрыстос, узяўшы абрус і прыклаўшы яго да твару, стварыў Сваю нерукатворную выяву. Так мяркуе Дамаскін, але, ня маючы аніводнага доказу, ён сам піша пра гэта як пра няпэўную рэч. Дзеля гэтага ня варта такім няпэўным рэчам верыць, як і Апостал, да Цімахвея пішучы, кажа: «Недарэчных казак высьцерагайся» (1 Цім. 4: 7).

Нарэшце, калі хто захоча паверыць гісторыі пра валадара Агвара,

На остатокъ, естли бы кто деанію о Агваре царю верити хотелъ, ино бы подобней Евъсевію Кесарійскому верити, которій былъ во три ста летъ по Хрістовомъ вознесенію, нежели Дамаскину, который вже былъ по седмисотъ летехъ. Лечь Евсевій, тое деаніе широко выписуючи, не въспоминаеть ни которых образовъ, только листъ припоминаеть, который Хрістос къ Агварю писалъ. А к тому, яко святый Апостолъ Фома посылалъ Фаддеа къ Агварю, который дей его возложеніемъ рукъ и молитвою злечилъ. О томъ знайдешь у него въ первой книзе церковного деаніа главу 13.

**ПЫТАНЬЕ**

Ешче некоторыи говорять, яко Лука Евангелистъ былъ иконописецъ, иже бы иконы пречистой богородицы писалъ.

**ОТКАЗЪ**

Тое на святого Луку безвинне зложили иконопоклонницы, абы такъ свой блудъ укрепили. Лечь напротиву имъ о Луце Апостолъ стоить, поведаючи, ижь врачь былъ, то есть лекарь, а не иконописець. Тако бо къ Коласаемъ пишеть: «Целоуеть вы Лука, врачь възлюбленный» (Кол. 4: 10-18).

Если бы Лука былъ иконописецъ, никако бы того не замолъчал Павелъ, яко и врачевства не миноулъ, а иконописаніе далеко вышша речь. Лечь не только святый Павелъ Апостолъ, але и Софроніе по тому же Луку врачомъ у его житию пишеть, а иконописанія ни одном словомъ не споминаетъ (чти пресловіе въ Евангелие от Луки).

**ПЫТАНЬЕ**

Што намъ Богъ у той заповеди приказоуеть чинити?

**ОТКАЗЪ**

Каждое приказанье две речи въ собе замыкаеть. Первая – што Богъ чинити велить. Другая – чого заказоуеть. У той заповеди, где образов чинити боронить, там же ся и тое замыкаеть, абы есмо образъ Божій чтили, то есть кажного человека. Бо той есть по образу Божіему созданъ (Быт. 1).

**ПЫТАНЬЕ**

Чого намъ Богъ заказуеть у томъ заказанью, або которые суть злая дела противу того приказанья?

**ОТКАЗЪ**

Напервей заказоуеть всякого образа чинити, предъ которым бы ся або самъ, або кто иный кланелъ. Тежь заказует не только самому чинити, але хотя бы кто иный учинилъ, абы ся не кланель. А кто бы напротиву тому чинил, таковогo дела суть тяжкие грехи.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ караеть тых, они же бы тую заповедь проступали?

то ці ж ня больш прыстала паверыць тады Яўсевію Кесарыйскаму, які жыў праз трыста гадоў пасьля ўшэсьця Хрыстова, чым Дамаскіну, які жыў празь семсот гадоў? Але Яўсеві, падрабязна распавядаючы пра тую падзею, ня ўзгадвае аніякіх выяваў, прыпамінае толькі ліст, які Хрыстос пісаў да Агвара. Да таго ж ячшэ ўзгадвае, як сьвяты Апостал Тамаш пасылаў да Агвара Тадэя, які, маўляў, вылячыў Агвара ўскладаньнем рук ды малітвай. Пра гэта знойдзеш у ягонай першай кнізе царкоўных дзеяў, разьдзел 13.

**ПЫТАНЬНЕ**

Яшчэ некаторыя гавораць, што эвангеліст Лука быў іканапісцам ды што ён нібыта іконы прачыстай багародзіцы пісаў.

**АДКАЗ**

Гэта пра сьвятога Луку выдумалі без усялякай прычыны іконахвальцы, каб такім чынам апраўдаць свой грэх. Аднак, насуперак ім, пра Луку сьведчыць Апостал, паведамляючы, што той быў урачом, гэта значыць, лекарам, а не іканапісцам. Так бо ён да Калосцаў піша: «Вітае вас Лука, лекар найдаражэйшы» (Кал. 4:14).

Калі б Лука быў іканапісцам, Паўла пра тое ніколі б не змаўчаў, як і лекарства ягонага не абмінуў, а іконапісаньне – куды больш важная справа. Ды і ня толькі сьвяты Паўла, але таксама і Сафроні называе Луку ў ягоным жыцьцяпісе лекарам, а пра іконапісаньне ня ўзгадвае аніводным словам (чытай прадмову да Эвангельля паводле Лукі).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што нам Бог у гэтым прыказаньні загадвае рабіць?

**АДКАЗ**

Кожнае прыказаньне дзьве рэчы ў сабе зьмяшчае: першая – што Бог рабіць загадвае, другая – што забараняе. У гэтым прыказаньні, дзе Бог забараняе рабіць Ягоныя выявы, зьмяшчаецца і тое, што мы павінны шанаваць вобраз Божы, гэта значыць, – кожнага чалавека, бо ён створаны на вобраз Божы (Роду 1).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што нам Бог забараняе ў гэтым прыказаньні, або якія ўчынкі, паводле гэтага прыказаньня, благія?

**АДКАЗ**

Перадусім Бог забараняе ствараць усякую выяву, якой бы ці ты сам, ці хто іншы кланяўся. Таксама Ён забараняе ня толькі самому выявы ствараць, але і кланяцца выявам, кімсьці іншым створаным. І хто насуперак гэтаму прыказаньню ўчыніць, той цяжка саграшыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае тых, хто парушае гэтае прыказаньне?

**ОТКАЗЪ**

Яко первое заповеди, тако и тоее проступцы карани бывають и вечными и телесными муками. Скаралъ Богъ сыны Ізраилевы, егда собе были учинили образъ яко теля, такъ иже ихъ убито одного дня три тисечи (Исход 32, 1 Кор. 10:5-11). Скаралъ теже Соломона, иже от сына его отступило десять коленъ сыновъ Ізраилевыхъ (3 Цар. 12).

А опустивши старие казни, новую памятуимы, яко Богъ тяжко скаралъ цара Констанътина, сына Лвова, и матку его Ирину, на которих розказанье наставляно образовъ до храмовъ Божіихъ и приказано ся имъ кланети (чти Номоканонъ, то есть правило събора седмого). Бо напервей тая Ірина царица ослепила сына своего, того жь Константина, давъши оному очи вынять, а той опfive напотомъ матку въ заточенье заслалъ, аже на остатокъ и самъ безъ потомъства згинулъ. Зачимъ и Кесарьство къ иному народу пришло (о томъ пишут Платина и Эгнатій).

**ПЫТАНЬЕ**

Што пакъ обецуеть Богъ тымъ, они же бы ся образомъ не кланели, ани бы ихъ чинили?

**ОТКАЗЪ**

Яко проступаючихъ и вечными муками и временными караеть, тако опять чинячимъ по той заповеди и зде добромъ платить, и потомъ вечный животъ обецуеть. Яко на взоръ маемъ Езекию и Іосию, царей Іудейских, которихъ Богъ противу всехъ враговъ ихъ крепко боронилъ, иже тому приказанью досыть чинячи, всякие балъваны губили. Такъ иже и оного змея медяного, которого былъ Моисей по повеленію Божіему учинилъ (Числа 21), егда ся ему молити людъ почалъ, побожный царь Езекия съкрушил, хотя жь онь змей былъ образомъ Сына Божіего Господа нашого Ісуса Хріста.

О томъ пакъ Езекіи тако Духъ Святый написалъ: «На Господа Бога уповалъ сей царь Езекия. И прото ж по немъ не было ему ровного во всехъ царехъ Іудиныхъ» (4 Цар. 18). Но ни в тыхъ, иже пред нимъ были. Потому жь и о Осии написано, иже ему подобный царь не былъ (4 Цар. 23), который бы ся тако навратилъ къ Господу Богу.

А тое для того Духъ Святый написалъ, абы цари, князи и иныи преложении ведали, иже тое на ихъ уряд залежить, абы всякие балъваны и ложные службы губили и выкореняли. Таковыхъ бы теперь по всехъ Рускихъ земляхъ вельми пильная потреба, где ся ідол и розличныхъ балвановъ вже от колька сот летъ такъ намножило, иже за ними и Бога людъ посполитый забылъ. Лечь о томъ иншого часу ширей напишемо.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори третее приказанье.

**ОТКАЗЪ**

«Не возмешь имени Господа Бога твоего вотшче або напрасно».

**АДКАЗ**

Як першага, так і гэтага прыказаньня парушальнікі будуць пакараны і вечнымі, і цялеснымі пакутамі. Пакараў Бог сыноў Ізраэльскіх, калі яны стварылі сабе выяву цяляці, так што за адзін дзень было іх забіта дваццаць тры тысячы (Вых. 32; 1 Кар. 10: 7-8). Пакараў Бог таксама Салямона, калі ад ягонага сына адступілася дзесяць каленаў Ізраэльскіх (1 Валад. 12).

Ня кажучы пра плягі мінулыя, памятайма на новыя, як Бог цяжка пакараў валадара Канстанціна, сына Львова, ды ягоную матку Ірыну. Па іхняй намове панастаўляна было абразоў па храмах Божых ды загадана было ім маліцца (чытай Номаканон, гэта значыць, правіла сёмага Сабору). Спачатку тая валадарка Ірына асьляпіла свайго сына Канстанціна, загадаўшы, каб яму вынялі вочы. А потым ён матку ў зьневаленьне саслаў. Ды, урэшце, і сам ён, бязьдзетны, згінуў, пасьля чаго і валадарства адыйшло да іншага народу (пра гэта пішуць Платына ды Эгнацы).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што абяцае Бог тым, хто выявам ня кланяецца ды іх не ставарае?

**АДКАЗ**

Як парушальнікаў Бог карае і вечнымі, і часовымі пакутамі, так, зноў жа, тым, хто спаўняе гэтае прыказаньне, Бог і тут дабром плаціць, і потым абяцае жыцьцё вечнае. За ўзор маем Эзэкію ды Ёсію, валадароў Юдэі, якіх Бог ад усіх ворагаў моцна бараніў, бо яны гэтае прыказаньне выконвалі, усіх балваноў зьнішчаючы. Нават таго медзянога зьмея, створанага Майсеем паводле Божага загаду (Лічбы 21), калі людзі пачалі яму маліцца, пабожны валадар Эзэкія зьнішчыў, хаця той зьмей быў вобразам Сына Божага Госпада нашага Ісуса Хрыста.

Пра гэтага Эзэкію так Дух Сьвяты напісаў: «І паклаў ён надзею ў Госпадзе, Богу Ізраэля, і падобнага да яго не было між усіх валадароў Юды як пасьля яго, так і перад ім» (2 Валад. 18). Гэтаксама і пра Ёсію напісана, што перад ім не было такога валадара, які б так навярнуўся да Госпада (2 Валад. 23).

А гэта дзеля таго Дух Сьвяты напісаў, каб валадары, князі ды іншыя начальнікі ведалі, што іхні абавязак – усякіх балваноў ды фальшывыя пакланеньні зьнішчаць ды выкараняць. Такія начальнікі па ўсіх Беларускіх землях зараз вельмі пільна патрэбныя, бо ідалаў ды ўсялякіх балваноў за некалькі соцень гадоў тут так намножылася, што за імі люд паспаліты на Бога забыўся. Але пра гэта іншым разам падрабязьней напішам.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары трэцяе прыказаньне.

**АДКАЗ**

«Не гавары імя Госпада, Бога твайго, легкадумна або надарэмна».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко тое маю розумети?

**ОТКАЗЪ**

Яко у первом слове далъ намъ Богъ науку, якое маеть быти нашое сердце, а въ второмъ слове, яко и теломъ Ему Самому служити вси повинни, тако у томъ третиемъ слове навчаеть насъ, яко языка своего маемъ къ чти Его вживати. То есть, абы есмо под заслоною имени Божіего нашое славы, пожитку и иныхъ таковых речей не искали. А Его Самого абы есмо славили, взывали и благодарили.

**ПЫТАНЬЕ**

Которые суть добрые дела того приказанья, которые чинити маемъ?

**ОТКАЗЪ**

Напервей естъ взывание, другое – благодареніе или дякованье. Третее – выславленіе. Четвертое – исповеданіе. Пятое – навчаніе правды. Шостое – клятвы або присягы захованье. Тые суть добрие дела третиего слова.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко маемъ Бога възывати?

**ОТКАЗЪ**

Взывати Бога никто не можеть естъли бы первей не позналъ Сына Его, иже естъ единый ходотай нашъ Богу Отцу. Бо егда человекъ хочеть призывати Бога, за того жь ему на память приходить недостойность его, а совесть или сумненье знаючи до себе грехи, не смееть уповати на Бога, и того для Его не призываеть.

Прото потреба ведати, иже до насъ Богъ ласкавъ и милостивъ Христа деля, и для Него грехи отпушчаеть и молитвы наши слышить. Той бо естъ нашъ единый ерей, который з насъ недостойныхъ чинить достойными и Богу любыми.

**ПЫТАНЬЕ**

Которые суть дела противу тому приказанью Божіему?

**ОТКАЗЪ**

Напервей — не призывати Бога часу потребы и не благодарити Его (1).

Призывати на помочь святыхъ вже усопъшихъ и оныхъ ходотаими чинити предъ Богомъ (2).

Ложное ученіе сеяти и того боронити, а правое учение гудити, хулити и затирати (3).

Непобожные службы Богу собою постановляти или от иного кого вымышленые держати (4).

Правого ученіа не исповедати, наболей въ время гонениа (5).

Евангелиа святого не учити, кто бы на тое избранъ (6).

Часу незгоды въ Церкъви правды не съзнати, естли бы на кого залежало (7).

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэта маю разумець?

**АДКАЗ**

Як у першым слове даў нам Бог навуку, якім мае быць нашае сэрца, а ў другім слове – як целам Яму Самому служыць усе павінны, так у гэтым трэцім слове Ён вучыць нас языком нашым Яго шанаваць. Значыць, каб мы пад заслонаю імя Божага не шукалі нашае славы, прыбытку ды падобнага, але каб Яго Самога славілі, клікалі ды Яму дзякавалі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія добрыя справы маем рабіць паводле гэтага прыказаньня?

**АДКАЗ**

Першая – прызываньне, другая – дзякаваньне, трэцяя – праслаўленьне, чацьвёртая – вызнаньне, пятая – навучаньне праўдзе, шостая – захаваньне клятвы або прысягі. Гэта добрыя ўчынкі паводле трэцяга слова.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як маем Бога прызываць?

**АДКАЗ**

Прызываць Бога ніхто ня можа, калі перш не спазнае Ягонага Сына, адзінага нашага Заступніка перад Богам Айцом. Бо калі чалавек хоча прызываць Бога, з-за таго, што прыходзіць яму на памяць ягоная недасканаласьць ды сумленьне нагадвае пра грахі, не асьмельваецца ён спадзявацца на Бога і Яго не прызывае.

Таму трэба ведаць, што Бог мае да нас ласку і міласэрнасьць дзеля Хрыста, і дзеля Яго прабачае нам грахі і чуе нашыя малітвы. Хрыстос бо – наш адзіны Сьвятар, які нас, нявартых, робіць вартымі і Богу любымі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ёсьць учынкі супраць гэтага прыказаньня Божага?

**АДКАЗ**

Першае – не прызываць Бога ў час патрэбы і ня дзякаваць Яму.

Другое – прызываць у дапамогу сьвятых, што памерлі, ды рабіць іх заступнікамі перад Богам.

Трэцяе – фальшывае вучэньне сеяць ды яго бараніць, а праўдзівае вучэньне ганьбіць, зьнеслаўляць ды зьнішчаць.

Чацьвёртае – блюзьнерскія пакланеньні Богу самім пастанаўляць або кімсьці іншым выдуманых пакланеньняў трымацца.

Пятае – праўдзівае вучэньне не вызнаваць, асабліва падчас перасьледу.

Шостае – Сьвятому Эвангельлю не вучыць, калі хтосьці на гэта абраны.

Тежь всякіе хулы на Бога суть противу того приказанья (8). Яко естъ слова Епикуреи, ими же нечестивіи осмевають Бога и Слово Его за басьни осужають. Тежь ругания противу Бога, яко слова фараона, Равсака и фарісей на Христа и на Его Апостолы (Исход 5, 4 Цар. 18, Матф. 12, Іоан 12).

Ешче слова, которими розслабляется вера в немошчныхъ и меншееть Божіа слава (9).

Тежь и они тяжко грешать, которыи словъ Божественныхъ от Писма Нового или Ветхого Завета ко блазеньству вживають (10).

Тежь чародейници и чародейнице, ведьмы и ворожбиты противу того слова грешать, хотя жь пакъ часомъ на ихъ шептанье люди и скотъ здоровы бывають (11).

Ешче противу того приказанья суть кривые клятвы або присяги. Бо таковый человекъ именемъ Божіемъ покриваеть грехи свои (12). А к тому поневажь, кто кленеться сведъкомъ собе призываеть Бога, прото будеть ли клятися криво, обидить славу Божію, бо хочеть, абы Бог его неправде посведъчилъ. А ешче кроме того, кто ся криво кленеть за малую речь судъ Божій собе маеть. Бо кленется, абы его Богъ скаралъ, естъли бы неправду говорилъ, а самъ ведаетъ, иже неправду кажеть, а предся гневу Божіего на себе призываеть, а потому знати, иже его ничимъ ставить. Бо естли бы ся гнева Божіего боялъ, ино бы его противу себе не призывалъ. Прото, иже такъ много греховъ естъ въ кривой клятве, повиненъ каждый стеречи себе пильно, абы клятвамъ не повыкалъ.

На остатокъ противу тому третиему слову суть злореченья и проклианья (13). Бо кто проклинаеть, призываеть Бога противу Его приказанья, абы человека скаралъ, которого Богъ любити велелъ. Яко той грехъ есть великъ, обачишь, естли и гараздъ вырозумеешь, иже не можеть быти самъ одинъ, але и иные грехи с собою тягнеть.

Напервей, кто проклинаеть, не маеть въ учтивости Бога, бо поменити Бога естъ Его призывати. Богъ пакъ маеть быти съ страхомъ и з великою учтивостию призыванъ. Лечь проклинанья бывають ляда с причины, часомъ напрасно, часомъ и зъ гневу, безъ страха Божія и учтивости Его.

Надъ то, не маеть Бога никто призывати, абы кому шкодилъ, а кто проклинаеть, для того Бога въспоминаеть, абы зашкодилъ оному, кого злоречить. Лечь Богъ всехъ любити велелъ. Пророки ачь неколи проклинають и злоречать, но только хульником и нечистивымъ, иже истинное ученіе и правдивую службу непрестанно гонили. Лечь мы таковаго проклинанья в обычай брати не маемъ.

Кто бы тежь кому своимъ житиемъ або норовы взоръ къ злому подалъ, або от веры правой отвелъ, той противу тому второму слову грешить.

**ПЫТАНЬЕ**

Годить ли ся человеку Хрістианьскому присягати, чи ли не?

Сёмае – падчас нязгоды ў Царкве праўды ня вызнаць, калі б ад некага гэта залежала.

Таксама ўсякае зьнеслаўленьне Бога парушае гэтае прыказаньне, як, напрыклад, выслоўі эпікурэйцаў, якімі бязбожнікі кпяць з Госпада, уважаючы Ягонае Слова за глупства. Таксама лаянка на Бога, як словы фараона, Рабсака, фарысэяў на Хрыста ды на Ягоных Апосталаў (Выхад 5, 2 Валад. 18, Мц. 12, Ян 12). Яшчэ словы, якія ў нямоглых веру аслабляюць ды зьмяншаюць славу Божую. Таксама і тыя цяжка грашаць, што ўжываюць дзеля блюзьнерства Божае Слова са Старога ці з Новага Запавету.

Таксама чарадзеі і чарадзейкі, вядзьмаркі і варажбіты грашаць супраць гэтага прыказаньня, хаця часам ад іх шаптаньня людзі ды жывёла здаравеюць.

Яшчэ парушаюць гэтае прыказаньне фальшывыя клятвы або прысягі, бо тады чалавек імем Божым прыкрывае свае грахі. Да таго ж той, хто прысягае, прызывае сабе ў сьведку Бога, таму, прысягаючы фальшыва, ён абражае Божую славу, хочучы, каб Бог пацьвердзіў ягоную няпраўду. Акрамя таго чалавек, які прысягае фальшыва, за нішто ўважае суд Божы. Бо прысягае, каб яго скараў Бог, калі ён няпраўду скажа, а сам ведае, што гаворыць няпраўду, аднак усё роўна гнеў Божы на сябе кліча. Відочна, што такі чалавек за нішто Божы гнеў лічыць, бо калі б яго баяўся, тады б яго на сябе ня клікаў. Калі ж так шмат грашыць той, хто прысягае хлусьліва, павінен кожны пільна сьцерагчыся, каб не прызвычайвацца прысягаць.

Нарэшце, парушаюць гэтае трэцяе слова зламоўнасьць ды праклёны. Бо хто праклінае, той прызывае Бога, каб, насуперак Ягонаму прыказаньню, пакараў чалавека, якога Ён загадаў любіць. Наколькі гэта вялікі грэх убачыш, калі добра зразумееш, што ён не здараецца адзін, але іншыя грахі за сабой цягне.

Найперш той, хто кляне, не шануе Бога, бо ўзгадаць імя Божае — азначае прызваць Бога, а прызываць Бога трэба са страхам ды зь вялікаю пашанай. Праклёны ж здараюцца без прычыны: часам – ні за што, часам – з гневу, бяз страху Божага ды шанаваньня Бога.

Да таго ж ніхто ня мае прызываць Бога, каб Ён некаму нашкодзіў. Той жа, хто кляне, дзеля таго Бога ўспамінае, каб Бог нашкодзіў чалавеку, якога зламовіць. Бог жа загадаў усіх любіць. Прарокі, хаця і пракліналі ды зламовілі, але толькі ганьбоўшчыкаў ды бязбожнікаў, якія безупынку перасьледвалі сапраўдную навуку ды служэньне. Аднак мы такія праклёны ня можам браць сабе за звычай.

Хто б таксама жыцьцём сваім або норавам даў камусьці благі ўзор або ад веры праўдзівай зьвёў, той супраць гэтага другога слова грашыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці належыць Хрысьціяніну прысягаць ці не?

**ОТКАЗЪ**

Вже есм поведелъ, иже ся того каждый стеречи маеть, абы клятися не привыкал, але естли бы шло о славу Божію, маеть хрістианинъ клятися именемъ Божием.

Яко учинилъ Апостолъ Павелъ, который въ второмъ посланью къ Коринфомъ кленется тако: «Сведетеля нарицаю Бога на душю мою» (2 Кор. 1: 21-2: 3). По тому жь и Авраамъ клялъся пред царемъ Содомскимъ, иже не мелъ взяти ничого з маетности его, которую былъ отнялъ, побивши пяти царей, которыи завоевали были Содомъ (Быт. 14). Ешче тежь годиться присягнути христианину, которому бы у праве о великую речь присягу присужоно, яко Апостолъ къ Евреомъ пишеть (6:13-20), иже всякому прекословію конецъ клятва. Лечь тое для малыхъ речей быти не маеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Если ся годить присягати Хрістианину, для чого жь Самъ Хрістос заказуеть клястися и небомъ, и землею, и Іеросолимомъ?

**ОТКАЗЪ**

Не только в тыхъ словехъ Хрістовыхъ, где клятися заказуеть, множество людей, ачь пакъ и учоныхъ, омыляеться, але и всее оное речы, которую Хрістос на горе о Законе учинилъ, не розумеютъ. Бо вси посполите тако оную речъ толъкуют, яко бы Хрістос Ветхаго Закона заповеди на сторону откладалъ, а Свои новые заповеди законилъ. Лечь Хрістос противу тому домниманью вельми ясне там же поведелъ, иже не пришолъ разорити Закона (Матф. 5:17). Часто теже мовилъ, иже съ Отцомъ едино ест (Іоан 10: 30). А о Своей науце поведелъ тако: «Мое оученіе несть Мое, но пославшего Мя» (Іоан 7: 16). С которых слов велми явна речь, иже Хрістос ани отставлялъ, ани отменялъ Закона Божіего, але только противу лживымъ толковником вырозуменье правое указалъ.

Прото жь кто бы такъ розумелъ о Хрісте, яко бы всякой клятвы боронил, где поведелъ не клятися отнюд, чинилъ бы таковый Сына Божіего Отцу противного, чого и помышляти Боже не дай. А яко бо Хрістос едино съ Отцом будеть, естли бы оные заповеди отнялъ, которые Богъ предалъ? Закон Божій тако о клятве пишеть: «Господа Бога своего бойся и Тому единому да служиши, и именемъ ся Его да кленеши» (Втор. Зак. 6). А Хрістос рече: «Не пріидох розорити Закона», ино каждый вже розумети можеть, иже клятва, если бы для Божіей славы, або помочи ближного, або очишченья себе, ест речь слушнаа, только бы справедливаа.

А ижь Хрістос клятвы не допушчаеть, для тое причины тако учинилъ, иже на онъ часъ жидове повыкли были клятвамъ на некоторые створенья, за грех того не маючы, бо только кривую клятву за грехъ мели. То пакъ Хрістос указуеть, иже не одно несправедливаа клятва на Бога, але и справедливаа, хотя на створеные речи, если бы не потребнаа, ест грехъ пред Богомъ. А не ест тое слово Хрістово противу

**АДКАЗ**

Ужо я распавёў, што кожны мае сьцерагчыся, каб не прызвычаіцца прысягаць, але калі ідзе пра славу Божую, то мае Хрысьціянін прысягаць імем Божым. Так зрабіў Апостал Паўла, які ў другім лісьце да Карынцянаў так прысягае: «Дык прызываю на сьведку Бога на душу маю» (2 Кар. 1:23). Гэтаксама і Абрагам прысягаў перад валадаром Садомскім, што ня меўся браць анічога з маёмасьці, захопленай ім пасьля перамогі над пяцьцю валадарамі, якія напалі на Садом (Роду 14).

Таксама належыць прысягаць Хрысьціяніну — калі яму суд пастановіць — наконт важнай справы, бо Апостал да Гебраяў піша, што кожная спрэчка канчаецца прысягай (Гебр. 6:16). Аднак дзеля справаў малых прысягаць не належыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі мажліва прысягаць Хрысьціяніну, чаму Сам Хрыстос забараняе прысягаць і небам, і зямлёй, і Ерузалімам?

**АДКАЗ**

Мноства людзей, нават і вучоных, ня толькі памыляецца наконт гэтых словаў Хрыста, калі Ён забараняе прысягаць, але і не разумее ўсёй той навукі пра Закон, якую Хрыстос на гары аб'явіў. Бо ўсе звычайна так гэта тлумачаць: нібыта Хрыстос прыказаньні Старога Закону скасаваў, а Свае новыя прыказаньні сьцьвердзіў. Але Хрыстос супраць гэтага меркаваньня вельмі ясна тамсама сказаў, што Ён не прыйшоў скасаваць Закон (Мц. 5:17). Часта Ён таксама мовіў, што Ён з Айцом – адно (Ян 10: 30), а пра Сваю навуку Ён так гаварыў: «Мая навука не Мая, але Таго, Хто Мяне паслаў» (Ян 7: 16).

З гэтых словаў ясна, што Хрыстос ані адстаўляў, ані адмяняў Закону Божага, але толькі, насуперак фальшывым тлумачальнікам, паказаў праўдзівае разуменьне. Дзеля гэтага той, хто мяркуе, што Хрыстос забараніў усякую прысягу, калі казаў зусім не прысягаць, робіць Сына ворагам Айцу, – ад адной такой думкі Божа барані! А як бо Хрыстос будзе адно з Айцом, калі Ён скасаваў тыя прыказаньні, што даў Бог? Закон Божы так пра прысягу піша: «Госпада, Бога твайго, бойся, і Яму служы, і Ягоным імем прысягай» (Паўт. Зак. 6). А Хрыстос сказаў: «Я не прыйшоў скасаваць Закон», таму кожны ўжо можа зразумець, што прысяга дзеля славы Божай, або дзеля дапамогі бліжняму, або дзеля свайго апраўданьня – справа слушная, няхай толькі будзе праўдзівай.

А што Хрыстос прысягаць не дазваляе, робіць тое не без прычыны: у тыя часы юдэі так прызвычаіліся прысягаць рознымі стварэньнямі, што ўжо не лічылі гэта за грэх, бо мелі за грэх толькі прысягу фальшывую. Значыць, Хрыстос паказвае, што ня толькі фальшывая прысяга імем Божым, але і праўдзівая прысяга нейкім стварэньнем, калі без патрэбы складзеная, – грэх перад Богам. Не супярэчаць Закону Божаму тыя словы Хрыста. Бо і Закон у тым трэцім слове гэта заба-

Закона Божіего, бо и Законъ у томъ третиемъ слове того жь боронить, где рече: «Не возмешь имени Господа Бога твоего», але прикладаеть «вотшче», абы кто клятвы въ малую речь не ставилъ.

А такъ годиться Хрістианину, естли бы иначей быти не могло, клятвы, або яко тепер зовутъ, присягы вживати, яко для славы Божіей, тако естли бы у праве слушне была сказана. Для славы Божіей присягнулъ Авраамъ, Павелъ и иншіи. А о той, которую право судить, въ Исходе тако написано: «Ашче кто дасть другу сребро или съсуд заховати, и оукрадеть ся из дому мужа того, и обряшчеть ся украдый, да тяжыт сугубъ, ашче ли не обряшчеться тать, да придеть господин дому пред судьи, и да ся кленеть, яко самъ не скористовалъ» (Исход 22).

Ту явне видишь, яко не только Богъ клятися допушчаеть, але часу потребы и повелеваеть.

**ПЫТАНЬЕ**

На чие имя маеть быти присяга?

**ОТКАЗЪ**

Вошло было теперешнего веку в обычай людемъ, ижь не только именемъ Самого Бога, але тежь именемъ пречистой Сына Божіего матки и иных святыхъ клялися, лечь той обычай не только естъ злый, але и нечестивый. Ест бо клятва призыванье Самого Бога на сведительство, яко Который вси речи ведаеть (Ісаіа 63). Лечь поневаж святій не ведають, што ся с нами деетъ, для того не ест речь пристойнаа призывати оных на сведетство.

К тому, клятва естъ служба або поклон Богу, естли ест справедливаа. Служба пакъ Божіа ест Его слава. Прото кто на святыхъ присягаеть, тотъ славу Божію от Бога отбераеть и оную святымъ, то ест, твари, отдаеть. Противу чому Самъ Богъ у пророка Ісаіи тако рече: «Славы Моея иному не дам, ни добродетели Моея истуканнымъ» (Ісаіа 42). А тако, не маеть никто иначей присягати, только на имя Божіе. Яко написано: «Господа Бога твоего бойся и Тому единому да служиши, и именем ся Его да кленеши» (Втор. Зак. 6).

**ПЫТАНЬЕ**

Што маеть пред собою мети человекъ, коли присягаеть? Бо некоторие меваютъ образ, на который руку кладуть або и целують.

**ОТКАЗЪ**

Ачь тотъ былъ обычай сих теперешных часов, иже кто присягалъ, клалъ руку на образъ, а потомъ и целовалъ, нижели мы, христиане, не повинни есмо оных обычаевъ держати, которие соуть противу Слову Божіему или противу обычаем угодниковъ Божіихъ. Прото и въ присяганью маютъ христиане той обычай заховати, который або Самъ Богъ указалъ, або святіи заховали.

То пакъ Святое Писмо клятву або присягу Самого Бога або коего святого выписуючи, часто воздвиженіе рукъ припоминаеть, а часомъ

раняе, калі кажа: «Не гавары імя Госпада, Бога твайго» і далучае: «надарэмна», каб хто не палічыў прысягу за справу няважную.

А калі так, належыць Хрысьціяніну, калі інакш быць ня можа, клясьціся, або, як цяпер кажуць, прысягаць, як дзеля славы Божай, так і на судзе, калі прысягае хто слушна. Дзеля славы Божай прысягнуў Абрагам, Паўла ды іншыя. А пра прысягу, пастаноўленую судом, у кнізе «Выхад» так напісана: «Калі б хто даў другому грошы або каштоўныя рэчы на захаваньне, і яны б былі скрадзеныя ў доме таго чалавека, калі злодзей будзе выяўлены, павінен выплаціць падвойнае адшкадаваньне. Калі б ня выяўлена злодзея, то тады той гаспадар дому стане перад Богам і прысягне, што ня выцягнуў рукі на дабро бліжняга свайго» (Вых. 22).

Тут ясна бачыш, што Бог ня толькі прысягаць дазваляе, але і падчас патрэбы прысягаць загадвае.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чыім імем трэба прысягаць?

**АДКАЗ**

Увайшло ў цяперашнія часы сярод людзей у звычай ня толькі імем Самога Бога, але таксама імем прачыстай маці Божай ды імем іншых сьвятых прысягаць. Аднак гэты звычай ня толькі памылковы, але і бязбожны, бо прысяга – гэта кліканьне ў сьведкі Самога Бога, Які ўсе справы ведае (Іс. 63). Паколькі сьвятыя ня ведаюць, што з намі робіцца, то і прызываць іх у сьведкі – ганебная справа. Да таго ж прысяга, калі складзена справядліва, – гэта служэньне або пакланеньне Богу. А паслужыць Богу – значыць Яго праславіць.

Дзеля гэтага той, хто сьвятымі прысягае, славу Божую ў Бога забірае ды сьвятым, гэта значыць стварэньням, яе аддае. Супраць гэтага Сам Бог у прарока Ісаі так казаў: «Я – Госпад: гэта імя Маё; і славы Маёй не аддам другому, і хвалы Маёй – ідалам» (Іс. 42). А калі так, ня мае ніхто прысягаць інакш, як толькі імем Божым, бо напісана: «Госпада, Бога твайго, бойся і Яму служы, і Ягоным імем прысягай» (Паўт. Зак. 6).

**ПЫТАНЬНЕ**

Перад чым мае чалавек прысягаць? Бо некаторыя прысягаюць перад абразом, на які руку кладуць, або абраз той цалуюць.

**АДКАЗ**

Хаця ў цяперашнія часы ёсьць гэты звычай – прысягаючы, класьці руку на абраз, а потым абраз цалаваць – аднак мы, хрысьціяне, не павінны трымацца тых звычаяў, якія супярэчаць Божаму Слову або звычаям сьвятых Божых. Дзеля таго і ў прысязе маюць хрысьціяне той звычай захаваць, які або Сам Бог паказаў, або сьвятыя захавалі.

Сьвятое ж Пісьмо, распавядаючы пра клятву або прысягу Самога Бога ці якога-небудзь сьвятога, часта ўзгадвае ўздыманьне рукі, а часам саму прысягу заве ўздыманьнем рукі. Напрыклад, у Эзэкіля Бог

клятву возъдвиженіемъ рукъ зоветь. Яко у Езекіила Богъ рече: «Глаголахъ к дому Ізраилеву в пустыни, разлиати ярость Свою на ня в пустыни, яко потребити я, и сътворих, якожь паче всего, да ся имя Мое не осквернявит пред странами, изъ них же изведох я пред очима ихъ. Того деля воздвигох руку Мою на ня в пустыни, да бых не въвелъ ихъ до земли, ю же дах имъ» (Езек. 20).

Што рече: «Въздвигох руку Мою на ня», тако ся розумееть, яко бы реклъ: «Заклялъся есмъ». По тому жь в песни Моисееве Бог рече: «Воздвигну на небо руку Мою и кленуся десницею Моею». Зде значится, иже клянушчіися мели тотъ обычай подняти въ небо руку. Тако Авраамъ клялъся царю Содомъскому. Бо егда у него царь просилъ людей, а иные вси речи, которые былъ от чотырехъ Царей отнялъ, взяти ему велелъ, Авраамъ рече: «Воздвигаю руку мою къ Господу Богу вышному, владеюшчему небомъ и землею, яко не возму». Где говорить: «Воздвигаю руку мою», тако ся розуметь, яко бы реклъ: «Кленуся». А к тому с тых словъ значиться, иже кто ся клялъ, руку в небо взносилъ.

А не толико таков взор у Старомъ Завете ест описанъ, но и въ Откровенью святого Іоанна о томъ обычаю тако написано: «Ангелъ, его же видех стояшча на морю и на земли, воздвиже руку свою къ небу и клял ся живомъ въ веки векомъ» (Поясну жь и у Дан. 12).

Обачи жь а паметоуй обычай, который Святое Писмо и Нового и Старого Завета похваляеть. Не знайдешь бо ни на одномъ месте, абы на образы, або на што иного кленушчіися руки клали, але е въ небо возносили. Прото и тепер не годиться иных обычаевъ вымышляти.

**ПЫТАНЬЕ**

Што о томъ розумеешь, естлибы кто присягнулъ што учинити, а потомъ бы обачилъ, иже онаа речь есть противу Слова Божіего, маеть ли той для присягы оную речь деломъ исполнити, чи ли не маеть?

**ОТКАЗЪ**

Кто з необаченья або и нарокомъ обецуеть што неслушного учинити, а потом ся каеть и не чинить, хотя молбою обецалъ, той единою только согрешилъ. Лечь кто для слюбу або клятвы, боячися ее нарюшити, противу Закона чинить, того согрешенье не ест просто, але вже двояко. Бо ачь написано: «Помолитеся и воздадите Господеви» (Псалом 75), але тое розумети маемъ о побожныхъ молитвахъ, а не о безбожныхъ.

О сихъ бо на иномъ месте тако пишетъ: «Богъ не хотяй безакониа ты еси» (Псалом 5). Безаконие есть всякаа речь, которую противу Закона Божіа чинишь, того, кажеть, Богъ не хочеть. А иже безакониа Богъ не хочеть, чого деля ты безаконие чинити маешь? На взорь маемъ Ирода царя, который клялъся Иродиадиной дочце дати о што бы просила (Матф. 14: 1-13), а егда, научена от от матки, просила головы святого Предтечи и Крестителя Іоанна (Марк 6: 14-30), прошю, што мелъ учинити Иродъ? Мелъ ли клятве досытъ чинити?

кажа: «Дык Я сказаў, што вылью гнеў Мой на іх у пустыні, каб іх зьнішчыць. Зрабіў аднак іначай, каб імя Маё не было зьняважана перад народамі, бо Я вывеў іх на вачах іхніх. Але падняў Я руку Маю супраць іх у пустыні, што ня ўвяду іх у зямлю, якую даў ім» (Эз. 20).

Калі Бог гаворыць: «Падняў Я руку Маю супраць іх», — тое самае гэта значыць, што і калі б Ён сказаў: «Прысягнуў». Гэтаксама ў песьні Майсея Бог казаў: «Падыму Я аж да неба руку Маю і прысягну правіцай Маёй». Тут гэта значыць, што той, хто прысягаў, меў звычай падымаць руку ў неба. Так Абрагам прысягаў валадару Садомы. Бо калі валадар прасіў у яго людзей, а іншую ўсю маёмасьць, якую ён забраў у чатырох валадароў, загадаў сабе ўзяць, Абрагам адказаў: «Падымаю руку маю да Госпада, Бога майго Ўзвышняга, Творцы неба і зямлі, што не вазьму». Дзе кажа: «Падымаю руку маю»,— тое ж самае гэта значыць, што і калі б ён сказаў: «Прысягаю». І з гэтых словаў вынікае, што той, хто прысягаў, падымаў руку ў неба.

Ды ня толькі ў Старым Запавеце такі ўзор прыведзены, але і ў Адкрыцьці сьвятога Яна пра гэты звычай так напісана: «І Анёл, якога я бачыў стаячага на моры і на зямлі, падняў руку сваю ў неба і прысягнуў на Жывучага на вякі вечныя» (таксама кніга Данііла, разьдзел 12).

Разгледзь жа ды памятай звычай, які ўхваляе Сьвятое Пісьмо Новага ды Старога Запавету. Ня знойдзеш бо там аніводнага ўзору, каб на абразы або нешта іншае падчас прысягі рукі ўскладалі, але ў неба іх падымалі. Дзеля гэтага і зараз нявартa іншых звычаяў выдумляць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ты мяркуеш пра чалавека, які прысягнуў што-небудзь зрабіць, а потым убачыў, што тая справа супярэчыць Слову Божаму? Ці мае ён дзеля прысягі зрабіць тое, пра што прысягаў, ці ня мае?

**АДКАЗ**

Хто ненаўмысна або і наўмысна абяцае зрабіць штосьці няслушнае, а потым каецца ды ня робіць, хоць прысягаючы абяцаў, той саграшыў толькі аднойчы. Аднак той, хто, дзеля дамовы або дзеля прысягі, баючыся іх парушыць, чыніць супраць Божага Закону, той грашыць не адзін раз, а двойчы. Бо хаця і напісана: «Складайце прырачэньні і спаўняйце іх перад Госпадам Богам вашым» (Пс. 75), але гэта маем разумець пра прырачэньні пабожныя, а не бязбожныя.

Пра бязбожныя бо ў іншым мейсцы так напісана: «Бо Ты не такі Бог, Якому падабалася б беззаконьне» (Пс. 5). Беззаконьне — гэта кожная справа, якую ты робіш супраць Божага Закону і якая не падабаецца Богу. А калі беззаконьне Богу недаспадобы, дзеля чаго ты маеш чыніць беззаконьне? За ўзор маем валадара Герода, які прысягнуў дачцэ Герадыяды, што дасьць ёй ўсё, пра што б ні запытала (Мц. 14: 7). А тая, навучаная маткай, прасіла галавы сьвятога Прадвесьніка і Хрысьціцеля Яна (Мк. 6: 24). Пытаюся: што меў рабіць Герод? Ці меў ён выканаць тое, пра што прысягаў?

Домнимаю, яко нетъ того, кто бы не бачилъ, иже лепшей было Ироду не одну клятву, але и колько их зрушити, нежели святому человеку одну якую кривду учинити, не только животъ отняти. Прото и теперь всякой клятвы нечестивой не маеть никто выполъняти, але того сердечьне жаловати, хочетъ ли въ следъ Ирода не ити.

За нечестивые пакъ клятвы оные почитати маемъ, которие суть або противу Божіа славы, або своего спасеніа, або ближного любви.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко деръжишь о иноцехъ или о девственицехъ, которые молбою обешчають девъство ховати даже къ смерти?

**ОТКАЗЪ**

О девстве не годится зле розумети, понеже Апостолъ пишетъ, яко добро человеку жене не прикоснутися, и к тому рече: «Мню сее», — разумей девство, — «потребно быти за настояшчую нужду» (1 Кор. 7: 24-35). И Самъ Христос похваляеть каженики, иже сами себе казять Царствія Небеснаго ради (Матф. 19: 3-15). А таков былъ Иліа, Іоаннъ и прочіи.

Лечь ся надобе стеречи, абы есмо теперешных Иноковъ Мниховъ и всехъ, которые чорною ризою девство показують, з оными давными не ровнали. Бо въ иншый обычай перви они девицами были, нежели теперешніи. Сихъ бо держяться великие блуды, наболей три. Первый блудъ их ест, иже в томъ девстве не хотять жити тако свободне, але аже ся молбою обешчавши. Того нигде Хрістос не повелелъ. Іоаннъ у девстве жилъ, але ся о немъ не пишеть, абы тое за мольбою чинилъ, по тому же Иліа. Апостолъ много пишеть о девахъ и юношах, але негде жь имъ не повелеваеть обешчатися на весь живот тако жити, но паче ясне пишеть, иже можеть дева замужь ити, а не съгрешить. Тако бо рече: «Ашче посагнеть дева, не съгрешила естъ».

Лечь теперешніи девственники тако розумеють, иже кто бы от них, молбу отставивши, бракъ принялъ, той Іуды предателя горшый ест. Но боятися имъ потреба, абы не от оныхъ числа были, о которых къ Тімофею тако Апостолъ пишеть: «Духъ же речію глаголеть, яко въ последныя времена отступять неціи от веры, вънимаюшче доухом льстивым и ученіем бесовским, въ лицемеріи ложъ говоряшчим, соженомъ своею съвестію, възбранеюшчимъ женитися, и свенитися брашенъ, яже Богъ создана снеденіе съ благодареніемъ вернымъ и познавшіимъ истину».

Возри пилно в тые слова Святого Духа, а обачишь, о комъ ся розумеють. Явне бо оных отступники зоветь, которыи возбраняють женитися, тое пакъ возбраненіе ученіем бесовскымъ нарицаеть. Едали ся тое межи теперешныхъ девственниковъ не найдуеть? Прото потреба ся таковых остерегати, яко и Апостолъ повелеваеть, тако къ Коласаем пишучи: «Никоторыи же вас да не бес правды даеть, хотя смиреномудріемъ и въ службе аггельстей, яже не виде оуча» и прочая. Зде остерегаеть Апостолъ Коласа-

Мяркую, няма такога, хто б ня бачыў, што лепей было б Героду не адну, а некалькі прысягаў парушыць, чым сьвятому чалавеку найменшую крыўду ўчыніць, ня тое што жыцьця пазбавіць. Дзеля гэтага і зараз ніхто ня мае ня толькі выконваць бязбожную прысягу, але і нават у сэрцы таго выкананьня жадаць, калі ня хоча пайсьці ўслед за Геродам.

За бязбожныя маем уважаць прысягі, што супраць Божай славы, асабістага збаўленьня або любові да бліжняга.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што мяркуеш пра манахаў або цнатліўцаў, якія склалі прырачэньне, абяцаўшы захаваць дзявоцтва аж да сьмерці?

**АДКАЗ**

Пра дзявоцтва не належыць блага меркаваць, бо Апостал піша, што добра чалавеку не кранацца жанчыны, і да таго далучае: «Лічу гэта (значыць, дзявоцтва) за лепшае дзеля надыходзячых патрэбаў» (1 Кар. 7: 26). Ды Сам Хрыстос ухваляе эўнухаў, якія самі сябе выпакладалі дзеля Валадарства Нябеснага (Мц. 19: 12). Гэтакімі былі Ільля, Ян ды іншыя.

Але трэба нам сьцерагчыся, каб цяперашніх манахаў ды усіх, хто носіць чорныя шаты на знак дзявоцтва, з тымі даўнімі не раўняць. Бо іншым звычаем тыя першыя дзявоцтва захоўвалі, чым цяперашнія, што жывуць у трох вялікіх грахах. Перш грашаць яны тым, што не жадаюць у дзявоцтве жыць свабодна, але складаюць у малітве абяцаньне. Гэтага нідзе Хрыстос не пастанаўляў. Ян у дзявоцтве жыў, але пра яго не напісана, што ён склаў у малітве гэтае абяцаньне. Гэтаксама і Ільля. Апостал шмат піша пра цнатлівых дзяўчын ды юнакоў, але нідзе ім не загадвае, каб яны абяцалі ўсё жыцьцё так пражыць, наадварот, ён ясна піша, што дзяўчына можа замуж ісьці, і не саграшыць. Так бо сказаў: «Дзяўчына, калі ідзе замуж, не грашыць».

Аднак жа цяперашнія цнатліўцы так мяркуюць: калі нехта зь іх, скасаваўшы сваё абяцаньне, шлюб прыйме, той будзе горшы за здрадніка Юду. Але баяцца ім патрэбна, каб не апынуліся ў ліку тых, пра якіх Апостал да Цімахвея гэтак піша: «Дух вось адкрыта кажа, што ў апошнія часы некаторыя адступяцца ад веры і прыхіляцца да духаў спакусы і да навук д'яблавых праз тых, хто крывадушна падманвае і з заплямленым сумленьнем забараняе жаніцца, загадвае ўстрымлівацца ад страваў, якія стварыў Бог для ежы веруючым і тым, якія пазналі праўду, каб дзякавалі Богу».

Пільна ўгледзься ў гэтыя словы Сьвятога Духа ды ўбачыш, пра каго яны кажуць. Бо відочна, што Ён называе адступнікамі тых, хто забараняе жаніцца, а забарону такую называе «д'яблавай навукай». Няўжо ня знойдзецца гэтага пасярод цяперашніх цнатліўцаў? Таму і трэба іх засьцерагчы, як Апостал загадвае, да Калосцаў пішучы: «Ніхто хай не пазбавіць вас нагароды, маючы ўпадабаньне ў прыніжэньні сябе і кульце анёлаў, зьвяртаючы ўвагу на тое, што ня бачыў...» і гэтак да-

евъ, абы ся прельстити не дали, ани смиреномудріемъ или покорою, ани службою аггельскою, то есть девствомъ. Яко и теперь черънество ангельскимъ образомъ зовуть.

Не много о томъ говорячи, стережися каждый тое сети, у которой діаболъ многих половилъ. Добраа речь ест девство, кому бы той даръ Богъ милостивый далъ, але не надобе его обешчати, но свободне в нимъ Богу служити, яко есмъ на взорь указалъ Іоанна крестителя. Той не обецуючи девъство заховалъ. Есть бо велико небеспеченьство обешчати Богу, наболей чого кто не маеть въ своей власти. Не иначей тіи чинять, они же девство Богу обецують, але ровне яко естъли бы кто клялъся николи не спати або не ести. А што бы тое было, хыба кусити Бога? Чого намъ Самъ Богъ заказуеть, мовячи: «Не исъкусиши Господа Бога твоего» (Втор. Зак. 6).

Искушаешь каждый Бога, кто ся над Его приказанье и над свою силу чого догадываеть а на себе кладеть. Яко тые нинешніи девъственици чинять, забывши, што Давыд рече: «Волею пожру тобе» (Псалом 53), неволею пожрети Богу хотять. За малое ся им видить доброволне пребывати у девъстве, аже мольбою тое овешчають. Але яко тое исполняють, не надобе выписовати, понеже вси о томъ ведають. Мне ся тако видить, иж бы не всемъ кривъду онъ учинилъ, кто бы оную речь Апостола Павла на них привелъ, которую о языцехъ къ Римляномъ пишеть тако: «Предасть их Богъ въ вся похоти сердца их, в нечистотоу, досажати в телесехь их в собе» и прочая.

Прото мнимаю, иже не омылилъся есм, назвавши таковыя обешчаніа сетью діавольскою, ею же многых вже половилъ и дотуле ловить. Напервей бо къ тому их приводить, абы обецали, а потом абы боячися обетницы отменити, въ всякой нечистоте жили, а того бы за грехъ не личили. А затым удвои способъ грешять. Наперед, иже девство обецують, которого имъ Богъ не далъ, ани обетовати велелъ, у другое пакъ грешять, яко обешчаніа своего не исполняють, но паче вместо девъства нечистоту творять. А не розумей абых тое собою говорилъ або вымыслилъ, бо ани бы ся того чинити годило, ани я самъ хочю. Лечь тое все от Божественного Писаніа пріимую.

Обачь бо, естъли не по тому жь и Апостолъ о девстве розумееть, ижь потреба ся стеречи, абы намъ не было силомъ або сетию. Бо где выхваляеть не ожененіе, на концы приложилъ тако: «Се же к ползе вам глаголю, не да сило вамъ наложу» (1 Кор. 7: 24-35). Припатрися тому, што Апостолъ рече, прошу тебе, пилно. Бо ачь не мовить просто: «Не обецуй девства», але ся тако розумееть. Нижли тако для того не рече, ижь ешче не было таковыхъ обетниць, яковые потомъ не борздо настали. Ачь былы обешчаніа или молбы, але по Закону, то есть жидовъские, не хрістианьские. Того для Апостолъ або, радъней, Духъ Святый, не мольбою, ани обешчаніемъ, але силомъ назвалъ и рече: «К ползе вамъ глаголю, не да сило вамъ наложу». Яко бы тако написалъ: «Добра речь есть девство, але маеть быти безъ сила», то есть маетъ быти по доброй воли, не по молбе или обетованію.

лей. Засьцерагае тут Апостал Калосцаў, каб не спакусіліся ані прыніжэньнем сябе ці пакораю, ані службай анёльскаю, значыць, дзявоцтвам. Бо і зараз манаства называюць анёльскім вобразам.

Каб не гаварыць шмат, няхай кожны сьцеражэцца гэтай пасткі, у якую д'ябал многіх злавіў. Добрая справа – дзявоцтва, калі міласьцівы Бог гэты дар камусьці даў, толькі ня трэба яго абяцаць, але трэба свабодна ў ім Богу служыць, як бачым на прыкладзе Яна Хрысьціцеля – той без прысягі дзявоцтва захаваў. Вельмі бо небясьпечна абяцаць нешта Богу, асабліва тое, чаго ня маеш у сваёй уладзе. Таму і абяцаць Богу дзявоцтва – усё роўна, што абяцаць ніколі ня спаць або ніколі ня есьці. Што ж гэта такое, як не спакушэньне Бога, якое Ён Сам нам забараняе, кажучы: «Не спакушай Госпада, Бога твайго» (Паўт. Зак. 6).

Спакушае Бога кожны, хто да Яго прыказаньня па-над сваю сілу нешта прыдумляе ды на сябе ўскладае. Так цяперашнія цнатліўцы робяць, забыўшыся, што Давід казаў: «Дабравольна прынясу ахвяру Табе» (Пс. 53), і хочуць прынесьці Богу ахвяру пад прымусам. За малое ім здаецца дабраахвотна дзявоцтва захоўваць, дык яны прысягі складаюць, але як іх спаўняюць, ня трэба і пісаць, бо ўсе пра гэта ведаюць. Здаецца мне, мала хто зь іх пакрыўдзіцца, пачуўшы словы Апостала Паўлы пра паганаў, калі ён да Рымлянаў так піша: «Дзеля таго аддаў іх Бог у пажаданьнях сэрцаў іхніх нячыстасьці, каб між сабою паганілі цела сваё...» і так далей.

Таму, мяркую, я не памыліўся, назваўшы такія абяцаньні пасткай д'ябла-вай: шмат каго ён ужо так злавіў ды і дагэтуль ловіць. Найперш бо да таго іх прыводзіць, каб паабяцалі, а потым каб, баючыся абяцаньні свае скасаваць, ва ўсялякай нячыстасьці жылі ды за грэх гэтага не лічылі. Такім чынам двойчы яны грашаць. Першы раз грашаць, бо абяцаюць дзявоцтва, якога ім Бог не даваў ды абяцаць не загадваў. Другі раз грашаць, бо абяцаньні свае не выконваюць, але наадварот, замест дзявоцтва ў нячыстасьці жывуць. Не падумай, што я гэта ад самога сябе гаварыў або сам выдумаў, нягожа было б так рабіць, ды і сам я таго не хачу, але ўсё гэта з Божага Слова прыймаю.

Разгледзь бо, ці не гэтаксама і Апостал пра дзявоцтва мяркуе, што трэба сьцерагчыся, каб ня сталася нам пасткаю? Бо дзе ўхваляе дзявоцтва, напрыканцы далучае: «Кажу гэта на вашу карысьць, а не каб паставіць вам пастку» (1 Кар. 7). Прыглядзься, прашу цябе, пільна да таго, што сказаў Апостал. Бо хаця не гаворыць ён проста: «Не абяцай дзявоцтва»,— але мае гэта на ўвазе. Аднак ён так не сказаў, бо яшчэ не складалі тады такіх абяцаньняў, якія потым, значна пазьней, зьявіліся. Хаця і былі абяцаньні або прырачэньні, але паводле Закону, гэта значыць, юдэйскія, а не хрысьціянскія. Таму і Апостал (а больш дакладней – Дух Сьвяты) не прырачэньнем або абяцаньнем, але пасткай гэта назваў ды сказаў: «Кажу на вашу карысьць, а не дзеля таго, каб паставіць вам пастку». Быццам бы так напісаў: «Добрая справа – дзявоцтва, але няхай будзе без прымусу»,— значыць, свабодна, а не паводле прырачэньня або абяцаньня.

Прото и Христос не силою повелеваеть быти каженикомъ, але кто можеть. Тако бо рече: «Могый вместити, да въместить» (Матф. 19: 3-15). Ныне же не потому каженици держять, але просто, хотя жь иный того дарю не маеть, предся овешчаеть, а потомъ, яко бы не обешчавши, живеть и в тое сило упадаеть, и естъли ся не покаеть, певъне мучонъ будеть. Бо ачь тому людие не верують, але Слово Божіе мимо ити не можеть, которое сведъчить, иже не пустить Господь оного безъ каранья, который бы взялъ имя Его напрасно. О томъ же Соломон пишеть, яко многымъ лепшей не обешчати, нежели, обешчавши, не исполнити (Екл. 5). Але вже доволино о симъ блуде первомъ.

Другый есть не меншый, яко не у тотъ обычай девствують, у которыі бы мели, але иже ся для того живота вечного надевають. Если бы тое надежи о девъстве не имели, за того жь бы просторнейшие монастыри были, сами бы ся тольки они, имъ же Богъ чрево, зостали. Але обачмы, откуле тое мниманье взяли. Напервей приводять, што Хрістос о каженикax поведелъ, иже казять ся Царствіа Божіа ради. Которые слова такъ розумеють, яко бы Хрістос оных каженикoвъ похвалялъ, которые ся казять для того, абы Царствіе Небесное взяли.

Лечь таковое розуменье естъ и шкодливое и ложъное. Не того ту Хрістос розумееть, ани тых каженикoвъ похваляеть, которіе бы ся для того каженикaми учинили, абы небо за тое зыскали, але ся тые слова тако розумеють, иже они каженици Царствіа Божіа деля казяться, которіе бы ради тому Царству служили и оное ширили. Царство Божіе розумей: Святое Евангелие или науку Хрістовую, для того Царства добрая речь быти каженикомъ. То естъ не брати жены, абы такъ готовшый былъ на всякое дело, которое бы тому Царствоу было полезно. Для того Іоанъ креститель, для того Иліа и прочіи казилися, то естъ безъ жонъ жили. Не для того, абы собе небо одержели. Иншое бо речы надобе къ одержанью неба, или вечного живота, нежели девства.

Але, недалеко речы отступуючи, девъство естъ даръ Божій вельми пожиточный, но не къ оправданію, яко мнихи домнимають, ани ко оставленію хрехомъ, но абы человекъ былъ волнейшый и готовъшый къ всякому доброму делу, яко есмь вже поведелъ. Посведчаеть ми того Апостолъ Павел, где о девстве тако къ Корінфяном советуеть: «Мню се», — розумей «девство»,— «добро быти за настояшчую нужу, яко добро человеку тако быти» (1 Кор. 7: 24-34), то естъ безъ жены. Ясна речь, иже сими словы Апостолъ выхваляеть девство. Рече бо: «Добро человеку тако быти», але и тое явно, иже и причину кладеть, для которое девъство добро: «За настоящую,— кажеть,— нужу».

Пилно паметуй, иже не рече: «Грехом отпушченіа деля», або про вечьный животъ, але за настояшчую нужу, або яко по просту значней сказати можемо: «Про настояшчю потребу». Настояшчю потребою зоветь, которая вже яко бы над нами стоить, а за того жь пріходить, яко бы реклъ, для трудностей, которие над нами всегды стоять. Сами

Дзеля гэтага і Хрыстос загадвае не паводле прымусу быць эўнухам, але паводле здольнасьці, так бо сказаў: «Хто можа зразумець, няхай зразумее» (Мц. 19:12). Зараз жа манахі гэтага не трымаюцца, але, хаця некаторыя ня маюць такога дару, усё адно абяцаюць, а пасьля жывуць як і не абяцаўшы ды ў тую пастку трапляюць. І калі не пакаюцца, пэўна будуць пакараныя. Бо хаця людзі гэтаму ня вераць, але Слова Божае іх абмінуць ня можа, а яно сьведчыць, што не пакіне Госпад без пакараньня таго, хто возьме імя Ягонае надарэмна. Ды і Салямон на гэты конт піша, што шмат каму лепш не абяцаць, чым, абяцаўшы, ня выканаць (Экл. 5). Ды ўжо хопіць пра гэты грэх першы.

Другі грэх ня меншы, бо ня тым звычаем яны ў дзявоцтве жывуць, як бы належала, але дзеля надзеі на жыцьцё вечнае. Калі б яны ня мелі такой надзеі на дзявоцтва, то свабаднейшыя былі б кляштары, адно засталіся б там тыя, якім бог – іхняе чэрава. Але пабачым, адкуль узялося такое меркаваньне. Найперш яны прыводзяць словы, што Хрыстос сказаў пра эўнухаў, якія самі сябе выпакладалі дзеля Валадарства Божага. Гэтыя словы яны разумеюць так, нібыта Хрыстос ухваляў тых эўнухаў, што выпакладаюць сябе, каб насьледаваць Валадарства Божае.

Аднак такое разуменьне і шкоднае, і памылковае. Ня гэта Хрыстос тут мяркуе, ды не ўхваляе Ён эўнухаў, якія зрабілі сябе такімі, каб неба заслужыць. Гэтыя словы азначаюць, што тыя эўнухі дзеля Валадарства Божага сябе выпакладаюць, якія гэтаму Валадарству служаць ды яго пашыраюць. Валадарства ж Божае разумей як Сьвятое Эвангельле, або навуку Хрыстову, дзеля гэтага Валадарства добра быць эўнухам. Значыць, ня браць жонкі, каб так быць больш падрыхтаваным да ўсякай справы, карыснай гэтаму Валадарству. Дзеля гэтага Ян Хрысьціцель, дзеля гэтага Ільля ды іншыя сябе выпакладалі, — значыць, жылі бяз жонак. Не дзеля таго, каб здабыць сабе неба. Іншыя бо рэчы, а не дзявоцтва, патрэбны, каб здабыць неба, або жыцьцё вечнае.

Але каб не адыйсьці далёка ад нашай размовы, дзявоцтва – дар Божы вельмі карысны, але не дзеля апраўданьня, як мяркуюць манахі, ані дзеля прабачэньня грахоў, але дзеля таго, каб чалавек быў больш падрыхтаваны да ўсякай добрай справы, як ужо я казаў. Пацьвярджае маю думку Апостал Паўла, калі пра дзявоцтва так Карынцянам радзіць: «Лічу гэта (значыць, дзявоцтва), за лепшае дзеля надыходзячых патрэбаў, бо добра так застацца жыць чалавеку» (1 Кар. 7: 26). Гэта значыць, бяз жонкі. Відочная справа, што гэтымі словамі Апостал ухваляе дзявоцтва, кажа бо: «Добра чалавеку так застацца»,— ды і яскрава паказвае прычыну, дзеля якой дзявоцтва – на даброо: «Дзеля надыходзячых, – кажа, – патрэбаў».

Пільна памятай, што не сказаў Апостал: «Дзеля прабачэньня грахоў» або: «Дзеля жыцьця вечнага», але: «Дзеля надыходзячых патрэбаў», ці можам сказаць больш зразумела: «Дзеля сапраўдных патрэбаў». Сапраўднай Апостал заве тую патрэбу, што ўжо ёсьць перад намі

бо видимы, ижь жонатому далеко трудней бываеть, коли на него приходять гоненіе и всякие скорбы, или клопоты, нежели неженивому. Бо той от всего того свободенъ. Прото Апостолъ о жонатыхъ рече, яко скорбъ плотію имети начнуть таковыи (1 Кор. 7: 24-34). Опять, о нежонатыхъ там же пишеть, яко пекуться о речахъ Господнихъ. Тая ест мзда за девство, а не иная.

Третій блудъ теперешных мниховъ естъ, яко о девъстве розумеють, абы оное предъ Богомъ достойнейшое за бракъ, або за женитву было. И того для оное слово Хрістово о семени падшемъ на добрую землю, (где мовить, яко обо приносить плод сторицею, обо шестдесятный, обо тридесятный) тако толкують, плод сторицею девствоу приписуючи а шестидесятный плод и тридцатый женитве (чти у толъковых Евангеліахъ слово 34). Лечъ ся на томъ велми омыляють. Не о девьстве бо тамо Христос притчю поведелъ, але о Слове Своимъ, даючи знати, яко не въ всехъ пожитку чинить. Аже если на добрую землю, то есть на доброе сердце падеть, хотя жь онъ человекъ белецъ, хотя жь чернецъ, который, принявши таковое семя, чинить плод або пожитокъ о ономъ семени, то естъ о Божіимъ Слове. Бо таковый не только самъ станеться побожный, але и иных къ побожности потягнеть, на болей домъ свой. А иже одинъ большей притягаеть людей, нежели другый, для того Хрістос розные плоды положилъ.

Або и тако розумети можемь, коли кто тело свое мертвить, абы въ нимъ не было каменья, тернья и штокольвекъ семя Божественно давить, выкореняеть, тогды плод приносить. То пакъ не вси заровно такового тернія позбывають, але одинъ большей за другого, того для поведаеть Хрістос, яко ово семя сторычный плод чинить, ово шестдесятный, ово пакъ и тридесятный. Да вед же и тое знаменуй, яко Хрістос не земли плод приписуеть, але семеню. Бо не рече: «Добра земля принесе плод», але рече: «Семя, падшее на добрую землю, творить и приносить плод», абы кто собе не приписалъ, если у собе знайдеть што доброго, але абы ведалъ, яко всяко даяніе благо и всякъ даръ съверъшенъ съвыше ест, сходя от Отца светомъ, яко Іаковъ пишеть (Іак. 1:1-12).

Прото блудять и в томъ иноци, яко домнимають, абы их девство вышшаа речь пред Богомъ была, нежели ожененіе. А если ся имъ тако видить, иже не блоудять, ино бы тое нехай Словом Божіимъ показали. Лечь они того не приняли от Слова Божіего, но от ума телесного. Пишеть убо Апостолъ Павелъ, яко ест разнаа речь дева а жена, але абы тая розница пред Богомъ место мела, далъ знати о васъ бес печали быти. Кто бы ся тако заховалъ, не завадила бы ему жона.

Але нехай на том доволно будеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ оных караеть, которие напротивъ тое заповеди чинять?

і прыходзіць дзеля цяжкасьцяў, якія нам заўсёды супрацьстаяць. Самі бо бачым, што жанатаму значна цяжэй бывае, чым нежанатаму, калі прыходзяць на яго перасьледаваньні ды ўсялякія клопаты. Бо нежанаты ад усяго гэтага вольны. Таму і Апостал пра жанатых сказаў, што такія будуць мець клопаты зь целам (1 Кар. 7: 28), зноў жа, пра нежанатых там жа піша, што рупяцца пра справы Госпада. Такая вось ёсьць узнагарода дзявоцтва, а ня іншая.

Трэці грэх цяперашніх манахаў у тым, што яны разумеюць дзявоцтва перад Богам больш дасканалым за шлюб, або сужонства. І дзеля гэтага так тлумачаць тое слова Хрыстова пра насеньне, што ўпала на ўрадлівую зямлю ды прынесла плён або стакротны, або шасьцідзесяцікротны, або трыццацікротны: плён стакротны дзявоцтву прыпісваюць, а плён шасьцідзесяцікротны ды трыццацікротны – сужонству (чытай у тлумачэньні Эвангельляў верш 34). Але вельмі ў гэтым яны памыляюцца. Не пра дзявоцтва бо Хрыстос сказаў гэтую прыповесьць, але пра Сваё Слова, даючы знаць, што не ва ўсіх яно плён прыносіць. Калі ва ўрадлівую зямлю, гэта значыць, у добрае сэрца яно трапляе, чалавек, прыняўшы такое насеньне, – ці то ён у сужонстве, ці то ён у дзявоцтве, – прыносіць плён або прыбытак гэтага насеньня, значыць, Божага Слова. Бо такі чалавек ня толькі сам пабожным стане, але і іншых да пабожнасьці прывядзе, перадусім дом свой. А паколькі адзін болей людзей здабывае, чым другі, дзеля гэтага Хрыстос казаў пра розны плён.

Яшчэ і так можам гэтае слова разумець: калі хто цела сваё мярцьвіць, каб у ім не было каменьня, церня, ды выкараняе ўсё, што заглушае ў ім Божае насеньне, тады такі чалавек прыносіць плён. Паколькі ж ня ўсе аднолькава тое церне выкараняюць, але адны болей за другіх, дзеля таго сказаў Хрыстос, што тое насеньне прыносіць прыбытак або стакротны, або шасьцідзесяцікротны, або і трыццацікротны. Ды і на тое зважай, што Хрыстос не зямлі плён прыпісывае, але насеньню, бо не сказаў: «Урадлівая зямля прынесла плён», але сказаў: «Насеньне, што ўпала на ўрадлівую зямлю, дало і прынесла плён»,— каб ніхто, знайшоўшы ў сабе штосьці добрае, сабе яго не прыпісаў, але каб ведаў, што, як кажа Якуб, усякае дабро ды ўсякі дар дасканалы з гары ад Айца сьвятла паходзіць (Як. 1: 17).

Таму грашаць манахі, калі мяркуюць, што іхняе дзявоцтва перад Богам больш дасканалае за сужонства. А калі ім здаецца, што яны не грашаць, то няхай гэта Словам Божым дакажуць. Аднак прынялі яны гэта не ад Слова Божага, але ад розуму цялеснага. Піша бо Апостал Паўла, што розная справа – дзяўчына і замужняя жанчына, – але дае ён ведаць пра тую розніцу перад Богам, каб жыць нам бяз смутку. Хто сябе так захавае, то не зашкодзіць такому жонка.

Але спынімся на гэтым.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае тых, хто парушае гэтае прыказаньне?

**ОТКАЗЪ**

В Законе Моисеевомъ велелъ былъ Богъ таковых каменьемъ оубивати. И тако учинили одному сынови жены Ізраильския, его же съ Египтяниномъ мела. Той бо сынъ, посварившися з другомъ, хулилъ имя Господне и повелелъ его Господь убити. А не только того одного, але и всем, которые бы ся того допустили, по тому жь чинити велелъ (Левіт 24). Прото на урядъ належить, абы таковыхъ каралъ. А хотя жь пакъ уряд не скараеть, предся Самъ Богъ карати певне обецалъ. Бо тако к тому Слову придалъ: «Не очистить от греха Богъ того, который береть имя Господа Бога своего надармо».

А не розумей собе того только о клятве або о присязе, але и о всякомъ имени Божіего недостойномъ призываню. К тому кто бы блюзнилъ или проклиналъ, не минеть его помста. Мусить таковъ каран быти и зде, на сим свете, и потомъ на оном, яко и сами на око видимы, иже ся никому не минаеть, кто бы Слово Божіе або имя Его гудилъ, або под нимъ не правду твердилъ.

О Рапсаце, царя Асирского воеводе, написано, яко имя Господа Бога смеле хулилъ, которого часу Іеросолимъ былъ облеглъ, але тое жь ночи окрутне скаранъ, тако иже одинъ ангелъ от оного войска убилъ сто тисечей и осмъдесятъ тисечей и пять тисечей мужей (4 Цар. 18,19).

О Керинфе Еретице пишють, яко, заставши его Іоаннъ Богослов у отмывальни, а ведаючи, яко Сына Божіего хульникъ естъ, не хотелъ ся тамо мыти, но ко своимъ рече: «Бежемо вонъ, да не згинемо съ Керинфомъ, истине врагомъ» (Евсев, в треіихъ книгах глав. 28). И пишють, яко за того жь, егда вышолъ Іоаннъ, упала отмывальня и убила Керинфа.

Не лепшое мелъ доконанье потомъ Арій, тежь Еретикъ, который противу Божеству Хрістову блюзнилъ, того для доконанье Іудино принялъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што Богъ обецалъ тымъ, которие бы имени Его з верою а потребне призывали?

**ОТКАЗЪ**

Обецалъ таковых николи не отпустити, выслухати, ратовати, съ ними быти и всехъ бедъ избавити. О чомъ часто и въ псалмехъ Духъ Святый споминаеть. Яко въ псалме 49: «Призови Мя въ день печали твоей и збавлю тя». По тому жь в псальме 144 написано, яко «близъ ест Господь всемъ призываюшчимъ Его, всем призываюшчимъ Его въ истине».

И везде таковые обетницы у Святомъ Писмени знайдешь. А не только обетницы, але и скутекъ самый обачишь, яко Богъ на призыванье имени Своего великие чюда и сылы творилъ, а Своихъ верныхъ боронилъ и избавлялъ. Призывалъ Моисей — а розступило ся море. Призывалъ Ісоусъ Навинъ — и стануло солнце. Призывалъ Самоиль — а голосъ былъ съ небес слышанъ. Призывалъ Иліа — а огонь спалъ из неба. И многие иншие речи опушчаю.

**АДКАЗ**

У Майсеевым Законе загадаў Бог гэтакіх каменьнем забіваць. І так зрабілі з адным сынам жанчыны Ізраэльскае ды Эгіпцяніна. Той бо сын, пасварыўшыся зь сябрам, зьнеслаўляў імя Госпада, і Госпад загадаў яго забіць (Сьвят. 24). Ды ня толькі зь ім адным, але з усімі, хто падобнага дапусьціцца, Бог загадаў гэтаксама зрабіць. Дзеля гэтага абавязак ураду – такіх людзей караць. А калі не пакарае іх урад, усё адно Сам Бог пэўна абяцаў пакараць, бо так у тым слове Ён сказаў: «Не даруе грэху Бог тым, хто імя Госпада, Бога свайго, надарэмна бярэ».

Дык мяркуй так ня толькі пра клятву або прысягу, але і пра кожнае дарэмнае прызываньне імя Божага. Таксама і таго, хто блюзьніць ці кляне, помста не абмінае: мусіць быць такі чалавек пакараны і тут, у гэтым жыцьці, і ў жыцьці будучым. Бо і самі на свае вочы бачым, што не даруе Бог тым, хто Слова Божае або імя Ягонае зьнеслаўляе, або пад заслонаю Божага імя кажа няпраўду.

Пра Рабсака, ваяводу валадара Асырыйскага, напісана, што ён аблажыў Ерузалім ды дзёрзка зьнеслаўляў імя Госпада Бога, але у тую ж ноч быў ён жорстка скараны: Анёл забіў сто восемдзесят пяць тысяч мужоў зь ягонага войска (2 Валад. 18, 19).

Пра герэтыка Керынфа пішуць, што Ян Багаслоў, сустрэўшы яго ў купальні ды ведаючы, што ён блюзьніць на імя Божае, не захацеў тамака мыцца, але сказаў сваім вучням: «Бяжым адсюль, каб ня згінуць нам разам з Керынфам, ворагам праўды!» (Яўсеві, 3 кніга царкоўных дзеяў, разьдзел 28). Ды пішуць, як толькі Ян выйшаў, купальня абвалілася ды забіла Керынфа.

Ня лепш скончыў Арый, таксама герэтык, які блюзьніў на Боскасьць Хрыста, дзеля чаго напаткаў яго лёс Юды.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што Бог абяцаў тым, хто прызывае імя Ягонае зь верай ды ў час належны?

**АДКАЗ**

Абяцаў Ён такіх ніколі не пакідаць, выслухоўваць, ратаваць, зь імі быць ды з усіх няшчасьцяў іх вызваліць. Пра гэта часта ў Псальмах Дух Сьвяты ўзгадвае, як, напрыклад, у псальме сорак дзевятым: «А тады кліч мяне ў дзень бяды, і Я абараню цябе». Гэтаксама і ў псальме сто сорак чацьвёртым напісана: «Госпад блізкі тым, што клічуць Яго, усім, якія прызываюць Яго шчыра».

Ды паўсюль ў Сьвятым Пісьме такія абяцаньні знойдзеш. І ня толькі абяцаньні, але і сам вынік убачыш, як Бог на прызываньне імя Ягонага рабіў вялкія цуды і моц аб'яўляў, Сваіх верных абараняў ды выратоўваў. Прызываў Яго Майсей – і расступілася мора. Прызываў Ісус Навін – і спынілася сонца. Прызываў Самуэль – і стаў чуцен голас зь неба. Прызываў Ільля – і зыйшоў зь неба агонь. А многія іншыя прыклады ня ўзгадваю.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори четветую заповедь Господню.

**ОТКАЗЪ**

Четвертую заповедь тако Богъ написалъ: «Помни, абы есь день суботный святилъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся то слово «святити» розумееть?

**ОТКАЗЪ**

Святити розумеется не прожновати просто, яко посполите розумеють, але на святые дела отдати.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи доводней, абых розумелъ причину: лепшей ли Богъ любить порожнованье за роботу?

**ОТКАЗЪ**

Не у тотъ обычай Богъ седмый день святити велелъ, абы роботы не рад виделъ, а прожнованье любилъ, поневажь на Адама тотъ законъ, высылаючи его з рая, взложилъ, абы у поте лица своего елъ хлебъ свой, и землю бы делалъ по вся дни живота своего (Быт. 3). Але абы мелъ человекъ певный день, которого бы ся Слова Божіего оучилъ и святыми бы ся речми бавилъ. И того для у томъ Слове не тако спроста празновати повелеваеть, ани знага делати заказуеть, але святити той день велить.

«Святити» пакъ не розумееться прожновати или ничого не творити, але святые дела чинити. А дела святыя оны суть, котория Богъ чинити велелъ, яко Слова Господня слухати, милостину давати, Богу ся молити и прочая. Прото не боронить Богъ на тотъ день святыхъ делъ делати, але только мирскихъ або светьских, дочасных, а того живота. А опять велить нам чинити святые дела, яко есм вже поведелъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми, естли и хрістіане повинни седьмый день святити, а к тому ешче для чого неделю святять, а не суботу?

**ОТКАЗЪ**

Кто вырозумееть, для чого Богъ людемъ Ізраилевымъ суботу святити велелъ, онъ теже снадне вырозумети можеть, яко хрістіане слободни от седмого дня, а яко ему повинни. Ино находимъ у Святомъ Писмени чотыри вины, для которихъ суботу Богъ святити велелъ. Первая причина, абы сътворенье света припоминали. О той причине Моисей тако пишеть: «Въ шести бо днехъ сотворилъ Богъ небо и землю, море и вся, еже в нихъ суть, и отпочинул в день седмый» (Исход 20). Яко бы реклъ тако: «Помни день суботный святити, бо в шести днех сътворилъ Богъ весь светъ, абы есь того не забылъ».

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажы чацьвёртае прыказаньне Госпада.

**АДКАЗ**

Чацьвёртае прыказаньне Бог так напісаў: «Памятай, каб сьвяткаваць дзень суботні».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што значыць гэтае слова «сьвяткаваць»?

**АДКАЗ**

«Сьвяткаваць» не азначае «час марнаваць», як гэта звычайна разумеюць, але азначае «на сьвятыя справы час аддаць».

**ПЫТАНЬНЕ**

Растлумач больш пераканаўча, каб я зразумеў прычыну: хіба Бог больш за работу любіць гультайства?

**АДКАЗ**

Не дзеля таго загадаў Бог сьвяткаваць сёмы дзень, што Ён любіць гультайства, а працы ня рады, бо, высылаючы Адама з Эдэму, даў яму закон, каб у поце твару свайго еў хлеб свой ды працаваў на зямлі ва-ўсе дні жыцьця свайго (Роду 3); але дзеля таго, каб меў чалавек пэўны дзень, у які б вучыўся Слову Божаму ды займаўся сьвятымі справамі. Таму ў гэтым слове Бог загадвае ня так проста гэты дзень марнаваць ды ўвогуле анічога не рабіць, але загадвае гэты дзень сьвяткаваць.

А «сьвяткаваць» азначае ня час марнаваць або анічога не рабіць, але сьвятыя справы чыніць. Справы ж сьвятыя ёсьць тыя, што Бог загадаў рабіць, напрыклад, Слова Божае слухаць, міласьціну даваць, Богу маліцца ды іншыя. Вось чаму ў гэты дзень Бог забараняе рабіць не справы сьвятыя, а толькі справы мірскія, або сьвецкія, мінаючыя, уласьцівыя гэтаму жыцьцю. Ды, зноў жа, загадвае нам рабіць справы сьвятыя, як ужо я і казаў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы мне, ці павінны Хрысьціяне сёмы дзень сьвяціць? Ды яшчэ: дзеля чаго яны нядзелю сьвяцяць, а не суботу?

**АДКАЗ**

Хто зразумее, дзеля чаго Бог загадаў Ізраэльскаму народу сьвяткаваць суботу, той лацьвей можа зразумець, у чым хрысьціяне ад сёмага дня вольныя, а ў чым яго павінны спаўняць. Бо знаходзім у Старым Запавеце чатыры прычыны, дзеля якіх Бог загадаў суботу сьвяціць. Першая прычына – каб узгадваць стварэньне сусьвету. Пра гэтую прычыну Майсей так піша: «Бо ў шасьці днях стварыў Госпад неба і зямлю, і мора ды ўсё, што на іх ёсьць, і супачыў у сёмы дзень» (Вых. 20), нібы так ён хацеў сказаць: «Памятай, каб дзень суботні сьвяткаваць ды не забыцца, што за шэсьць дзён Бог стварыў увесь сьвет».

Другая причина, абы онъ людъ мел тайну или образъ отпочиненья духовного. То есть, субота знаменовала, иже вси потребуемъ, абы насъ Богъ посвятилъ и до вечного отпочиненья принялъ. Тую причину далъ знати Моисей у Исходе где пишеть, яко Богъ рече: «Видьте да суботы Моя соблюдете, понеже знамя естъ межи Мною и вами в родехъ вашихъ, да разумеете, яко Азъ есмъ Господь освешчаяй васъ» и прочая (Исход 31). Тую жь таки причину и Езекиіль широко выписуеть у 20 главе, межи иными словы пишеть, яко Богъ рече: «Суботы Моя дах имъ, яко ж быти въ знаменіе межю Мною и межю ими, яко жь разумети им, яко Азъ Господь освешчая и». Яко Моисей, тако Езекіилъ кажють, иже для того Богъ далъ былъ суботу и святити ю велелъ, абы розумели, яко освятитися от Бога потребовали.

Третяа причина, абы онъ людъ мелъ опричьный день, которого бы Закон розбералъ и иншие святые речи делалъ. О томъ и Лука в Деаніахъ Апостолъских споминаеть, яко Моисей чтеться по вся суботы. Четверая причина естъ, абы неволником и неволницамъ, и скотом было отпочиненье. О тоя причине Моисей написалъ тако: «Шесть дней делати будешь, седмаго же дня престанеши, да отпочинеть волъ и оселъ твой и да отдыхнеть сынъ рабы твоея и пришлецъ, иже есть у тебе».

Вже тепер погледи до тыхъ причинъ, а самъ собою вырозумеешь, яко повинни есмо тому слову, а яко не повинни. Бо водле некоторихъ причинъ вже свободные есмо от седмого дня, а водле иншихъ причинъ потреба, абы и хрістіане мели опричьный день, которого бы святили. Вторую причину поведелъ есмъ на тотъ обычай, иже для того людемъ Ізраилевым велел Богъ суботу святити, абы ихъ упоминала а на память приводила, иже имъ надобе освешченья и покоя, або ижь потреба, абы ихъ Богъ освятилъ и въ отпочиненье принял.

По той причине свободни есмо от всехъ празниковъ и суботъ. Бо всемъ образом и стеньемъ конецъ принесъ и учинилъ Христос. А кто бы у тотъ обычай суботу або неделю святилъ, не добре бы чинилъ и противу бы Хріста іоудействовалъ. Тотъ бо обычай празнованья Христос вже отнял и Апостоли отставили, яко Павелъ Коласаемъ пишеть: «Да никто васъ осужаеть о яденіи, или о питии, или о части праздника, или о новомесяцах, или о суботахъ, еже суть стень грядушчимъ, тело же Христово» (Кол. 2:13-19).

Пилъно обачъ, яко празники, суботы, брашна и таковая стенемъ называеть, то есть образомъ, а Хріста теломъ зоветь. Даючи знати, иже оные суботы толико образовалы або значилы пришлые речи, а до того часу мелы быти, докуле бы вже не стень, але самая правда пришла, которую теломъ зоветь. А прото не мають хрістіане у тотъ обычай никаких празников мети, але вси дни за празники мають личити, яко Ісаіа пророчествовалъ, где рече: «И будеть новомесецъ от новомесяца и субота от субботы» (Ісаіа 66), ачь тое по вскрешеніи достаточней ся збудеть.

Другая прычына – каб людзі мелі знак або вобраз адпачынку духоўнага, бо субота азначае, што ўсе мы патрабуем, каб Бог нас асьвяціў ды прыняў у вечны адпачынак. Пра гэтую прычыну Майсей паведаміў у кнізе Выхаду, калі напісаў: «І сказаў Госпад: "Глядзіце, каб вы захоўвалі суботу Маю, бо гэта знак паміж Мною і вамі для ўсіх пакаленьняў вашых, каб па гэтым можна было пазнаць, што Я – Госпад, Каторы асьвячае вас"» (Вых. 31). Пра гэтую ж прычыну Эзэкіль падрабязна распавядае ў дваццатай главе, дзе паміж іншым піша, як Госпад сказаў: «І даў ім суботы Мае, каб былі знакам паміж Мною і імі, каб ведалі, што Я – Госпад, Каторы іх асьвячае». Як Майсей, так і Эзэкіль гаворыць, што дзеля таго Бог даў нам суботу ды яе загадаў сьвяткаваць, каб мы зразумелі, што нам патрэбна Божае асьвячэньне.

Трэцяя прычына – каб людзі мелі асобны дзень, у які б вывучалі Закон ды іншыя сьвятыя справы рабілі. Лука ў Дзеях Апостальскіх узгадвае, што Закон Майсеяў чытаецца кожную суботу. Чацьвёртая прычына – каб нявольнікам ды нявольніцам, і жывёле быў адпачынак. Пра гэтую прычыну Майсей так напісаў: «Шэсьць дзён будзеш працаваць, а ў сёмым дні – субота Госпада. Не рабі ў ім ніякай працы, хай адпачне вол твой ды асёл твой, хай аддыхне сын нявольніцы тваёй і чужынец, які прабывае ў брамах тваіх».

Вось цяпер паглядзі на гэтыя прычыны і сам зразумееш, што мы павінны рабіць паводле гэтага слова, а што не павінны. Бо паводле адных прычынаў мы ўжо вольныя ад сёмага дня, а паводле іншых прычынаў патрэбна, каб і Хрысьціяне мелі асобны дзень, які б сьвяткавалі. Другую прычыну я паведаміў таму, што Бог загадаў народу ізраэльскаму сьвяткаваць суботу, каб яна ім нагадвала ды на памяць прыводзіла, што ім патрэбныя асьвячэньне ды адпачынак, або што яны патрабуюць, каб Бог іх асьвяціў ды ў Свой адпачынак прыняў.

Паводле гэтай прычыны вольныя мы ад усіх сьвятаў ды субот, бо ўсім знакам ды вобразам канец прынёс ды ўчыніў Хрыстос. А хто такім звычаем суботу або нядзелю сьвяткуе, нядобра робіць ды супраць Хрыста юдэйствуе. Такі бо звычай сьвяткаваньня Хрыстос скасаваў, і Апосталы гэты звычай пакінулі, як Паўла да Калосцаў піша: «Дык хай ніхто вас не асуджае за яду або пітво, або з прычыны дня сьвяточнага або маладзіка, ці суботы, каторыя ёсьць ценем будучага, цела ж – Хрыстовае» (Кал. 2: 16-17).

Паглядзі ўважліва: сьвяты, суботы, ежу ды падобнае Апостал называе ценем, значыць, вобразам, а Хрыста ён заве целам, даючы знаць, што гэтыя суботы азначалі рэчы мінаючыя ды былі датуль, пакуль ужо ня цень, а сама праўда прыйшла, якую ён целам заве. А таму не павінны Хрысьціяне тым звычаем аніякіх сьвятаў мець, але ўсе дні за сьвятыя мусяць лічыць, як Ісая прарочыў, калі казаў: «І будзе: кожнага месяца ў час маладзіку і кожнага тыдня ў суботу прыйдзе кожны чалавек, каб пакланіцца Мне, – кажа Госпад» (Іс. 66), але гэта пасьля ўваскрашэньня ў поўні збудзецца.

Обачивъши тую причину, обачи и иншие причины, для которихъ празники Богъ поставилъ. То есть, абы былъ опричный день, которого бы ся людие ко слуханью Слова Божіего съхажали, а семья бы неволная и скотъ отпочивали. Водле тыхъ причинъ мусить бытии певный день у хрістіан. Бо и Хрістос собератися Своимъ велить, и о Апостолехъ читамы, яко ся къ слуханью Слова Божіего и къ преломленью хлеба съберали. Надъ неволниками теже велить Богъ милость мети и оныхъ шчадити. А прото потреба, абы таковъ день мели хрістіане, яко жь ешче спочатку мели.

**ПЫТАНЬЕ**

Вижу, яко мусить быти день одинъ, которого бы християне от роботъ своихъ волными были, а слуханья бы Слова Божіего пилновали. Але ешче рад быхъ ведалъ, для чого на тое инший день обрали, нежели который Самъ Богъ обралъ и посвятилъ и, то есть для чого святимъ неделю, а не суботу?

**ОТКАЗЪ**

Ачь то на воли оныхъ старих христіанъ, то есть Апостоловъ было, обрати собе которы колвекъ бы день хотели на святые справы, хотя ж бы понеделокъ або второкъ, або иный который от седми дней, поневажь вси дни ровные суть, а не ест одинъ за другого лепшейшый, яко Апостолъ, к Римляномъ пишючи, знаменуеть.

Да вед же не безъ причины первый день, то есть неделю на тое избрали. Яко бо под Закономъ сувоту для того святили, ижь того дня Богъ отпочинулъ, створивши вси речи, по тому жь под Еванъгелиемъ годится оного дня добродейства Божіе припоминати, которого Сынъ Божій, знову створивши светъ, то есть человека избавивши, к новому животу въскреснути рачилъ. Бо оное первое створенье, для которого былъ Богъ суботу святити велелъ, Адамовымъ грехомъ было нарюшоно, а ново Ісусомъ Хрістомъ опять есть найдено.

**ПЫТАНЬЕ**

Чимъ того доведешь, абы Апостоли неделю заховали, або ку слуханью Слова Божіего обрали?

**ОТКАЗЪ**

Ничимъ, толико Писмом Святымъ. Наперведей бо Лука Евангелистъ в Деаніах Апостолских пишеть тако: «Въ едину же от суботъ събраным оученикомъ преломити хлебъ Павелъ глаголалъ к ним, хотя изыйти на оутріи, и простреть слово до полоуношчи» (Деан. 20: 7-15). Зде явне пишеть, яко оученици, сиречь хрістіане, събералися ламати хлеба, то есть Вечерю Господню чинити, в неделю.

По тому жь и Павелъ Апостолъ к Корінфом пишючи, припоминаеть неделю, яко того дня маеть быти сложеніе милостины. Тако бо пишеть: «А сложеніе еже къ святым, яко же расчыних церквам Галатейскым, тако и вы творите. По единой от суботъ кожды васъ о собе да полагаеть, съхраняа» (1 Кор. 16: 1-3).

Разгледзеўшы гэтую прычыну, пабач і іншыя прычыны, дзеля якіх Бог пастанавіў сьвяты. Гэта значыць, дзеля таго, каб быў асобны дзень, у які б усе людзі зыходзіліся да слуханьня Слова Божага, а нявольнікі ды жывёла каб адпачывалі. Паводле гэтых прычынаў мусіць быць у Хрысьціянаў пэўны дзень, бо і Хрыстос Сваім вучням зьбірацца загадвае, і ў Апостала чытаем, як усе зьбіраліся дзеля слуханьня Слова Божага і дзеля ламаньня хлеба. Да нявольнікаў таксама Бог загадвае быць міласьцівымі ды іх літаваць. Таму патрэбна, каб у Хрысьціянаў быў такі дзень, які яны мелі яшчэ ад пачатку.

**ПЫТАНЬНЕ**

Бачу, што мусіць быць адзін дзень, у які б Хрысьціяне былі вольнымі ад сваёй працы ды пільнаваліся слуханьня Слова Божага. Але яшчэ хацеў бы я ведаць, чаму на гэта іншы дзень абралі, а ня той, які Сам Бог абраў ды асьвяціў? Значыць, чаму мы сьвяткуем нядзелю, а не суботу?

**АДКАЗ**

Хаця гэта ад волі першых Хрысьціян, значыць, Апосталаў, залежала – абраць сабе на сьвятыя справы які заўгодна дзень, – хоць панядзелак або аўторак, або іншы які зь сямі дзён, бо ўсе дні роўныя ды адзін дзень ня лепшы за другі, як кажа Апостал, пішучы да Рымлянаў, але не без прычыны першы дзен, значыць, нядзелю, яны абралі. Як падчас Закону суботу сьвяткавалі, бо ў гэты дзень Бог супачыў, усе рэчы стварыўшы, так і падчас Эвангельля належыць у гэты дзень узгадваць дабрадзейства Божае — як Сын Божы, нанова стварыўшы сьвет, значыць, чалавека збавіўшы, дзеля новага жыцьця ўваскрос. Бо тое першае стварэньне, дзеля якога Бог загадаў сьвяткаваць суботу, парушанае Адамавым грахом, праз Ісуса Хрыста было ўзноўлена.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чым давядзеш тое, што Апосталы сьвяткавалі нядзелю або абралі яе дзеля слуханьня Слова Божага?

**АДКАЗ**

Нічым іншым, як толькі Сьвятым Пісьмом. Найперш бо эвангеліст Лука ў Дзеях Апостальскіх піша так: «У першы дзень па субоце, калі сабраліся мы на ламаньне хлеба, Паўла, каторы назаўтра меў выбрацца ў дарогу, гаварыў да іх ды зацягнуў сваё слова да поўначы» (Дзеі 20: 7). Тут Лука ясна піша, што вучні (значыць, Хрысьціяне), зьбіраліся ламаць хлеб (значыць, спраўляць Вячэру Госпадаву) у нядзелю.

Гэтаксама і Апостал Паўла, да Карынцянаў пішучы, узгадвае пра нядзелю як пра дзень, у які мае зьбірацца міласьціна, так бо ён піша: «Адносна складак, што зьбіраюцца дзеля сьвятых, дык і вы рабіце, як я загадаў цэрквам у Галятыі. Хай у першы дзень тыдня кожны з вас адкладзе ў сябе і зьберажэ» (1 Кар. 16: 1-2).

Съ обеюхъ тых местъ вырозумети можемъ, ижь Апостоли неделю обрали, абы у тотъ день святые справы чинили хрістіане. То естъ абы ся но одно место згромадивши, Бога призывали, Слово Его слухали, тайне пріймовали, милостину здавали и ишие побожьные дела Богу ко чти чинили.

**ПЫТАНЬЕ**

Вижу, яко Лука сведчить, иже съшлися были оученицы въ едину от суботъ преломити хлебъ. Лечь не пишеть, абы тое было в неделю, але яко бы «в некоторую суботу». Павла теже Апостола речь трудна къ вырозуменью. Бо не рече: «Полагай каждый в неделю у себе милостину», але рече: «По единой от суботъ». Яко тое розумети маю?

**ОТКАЗЪ**

Нетъ в сихъ словехъ никакое трудности, кто ся Писму Святому припатрити хочеть. Ведомо бо маеть быти, яко Апостоли и Евангелисты, ачь языкомъ гречьскым писали, лечь предся обычай мовы еврейское заховали. Евреане пакъ не потому дни звали, яко мы теперь зовемъ, ани по тому, яко на онъ часъ греки звали, ани ся годило тако Апостоломъ звати. Бо греки, або еллини, будучи погане, многых боговъ быти веровали, и их имены дни называли. Што мы ныне неделею зовемъ, они днемъ Иліовым, то ест солнеца звали, солнце вместо бога маючи. Што в насъ теперь понеделок, тое они днемъ луны, которую мели за богиню, называли, по тому же второкъ Ираклиевымъ днемъ, середу — Ермиевымъ, четвер — Діовым, пятницю — Афродиты, суботу — Кроніовымъ.

Ино яко есмъ вже поведелъ, не годилося по тому Апостоломъ ани Евангелистом писати, которие множство ложных боговъ потребити мели, а того для обычаемъ еврей дни называли. Неделю – единою от суботъ, понеделокъ – второю або другою от суботъ, второкъ – третиею от суботъ, середу – четвертою от суботъ, пятницу – шестою от суботъ, а суботу – суботую или шабасомъ звали. Прото где знайдешь у Святомъ Писанію «въ едину от суботъ», розумей, яко бы написано «у неделю».

А для лепшейшого вырозуменья обачь въ всехъ Евангелиах, где святіи Евангелисты въскресеніе Христово выписують, увидишь, иже вси сведчать, яко Христос въ едину от суботъ въсталъ из мртвыхъ, то ест, на заутріе по суботе, по нашему – у неделю. Матфей бо тако пишеть: «Въ вечер же суботный и свитаюшчи въ едину от суботъ, пріиде Маріа Магдалини и другаа Маріа видети гробъ» и прочая. Обачь, яко ясне даеть знати, иже опошле вечера суботного свитаеть въ едину от суботъ. Што ся о иномъ дни розумети не можеть, развей о недели.

Тое теже памятуй, ижь по обычаю еврейское речы Евангелисты, што бы мели писати «въ первую от суботъ», они писали «въ едину от суботъ». Тако бо и Моисей, выписуючи, яко Богъ сътворилъ светъ, на-

З абодвух гэтых словаў мы можам зразумець, што Апосталы абралі нядзелю, каб у гэты дзень Хрысьціяне рабілі сьвятыя справы. Значыць, каб яны, разам сабраўшыся, Богу маліліся, Ягонае Слова слухалі, да таямніцаў прыступалі, міласьціну давалі ды іншыя пабожныя справы дзеля Божай славы рабілі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Бачу, як Лука сьведчыць, што вучні ў першы дзень па субоце сабраліся ламаць хлеб. Аднак ён ня піша, што гэта было ў нядзелю, а «ў першы дзень па субоце». Таксама і мову Апостала Паўлы цяжка зразумець, бо ён не сказаў: «Кожны няхай дае міласьціну ў нядзелю», але сказаў: «Хай у першы дзень тыдня кожны з вас яе адкладзе». Як гэта маю разумець?

**АДКАЗ**

Няма ва ўсіх гэтых словах нічога цяжкага для таго, хто хоча зразумець Святое Пісьмо. Мае быць вядома, што Апосталы ды Эвангелісты, хаця і пісалі па-грэцку, аднак захоўвалі звычаі мовы гебрайскай. Гебраі ж называлі дні ня так, як мы зараз іх завём, ані так, як грэкі ў той час звалі. Не належала Апосталам тым грэцкім звычаем дні называць, бо грэкі, або эліны, былі паганамі ды верылі, што ёсьць шмат багоў, і называлі дні іхнімі імёнамі.

Што мы зараз завём «нядзеля», тое яны звалі «дзень Геліяса», значыць, сонца, маючы яго замест Бога. Што ў нас зараз «панядзелак», тое яны называлі «дзень Месяца», маючы Месяц за Бога. Гэтаксама і аўторак называлі «дзень Марса», сераду – «дзень Гермэса», чацьвер – «дзень Зеўса», пятніцу – «дзень Афрадыты», суботу – «дзень Кронаса».

Але, як ужо я пісаў, не належала Апосталам ды Эвангелістам, якія меліся зьнішчыць мноства фальшывых багоў, тым жа чынам дні называць, таму Апосталы ўжывалі звычай гебраяў. Пра нядзелю казалі «першы дзень пасьля суботы», пра панядзелак – «другі дзень пасьля суботы», пра аўторак – «трэці дзень пасьля суботы», пра сераду – «чацьвёрты дзень пасьля суботы», пра чацьвер – «пяты дзень пасьля суботы», пра пятніцу – «шосты дзень пасьля суботы», а суботу звалі «субота», або «шабат». Дзеля гэтага калі знойдзеш у Сьвятым Пісаньні словы «ў першы дзень па субоце», ведай, што гэта значыць «у нядзелю».

А дзеля лепшага разуменьня паглядзі ва ўсіх сьвятых Эвангельлях тое мейсца, дзе сьвятыя Эвангелісты пішуць пра ўваскрасеньне Хрыста, і ўбачыш, як усе яны сьведчаць, што Хрыстос уваскрос у першы дзень пасьля суботы, значыць, па-нашаму, назаўтра раніцай пасьля суботы. Мацьвей бо так піша: «Па субоце на сьвітаньні ў першы дзень тыдня прыйшла Марыя Магдалена і другая Марыя паглядзець магілу» і так далей. Глядзі, ясна кажа Мацьвей пра сьвітанак першага дня па субоце, меркаваць жа так можна хіба што пра нядзелю, а не пра нейкі іншы дзень.

Таксама памятай, што звычаем гебрайскай мовы Эвангелісты замест таго, каб напісаць «першы дзень тыдня», пісалі «ў першы дзень

писалъ: «И бысть вечеръ и оутро, день единъ». То естъ день первый. Прото Марко Еванъгелистъ написалъ тако: «Въскресъ Ісус заоутра въ первую от суботъ». Домнимаю, яко вже каждый розумети можеть, іже где Лука въ Деаніахъ пишеть, яко оученици схажалися ламати хлеба въ едину от суботъ, не можеть ся о иномъ дни розумети, развей о недели.

А ижь тотъ день неделный былъ ешче за Апостолъ обранъ на Божіе справы, вже есмъ довелъ, чого ми теже посведчаеть Іоаннъ Богословъ въ Откровенію, где тако пишеть: «Азъ, Іоаннъ, братъ вашъ и обешчникъ въ скорби и царстве и терпени Ісус Хрістове, бехъ въ острове, нарицаемомъ Патмомъ, за Слово Божіе и за сведительство Ісус Христово, бехъ духомъ въ день недельный» (Апокал. 1). Лечь што зде днемъ недельнымъ на нашую речь преводники написали, то у греческих книгах «въ день Господень» пишють. Тако бо греческого языка Хрістіане неделю зовуть — «Киріаки имера», то ест «день Господень».

По чому знати, иже той день стародавные хрістиане отделили были Божіимъ съправам. Бо естли бы не такъ было, не писалъ бы его Богословъ днемъ Господнем.

**ПЫТАНЬЕ**

Если за Апостолъ мели Хрістіане опричьный день, которого святие справы делали, чого жь для Апостолъ Галатъскую церъковъ о томъ обличаеть, яко певные дни мели, которых смотрели. Тако бо пишеть имъ: «Како възврашчаетеся пакы на немошчныя, худыя стихіа (початки), имъ же пакы слоужити хотяшче, дни смотряете, и месяца и времена и лета. Боюся о васъ, егда како без оума трудихъся» (Гал. 4: 8-21) и прочая.

**ОТКАЗЪ**

Поведелъ вже есмъ, яко мы, Хрістіане, иншимъ способомъ praзновати, нежели Ізраильтяне, маемъ. Тій бо для того празновали, абы образовали або значили, яко потреба, абы были посвяшчени. Мы пакъ только для того празнуемъ, абы есмо часъ мели Божіихъ справъ пилновати.

Галаате пакъ не для того дни смотрели, але, іоудействуючи, инъшие дни за святые, а инъшие за несвятые мели. Прото Апостолъ напротиву тому ихъ худоству пишеть, а не противу церковному чину. О котором на иномъ месте тако повелеваеть: «Вся благообразно и по чину да бывають» (1 Кор. 14: 26-40). А яко жь по чину будуть вся, естли бы певного дня ко събераныю Хрістіанъ и къ инымъ справам не было?

**ПЫТАНЬЕ**

Которые суть добрие дела того четвертого слова?

**ОТКАЗЪ**

Наперврей проповеданье Слова Божія и причашчанье Тайнъ Хрістовых за великіе дари Божіе мети (1).

Слова Божіего з великою пилностию наоучати, естли кто к тому избранъ (2).

пасьля суботы». Так бо Майсей, распавядаючы, як Бог стварыў сусьвет, напісаў: «І мінуў вечар і раніца – дзень першы», значыць, адзін дзень. Дзеля таго і Эвангеліст Марк напісаў так: «Уваскрос Ісус на сьвітаньні ў першы дзень тыдня». Мяркую, ужо кожны можа зразумець, што, калі Лука піша ў Дзеях, як вучні зьбіраліся на ламаньне хлеба ў першы дзень пасьля суботы, ён мае на ўвазе нядзелю, а ня нейкі іншы дзень. Ужо я давёў, што нядзеля была абраная на Божыя справы яшчэ ў часы Апосталаў, ды і таксама Ян Багаслоў падмацоўвае мае доказы, бо ў Адкрыцьці так піша: «Я, Ян, брат ваш і ўдзельнік у прыгнёце, у валадарстве і вытрыманасьці ў Хрысьце Ісусе, быў на востраве Патмас дзеля Слова Божага і сьведчаньня аб Ісусе Хрысьце, я быў у захапленьні духа ў дзень нядзельны» (Адкр. 1). Што тут «дзень нядзельны» напісалі перакладчыкі нашай мовай, тое на мове грэцкай «дзень Госпадаў» завецца, бо Хрысьціяне-грэкі называюць нядзелю «Кірыакі імера», значыць «дзень Госпада».

Такім чынам можам пазнаць, што гэты дзень Хрысьціяне аддалі на Божыя справы, бо калі б ня так было, не назваў бы яго Багаслоў днём Госпада.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі ў часы Апосталаў Хрысьціяне мелі асобны дзень, каб рабіць сьвятыя справы, дзеля чаго тады Апостал Паўла выкрывае царкву ў Галятыі, бо яны мелі пэўныя дні, якія сьвяткавалі? Так бо ён піша: «Чаго вяртаецеся да ліхіх і бясьсільных стыхіяў, якім зноў хочаце служыць? Вы глядзіцё на дні, месяцы, часы і гады. Баюся за вас, што надарма працаваў у вас» (Гал. 4: 9-11).

**АДКАЗ**

Ужо я сказаў, што мы, Хрысьціяне, маем сьвяткаваць іншым звычаем, чым Ізраэльцы. Яны бо сьвяткавалі пэўныя дні, каб узгадаць, што патрабуюць асьвячэньня. Мы толькі дзеля таго сьвяткуем, каб мець час на Божыя справы. Галяты ж не дзеля гэтага пэўныя дні сьвяткавалі, але юдэйствавалі і адны дні мелі за сьвятыя, а другія – за несьвятыя.

Таму Апостал піша супраць іхніх выдумак, але ня супраць царкоўнага парадку, пра які ў іншым мейсцы так загадвае: «Ды хай усё адбываецца прыстойна і парадкам» (1 Кар. 14: 40). А як жа ўсё будзе парадкам, калі ня будзе пэўнага дня, у які б Хрысьціяне зьбіраліся разам ды ў які б сьвятыя справы рабілі?

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія справы, паводле таго чацьвёртага слова, добрыя?

**АДКАЗ**

Па-першае, мець за вялікія Божыя дары прапаведаньне Слова Божага ды ўдзел у Хрыстовых таямніцах.

Па-другое, зь вялікай пільнасьцю навучаць Слову Божаму, калі хто дзеля гэтага абраны.

Слова Божіего учительного пилно слушати, с него ся направляти, теже Тайнамъ Хрістовымъ причашчатися (3).

Дни святые къ тому тягнути, абы ся тогды любовь показовала, абы и иншие, видячи, къ благочестию пріступовали, милостину давали и въ всимъ ближному своему потребному посабляли. Тако бо и Хрістос праздники празновалъ, всякие недуги або хворобы исцеляючи (4).

Ешче служителемъ Слова Евангельского выхованье давати, абы за працами своими служити не омешкали. Тем же обычаем их боронити и свободу делати, абы беспечне служили (5).

Немного говорячи, тотъ седмый день святить, кто и в собе, и в другихъ верю, надею, любовь острить (6).

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть грехи противу того слова?

**ОТКАЗЪ**

Напервей гордити службою Евангельскою. То естъ або николи, або зредка слухати Слова Божіа (1).

Не причашчатися Тайнам Хрістовымъ (2).

Оставляти проповеданье Слова Божіего або недбале его навчати (3).

Постановляти незбожные чины, которие правое ученіе затерають (4).

Въ дни святые пированья чинити, непильные суды судити, на позоришча ходити, прожновати, дочасные речи робити, о Божественных не розмышляти (5).

Отводити кого от слуханья беседъ поучительных або дати кому причину зле о нихъ розумети (6).

Всякіе справы в той день чинити, которие бы от слуханья Божія Слова и от розмышлянья Его отводили, яко в день святый торговати, долъгы отправляти, копы съберати, в дорогу ехати, полевати або зверъ ловити и таковая (7).

Причину, абы некому Слова Божія наоучати, яко жъ кольве дати, або напротиву чти служителей стоячи, або данину от нихъ завераючи (8).

Подданыхъ великими службами обтяжати, за которими часу не мають до церъкви приходити (9).

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ караеть тых, которые того слова четвертого непослушни?

**ОТКАЗЪ**

Яко первыхъ словъ проступци и на теле и на души бывають карани, по тому жь и о того слова проступницех розумети маемъ, понеже и тое слово ест от первое дошчки. И маемъ взоръ у Святом Писанью, яко ся Богъ на таковыхъ гневаеть, которие бы дня святого свои потребы чинили, а Господне бы отставили.

Моисей бо пишеть, яко Самъ Богъ велелъ человека каменіемъ убити, иже только трески в день суботный збиралъ (Числа 15). Неемения теже сведчить, яко Богъ за тое былъ навелъ зло на Ιерусалимъ,

Па-трэцяе, пільна слухаць навуку Слова Божага ды паводле Яго выпраўляцца, таксама браць удзел у таямніцах Хрыстовых.

Па-чацьвёртае, сьвятыя дні так праводзіць, каб любоў паказаць ды каб іншыя людзі, гэта бачачы, пачыналі жыць багабойна: давалі міласьціну і ва ўсіх патрэбах дапамагалі свайму бліжняму. Так бо і Хрыстос сьвяткаваў дні сьвятыя, аздараўляючы ўсялякіх хворых.

Па-пятае, даваць на ўтрыманьне служыцеляў Эвангельскага слова, каб за працай не пакідалі свайго служэньня. Тым жа звычаем іх бараніць ды ахоўваць свабоду, каб служылі ў бясьпецы.

Ня шмат кажучы, той чалавек сёмы дзень сьвяткуе, хто і ў сабе, і ў іншых узмацняе веру, надзею і любоў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ёсьць грахі супраць гэтага слова?

**АДКАЗ**

Першы грэх – пагарджаць Эвангельскім служэньнем, значыць, або ніколі, або зрэдку слухаць Божае Слова.

Другі грэх – ня ўдзельнічаць у таямніцах Хрыстовых.

Трэці грэх – пакідаць прапаведаньне Божага Слова або нядбала яму навучаць.

Чацьвёрты грэх – пастанаўляць бязбожныя парадкі, якія зьнішчаюць правільнае вучэньне.

Пяты грэх – у дні сьвятыя банкетаваць, судзіць няпільныя суды, хадзіць на забавы, час марнаваць, рабіць штодзённыя справы, не разважаючы пра справы Божыя.

Шосты грэх – зводзіць кагосьці ад слуханьня настаўленьняў ці даваць камусьці падставы няправільна іх разумець.

Сёмы грэх – рабіць у гэты дзень усякія справы, што зводзяць ад слуханьня ды разважаньня Божага Слова, напрыклад, у сьвяты дзень гандляваць, аддаваць даўгі, зьбіраць копы, ехаць у дарогу, паляваць або зьвера лавіць ды падобнае.

Восьмы грэх – ствараць перашкоды, каб не было каму вучыць Божаму Слову, ці то абражаючы гонар служыцеляў, ці то забіраючы іхнія прыбыткі.

Дзевяты грэх – абцяжарваць падданых вялікай працай, з-за якой яны ня мелі б часу прыходзіць да царквы.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае непаслухмяных гэтаму чацьвёртаму слову?

**АДКАЗ**

Як парушальнікі першых словаў бываюць караныя і целам, і душою, тым жа звычаем мусім разумець і пра парушальнікаў гэтага слова, бо і гэтае слова запісана на першай дошцы. Ды маем узор у Сьвятым Пісьме, як Бог гневаецца на тых, што ў дзень сьвяты пра свае патрэбы клапоцяцца, а Божыя пакідаюць.

иже суботы были посквернили (2 Ездр. 13). Тое жь у Езекиіла и у иныхъ пророкъ знайдешъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што будеть онымъ, которыи тую заповедь полнять?

**ОТКАЗЪ**

Яко проступници и на душы и на теле карани бывають, по тому же и которіе того слова стерегуть, и вечные дарованіа пріимуть, и зде, на земли, ласкавого къ собе Бога познають. О вечныхъ рече Самъ Господь: «Блажени слышашчеи Слово Божіе и храняшче е» (Лука 11: 23-28).

О земныхъ пакъ Ісаіа тако пишеть: «Ачше отвратиши ногу твою от субот и не сътвориши воля своя в день святый, и прозовеши суботы млады святы Богови своему, да не въздвинеши ногы своея налево, ни да възглаголеши словесы на гневъ из оустъ своих, и будеши уповая къ Господеви, възведеть тя на бготы земныя и уречеть ти причастіе Іакова, отца твоего» (Ісаіа 58).

**ПЫТАНЬЕ**

Говори пятую заповедь.

**ОТКАЗЪ**

Пятаа заповедь естъ: «Чти отца и матку твою, абы есь долго живъ на земли, которую Господь Богъ дасть тобе».

**ПЫТАНЬЕ**

Што зде Богъ зовет честию?

**ОТКАЗЪ**

Писмо Святое не только тое честию зоветь, што людие посполите зовуть. Люді бо мають оное за честь, коли кто къ кому укладъне говорить, повстаеть, шапку снявши, кланяеться. Лечь у Святом Писме честь называется не только таковая укладность, але теже коли кто, видечи потребного, от маетности своей ему уделяеть. О таковой зде чести сее слово пятое повелеваеть. То естъ абы есьмо родителемъ своимъ послушни и поволніи были, учьтиве ся к нимъ заховали, по тому жь абы есмо им, естли бы потреба, выхованье давали. А на остатокъ и працу свою къ их пожиткомъ отдавали. На том бо залежить честь, о которой туть Богъ заповедуеть.

А хочешь ли о том певнейшый быти, яко чтити розумееться живити а выхованье давати, погледи, што Апостолъ к Тімофею пишеть: «Прележашчей добре пресвітры сугобей чти да достойни бывають, паче же трюждаюшчейся в слове и ученіи» (1 Тім. 5: 11-21) и докладаеть, абы вырозумелъ Тімофей, о якой чти говорить, и рече: «Глаголеть бо Писание: "Вола верхушча не оборотиши" и: "Достоінъ делател мзды своея"».

Естли бы не датокъ зде честию звалъ Павелъ, а на што бы о воле молотяшчом Писмо приводилъ, которого «оборотити» заказу-

Майсей бо піша, як Сам Бог загадаў пабіць чалавека каменьнем толькі за тое, што ў дзень суботні дровы зьбіраў (Лічбы 15). Нэемія таксама сьведчыць, як Бог за тое навёў зло на Ерузалім, што суботы не сьвяткаваліся (Нэем. 13). Тое ж самае ў Эзэкіля ды ў іншых прарокаў ты знойдзеш.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што будзе тым, хто гэтае прыказаньне спаўняе?

**АДКАЗ**

Як парушальнікі бываюць караныя і душою, і целам, гэтаксама і тыя, што пільнуюцца гэтага слова, прыймуць і вечныя дабраславенствы, і тут, на зямлі, зьведаюць міласьць Божую. Пра вечныя дабраславенствы Сам Госпад сказаў: «Тым болей шчасьлівыя тыя, што слухаюць Слова Божае ды захоўваюць яго» (Лк. 11: 28), пра зямныя ж дабраславенствы Ісая так піша: «Калі ў суботу, дзень Мой сьвяты, стрымаеш тваю нагу, каб не сваволіць, назавеш суботу днём сьвятым, слаўным у Госпада, і калі яго ўшануеш, пазьбягаючы тваіх падарожжаў і пакінуўшы ўсе твае справы, тады будзеш захапляцца Госпадам. Тады Я падыму цябе на вышыні зямныя і карміць буду цябе спадчынай Якуба, бацькі твайго. Вусны Госпада сказалі гэта» (Іс. 58).

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары пятае прыказаньне.

**АДКАЗ**

Пятае прыказаньне: «Паважай бацьку свайго і маці сваю, каб быў ты даўгавечны на зямлі, якую дасьць табе Госпад, Бог твой».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што тут Бог называе павагай?

**АДКАЗ**

Пісьмо Сьвятое заве павагай ня толькі тое, што і ўсе людзі звычайна завуць. Людзі бо маюць за павагу, калі хто пачціва гаворыць, устае, кланяецца, шапку зьняўшы. Аднак у Сьвятым Пісьме павагай завецца ня толькі такая пачцівасьць, але таксама калі хтосьці бачыць чужую патрэбу ды дзеліцца з тым чалавекам сваёй маёмасьцю. Такой вось павазе вучыць нас гэтае пятае слова. Значыць, каб мы слухаліся нашых бацькоў, ім дагаджалі, пачціва да іх ставіліся, таксама каб у час патрэбы давалі ім на жыцьцё, ды, нарэшце, каб дзеля іхняга прыбітку не шкадавалі нашай працы. На гэтым залежыць павага, пра якую Бог загадвае.

А калі хочаш болей упэўніцца ў тым, што паважаць – значыць карміць, на жыцьцё даваць, паглядзі, што Апостал да Цімахвея піша: «Старшыя, якія добра кіруюць, вартыя падвойнай пашаны, асабліва тыя, што працуюць у слове і ў навуцы» (1 Цім. 5: 17). А каб Цімахвей зразумеў, пра якую пашану ён кажа, далучае: «Вось, кажа Пісаньне: “Не завязвай морды валу, які малоціць” і: “работнік варты платы сваёй”».

еть? (То ест въ обрет внуздати, абы не елъ). На што бы Слово Хрістово припоминал о делателю, яко достоин мзды або заплаты своея? А такъ надобе тое паметовати а родителем не только словом, поклоном а шапкою честь чинити, але сее чинячи, оного, на чим большей належить, не опушчати.

**ПЫТАНЬЕ**

Буду вже розумети, яко ся чтити годить родители, але ми ешче скажи: кого зде Богъ отцомъ и маткою называеть, естли только родителей, от которих тело имаемъ?

**ОТКАЗЪ**

Коли бы есмо ся от отца и от матки народивши, не потребовали иных людей помочы, обороны, наоуки, ино бы есмо не должни никому иному чести тоее, разве родителем нашим. Але ижь безъ тыхъ речей вже ознаменых на сим свете быти не можем, прото и оных на месте родителей мети есьмо повинни, от которыих тые добродейства прiимуемъ, се есть наставники, мастери, пастыры и врядники.

Тым бо должни есмо честь заровно яко родителем. Бо яко от родителей тело маемъ, тако опять от мастеров маемъ, иже оное тело можемъ заховати, абы и одежу и пишчу мело. По тому жь за властями покой маем, а за пастырми добрую совесть. А безъ тых на свете пожити нельза человекомъ. Безъ родителей бо на светъ никто не народиться, але хотя жь ся от родителей кто народить, а добрым норовом не наставиться, што за пожиток с него будеть? По тому жь хотя жь бы ся кто и народилъ, и выхованъ былъ, але бы врагъ непокой чинилъ, а вряду бы не было, который бы боронилъ, а нашто бы и выхованье? Лечь хотя бы и выхованье кто мелъ, и оборону, але бы опять Слова Божiего не мелъ от кого слухати, предся бы ешче великый недостатокъ терпелъ.

Прото сее пятое слово не только ся о родителех розумееть, але о всехъ тыхъ, которыхъ есмъ вже припоминалъ. То есть о наставниках, о пастырех а о преложоных. Тым повинни есьмо честь не мней, але яко родителем, не такъ для обороны и наукы, яко для того, ижь оныхъ Богъ на Своим месте поставилъ и послушеньство им чинити велелъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли родители, пастыри або оучители и господари за отцы чтити маем, чого для Хрiстос заказуеть отцомъ кого звати на земли, даючи того причину, иже единъ ест Отецъ наш на небесехъ? (Матф. 23: 1-12)

**ОТКАЗЪ**

Не только отцами людей звати Хрiстос заказал, але того жь часу Апостоломъ заборонилъ, абы ся оучительми не звали. А предся Павелъ Апостолъ назвалься и оучителем и отцомъ, бо, пишючи к Тiмофею, тако рече: «Iстинну глаголю о Хрiсте, а не лжю оучитель языком въ вере и истинне» (1 Тiм. 2: 1-15). Зде ся оучителемъ назвалъ, а къ

Калі б не дарунак назваў тут Паўла пашанай, навошта тады б ён узгадваў пра вала, што малоціць, ды чаму б забараняў яму морду завязваць (гэта значыць закілзаць, каб ня еў)? Дзеля чаго б ён узгадваў словы Хрыста пра работніка, які варты ўзнагароды або платы сваёй? А калі так, то трэба на гэта добра памятаць ды бацькоў шанаваць ня толькі словам, паклонам ды зьніманьнем шапкі, але, так чынячы, не забывацца на рэчы больш важныя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Буду ўжо ведаць, як належыць паважаць бацькоў, але скажы мне яшчэ: каго тут Бог называе бацькам ды маткай? Ці толькі бацькоў, ад якіх маем цела?

**АДКАЗ**

Калі б мы, нарадзіўшыся ад бацькі і маці, не патрабавалі дапамогі, абароны ды навукі іншых людзей, тады б ня мусілі шанаваць нікога іншага, акрамя бацькі з маткай. Але раз бяз тых рэчаў, названых вышэй, мы ня можам жыць на на гэтым сьвеце, таму і тых мы павінны лічыць за бацькоў, ад каго гэтыя дабрадзействы прыймаем, – вучыцеляў, майстроў, пастыраў ды ўрадоўцаў.

Іх бо мусім як бацькоў шанаваць, бо як ад бацькоў маем цела, так, зноў жа, ад майстроў маем усё, каб гэта цела захаваць – вопратку ды ежу. Тым жа звычаем урад клапоціцца пра наш супакой, а пастыры – пра нашае добрае сумленьне. Немагчыма бяз гэтага жыць чалавеку на сьвеце. Без бацькоў бо на сьвет ніхто не народзіцца, але калі чалавек ад бацькоў на сьвет народзіцца, а добрым норавам ня будзе навучаны, якая зь яго будзе карысьць? Ды, зноў жа, калі чалавек народзіцца ды будзе выхаваны, але вораг на яго вайной пойдзе ды ня будзе ўраду, які б бараніў, – навошта тады выхаваньне? Ды калі б і выхаваньне хто меў, і абарону, але, зноў жа, не было б каму навучыць яго Слову Божаму – усё адно ён меў бы вялікі недахоп.

Таму і гэтае пятае слова кажа ня толькі пра бацькоў, але і пра ўсіх тых, каго ўжо я ўзгадаў, значыць, вучыцеляў, пастыраў ды ўрадоўцаў. Іх павінны мы шанаваць ня менш за бацькоў ня толькі дзеля абароны ды навукі, але і дзеля таго, што Бог паставіў іх на гэтае мейсца ды загадаў нам іх слухацца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі мусім бацькоў, пастыраў або вучыцеляў і ўрадоўцаў як айцоў паважаць, чаму тады Хрыстос забараняе зваць некага на зямлі айцом з тае прычыны, што адзін ёсьць у нас Айцец нябесны (Мц. 23:9)?

**АДКАЗ**

Хрыстос ня толькі забараніў зваць некага айцом, але таксама і Апосталам загадаў, каб не называлі сябе вучыцелямі. Аднак жа Апостал Паўла назваў сябе і вучыцелем, і айцом, бо, пішучы да Цімахвея, так сказаў: «Праўду кажу пра Хрыста, не ашукваю, вучыцель паганаў у веры

Коринфом пишеть тако: «Не срамляя вас пишу сія, но чада моя возлюбленная наказаю. Ашче бо тму оучителей имате о Хрісте, но не многы отца. Бо о Хрісте Ісусе благовествованием азъ вы родих. Молю убо вас, подобни ми бывайте. Сего ради послах вам Тімофея, иже ми ест чадо възлюбленое» (1 Кор. 4: 9-17).

С тых словъ Апостольскихъ явне, иже ся отцом Коринфом пишеть, а потому жь и Тимофею. Прото заказъ Хрістовъ муситься не такъ просто розумети. Бо если бы ся просто розумелъ, не чинил бы противу его Апостолъ, то естъ не звалъ бы ся ани учителемъ, ани отцемъ. Прото тако розумети маемъ слова Хрістова, где заказуеть оученикомъ, абы ся учительми не звали, тое жь ся розумееть, яко коли бы им поведелъ: «Не оучете сами от себе, што ся вам полюбить, але што есмъ Я вас научилъ».

Той бо оучителемъ ся зоветъ, кто не Хрістова ученья, але своихъ вымысловъ учить. Опять, кто Хрістова Слова навчаеть, можеть ся учителем назвати. Бо тая честь не его будеть, але Оного, чия наука. А ижь ся по тому Павел и иншие Апостоли заховали, слушне ся учительми звали. Бо и на тое были от Хріста избрани и потом послани, абы навчали. И того для Апостолъ к Ефесіом пишючи, не только Пророки, Апостолы, Евангелисти и пастыры личыть за дары, которие намъ Хрістос, по правицы Бога Отца седячи, даеть, але теже и учителей припоминаеть (Ефес. 4: 1-13).

По тому жь и званью отцомъ розумей, иже не боронить Хрістос звати отцомъ отца, и пастыра або учителя, але у томъ слове напоминаеть, абы есмо для нашихъ отцовъ Бога, всем истинного Отца, не отступали, Его славу большей важили. Окроме того теже ведати надобе, иже, властиве говорячи, Единъ только Самъ Богъ естъ всее твары и Отецъ, и Господинъ, Царь, Княз, и Богъ. Да вед же предся Самъ Богъ рачилъ тых именъ оным узычити, которие на Его местех седять.

Яко часто у Святом Писанію находемъ, иже не преложеные только называються князи, отцы, цары и господеви, але и бози нарицаються от Самого Бога. Яко у Псалмех Духъ Святый рече: «Богъ ста в сонме боговъ, посреди же боговъ разсудить» (Псалом 81). Там же, мало нижей, рече: «Азъ рех: бози есте и сынове Вышнего вси» (Псалом 81). По тому же въ Исходе написано: «Богомъ не поругаешися». Тое пакъ не розумееться о поганьскихъ бозех, бо тымъ можеть ся ругати, яко чинилъ Илія (3 Цар. 18), Іеремія и прочиі, але ся розумееть о судьяхъ а о преложеныхъ, которих Богъ чтити велить, а поругатися имъ възбраняеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Если же бы господарь былъ несправедливый, што маеть чинити Христіанинъ?

**ОТКАЗЪ**

Несправедливый былъ Саоулъ, а предся чтилъ его Давыдъ. Идолослужители были римские кесари, а предся имъ Хрістос кинсонъ пла-

і праўдзе» (1 Цім. 2: 7). Тут ён назваў сябе вучыцелем, а да Карынцянаў так зьвяртаецца: «Не пішу гэтага, каб вас засароміць, але каб вам, як найдаражэйшым маім дзеткам, даць напамін. Бо хоць вы мелі ў Хрысьце тысячу выхавацеляў, але няшмат айцоў, бо я ў Хрысьце Ісусе праз Эвангельле нарадзіў вас. Дык прашу вас, будзьце маімі перай-мальнікамі. Дзеля чаго пасылаю да вас Цімахвея, які ёсьць сын мой найдаражэйшы» (1 Кар. 4: 14-17).

З гэтых апостальскіх словаў ясна бачна, што ён называе сябе айцом, зьвяртаючыся да Карынцянаў, ды вучыцелем, пішучы да Цімахвея. Значыць, Хрыстовы загад ня так проста тлумачыцца. Бо калі б ён тлумачыўся так проста, не парушаў бы яго Апостал, не называў бы сябе ані вучыцелем, ані айцом. Дзеля гэтага словы Хрыста, калі Ён забараняе Сваім вучням звацца вучыцелямі, мы мусім так разумець, нібы Ён сказаў: «Не вучыце ад саміх сябе, як вам падабаецца, але вучыце так, як Я навучыў вас».

Часам бо той заве сябе вучыцелем, хто вучыць не навуцы Хрыстовай, а сваім выдумкам. Аднак толькі той, хто навучае Слову Хрыста, можа зваць сябе вучыцелем, бо гэта будзе не ягоная заслуга, а таго, чыя навука. Паколькі Паўла ды іншыя Апосталы тым звычаем сябе паводзілі, то і слушна звалі сябе вучыцелямі. Яны былі абраныя Хрыстом ды потым пасланыя, каб вучыць. Таму і Апостал, пішучы да Эфэсцаў, ня толькі пакліканьне Прарокаў, Апосталаў, Эвангелістаў ды Пастыраў лічыць за дары, якія нам дае Хрыстос, седзячы праваруч Бога Айца, але таксама ўзгадвае і вучыцеляў (Эф. 4: 11).

Тым жа звычаем мяркуй і пра называнньне айцом: не забараняе нам Хрыстос зваць айцом і айца, і пастыра, і вучыцеля, але нагадвае ў гэтым слове, каб мы дзеля нашых айцоў не адступіліся ад Бога, Айца праўдзівага, ды каб мы Ягоную славу болей за ўсё шанавалі. Таксама трэба ведаць, што, уласна кажучы, адзін толькі Бог кожнаму стварэньню і Айцец, і Валадар, і Кароль, і Князь, і Бог ды што Ён Сам назваў у гэтыя словы тых, хто сядзіць на Ягоным мейсцы. Часта бо ў Сьвятым Пісьме знаходзім, што Сам Бог называе князёў, айцоў, валадароў, урадоўцаў ня толькі начальнікамі, але і багамі, як, напрыклад, у Псальмах Дух Сьвяты кажа: «Бог падымаецца на божым сабраньні, пасярод багоў праводзіць суд» (Пс. 81). Тамсама, крыху ніжэй, сказана: «Дык сказаў Я: “Вы – багавішчы, і ўсе вы – сыны Найвышэйшага”» (Пс. 81), тым жа звычаем у кнізе Выхаду напісана: «Ня блюзьні Богу». Гаворыцца так не пра багоў паганскіх, бо тых багоў можна зьнеслаўляць, так рабілі Ільля, Ярэмія ды іншыя (1 Валад. 18), але маюцца тут на ўвазе судзьдзі ды начальнікі, якіх Бог загадвае шанаваць ды забараняе іх зьнеслаўляць.

**ПЫТАНЬНЕ**

А калі гаспадар несправядлівы, што мае рабіць Хрысьціянін?

**АДКАЗ**

Несправядлівым быў Саўл, аднак жа Давід яго шанаваў. Балвана-

тити велелъ, и Сам (Лука 20: 19-26) дідрахму заплатилъ. Прото Павелъ Римляномъ тако пишеть: «Воздади тежь всемъ долгы. Ему же уброкъ уброкъ, ему же дань — дань, ему же страх — страх, ему же честь — честь» (Рим. 13: 1-11). А Петрь ешче ясней того пишеть, абы подъданые або слугы повиновалися владыкамъ або господаромъ своимъ не токмо благым и кроткым, но и строптивымъ.

Прото повиненъ хрістіанинъ господаря своего слухати, ему служити и што розкажеть, маеть чинити. Нижли естли бы што напротиву Бога Царь, Князь або который иншый господарь повелелъ, а хотя ж бы и пастыр, тогды вже не маеть хрістианинь послушень быти, але обычаемъ Апостолъ святыхъ маеть отказати: «Послушати подобаеть Богови более, нежели человекомъ» (Деан. 5: 21-42).

В той мере вже и родного отца послушни быти не маемъ, ани наконецъ Ангела, если бы от Бога отводилъ, або противу Его Слова верити, або што делати велелъ (Матф. 10: 30-36). Бо вже тогды отецъ не отецъ, але чужый, господарь не господарь, але розбойникъ, пастырь не пастырь, але волкъ, ангелъ не ангелъ, але діаволъ. Прото, мовлю, вже на тотъ часъ не слухай, бо Хрістос тако рече: «Пріидохъ разлучити человека на отца своего, и дъшчере на матер свою, и невестку на свекровъ свою, и врази человеку домашніи его. Иже любить отца или матерь паче Мене, несть Ми достоинъ» и прочая (Матф. 10: 35-36). Опять, Павел къ Галатом рече: «Ачше мы или аггелъ со небеси благовестить вам, паче еже благовестихом вам, анафема да будеть» (Гал. 1: 3-10).

На тые бы слова мели паметовати, которіи ныне Божіему Слову места дати не хотять для отецских обычаевъ або для знаменъ, чюдес або для якого явленья аггельскаго.

**ПЫТАНЬЕ**

Годить ли ся Хрістианину быти на вряде?

**ОТКАЗЪ**

Напервей, нежели на тое пытанье откажу, потреба ся нам от Божіего Слова гараздъ навчити, какова речь ест врадъ, добра ли або недобра. Найдеть ли ся у Божіемъ Слове, яко врядь речь добраа, чого бы для Хрістіанин не мелъ быти на уряде? Опять, знайдеть ли ся, яко злаа речь урядь, ино негожа будеть Хрістіанину бити врядъникомъ.

То пакъ кажную речь по сему познати, какова ли будеть, естли вину або причину оное речи обачишь. Бо знайдеш ли которой речи виною и начальником Самого быти Бога, розумей сию речь за добрую. Опять, знайдешъ ли какую речь оной, же начатокъ далъ діаволъ, не мей оное речы за добрую, хотя жь пакъ розум чоловечій и очи полюбять.

Але не далеко заходячи, обачимъ, кто цари, князи, воеводы и иншие врядники поставилъ. То пак все Писмо и Ветхого и Нового Завета посведчаеть, яко Богъ всехъ тых на ихъ престолы сажаеть. Тако бо у

хвальцамі былі рымскія кесары, аднак Хрыстос загадаў, каб ім плацілі падатак (Лк. 20: 19-26), ды Сам заплаціў дыдрахму. Таму і Паўла да Рымлянаў так піша: «Аддавайце ўсім належнае: каму падатак – падатак, каму мыта – мыта, каму страх – страх, каму пашану – пашану» (Рым. 13: 7). А Пётр яшчэ ясьней кажа, каб падданыя або слугі падпарадкоўваліся ня толькі добрым ды ціхім уладам або ўрадоўцам, але і свавольным.

Дзеля гэтага павінен Хрысьціянін слухацца свайго гаспадара, служыць яму і тое, што ён скажа, мае рабіць. А калі бваладар, князь або які іншы начальнік, нават пастыр, супраць Бога загадаў штосьці зрабіць, тады ўжо ня мусіць Хрысьціянін яго слухацца, але, звычаем сьвятых Апосталаў, мае адказаць: «Болей трэба слухацца Бога, чым людзей» (Дзеі 5: 29).

Гэтаксама ня маем слухацца ані роднага бацьку, ні нават анёла, калі яны ад Бога адводзяць або загадваюць ня верыць Ягонаму Слову, або прымушаюць супраць Слова Ягонага рабіць. Бо тады ўжо бацька – ня бацька, але чужы; гаспадар – не гаспадар, але разбойнік; пастыр – ня пастыр, але воўк; анёл – не анёл, але д'ябал (Мц. 10: 35-36).

Таму, кажу, у такім выпадку іх ня слухайся. Бо Хрыстос так сказаў: «Прыйшоў Я аддзяліць чалавека ад бацькі, дачку — ад маткі яе, сынавую — ад сьвякрухі яе. Дык будуць непрыяцелямі чалавеку хатнія ягоныя. Хто любіць больш бацьку ці матку, чым Мяне, той ня варты Мяне» ды гэтак далей (Мц. 10: 35-36). Зноў, Паўла да Галятаў казаў: «Але калі б нават мы або анёл зь неба абвяшчаў вам нешта іншае, чым тое, што мы абвяшчалі вам, хай будзе анатэма» (Гал. 1: 8).

На гэтыя словы мусілі б памятаць тыя, што сёньня ня хочуць даць мейсца Божаму Слову або дзеля звычаяў бацькоўскіх, або дзеля знакаў, цудаў, або дзеля зьяўленьня анёльскага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці належыць Хрысьціяніну быць ва ўрадзе?

**АДКАЗ**

Перш, чым адкажу на гэтае пытаньне, трэба нам добра разгледзець у Божым Слове: ці то ўрад – справа добрая, ці то благая. Калі знойдзем у Божым Слове, што ўрад – справа добрая, то чаму Хрысьціянін ня мае быць ва ўрадзе? Зноў жа, калі знойдзем, што ўрад – справа благая, то і нягожа Хрысьціяніну быць урадоўцам.

Пра кожную рэч зможаш даведацца, якой яна будзе, калі разгледзіш яе пачынальніка або прычыну. Бо калі знойдзеш, што прычына ды пачынальнік нейкай рэчы Сам Госпад, тады ўважай гэтую рэч за добрую. Зноў, калі знойдзеш, што нейкай рэчы пачатак даў д'ябал, не ўважай яе за добрую, нават калі яе палюбяць вочы ды чалавечы розум.

Але, каб не заходзіць далёка, паглядзім, хто паставіў валадароў, князёў, ваяводаў ды іншых начальнікаў. Тое, аднак, усё Пісьмо і Старога, і Новага Запавету сьведчыць, што Бог усіх іх садзіць на іхнія пасады. Так бо ў Прыповесьцях Салямона мудрасьць, — значыць, Сын

Притчах Соломоновых премудрость, — то естъ Сынъ Божій, — рече: «Мною Царие царствуют и силніи пишють правду, Мною велможи величествують и мучители Мною держать землю» (Притч. 8). А што можеть ясней речено быти, яко зде Сынъ Божій поведелъ, яко от Него вси Цари, Господари и Мучители?

Але погледи до Святого Писанья, не тое ли знайдеши? Моисея чи не Богъ позвал быти князем? По семъ Ісусъ Навинъ не на повеленіе ли Божіе место принялъ? Самсона, Офоніила, Гедеона, Варака, Іефу и иныхъ судей даже до Самоила людемъ Ізраилевымъ кто посылалъ? Саоула кто помазати велелъ? Давыда на царство кто избралъ? А не токмо межю людей Ізраилевых, но и посреды языческих а погань-скихъ народов от Бога цари царствують, яко Пророки о Навуходоносоре и о Кирю пишуть.

О Навходнасоре Даніилъ тако къ сыну его поведелъ: «Богъ Превышній царство и величество, славу и честь далъ Навходнасару» (Дан. 5). О Кирю пакъ у Паралипоменоне тако пишеть сам же Киръ о собе: «Вся царства земныя далъ ми Господь Богъ небесній» (2 Парал. 36; Ездр. 1). Вже явно кажному от Старого Завета, яко Богъ Самъ даеть Цари, князи и иные господари.

У Новом опять Завете тое ж ся знаходить, яко где Хрістос къ Пилату тако рече: «Не имелъ бы власти ни единоя, ашче не быти дано свыше». Явне указуеть, яко всякаа власть свыше ест, то ест от Бога. О чомъ Апостолъ къ Римляномъ доводней пишеть тако: «Несть владычество, ашче не от Бога, сушча же владычества от Бога оучинена суть. Тем же противляяйся власти, Божію повеленію противляеться» (Рим. 13: 1-14: 5). Видишь ли, яко Апостолъ владычество или урядъ от Бога быти пишеть? Прото явна речь ест, иже Богъ Самъ урадники постановилъ. А естъли Богъ постановилъ или, по Апостолу говорячи, учинилъ, мусить быти речь добраа. А естли добраа, а чого бы для не годилося хрістіанину на вряде быти?

Правда ти естъ, иже врадники забывають посполите позванья або повинностей своих. То ест не паметують, иже мають быти до подданых яко отци до своихъ детей, и бывають окрутники, мучители, лихоимци або лупежники и иншие тяжкіе трудности подъданым чинять. Да вед же для того их врядъ не переставаеть быти от Бога. Бо невже золото злаа речь а не от Бога будеть, естъли бы кто его на збытокъ або на пыху вживал? Золото ничимъ повинно, але он человекъ злый. По тому же и Царь и иный какій врядникъ будеть ли лихъ, не будеть тое вина его уряду, але самого его особы.

К тому ешче маемъ на взоръ людей святыхъ, которие на урядехъ были, яко Моисея, Іосифа, Мелхиседека, Ісуса Навина сына, Самоила, Давыда и прочих. А в Новомъ Завете Корниліа сотника, Іосифа от Арімафіа съветника, Сергіа Павла, Пафеньского Анфіпата або наместника, и прочихъ.

Прото годиться Хрістіанину урядъ держати, судити, добрихъ боро-

Божы, — кажа: «Празь Мяне і валадары валадараць, і справядліва пастанаўляюць урадоўцы; празь Мяне начальнікі загадваюць, і ўлады спаганяюць справядлівасьць» (Прып. 8). Ці можна сказаць дакладней за Сына Божага, што ад Яго ўсе валадары, гаспадары, тыраны?

Ды паглядзі Сьвятое Пісьмо, ці ж гэтага ня знойдзеш? Майсея ці ня Бог паклікаў быць князем? Пасьля яго Ісус Навін ці не паводле загаду Божага сваё мейсца прыняў? Самсона, Атніэля, Гідэона, Барака, Ефтая ды іншых судзьдзяў, аж да Самуэля, народу Ізраэльскаму хто пасылаў? Саўла хто памазаць загадаў? Давіда на валадарства хто выбраў? Ды і ня толькі пасярод народу Ізраэльскага, але і пасярод паганскіх народаў ад Бога валадары валадараць, як пішуць прарокі пра Нэбукаднэсара ды Кіра.

Пра Нэбукаднэсара Данііл так ягонаму сыну казаў: «Валадару, Найвышэйшы Бог даў твайму бацьку Нэбукаднэсару валадарства, вялікасьць, хвалу і веліч» (Дан. 5). Кір жа ў кнізе Кронікаў пра сябе так піша: «Усе каралеўствы зямлі даў мне Госпад, Бог нябесны» (2 Крон. 36, Эзд. 1). Са Старога Запавету ўжо кожнаму зразумела, што Сам Бог дае валадароў, князёў ды іншых гаспадароў.

У Новым Запавеце тое самае знаходзім, як, напрыклад, калі Хрыстос Пілату так сказаў: «Ня меў бы ты ніякай улады нада Мной, калі б табе не было дадзена звыш». Ясна Ён тут паказвае, што ўсякая ўлада — звыш, значыць, ад Бога. Пра гэта Апостал да Рымлянаў дакладней піша: «Бо няма ўлады, як толькі ад Бога. Каторыя ж ёсьць, Богам устаноўленыя. Дык хто працівіцца ўладзе, пастанове Бога працівіцца» (Рым. 13: 1-2). Ці бачыш: Апостал піша, што ўлада, або ўрад, ад Бога? З гэтага вынікае, што Сам Бог ставіць урадоўцаў. А калі Бог паставіў, ці, паводле Апостала, устанавіў, то гэта мусіць быць добрай справай. А калі гэта добрая справа, то дзеля чаго не належыць Хрысьціяніну быць ва ўрадзе?

Праўда, урадоўцы зазвычай забываюцца на сваё пакліканьне або на свае абавязкі. Значыць, ня памятаюць, што маюць ставіцца да сваіх падданых як бацькі да сваіх дзяцей ды бываюць бязьлітаснымі, тыранамі, хціўцамі або рабаўнікамі ды іншыя цяжкасьці чыняць сваім падданым. Але дзеля гэтага іхні ўрад не перастае быць ад Бога, бо золата не становіцца рэччу благой ды ня Божай, калі нехта карыстаецца ім празьмерна або дзеля пыхі. Ня золата тут вінавата, але той благі чалавек. Тым жа звычаем калі валадар ці іншы які ўрадовец будзе жорсткім, вінаваты будзе ня ўрад, але сам той чалавек.

Да таго яшчэ маем за ўзор людзей сьвятых, якія былі ва ўрадзе, як Майсей, Язэп, Мельхісэдэк; Ісус, сын Нуна; Самуэль, Давід ды іншыя. А ў Новым Запавеце – сотнік Карнэль, сябра рады Язэп з Арыматэі; Сергій Паўла, праконсул (гэта значыць – намесьнік) Парфскі ды іншыя.

Таму належыць Хрысьціяніну быць ва ўрадзе, судзіць, добрых абараняць, злодзееў караць, ня толькі маёмасьці, але і жыцьця пазбаўляючы, адно толькі каб справядліва. Ды ня толькі за гэта на ўрадоўцу ня будзе граху, але і тым звычаем робіць ён перад Богам удзячную спра-

нити, злыхъ карати не только на маетности, але и на горле, только бы справедливе. А не только за тое греха врядъникъ не маеть, але теже вдячную речь Богу тымъ обычаемъ чинить. А где бы того не чинилъ, то ест злыхъ не каралъ, а добримъ мирю або покоя не чинилъ, таковый урадникъ грешить, яко который повинности своей не чинить досыть. Пишеть бо Апостолъ, яко «не без оума мечь носить, а яко Божій служитель, отмьститель маеть быти въ гневе злотворяшчему». Блудять неціи, которие за грехъ мають, на уряде седячи, розбойника, или чужоложника, или иншого злочиньцу сказати на смерть и мають тое за милость або за милосердие. Але такова милость ест опачьнаа. Лепшей добрых миловати, нежели ихъ врагов. Бо той добрих не милуеть, кто злымъ волю даеть, зачимъ добрие покоя мети не могуть.

**ПЫТАНЬЕ**

Што чинити маеть подданый або слуга, естъли бы ему господинъ его злую речь учинити велелъ?

**ОТКАЗЪ**

Богъ не тако далъ власть Царомъ и инымъ врядникомъ, абы Собе болшее не заховалъ. Прото маеть ся на повеленіе царево или иного которого господаря слуга намыслити. Если ся с повеленіемъ Божіемъ згодить, ино повиненъ яко Самого Бога слухати. Если пакъ напротивъ Богу и Его Слову — не маеть чинити, бо написано: «Послушати подобаетъ Богови более, нежели человекомъ» (Деан. 5: 21-42).

Коли ся царь Саоулъ на Ерея Ахимелеха и на сыны его розгневалъ, иже былъ принялъ Давыда и ести ему далъ, и онъ мечь, которим Голиафа убилъ, выдалъ, и велелъ Саоулъ в окрестъ стояшчимъ служебникомъ, абы которы скочивши убилъ Ахимелеха и сыны его. Лечь ни одинъ от стояшчих царского повеленія исполнити не хотелъ, разве Доикъ Ідумеанинъ волю цареву нечестиве учинилъ (1 Цар. 21, 22). Прото не маеть слуга або подданы только на тое гледети, естъли господарь што велел, але естли повеленіе его згожается з Божіемъ повеленіемъ.

Теперь много людей знають правду, нижли, господаровъ своихъ деля, исповедати ее не смеють. Лечь таковыи мели бы паметовати на Слово Хрістово, где рече: «Не бойтеся от убиваюшчих тело, душю же не могушчих оубити. Убойте же ся паче могушчаго и душю и тело погубити въ геене огньней». Прото естъли господарь указуеть або войну служити, або подачокъ платити, на остатокъ и в неволю повернути, маеть Хрістіанинъ терпети и за нимъ Бога молити.

Але естъли противу Слова Божіего што чинити указуеть, не буди яко Доикъ, Саоуловъ похлебца, не чини, хотя бы самому животъ брали. Укажеть ли твой господарь иконом кланетися, паметуй противное Божіе Слово: «Не учиниши собе образа, ани ся ему поклониши», а по Апостолу: «Бегайте от ідолослуженіа» (1 Іоан 5: 1-21).

Речет ли господарь: «Призывай святых вже усопших на помочь», откажи: «Господарь мой еси ты, але Богъ, старейшый Господь гос-

ву. А калі так ня робіць, значыць: калі злодзеяў не карае, а добрым не захоўвае супакою або міру, такі ўрадовец грашыць, бо абавязак свой не спаўняе належна. Піша бо Апостал, што «не надарма ўлада носіць меч, бо ёсьць Божай уладай, спаганяючай гнеў на тым, хто робіць зло».

Грашыць той, хто, ва ўрадзе седзячы, лічыць за грэх пакараньне сьмерцю злодзея, чужаложніка або іншага злачынцу, уважаючы гэта за любоў або міласэрнасьць. Але такая любоў памылковая. Лепш добрых любіць, чым іхніх ворагаў. Бо той добрых ня любіць, хто злодзеям волю дае, дзеля чаго добрыя ня маюць супакою.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што мае рабіць падданы або служка, калі ягоны гаспадар загадаў яму зрабіць благую справу?

**АДКАЗ**

Бог даў уладу валадарам ды іншым начальнікам, але Сабе захаваў уладу большую. Дзеля гэтага служка мае разважыць пра загад валадара ці іншага якога гаспадара. Калі той загад згаджаецца з Божым прыказаньнем, тады служка павінен слухацца гаспадара як Самога Бога. Калі ж, наадварот, той загад супраць Бога ды Ягонага Слова, ня мае служка яго выконваць, бо напісана: «Болей трэба слухацца Бога, чым людзей» (Дзеі 5: 29).

Калі валадар Саўл раззлаваўся на сьвятара Ахімэлеха ды на ягоных сыноў (бо гэты сьвятар прыняў Давіда, накарміў яго ды адаў яму меч, якім ён забіў Галіята), тады Саўл загадаў тым служкам, што стаялі вакол, забіць Ахімэлеха ды ягоных сыноў. Аднак ніхто не захацеў выканаць валадарскі загад, адзін толькі Даэг Эдомец бязбожна выканаў валадарскую волю (1 Сам. 21, 22). Таму служка або падданы мае зважаць ня толькі на тое, што гэта загад гаспадарскі, але і на тое, ці згаджаецца загад гаспадарскі з Божым загадам.

Цяпер шмат людзей ведае праўду, але, дзеля сваіх гаспадароў, не асьмельваецца яе вызнаваць. Аднак такія падданыя мелі б памятаць на слова Хрыста, калі Ён сказаў: «Ня бойцеся тых, што забіваюць цела, а душы забіць ня могуць. Але бойцеся больш Таго, хто можа і душу, і цела загубіць у пекле». Дзеля гэтага калі гаспадар загадвае або на вайне служыць, або падатак плаціць, або нават у няволю пайсьці, мае Хрысьціянін цярпець ды маліцца за яго Богу.

Але калі гаспадар загадвае зрабіць нешта супраць Божага Слова, то ня будзь такім, як Даэг, Саўлаў падлізьнік, не рабі так, хаця б пагражалі твайму жыцьцю. Загадае табе твой гаспадар іконам кланяцца – памятай, што Божае Слова адваротнае кажа: «Не рабі сабе статуі і ніякай выявы, і не пакланяйся ім», а паводле Апостала: «Сьцеражыцеся ідалаў!» (1 Ян 5: 21). Скажа табе гаспадар: «Прызывай сьвятых ужо памерлых на дапамогу», адкажы яму: «Гаспадар мой — ты, але Бог, усім гаспадарам Госпад ды ўсім валадарам Валадар, іншае мне загадвае, кажучы: “Госпаду, Богу твайму, кланяцца будзеш і Яму аднаму

подьствуюшчим и Царь царствуюшчимъ, не по тому мне велить, рекучи: “Господу Богу твоему поклонишися и Тому единому послужиши”» (Матф. 4:1-11). Апостолъ пакъ сведчить, яко «единъ ходотай Богу и человеком, человекъ Ісус Хрістос» (1 Тім. 2: 1-15). По тому жь и на иншие откажешь.

**ПЫТАНЬЕ**

Што повинни родители детемъ або врадники подданымъ своимъ?

**ОТКАЗЪ**

Родителемъ Апостолъ тако науку даеть, што повинни детемъ, где къ Ефесіомъ пишет: «Отци, не раздражняйте чад своихъ, но воспитайте я въ наказаніи и въ научаніи Господнемъ» (Ефес. 5: 33-6: 10). Три речи въ одно место спойлъ Апостолъ, што повинни Отци. Напервей —выхованье, потомъ – наказанье або каранье, а на остатокъ науку.

О выхованью або выживенью не надобе много говорити. Самое бо естество або прироженіе к тому тягнеть отца и матку, абы чадомъ выживенье давали. Лечь понеже того для Богъ людей на свет попустилъ, абы Его знали. Прото не только телу выживенья потреба, але и науки, наболей о Бозе. Яко и въ Законе написано: «Скажеши Слова Божія сыномъ твоимъ» (Втор. Зак. 6). Ино отци повинни ся о дети старати, абы ся Божественное науки научили. То естъ, абы розумели о Бозе, о Законе Божіемъ, о благовествованью або о благодати Божіей, которую намъ о Сыне Своимъ далъ. Теже о страшномъ суде и о вечьномъ животе.

К тому ешче повинны родители научити сыновъ своих мастерства або ремества якого побожного, абы от него слушное выживенье напотомъ мели. Тако бо тотъ же Апостолъ на иномъ месте повелеваеть: «Да оучать же ся и наши добримъ деломъ прилежати, в нужная требованія да не будутъ бесплодны» (Тит 2: 11-3: 15). Яко бы реклъ Апостолъ: «Нехай оучаться хрістіане наукъ потребныхъ, яко Писанію, богословію, потомъ иншие судьбам, лекарству и иным почтивымъ наоукамъ, теже и воинства, дабы церкви напотом услужити могли и оумели».

Видиши бо, яко Апостолъ повелеваеть: «Да не будуть, дей, бесплодны», — по нашему: «Нехай не будуть непожиточные, але пожиточные». Паметуй же, яко не велить в печери лести, межи зверь в пустыню утекати, яко мнихи чинять и инымъ оуказуютъ. А на што бо сее? Але хочеть Апостолъ, абы есмо для спасеніа ближных наших, межи нихъ живучи, всякие труды поднимали, часом и трудности терпели, верою, исповеданіемъ и послушеством светили, яко и Хрістос рече: «Тако да просветится светъ вашь пред человекы, яко да видять ваша добраа дела и прославять Отца вашего, иже ест на небесехъ» (Матф. 5: 11-26). А яко бо Божественнаа наоука в людех множитися и рости маеть, не будутъ ли Пророкы, Апостоли и инъшие учители промешку людей жити, але по кельямъ, по лесом и кое где дремати або блудити?

служыць будзеш"» (Мц. 4:10). Апостал таксама сьведчыць: «Адзін Бог, і адзін Пасярэднік між Богам і людзьмі – чалавек Ісус Хрыстос» (1 Цім. 2:5). Тым жа звычаем і на іншыя загады адкажаш.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што павінны бацькі дзецям, або начальнікі – сваім падданым?

**АДКАЗ**

Бацькоў пра тое, што яны павінны дзецям, вучыць Апостал, калі да Эфэсцаў піша: «І вы, бацькі, не раздражняйце дзяцей вашых, але ўзгадоўвайце іх у навуцы і напамінаньні Госпадавым» (Эф. 6:4). Адразу пра тры рэчы, якія бацькі павінны дзецям, узгадаў у гэтым слове Апостал. Найперш – узгадаваньне, потым – напамінаньне або пакараньне ды, наастатак, – навуку.

Пра выхаваньне, або ўзгадаваньне, няма патрэбы шмат гаварыць, сама бо прырода, або натура, скіроўвае бацьку ды матку, каб узгадаваць дзяцей. Аднак Бог дзеля таго людзей на сьвет пусьціў, каб яны Яго ведалі. Таму чалавеку патрэбна ня толькі ўзгадаваньне, але і навука, перадусім – пра Бога, як і ў Паўторным Законе напісана: «Паўтарай Словы Божыя дзецям тваім» (Паўт. Зак. 6). Бацькі павінны клапаціцца, каб дзеці навучыліся Божай навуцы, значыць, каб ведалі пра Бога, пра Божы Закон, пра Дабравесьце, або пра любоў Божую, якую Ён даў нам у Сваім Сыне, таксама пра Апошні Суд ды пра вечнае жыцьцё.

Да таго ж павінны яшчэ бацькі навучыць сваіх дзяцей нейкаму пабожнаму майстэрству або рамяству, каб потым мелі зь яго добры прыбытак. Так бо той жа Апостал у іншым мейсцы загадвае: «Хай навучацца і нашыя быць першымі ў добрых дзеяньнях дзеля пільных патрэбаў, каб не былі яны бясплоднымі» (Ціт 3: 14). Нібыта кажа Апостал: «Няхай вучацца Хрысьціяне навукам патрэбным – Пісаньням, багаслоўю, потым іншым – юрыдычным, лекарскім ды іншым пачцівым навукам, таксама і ваеннай справе, каб потым маглі і ўмелі царкве паслужыць».

Бачыш, Апостал загадвае: «Няхай ня будуць яны бясплодныя», па-нашаму значыць: «Няхай яны будуць не беспрыдатныя, але прыдатныя». Памятай, што Апостал не загадвае лезьці ў пячоры, уцякаць да зьвяроў на пустыню, як манахі тое самі робяць ды іншым раяць. Навошта бо гэта ўсё? Але хоча Апостал, каб мы, дзеля збаўленьня нашых бліжніх, сярод іх жывучы, за ўсякую працу браліся, часам і цяжкасьці зносілі, верай, сьведчаньнем ды паслухмянасьцю нашай сьвяцілі, як і Хрыстос сказаў: «Так хай сьвеціць сьвятло вашае на віду ў людзей, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі ды хвалілі Айца вашага, Які ў небе» (Мц. 5: 16). А як бо навука Божая мае сярод людзей памнажацца ды шырыцца, калі Прарокі, Апосталы ды іншыя вучыцелі ня будуць жыць сярод людзей, але па кельях, па лясах ды і яшчэ дзе будуць спаць або распусьнічаць?

А што Отци чадамъ, тое жь Господари подданым, кажный своим, повинни. То есть, яко добрый отецъ питаеть свои сыны, а к тому добрим обычаемъ и реместву навчаеть и в наказанью держить, по тому жь и каждый Господарь — Цар ли, княс ли, воевода ли, или бояринъ, или мешчанин — кто бы только мелъ подданых або ли семью, повиненъ, мовлю, имъ сие три речи. Напервей – выхованье, потом – наоуку, а третье – наказанье або каранье. Выхованье повинен дати, хотя жь не по тому, яко отци детемъ, але станеть за его, если оного не здерешь подачками, серепшчизнами, пересудами, винами безвинными, службами тяжкими и иными вымыслами бесовскими не обложишъ а не вытягнешъ. Але о люте нашим обычаемъ.

А кто таковъ теперечи ест до подданых, абы не дралъ, абы дивных дортылевъ ко вылупенью ихъ маетности не вымыслялъ? А кто на старих а звыклыхъ повинностях переставаеть? Вси на тое ся удали, абы великие доходы мели, а потомъ, на убогих вымучивъши, на непотребные речи утраты безмерные ведуть. Иншый – на собаки накладаеть, иншій на непотребное будованье, иншый – на шаты збыточные, иншый – на пианьство, або на строе, або на похлебцы, або на игрю, а иншихъ речей не годиться и говорити. А тое все от поту, або, радней, от крови убогых людей мусить господарь або силою, або хитростию вылупити.

Ест теже и тіи, которие на непотребные речи не тераюіь, але мехи кое скрини напыхають, да вед же не лепшей за первых чинять. О сихъ Апостолъ тако пишеть: «Нубо ныне, богатіи, плачетеся рыдаюшчей о страстех ваших грядушчих, богатество ваше изгни, и ризы ваша молие поедоша. Злато ваше и сребро изоржаве, и ржа их во сведетелство противу вамъ будеть, и снесть плоти ваша, яко огонь» и прочая (Іак. 4:7-5:9). Плакатися велить Апостолъ богатымъ, але редъкого знайти, который бы плакалъ або бы каялъся того.

Другая речь, которую повинни панове подданымъ, естъ наука. То естъ повинны Господари старатися о подданных своих, абы их было кому оучити правдивое веры. Бо яко от подданных мають часные доходы, такъ, опять, мають имъ о духовных промышляти. Але и тому повиноватеству своему Господари не чинять досыть. Одни ложным учителемъ продають тые доходы, которие здавна на учители надано. А иншіи подъ себе забераютъ. Обой заровно грешать, а не только, ижь повинностей своих не чинять, але теже ижь святаа крадутъ або красти позваляють. А убогие люди великъ голодъ Божіа Слова терпять и у старом блуде за таковым голодом укрепляються.

Што на онъ часъ вы, Господари откажете, коли на страшном суде станете? Како личьбу отдасте? Не вы ли у том винни, што подданые ваши Бога не знають? Покайтеся, покайтеся, бойтеся суда Божіа. Паметуйте на Давыда цара, яко и самъ Закона Божіего училъ подданых, и таковых людей, которие бы учили, мелъ. Паметуйте Соломона, яко докуле былъ не согрешилъ идолослужениемъ, по тому жь чинилъ,

А што бацькі павінны дзецям, тое ж кожны гаспадар павінен сваім падданым. Значыць, як добры бацька корміць сваіх сыноў, а да таго ж, добрым звычаем, і рамяству вучыць, і часам карае, гэтаксама і кожны гаспадар – ці то валадар, ці то князь, ці то ваявода, ці то баярын, ці то гараджанін – калі толькі мае падданых, а тым болей – сям'ю, павінен ім, кажу, тры гэтыя рэчы: першая – выхаваньне, другая – навука, а трэцяя – напамінаньне або пакараньне. Выхаваньне павінен ты даць, хаця і не такое, як бацькі – дзецям, але хопіць зь цябе, калі ня будзеш вымагаць хабару, грашовых падаткаў, судовых пошлінаў, ня будзеш абцяжарваць беспрычыннымі штрафамі, цяжкаю службай ды іншымі д'ябальскімі выдумкамі паводле лютых нашых звычаяў.

А хто зараз такі да падданых сваіх? Хто іх не рабуе або дзівацкіх спосабаў дзеля захопу іхняй маёмасьці не выдумляе? Хто даўнейшымі, звыклымі, павіннасьцямі задаволены? Усе гаспадары прагнуць вялікіх прыбыткаў, а потым, убогіх змучыўшы, на непатрэбныя рэчы робяць бязьмерныя выдаткі. Адзін на сабак усе аддае, другі – на будоўлю, трэці – на лішнія шаты, чацьвёрты – на п'янства, або на строі, або на лісьліўцаў, або на гулянкі, пра іншыя ж рэчы і казаць сорамна. А на гэта ўсё з поту або – дакладней — з крыві ўбогіх людзей мусіць гаспадар ці то сілай, ці то хітрасьцю спагнаць.

Ёсьць таксама і тыя, што на непатрэбныя рэчы грошы не губляюць, але пхаюць іх у мяхі і скрыні ды робяць ня лепш за першых. Пра іх Апостал так піша: «Дык цяпер жа, багацеі, плачце і галасіце ў горы, якое надыходзіць на вас. Багацьце вашае збутвела, адзеньне вашае моль стачыла, золата і серабро паржавела, ды ржа іхняя будзе сьведчаньнем супраць вас і, як агонь, будзе нішчыць целы вашыя» (Як. 15: 1-3) ды гэтак далей. Плакаць загадвае Апостал багатым, але рэдка каго знойдзеш, хто б з таго плакаў або ў гэтым каяўся.

Другая рэч, якую гаспадары павінны падданым, – гэта навука. Значыць, гаспадары мусяць клапаціцца пра сваіх падданых, каб было іх каму навучыць праўдзівай веры. Бо гаспадары, маючы з падданых прыбыткі часовыя, мусяць рупіцца пра іхнія прыбыткі духоўныя. Але ж і гэты свой абавязак гаспадары не выконваюць дастаткова. Адзін фальшывым вучыцелям аддае тыя прыбыткі, што здаўна вучыцелям прызначаныя, другі сабе іх забірае. Абодва аднолькава грашаць ня толькі таму, што абавязкаў сваіх не выконваюць, але і таму, што са сьвятога самі крадуць або іншым красьці дазваляюць. Убогія ж людзі вялікі голад Божага Слова церпяць ды ў старых грахах дзеля такога голаду ўзмацняюцца.

Што тады вы, гаспадары, адкажаце, калі паўстанеце перад Апошнім Судом? Якую справаздачу дасьцё? Ці ж ня вы ў тым вінаватыя, што вашыя падданыя Бога ня ведаюць? Пакайцеся, пакайцеся, бойцеся Суду Божага! Памятайце на валадара Давіда: ён ня толькі сам вучыў падданых Божаму Закону, але і меў людзей, якія вучылі. Памятайце на Салямона: ён, пакуль балванахвальствам не саграшыў, тое самае рабіў, – значыць,

то есть, яко отецъ подданых и речію и Писаньемъ училъ, такъ иже ся и Екклесиастом, то есть казнодеемъ, написати не соромелъ. Возмите взорь от оного богочестивого Цара Іоудейскаго Осіи. О том написано, яко самъ, въступивши на кресло высокое, завешчал заветъ пред Господемъ (4 Цар. 22, 23). То есть наоучалъ подданых своих Слова Божіего.

Таковых бы и тепер Царей надобе. Але діаволъ не спить, забегаеть тому, яко можеть и умееть, верешчить черезъ свои сосуды, яко не годиться господаром Слова Божія ани учитися, ани людей навчати. Не твое дей, Господарю, дело. Лечь Духъ Святый у Святом Писанію не по тому сведчить, но всехъ к тому напоминаеть, – а наболей князей или царей и иных господаровъ, – абы Законъ Божій розумели. А чи не тако Духъ Святый на цари у псалме вопиеть або кличеть: «И ныне, царие, разумейте, накажитеся вси судяшчие землю. Работайте Господеви со страхомъ и радуйтеся Ему со трепетомъ. Пріимете наказаніе, або поцелуйте Сына» и прочаа (Псалом 2).

Бачиш ли, яко Духъ Святый повелеваеть царом розумети а придаеть «ныне», абы не откладали. Ешче велить таки им же наказатися, а діаволъ отстрашаеть вереском своим: «Не твоя речь, господарю». По третье, велить работати Господеви. А как же лепшей цар или князь поработаеть Господеви, развей естли подъданымъ откриеть волю Его, абы ю чинили. Опять, у другомъ псалме той же Духъ рече ни на кого иного, только на цари а на господари: «Возмете врата князи ваша и возмитеся врата вечьная, да вніидеть Царь славы» (Псалом 23). У томъ теже стиху показуеться, яко много на господарехъ належить, коли отвераають врата до своихъ землъ Цару славы, то есть Божіему Слову. То пакъ отвераеть княз ворота Божіему Слову, коли ся о томъ стараеть, абы было, кто бы оное проповедалъ. Але о томъ вже нехай будеть досыть.

Третяа речь, которую повинни Господари и подданым своимъ есть, по Апостолу, наказание, але о томъ вже вышшей было. Повинни теже подданымъ панове оборону, але ся таа замыкаеть и розумееть под выхованьемъ. Бо и покой залежить ко выхованью, о которомъ вже есмо мели. Окроме того, повинни Господари стеречи обеюхъ дошчок заповедей Божіих, абы противу имъ подданые не чинили. Повинни постановити и церкви, и училишча або схолы. Повинни карати Епикуреовъ, ідолослужителей, лжеучителей, волхвовъ и кривокленушчихся.

Да нехай обороняють цноту, мирь, маетности убогих и суды нехай чинять по тому, яко иные заповеди учять. Абы не убивано, не чужоложоно, не крадено, ложне не посведчано, абы тако мирь былъ межи людей. Бо и Апостолъ тако къ Тімофею пишеть: «Молю оубо прежде всего творити молитвы и моленіа, прошеніа, благодареніа за вся человекы, за цара, и за вся, яже въ власти сушчих, да тихо и безмолвено житие поживемъ въ всякомъ благоверіи и чистоте» (1 Тім. 2: 1-15).

як і бацька ягоны, вучыў падданых прыповесьцямі ды Пісьмом Сьвятым, так што і Эклезіястам, значыць, прапаведнікам, назваць сябе не саромеўся. Вазьміце за ўзор і багабойнага юдэйскага валадара Озію. Пра яго напісана, што ён, заняўшы пасад, сам узнавіў Запавет перад Госпадам (2 Валад. 22, 23). Значыць, ён вучыў сваіх падданых Божаму Слову.

Такія валадары нам і зараз патрэбныя. Але д'ябал ня сьпіць, шкодзіць гэтаму, як толькі можа ды як толькі ўмее. Верашчыць праз свае начыньні, што не да твару гаспадарам ані самім вучыцца Божаму Слову, ані іншых людзей навучаць: не твая, маўляў, гаспадару, справа. Аднак Дух Сьвяты у Сьвятым Пісьме сьведчыць адваротнае, нагадваючы ўсім, а найболей князям ці валадарам ды іншым гаспадарам, каб разумелі Божы Закон. Ці ж ня так Дух Сьвяты да валадароў у псальме зьвяртаецца або кліча: «А цяпер, валадары, зразумейце, уцямце, судзьдзі зямлі: служыце Госпаду са страхам і радуйцеся з дрыжаньнем, з пашанаю падчыняйцеся Яму, каб не загневаўся» і гэтак далей (Пс. 2).

Ці бачыш, што Дух Сьвяты загадвае рабіць валадарам ды далучае «зараз», каб надалей не адкладалі? Ды яшчэ Ён загадвае зразумець перасьцярогу, але д'ябал пужае сваім верашчаньнем: «Не твая справа, гаспадару!» Таксама Дух Сьвяты загадвае служыць Госпаду. А чым жа лепш валадар або князь паслужыць Госпаду, як ня тым, што адкрые падданым Ягоную волю, каб яе спаўнялі? Зноў жа, у іншым псальме Дух Сьвяты казаў не каму іншаму, як валадарам ды гаспадарам: «Адчыніце, князі, брамы вашыя, каб увайшоў Валадар Славы» (Пс. 23). У гэтым вершы таксама паказана, як шмат залежыць ад гаспадароў, бо яны адчыняюць брамы сваіх земляў перад Валадаром Славы, – значыць, перад Божым Словам. Адчыняе ж князь брамы перад Божым Словам тады, калі клапоціцца, каб было каму Яго прапаведаваць. Але пра гэта ўжо досыць.

Трэцяя рэч, якую павінны гаспадары сваім падданым, паводле Апостала, пакараньне, але пра гэта ўжо вышэй гаварылася. Павінны таксама паны сваіх падданых абараняць, але абарону азначае ды мае на ўвазе выхаваньне, бо і супакой прыналежыць да выхаваньня, пра што мы ўжо казалі. Акрамя таго, павінны гаспадары сачыць, каб падданыя не парушалі дзесяць Божых прыказаньняў. Павінны засноўваць і цэрквы, і вучэльні або школы. Павінны караць эпікурэйцаў, балванахвальцаў, фальшывых настаўнікаў, чарадзеяў ды крывадушных сьведкаў.

Ды няхай абараняюць цноту, супакой, маёмасьць убогіх, ды судзяць няхай паводле таго, як вучаць дзесяць прыказаньняў: каб ніхто не забіваў, не чужаложыў, ня краў, хлусьліва ня сьведчыў, каб супакой быў паміж людзей. Бо і Апостал так Цімахвею піша: «Дык малю найперш, каб заносілі просьбы, малітвы, умольваньні і падзякі за ўсіх людзей, за валадароў і за ўсіх тых, што знаходзяцца пры ўладзе, каб маглі мы весьці жыцьцё спакойнае з усёю пабожнасьцю і прыстойнасьцю» (1 Цім. 2: 1-2).

Для того велить Апостолъ молитися за властителей, абы есмо тихо и безмолвено пожити могли. Але не только тое обачь, яко Апостолъ для мира молитися за господари указуеть, лечь и тое розбачити надобе, для чого мирь потребный. Сего света бо людие для тое причины мирь, або покой, любять, абы тако у роскошахъ а того живота сластехъ жити могли. Але Апостолъ не для того мира жадаеть, но абы ся вера Хрістова а добрие норовы ширити могли. Бо тако рече: «Да тихо и безмолвено поживем въ всяком благоверіи и чистоте». Не рече: «Въ всяких сластехъ, збыткахъ и иных таковых».

Памятуй же, для чого потребный мирь или покой Христианомъ, – абы ся заховати могло благоверіе и чистота. То естъ абы была слобода учити церковъ, наказовати молодых людей и добрим норовом приставляти. Бо тое дело потребуеть мира або покоя. Брань пакъ или война мешаеть тые речи. Бо нельза людемъ сходитися певных часовъ на певные места. Нельзя наказанья норовом постановляти, судовъ чинити, наставником платити, дела кажного дозерати, приходовъ отберати, естъли бы, мовлю, мира Богъ не далъ.

А на том о повинностех господарских на тотъ час досыть.

**ПЫТАНЬЕ**

Подданные, опять, што Господаромъ своимъ должни?

**ОТКАЗЪ**

Напервей повинни ся подданные за свои господари молити Богу, яко есмо от Апостола чули, хотя жь добрие будуть, хотя жь и недобрые. Повинни их справы на добрую сторону выкладати, а о них не мають лихо говорити ани осужати, яко Богъ Моисеомъ написалъ: «Богомъ да не поругаешися и князю людей твоих зла не induced» (Исход 22). Повинни их у великой чти мети. Повинни имъ добра жычити. Повинни имъ звыклые подачки платити и часу потребы незвыклых поступовати, только бы могли изнести. А коротко говорячи, оное ся наоуки подданые мають деръжати, которую даеть Апостолъ, тако къ Римляном пишючи: «Роздадите всем долгы: ему же уброкъ – уброкъ, ему же дань — дань, ему же страх — страх, ему же честь — честь» (Рим. 13: 1-10).

По тому жь дети родителем своим повинни служити, любити, слухати, надъ тое живити, приодевати и всякую вчасность чинити. Тежь грехы ихъ закривати. Яко учинили сынове Ноего Симъ и Іафетъ, коли ся ихъ отецъ, спивши виномъ, обнажил, они, закривши собе очи и отворотивши лица своя, покрили срамоту его. Тако повинны сынове чинити отцом своим, а подданые – господаромъ, ученицы – учителемъ, овцы – пастыромъ.

Лечь теперь подданые в обычаю того не мають, хотя жь легкие грехи господаровъ своих видять, гудять и розширають, а часом, хотя жь чого не чинять, на них складають и на лихоимание их нарекають. А того не обачають, иже тое сами у Бога заслугують, абы имъ таковые

Дзеля таго Апостал загадвае маліцца за гаспадароў, каб мы маглі жыць спакойна. Але ня толькі тое зважай, што Апостал дзеля супакою загадвае маліцца за гаспадароў, бо важна і тое разгледзець, навошта супакой патрэбны. Людзі гэтага сьвету мір або супакой любяць таму, што тады могуць жыць у раскошы ды ў пажаданьнях гэтага сьвету. Але Апостал жадае міру дзеля таго, каб маглі пашырацца вера ў Хрыста ды добрыя норавы, бо так сказаў: «Каб маглі мы весьці жыцьцё спакойнае, з усёю пабожнасьцю і прыстойнасьцю жыць маглі». Не гаварыў Апостал: «Каб жыць нам ва ўсякіх пажаданьнях, свавольствах ды ў чым падобным».

Памятай жа, дзеля чаго Хрысьціянам патрэбны мір або супакой: каб маглі захавацца пабожнасьць ды чысьціня, – значыць, каб была свабода вучыць царкву, настаўляць маладых людзей ды прызвычайваць іх да добрых нораваў. Бо гэтыя справы патрабуюць міру або супакою. Сваркі ж або вайна шкодзяць гэтым справам. Нельга бо тады людзям зьбірацца ў пэўны час у пэўным мейсцы. Нельга добрым норавам вучыць, судоў чыніць, вучыцелям плаціць, справу кожнага разглядаць, ахвяраваньні зьбіраць, — калі, кажу, Бог ня даў міру.

І на гэтым пра гаспадарскія абавязкі ўжо досыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Падданыя, зноў жа, што павінны сваім гаспадарам?

**АДКАЗ**

Найперш падданыя павінны маліцца Богу за сваіх гаспадароў — як чулі мы ад Апостала — і за добрых, і за благіх. Павінны іхнія справы на добрае разумець ды ня мусяць пра гаспадароў ліхое казаць або іх асуджаць, як Бог праз Майсея казаў: «Ня блюзьні Богу і не праклінай начальніка народу твайго» (Вых. 22). Павінны мець гаспадароў у вялікай пашане. Павінны зычыць ім добрага. Павінны плаціць ім звыклыя падаткі ды дапамагаць у час раптоўнай патрэбы, каб маглі яе зьнесьці. Карацей кажучы, той навукі падданыя мусяць трымацца, якую дае Апостал, так да Рымлянаў пішучы: «Аддавайце ўсім належнае: каму падатак – падатак, каму мыта – мыта, каму страх – страх, каму пашану – пашану» (Рым. 13: 7).

Такім жа чынам дзеці павінны сваім бацькам служыць, іх любіць, слухацца, а да таго – іх карміць, апранаць ды ўсякую ласку ім аказваць. Таксама грахі іхнія пакрываць, як зрабілі Сэм ды Яфэт, сыны Ноя. Калі іхні бацька, напіўшыся віна, ляжаў голы, яны, закрыўшы сабе вочы і адвярнуўшы свае твары, прыкрылі ягоную голасьць. Так павінны сыны рабіць сваім бацькам, а падданыя – гаспадарам, вучні – настаўнікам, авечкі – пастырам.

Аднак зараз падданыя ня маюць такога звычаю: бачачы нават малыя грахі сваіх гаспадароў, пра тое гамоняць ды чуткі пускаюць, а часам тое, што гаспадары не рабілі, пра іх выдумляюць ды скардзяцца на іхнюю хцівасьць. Ды ня бачаць, што самі заслужылі перад Богам, каб

господари давалъ. Іовъ бо пишеть, яко Богъ царствовати допушчаеть человека лицемера, грехъ людьских деля (Іовъ 34). А прото хотя жь бы Господарь былъ не устроиливъ, не мають подданые о ним клеветати, ниже его злоречити, але покаятися а къ Богу молитися, абы сердце господарское инуды повернулъ, понеже у руках Его Самого естъ, яко Соломон написалъ: «Той Самъ накланяеть е камо въсхочеть» (Притч. 21).

Надобе, мовлю, подданым покаятися, а къ Богу навратитися. Бо таковым обецалъ дати пастыре по сердцю Своему (Ерем. 3), о чомъ у Пророка тако рече: «Обратитеся къ Мне, сынове, наврашчаюшче,— рече Господь,— яко Азъ обладати буду вами и пріиму вас, единого от града и два от рода. И въведу вас на Сіонъ, и дам вам пастыре по сердцу Моему, и пасти будутъ васъ пасаій з разумомъ». Видиш ли, яко по обычаемъ людей даеть имъ Богъ преложеные и пастыре? А такъ, не маем на господари, естъли бы тяжкие были, але сами на себя нарекати и виновати.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ караеть проступники сего пятого слова? То естъ и отцевъ або панов, и дети або подданых, коли не чинять повинностем своимъ досыть?

**ОТКАЗЪ**

Обецал Богъ карати и караеть уставичне яко дети непослушные, тако родители недбалые. По тому жь преложоных и подданых, которие не памятують на свой урадъ. А напервей о родителех маемъ на взор Илиа жерца, который ачь самъ былъ побожный, але иже сынов своих не казнилъ, вельми Бога розгневалъ, иже и Богъ от себе откинулъ (1 Цар. 2). Сам теже Христос поведелъ тако: «Кто бы соблазнилъ единого от малых сих, веруюшчих в Мя, оунее ему да обеситься жерновъ осельскій на вый его, и потонеть въ пучине морстей» (Матф. 18: 1-9).

Потом о пастырехъ злыхъ явное письмо, иже тяжко мають быти карани. Наболей у Пророка Езекіила тако им Богъ мстити обецуеть: «Внегда глаголю безаконнику: “Смертию умреши”, ты же не возвестиши ему, ни съглаголеши, крови его от руки твоея взышчу» (Езекі 33). А на ином месте у того ж Пророка тако написано: «Се глаголеть Адонай Господь, оле пастухи Ізраилеви. Еда пасутся пастуси сами? Не овця ли оубо пасут пастуси? Се млеко ядясте, и волною одевастеся, и тучное закалясте, а овецъ Моих не пасосте. Немогшагося не подясте, и боляшчаго не врачевасте, и сокрушенаго не обязасте, и оуязвенага не зарастите» и прочая (Езек. 34). И на конецъ тако рече: «Занеже не бе пастыря, ниже посешчаху пастыри стада Моего, но пасошя пастыри сами себе, а овецъ Моих не пасошя. Сего ради слышите Слово Господне, се глаголеть Адонай Господь: Се Азъ на пастухи, и взышчу овецъ Своих от руку их» и прочаа.

Ён даў ім такіх гаспадароў. Гіёб бо піша, што Бог, дзеля людзкіх грахоў, дапускае караляваць крывадушніка (Гіёб 34). Таму, нават калі гаспадар не дабрадзейны, няхай падданыя на яго не гаворацць, няхай яго не зламовяць, але няхай пакаюцца ды моляцца Богу, каб Ён перамяніў сэрца гаспадара, яно бо ў Божых руках, як Салямон напісаў: «Бог паварочвае гаспадарскае сэрца, куды Сам хоча» (Прып. 21).

Патрэбна, кажу, падданым пакаяцца ды навярнуцца да Бога, бо такім Бог абяцаў даць пастыраў па сэрцу Свайму. Пра гэта ў Прарока так Ён сказаў: «Вярніцеся, дзеці няверныя, — кажа Госпад, — бо Я — Госпад ваш; і Я вазьму вас, аднаго з кожнага гораду і двух з кожнага роду, і завяду вас на Сыён. І дам вам пастыраў паволе сэрца Майго і будуць яны пасьвіць вас разумна і разважна» (Ярэм. 3). Ці ж ня бачыш, што паводле звычаяў людзей Бог дае ім начальнікаў ды пастыраў? Таму мусім не на ліхіх гаспадароў, але на саміх сябе наракаць ды саміх сябе вінаваціць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае парушальнікаў гэтага пятага слова? Значыць, і бацькоў або паноў, і дзяцей або падданых, калі яны абавязкаў сваіх не спаўняюць?

**АДКАЗ**

Абяцаў Бог пакараць і карае заўсёды як дзяцей непаслухмяных, так і бацькоў нядбайных. Гэтаксама Ён робіць з начальнікамі ды падданымі, якія ня памятаюць на свае абявязкі. Што ж да бацькоў, маем за прыклад сьвятара Ілія, які, хаця і быў сам пабожны, але сваіх сыноў не пакараў. Вельмі ён гэтым Бога разгневаў, і Бог адкінуў іх ад Сябе (1 Сам. 2). Сам Хрыстос так казаў: «А хто б згоршыў аднаго з малых гэтых, што ў Мяне вераць, лепш было б яму прычапіць камень млыновы на шыю і ўтапіць у глыбіні мора» (Мц. 18: 6).

Што ж да благіх пастыраў, яўна бачым зь Пісаньня, што будуць яны цяжка скараныя. Найболей у Прарока Эзэкіля Бог так абяцае ім помсьціць: «Калі Я злачынцу скажу: “Бязбожнік, ты сьмерцю памрэш”, — а ты нічога ня скажаш, каб адвесьці злачынцу ад ліхой дарогі, то ён памрэ за свой грэх, але адказнасьць за яго сьмерць Я ускладу на цябе» (Эз. 33).

А ў іншым мейсцы ў таго ж Прарока так напісана: «Гэта кажа Госпад Бог: Гора пастырам Ізраэля, каторыя пасьвяць самі сябе! Ці ж пастыры не павінны пасьвіць авечак? Вы напіліся малака, паадзяваліся ў воўну, забівалі, што тлустае, аднак статкі авечак ня пасьвілі: што слабое было, не ўзмацнялі; што хворае, не аздараўлялі; што скалечанае, не заглядалі» (Эз. 34) ды гэтак далей, а напрыканцы так Бог сказаў: «За тое, што статак Мой стаўся рабункам і авечкі Мае ня мелі пастыра, бо пастыры Мае не шукалі авец Маіх, але пасьвілі саміх сябе, а статку Майго ня пасьвілі, дзеля таго вы, пастыры, слухайце слова Госпада. Вось што кажа Госпад Бог: Вось Я супраць пастыраў. З рукі іх Я запатрабую статку Майго» (Эз. 34) і так далей.

Нехай бы погледели обой пастыри – и духовные и земские – до тое главы, ачей бы пильнейшими стали вряду своего. Тое жь знайдешь у Пророка Ісаій с початку пророчества, где оных князей, которые для посулъ злочинчовъ не караюṭь, обешчники татем зоветь. Читай теже о пастырех у того жь Ісаіи главу 56, у Іереміи – главу 24, у Захаріи – главу 11. И на иных местех.

Детем теже и подданымъ непослушным назначилъ Богъ каранье у том же слове, где рече: «Естли хочешь долго жити на земли». Яко и сами на око видимъ, ижь сынъ непослушный або который бы отца не чтилъ не можеть долго быти на свете. Велелъ Богъ таковых убивати (Исход 21). А хотя жь урядъ не караеть, предся Богъ мститься над таковым, ижь его або кто забиеть, або повесять, яко Соломонъ въ Притчах написалъ: «Око ругаешчиеся отцу своему, иже гордит плодом матеры своея, выклюють е вранове от дебріа и снедять е птенци орли» (Прит. 30). И маемъ много таковых взоровъ у Святом Писанью, яко ся ни одному сыну не минуло, который въ чти отца своего не мелъ.

Хамъ, Ноего сынъ, иже ся с пианого отца насмеялъ, проклятъ и с потомством на веки (Быт. 9), абы былъ неволникомъ.

Авесаломъ, иже противу отца своего Давыда руку поднялъ, на дереве за волосы повислъ и убитъ (2 Цар. 18).

Амалехитянина велелъ Давыд убити (2 Цар. 1), иже сам на себе сказалъ, яко царя Саоула убилъ.

Сестра Моисеова Маріам прокаженіемъ от Бога скарана была, иже противу Моисеа врядъника говорила (Числа 12). Прото Соломон написалъ: «Бойся Господа, сыну мой, и Царя, и съ насмеваючи не дружися, яко скоро приходить погибель их» (Притч. 24).

Корея, Дафана и Абирона земля живых пожарла, иже противу Моисеа и Аарона репътали (Числа 16).

За нашое оуже памяти у Немецких сторонахъ докольки десять тисечей людей сельских убито, иже были въстали противу господаром своимъ.

Павелъ бо Апостолъ рече: «Противляшчейся власти, собе судъ пріемлють» (Рим. 13: 1-10). Тое же и Самъ Господь къ Петру поведелъ: «Вси пріемшей ножь, ножемъ погыбнуть» (Матф. 26: 6-56). Той пріимаеть ножь или меч, кому его Богъ не даеть, але ся самъ за нь береть. Яко розбойники и вси, которіе силою люди подъ себе забераютъ а собе им служити велять.

**ПЫТАНЬЕ**

Што тым будеть, они же тому пятому слову послушни?

**ОТКАЗЪ**

Отци, которіе чада своя по повеленію Божіему в благоверію и в наказанію выховывають, великою потомъ потеху с них меванють. Яко Духъ Святый Давыдом обецалъ, где тако пишеть: «Жена твоя яко лоза плодовита въ странах дому твоего. Сынове твои яко новорасли мас-

Няхай бы пагледзелі ўсе пастыры – і духоўныя, і сьвецкія – той разьдзел, можа, сталі б пільнейшымі ў сваіх абавязках. Гэта ж самае знойдзеш у Прарока Ісаі напачатку прароцтва, дзе ён называе супольнікамі злачынцаў тых князёў, якія, дзеля падарункаў, не караюць злачынцаў. Чытай таксама пра пастыраў у таго ж Ісаі разьдзел 56, у Ярэміі – 24, у Захарыя – 11, ды ў іншых мейсцах.

Дзецям, таксама як і непаслухмяным падданым, Бог пастанавіў пакараньне ў тым жа прыказаньні, калі сказаў: «Калі хочаш доўга жыць на зямлі». Ды на свае вочы бачым, што сын непаслухмяны або той, які не шануе бацьку, ня можа доўга жыць на зямлі. Загадаў Бог такіх забіваць (Вых. 21). Ды нават калі ўрад не скарае, Бог усё адно такому адпомсьціць: такога ці заб'юць, ці павесяць, як Салямон у Прыповесьцях напісаў: «Вока, каторае бацьку высьмейвае ды ня хоча слухаць маткі — хай выдзяўбуць крукі над ракою або хай зьядуць арляняты» (Прып. 30). Ды маем шмат такіх узораў у Сьвятым Пісьме: аніводнага сына, калі ён не шанаваў свайго бацьку, не абмінула пакараньне.

Хам, Ноеў сын, пасьмяяўся зь п'янага бацькі ды быў пракляты з патомствам сваім навек, стаўшыся паднявольным (Роду 9).

Абесалом за тое, што ўзьняў руку супраць свайго бацькі Давіда, зачапіўся валасамі за дрэва ды быў забіты (2 Сам. 18).

Амалекца Давід загадаў забіць (2 Сам. 1), калі той засьведчыў пра сябе самога, што забіў валадара Саўла.

Мірыям, сястру Майсея, Бог скараў праказаю, бо яна гаварыла супраць начальства Майсеявага (Лічбы 12). Пра гэта Салямон напісаў: «Бойся Госпада, сыне мой, і валадара ды не супольнічай з тымі, хто зь іх сьмяецца, хутка бо прыйдзе згуба на такіх» (Прып. 24).

Карэя, Датана і Абірама зямля праглынула жывымі, бо яны наракалі супраць Майсея ды Аарона (Лічбы 16).

Пры нашай ужо памяці ў землях нямецкіх было забіта амаль дзесяць тысяч сялянаў, бо яны паўсталі супраць сваіх гаспадароў.

Апостал Паўла казаў: «Хто супраць улады паўстае, сабе суд рыхтуе» (Рым. 13: 2). Тое ж і Сам Госпад Пятру гаварыў: «Бо ўсе, што за меч хапаюцца, пагінуць ад мяча» (Мц. 26: 52). Таго напаткае нож або меч, хто сам, бяз Божага дазволу, за яго бярэцца: злачынцаў ды ўсіх тых, хто сілай людзей сабе падпарадкоўвае ды змушае іх сабе служыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што будзе тым, што гэтага пятага прыказаньня паслухаюцца?

**АДКАЗ**

Бацькі, якія, паводле Божага загаду, выхоўваюць сваіх дзяцей у пабожнасьці ды ў строгасьці, потым маюць зь іх вялікую пацеху. Бо Дух Сьвяты праз Давіда абяцаў: «Жонка твая — як плодная галінка вінаграду ў пакоях дому твайго, дзеці твае — як парасткі аліўныя вакол твайго стала» (Пс. 127). Салямон таксама казаў: «Мудры сын — ра-

линные окрест трапезы твоея» (Псалом 127). Соломон теже рече: «Сынъ мудрый возвеселить отца» (Притч. 10). Тако былъ Богъ Іакова оувеселилъ, егда увиделъ сына своего Іосифа всее земли Египетское господаремъ (Быт. 47). Потому же Давыд веселъ былъ, коли Соломона на престоле своим оузрелъ (3 Цар. 1).

Пастыром теже добримъ обецуеть Хрістос, яко будуть мети часть у Царствіи Небесномъ. Тако бо у притчы рече: «Блазенъ рабъ той, его же пришед господин его обрашчеть тако творяшча. Аминь глаголю вамъ, яко над всемъ именіемъ своим поставить его» (Матф. 24: 42-51). А в притчы о талантех оному, который пятию талантъ другую пять принялъ, то ест который много людей къ Богу навернулъ, тако рече: «Добрый рабе, благы и верный, въниди в радость Господина своего» (Матф. 25: 14-30). Даніилъ теже пишеть, яко учени процветуть, акы светъ небесный. И кои къ правде наоучают многыхъ, акы звезды въ вечные вечности (Дан. 12).

Господари, которіе подданыхъ своихъ любят, право судять и уряду своему досыть чинять, не могуть без того быти, абы им Богъ не благославилъ. Яко Самуилъ къ Саоулу и подданным его рече: «Будете ли ся бояти Господа, и поработаете Ему, и послушаете ли гласа Его, и не отвержете ли ся словесъ Его, будете и вы и Царь, иже царствуеть над вами, наследуюшче Господа Бога вашого» (1 Цар. 12). То естъ благословени будете во всех делех своих, и царство долго стояти будеть. Тое жь написалъ Соломонъ, где рече: «Царь он же судить въ правде нишчимъ, престолъ его въ веки оукрепится» (Притч. 29).

Справедливым господаром даеть Богъ и долгие лета, яко тот же Соломон рече: «Царь он же возненавидить неправды, долго время поживеть» (Притч. 28). Таковым господаром даеть Богъ силу на их враги, яко Давыду, Езекію и прочим. Даеть имъ и потомство, яко написано: «Силно на земли будеть семя его, родъ праведных благословиться, слава и богатество в дому его» (Псалом 111).

По тому жь и чада або молодые люди мають и обетницы многие, и приклады. Яко напервей у том же таки слове придана естъ обетница, где Богъ рече: «Хочеши ли долго пожити на земли». Которих слов не маемъ собе такъ легко важити, але им достаточне верити, ижь то певна речь, кто послушенъ старшимъ, того Богъ на земли дольго захovуеть и всем его деломъ благословить. Яко на взорь маемъ сыны Ноя – Іафета и Сима – которим Богъ благословилъ, иже отца своего въ оучтивости мели (Быт. 9).

У пророка Ереміи о сынех Іонадавовых написано, иже вина пити не хотели того для, яко имъ отецъ былъ заповедалъ. А ижь вельми статочніи у томъ были, велелъ имъ Богъ Ереміи тако поведети: «Се глаголеть Господь: Понеже послушашя сынове Іонадавли сына Рихавова заповеди отца своего творити, елико заповеда имъ отецъ ихъ, не оскудееть мужь сыновъ Іонадавлихъ сына Рихавля, предстояй пред лицемъ Моим, вся дни земля» (Іерем. 35). Мели бы сынове и вси,

дасьць для бацькі, дурны сын — згрызота для маткі» (Прып. 10). Так Бог пацешыў Якуба, калі той убачыў свайго сына Язэпа гаспадаром усёй зямлі Эгіпецкай (Роду 47). Ды і Давід усьцешыўся, калі ўгледзеў Салямона на сваім пасадзе (1 Валад. 1).

Таксама добрым пастырам Хрыстос абяцае, што яны атрымаюць сваю частку ў Валадарстве Божым. Так бо ў прыповесьці сказаў: «Дабраславёны той служка, якога, прыйшоўшы, гаспадар знойдзе, што ён так робіць! Сапраўды кажу вам, што паставіць яго валодаць усёю сваёй маёмасьцю» (Мц. 24: 46-47). А ў прыповесьці пра таленты таму служцы, якому было даручана пяць талентаў і які зарабіў імі другія пяць талентаў, — значыць, навярнуў да Бога шмат людзей, — Хрыстос так сказаў: «Добра, служка добры і верны; у малым ты быў верны, дам табе ўладу над многім; увайдзі ў радасьць гаспадара твайго» (Мц. 25: 21). Данііл таксама піша: «Навучаныя будуць ясьнець, як сьвятло паднябеснае, а тыя, што навучылі праўдзе многіх, заясьнеюць як зоркі ў вякі вечныя» (Дан. 12).

Гаспадары, якія любяць сваіх падданых, судзяць справядліва ды спаўняюць свае абавязкі, не застануцца бяз Божага дабраславенства, як Самуэль сказаў Саўлу і ягоным падданым: «Калі будзеце баяцца Госпада, і будзеце служыць Яму, і будзеце слухаць голас Яго, дык будзеце вы і валадар, каторы валадарыць вамі, хадзіць за Госпадам, Богам вашым» (1 Сам. 12) – значыць, дабраслаўлёныя будзеце ва ўсіх сваіх справах ды валадарства будзе доўга трываць. Тое ж напісаў Салямон, калі сказаў: «Валадар, які справядліва судзіць бедных, навякі ўмацуе пасад свой» (Прып. 29).

Справядлівым гаспадарам Бог дае доўгае і жыцьцё, як той жа Салямон сказаў: «Неразумны валадар шмат чыніць крыўды, а хто ненавідзіць хцівасьць, павялічвае свае дні» (Прып. 28). Такім гаспадарам Бог дае моц супраць іхніх ворагаў, як даваў Давіду, Эзэкіі ды іншым. Дае ім таксама патомства, як напісана: «Магутным будзе семя яго на зямлі, дабраслаўлёным будзе род пабожных. Дастатак і багацьце ў доме ягоным» (Пс. 111).

Тым жа звычаем і дзеці або маладыя людзі маюць многія абяцаньні ды прыклады. Як, найперш, у тым жа слове далучана абяцаньне, дзе Бог сказаў: «Калі хочаш доўга жыць на зямлі». Да гэтых словаў мы ня можам ставіцца легкадумна, але мусім ім верыць, бо гэта пэўная рэч: таго, хто паслухмяны старшым, Бог доўга захоўвае на зямлі ды ўсе ягоныя справы дабраслаўляе. За ўзор маем Яфэта ды Сэма, сыноў Ноя, якіх Бог дабраславіў, бо да свайго айца яны ставіліся пачціва (Роду 9).

У прарока Ярэміі напісана пра сыноў Ёнадабавых, што яны не хацелі піць віна, бо так ім запаведаў айцец. Ды як вельмі таго пільнаваліся, загадаў Бог Ярэміі так ім сказаць: «Гэта кажа Госпад Магуцьцяў, Бог Ізраэля: За тое, што вы былі паслухмянымі Ёнадабу, бацьку вашаму, спаўняючы ўсе яго прыказаньні і захоўваючы ўсё, што ён загадаў,

которіи над собою Господаровъ мають, добре на тотъ взор памятати, абы верили, яко их послушенство, которое старшимъ чинять, естъ речь вельми Богу вдячнаа, которую от нихъ тако пріимаеть, яко бы тое Ему Самому чинили. Прото бо и Апостолом поведелъ: «Иже васъ приемлеть, Мене приемлеть» (Матф. 10: 37-11: 1). Апостол теже паробком тако пишеть, абы своим господаром не такъ служили, яко человеком, але яко Самому Хрісту (Ефес. 5: 33-6: 9). Великая то естъ потеха и неволникомъ, коли ведають, иже их послуга, или робота, подобаеться Богу.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори шостое слово Божіих заповедей.

**ОТКАЗЪ**

Шостое слово естъ: «Не оубиеши».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся тое слово розумееть?

**ОТКАЗЪ**

Тако ся розумееть, яко Сам Хрістос толкуеть, где рече: «Слышасте, яко речено бысть древніимъ: "Не убиеши, иже бо ашче оубиеть, повинен ест суду". Азъ же глаголю вам, яко всяк, гневаяйся на брата своего всуе, повинен естъ суду, а иже ашче речеть брату своему: "Рака", повинен естъ сънмишчу, а иже речеть: "Юроде", повинен естъ геенне огненей» (Матф. 5: 20-26).

От сих словъ Самого Господа латве вырозумети, иже убійство естъ, не только рукою або оружіем кого убити или только бити, але теже слово прикрое або сромотное на кого выговорити, або ся гневати, або кому завидети естъ убійство, которого у симъ слове Богъ заказуеть.

Бо если бы только рукою бити або шкодити ближному заповедалъ, ино бы только рукам далъ Богъ тую заповедь на тотъ обычай: «Не подоймешь, человече, рукъ твоихъ на ближного своего». Але не тако рече, но просто: «Не убиеши», яко бы тако реклъ: «Ты, человече, со всеми чувствы, члонками, похотями и страстьми твоими, не оубиеши».

А тое естъ правое того слова вырозуменье, абы есмо ни жаднымъ обычаемъ здоровью душному и телесному ближному не шкодили, ани ему завидели, ани ся на него гневали, ани проклинали, але ему здоровья тако, яко собе, зычили.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть добрие дела того шостого слова?

**ОТКАЗЪ**

Яко оубійство естъ розно – одно на души, а другое на теле, тако и дела добрие тое заповеди двоякие суть – духовные и телесные. Телеснаа реч естъ не оубити на теле, не пособити биючому, не радити на убійство, боронити оных, которих бы кто кривдити хотелъ, часу

дзеля таго вось што кажа Госпад Магуцьцяў, Бог Ізраэля: Ня спыніцца ў Ёнадаба, сына Рэхаба, патомак, каторы будзе стаяць перада Мною» (Ярэм. 35).

Мусілі б сыны ды ўсе, хто мае над сабой гаспадароў, добра памятаць на гэты ўзор, каб верыць: іхняя паслухмянасьць, якую аказваюць старшым, — справа перад Богам вельмі ўдзячная, якую Ён так ад іх прыймае, нібыта Яму Самому тое зрабілі. Таму і Апосталам Ён казаў: «Хто вас прыймае, прыймае Мяне» (Мц. 10: 40). Таксама Апостал піша служкам, каб сваім гаспадарам не як чалавеку, але як Самому Хрысту слугавалі (Эф. 6: 7). Вялікае пацяшэньне нявольнікам, калі яны ведаюць, што іхнія паслугі або праца падабаюцца Богу.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары шостае слова Божых прыказаньняў.

**АДКАЗ**

Шостае слова: «Не забівай».

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэтае слова разумець?

**АДКАЗ**

Так разумець, як Сам Хрыстос тлумачыў, калі казаў: «Чулі, што сказана было прабацькам: "Не забівай", а хто б забіў, той будзе суджаны. А Я вам кажу, што той, хто гневаецца на брата свайго надарэмна, будзе суджаны; а хто б сказаў брату свайму: "Рака", будзе суджаны радай; а хто б сказаў: "Дурны", будзе варты агню пякельнага» (Мц. 5: 21-22).

З гэтых слоў Самога Госпада лёгка зразумець, што забойства – гэта ня толькі рукою або зброяй кагосьці забіць або толькі біць, але таксама слова прыкрае або брыдкае на кагосьці сказаць, або злавацца, або камусьці зайздросьціць – таксама забойства, якое Бог у гэтым прыказаньні забараняе.

Бо калі б Бог забараніў толькі рукою біць або шкодзіць свайму бліжняму, тады б Бог даў гэтае прыказаньне толькі пра рукі, напрыклад: «Не ўзьнімай тваёй рукі сваёй супраць твайго бліжняга». Але ня так Бог сказаў, але проста: «Не забівай», нібыта Ён хацеў сказаць: «Ты, чалавеча, з усімі тваімі пачуцьцямі, целам, пажаданьнямі ды прагненьнямі, — не забівай».

Вось правільнае разуменьне гэтага слова: каб мы аніводным звычаем ня шкодзілі здароўю душэўнаму ды цялеснаму нашага бліжняга, каб яму не зайздросьцілі, на яго ня гневаліся, яго не клялі, але зычылі яму здароўя так, як і сабе.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ўчынкі, паводле гэтага шостага прыказаньня, добрыя?

**АДКАЗ**

Як забойства бывае рознае – забойства душы і забойства цела,

голоду выховати або выживити, на воде або часу иншое пригоды ратовати – добрие суть дела, але телесные, которие и неверніи чинити могуть. Да вед же и таковыхъ делъ Богъ по насъ хочеть, абы людие промежку себе супокоем жили.

Опять, духовные дела залежать в Божіей боязни, в вере и в познанью Хріста чинити по сему слову. То есть не держати гневу на сердци своем, не мыслити о помсте, жаловати от правды обидимыхъ, хотети их боронити и онымъ пособити, латве отпушчати васьни або гневу не держати.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть грехи противу шостого слова?

**ОТКАЗЪ**

По тому жь, яко добрие дела, и грехи: одны – внутреные, а иншие – зверховные. Зверховные грехи быти розумей не урадовне тело чие, како ли будеть, вередити. Пособляти или хвалити обиду або кривду. Не боронити их, же боронити маеть. Грешять теже нерозумные лекари, аптыкари и барбири, которіи, не знаючи, зелье або лекарство дають шкодливое. Грешять теже Цари, коли несправедливую войну зачинають.

Опять, внутреные грехи суть мети хуть на мысли своей зашкодити кому, теже възненавидети кого, зла ему зычити, не жаловати, миру межи людей не жадати, незгодам ся радовати и иные таковые.

**ПЫТАНЬЕ**

Грех ли естъ убити розбойника або иного которого злочинцу?

**ОТКАЗЪ**

Урядъ от Бога на тое естъ избранъ, абы злых каралъ, а добрим покой чинилъ. Прото урядъ не грешить, коли злых караеть не только винами, битьем, але и смертію. Але кто бы, на враде не будучи, злочинцу убил, без греха быти не можеть. Бо не мает ся никто своих шкодъ або кривдъ сам мстити, ани собе меча брати, яко вышшей речено естъ.

У Моисея теже написано, яко Богъ рече: «Мне отмшчение, и Азъ въздам» (Втор. Зак. 32), тое жь и Апостолъ припоминаеть (Евр. 10: 19-31). Которими словы Богъ заказуеть, абы ся никто своеи кривды не мстилъ, але Богу помсту заховалъ. А Богъ черезъ урядъ мститься, коли той злыхъ караеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино хотя бы розбойникъ билъ, не отниматися ему?

**ОТКАЗЪ**

Урядники по Божіему росказанью повинни ся о том пилно старати, абы розбоевъ не было, яко вже речено. Да вед же если бы ся прігодило Хрістианину, же бы на него розбойник прішолъ и хотелъ

так і добрыя ўчынкі, паводле гэтага прыказаньня, дваякія – духоўныя і цялесныя. Цялесныя ўчынкі – гэта значыць не забіваць цела, не дапамагаць б'ючаму, не намаўляць на забойства, бараніць таго, каго хочуць пакрыўдзіць, падчас голаду дапамагчы або пракарміць; на вадзе або падчас іншага здарэньня ратаваць – усё гэта добрыя ўчынкі, але цялесныя, якія могуць рабіць і няверуючыя. Але ж і такіх справаў Бог ад нас хоча, каб людзі паміж сабой жылі ў супакоі.

Зноў жа, духоўныя ўчынкі паводле гэтага слова – баяцца Бога, верыць у Хрыста і пазнаваць Яго. Гэта значыць, не трымаць гневу ў сваім сэрцы, ня думаць пра помсту, прыймаць пакрыўджаных за праўду, іх бараніць ды ім дапамагаць, хутка прабачаць крыўду або гневу не трымаць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія бываюць грахі супраць шостага слова?

**АДКАЗ**

Грахі, як і добрыя ўчынкі, адны – унутраныя, а другія – вонкавыя. Вонкавыя грахі так разумей: неўрадоўна целу іншага шкодзіць, падтрымліваць ці хваліць абразу або крыўду; не абараніць таго, каго мусіш абараняць. Грашаць таксама неразумныя лекары, аптэкары ды цырульнікі, якія, ня знаючы, даюць шкодныя зёлкі або лекі. Грашаць таксама валадары, калі пачынаюць несправядлівую вайну.

Зноў жа, унутраныя грахі – у сваіх думках прагнуць камусьці шкоды, таксама кагосьці ўзьненавідзець, зычыць яму благога, супакою між людзей не жадаць, зь нязгодаў, сварак цешыцца ды падобныя рэчы.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці грэх забіць разбойніка або іншага якога злачынцу?

**АДКАЗ**

Урад абраны Богам на тое, каб благіх караць, а добрым супакой захоўваць. Таму ўрад не грашыць, калі карае благіх ня толькі штрафамі, біцьцём, але і сьмерцю. Калі ж хтосьці, ня будучы ва ўрадзе, заб'е злачынцу, — на тым грэх. Бо ніхто ня можа сам адпомсьціць за свае шкоды або крыўды, ані за зброю брацца, як ужо вышэй пра тое сказана.

У Майсея таксама напісана, што Бог сказаў: «Мая помста і аднагарода» (Паўт. Зак. 32), ды і Апостал гэта самае ўзгадвае (Гебр. 10: 30). У гэтых словах Бог кожнаму загадвае ня помсьціцца за крыўду, але Богу перадаць помсту. А Бог помсьціць праз урад, калі ўрад карае благіх.

**ПЫТАНЬНЕ**

Нават калі разбойнік б'е, не бараніцца ад яго?

**АДКАЗ**

Урадоўцы, паводле Божага загаду, павінны пільна старацца, каб не было разбоеў, як ужо гаварылася. Але калі б і здарылася з Хрысьція-

бы му живот взяти, ино маеть ся тогды по тому заховати, яко ся святіи патриархи в таковых пригодах заховали. Яко о Іакове написано, ижь ся боронилъ ангелу, домнимаючи, абы разбойник (Быт. 36). У котором взоре две речи обачь: напервей, ижь патріархъ не ждалъ, аж бы его билъ розбойникъ, яко и онъ розумелъ, бо бы тое было Бога искушати, але ся с ним взялъ и отпералъ ему, яко могъ. А другую речь обачь, яко Іаковъ не стоялъ на животъ розбойника, але только яко бы самого себе оборонилъ.

Прото и Хрістианинъ мо можеть своего живота боронити, але на чужіи животъ не маеть стояти. Да вед же если ся кому за неволею а необаченьемъ пригодило таковою непріятеля оубити, мовлю, бороначися, а не хотячи оубити, кто оубиеть, домнимаю, яко таковое оубійство от вряду не маеть быти карано. И пред Богом меншей таковый оубійца повиненъ, поневажь и под Законом обрал былъ Богъ певные места, на которие таковские втекали, они же нехотя убивали (Исход 22). А не только тое, но и явне написано, естли бы кто татя, вламывающчагося в дом его в ночи, оубилъ, не винен крови его. А естли таков от крови татя, он же только маетности отнимаеть, слободенъ, далеко подобней оному быти волному, кто розбойника, на пустом месте на животъ и на маетность восставшего, с пригоды оубилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Годить ли ся Хрістианом воевати або не? Бо о сих написано: «От Сіона изыйдеть закон, и Слово Господне из Іерусалима. И разсудить по среде языкъ, и обличить люди многы. И роскуют мечя своя на леметя, и копія своя на серпы. И не воздвигнут языкъ на языкъ меча, и не навыкнуть к тому воевати» (Ісаіа 2).

**ОТКАЗЪ**

Коли бы вси люди хрістиане истиніи былі, не было бы надобе ани судей, ани иных оурадніков. Бо правый Хрістианинъ маеть любов, которая, по Апостолу, не завидить, не пеняеть, не гордится, не злообразуется, не ишчеть своих речей, не дражнится, не вменяетъ злого, не радуется о неправде, радует же ся истине, все любить, все терпить (1 Кор. 13: 4-14: 5).

Гледи жь, коли бы такови вси были, мовлю, се естъ, коли бы вси истинными а от правды Хрістианами были, а на што бы таковим судья? Темъ же образом и о войне розумей: а яко бы тіи воевати ся оумели, которіи ани завидують, ани злого за злое пріймаютъ, вси кривды терпят, вся любят? Наболей иже не было бы и кривды кому чинити, коли бы, мовлю, вси людие оучинили ся Хрістианами не поверху только, но от правды съ всего сердца.

Але понеже Хрістиане мусять всегда, докуле зде, на земли, будут, межи злых людей жити, яко добрие рибы посреды злых, по Хрістовей притчи (Матф. 13: 47), того для и урадники, и воины у них быти мусять. Прото и Креститель святый Іоаннъ, коли его драбы, или

нінам, што на яго напаў бы разбойнік ды хацеў яго забіць, мусіць Хрысьціянін так сябе паводзіць, як паводзілі сябе ў такіх прыгодах сьвятыя патрыярхі.

Пра Якуба напісана, што змагаўся з анёлам, бо палічыў яго за разбойніка (Роду 36). У гэтым прыкладзе дзьве рэчы заўваж: патрыярх не чакаў, пакуль разбойнік на яго нападзе, бо ён разумеў, што гэта значыла б спакушаць Бога, але першы на разбойніка кінуўся ды адбіваўся, як мог. І другую рэч заўваж: Якуб не імкнуўся забіць разбойніка, а толькі сябе самога хацеў абараніць.

Таму і Хрысьціянін можа бараніць сваё жыцьцё, але чужога жыцьця ня мусіць адбіраць. Ды калі б каму здарылася выпадкова, а не наўмысна, непрыяцеля забіць, – кажу: калі хто баронячыся, а не забойства прагнучы, заб'е, – мяркую, што ўрад не павінен караць за такое забойства, ды перад Богам такі забойца менш вінаваты. Бо і пад Законам абраў Бог пэўныя мейсцы, куды ўцякаў той, хто забіў ненаўмысна (Вых. 22). Ды ня толькі гэта, але і яшчэ яўна напісана: калі хто заб'е злодзея, які ўначы ў хату ўлез, не вінаваты такі чалавек у ягонай крыві. А калі чалавек не вінаваты ў крыві злодзея, які толькі маёмасьць крадзе, тым больш не вінаваты будзе той, хто выпадкова заб'е разбойніка, паўстаўшага на жыцьцё і маёмасьць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці павінен Хрысьціянін ваяваць, ці не? Бо напісана: «З Сыёну выйдзе закон ды слова Госпадава зь Ерузаліму. Вось жа, ён будзе судзіць народы і абвінавачваць многа людзей, і launched ператочаць яны мячы свае на плугі, а дзіды – на сярпы. Не падыме народ на народ мяча і ня будуць больш рыхтавацца да бою» (Іс. 2).

**АДКАЗ**

Калі б усе людзі былі сапраўднымі Хрысьціянамі, то не было б патрэбы ані ў судзьдзях, ані ў іншых ўрадоўцах. Бо сапраўдны Хрысьціянін мае любоў, якая, паводле Апостала, «не зайздросная, не ганарыстая, не пыхлівая, не амбітная, не шукае свайго, не гняўлівая, ня памятае благога, ня цешыцца зь несправядлівасьці, але радуецца з праўды, усё пераносіць, ва ўсё верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць» (1 Кар. 13: 4-7).

Глядзі ж, калі б такімі былі ўсе, – значыць, кажу, калі б усе былі праўдзівымі ды шчырымі Хрысьціянамі, то навошта б здаўся такім судзьдзя? Тым жа звычаем і пра вайну мяркуй: ці ваявалі б тыя, што не зайздросьцяць, ня памятаюць благога, усе крыўды пераносяць, усіх любяць? Ды, перадусім, не было б каму і крыўдзіць, калі б, кажу, усе людзі сталіся Хрысьціянамі ня толькі вонкава, але праўдзіва, ад усяго сэрца.

Але раз Хрысьціяне мусяць заўсёды (пакуль тут, на зямлі, будуць), жыць сярод благіх, як добрыя рыбы сярод злых, паводле Хрыстовай прыповесьці (Мц. 13), дзеля гэтага будуць у іх і ўрадоўцы, і ваяры. Таму

людъ служебный, воспросили што бы чинити имели, не велелъ, абы службу военскую покинули, але абы войну служачи, сие три речи заховали: никого не обидели, ни оклеветали а доволни были оброки своеми (Лука 3:1-18).

Да вед же не кажное войны Хрістианинъ служити можетъ. Бо часом война бываеть несправедливаа. Яко коли Тыраннъ или мучитель какый гордый, не переставаючи на своем паньстве, чужие городы, князтва или земли силою забираеть. Таковое войны служити Хрістианину не годиться. Бо таковая война естъ разбой. А кто бы тамо человека, хотя жь не Хрістианина, оубилъ, вередилъ або обидилъ, той противу шестому слову Божіему оубійство пополнилъ. Мучитель, пакъ иже безвинне брань зачинаеть, только оубійствъ долъженъ пред Богом, колько тамо головъ ляжеть.

Опять, справедливаа война естъ, коли не для гордости, не для лакомъства, але для обороны пределовъ своих Король или Княз оружие противу врагом своим береть, отпераючи имъ, абы подданыхъ его не мордовали, не вязали, в полонъ не гнали, женамъ и девицамъ насилиа не чинили, церкви не потребили, детей не споганили або не побили, градов не спустошили, оучителей не розгонили и всякого чину доброго не помешали. С тых причинъ а на таковых людей слушнаа бываеть воина, можеть ее Хрістианинъ з доброю совестию служити.

Сее пакъ пророчество не стоить противу тому, ани отнимаеть Хрістианомъ оружіе еже на врагы, але о любви кажеть, которую промежку себе мети должни, яко есмъ вже изъ Апостола пріводилъ. К тому ознамуеть Ісаіа пожитокъ науки Евангельское, котораа от Сіона изыти мела, иже которіи ее пріимуть, оупокоини а чиши быти маютъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ караеть они же непослушни сего шостого слова?

**ОТКАЗЪ**

Напервый оубійца былъ Каинъ, который ачь ешче до сее Божіей заповеди брата убилъ, предъся у великій гневъ Божій для того оупалъ, бо и от отца отлучилъ, и от всехъ побожных потомков его, и знамя на него възложилъ, абы ся его вси остерегали а с нимъ не обшчовали. Але потом тяжъшую муку оубійцом Самъ Богъ после потопа придалъ, тако къ Ноеви рекучи: «Кто излиеть кровь человека, и излиется человеком кровъ его, по образу Божіему создан естъ человекъ» (Быт. 9).

Потому жь и в Законе поновилъ Богъ тую муку. А хотя жь часомъ злый урядъ не караеть оубіицовъ або для посуловъ, або иного чого, предъся Самъ Богъ караеть и оубійцевъ, и дружину ихъ, сиречь, оурядъ. Не можеть бо того не каравши спустити. Яко къ Каину Самъ рече: «Что сътворилъ еси, се глас крови брата твоего вопиет ко Мне от земли».

Іерусалимъ, такъ славный город и называемый святый, о тое Богъ скаралъ, яко оубійство в немъ пановало. Яко Хрістос Сам поведелъ:

і Хрысьціцель сьвяты Ян, калі ваяры спыталіся ў яго, што загадае ім рабіць, не загадаў ім пакінуць ваенную службу, але загадаў, на вайне служачы, гэтыя тры рэчы захаваць: нікога ня крыўдзіць, не намаўляць ды быць задаволенымі сваёй платай (Лк. 3:14).

Але не на кожнай вайне Хрысьціянін можа служыць. Бо часам вайна бывае несправядлівай, калі які тыран або мучыцель які пыхлівы, не спатоліўшыся сваёй дзяржавай, забірае сілай чужыя гарады, княствы або землі. На такой вайне Хрысьціянін служыць ня можа, бо такая вайна – разбой. Ды хто на такой вайне чалавека, – нават не Хрысьціяніна, – заб'е, пакалечыць або пакрыўдзіць, той, насуперак шостаму Божаму слову, забіў. Таксама мучыцель, які пачынае вайну без прычыны, столькі забойстваў прад Богам учыніў, колькі там галоў ляжа.

Зноў жа, вайна будзе справядлівай, калі валадар або князь бярэцца за зброю не дзеля пыхі, не дзеля хцівасьці, але дзеля абароны сваіх межаў ды супрацьстаіць ворагам, каб ягоных падданых не мардавалі, не вязалі, у палон ня гналі, жонак ды дзяўчат не гвалтавалі, цэркваў не вынішчалі, дзяцей не забівалі, гарады не спусташалі, вучыцеляў не разганялі ды ўсякі добры звычай ня рушылі. З тых прычынаў ды супраць такіх людзей слушна ісьці вайною, можа Хрысьціянін служыць на такой вайне з добрым сумленьнем.

Гэтае ж прароцтва ня кажа пра вайну ды пра тое, каб Хрысьціянін не ўзьнімаў мяча супраць ворагаў, але кажа пра любоў, якую паміж сабой мы мець павінны, як ужо я прыводзіў словы Апостала. Ды яшчэ аб'яўляе Ісая плён Эвангельскай навукі, якая мелася прыйсьці ад Сыёну: тыя, што яе прыймуць, будуць жыць ў супакоі ды ціхасьці.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае неслухмяных гэтаму шостаму слову?

**АДКАЗ**

Першым забойцам быў Каін, які забіў брата яшчэ да Божага прыказаньня, і гэтым вельмі разгневаў Бога. Дзеля гэтага Каін быў і ад бацькі адлучаны, і ад усіх ягоных пабожных нашчадкаў, ды быў на Каіна ўскладзены знак, каб усе яго сьцерагліся ды зь ім не супольнічалі. Але потым, пасьля патопу, Бог прызначыў забойцам больш цяжкую кару, так Ною сказаўшы: «Хто пральле кроў людзкую, і таго будзе пралітая кроў рукою чалавека, бо чалавек створаны на вобраз Божы» (Роду 9).

Таму і ў Законе Бог узнавіў тую кару. Ды хоць часам ліхі ўрад не карае забойцаў або дзеля хабару, або яшчэ дзеля чаго, перадусім Сам Бог карае і забойцаў, і супольнікаў іхніх, – значыць, і ўрад. Ня можа Бог пакінуць забойцу без пакараньня, бо да Каіна Сам прамовіў: «Што ты зрабіў? Голас крыві брата твайго кліча да Мяне з поля».

Ерузалім, такі слынны горад, названы сьвятым, Бог пакараў дзеля таго, што ў ім панавала забойства, як Сам Хрыстос сказаў: «Ерузалім, Ерузалім, які забіваеш прарокаў ды камянуеш тых, што да цябе пасла-

«Іерусалимъ, Іерусалимъ, избивы пророкы каменіем, побивая посланыя къ нему, коль крать въсхотех собрати чяда твоя, яко же събираеть кокошь птенця своя подъ криле, и не въсхотесте? Се оставляетъся вамъ домъ вашь пустъ» и прочаа (Матф. 23: 29-39).

Потому жь и на Вавилон у Авакума Богъ рече: «Понеже ты пленилъ страны многы и пленять тя вси оставшіися людие, крове деля человечя» (Авак. 2). Давыд теже написалъ, яко «мужи крови и льстиви наполы не поживут дней своих» (Псалом 54).

Коротко говорячи, караеть Богъ розличне убійство, и полно о том везде у Святомъ Писанью, и на око сами видимы, яко Богъ и тайных убіицевъ дивными обычайми выявляеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Што оным будеть, которіи того слова шостого стерегуть? То естъ которіи не забивають, але милосердие над ним чинять, боронять, радою, лекарством остереженіемъ и иными обычайми ему помагають, гневъ отпушчають, а коротко – и на теле, и на души оживляють, што, мовлю, таковымъ будеть?

**ОТКАЗЪ**

Тіи безъ отдарованья быти не могуть, Сам бо Спаситель рече: «Блажени милостивіи, яко тіи помиловани будутъ» (Матф. 4: 25-5: 13). А на иномъ месте тако рече: «Отпушчайте и отпустят вамъ» (Лука 6: 37-45).

**ПЫТАНЬЕ**

Говори семое слово Божіих заповедей.

**ОТКАЗЪ**

Семое слово естъ: «Не любодей, або не чужоложь».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся тое слово розумееть, а чого нам зде Богъ заказуеть?

**ОТКАЗЪ**

По тому жь, яко и иные вси заповеди. Се естъ тако розумети, яко Хрістос Сам толькуеть. То естъ, ижь не толко человекъ на теле от блуда чистъ быти маеть, але и на сердци а на души. Бо тако рече: «Слышасте, яко речено бысть пръвим: "Не прелюбы сътвориши", Азъ же глаголю вам, яко всякъ, иже възрить на жену съ похотію, оуже любыдействова с нею въ сердци своемъ». А от тых словъ розумети можем, кто тое слово исполняеть, а якового послушества Богъ по насъ хочеть.

Другаа надобе памятовати, иже ся двоя речь у томъ слове, яко и в иных, заховуеть. Перваа речь – чого Богъ заказуеть. Другаа речь – которую мети хочеть. Бо мало на томъ, иже кто не блудить, а предся на сердци похотію горить, потреба, абы того не мелъ, то естъ, абы жону понялъ, яко Апостолъ рече: «Добро естъ жене не прикасатися, любодеаніа же, единый каждый свою жену да имать». А мало нижей: «Лепей ест женитися, нежели разжигатися».

ныя. Колькі разоў хацеў Я сабраць сыноў тваіх, як кураводка зьбірае пісклянят сваіх пад свае крылы, але ты не захацеў. Таму дом ваш стане пустым» і гэтак далей (Мц. 23: 37-38).

Таму і на Бабілён Бог сказаў у Абакума: «Як ты зрабаваў шматлікія народы, дык і цябе зрабуюць пазасталыя народы за праліцьцё крыві людзкай» (Аб. 2). Давід таксама напісаў, што «людзі разбойныя і падступныя не дажывуць да паловы жыцьця свайго» (Пс. 54).

Коратка кажучы, па-рознаму Бог карае за забойства, і дастаткова пра гэта паўсюль у Сьвятым Пісьме гаворыцца. На ўласныя вочы самі бачым, як Бог падступных забойцаў выяўляе цудоўным чынам.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што будзе тым, якія гэтага шостага слова пільнуюцца? Значыць, якія не забіваюць, але аказваюць міласэрнасьць, абараняюць, выконваюць яго парадай, лекамі, перасьрогамі ды іншым звычаем, ня гневаюцца, — ды, коратка кажучы, і цела, і душу жывяць, – што, кажу, такім будзе?

**АДКАЗ**

Яны не застануцца без узнагароды, Сам бо Збаўца сказаў: «Шчасьлівыя міласэрныя, бо ім будзе аказана міласэрнасьць» (Мц. 5: 7). А ў іншым мейсцы Ён кажа: «Адпушчайце і вам будзе адпушчана» (Лк. 6: 37).

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажы сёмае слова з Божых прыказаньняў.

**АДКАЗ**

Сёмае слова: «Не любадзей» або: «Не чужалож».

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэтае слова разумець ды што нам Бог тут забараняе?

**АДКАЗ**

Разумей яго гэтаксама, як і іншыя прыказаньні, значыць, так разумей, як Сам Хрыстос тлумачыць: ня толькі целам павінен чалавек быць чыстым ад блуду, але і сэрцам, і душой. Бо так Хрыстос сказаў: «Чулі, што сказана прабацькам: "Не чужалож!" А Я вам кажу, што кожны, хто глядзіць на жанчыну з пажадаю, ужо яе счужаложыў у сэрцы сваім». З гэтага мы можам зразумець, хто тое слова выконвае ды якой паслухмянасьці Бог чакае ад нас.

Таксама трэба памятаць, што гэтае слова, як і іншыя, зьмяшчае ў сабе дзьве рэчы: першая – што Бог забараняе, другая – што ад нас хоча. Бо мала, калі хтосьці ня блудзіць, але ўсё адно гарыць у сэрцы пажадаю. Ня трэба, каб так было, значыць, няхай бярэ жонку, як Апостал казаў: «Добра чалавеку не дакранаца да жанчыны, але з увагі на распусту, кожны няхай мае сваю жонку». А крыху ніжэй ён жа кажа: «Лепш ажаніцца, чым распаляцца».

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть дела добриа сего слова?

**ОТКАЗЪ**

Напервей чистоту заховати на сердци своем, не мыслити о плюгастве и о всякой нечистоте, але только о чистоте. Жону свою миловати, а жоне мужа, а не только миловатися должни, але и в оучтивости ся мети, верю собе заховати, встыдъ межи собою держати.

Опять, оных речей стеречися, которие къ блуду приводять, або къ розжиганью или нечистым мыслям, яко Апостолъ рече: «Не оупиваитеся вином, в нем же естъ блудъ» (Ефес. 5: 9-19). Потому же и Сам Хрістос рече: «Вънемлете себе, да некогда отягчяют сердца ваша обьяденіем и пианьством, и печальми житеискими» (Лука 21: 28-36). На остатокъ по тому справовати свое тело, абы было обитель Святого Духа.

Сие суть добрые дела сего слова.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть грехи противу сему слову?

**ОТКАЗЪ**

Напервей естъ грехъ на сердци нечистоту мыслити. Потомъ слова плюгавые говорити. Песни сромоцьские пети, корогоды водити, плясати и таковаа чинити. Бо сие дела къ блуду тягнуть человека, и прото ихъ Богъ у томъ слове заказуеть чинити.

Опять, грех естъ мужу от жоны, а жене от мужа выступовати. Грех естъ жоны, кому ее надобе, не взяти. Бо таковъ мусить всегда розжигатися, а таковое розжигание естъ грехъ пред Богомъ. Грехъ естъ жону отпушчати, разве блуда деля не грехъ.

Грешать и они, которыи для убожества своего женитися не хотять. Грешять противу тому слову вси нечистіи любодеици, прелюбодеици, мужоложници, скотоложници, содомляне и прочіи.

**ПЫТАНЬЕ**

Што за казни Богъ допушчаеть для нечистоты або прелюбыдеиства?

**ОТКАЗЪ**

В Законе велелъ Богъ таковыхъ каменьемъ побивати, яко написано у Пятой книзе Моисеове (Втор. Зак. 22). Але и по вси веки каралъ Богъ нечистые люди. Яко напервей весь светъ не для жадьное вины потопилъ, только для ідолослуженіа, обиды нишчих а для плюгаства. На Содомъ того жь деля Богъ огнистый дошчъ спустилъ.

Сихемъ, сынъ Емморовъ, взялъ силою дочъку Іакова Дину и насилие ей учинилъ, але опять братья ее Симіонъ и Леви для того деля не только Сихема, но и отца его, и весь город выбили (Быт. 34).

В Судьяхъ написано, яко одного леоувита жену мешчане Гавааньские от колена Веніаминова споганили и насилиемъ заморили (Суд. 20). Да ведже за тое от колена Веніаминова 25 тисечи мужов убили сынове Ізраилеви, женъ пакъ мало зосталося.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ўчынкі, паводле гэтага слова, добрыя?

**АДКАЗ**

Найперш – захоўваць у сваім сэрцы чыстасьць, думаць толькі пра чыстасьць, а не пра плюгаўства ды пра ўсялякую нячыстасьць. Муж няхай любіць жонку, а жонка – мужа. Ды ня толькі павінны мілавацца, але і пачціва адно да аднаго ставіцца, веру ў сабе захоўваць, сарамлівасьці між сабою трымацца.

Зноў, трэба сьцерагчыся тых справаў, што прыводзяць да распусты або да распаленьня, як Апостал кажа: «Не напівайцеся віном, бо ў ім распуста» (Эф. 5: 18). Тое ж і Сам Хрыстос казаў: «Сьцеражыцеся, каб часам не абцяжарылі сэрцы вашыя абжорствам, ды п'янствам, ды клопатамі гэтага жыцьця» (Лк. 21: 34). Ды, нарэшце, трэба так захоўваць сваё цела, каб яно было жытлом Духа Сьвятога.

Вось гэта добрыя справы паводле гэтага слова.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія грахі супраць гэтага слова?

**АДКАЗ**

Найпершы грэх — мець у сэрцы нячыстыя думкі. Потым – казаць бессаромныя словы, сьпяваць бессаромныя песьні, вадзіць карагоды, танчыць і падобнае рабіць, бо гэтыя справы цягнуць чалавека да блуду, і таму Бог у гэтым слове забараняе іх рабіць.

Зноў жа, грэх мужу ад жонкі, а жонцы ад мужа зыходзіць. Грэх ня ўзяць жонку таму, каму яна патрэбная, бо такі чалавек будзе распаляцца, а гэта грэх перад Богам. Грэх жонку пакінуць, хіба толькі дзеля распусты гэта ня грэх.

Грашаць і тыя, што дзеля сваёй беднасьці ня хочуць жаніцца. Грашаць супраць гэтага слова ўсе нячыстыя распусьнікі, чужаложнікі, мужаложнікі, скаталожнікі, садамляне ды іншыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія пакараньні дапускае Бог дзеля нячыстасьці або чужалоства?

**АДКАЗ**

У Законе загадаў Бог такіх забіваць каменьнем, як напісана ў Пятай кнізе Майсея (Паўт. Зак. 22), бо ва ўсе часы Бог караў нячыстых людзей. Напрыклад, перш Бог патапіў увесь сьвет не дзеля якой-небудзь іншай прычыны, як толькі дзеля балванахвальства, дзеля пагарды жабракамі ды дзеля распусты. На Садом дзеля гэтага ж Бог выліў вогненны дождж.

Сыхем, сын Гамора, сілай узяў Дзіну, дачку Якуба, ды яе згвалтаваў, але, зноў жа, яе браты Сымон і Леві забілі за гэта ня толькі Сыхема, але і ягонага бацьку, і ўвесь горад (Роду 34).

У кнізе Судзьдзяў напісана, што жыхары Гібэону згвалцілі ды замарылі гвалтам жонку аднаго лявіта. За гэта сыны Ізраэльскія забілі дваццаць пяць тысячаў мужоў з калена Бэн'яміна, ды і жанчынаў засталося мала (Судз. 20).

Сынове Ізраілеви, живучи в пустыни, допустилися блуда з дочками Моавскими (Числа 25; 1 Кор. 18), але для того 23 тисечи згинуло.

Давыд за прелюбыдеаніе много и с поддаными своими утерпелъ (2 Цар. 12).

Сынъ Давыдовъ Амномъ сестре своей Фамаре насилие учинилъ, але скоро от Авесалома убить (2 Цар. 14).

Іаковъ сына своего Рувима проклялъ, иже постелю его посквернилъ (Быт. 49).

Полно таковых казней у Святом Писанію, але съ всих нагоршаа казнь естъ, иже вси нечистіи, естли ся не покають, животъ вечный собе потерають. Тако бо Апостолъ пишеть: «Ни блудници, ни прелюбодеи, ни телосквернители, ни мужеложници Царствіа Божіа не наследять» (1 Кор. 5: 12-6: 20). Тое жь къ Галатом рече: «Явна суть дела плотъскаа, яже суть прелюбодеаніе, блудъ, нечистота, скверневъство, таковаа творяшчей Царствія Божіа не наследять» (Гал. 5: 11-21).

По тому же и къ Евреомъ пишеть: «Блудъником и прелюбыдеемъ судить Богъ» (Евр. 12: 25-13: 6). А на иномъ месте сведчить, яко «для блуда, нечистоты, руйности и иных приходить гневъ Божій на сыны противленіа» (Кол. 3: 4-11).

Сие грозбы вельми суть страшны, а предся и собе люди мало важять, ани мають за грехъ нечистоты. Але Хрістианинъ маеть ведати, яко часу своего всехъ таковых Богъ скараеть. Сам бо рече у пророка: «Азъ есмъ Господь Богъ вашь, не изменюся». Если преже каралъ, и теперь карати будеть.

Прото обачися кажный, што чинишь, не разгневи собе Господа, не кохайся в нечистоте, послухай словъ Апостолских, где рече: «Не весте ли, яко телеса ваша удове Хрістовы суть? Тем ли убо оуды Хрістовы сътворяемъ уды любодейца? Да не будеть. Или не весте, яко прилепляяйся любодеици, едино тело естъ? А прилепляайся Господеви, единъ Духъ естъ. Бегайте любодеанія. Всяк бо грехъ, иже ашче сътворить человекъ, кроме тела естъ, а творяй любы, въ свое тело съгрешаеть. Или не весте, яко телеса ваша храмъ, иже въ васъ Святому Духу естъ, Его же имате от Бога?» (1 Кор. 5: 12-6: 20).

**ПЫТАНЬЕ**

Што тымъ будеть, они же сее слово польнять?

**ОТКАЗЪ**

За сердечъную чистоту обецуеть Самъ Хрістос великое блаженьство, где рече: «Блажени чистіи сердцемъ, яко тіи Бога оузрять» (Матф. 4: 25-5: 14). А над тое и телесными речми таковых людей Богъ богатить, даючи имъ слушное выхованье. Яко Хрістос далъ знати, будучи на браце у Кане Галилиіской, бо егда имъ не достало вина, пособилъ имъ, учинивъши з воды вино (Іоан 2: 1-10).

Не малаа теже естъ ласка Божіа, ижь чистыхъ людей тела чинить храмом Святого Духа. По тому жь и жоны мають обетнцу, которие в

Сыны Ізраэльскія, жывучы ў пустыні, распусьнічалі з дочкамі Мабскімі, але дзеля гэтага загінула іх дваццаць тры тысячы (Лічбы 25; 1 Кар. 18).

Давід дзеля чужалоства шмат пакутаваў разам са сваімі падданымі (2 Сам. 12).

Амнон, сын Давідаў, учыніў гвалт сваёй сястры Тамары, але хуткім часам загінуў ад рукі Абэсалома (2 Сам. 14).

Якуб пракляў свайго сына Рубэна, бо той ягоны ложак апаганіў (Роду 49).

Шмат такіх пакараньняў ёсьць у Сьвятым Пісьме, але найгоршае зь іх усіх тое, што ўсе распусьнікі, калі не пакаюцца, страцяць вечнае жыцьцё. Так бо Апостал піша: «Ані распусьнікі, ані чужаложнікі, ані разбэшчаныя, ані мужчыны, якія жывуць з сабой, ня возьмуць спадчыну ў Валадарстве Божым» (1 Кар. 6: 9-10). Гэтаксама ён казаў да Галятаў: «Вядомыя ж учынкі цела, вось яны: распуста, нячыстасьць, разбэшчанасьць. Каторыя такіх грахоў дапускаюцца, Валадарства Божага не атрымаюць» (Гал. 5: 19-21).

Тым жа звычаем ён да Гебраяў піша: «Распусьнікаў і чужаложнікаў судзіць будзе Бог» (Гебр. 13: 4), а ў іншым мейсцы сьведчыць, што «дзеля распусты, нячыстасьці, любежнасьці, юру прыходзіць гнеў Божы на дзяцей недаверства» (Кал. 3: 5-6).

Страшныя гэта пагрозы, але людзі ставяцца да іх легкадумна ды не ўважаюць нячыстасьць за грэх. Але Хрысьціянін мусіць верыць, што ў свой час Бог пакарае ўсіх тых, хто так грашыць, Сам бо сказаў у прарока: «Я – Госпад, Бог ваш, не зьмянюся». Калі раней караў, значыць і цяпер пакарае.

Таму разваж кожны, што робіш, не гняві Госпада Бога ды не любі распусту, паслухай словы Апостала, калі ён сказаў: «Ці ня ведаеце, што целы вашыя ёсьць члены Хрыста? Ці ж, узяўшы члены Хрыста, буду рабіць іх членамі распусьніцы? Ніколі! Або ці ня ведаеце, што той, хто злучаецца з распусьніцай, творыць зь ёй адно цела? Будуць вось яны, – як сказана, – двое адно цела. Той жа, хто лучыцца з Госпадам, ёсьць адным духам зь Ім. Сьцеражыцеся распусты! Кожны бо грэх, дапушчаны чалавекам, ёсьць па-за целам. Хто грашыць распустай, супраць свайго ўласнага цела грашыць. Ці ж ня ведаце, што цела ваша ёсьць сьвятыня Духа Сьвятога, Каторы ў вас і Каторага маеце ад Бога» (1 Кар. 6:15-19).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што будзе тым, хто выконвае гэтае слова?

**АДКАЗ**

За чыстасьць сэрца Сам Хрыстос абяцаў вялікае дабраславенства, калі казаў: «Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога аглядаць будуць» (Мц. 5: 8). Акрамя таго, Бог узбагачае такіх людзей і зямнымі дабротамі, даючы ім годнае ўтрыманьне, як Хрыстос абвясьціў на вясельлі ў

малженстве живуть, верю мужомъ заховують, а о детех працу пріимають. Тако бо Апостолъ рече: «Жена спасется ради чадородиа, ашче пребудеть въ вере и любви, и въ святини съ целомудріем» (1 Тім. 2: 1-15).

Видиш ли, што Духъ Святый женамъ обецуеть? Розумъ человечи за мерскую речь почитаеть чадородие, а девство за ангелъскій животь маеть, але зде не по тому Святый Духъ судить: «Спасеться, дей, жена чадородия деля». От которих бы словъ могли людие зацность женитвы познати. Яко тот же Апостолъ къ Евреомъ пишеть: «Честна женитва въ всехъ и ложе нескверно» (Евр. 12: 14-13: 6). Где рече «въ всехъ», розумей, яко бы реклъ «межи всехъ, никого не выимаючи».

**ПЫТАНЬЕ**

Говори осмое слово Божіихъ заповедей.

**ОТКАЗЪ**

Осмое слово есть «Не оукрадеши».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко тое розумети маю? Чого нам зде боронить Богъ?

**ОТКАЗЪ**

Хочеть Богъ, абы каждый человекъ маетность свою мелъ у моцы своей. А одинъ у друга абы хитростию, здрадою, пеняньемъ и коемъ ли иным обычаемъ не бралъ. Опять, и тое ся тут же замыкаеть, абыхмо часу потребы ближному нашему маетности наших уделяти не жаловали. Бо на том мало, естли бы кто чужого не бралъ, а своего бы убогому не узычалъ.

Обе речи маеть Хрістианинъ заховати: напервей – абы чужого не хотелъ, а другаа речь – абы своее маетности, где надобе, дати не жаловал. Кто по тому не чинить, той противу того слова грешить.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть грехи противу тому слову?

**ОТКАЗЪ**

Яко розные суть межи людей станы, або повинности, тако розные и грехи противу тому слову, или злодейства. А мает ли ся, правда мовити, редко не въ всих станехъ найдуется злодейство.

Возри напервей на станъ учительскій, або Пастырскій – вси ли верне пасуть стадо Хрістово? Вси ли правды оучать? Не большая ли част у учителей, которіи для чрева безлепицъ учять? Пастири пакъ не себе ли пасуть? Укажи ми, прошю тебе, Епископа, который бы Слово Божіе проповедалъ.

Лечь я ведаю, ижь таковогo у сих сторонах ни одного не знайдешь. Многых найти можешь, што ся на Епископие, на Митрополие, на Архимандрие накупують, але который бы Словомъ Божіемъ стадо Хрістово паствилъ, укажи ми одного. А как же ихъ назвати? Ведаю, яко

Кане Галілейскай. Бо калі там не хапіла віна, Хрыстос дапамог ім, зьмяніўшы ваду ў віно (Ян 2: 1-10).

Вялікая і ў тым ласка Божая, што чыстых сэрцам людзей Бог робіць сьвятыняй Духа Сьвятога. Гэтае абяцаньне маюць і жанчыны, якія жывуць у шлюбе, захоўваюць вернасьць мужам ды пра дзяцей клапоцяцца, так бо Апостал казаў: «Жанчына будзе збаўлена, родзячы дзяцей і трываючы ў веры, любові і сьвятасьці са сьціпласьцю» (1 Цім. 2: 15).

Бачыш, што Дух Сьвяты абяцае жанчынам? Розум чалавечы ўважае нараджэньне дзяцей за мярзоту, а дзявоцтва – за анёльскае жыцьцё, але тут Сьвяты Дух судзіць іншым звычаем: «Будзеш збаўлена, жанчына, нараджаючы дзяцей». З гэтых словаў шмат людзей могуць спазнаць высакароднасьць шлюбу, як той жа Апостал да Гебраяў піша: «Няхай у-ва ўсіх будзе ў пашане сужонства і сужыцьцё беззаганнае» (Гебр. 13: 4). Калі Апостал кажа «ў-ва ўсіх», разумей гэта так, калі б ён сказаў «сярод усіх без выключэньня».

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажы восьмае слова Божых прыказаньняў.

**АДКАЗ**

Восьмае слова: «Не крадзі».

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэта я мушу разумець? Што нам тут Бог забараняе?

**АДКАЗ**

Бог хоча, каб кожны чалавек валодаў сваёй маёмасьцю ды каб у іншых хітрасьцю, здрадай, крыўдай або іншым якім звычаем маёмасьць не забіраў. Зноў жа, зьмяшчаецца тут і тое, што мы ў час патрэбы павінны дзяліцца нашай маёмасьцю з бліжнім. Бо мала проста чужога ня браць, а свайго ўбогаму не даваць.

Абедзьве рэчы мусіць Хрысьціянін выконваць: перш за ўсё чужога не пажадаць, а да таго – не шкадаваць сваёй маёмасьці, калі трэба дзяліцца. Хто так ня робіць, той грашыць супраць гэтага слова.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія ёсьць грахі супраць гэтага слова?

**АДКАЗ**

Як ёсьць сярод людзей розныя станы ці абавязкі, гэтаксама і грахі або злачынствы супраць гэтага слова бываюць розныя. Ды ці варта казаць, што зрэдку ў якім стане ня знойдзецца злачынства?

Зірні перш на вучыцельскі або пастырскі стан: ці ўсе верна пасьвяць статак Хрыстовы? Ці ўсе вучаць праўдзе? Ці ня большасьць вучыцеляў дзеля чэрава глупствам вучыць? Пастыры ці не саміх сябя пасьвяць? Пакажы мне, прашу цябе, епіскапа, які Слова Божае прапаведуе. Аднак я ведаю, што такога па ўсім сьвеце ня знойдзеш. Шмат каго знойдзеш, хто займае пасаду епіскапа, мітрапаліта, архімандрыта, але пакажы мне хаця

ся вамъ гневати, але васъ предся Самъ Хрістос розбойниками и татьми, се естъ, злодеями, зоветь. Бо так рече: «Не входяй дверми въ двор овчій, но прелазяй инуде, тъй тать есть и разбойникъ, а въходяй дверъми, пастырь естъ овцамъ» (Іоан 9: 39-10: 9).

Оже маешъ, яко таковых Хрістос зоветь, которіи не про двери до овецъ входять, але инуды, то естъ черезъ посулы приходять на Епископие або на иншые пастырства. Прото напервей ся злодейство межи духовных пастыровъ находить. А ешче и тое обачити треба, яко не просто злодейство пополъняють, але двойчасто. Бо иже не наоучають, крадуть правду пред людьми. А другое злодейство, иже именья церковного вживають, а за тое досыть не чинять. А тымъ обычаемъ и в духовных, и в дочасных речахъ окрадают убогих хрістианъ.

По тому жь о преложоныхъ светских розумей, естли бы, на звыклых приходехъ не переставаючи, не по мере подачки на подъданыхъ вымышляли, наболей безъ военное потребы.

Крадуть подданые пановъ своих, если им подачков несправедливе отдавают, естли незычливе робять або иныхъ повинностей своихъ не делають.

Крадуть ремесники, если непобожне свою роботу продають.

Крадуть купци и торговци, которие злыми товари людей подманывають, або за малую цену у простых людей какую речь беруть.

Крадуть которие хлеб напрасно едять а ничого не робять.

Крадуть калеки, которіи, могучи роботою покоръмитися, не хотять робити, але жебрують.

Крадуть лихвяри, которіи взаем грошей давают, але от них гостинци або резъ, то естъ лихву, беруть.

Крадуть костыри и вси игрячи, которіи костками, або картами, або чимъ инымъ маетности чужіе отнимають.

Крадуть мытници, если большей, нежели имъ уставлено, вытягають.

Крадеть панъ, которій слузе мыта заслужоного не платить.

Крадеть слуга, если господину своему не по тому, яко бы мело быти, служить.

Крадеть, кто на вряде седить а злодей не караеть, яко Богъ велелъ.

Коротко говорячи, вси люди сему слову пред Богом дольжни, которие кажному што чие естъ, не отдають або своего потребному не уделяють.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть добрие дела того слова?

**ОТКАЗЪ**

Напервей перестати на том, што Богъ далъ. Потомъ отдати кажному, што его естъ. А третее доброе дело естъ чинити милостину. К тому от грошей ничого не брати.

**ПЫТАНЬЕ**

Кому маеть быти давана милостина?

б аднаго, хто б Божым Словам пасьвіў статак Хрыстовы. А як жа такіх назваць? Ведаю, што гэта вас гневае, але Сам Хрыстос назваў вас разбойнікамі і рабаўнікамі, — значыць, злодзеямі, бо так Ён сказаў: «Хто не ўваходзіць у аўчарню празь дзьверы, але інакш, той злодзей і разбойнік. А хто ўваходзіць празь дзьверы, той пастыр авечак» (Ян 10: 1-2).

Вось бачыш, як Хрыстос заве тых, што прыходзяць да авечак не празь дзьверы, але інакш, — значыць, за хабар прыходзяць на епіскапства ці на іншае пастырства. Таму знаходзім злачынства найперш сярод духоўных пастыраў. Ды яшчэ трэба заўважыць, што яны робяць злачынства двойчы: ня вучаць і крадуць праўду ў людзей, да таго ж спажываюць царкоўную маёмасьць, а за гэта не выконваюць сваіх абавязкаў ды тым звычаем абкрадаюць убогіх Хрысьціянаў і ў справах духоўных, і ў справах штодзённых.

Гэтаксама мяркуй і пра сьвецкіх начальнікаў, калі, не спаталяючыся звыклымі прыбыткамі, яны ня ведаюць меры ды выдумляюць падданым падаткі, перадусім без ваеннай патрэбы.

Крадуць падданыя ў сваіх паноў, калі несумленна аддаюць падаткі, калі кепска працуюць або не спаўняюць іншых сваіх абавязкаў.

Крадуць рамесьнікі, калі не богабойна прадаюць сваю працу.

Крадуць купцы ды гандляры, калі падманваюць людзей кепскім таварам ці калі ў простых людзей набываюць нейкую рэч за малыя грошы.

Крадуць тыя, што хлеб надарэмна ядуць ды нічога ня робяць.

Крадуць жабракі, якія могуць пракарміцца працай, але ня хочуць працаваць ды жабруюць.

Крадуць ліхвяры, што пазычаюць грошы ды за гэта бяруць гасьцінцы або ліхву.

Крадуць гульцы ў косьці ды ўсе гульцы, якія гульнёй у косьці, карты ці што іншае забіраюць чужую маёмасьць.

Крадуць зьбіральнікі мыта, калі патрабуюць больш, чым усталявана.

Крадзе пан, калі ня плаціць свайму служцы заслужанай узнагароды.

Крадзе служка, калі служыць гаспадару не як належыць.

Крадзе той, хто ва ўрадзе сядзіць, а злодзеяў, як Бог загадаў, не карае.

Карацей кажучы, гэтае слова парушаюць перад Богам усе тыя людзі, што не аддаюць належнага або не ўдзяляюць са сваёй маёмасьці патрабуючаму.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія справы, паводле гэтага слова, добрыя?

**АДКАЗ**

Найперш — задаволіцца тым, што даў Бог. Потым — аддаць кожнаму, што ягонае. А трэцяя добрая справа – даваць міласьціну, да таго ж з грошай нічога ня браць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Каму трэба даваць міласьціну?

**ОТКАЗЪ**

Въ обычай собе зде у наших краинахъ люди леные взяли: кто робити не хочеть, у калеки идеть, хотя жь будеть здоровъ, и молод, и тако з милостины живеть. Но не добрь естъ таковъ обычай, и мели бы преложоные таковых людей оуняти, абы имъ не было волно калековати, або, правду рекъши, зводити и под покровом убожества красти.

И ест того великие причины, для которих маеть имъ урядъ того боронити. Напервей, ижь Богъ всемъ здоровымъ людемъ робити велелъ и от працы своее выховатися, яко къ Адаму Самъ поведелъ: «В поте лица твоего снеси хлебъ свой» (Быт. 3). Апостолъ опять рече: «Аште кто не хочеть делати, да не ясть» (2 Сол. 3: 6-17). Другая причина естъ. Бо людъ простый только тымъ милостину даеть, которіи могуть бегати, а затым правдивые калекы голод терпять. Прото, мовлю, на урядъ належить, абы таковымъ здоровымъ калекам заборонно было милостины и просити, и брати. А ижь бы ихъ к роботе приставляно. Абы пред правыми калеками не крали милостины, а сами бы тежь свой хлебъ ели.

Милостина пакъ маеть быти давана. Напервей, где суть діакони, – до диаконовъ. Бо их урядъ естъ не кадити, ани што иного чинити, але только милостину съберати, а убогих стеречи, абы якое нужи не терпели. О чом в Деаніах Апостольских достаточне выписано. Мают теже з милостины и учители жити, яко Христос рече: «Достоинъ ест делатель мьзды своея» (Матф. 10: 9-15). Потому жь и Апостолъ сведчить, яко Господь повелел проповедаюшчимъ благовестіе от благовестиа жити (1 Кор. 9: 13-18). А на ином месте пишеть: «Да уделяет же оучайся словеси учашчому и от всего добра» (Гал. 6: 2-10).

Теже милостина маеть быти давана всемъ убогимъ, старимъ, немошчным, молодымъ недужимъ, сиротам, вдовам старимъ и онымъ, которихъ Богъ скараеть або огнемъ, або войною, або иною шкодою. Яко о Іове написано, иже и друзи его по оныхъ шкодах и многых страстьях даровали по грошу, або, яко неціи превели, по овцы и по златой серазе (Іовъ 42).

**ПЫТАНЬЕ**

Годить ли ся Церквамъ мети именіа або доходы?

**ОТКАЗЪ**

Церковъ для трех причинъ маеть держати або приходы, або именья. Первая причина, абы служители мели выхованье. Другая причина, абы училишча или школы быти могли. Бо наставником платити потреба, а часом и ученником убогимъ докладати церковъ мусить. Третяя причина, аби нишчимъ было выхованье.

Тых причинъ деля потреба, абы были церковныя наданья нерушоны. А не только не мають быти нарушены, але естли бы где таковыхъ доходовъ мало, повинни Князи и иныи господари опатрити, абы доволно было. Бо Ісаія пишеть, яко Цари мають быти церквамъ доителе, а княгыне – кръмителе.

**АДКАЗ**

Узялі сабе тут, у нашых землях, гультаяватыя людзі за звычай: той, хто працаваць ня хоча, ідзе ў жабракі, нават калі здаровы і малады, ды так зь міласьціны жыве. Але нядобры гэта звычай і мусіў бы ўрад такіх людзей уціхамірыць, каб не маглі, калі ім захочацца, жабраваць, або праўду кажучы, — падманваць ды пад выглядам жабрацтва красьці.

І ёсьць важныя прычыны, дзеля якіх урад мусіць ім гэта забараніць. Найперш таму, што Бог загадаў усім здаровым людзям працаваць ды жыць са сваёй працы, як Сам сказаў Адаму: «З працы будзеш жывіцца ва ўсе дні жыцьця твайго» (Роду 3). Апостал, зноў жа, гаварыў: «Хто працаваць ня хоча, няхай і ня есьць» (2 Тэс. 3: 10). Другая прычына таксама ёсьць: люд просты дае міласьціну толькі тым, хто можа хадзіць, з-за чаго сапраўдныя жабракі церпяць голад. Таму, кажу, няхай урад забароніць тым здаровым жабракам міласьціну і прасіць, і браць ды дасьць ім працу, каб яны ў сапраўдных жабракоў міласьціны ня кралі, але елі свой хлеб.

Міласьціна няхай так даецца: найперш, там, дзе ёсьць дыяканы, — дыяканам. Бо іхні абавязак – не кадзіць ці штосьці іншае рабіць, але толькі зьбіраць міласьціну ды дапамагаць убогім, каб ня мелі ніякай нястачы. Пра гэта ў Дзеях Апостальскіх дастаткова напісана. Мусяць таксама зь міласьціны і вучыцелі жыць, бо Хрыстос сказаў: «Работнік варты ўзнагароды сваёй» (Мц. 10: 10). Тым жа звычаем і Апостал сьведчыць, што Госпад загадаў тым, хто дабравесьціць, з дабравесьця жыць (1 Кар. 9: 14), ды ў іншым мейсцы піша: «Хай жа навучаны дзеліцца ўсялякім даброцьцем з тым, хто яго навучае» (Гал. 6: 6).

Таксама міласьціну трэба даваць усім убогім старым, нядужым, хворым маладым, сіротам, старым удовам ды тым, каго Бог пакараў або пажарам, або вайною, або іншай шкодай. Як пра Гіёба напісана, што ягоныя сябры пасьля ўсіх шкодаў ды многіх цярпеньняў далі яму па грошу, або (як некаторыя пераклалі) па авечцы ды па залатой завушніцы (Гіёб 42).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці могуць Цэрквы ўтрымліваць маёмасьць або даходы?

**АДКАЗ**

Царква дзеля трох прычынаў павінна ўтрымліваць або даходы, або маёмасьць. Першая прычына — каб служыцелі мелі ўтрыманьне. Другая прычына — каб маглі працаваць вучэльні ды школы, бо настаўнікам трэба плаціць, а часам і вучням зьбяднелым царква мусіць дапамагчы. Трэцяя прычына — каб жабракам дапамагаць.

Дзеля гэтых прычынаў нельга рушыць царкоўныя наданьні. Ды ня толькі нельга рушыць царкоўныя наданьні, але і калі б такіх даходаў дзесьці не хапала, павінны князі ды іншыя гаспадары паклапаціцца, каб даходаў было дастаткова. Бо Ісая піша, што князі мусяць быць цэрквам карміцелямі, а княгіні іхнія — мамкамі.

Да вед же таковые данины або именья не мають быти у Епископа или у Господаря въ руках, но Діакони, на тое от верныхъ избраніи, мають оныя заведати. То естъ учителей, школы и больницы выховати. На сие бо потребы исперва надавали благоверни Цари и Князи такова имениа.

**ПЫТАНЬЕ**

Годитъ ли ся Хрістіанину мети свое именье або маетность? Пишеть бо Лука в Деаніах, яко первіи Хрістіане обшчая вся мели.

**ОТКАЗЪ**

Божественный Лука оубо пишеть сие только о церкви, которая была въ Іерусаліме (Деан. 1: 12-26), але о іных церквах того не пишеть, абы Хрістіане вси речи за обшчие межи собою повинни мети. Да вед же и въ Іеросолимской церкви не узаконили того были Апостоли, але з любви сее чинили: которіи на онъ час былі хрістіане, продавалі именія своя и цену до Апостолъ относили. Особливая то Святого Духа наоука тогды была. Ведаючи бо Духъ Святый, яко Іерусалимъ Римляне розорити и спустошити мели, слушне оныхъ Хрістіан тому наоучилъ, абы пред часом именья своя продали, а потребамъ убогыхъ пособили. Памятали бо на слово Христово, которое на град Іерусалимскый прорече: «Прійдуть дніе на тя, и обложють врази твои острогъ о тобе, и обыдут тя, и обыймуть тя всюду, и разбиють тя, и чада твоя в тебе, и не оставять камень на камени в тобе» (Лука 19: 37-44). Тая была причина оным Хрістіаномъ въ Іерусалиме, иже продали своя имениа, и покладали до Апостолъ, и вси речи мели за обшчая.

Тепер пакъ того ненадобе, абы маетности свои Хрістяне продавали, але надобе, абы другъ друга любилъ, а часу потребы маетности ему не пошчадилъ. Бо и за Апостолъ, Хрістіане каждый свое именье держалъ, а с него милостину на учители и на убогые давалъ. Такова была Тавифа, Корнилей и прочіи. Прото и Апостолъ о богатых Тімофею тако пишеть: «Богатым в нынешнемъ веце запрешчай не высоко мродствовати, ниже уповати, на богатество изгыбаюшчее, но на Бога живаго, подаюшчего нам все обильно» (1 Тім. 6: 17-20). Выгледи, яко не рече Апостолъ: «Богатым запрешчай не мети богатества», але: «Не уповати на богатества а невысоко разумети».

Соломоном Духъ Святый наоуку достаточьную о том даеть сими словы: «Да исходять ручаи твои вонъ, и на улицахъ воды твое дели, но источникъ воды твоея да будеть тобе самому» (Притч. 5). Велить зде ручаи от источника вонъ пушчати, се естъ, маетностей своих убогым уделяти, але источникъ велить самому мети. Розумей, яко надобе при собе маетность ховати. Бо естли бы кто заразъ все именье покинулъ или кому отдалъ, не будеть напотомъ мети, откуле бы милостину дати, и самъ мусить у иных хлеба просити.

Прото годиться Хрістіанину свою маетность мети, нижели потреба, абы ся справедливе достала, а к тому абы таковый милостину давалъ.

Ды ўсе такія наданьні або маёмасьць няхай ня будуць у руках епіскапа або валадара, але Дыяканы, абраныя дзеля гэтага сярод верных, мусяць распараджацца наданьнямі, гэта значыць, даглядаць настаўнікаў, школы і бальніцы. На гэтыя бо патрэбы багабойныя валадары ды князі перш ахвяравалі сваю маёмасьць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці можна Хрысьціяніну мець свой маёнтак або маёмасьць? Піша бо Лука ў Дзеях, што ў першых Хрысьціянаў было ўсё супольнае.

**АДКАЗ**

Багабойны Лука так піша толькі пра царкву, якая была ў Ерузаліме (Дзеі 1: 12-26), але пра іншыя цэрквы ён ня піша, што Хрысьціяне мусяць мець між сабой ўсе рэчы за супольныя. Ды і ў Ерузалімскай царкве так рабілі не дзеля пастановы Апосталаў, але зь любові: той, хто быў на той час хрысьціянінам, прадаваў сваю маёмасьць ды прыносіў грошы Апосталам.

На той час гэта была асаблівая навука Сьвятога Духа, бо Дух Сьвяты, ведаючы, што Рымляне меліся зьнішчыць ды спустошыць Ерузалім, слушна навучыў тых Хрысьціянаў, каб яны загадзя сваю маёмасьць прадалі ды паслужылі патрэбам убогіх. Яны бо памяталі на слова Хрыстова, якое Ён Ерузаліму прамовіў: «Прыйдуць на цябе дні, калі ворагі твае абкладуць цябе акопамі і акружаць цябе, і сьціснуць цябе зусюль; і зруйнуюць цябе, і пазабіваюць дзяцей тваіх у табе, і не пакінуць ў табе каменьня на каменьні» (Лк. 19: 43-44).

Вось з гэтай прычыны тыя Хрысьціяне ў Ерузаліме прадавалі сваю маёмасьць і прыносілі грошы Апосталам, і ўсё мелі супольнае. Цяпер ўжо Хрысьціянам няма патрэбы прадаваць сваю маёмасьць, але трэба, каб Хрысьціяне адзін аднаго любілі ды ў час нястачы іншаму маёмасьці не пашкадавалі. Бо і ў часы Апосталаў кожны Хрысьціянін валодаў маёмасьцю і зь яе даваў міласьціну вучыцелям ды ўбогім. Такімі былі Тавіта, Карнэль. Дзеля гэтай прычыны і Апостал да Цімахвея так піша пра багатых: «Багатым у гэтым веку загадвай, каб яны ня думалі шмат аб сабе ані спадзяваліся на багацьце няпэўнае, але на Бога Жывога, што дае нам усё шчодра» (1 Цім. 6: 17). Зважай, не казаў Апостал: «Багатым забараняй мець багацьце», — але казаў не спадзявацца на багацьце ды ня думаць пра сябе шмат.

Праз Салямона Дух Святы дае пра гэта дастатковую навуку ў такія словы: «Хай навонкі разьліваюцца твае крыніцы, твораць на плошчах ручаі, але мей іх толькі ты адзін» (Прып. 5). Тут Дух Сьвяты загадвае пускаць ручаі ад крыніцы, гэта значыць, дзяліцца сваёй маёмасьцю з убогімі, але крыніцу загадвае самому мець, гэта значыць самому валодаць маёмасьцю. Бо калі хтосьці за адзін раз усю маёмасьць раздасьць або пакіне іншаму, з чаго будзе потым міласьціну даваць? Сам мусіць хлеба ў іншых прасіць.

Дзеля гэтага належыць Хрысьціяніну валодаць сваёй маёмасьцю, адно каб прыдбаў яе справядліва ды каб даваў міласьціну, як Хрыстос

Яко Хрістос рече: «Сушчаа дадите миластиня, и се все чиста вамъ будеть» (Лука 11: 34-41).

**ПЫТАНЬЕ**

Што онымъ Богъ обецалъ, которіи послушніи сего осмого слова?

**ОТКАЗЪ**

Которіи того слова послушни, то есть которіи на своихъ маетностяхъ переставають, чужое речи не жадають, а з маетностей своих милостину дають, тымъ Бог и зде достатокъ выхованья, и у другом животе спасеніе обецуеть. Напервей такови мають выхованье, яко у Псалтыри написалъ Давыдь: «Праведникъ милуеть и даеть». А мало нижей: «Младшій быхъ и сесътарехся, и не видех праведника оставлена, ни семени его просяшча хлеба. Весь день милуеть и в заемъ даеть праведный, и семя его въ благословении будеть» (Псалом 36).

О таковыхъ Самъ Хрістос рече: «Блажени милостивіи, яко тіи помилованы будуть» (Матф. 4: 25-5: 14). Таковым на суде Сам Спасителъ речеть: «Прійдите, благословении Отца Моего, наследуйте оуготованое вам Царствіе от сложеніа миру. Възалкахъ бо ся и дасте Ми ясти, въждадахся и напоисте Мя, сраненъ бехъ и въведосте Мене, нагъ и одеясте Мене, боленъ и посетисте Мене, въ темници бех и пріидосте къ Мне» и прочаа (Матф. 25: 31-46). А мало нижей: «Понеже сътвористе единому от сих братій Моих менших, Мне сътвористе».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко Богъ оныхъ караеть, которіи противу тому Слову чинять?

**ОТКАЗЪ**

Розные суть грехи противу тому Слову, яко вышшей речено, для того теже и каранья суть або бывають розные.

Напервей лакомых людей караеть Богъ зде, на земли, недостатком и нишчетою. Тако бо Соломон пишеть: «Мужь, хотяшчий скоро обогатитися и инымъ завидить, не знаеть, яко на него прійдеть нишчета» (Притч. 28). А мало пред тымъ рече: «Кто поспешаеть убогатитися, не будеть безъ вины». Ешче той же рече: «Кто зобижаеть нишчаго приспорити собе имения, отдасть потом богатъшему, а самъ обнишчаеть» (Притч. 22).

Явные суть сие сведества, яко Богъ караеть на сим свете, они же на сее осмое слово не паметують, але далеко горшей на ономъ свете обецалъ таковыхъ карати. То есть всехъ немилостівых, которіи ближному часу потребы не пособляють, теже татевъ, лихоимцовъ, обидниковъ осудить Богъ въ вечную муку. Яко у Святом Евангелию написано, иже на оном страшном суде речеть Царь сушчіимъ о левицы Его: «Идите от Мене, проклятіи, въ огонь вечный, оуготованый діаволу и аггеломъ его. Възалкахъ бо ся и не дасте Ми ясти, въждадахъся и не напоисте Мене, страненъ бехъ, и не въведосте Мене, нагъ и не одеясте Мене, боленъ и в темници и не посетисте Мене» (Матф. 25: 31-46). А мало нижей: «Понеже не сътвористе единому от сих менших, ни Мне сътвористе, и идуть сіи в муку вечную».

казаў: «Лепш давайце людзям міласьціну з таго, што ўнутры, і ўсё будзе вам частым» (Лк. 11: 41).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што Бог абяцаў паслухмяным гэтаму восьмаму слову?

**АДКАЗ**

Тым, хто паслухаецца гэтага слова, — значыць, хто задаволіцца сваім, не пажадае чужой рэчы ды са сваёй маёмасьці будзе даваць міласьціну, — тым Бог абяцае і ў гэтым жыцьці дабраславенства, і ў будучым жыцьці збаўленьне.

Найперш такія маюць дабрабыт, як напісаў у Псальмах Давід: «Справядлівы чалавек шчодры і дае» і трохі ніжэй: «Я быў малады і пастарэў, ды ніколі ня бачыў, каб пабожны быў кінуты, каб род ягоны хлеба прасіў. Заўсёды ён шчодры і пазычае, і род ягоны будзе дабраслаўлёны» (Пс. 36).

Пра такіх Сам Хрыстос казаў: «Дабраславёныя міласьцівыя, бо яны будуць памілаваныя» (Мц. 5: 7). Такім на судзе Сам Збаўца скажа: «Прыйдзіце, бласлаўлёныя Айца Майго, насьлядуйце валадарства, прыгатаванае вам ад стварэньня сьвету. Бо Я хацеў есьці, і вы накармілі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязьніцы, і вы прыйшлі да Мяне» (Мц. 25: 35-36). І трохі ніжэй: «Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых меншых братоў Маіх, вы зрабілі Мне».

**ПЫТАНЬНЕ**

Як Бог карае тых, хто гэтае слова парушае?

**АДКАЗ**

Розныя ёсьць грахі супраць гэтага слова, як ужо вышэй было ўзгадана, дзеля гэтага і пакараньні ёсьць або бываюць таксама розныя.

Найперш хцівых людзей Бог карае тут, на зямлі, нястачаю ды жабрацтвам. Так бо Салямон піша: «Чалавек ліхога вока сквапны на багацьце, а ня ведае, што бяда прыйдзе на яго» (Прып. 28), а крыху раней перад гэтым ён кажа: «Хто хоча скора ўзбагацець — не міне кары» (Прып. 28). Ды ён жа сказаў: «Крыўдзіцель беднага аддасьць сваю маёмасьць багатаму, а сам зьбяднее» (Прып. 22).

Яўныя гэта сьведчаньні, як Бог карае на гэтым сьвеце тых, хто забываецца на восьмае прыказаньне, але нашмат горш Ён абяцае такіх пакараць у будучым жыцьці. Значыць, усіх неміласэрных, якія не дапамагаюць бліжняму ў час патрэбы, таксама злодзеяў, хабарнікаў, крыўдзіцеляў асудзіць Бог на вечную пакуту. Бо ў Сьвятым Эвангельлі напісана, што на Апошнім Судзе скажа Валадар усім, што леваруч Яго: «Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, прыгатаваны д'яблу ды анёлам ягоным. Бо Я хацеў есьці, і вы не далі Мне; прагнуў, і вы не напаілі Мяне; быў нагі, і не адзелі Мяне; быў хворы і ў вязьніцы, і не адведалі Мяне» (Мц. 25: 41-43). І трохі ніжэй: «Як вы не зрабілі гэта аднаму з гэтых меншых, то не зрабілі Мне. І пойдуць гэтыя на пакуту вечную».

По тому жь Апостолъ пишеть: «Не льстите ся, ни лихоимци, ни татие, ни пианици, ни злоляици, ни хишчници Царствіа Божіа не наследать» (1 Кор. 5: 12-6: 20). Соломонъ о немилостивых тако пишеть: «Кто замыкаеть ухо свое, когда вопиеть нишчий, той сам вопияти будеть и не оуслышится» (Притч. 21).

**ПЫТАНЬЕ**

Говори девятое Слово Божіих заповедей.

**ОТКАЗЪ**

Девятое слово есть: «Не посведчишь на своего ближного сведества лживого».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся сее слово разуметь, або чого по насъ Богъ хочеть у томъ слове?

**ОТКАЗЪ**

Того по насъ Богъ хочеть у том Слове, абы есмо на всякъ часъ правду заховали, знали, говорили и чинили противу ближному нашему.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть добрие дела того Слова?

**ОТКАЗЪ**

Напервей о кажном у собе добре розумети, а на своей совести уквапливе никого не осужати. Пред правом або пред судом правду сознавати. Оумовы, приреченья крепко держати. Славу добрую о кажномъ пушчати. Слова всехъ на добрую сторону выкладати.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие суть злые дела того слова?

**ОТКАЗЪ**

Всякая неправда валчить на тое слово. Напервей грех естъ, або злое дело, противу сему слову у себе на своей совести о комъ зле розумети.

Грех естъ пред судом иначей, нежели было, съзнавати, хотя жь и на отца або на иного съродника или племеника.

Грех естъ приреченья, угоды, записы, присяги и всякие умовы ламати.

Грех естъ на славе доброй кого казити.

Грех естъ чии слова ницовати, абы што у добрый обычай кто рече, на злы розумъ опорочати.

Грехъ естъ невинного до права потягати.

Грехъ естъ винным будучи до права дати ся позывати.

Грехъ естъ о несправедливую речь у праве от кого говорити.

Грехъ естъ с правды неправду, або з неправды правду діалектікою або риторікою учинити.

Грехъ естъ ласкаве ся кому словомъ обецовати, а на сердци зло ему мыслити або его не любити. Таковых людей тепер ест много. И вся неправда грехъ естъ противу тому девятому слову.

Таму і Апостал піша: «Дык не падманвайце сябе: ані злодзеі, ані хціўцы, ані п'яніцы, ані рабаўнікі ня возьмуць у спадчыну Валадарства Божага» (1 Кар. 6: 10). Салямон пра неміласэрных так піша: «Хто вушы свае затыкае на кліч беднага, той сам будзе прызываць, але ня будзе выслуханы» (Прып. 21).

**ПЫТАНЬНЕ**
Кажы дзевятае слова Божых прыказаньняў.
**АДКАЗ**
Дзевятае прыказаньне: «Ня сьведчы фальшыва на бліжняга свайго».

**ПЫТАНЬНЕ**
Як гэтае слова разумець, або што Бог хоча ад нас у гэтым слове?
**АДКАЗ**
Бог хоча ад нас у гэтым слове, каб мы ва ўсякі час праўду захоўвалі, ведалі, гаварылі ды рабілі нашаму бліжняму паводле праўды.

**ПЫТАНЬНЕ**
Якія ўчынкі, паводле гэтага слова, добрыя?
**АДКАЗ**
Найперш — пра кожнага думаць добрае і ў сваім сумленьні нікога пасьпешліва не асуджаць. Потым – вызнаваць праўду перад законам або перад судом. Дамовы, прысягі цьвёрда спаўняць. Добрае пра кожнага гаварыць. Словы кожнага чалавека на добрае разумець.

**ПЫТАНЬНЕ**
Якія ўчынкі парушаюць гэтае слова?
**АДКАЗ**
Усякая няпраўда парушае гэтае слова. Першы грэх, або благі ўчынак, паводле гэтага слова, — пра некага благое думаць.

Грэх перад судом інакш, чым было на самой справе, сьведчыць, хаця б і пра бацьку або іншага роднага ці сваяка.

Грэх парушаць абяцаньні, пагадненьні, запісы, прысягі ды ўсякія дамовы.

Грэх зьнеслаўляць добрае імя.

Грэх перакручваць словы іншага або штосьці добрым звычаем сказанае на благое зьмяняць.

Грэх бязьвіннага на суд выклікаць.

Грэх, вінаватым будучы, да суду даць сябе выклікаць.

Грэх на судзе ад імя іншага сьведчыць пра несправядлівую справу.

Грэх дыялектыкай або рыторыкай зьмяняць праўду на няпраўду або няпраўду на праўду.

Грэх ласкава некаму на словах абяцаць, а ў сэрцы благое супраць яго думаць ці яго не любіць. Такіх людзей зараз многа. І кожная няпраўда — грэх супраць гэтага дзевятага слова.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино не годиться и пастыром або учителем греховъ обличати? Бо и Христос рече: «Не судите, да не осужени будете».

**ОТКАЗЪ**

Сие слова не стоять напротиву судьям, пастыром, родителемъ и иным таковымъ особамъ, але только възбраняють, абы другъ друга не соромотилъ а не потварал. Опричных судовъ боронить Господь, а не врядовыхъ, ани тыхъ, которые з любви братерское походять. Бо на тот обычай Самъ Хрістос судити або обличати велить. Яко в Матфею написано: «Ашче съгрешить к тебе братъ твой, иди, обличи его междоу собою и темъ единемъ».

Пророку теже Самъ Богъ повелел людей своих грехи оповедати: «Возопій, — рече, — крепостію и не пошчади. Яко труба възнеси глас свой, и възвести людем Моимъ грехы ихъ и дому Іаковлю безакония ихъ» (Ісаіа 58). Естъ бо уряд Пророческій, Апостолскій и всех учителей грехы людемъ оказовати, абы от них бегали. Прото Креститель Хрістовъ Іоаннъ обличал Ирода (Марк 6: 14-29), Пророци – лжепророкы, Хрістос Самъ и Его Апостоли и Стефанъ обличали фарісеи и всехъ лицемерей (Деан. 6-7). Але на томъ перестаньмо.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли всякая ложь – грехъ, ино Авраамъ съгрешилъ коли, пришедши въ Египет, не сказалъ, абы Сарра жона его была, але ее сестрою своею звалъ (Быт. 12, 20, 26)? Тое жь учинилъ, коли гостилъ въ земли Герарской. По тому жь учинилъ и Ісаакъ в той же земли Герарской.

**ОТКАЗЪ**

Иншая речь естъ ложь, а иншаа – потребное утаенье. Ложь бо естъ, коли кто правъду отменяеть в неправду, хотячи тако ближному зло учинити, або ему ушкодити. Кто бы тако чинилъ, винен бы сему девятому слову.

Лечь святіи мусели под час некоих делъ таити, абы тым обычаем горшимъ речамъ вины не дали. Яко на взор маешь бабы Еврейские (Исход 1), которие пред Царом Египетским на жоны Еврейские сложили, яко бы оные при роженью детокъ бабъ не требовали. Не была то правда, але добре бабы учинили, абы потому от окрутного повеленья Царева волные были. Бо имъ былъ Царь велелъ весь полъ мужескій у Евреянокъ убивати. А ижь оные бабы у том не съгрешили, свечить Дух Святый Моисиомъ, где тако пишеть, ижь для того учинилъ Богъ добре бабамъ тымъ.

По тому же учинила Раавъ въ Іерихоне (Ісусъ Нав. 2), коли послал к ней Цар Іерихоньскій, абы выдала выгледачевъ Ісусъ Навиновых, скривши их, сказала, ижь вышли изъ города. Да вед же у том не съгрешила, ани можеть сее за ложь почитати, понеже тое потребъне учинила, абы тако животъ оныхъ шпегов оборонила.

Тым же обычаемъ некая жона Ахимаасу и Енафану, шпегомъ Давыдовымъ, учинила (2 Цар. 17). Затаивши бо их у колодези, сказала

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці належыць пастырам або вучыцелям выкрываць грэх, бо Хрыстос казаў: «Не судзіце і ня будзеце суджаныя»?

**АДКАЗ**

Словы гэтыя не супрацьстаяць судзьдзям, пастырам, бацькам ды іншым падобным асобам, а толькі забараняюць нам адзін аднаго высаромліваць ды адзін на аднаго паклёпнічаць. Асабістыя суды забараняе Госпад, а ня ўрадавыя ды тыя, што паходзяць з братэрскай любові. Бо такім звычаем Сам Хрыстос загадвае судзіць або выкрываць, як у Мацьвея напісана: «Калі брат твой правініцца табе, ідзі і выкрый яго ў чатыры вокі».

Прароку таксама Сам Бог загадаў, каб выкрыў грахі Ягонага народу: «Крычы моцна, не пераставай! Як труба падымі голас свой і выяві народу Майму злачынствы іхнія і для дому Якуба іхнія грахі» (Іс. 58). Ёсьць бо абавязак Прароцкі, Апостальскі ды Вучыцельскі – выкрываць грахі людзей, каб людзі сьцерагліся грахоў. Дзеля гэтага Ян, што Хрыста ахрысьціў, выкрываў Герода (Мк. 6: 18), прарокі – ілжэпрарокаў, Сам жа Хрыстос ды Ягоныя Апосталы і Стэфан выкрывалі фарысэяў ды ўсіх крывадушнікаў (Дзеі 6-7). Але на гэтым спынімся.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі ўсякая няпраўда – грэх, то Абрагам саграшыў, калі, прыйшоўшы ў Эгіпет, не сказаў, што Сара была ягонай жонкай, але зваў яе сваёй сястрой (Роду 12, 20, 26). Тое ж ён зрабіў, калі гасьцяваў у зямлі Гэрарскай. Тым жа звычаем учыніў Ізаак у той жа зямлі Гэрарскай.

**АДКАЗ**

Адна справа – хлусьня, іншая – утаеньне ў час патрэбы. Хлусіць той, хто праўду зьмяняе ў няпраўду, жадаючы такім чынам зрабіць бліжняму блага або яму нашкодзіць. Хто так робіць, той парушае гэтае дзевятае слова.

Але ж сьвятыя мусілі часам некаторыя справы утойваць, каб ня здарыліся рэчы горшыя. За ўзор маем гебрайскіх павітух (Вых. 1), якія казалі эгіпецкаму фараону, што жанчыны-гебрайкі, нараджаючы дзяцей, ня клікалі павітух. Не было гэта праўдай, але павітухі добра зрабілі. Фараон загадаў ім забіваць сыноў гебраек, а яны такім чынам не выконвалі ягоную жорсткую пастанову. А што тыя павітухі не сагрышылі, Дух Сьвяты сьведчыць праз Майсея, які піша, што Бог дабраславіў тых павітухаў.

Гэтаксама ўчыніла Рагаб у Ерыхоне (Іс. Нав. 2): калі Ерыхонскі валадар загадаў ёй выдаць пасланцоў Ісуса Навіна, яна, схаваўшы іх, сказала, што пасланцы ўжо пайшлі з гораду. Дык жа ў тым Рагаб не саграшыла, і ня можа гэта лічыцца хлусьнёй, бо яна так зрабіла, каб абараніць жыцьцё тых выведчыкаў.

Тым жа звычаем адна жанчына абыйшлася з Ахімаасам ды Ёнатанам – выведчыкамі Давіда (2 Сам. 17). Схаваўшы іх у калодзежы, яна

слугам Авесоломовым, ижь пошли, напившися мало воды. И иных много естъ таковых взоровъ у Святомъ Писанию.

Прото надобе разность знати межи лжою а потребнымъ утаеньемъ. Ложь не только естъ утаенье правды, але к тому причиненье неправды къ шкоде или кривде невинного человека. Опять, утаити чого для пожитку невинного не естъ ложь ани грех, але естъ милосердие. Авраамъ не для того Саррю сестрою звалъ межи чужих людей, абы имъ што злого мыслилъ, але абы только самъ безпеченъ от нихъ был. Прото ани лгалъ у той мере, ани грешилъ.

Да вед же паметуй, яко всякаа ложь грех естъ, если бы не за великою потребою была, яко похлебство, або коли кто безпотребне только або для звычаю, або для тошчое славы небылые речи кажеть. От такового звычая винен ся человекъ гамовати. Хрістос бо рече: «Буди слово ваше ей, ей, ни, ни. Лихое же сея от непріязни естъ» (Матф. 5: 33-41).

**ПЫТАНЬЕ**

Карает ли Богъ оныхъ, которіи противу сему слову девятому чинять?

**ОТКАЗЪ**

Понеже Сам Бог естъ истинная правда, не можеть любити лжи и всякое неправды. И того для, всех ложь и неправду говорачих обецалъ карати и караеть по вси часы. Яко написано: «Погубиши всех, глаголюшчихъ лжу» (Псалом 5). Соломонъ теже рече: «Сведетель лживый не будеть без помсты, и кто направду молвить, не съкриется» (Притч. 19). И опять, той же пишеть: «Сведитель ложенъ погибнеть» (Притч. 21). И маемь на взорь Ананию и Самфірю, его жону, которых Богъ наглою смертію лжи деля скаралъ (Деан. 5).

**ПЫТАНЬЕ**

Што оным будеть, которіи тому слову послушни?

**ОТКАЗЪ**

Великие заплаты обецуеть Богъ у слове Своемъ тымъ, которіи бы правду и знали, и говорили. Яко напервей естъ у псалме 14 написано: «Господи, кто обитаеть в жилишчи Твоем, или кто вселится в горю святую Твою. Входяй безъ порока и делая правду. Глаголяй истину въ сердци своем, иже не у льсти языком своимъ. И не сътвори искренему своему зла, и поношенія не пріять на ближния своя». А мало нижей рече: «Кленыйся искрнему своему и не отметая ся. Творяй сия, не подвижется въ веки».

Лепшие заплаты быти не могуть, яко которіе зде Духъ Святый обецуеть. Напервей бо обецуеть Царствіе Небесное, а потом добрую совесть. А на ином месте Духъ Святый тако рече: «Кто ест человекъ, хотяй живота, любяй дние видети благы. Удержи языкъ твой от зла, и устне свои, еже не глаголати льсти» (Псалом 33). Зде опять обецуетъ и животъ долгы, и достатокъ къ выхованью оному, кто бы языку своему воли не дал.

сказала слугам Абесалома, што тыя, напіўшыся крыху вады, ужо зыйшлі. Ды шмат яшчэ такіх узораў ёсьць у Сьвятым Пісьме.

Дзеля гэтага і трэба ведаць розніцу паміж хлусьнёй ды патрэбным утаеньнем. Хлусіць – значыць ня толькі праўду схаваць, але да таго ж рабіць няпраўду, каб нашкодзіць ці каб пакрыўдзіць бязьвіннага чалавека. Зноў жа, утойваць штосьці дзеля добрага намеру – не хлусьня і ня грэх, але міласэрнасьць. Абрагам сярод чужых людзей назваў Сару сястрою не таму, што задумаў супраць іх нешта благое, але толькі каб самому быць у бясьпецы. Таму ён ані схлусіў, ані саграшыў.

Дык жа памятай, што ўсякая хлусьня – грэх, калі толькі не дзеля вялікай патрэбы сказана, гэтаксама як і грэх выхваляцца або без патрэбы, толькі дзеля звычаю або дзеля мінаючай славы, небыліцы распавядаць. Такой звычкі мусіць чалавек сьцерагчыся, Хрыстос бо сказаў: «Хай жа тады слова вашае будзе: “Так, так”. “Не, не”. А што болей — гэта ад ліхога» (Мц. 5: 37 ).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці карае Бог тых, што грашаць супраць гэтага дзевятага слова?

**АДКАЗ**

Паколькі Сам Бог – праўда, ня можа Ён любіць хлусьню ды ўсякую няпраўду. І дзеля гэтага ўсіх, хто хлусіць ды гаворыць няпраўду, Ён абяцае караць ды ва ўсе часы карае, як напісана: «Выгубіш усіх, хто гаворыць няпраўду» (Пс. 5). Салямон таксама казаў: «Фальшывы сьведка не ўсьцеражэцца кары, і не схаваецца той, хто гаворыць хлусьню» (Прып. 19). Ды, зноў жа, ён там піша: «Крывадушны сьведка загіне» (Прып. 21). За ўзор маем Ананію ды Сапфіру, ягоную жонку, якіх Бог дзеля няпраўды пакараў раптоўнаю сьмерцю (Дзеі 5).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што будзе тым, хто гэтага слова паслухаецца?

**АДКАЗ**

Вялікую ўзнагароду абяцае Бог у Сваім Слове тым, хто ведае ды вызнае праўду. Так найперш у чатырнаццатым псальме напісана: «Госпадзе, хто будзе жыць у доме Тваім? Хто паселіцца на гары Тваёй сьвятой? Той, хто жыве беззаганна і справядліва, і гаворыць праўду ў сэрцы сваім, і не абмаўляе сваім языком. Той, хто ня робіць благога бліжняму свайму і не ачарняе суседа свайго». Ды трохі далей сказана: «Той, хто спаўняе, хаця і зь некарысьцю для сябе, прысягае. Хто так робіць, не пахісьнецца навек».

Няма ўзнагародаў лепшых за тыя, што тут Дух Сьвяты абяцае. Найперш бо Ён абяцае Валадарства Нябяснае, а потым – добрае сумленьне. А ў іншым мейсцы Дух Сьвяты так сказаў: «Які гэта чалавек, што любіць жыцьцё, хоча доўга жыць і цешыцца шчасьцем? Не распускай свайго языка і вусны свае сьцеражы ад ліхіх слоў» (Пс. 33). Тут Ён зноў абяцае і доўгае жыцьцё, і дабрабыт тым, хто ня дасьць волі свайму языку.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори десятое слово Божіих заповедей.

**ОТКАЗЪ**

Десятое слово естъ: «Не похочеши жоны ближнего своего, и ни дому его, и ни поля, и ни паробка, и ни невольницы, и ни вола, и ни осла, и ни чего, што его естъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого Богъ по нас у том слове хочеть?

**ОТКАЗЪ**

Хочеть, абыхмо о Его Законе иначей розумели, нежели о человечихъ законехъ. Человечие бо уставы або законы делом только зла чинити забраняють, а того за справедливого поличають, кто бы оные зверъху только чинилъ. Але Законъ Божій не только делом зла чинити заказуеть, но того по кажном хочеть, абы не сердцомъ, ни помысломъ, ни хотеньемъ противу ему выстповалъ. А кто бы тому досыть чинилъ, то естъ николи не похотелъ, того Законъ Божій за невинного поличаеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Чи можеть человек того довести, абы не похотелъ або не пожадалъ?

**ОТКАЗЪ**

И сами по собе знати можемъ, и Слово Божіе сведчить, яко не можеть никто тому досыть учинити, абы в немъ похоти не было.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли бы того никто исполнити не моглъ, для чого жь Богъ далъ сию заповедь?

**ОТКАЗЪ**

Не только сее заповеди, але иныхъ всех исполнити человекъ не можеть. Бо кажная заповедь достаточного выполненья потребуеть и хочеть, яко вже мовили есмо, а человекъ утратилъ таковую силоу, ставшися подданый греху. Яко и Апостолъ тую же вину даеть, где рече: «Закон духовенъ естъ, азъ же плотенъ» (Рим. 7: 14-8: 1).

Прото не для того Богъ далъ Законъ, абы и человек выполнити могъ, але наболей абы позналъ и обачилъ недостатокъ свой. А обачивши, абы у собе не уповалъ, але бы где инде лекарства и спасенья искалъ. А для лепъшего вырозуменья обачь а паметай, ижь троякій естъ пожитокъ Закона – наказание, которого и добрим, и злым потреба. Хочеть бо Богъ, абы зліи люди были гамовани и карани. А добрим потреба науки и наказанья, наболей молодым людемъ и простымъ.

Другый пожитокъ Закона – къ обличанью греховъ и престрашанью совести. О чом Апостолъ пишеть: «Законом познание греха» (Рим. 3: 19-4: 4). А на иномъ месте: «Законъ гнев съделавяеть. Бо естли бы никакова закона не было, а по чом бы знати грехъ?» (Рим. 4: 13-25)

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажы дзесятае слова Божых прыказаньняў.

**АДКАЗ**

Дзесятае прыказаньне: «Не пажадай жонкі бліжняга свайго, і не жадай дому бліжняга свайго, ані поля ягонага, ані парабка ягонага, ані служанкі яго, ані вала яго, ані асьляці яго ды нічога, што ягонае».

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаго Бог хоча ад нас у гэтым слове?

**АДКАЗ**

Ён хоча, каб мы разважалі пра Ягоны Закон інакш, чым пра законы чалавечыя. Чалавечыя бо статуты або законы забараняюць рабіць благое толькі відавоку ды ўважаюць за справядлівага таго, хто іх толькі звонку спаўняе. Закон жа Божы ня толькі забараняе чыненьне благіх справаў, але і ад кожнага патрабуе ані ў сэрцы, ані думкай, ані жаданьнем яго не парушаць. Таго, хто гэта спаўняе, значыць, не пажадае, Закон Божы ўважае за нявіннага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці можа чалавек так жыць, каб анічога не пажадаць?

**АДКАЗ**

І самі па сабе можам зьведаць, і Слова Божае нам сьведчыць, што ня можа ніхто так зрабіць, каб у ім не было пажаданьня.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ж Бог даў гэтае прыказаньне, калі яго ніхто ня можа выканаць?

**АДКАЗ**

Ня толькі гэтага прыказаньня, але і ўсіх іншых чалавек ня можа выканаць. Бо кожнае прыказаньне патрабуе і хоча дасканалага выкананьня, як ужо мы казалі, але чалавек страціў такую сілу, стаўшыся падданым граху, як і Апостал пра гэтую ж прычыну засьведчыў, калі сказаў: «Бо мы ведаем, што Закон духоўны, а я цялесны» (Рым. 7: 14).

Не дзеля таго Бог даў Закон, каб чалавек мог яго выканаць, але найбольш дзеля таго, каб спазнаў ды ўбачыў сваю недасканаласьць. Ды, убачыўшы, каб не на самога сябе спадзяваўся, але каб дзе ў іншым мейсцы шукаў лекаў ды збаўленьня. А дзеля лепшага разуменьня пабач ды памятай, што траякі ёсьць прыбытак ад Закону.

Першы прыбытак ад Закону – пакараньне, якога патрабуюць і добрыя, і благія, бо Бог хоча благіх людзей уціхамірваць ды караць. А добрым людзям патрэбны навука ды пакараньне, найбольш маладым людзям ды простым.

Другі прыбытак Закону – выкрыцьцё грахоў ды перасьцярога сумленьню, пра гэта Апостал піша: «Бо праз Закон пазнаецца грэх» (Рым. 3: 20) і ў іншым мейсцы: «Бо Закон выклікае гнеў, а дзе няма Закону,

Третій пожитокъ Закона оправданымъ, абы ведали, которие дела чинити винни. Бо хотя жь слободни суть от Закона, абы их не осужалъ, але от того не волные, абы могли чинити, што бы хотели. Прото Хрістос поведелъ: «Не прійдох разорити Закона» (Матф. 5: 14-20).

**ПЫТАНЬЕ**

Што надобе при кажъномъ слове заповедей Божіих обачати?

**ОТКАЗЪ**

Чотыри речи при кажномъ слове потреба обачати и паметати. Первая речь – што нам чинити велить и чого боронить. Другая речь – къ которому концу. Третяя речь – естли бы есмо могли выполняти. Четвертая – яко Богъ любить недостаточное выполнянье.

О перъвой речи мели есмо при кажномъ слове. О другой пакъ маем ведати, ижь кажьная заповедь к тому концу от Господа Бога естъ подана, абыхом ся Его бояли, а што Онъ велелъ чинили. О третей речи маемъ ведати, яко есмо теперъ розмавляли, то естъ ижь таковъ человекъ не былъ на свете, ани естъ, ани будетъ, которій бы достаточне Законъ выполнилъ, а не рекучи весь Закон, але единому слову николи никто досыть не учинилъ. Кроме только Самого Сына Божіего, Господа нашего Ісус Хріста. Той Законъ Самъ исполнилъ.

Четвертая речь, которую маемъ ведати, естъ яко ся нашие дела подабати Богу могуть, понеже недостаточные. О том тако розумети маемъ, ижь хотя жь послушество нашое не естъ достаточно, але ижь мы верою в Сына Божіего угодни бываемъ Богу и Ему ся подобаемъ, прото и нашие дела любить, хотя жь недостаточные, але ижь особу Богъ любить, и дела любить. Опять, если которого человека не полюбить, тогды и делъ его полюбити никак не можеть. Яко Апостолъ къ Евреом пишеть: «Без веры невозможно угодити Богу» (Евр. 10: 35-11: 7). А на ином месте рече: «Все, еже не ест от вери, грех естъ» (Рим. 14: 18-26).

## КОНЕЦЪ
## первое части КАТИХИСИ

няма і праступку. Калі б не было Закону, як бы спазналі, што ёсьць грэх?» (Рым.4: 15).

Трэці прыбытак ад Закону — апраўданым, каб яны ведалі, якія справы павінны рабіць. Бо хаця яны і вольныя ад асуджэньня Закону, але ня вольныя рабіць усё, што захочацца. Пра гэта Хрыстос сказаў: «Не прыйшоў Я скасаваць Закон» (Мц. 5: 17).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што трэба заўважыць пры кожным слове Божых прыказаньняў?

**АДКАЗ**

Чатыры рэчы пры кожным прыказаньні патрэбна заўважыць ды памятаць. Першая рэч – што прыказаньне нам загадвае ды што забараняе. Другая рэч – дзеля чаго. Трэцяя рэч – каб маглі прыказаньне выконваць. Чацьвёртая – што Бог любіць і недасканалае выкананьне прыказаньняў.

Пра першую рэч мы казалі пры кожным прыказаньні. Пра другую рэч мусім ведаць, што кожнае прыказаньне дадзена Богам дзеля таго, каб мы баяліся Бога ды рабілі тое, што Ён загадвае. Пра трэцюю рэч мусім ведаць, як мы ўжо гаварылі, што не было, няма ды ня будзе на сьвеце чалавека, які б увесь Закон выканаў дасканала. Ды ня кажучы ўжо пра ўвесь Закон, нават аднаго прыказаньня ніхто дасканала ня выканаў, акрамя толькі Самога Сына Божага Госпада нашага Ісуса Хрыста. Ён увесь Закон Сам споўніў.

Чацьвёртая рэч, якую маем ведаць: нашыя ўчынкі могуць падабацца Богу, нават калі яны недасканалыя. Гэта так мусім разумець: хаця нашая паслухмянасьць і недасканалая, але мы вераю ў Сына Божага дагаджаем Богу і Яму падабаемся. Таму і ўчынкі нашыя, хаця і недасканалыя, Бог любіць. Бо калі Бог любіць чалавека, то і ягоныя ўчынкі любіць. Ды зноў жа, калі нейкага чалавека Бог ня любіць, тады і ягоныя ўчынкі палюбіць ніяк ня можа, як Апостал да Гебраяў піша: «А бязь веры немагчыма падабацца Богу» (Гебр.11: 6). І ў іншым мейсцы кажа: «А ўсё, што робіцца не па веры, грэх» (Рым. 14: 23).

## КАНЕЦ
## першай часткі КАТЭХІЗІСУ

# ПОЧИНАЕТСЯ ВТОРАЯ ЧАСТЬ КАТИХИСІ О ВЕРЕ

**ПЫТАНЬЕ**

Поведелъ есь на початку сее розмовы, яко чотыри суть части наоуки Хрістіанской, и сказалъ есь, яко Першая часть естъ десятеро Божіе приказанье, Другая – вызнаньне веры, Третяя – молитва Господня, Четвертая часть – наука о тайнех Хрістовыхъ.

Иле ся дотычеть первое части, уже ведаю, яко ся кажное приказанье розумееть и яко оныхъ Богъ караеть, которіи непослушни, яко теже милуеть послушнихъ, и иншие таковые речи паметую. Тепер прошю тебе, ростолкуй ми вторую часть о вере и ее исповеданію, или о вызнаньню. Наболей пакъ скажи ми, што ест вера?

**ОТКАЗЪ**

Вера по Апостолу естъ надеемым вешчемъ составъ, обличение невидимымъ (Евр. 10: 35-11:8). То естъ хотя жь кто чого не виделъ, а предся такъ тому веру иметь, яко коли бы виделъ, тое вера словеть. Яко на взорь, никто от людей при том не былъ, коли светь створон, а предся веруемъ, яко и Богъ створилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Колько ест способовъ веры?

**ОТКАЗЪ**

Двой ест способъ веры. Первый естъ, коли которую речь за правдивую кто маеть, хотя жь при ней не былъ. А таковую верю зовоуть верою деанія. Яко коли кто верить, иже все, што о Христе написали святіи Евангелисты, естъ правда. Опять, другый способ веры естъ, коли не только веруемъ, ижь Хрістос народилъся, умерь и въскресъ, але над тое веруемъ, яко для того оправданіи быти маемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што естъ оправдание?

**ОТКАЗЪ**

Естъ къ правде или къ справедливости привернене. Бо человекъ не остоялъся въ оной правде, у которой был створонъ, понеже

# ПАЧЫНАЕЦЦА ДРУГАЯ ЧАСТКА КАТЭХІЗІСУ ПРА ВЕРУ

**ПЫТАНЬНЕ**

Распавёў ты напачатку гэтай размовы, што чатыры ёсьць часткі навукі хрысьціянскай, і сказаў, што першая частка – гэта дзесяць Божых прыказаньняў, другая – вызнаньне веры, трэцяя – малітва Госпадава, чацьвёртая частка – навука пра Таямніцы Хрыстовыя.

Што датычыцца першай часткі, ужо я ведаю, як разумець кожнае прыказаньне, як Бог карае непаслухмяных, як паслухмяных мілуе, ды іншыя гэтакія рэчы памятаю. Цяпер, прашу цябе, растлумач мне другую частку – пра веру ды пра яе вызнаньне. Перадусім скажы мне, што ёсьць вера?

**АДКАЗ**

Вера, паводле Апостала, ёсьць зарука чаканага і пэўнасьць у рэчах нябачных (Гебр.11:1). Значыць, хаця хтосьці нечага і ня бачыў, аднак так у тое верыць, быццам бы тое бачыў, – гэта і ёсьць вера. Напрыклад, нікога зь людзей не было пры стварэньні сьвету, аднак жа мы верым, што ён Богам створаны.

**ПЫТАНЬНЕ**

Колькі ёсьць спосабаў веры?

**АДКАЗ**

Ёсьць два спосабы веры. Першы – калі нейкую справу маем за праўдзівую, хаця ж самі пры ёй не былі. Такую веру завуць верай дзеяньня. Напрыклад, мы верым у праўдзівасьць усяго, што сьвятыя Эвангелісты напісалі пра Хрыста. Зноў жа, другі спосаб веры – калі мы ня толькі верым, што Хрыстос нарадзіўся, памёр ды ўваскрос, але і верым, што мы дзеля гэтага маем апраўданьне.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што такое апраўданьне?

**АДКАЗ**

Гэта навярненьне да праўды або да справядлівасьці. Бо чалавек

над Божие росказанье змиовой рады послухалъ. Зачим до вечной смерти былъ упалъ. Прото потребовалъ лекарства, яко бы опять ожилъ и къ справедливости пріити могъ.

**ПЫТАНЬЕ**
Которого жь лекарства потребовалъ?
**ОТКАЗЪ**
Самъ человекъ на оный часъ не разумелъ, о чим бы могъ поправитися, але Богъ ему тогды жь ознаймил, ижь мело пріити таково семя, которое бы главу зміову потоптало и съкрушило. Тако бо къ змію Богъ рече: «Вражду посреди тебе и посреди жены, и посреди семенемъ твоим и посреди тобою, и той тебе блюдеть главу, ты же ему блюдеши пяту» (Быт. 3). Тую жь опять обетницу поновилъ Богъ къ Аврааму, где тако рече: «Благославятся о семени твоемъ вси народы земли» (Быт. 22). Тое пак семя по Апостолу Павлу есть и розумеется Хрістос (Гал. 3).

**ПЫТАНЬЕ**
Всем ли Хрістос благословение наготовалъ?
**ОТКАЗЪ**
Правда есть, ижь Богъ Сына Своего всем людемъ послалъ и за всехъ и предалъ, бо и Сам Спасъ рече: «Тако Богъ възлюби мирь, яко же и Сын Свой единородный далъ есть» (Іоан 3:16-21). Где слышишь, ижь мир або светъ възлюбилъ Богъ, и Сына Своего за нь выдалъ, можешь розумети, ижь не за одного ани за тисечь, але за всехъ учинилъ Богу досыть. Яко и Іоаннъ о Нимъ поведелъ: «Се, Агнецъ Божій вземляй грехы мироу» (Іоан 1: 29-34). По тому жь и Апостолъ рече: «Се есть добро и приатно пред Спасителем нашим Богом, иже всем человеком хочеть спастися и в разум истины пріити» (1 Тім. 2:1-15).

Прото, мовлю, правда, ижь всемъ Хрістос благословеніе наготовалъ. Да вед же не вси къ тому уготованному благославенію пріидут. Не с стороны Бога, але для своей вины, ижь того благословеніа не пріимают. То есть, не верують, ани на Хрістово заслуженье уповають, и того для им заслугы Его пожитку не делають. Хочеть бо Хрістос, абы хотяшчіи спастися в Него верили. Прото где рече: «Тако Богъ възлюби мирь, или светъ, иже Сына Своего далъ» приложилъ оные слова: «Да всяк веруяй во нь, не погыбнеть, но имать животъ вечный».

Видишь, яко оному веры надобе, кто хочеть вечъный животъ мети. По тому жь Апостоломъ заповедаючи, рече Хрістос: «Шедша в мир весь, проповедите Евангелие всей твари, иже веру иметь и окрестится, спасен будеть» (Марк 16: 9-19).

**ПЫТАНЬЕ**
Досыт ли на тым, ижь кто въ сердци веру мети будеть?

не застаўся ў той праўдзе, у якой быў створаны, калі замест Божага загаду паслухаўся парады зьмея. З-за гэтага прыйшла на чалавека вечная сьмерць. Таму і патрабаваў ён лякарства, каб зноў ажыць і да справядлівасьці прыйсьці.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якога ж лякарства ён патрабаваў?

**АДКАЗ**

Сам чалавек на той час не разумеў, ад чаго мог бы паправіцца, але Бог тады ж яму абʼявіў, што мелася прыйсьці такое патомства, якое галаву зьмяіную растопча ды скрышыць. Так бо зьмею Бог сказаў: «І Я пакладу варожасьць між табой і жанчынай, і патомствам тваім і ейным патомствам. Яно сатрэ галаву табе, а ты сатрэш яму пяту» (Роду 3). Тое самае абяцаньне Бог аднавіў Абрагаму, калі так сказаў: «Атрымаюць дабраславенства ў патомстве тваім усе народы зямлі» (Роду 22). Патомства ж гэтае, паводле Апостала Паўлы, ёсьць Хрыстос (Гал. 3).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці ўсім Хрыстос дабраславенства заслужыў?

**АДКАЗ**

Праўда ў тым, што Бог паслаў Свайго Сына да ўсіх людзей і за ўсіх людзей Яго аддаў, бо і Сам Збаўца казаў: «Так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго Адзінароднага даў» (Ян 3:16). Калі чуеш, што Бог палюбіў сьвет і аддаў за яго Свайго Сына, разумееш, што ані за аднаго чалавека, ані за тысячы, але ўсіх людзей Хрыстос прынёс ахвяру перад Богам. Ян пра Яго гэтаксама казаў: «Вось Ягнё Божае, Той, хто бярэ на Сябе грахі сьвету» (Ян 1: 29). Тым жа звычаем Апостал гаварыў: «Гэта добра і міла Збаўцы нашаму Богу, Які хоча збавіць усіх людзей і давесьці іх да пазнаньня праўды» (1 Цім. 2: 3-4).

Таму, кажу, праўда, што Хрыстос заслужыў дабраславенства ўсім людзям. Але ня ўсе людзі прыйдуць да гэтага падрыхтаванага дабраславенства. Не дзеля віны Бога, але дзеля сваёй віны, бо гэтага дабраславенства яны не прыймаюць. Гэта значыць, ня вераць ды на ахвяру Хрыста не спадзяюцца, дзеля чаго Ягоныя заслугі не прыносяць ім аніякага здабытку. Хоча бо Хрыстос, каб той, хто жадае збавіцца, у Яго верыў. Дзеля таго там, дзе сказаў: «Так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго даў», Ён далучыў тыя словы: «Каб кожны, хто ў Яго верыць, не памёр, але меў жыцьцё вечнае».

Бачыш, чалавеку, які хоча мець жыцьцё вечнае, патрэбна вера, таму і Хрыстос загадаў Апосталам: «Ідзіце на ўвесь сьвет і вясьціце Эвангельле ўсякаму стварэньню. Хто ўверыць ды прыйме хрост, будзе збаўлены» (Мк. 16: 15-16).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці досыць, калі будзеш мець веру ў сэрцы?

**ОТКАЗЪ**

Не досыть, бо потреба на сердци веру маючи, и усты оную исповедати. Яко Апостолъ рече: «Ашче исповеси усты своими Господа Ісуса и веруеши въ сердци своемъ, яко Богъ того въздвиже от мертвыхъ, спасешися. Сердцем бо веруется въ правду, усты же исповедуется въ спасеніе» (Рим. 10:1-10).

**ПЫТАНЬЕ**

Какъ маеть хрістианинъ о Бозе веру мети и оную исповедати?

**ОТКАЗЪ**

Не иначей только потому, яко ся нам Сам Богъ обявилъ у Своемъ святымъ Слове.

**ПЫТАНЬЕ**

Што Божіимъ Словомъ называешь?

**ОТКАЗЪ**

Все оное, што кольве Духом Святымъ писали Пророци, Евангелисты и Апостоли, што по греческии «Вивліа» зовуть.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко тое быти можеть, понеже не вси писмени умеют, и память человеча такъ много паметати не подойметь?

**ОТКАЗЪ**

Не на том залежить, абы вси напамять умели, а наболей простые, все што Пророци и Апостоли писали. Досыть, абы простые умели «Вызнанье, или Сімволъ веры». Бо и все Святое Писанье болшей у собе не замыкаеть, только тые речи, которие коротко у «Вызнанью веры» описано.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто написалъ «Сложеніе веры, или Сімволонъ»?

**ОТКАЗЪ**

Не одно естъ сложеніе веры. Бо мало не на кажномъ Съборе причиняно сложеніа для еретикъ, которіи часто повставали и новые наоуки сеяли. Напершое сложеніе естъ, которое по греческіи «Сімволонъ тон агіонъ апостолонь» зовуть, сие естъ «Гасло, или Сложеніе святыхъ Апостолъ».

Тое спочатку межи собою мели христіане, ажь потом насталъ Арій еретикъ, который Хріста за истинного по естестве Бога не исповедалъ. Того для святіи, которіи на той часъ были учители, събравшеся в Никеиский город, мусели некоторіе слова от Святого Писанія къ первому символу пріложити.

Опять же, насталъ Македоній, который Святого Духа хулилъ и сътвореньемъ быти казалъ, прото и противу тому събралися Епископи в Константиноград и приложили некоторіе слова къ «Символу» Никейс-

**АДКАЗ**

Ня досыць, бо трэба, маючы веру ў сэрцы, і вуснамі яе вызнаваць, як Апостал казаў: «Дык калі вуснамі тваімі вызнаеш: «Ісус – Госпад», і ў сэрцы тваім уверыш, што Бог уваскрасіў Яго з памерлых, будзеш збаўлены. Сэрцам бо верыцца дзеля справядлівасьці, а вызнаецца вуснамі дзеля збаўленьня» (Рым. 10: 9-10).

**ПЫТАНЬНЕ**

Як мае хрысьціянін у Бога верыць і веру вызнаваць?

**АДКАЗ**

Толькі так, як нам Сам Бог аб'явіў у Сваім сьвятым Слове.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што называеш Божым Словам?

**АДКАЗ**

Усё тое, што-кольвек Духам Сьвятым пісалі Прарокі, Эвангелісты ды Апосталы, што па-грэцку «Біблія» завецца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як гэта можа быць: ня ўсе ж пісьменныя ды і ня здолее чалавек так шмат запомніць?

**АДКАЗ**

Не на тым залежыць, каб усе людзі, перадусім простыя, ведалі на памяць усё, што пісалі Прарокі ды Апосталы. Досыць, каб простыя людзі ведалі «Вызнаньне, або Сымбаль веры». Бо і ўсё Сьвятое Пісьмо не зьмяшчае ў сабе больш за тое, што ў «Вызнаньні веры» сьцісла запісана.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто напісаў «Вызнаньне, або Сымбаль веры»?

**АДКАЗ**

Не адно ёсьць вызнаньне веры. Бо ледзь не на кожным Саборы, дзеля герэтыкоў, якія часта паўставалі ды сеялі новыя вучэньні, складалася вызнаньне веры. Самае першае вызнаньне тое, што па-грэцку завецца «Сімволон тон агіон апостолон», гэта значыць «Пароль, або Вызнаньне сьвятых Апосталаў».

Спачатку яго мелі між сабой хрысьціяне, але потым паўстаў герэтык Арый, які не вызнаваў Хрыста праўдзівым Богам. Дзеля таго сьвятыя вучыцелі, што былі на той час, сабраўшыся ў горад Нікейскі, мусілі далучыць да першага «Сымбалю веры» некаторыя словы зь Пісьма Сьвятога.

Зноў жа, паўстаў Македоні, які блюзьніў на Сьвятога Духа, кажучы, што Ён створаны. Дзеля таго зыйшліся епіскапы ў Канстанцінопаль ды далучылі некаторыя словы да «Сымбалю» Нікейскага. Гэты «Сымбаль» і зараз гавораць па грэцкіх цэрквах, хаця пазьней складаліся іншыя

кому. Которое «Символонъ» и теперъ у греческих церквах говорать. Хотя жь и потом писали и иныя сложеніа. Яко в Халькедоне противу Евтиха, и въ Ефесе противу Несторію и прочіим.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори сложеніе веры Апостольское.

**ОТКАЗЪ**

«Верую в Бога Отца Вседержителя, Творца небу и земли. И въ Ісуса Христа Сына Его единого, Господа нашего, Которий ся почалъ Духом Святымъ, народился от девы Маріи, пострадалъ при Понтеистемъ Пилате, роспят, умерь и погребенъ, зышолъ въ адъ, третиего дня повсталъ из мертвых, взишолъ на небеса, седить по правици Бога Отца Вседержителя. Отуль пріидеть судити живых и мертвых. Вероую и въ Духа Святаго, святую церков съборную, святыхъ обшчованье, грехом оставленіе, телу из мертвыхъ повстаніе і животъ вечный, аминь».

**ПЫТАНЬЕ**

Говори вызнанье веры събора Никейскаго.

**ОТКАЗЪ**

Тое жь естъ вызнанье веры събора Никейского, которое Константиноградского, только ижь приложили на съборе Константиноградском о Святым Дусе противу Макидонію еретику. И тако написали: «Вероую въ Единого Бога Отца Вседержителя, Творца небу и земли, видимым же всем и невидимым. И въ единаго Господа Ісус Христа, Сына Божіа единороднаго, иже от Отца роженаго преже всех век, светъ от света, Бога истинна от Бога истинна, роженна а не сътворенна, единосушчна Отцю, Им же вся быша.

Насъ ради человекъ, и спасеніа нашего ради съшедшаго съ небесъ и въплотившагося от Духа Святаго и Марія девы вълеловечьшася, распята же за ны при Поньтеистем Пилате, и страдавше, и погребена, и въскресша въ третій день по Писаніихъ, и въшедша на небеса, и седашча одесную Отца, и пакы грядушчаго съ славою судити живым и мертвымъ, Его же царствію нест конца. І в Духа Святаго истиннаго и животворяшчаго, иже от Отца исходяшчаго, иже съ Отцомь и Сыномъ спокланяема и славима, глаголяшаго пророкы. И едину святую съборную и апостольскою церковъ. Исповедую едино крешченіе въ оставленіе грехомъ, чаю въскресенія мертвым, и жизнь будушчаго века, аминь.»

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для сее «Символонъ» не згожается съ «Символемъ» Апостольскимъ?

**ОТКАЗЪ**

Уже есмъ поведелъ причину, для которое приложоно некоторие слова, не противные, але которие бы значней о Троици Святой наоуку замыкали. А к тому причину еретики онымъ старим Хрістіа-

вызнаньні, напрыклад, у Халкэдоне супраць Эўтыха і ў Эфэсе супраць Несторыя ды іншыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары Апостальскае вызнаньне веры.

**АДКАЗ**

«Веру ў Бога Айца Ўсемагутнага, Творцу неба ды зямлі, і ў Ісуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Госпада нашага, Які пачаўся з Духа Сьвятога, нарадзіўся зь дзевы Марыі, пакутаваў пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і пахаваны, зыйшоў у пекла, трэцяга дня ўваскрос з памерлых, узыйшоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца Ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых. Веру ў Духа Сьвятога, адзіную сьвятую паўсюдную Царкву, веру ў супольнасьць сьвятых, адпушчэньне грахоў, уваскрасеньне з памерлых і жыцьцё вечнае. Амін».

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары вызнаньне веры сабору Нікейскага.

**АДКАЗ**

Вызнаньне веры сабору Нікейскага тое ж самае, што і Канстанцінопальскага, толькі на саборы Канстанцінопальскім, паўстаючы супраць Македонія-гэрэтыка, далучылі словы пра Духа Сьвятога ды так напісалі: «Веру ў адзінага Бога Айца Ўсемагутнага, Творцу неба і зямлі, усяго бачнага ды нябачнага, і ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага адзінароднага, з Айца народжанага перад усімі вякамі, Сьвятло са Сьвятла, Бога праўдзівага з Бога праўдзівага, народжанага, а ня створанага, адзінасутнага Айцу, празь Яго ўсё сталася. Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зыйшоў зь неба ды ўцелавіўся ад Духа Сьвятога і дзевы Марыі, і стаў чалавекам.

Укрыжаваны таксама за нас пры Понцкім Пілаце, пакутаваў і быў пахаваны, і ўваскрос на трэці дзень паводле Пісаньняў, узыйшоў на неба і сядзіць праваруч Айца, прыйдзе ў славе судзіць жывых ды памерлых і Ягонаму Валадарству ня будзе канца. Веру ў Духа Сьвятога, праўдзівага і жыватворнага, Які ад Айца паходзіць, Які супольна з Айцом і Сынам прыймае пакланеньне і хвалу, Які прамаўляў праз прарокаў. Веру пра адзіную сьвятую паўсюдную і Апостальскай царкву, вызнаю адзіны хрост дзеля адпушчэньня грахоў, чакаю ўваскрасеньня з памерлых і жыцьця вечнага. Амін».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго гэты «Сымбаль» не згаджаецца з «Сымбалем» Апостальскім?

**АДКАЗ**

Ужо назваў я прычыну, дзеля якой былі далучаныя некаторыя словы, што не супярэчаць, але зьмяшчаюць больш дакладную навуку пра Сьвятую Тройцу. Падставу ж дзеля гэтага далі тым першым

номъ дали. Прото несъгласіе або незгода только естъ у словехъ, але не в розуме. Яко, на прикладъ, можем взяти первый стих «Символа». Той у Апостольском зложенью тако былъ написанъ: «Верую въ единого Бога Отца Вседержителя, Творца небу и земли». Селько исперва вызнанья было о первом Святое Троицы лицу. На котором они древніи хрістіане доволни были, нижли потом Маненть еретик две на чале всем речамъ быти наоучал, се ест Бога и беса (чти Епифанія о ересехъ). Видимым речам творца беса быти баснословилъ, а невидимым – Бога. Сего для святіи Епископи, которіи того часу были, приложили сия слова: «Видимым же всем и невидимымъ».

По тому жь и о другомъ Пресвятое Троици лицу первіи хрістіане по Апостольскому зложенію тако исповедь чинили: «И въ Ісуса Хріста Сына Его единого Господа нашего». На сим исповеданію вси доволни были, нежели змій онъ хитрый от презбитиров Александрьских побудилъ некоего Аріа, который о Спасе училъ, яко не по естествоу, але по благодати Сынъ Божий естъ, яко и мы. То естъ не Творецъ, але створенье. Того для святіи отцы приложили оные слова: «Единороднаго, иже от Отца роженаго преже всехъ векъ, светъ от света, Бога истинна от Бога истинна, роженна, а не сътворенна, единосушчна Отцю, Им же вся быша». А тая ест причина тому, ижь у словех не съгласныя суть зложеніа веры.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми тое, годило ли ся оным святым Епископомъ прикладати къ науце святых Апостолъ?

**ОТКАЗЪ**

Не рекучи Епископомъ, але ани самым Апостолом, ни ангеломъ годится прикладати к Божіему Слову, яко Апостолъ рече: «Ашче мы или аггелъ с небеси благовестить вамъ паче еже благовестихом вамъ, анафема да будеть» (Гал. 1: 3-10).

Если бы они Епископи собою што приложили, чого бы у Святом Писанію не было, тогды бы не годилося оного их приложенья пріимати, але ижь не от своего розуму прикладали, но от Святого Писанія, маеть быти принято. Бо не естъ их слово, але Божіе.

**ПЫТАНЬЕ**

Первей, нижь къ достаточному того зложенья розберанью приступемо, скажи ми, чого для зложеніе веры «Символон» нарицается, што ест за слово?

**ОТКАЗЪ**

«Символонъ» греческое естъ слово, лечь на нашь языкъ не может ся одном словом преложити. Бо греки иногда сее слово «символон» вместо того пишуть, што мы гасломъ зовимъ. Иногда «символон» розумеется яко у насъ «упоминокъ», иногда – «зложеніе».

хрысьціянам герэтыкі. Таму і адрозненьне або нязгода ёсьць толькі ў словах, але не ў разуменьні. Як прыклад можам узяць першы верш «Сымбалю». У Апостальскім вызнаньні было так напісана: «Веру ў Адзінага Бога Айца Ўсемагутнага, Творцу неба і зямлі». Толькі ў гэтыя словы вызнавалі спачатку першую асобу Сьвятой Тройцы. Такім вызнаньнем першыя хрысьціяне былі задаволеныя, пакуль Манент-герэтык не пачаў вучыць, што толькі дзьве асобы – Бог і д'ябал – усім рэчам даюць пачатак (чытай Эпіфанія пра герэзыі). Ён блюзьніў, што творца бачных рэчаў – д'ябал, а нябачных – Бог. Дзеля гэтага сьвятыя епіскапы, якія былі на той час, далучылі словы: «Усяго бачнага і нябачнага».

Тым жа звычаем і другую асобу Найсьвяцейшай Тройцы першыя хрысьціяне, паводле Апостальскага «Сымбалю», так вызнавалі: «І ў Ісуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Госпада нашага». Гэтым вызнаньнем былі ўсе задаволеныя, пакуль той хітры зьмей не ўзьняў пасярод Александрыйскіх прэсьвітэраў нейкага Арыя, які вучыў, што Збаўца – Сын Божы не па сутнасьці, але, як і мы, па міласьці Божай. Значыць, Ён – ня Творца, але стварэньне. Дзеля гэтага сьвятыя айцы далучылі словы: «Адзінароднага, з Айца народжанага перад усімі вякамі, Сьвятло са Сьвятла, Бога праўдзівага з Бога праўдзівага, народжанага, а ня створанага, адзінасутнага Айцу, і празь Яго ўсё сталася». Гэта і ёсьць прычына, дзеля якой не згаджаюцца ў словах вызнаньні веры.

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы мне: ці належала тым сьвятым епіскапам далучаць штосьці да навукі сьвятых Апосталаў?

**АДКАЗ**

Ня кажучы ўжо пра епіскапаў, самім Апосталам ды нават анёлам не належыць далучаць штосьці да Божага Слова, як Апостал сказаў: «Але калі б нават мы або анёл зь неба абвяшчаў вам нешта іншае, чым тое, што мы абвяшчалі вам, хай будзе анатэма!» (Гал.1: 8).

Калі б тыя епіскапы далучылі нешта сваё, чаго не было ў Сьвятым Пісьме, тады б не належала гэтага прыймаць. Яны ж не сваім розумам нешта выдумлялі, але ўзялі словы Сьвятога Пісьма. Мае быць гэта прынята, бо ня іхнія гэта словы, але Божыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Перш, чым пяройдзем да падрабязнага разгляду гэтага вызнаньня, скажы мне: дзеля чаго вызнаньне веры завецца «Сымбаль», што гэта за слова?

**АДКАЗ**

«Сымбаль» – грэцкае слова, яно не перакладаецца на нашую мову адным словам. Бо грэкі гэтае слова «сымбаль» часам пішуць замест таго, што мы завем «пароль». Часам «сымбаль» азначае, як і ў нас, «напамін», часам – «вызнаньне».

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого жь хрістіане «Гасломъ» вызнанье своее веры называють?

**ОТКАЗЪ**

Для того, ижь яко на войне по гасле ся знають, тако зде, межи еретиков, межи жидовъ и иных неверныхъ, потреба такового гасла, по нем же бы ся Хрістіане знали. Мають бо и еретики той обычай называтися хрістіанами, але поневажь того гасла не ведають, не трудно оныхъ познати. Потомуже и жиды хвалятся Богомъ Единым и поведають, яко во нь верують, але их по гасле латве познати, къ которому войску прислушаютъ.

**ПЫТАНЬЕ**

На колько частей делится «Гасло, или Вызнаньне веры хрістіаньское»?

**ОТКАЗЪ**

На чотыры части некоторіи делять. Перваа часть, у которой Бога Отца исповедуемъ. Другаа, у которой Сына Божіего. Третяя, у которой Духа Святого. Четвертая пакъ, у котрой святую церков и дари, которие ее Богъ дал, вызнаваемъ.

Иншии на три части делять, бо исповеданье пресвятое Троицы – Отца и Сына и Святого Духа – за одну часть личять. Потом исповеданье церкви – за другую, а дари, которие у церкви сут, – за третию. Оба розделы добри суть.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори першую часть «Гасла» хрістіаньского.

**ОТКАЗЪ**

«Верую въ единого Бога Отца Вседержителя, Творца небу и земли.»

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для говоришь: «Верую въ единого Бога», а не просто: «Верую единого Бога»?

**ОТКАЗЪ**

Далеко иншаа речь естъ веровати Бога а, опять, веровати въ Бога, и веровати Богу. Веровати Бога, естъ веровати, яко Богъ естъ. А таковую веру и беси мають, яко Іаковъ пишеть: «Бо верують, иже Богъ естъ» (Іак. 2: 14-26). Але веровати в Бога никто не может, только хрістіанінъ. Бо веровати въ Бога розумеется уповати на Бога. Опять, веровати Богу, естъ веровати, ижь Богъ все, што обецалъ, исполнить.

Розумей, же вси тые три способы веры быти добрие, да ведже тотъ, который естъ у зложенію веры, лепшейшый, бо и у Святомъ Писанью тако Богъ приказуеть, абы есьмо в Него веровали. Яко где Хрістос рече: «Да не съмоушчается сердце ваше, веруете въ Бога и въ Мя веруйте» (Іоан 14:1-10). Не рече: «Веруйте быти Бога», але: «Въ Бога».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго хрысьціяне называюць вызнаньне сваёй веры «Пароль»?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што як на вайне паводле паролю пазнаюць адзін аднаго, так і тут, пасярод герэтыкоў, пасярод юдэяў ды іншых няверных патрэбны такі пароль, каб па ім хрысьціяне адзін аднаго пазнавалі. Маюць бо і герэтыкі звычай называцца хрысьціянамі, але ня ведаюць яны таго паролю, таму і няцяжка іх пазнаць. Тым жа звычаем і юдэі хваляцца Богам адзіным ды кажуць, што ў Яго вераць, але паводле паролю лёгка зьведаць, якому войску яны служаць.

**ПЫТАНЬНЕ**

На колькі частак падзяляецца «Пароль, або Вызнаньне хрысьціянскай веры»?

**АДКАЗ**

На чатыры часткі некаторыя яго падзяляюць. Першая частка – дзе мы Бога Айца вызнаём, другая – дзе вызнаём Сына Божага, трэцяя – вызнаньне пра Духа Сьвятога, чацьвёртая – вызнаньне пра Сьвятую Царкву і пра дары, якія Бог ёй даў.

Іншыя ж на тры часткі яго дзеляць, бо вызнаньне пра Найсьвяцейшую Тройцу – Айца, Сына і Сьвятога Духа – за адну частку лічаць, потым вызнаньне пра Царкву – за другую, а дары, якія ёсьць у Царкве, – за трэцюю. Абодва гэтыя падзелы добрыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары першую частку хрысьціянскага «Паролю».

**АДКАЗ**

«Веру ў адзінага Бога Айца Ўсемагутнага, Творцу неба ды зямлі».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ты кажаш: «Веру ў адзінага Бога», а ня проста: «Веру, што ёсьць Бог адзіны?»

**АДКАЗ**

Зусім гэта розныя рэчы: верыць, што Бог ёсьць, ды, зноў жа, верыць у Бога і верыць Богу. Верыць, што Бог адзіны, – значыць верыць, што Бог ёсьць. Такую веру нават бесы маюць, бо яны, як піша Якуб, «вераць, што Бог ёсьць» (Як. 2:19). Верыць жа ў Бога ня можа ніхто, акрамя Хрысьціяніна. Бо верыць у Бога – значыць спадзявацца на Бога. Зноў жа, верыць Богу – значыць верыць, што Бог зробіць усё тое, што Ён абяцаў.

Зважай: усе гэтыя тры спосабы веры добрыя, аднак жа той, які ў вызнаньні веры, – найлепшы, бо і ў Сьвятым Пісьме Бог нам загадвае, каб мы ў Яго верылі, напрыклад, калі Хрыстос кажа: «Хай не трывожыцца сэрца вашае. Верце ў Бога і ў Мяне верце» (Ян 14:1). Ня сказана: «Верце, што ёсьць Бог», але: «Верце ў Бога».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для Бога Отцомъ называешь?

**ОТКАЗЪ**

Того для, ижь маеть Сына – Господа нашого Ісус Хріста. А к тому понеже Ісус Христос естъ родный сынъ Божый, а мы съ Христом едина плоть або тело, ино и нам ест Богъ Отецъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого и зовеш Вседержителемъ?

**ОТКАЗЪ**

Иже вси речи у Своей силе держить а промышленьемъ Своемъ весь светъ справуеть, и всякому створенью яко хочеть росказуеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого прикладываешь «Творца небу и земли»?

**ОТКАЗЪ**

Абы есмо з незбожными людьми не розумели, которіи не верують, абы Богъ светъ створилъ, але за тое мають, абы так от века сам собою учинилъся.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для небо а землю только припоминаешь, а Богъ не только небо и землю сътворилъ, но и иные вси речи?

**ОТКАЗЪ**

Правда, ижь не только небо и землю Богъ створилъ, але поневажь вси речи або суть на земли, або на небеси, того для досыть на припоминанью их. Да ведже к тому у зложенью Никейском приложоно: «Видимым же всем и невидимымъ». Которими словы вси речи створеные замыкаются.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко о Бозе розумеешь: на оный ли час только доброту Свою и силу показалъ, коли светъ створилъ, чи ли тепер показуеть?

**ОТКАЗЪ**

Не потому Богъ светъ створилъ, яко дойлид, хоромину поставивши, не дбаеть о ней або и отойдеть от нее, але створивши Богъ светь заховуеть его и промышлениіем Своем водить. Яко Сам Спаситель рече: «Отецъ Мой доселе делаеть, и Азъ делаю» (Іоан 5: 17-23). Той же сведчить, яко без воли Отца Небеснаго и едина птица не падеть на землю (Матф. 10: 23-30). А наииномъ месте известно кажеть, яко той же Отецъ питаеть их (Матф. 6: 22-30).

Тое жь везде у Святомъ Писанію Дух Святый ознамуеть, а наболей Давыдом в Псалтыры, где тако пишеть: «Очи всех на Тя уповають, Господи, и Ты даеши имъ пишчу въ благо время. Отверзаеши Ты руку Твою, и насышчаеши всяко животно благоволенія» (Псалом 103). А на

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго называеш Бога Айцом?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што Ён мае Сына – Госпада нашага Ісуса Хрыста. Паколькі ж Ісус Хрыстос – родны Сын Божы, а мы з Хрыстом – адна плоць, або адно цела, то і нам Бог – Айцец.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ты завеш Яго Ўсемагутным?

**АДКАЗ**

Бо Ён усё трымае ў Сваёй уладзе, радзіць усім сьветам паводле Свайго провіду ды кожным стварэньнем, як хоча, кіруе.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго далучаеш словы: «Творцу неба і зямлі»?

**АДКАЗ**

Каб мы, разам зь людзьмі бязбожнымі, якія ня вераць, што сьвет створаны Богам, не меркавалі, што сьвет сам сабою напачатку стварыўся.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго толькі неба і зямлю ўзгадваеш, Бог жа ня толькі неба ды зямлю стварыў, але і ўсе іншыя рэчы?

**АДКАЗ**

Праўда, што ня толькі неба і зямлю Бог стварыў; але паколькі ўсе рэчы знаходзяцца або на зямлі, або на небе, таму досыць толькі зямлю ды неба ўзгадаць. Дзеля гэтага ў Нікейскім вызнаньні гаворыцца: «Усяго бачнага ды нябачнага», гэтыя бо словы ўсё створанае азначаюць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як ты мяркуеш пра Бога: ці толькі на той час Ён аб'явіў Сваю дабрыню і моц, калі стварыў сьвет, ці таксама і зараз аб'яўляе?

**АДКАЗ**

Не дзеля таго Бог стварыў сьвет, каб, як дойлід, будынак паставіўшы, ня дбаць пра яго або прэч зыйсьці. Але, стварыўшы сьвет, Бог яго беражэ ды кіруе ім паводле Свайго провіду, як Сам Збаўца сказаў: «Айцец Мой дагэтуль так робіць, і Я так раблю» (Ян 5:17). Ён жа нам сьведчыць, што бяз волі Айца Нябеснага нават птушка не ўпадзе на зямлю (Мц. 10: 29), а ў іншым мейсцы кажа, што гэты ж Айцец іх корміць (Мц. 6: 26).

Тое самае паўсюль у Сьвятым Пісаньні Дух Сьвяты абвяшчае, а найбольш праз Давіда ў Псальмах, дзе Ён так піша: «Усе яны на Цябе, Госпадзе, спадзяюцца, і Ты даеш ім есьці ў свой час. Адкрываеш Ты руку, і насычаеш усё жывое дабраславеньнем» (Пс. 104). А ў іншым мейсцы Ён так кажа: «Сьпявайце Госпаду хвалебную песьню, на гусьлях слаўце Бога нашага, Які неба пакрывае хмарамі, дождж на зямлю

иномъ месте рече: «Воспойте Господеви въ исповедании, пойте Богови нашему въ гуслех. Одевающчему небо облаки, уготовяешчему земли дождь. Прозябающчему на горах сено, и траву на службу человекомъ. Дающчему скотом пишчу их, и птенцем врановымъ призывающчимъ Его» (Псалом 146).

Сия слова того нас учять, ижь Богъ милостивый не только вси речи створилъ, але створивши промышленіемъ Своемъ заховуеть, боронить, выховуеть и всего, чого потреба, достаточне додаваеть. Той Самъ ест виною всех речей, которие ся на свете деють. Той бо даеть дождь, сушу, ведро и непогоду, урожай и голодъ, здоровье и хворобы. Без воли Его ничто ся не дееть. Естъли бы той не держалъ а премудростію Своею не водилъ, не можно бы небу, и земли, и всей твари стояти. Того для Его пристойне Вседержителем или Всемогушчем святая церковъ нарицаеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Поведелъ есь, яко Богъ всеми обладаеть, ино и беси, и нечестивіи человеци по воли Божіей чинять?

**ОТКАЗЪ**

Хотя жь беси и нечестивіи люди Божіимъ Духомъ не ведутся, да ведже предся их в руце Своей яко на оузде держить, ижь далей поступити не могуть, хыба яко имъ Богъ попустить. К тому ешче чинить с них слугами воли Своее, ижь мусять ю выполнити, хотя бы не рады. Яко вчинили, Сына Божія на крестъ пригвоздивши.

**ПЫТАНЬЕ**

Што того за пожитокъ ведати, ижь Богъ владаеть злыми людьми и Сатаною?

**ОТКАЗЪ**

Великъ с того познанья силы Божіей над Сатаною и злыми людьми ест пожитокъ и великое утешенье. Бо если бы их Богъ не нуздалъ, чинили бы вернымъ, што бы хотели. Зачим бы съвесть кажного успокоена быти не могла. Але тепер, поневажь безъ Божіего допушченья ни беси, ни злые люди зашкодити не могуть, а кто ся их боить? Яко нас Самъ Господь сими словы упевняючи, къ смелости напоминаеть: «И власы главы вашея изъчтены суть, не бойтеся» (Лука 12: 2-7).

**ПЫТАНЬЕ**

Говори другую часть гасла Хрістіанского.

**ОТКАЗЪ**

Другаа часть гасла ест в ней же исповедуемъ Сына Божіего Господа нашого сими словы: «И въ единаго Господа Ісус Христа, Сына Божія единородного, иже от Отца роженого преже всехъ векъ, светъ от света, Бога истинна от Бога истинна, роженна а несотворенна, единосушчна Отцю, Им же вся быша».

пасылае, траву на гарах узрашчае, дае скаціне пашу яе, корм груганятам, што клічуць Яго» (Пс. 146).

Гэтыя словы нас вучаць, што міласьцівы Бог ня толькі ўсё стварыў, але, стварыўшы, Сваёй мудрасьцю беражэ, абараняе, забясьпечвае ды ўсё патрэбнае дае дастаткова. Ён Сам – прычына ўсяго, што дзеецца на сьвеце. Ён бо дае дождж, сьпёку, пагоду ды непагадзь, ураджай ды голад, здароўе ды хваробы. Бяз волі Ягонай нічога не адбываецца. Калі б Ён не бярог ды паводле мудрасьці Сваёй ня вёў, не сталася б ані неба, ані зямлі, ані ўсіх стварэньняў. Дзеля таго Сьвятая Царква называе Яго пачціва Ўседзяржыцелем, або Ўсемагутным.

**ПЫТАНЬНЕ**

Сказаў ты, што Бог усім валадарыць, няўжо і бесы, і бязбожнікі дзейнічаюць паводле Божай волі?

**АДКАЗ**

Хаця бесы ды бязбожнікі ня водзяцца Божым Духам, ды ўсё адно Бог іх у руцэ Сваёй, як у цуглях, трымае, так што яны далей ня ступяць, хіба толькі калі Бог ім дазволіць.

Да таго ж Ён робіць іх слугамі Сваёй волі, якую яны мусяць, нават ня хочучы, споўніць. Было так, напрыклад, калі яны Сына Божага ўкрыжавалі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Які нам здабытак ведаць, што Бог валадарыць над благімі людзьмі ды шатанам?

**АДКАЗ**

Вялікі здабытак ды вялікая пацеха ведаць, што Бог мае моц над шатанам ды благімі людзьмі. Бо калі б іх Бог не зацугляў, рабілі б яны верным што хацелі. Тады і сумленьне кожнага не магло б супакоіцца. Але цяпер, калі бяз Божага дазволу ані бесы, ані благія людзі ня могуць шкодзіць, хто будзе іх баяцца? Сам Госпад у такія словы нас запэўнівае, дзеля сьмеласьці нагадваючы: «Нават валасы вашыя на галаве палічаныя, дык ня бойцеся» (Лк. 12: 7).

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары другую частку хрысьціянскага «Паролю».

**АДКАЗ**

Другая частка паролю тая, дзе мы вызнаём Сына Божага, Госпада нашага, у такія словы: «Веру ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага адзінароднага, Які з Айца народжаны перад усімі вякамі, Сьвятло са Сьвятла, Бога праўдзівага з Бога праўдзівага, народжанага, а ня створанага, адзінасутнага з Айцом, празь Яго ўсё сталася».

Гэта вызнаньне веры ў Боскасьць Сына Божага, а словы, што будуць пасьля, кажуць пра Ягонае ўцелаўленьне такім звычаем: «Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зыйшоў зь неба, быў пача-

Се есть исповеданье веры о божестве Сына Божіа, а которие потом слова будуть, о въчеловечестве Его розумеются на тотъ обычай: «Нас ради человеки и нашего спасенія ради съшедшаго съ небесъ, и въплотившагося от Духа Святога и Маріа девы въчеловечшася, распята же за ны при Понтеистем Пилате, и страдавше и погребена, и въскресша въ третій день по Писаніих, и въшедша на небеса, и седяшча одесную Отца и пакы грядушчаго съ славою судити живым и мертвымъ, Его же царствію несть конца». Сия есть вторая часть.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого насъ оучить сяя часть?

**ОТКАЗЪ**

Напервей намъ выписуеть Сына Божіего, иже ест единъ з Богомъ Отцом, потом – иже есть Спасителем нашемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для зовешь Ісоусомъ Сына Божіего?

**ОТКАЗЪ**

Іжь Ему тое имя за повеленіем Божіемъ далъ аггелъ, нежели ся почалъ в животе пречистое девы (Матф. 1: 18-25, Лука 1: 24-38).

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся тое имя розумееть, а якое есть слово «Ісус»?

**ОТКАЗЪ**

«Ісус» есть слово еврейского языка, розумеется на нашь языкъ «Спасъ», или «Спаситель». Слушне убо сее имя Сыну Божіему дано. Бо хотя жь и первей были, которих Ісусами звано, яко сына Навинова и оного ерея, о котором в Захаріи (Зах. 3), тежь и Сираховича, лечь тіи никого спасти не могли. Той единый Сынъ Божій – сый, известно, люди Своя спасаеть от греховъ ихъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Опять и тое ми скажи, чого для Сынъ Божый наречеся Хрістос?

**ОТКАЗЪ**

«Христосъ» слово гречское, выкладается на словеньский языкъ «Помазаный». Былъ бо обычай подъ Закономъ Моисеовымъ оныхъ помазовати елеомъ или маслом, се есть, оливою, которих на царство або на Іерейство брано. И таковыхъ царей и іерей хрістами или помазаньцами звано. Прото и Сынъ Божій, поневажь принявши тело, зостал видимый и жрецъ, або іерей, и царь, слушне ест названъ Хрістос, то есть помазанный царь и іерей.

**ПЫТАНЬЕ**

Какимъ масломъ или оливою помазанъ ест Господь?

ты з Духа Сьвятога і прыняў цела зь дзевы Марыі, укрыжаваны таксама за нас пры Понцкім Пілаце, пакутаваў і быў пахаваны, і ўваскрос на трэці дзень паводле Пісаньняў, узыйшоў на неба, сядзіць праваруч Айца і прыйдзе ў славе судзіць жывых і памерлых, Яго ж валадарству ня будзе канца.» Гэта і ёсьць другая частка.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму вучыць нас гэтая частка?

**АДКАЗ**

Перадусім яна нам тлумачыць, што Сын Божы адзінасутны Богу Айцу, а потым, што Ён – наш Збаўца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ты завеш Сына Божага «Ісус»?

**АДКАЗ**

Бо Яму гэтае імя на загад Божы даў анёл, перш чым Сын Божы пачаўся ва ўлоньні прачыстае дзевы (Мц. 1: 21; Лк. 1: 31).

**ПЫТАНЬНЕ**

Як разумець гэтае імя, што значыць слова «Ісус» ?

**АДКАЗ**

«Ісус» – слова гебрайскай мовы, на мове нашай яно значыць «Спас», або «Збаўца». Слушна гэтае імя дадзена Сыну Божаму, бо хаця і раней былі людзі, якіх звалі імем «Ісус», напрыклад, сын Навіна і сьвятар з кнігі Захарыі (Зах. 3), таксама сын Сырахаў, аднак яны нікога не маглі збавіць. Адзін толькі Сын Божы збаўляе, як вядома, людзей Сваіх ад грахоў іхніх.

**ПЫТАНЬНЕ**

Зноў жа, і тое мне скажы, чаму Сын Божы названы Хрыстос?

**АДКАЗ**

«Хрыстос» – слова грэцкае, на мове славянскай яно значыць «памазаны». Быў бо падчас Закону Майсеявага звычай – памазваць алеем або маслам (значыць, аліваю) тых, што прызначаліся на валадарства або на сьвятарства. Такіх валадароў ды сьвятароў называлі хрыстамі, або памазанцамі. Дзеля таго і Сын Божы, прыняўшы цела, стаў бачным сьвятаром, або ярэем, і валадаром, і таму слушна названы Хрыстос, гэта значыць, памазаны валадар і сьвятар.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якім маслам або аліваю памазаны Госпад?

**АДКАЗ**

Масла, якім паводле Закону Майсея памазвалі валадароў ды сьвятароў, было бачнае, з дрэва, але Сын Божы не такім маслам памазаны. Як бо не зямны валадар Хрыстос, так і памазаньне было не ад

**ОТКАЗЪ**

Масло, которомъ ся помазывали Цари и Жерци в Законе Моисеовым, было видимое, от дерева, але Сынъ Божый не таковым маслом помазанъ. Яко бо не земный царь ест Хрістос, тако и помазаніе не было от видимого масла, но от Святого Духа. О котором Ісаіа тако прорече: «Духъ Господень на Мне, его же ради помаза Мя, благовестити нишчимъ посла Мя» и проча (Ісаіа 61, Лука 4: 16-20).

О том же и Давыдъ рече: «Возлюбилъ еси правду и възненавиделъ еси беззаконие, сего ради помаза Тя, Боже, Богъ Твой елеомъ радости пачей причасникъ Твоих» (Псалом 44). Которие слова яко бы толкуеть Креститель, где о Хрісте къ ученникомъ своим рече: «Его же посла Бог глаголы Божіа глаголеть, не у меру бо Богъ даеть Духа. Отецъ бо любить Сына, и вся дасть в руку Его».

**ПЫТАНЬЕ**

Каково естъ Сына Божиего Царство?

**ОТКАЗЪ**

Ижь не естъ светъское, Сам Хрістос сведчить, где къ Пилату тако рече: «Царство Мое нестъ от мира сего» (Іоан 18: 28-19: 6). Прото мусить быти духовное. Духом бо Святымъ справуется и Божіим Словомъ. А сие две речи кажному оправданіе и животъ вечный чинять.

**ПЫТАНЬЕ**

Опять, о Хрістовом Ерействе што розумеешь?

**ОТКАЗЪ**

Ерее, или жеръци, для трехъ речей в Законе были. Найпервей – абы жертвы приносили.

Потомъ – абы ся о всех Богу молили. А третяя речь – абы людей Закону научали. Тое все Христос достаточне выполнилъ. То естъ училъ, молился и наконецъ Самого Себе жертву на кресте принесъ. О чим Апостолъ къ Евреомъ широко пишеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Чи только на онъ часъ Христосъ был ереем, коли Ся на кресте Богу за наши грехи принесъ?

**ОТКАЗЪ**

Яко Его царство естъ вечное, потому жь и Ерействоу конца не будеть, поневажь обе речи не телесные, але духовные суть. О вечном Его царстве тако написал Давыдъ: «Царство Твое царство всех векъ, и владычество Твое въ всякомъ роде и роде» (Псалом 144). Потому жь Ісаіа: «На престоле Давидове и на царстве его сядеть направити и, и подъяти судомъ и правдою отныне и до века» (Ісаіа 9).

О том же Аггелъ къ богородицы, от Ісаі на пророчества принявши, рече: «И дасть ему Господь Богъ престолъ Давыда отца его, и въцарится в дому Іаковли въ векы, и царствію Его не будеть конца (Лука 1:

бачнага масла, але ад Духа Сьвятога, пра якога Ісая сьведчыў: «Дух Госпада нада Мною; таму Мяне памазаў, каб нёс добрую вестку ўбогім, паслаў Мяне вясьціць свабоду вязьням...» і гэтак далей (Іс. 61, Лк. 4:18-19) і Давід сказаў: «Любіш справядлівасьць і ненавідзіш беззаконьне, дзеля таго памазаў Цябе, Божа, Бог Твой алеем радасьці панад сяброў Тваіх» (Пс. 44). Гэтыя словы тлумачыць Хрысьціцель, калі пра Хрыста сваім вучням так кажа: «Той, каго Бог паслаў, прамаўляе Словы Божыя, бо ня мераючы Бог дае Духа. Айцец бо любіць Сына і ўсё аддаў у Ягоную руку».

**ПЫТАНЬНЕ**

Якое ж Валадарства Сына Божага?

**АДКАЗ**

Яно не ад гэтага сьвету, як Сам Хрыстос сьведчыў, так адказаўшы Пілату: «Маё Валадарства ня з гэтага сьвету» (Ян 18: 36). Значыць, яно мусіць быць духоўнае, бо кіруецца Духам Сьвятым ды Божым Словам. А гэтыя дзьве рэчы прыносяць кожнаму апраўданьне ды жыцьцё вечнае.

**ПЫТАНЬНЕ**

Зноў жа, пра сьвятарства Хрыста што ты мяркуеш?

**АДКАЗ**

Ярэі, або сьвятары, у часы Закону абіраліся дзеля трох прычынаў: першая – каб прыносілі ахвяры, другая – каб за ўсіх Богу маліліся, трэцяя – каб вучылі людзей Закону.

Усё гэта Хрыстос дасканала выканаў, значыць, вучыў, маліўся, ды потым Самога Сябе ў ахвяру прынёс. Пра гэта Апостал піша падрабязна да Гебраяў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці толькі ў той час Хрыстос быў сьвятаром, калі на крыжы ахвяраваў Сябе Богу за нашыя грахі?

**АДКАЗ**

Як Валадарства Ягонае вечнае, так і сьвятарству Ягонаму ня будзе канца, бо абедзьве гэтыя рэчы не цялесныя, але духоўныя. Пра Ягонае вечнае валадарства так напісаў Давід: «Валадарства Тваё – валадарства ўсіх вякоў, і валадараньне Тваё будзе трываць праз усе пакаленьні. Верны Госпад ва ўсіх словах Сваіх і сьвяты ва ўсёй дзейнасьці Сваёй» (Пс. 144), гэтаксама напісаў і Ісая: «Вялікае будзе Ягонае валадараньне ў супакоі бязьмежным на пасадзе Давіда і над Ягоным валадараньнем, якое Ён сьцвердзіць і ўмацуе законам і справядлівасьцю адсюль і навечна» (Іс. 9).

Пра гэта і Анёл, прыняўшы прароцтва Ісаі, казаў багародзіцы: «І дасьць Яму Госпад пасад Давіда, бацькі Ягонага; і будзе ён валадарыць над домам Якуба вечна, і валадарству Яго ня будзе канца» (Лк. 1: 32-33).

24-37). Потому жь о ерействе Христове Святое Писаніе везде сведчить, яко вечно пребудеть. Давыдъ бо Духомъ Святыимъ глаголеть: «Клятся Господь и не раскается, Ты еси ерей въ веки по чину Мелхиседикову» (Псалом 109).

**ПЫТАНЬЕ**

Которимъ обычаемъ Христос ерей есть въ веки?

**ОТКАЗЪ**

Поведелъ есмъ, ижь три уряды мели ерее, которие не истинни ерее были, але только образъ ерейства Христова на собе носили. То пакъ Христос тые уряды и тепер выполняеть, а прото вечный есть ерей. Не для того бо на небеса взышолъ и одесницы Богу селъ, абы тамо прожноваль, але для того, абы насъ пред Богомъ припоминалъ. Яко Апостолъ къ Евреомъ пишеть: «Не преступно имать свяшченьство Христос, тем же и спасти можеть до конца приходяшчих Его ради къ Богу, всегда живъ сый проповедати о нихъ» (Евр. 7: 18-25).

Которими словы даеть намъ Апостолъ знати, ижь ся Христос не только зде будучи молилъ о грешных, але и теперь есть Ходотаемъ нашимъ къ Богу. А тотъ есть первый урядъ Ерея, или свяшченъника. Другый уряд есть приносити жертву за грехи людей, абы имъ отпушчены. И водле тое повинности Христос есть ерей або архиерей. Бо хотя жь единою Самъ Себе принесъ, але сила оное жертвы пребываеть даже до века. Бо кто въ Христа увероуеть, того жь часу причастникомъ оное жертвы Его бываеть, то есть оставленіе грехомъ для Христовой страсти и смерти пріймуеть. О томъ Апостолъ тако пишеть: «Христос единою о гресех принесе жертву, и седе одесную Бога въ веки, прочаяго жды дондеже положатся врази Его подножію ногама Его. Единым бо приношеніемъ съвершивъ веки освешчаемыхъ» (Евр. 10: 1-18).

Третий теже свяшченнический урядъ и теперь исполняеть Христос, се есть научаеть нас воли Закона Божіа. Бо хотя жь Самъ взышолъ на небо, а зде теломъ с нами не есть, але от Него маемъ Апостолы и всякие учители. Яко Апостолъ къ Ефесіемъ пишеть: «Единому же, – рече, – каждому з нас дастся благодать по мере дара Христова.» Там же глаголеть: «Въшел еси на высоту, и пленил еси пленъ, и далъ еси дааніа человеком» (Ефес. 4: 1-13). А мало нижей вычитаеть такова дааніа, сими словы пишючи: «Въшед превыше всех небесъ да исполнить всяческая. И Той дасть, овы оубо Апостолы, овы же пророки, овы же благовестники, овы же пастырие и оучителие, къ съвершенію святым, в дело служеніа, въсзданіе тела Христова».

Уже, надеюся, розумеешь яковъ царь и свяшченникъ ест Христос, а не только тое, але теже с тых словъ могъ есь выразумети, какие намъ пожитки из Его царства и свяшченьства ростуть и приходять.

Тым жа звычаем Сьвятое Пісьмо паўсюль сьведчыць, што сьвятарства Хрыста будзе навечна, Давід бо Духам Сьвятым кажа: «Прысягнуў Госпад і не пакаецца ў гэтым: “Ты сьвятар навек на ўзор Мелхі-сэдэка”» (Пс. 109).

**ПЫТАНЬНЕ**

Якім звычаем Хрыстос – сьвятар навечна?

**АДКАЗ**

Ужо я казаў, што сьвятары мелі тры абявязкі, хаця і не былі сьвятарамі праўдзівымі, але толькі насілі на сабе вобраз сьвятарства Хрыстова. Аднак толькі Хрыстос гэтыя тры абавязкі і цяпер выконвае, таму Ён – сьвятар навечна. Не дзеля таго бо Ён узыйшоў на неба і сеў праваруч Бога, каб там адпачываць, але дзеля таго, каб пра нас перад Богам узгадваць, як Апостал да Гебраяў піша: «Сьвятарства непераходзячае мае Хрыстос, дзеля таго і збаўляць можа Ён назаўсёды прыступаючых празь Яго да Бога, заўсёды жывы, каб за нас заступацца» (Гебр. 7: 25).

У гэтых словах Апостал нам паказвае, што Хрыстос маліўся за грэшнікаў ня толькі калі быў пасярод нас, але і зараз Ён наш Заступнік перад Богам. І гэта ёсьць першы абавязак сьвятара. Другі абавязак – прыносіць ахвяру, каб былі дараваныя грахі людзей. І паводле гэтага абавязку Хрыстос – Сьвятар, або Першасьвятар, бо хаця Ён толькі аднойчы прынёс Самога Сябе ў ахвяру, але сіла гэтай ахвяры трывае вечна. Той, хто паверыць у Хрыста, становіцца супольнікам Ягонай ахвяры, значыць, атрымлівае прабачэньне грахоў дзеля Ягоных пакутаў і сьмерці. Пра гэта Апостал так піша: «Ён жа, склаўшы адну ахвяру за грахі, навек сядзіць праваруч Бога, чакаючы, аж пакуль у канцы ворагі Ягоныя будуць паложаны ля падножжа ног Ягоных. Вось, Ён адной ахвярай удасканаліў на вякі тых, якія асьвечаны» (Гебр. 10: 12-13).

Таксама і трэці сьвятарскі абавязак выконвае зараз Хрыстос, значыць, Ён вучыць нас волі Закона Божага. Бо хаця Сам Ён узыйшоў на неба і тут, на зямлі, Яго з намі няма, але ад Яго мы маем Апосталаў ды розных вучыцеляў, як Апостал да Эфэсцаў піша: «Кожнаму з нас дадзена ласка паводле меры дару Хрыстовага» (Эф. 4: 7). Там жа ён кажа: «Узыходзячы на вышыню, павёў палон у няволю і даў людзям дары», ды крыху ніжэй Апостал пералічвае гэтыя дары, у такія словы пішучы: «Хто зыйшоў, Той Самы і ўзыйшоў вышэй усяго неба, каб усё напоўніць. І Ён паставіў адных апосталамі, другіх – прарокамі, іншых – эвангелістамі, а яшчэ іншых – пастырамі і вучыцелямі, на ўдасканаленьне сьвятых, на патрэбы служэньня, на збудаваньне Цела Хрыстовага».

Ужо, я спадзяюся, ты разумееш, якім звычаем Хрыстос – валадар ды сьвятар, ды ня толькі гэта, але яшчэ з тых словаў ты мог зразумець, якія мы маем здабыткі зь Ягонага валадарства ды сьвятарства.

**ПЫТАНЬЕ**

Оуже тое все за ласкою милосердного Бога добре розумею. Але ми скажи и ростолкуй, для чого у том то гасле христіанском Христа называемъ единородным Сыномъ Божіимъ, а к томоу единосушчнымъ Богу Отцю?

Да ветже и намъ тую честь Богъ подаровалъ, абы есмо сынми Божими быти могли (Матф. 6), и Сам Христос наоучилъ нас Бога Отцомъ нашим звати. Іоаннъ теже тако написалъ: «Елико пріят Его, дасть им область чядом Божіимъ быти» (Іоан 1:1-18).

**ОТКАЗЪ**

Ижь насъ Богъ сынми або чяды Своеми зоветь, не для того тое чинить, абы мы по естеству сынове Божіи были, але иже насъ для Сына Своего тымъ правомъ подаровал, яко Апостолъ къ Галатомъ толкуеть, где рече: «Егда пріидеть кончина лету, посла Богъ Сына Своего рожаюшча от жены, бываюшча под Закономъ, да подзаконныя искупить, да въсыненіе пріимемъ» (Гал. 4: 4-21).

Пилно знаменуй, што Апостолъ пишеть. Бо явне мовить, иже того для Богъ Сына Своего послалъ, абы намъ от Закону выкупилъ, а ешче абы есмо усыненіе приняли для Господа нашего Ісус Христа. Яко там же самъ Апостолъ докладаеть сими словы: «Якоже есте сынове, посла Богъ Духъ Сына Своего въ сердца наша вопиа: «Авва Отецъ.» Тем же неси рабъ, но сынъ. Ашче ли же сынъ, ино и наследъникъ Божій Ісус Христомъ».

Зде ясне видишь, откуле тую честь имаемъ, же есмо сынове и наследници Божіи, придалъ бо на концы, яко того дошли есмо Ісус Христомъ. Прото слушне Той Сам есть названъ единородны Сынъ Божий, понеже Той по естестве естъ Сынъ, мы пакъ Его благодатиею есмо сынове. А иже ест едино съ Отцомъ, того для единосушчный Отцю наречонъ ест. Бо если бы от иного сушчества былъ Сынъ Божий, вже бы не Бог ани Творецъ былъ, але человекъ а простаа тварь. Бо самъ Бог часто о Собе кажеть, яко окроме Его Самого иного бога нетъ. Яко въ Ісаином пророчестве рече: «Азъ есмъ, пред Мною несть инъ богъ, и по Мне не будеть. Азъ Богъ, и не будеть разве Мене спасаяй» (Ісаіа 43).

Прото и Христос не ест иный, але тот же съ Отцом и съ Святымъ Духомъ, и того для единосушчна Отцю Его исповедуемъ. Яко Самъ къ Филіппу рече: «Не веруеши ли, яко Аз въ Отци и Отецъ въ Мне естъ? Глаголы, яже Азъ глаголю вамъ, от Себе не глаголю, Отец же въ Мне пребывая, Той творить дела. Веруйте Мне, яко Азъ въ Отцы и Отецъ въ Мне» (Іоан 14:10-27). Пилно паметуй сіе слова, абы есь от правды не заблудилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого приложоно: «Им же вся быша»?

**ОТКАЗЪ**

Бо тако все Святое Писание о Сыне Божіим сведетельствуеть, яко

**ПЫТАНЬНЕ**

Ужо гэта ўсё ласкай міласэрнага Бога я добра разумею. Але скажы ды растлумач мне, дзеля чаго ў тым хрысьціянскім вызнаньні мы называем Хрыста адзінародным Божым Сынам, да таго ж адзінасутным Богу Айцу?

Бо і нам Бог падараваў гонар быць сынамі Божымі, і Сам Хрыстос навучыў нас зваць Бога нашым Айцом (Мц. 6), таксама Ян напісаў: «А каторыя Яго прынялі, дало ім моц стацца сынамі Божымі» (Ян 1:12).

**АДКАЗ**

Калі Бог называе нас сынамі або Сваімі дзецьмі, робіць так не дзеля таго, што мы па прыродзе нашай сыны Божыя, але дзеля таго, што праз Свайго Сына Ён падараваў нам тое права. Так бо Апостал у лісьце да Галятаў гэта тлумачыць, кажучы: «А калі прыйшла поўня часу, паслаў Бог Свайго Сына, народжанага жанчынай, народжанага пад Законам, каб адкупіў тых, якія былі пад Законам, каб і мы атрымалі ўсынаўленьне» (Гал. 4: 4-5).

Пільна зважай, што піша Апостал. Ён ясна кажа, што дзеля таго Бог паслаў Свайго Сына, каб адкупіць нас зь нявол Закону ды яшчэ каб мы прынялі ўсынаўленьне дзеля Госпада нашага Ісуса Хрыста, бо там жа сам Апостал далучае такія словы: «А дзеля таго, што вы – сыны, спаслаў Бог Духа Свайго ў сэрцы вашыя, які кліча: «Абба, Ойча!» Так што ты ўжо не нявольнік, але сын; а калі сын, дык і спадкаемца Божы празь Ісуса Хрыста».

Тут ты ясна бачыш, адкуль мы маем той гонар быць сынамі да спадкаемцамі Божымі, Апостал бо сказаў, што мы атрымалі гэта празь Ісуса Хрыста. Таму слушна названы Хрыстос адзінародным Сынам Божым, Ён бо – Сын паводле прыроды, а мы – сыны паводле Ягонай ласкі. А паколькі Ён і Айцец – адно, таму і названы адзінасутным Айцу. Калі б Сын Божы меў іншую сутнасьць, ужо быў бы ня Богам і Творцам, але чалавекам і звычайным стварэньнем, бо Сам Бог пра Сябе часта гаворыць, што няма іншага бога апроч Яго. У прароцтве Ісаі Ён так сказаў: «Я ёсьць, і раней Мяне не было Бога, і пасьля Мяне ня будзе. Я, Я - Госпад, і па-за Мной няма Збаўцы» ( Іс. 43).

Дзеля гэтага і Хрыстос ня нейкі іншы, але тоесны Айцу і Духу Сьвятому, таму мы вызнаём Яго адзінасутным Айцу, Сам бо Ён сказаў Піліпу: «Ці ня верыш, што Я – у Айцы, а Айцец – у-ва Мне? Словы, якія Я вам кажу, не ад Сябе Самога кажу: Айцец, Які ў-ва Мне, Ён робіць даконы Свае. Верце Мне, што Я – у Айцы, а Айцец – у-ва Мне» (Ян 14:10). Пільна памятай на гэтыя словы, каб ад праўды не адступіцца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго далучаны словы: «І празь Яго ўсё сталася»?

**АДКАЗ**

Бо ўсё Сьвятое Пісьмо сьведчыць пра Божага Сына, што Ім створаны ўсе рэчы. Напрыклад, Майсей, распавядаючы пра стварэньне

Имъ вси речи створены суть. Яко напервей Мойсей, выписуючи створеніе света, кажеть, ижь Богъ, хотячи светло сътворити рече: «Да будеть светъ». Потом, хотечи твердъ учинити, рече: «Да будетъ твердь» (Быт. 1). Потому же и о всих речах сведчить, яко Словомъ" Божіимъ створены суть. Яко и Давыдъ пишеть: «Словесемъ Господним небеса оутвердишеся» (Псалом 32). Тое пакъ Слово ест Сынъ Божій, яко Іоаннъ рече: «В начале бе Слово и Слово бе у Бога, и Богъ бе Слово. Сее бе искони в Бозе. Вся тем быша, и без Него ничтоже бысть еже бысть» (Іоан 1:1-18).

Две речи зде обачь, напервей естли бы у Мойсея не розумелъ оного слова «Рече Богъ», або у Давыда оного «Словесемъ Господнемъ небеса оутвердишеся», ино Іоаннъ толкуеть, яко Слово оное есть Богъ. А другая речь, иже тем Словомъ вся быша. А тая естъ причина, для которое тые слова до гасла христіаньского приложены суть, абы вси розумели Сына Божіа Творца, а не тварь, яко и Бога Отца быти.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи жь ми, для чого такъ высока особа — Самъ Сынъ Божій — прінялъ человечество нашое и сталъ ся человекомъ?

**ОТКАЗЪ**

Доложоно того у зложенью, иже нас ради и нашего спасеніа деля.

**ПЫТАНЬЕ**

Чи не можно Богу было человека инако спасти?

**ОТКАЗЪ**

Правда, иже не такового былъ Богъ человека сперва створилъ, бо пишеть Духъ Святый через Мойсея, яко Бог человека по образу и по подобію Своему былъ створилъ и моужа и жену. То естъ, святого, непорочного, правдивого и безсмертного. Бо ся тако розумееть образъ Божій.

Нежели человек у томъ образе не пребылъ, бо даное заповеди не устерогъ. Прото Сынъ Божій, хотячи опять образъ Божій, то естъ, правду и бесмертность, человеку привернути, рачил ся стати человеком, абы в особе человека Богу за онъ грехъ досить учинилъ, который былъ Адамъ пополнилъ. Бо ижь мел быти Ходотай межи Бога и человека, потреба было, абы былъ и Богъ и человекъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого жь, опять, иным ся обычаемъ у животе девочомъ зачалъ? Чого для не потому, яко вси люди зачинаются, понеже истинный человекъ мелъ быти? Бо гасло рече, яко от Духа Свята въплотилься.

**ОТКАЗЪ**

Естли бы ся Христос потому жь, яко и мы зачалъ, а не от Святого Духа ино бы намъ къ очистенію пособити не могъ. Бо и Самъ не былъ бы от греха свободен. Яко Сам къ Никодиму рече: «Роженое от плоти плоть естъ» (Іоан 3:1-12). Прото безъ мужа зачался справою Святого

сьвету, кажа, што Бог, хочучы стварыць сьвятло, сказаў: «Хай станецца сьвятло!» Потым, хочучы стварыць цьвярдыню, сказаў: «Хай паўстане цьвярдыня!» (Роду 1) Тым жа звычаем Майсей сьведчыць, што ўсе іншыя рэчы створаны Божым Словам.

Давід таксама піша: «Словам Госпада створаны нябёсы і дыханьнем вуснаў Ягоных безьліч духаў неба» (Пс. 32). Слова ж гэтае – Сын Божы, так бо Ян казаў: «На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова. Яно было на пачатку ў Бога. Усё празь Яго сталася, і безь Яго не сталася нічога з таго, што сталася» (Ян 1:1-3).

На дзьве рэчы зьвярні тут увагу: па-першае, калі ты не зразумееў тых словаў Майсея «Сказаў Бог», або словаў Давіда «Словам Госпада створаны нябёсы», то Ян тлумачыць, што гэтае Слова ёсьць Бог; па-другое, праз гэтае Слова ўсё сталася. З тае прычыны далучаны гэтыя словы да хрысьціянскага вызнаньня, каб усе разумелі Сына Божага не створэньнем, але, як і Бога Айца, Творцам.

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы мне, дзеля чаго такая велічная асоба – Сам Сын Божы – прыняў наш чалавечы выгляд і стаўся чалавекам?

**АДКАЗ**

Сказана пра гэта ў вызнаньні: дзеля нас і дзеля нашага збаўленьня.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба нельга было Богу іншым чынам чалавека збавіць?

**АДКАЗ**

Праўда, што Бог ад пачатку не такім чалавека стварыў, бо Дух Сьвяты праз Майсея піша: «На Свой вобраз і на Сваё падабенства стварыў Бог чалавека, мужчынай і жанчынай стварыў іх». Значыць, учыніў яго сьвятым, чыстым, справядлівым ды неўміручым, такі бо вобраз Божы.

Аднак чалавек гэты вобраз страціў, бо не паслухаўся дадзенага прыказаньня. Сын Божы хацеў вярнуць чалавеку Божы вобраз – гэта значыць, справядлівасьць ды неўміручасьць. Ён стаўся чалавекам, каб у асобе чалавека прынесьці Богу ахвяру за грэх, які ўчыніў Адам. Бо калі Сын Божы меўся быць Пасярэднікам паміж Богам і чалавекам, патрэбна было, каб быў і Бог, і чалавек.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму, зноў жа, іншым звычаем Ён пачаўся ў дзявочым улоньні? Чаму ня так, як усе людзі пачынаюцца, калі Ён меўся быць праўдзівым чалавекам? Бо ў вызнаньні сказана: «Быў пачаты з Духа Сьвятога».

**АДКАЗ**

Калі б Хрыстос быў пачаты так, як і мы, а ня з Духа Сьвятога, то ня змог бы Ён паслужыць нашаму ачышчэньню, бо і Сам ня быў бы вольным ад граху. Так бо Сам Мікадыму сказаў: «Тое, што нарадзілася зь цела, ёсьць целам» (Ян 3: 6). Дзеля таго Ён быў пачаты бяз мужа ва

Духа в чреве пречистыя девы, абы былъ достойнымъ Ходотаемъ и Ереемъ, яко Апостолъ къ Евреомъ рече: «Таковъ нам подобаше первосвяшченникъ, преподобенъ, незлобивъ, бескверненъ, и отлученъ от грешникъ, и выше небесъ бывъ, иже не имать по вся дни потребы, яко первосвяшченници, преже о своих гресехъ жерътву приносити, потом же и о людскихъ» (Евр. 7: 26-8: 6).

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для «Зложенье» припоминаеть въплошченіе Сына Божіего и яко ся въчеловечилъ от святое девицы и потом, минувши житие Его на земли, роспятие только въспоминаеть?

**ОТКАЗЪ**

«Зложеніе веры» оные только речи выписуеть, на которых оправданіе и грехом оставленіе належить. Прото жития зде, на земли, не расписуеть, але роспятіе только Его и въскресеніе. Бо на томъ висить спасеніе нашое, си речь оставленіе грехом и оправданіе. Яко Апостолъ рече: «Христос предастся за прегрешеніа наша, и въста за оправданіе наше» (Рим. 4:13-25). Потому же и пророкъ о Немъ рече: «Той оуязвенъ бысть греховъ ради наших и поболе за безаконіа наша. Наказаніе смиреніа нашего на Немъ, язвою же Его мы исцелихом вси» (Ісаіа 53). Явне проповедуеть, иже язвы или раны Христовы нас злечили.

А тая ест причина, для которое рожество а роспятие и въскресеніе Гасло, или Символонъ, въспоминаеть. Бо тые речи спасеніа нашого суть виною.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого припоминаеть Понтеиского Пилата?

**ОТКАЗЪ**

Для того, абы есмо ведали, иже смерть Сына Божіа не тако згола на Него пришла, але с присуженья уряду. Бо той Пилатъ былъ на онъ часъ игемоном, то естъ старостою Іерусалимскимъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Росповежь ми тое явней.

**ОТКАЗЪ**

Если бы не з выроку суди умеръ нашь Господь, не такъ бы ся ясне невинность Его показала.

**ПЫТАНЬЕ**

Да ведже Пилатъ посведчилъ Ему, яко ни единое вины в Немъ не знашолъ.

**ОТКАЗЪ**

Все тое за промышленьемъ Божіемъ было, иже Сына Божіа Пилатъ сам же невинного быти казал, сам же и яко злодея на смерть осудилъ. Абы тем обычаемъ всимъ явно было, иже не за Свои злости, але яко наручникъ за чужіе терпелъ.

ўлоньні прачыстае дзевы за справай Сьвятога Духа, каб стацца годным Пасярэднікам ды Сьвятаром, як Апостал да Гебраяў казаў: «Такога вось належалася мець нам Першасьвятара, сьвятога, нявіннага, беззаганнага, аддзеленага ад грэшнікаў і ўзвышанага па-над неба, які не павінны, як іншыя першасьвятары, складаць штодзень ахвяры перш за свае грахі, а пасьля за грахі народу» (Гебр. 7: 26-27).

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго «Вызнаньне» ўзгадвае ўцелаўленьне Сына Божага, нараджэньне са сьвятой дзевы, а потым, мінаючы Ягонае жыцьцё на зямлі, кажа пра ўкрыжаваньне?

**АДКАЗ**

«Вызнаньне веры» кажа толькі пра тое, на чым залежыць збаўленьне ды адпушчэньне грахоў. Яно не распавядае пра жыцьцё Хрыста тут, на зямлі, але кажа толькі пра Ягонае ўкрыжаваньне ды ўваскрасеньне таму, што ад гэтага залежыць нашае збаўленьне – значыць, адпушчэньне грахоў ды апраўданьне, як Апостал казаў: «Ён быў выдадзены за грахі нашыя і ўваскрос дзеля апраўданьня нашага» (Рым. 4: 25). Тым жа звычаем і прарок пра Яго гаварыў: «Ён быў пакалечаны за грахі нашыя, пабіты за нашыя злачынствы; бічаваньне спала на Яго на збаўленьне нашае, Ягонымі ранамі мы аздароўленыя» (Іс. 53). Ясна ён тут прапаведуе, што раны Хрыста нас аздаравілі.

Вось тая прычына, чаму Пароль, або Вызнаньне, узгадвае пра нараджэньне, укрыжаваньне ды ўваскрасеньне Хрыста: ад гэтага залежыць нашае збаўленьне.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ўзгаданы Понці Пілат?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, каб мы ведалі, што Сын Божы ня так проста памёр, але на прысуд ураду. Бо гэты Пілат быў тады ігемонам, значыць, старастам ерузалімскім.

**ПЫТАНЬНЕ**

Распавядзі мне пра гэта падрабязьней.

**АДКАЗ**

Калі б наш Госпад памёр не паводле прысуду судзьдзі, не такой бы відочнай была Ягоная невінаватасьць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дык жа Пілат перад Ім засьведчыў, што не знайшоў у Ім аніякай віны.

**АДКАЗ**

Паводле волі Божай сталася тое, што Пілат сам назваў Сына Божага невінаватым, а потым сам жа асудзіў Яго, як злодзея, на сьмерць. Такім звычаем было ўсім зразумела, што Хрыстос не за Свае грахі пакутаваў, але як Заступнік за чужыя грахі цярпеў.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого Собе Господь смерть роспятую обрал?

**ОТКАЗЪ**

Для того, иже таковую смерть Сам Богъ проклялъ, яко написано в Законе: «Проклятъ всякъ, висяй на древе» (Втор. Зак. 21). Годилося бо Господу приняти на Себе на час клятву, абы мы от нее выслобожени были. Тако Апостолъ пріпоминаеть (Гал. 4).

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для у «Зложенью» Никейским не припоминаеть, абы Христос омерь, тольки припоминаеть, яко распятъ, пострадалъ и погребенъ?

**ОТКАЗЪ**

Гасло маеть быти короткими словы, але которие бы достаточную наоуку оныхъ речей, на которих каждого спасеніе належить, замыкали. Гасло Никейское, хотя жь словом не говорить, абы Христос умерь, але речь самую значне ознамуеть, где въспоминаеть роспятие и страданіе, а наболей погребенье. Не гребуть бо никого, ани до гробу кладуть, естли бы первей не умерь.

**ПЫТАНЬЕ**

Которие нам пожитки с того, ижь Сынъ Божій былъ умеръ?

**ОТКАЗЪ**

Первый пожитокъ оттуле маемъ, ижь знаемъ, яко смерть Господня естъ истинною жертвою за нашие грехи, которою Господь гневъ Божій упокоилъ и насъ в ласку Божію привелъ. Другый пожитокъ, ижь смерть Господня вси грехи наши вытерла з Божіей памети, абы черезъ тое пред лице Божіе явитися не могли. Бо вже оное рукописаніе нашое кровию Своею выписалъ. Яко Апостолъ рече: «И васъ, мертвых сушчаа в прегрешеніих, и не обрезаніемъ плоти вашея оживилъ Богъ съ Христомъ, даровавъ намъ вся прегрешеніа, отмывъ сушче на насъ рукописаніе, оученію еже бяше противно намъ. И тое взялъ от среды, пригвозди на кресте» и прочая (Кол. 2:13-20).

Третій пожиток смерти Христовое, иже насъ держить, абы есмо не грешили. А тое таковым обычаем бываеть. Видимъ, яко великие муки и тяжкие поднялъ Христос за оное непослушество отца нашого Адама, которие муки Самъ Богъ на Него былъ уложилъ, яко Пророкъ пишеть, иже Самъ Богъ о Христе рече: «Поражу пастыря, и разыдутся овця» (Зах. 13). Если тому веруемъ, мовлю, латве розумети можемъ, ижь Богъ греха велми ненавидить, поневажь и тако окрутне в Сыне Своимъ скаралъ, аже к Нему оные слова възопилъ: «Боже мой, Боже мой, въскую Мя еси оставилъ?» (Матф. 27: 33-61, Марк 15: 22-42). Таковъ пакъ гневъ Божій противъ грехом бачечи, верни Христіане выстерегаются греховъ, ведаючи яко ся никому без скаранья не минаютъ.

А тые суть пожитки муки и смерти Господа нашего Ісус Христа. Бо иншие на тотъ часъ опушчаю.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго Госпад выбраў Сабе сьмерць на крыжы?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што такой сьмерцю Сам Бог Яго прakляў, як напісана ў Законе: «Пракляты Богам кожны, хто вісіць на дрэве» (Паўт. Зак. 21: 23). Таму належала Госпаду прыняць на Сябе праклён, каб мы былі вольныя ад праклёну. Гэтаксама і Апостал сьведчыць (Гал. 4).

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ў «Вызнаньні» Нікейскім не ўзгадваецца, што Хрыстос памёр, але гаворыцца: «ўкрыжаваны, пакутаваў і пахаваны»?

**АДКАЗ**

Вызнаньне павінна зьмяшчыць сьціслую, але дастатковую навуку пра тое, на чым залежыць збаўленьне кожнага. «Вызнаньне» Нікейскае, хаця ж ніводным словам ня кажа пра сьмерць Хрыста, пра самыя важныя рэчы ўзгадвае – пра ўкрыжаваньне, пакуты ды, перадусім, пра пахаваньне. Бо нікога не хаваюць ды ў магілу не кладуць, калі не памрэ.

**ПЫТАНЬНЕ**

Які нам здабытак з таго, што Сын Божы памёр?

**АДКАЗ**

Першы здабытак мы з гэтага маем, бо ведаем, што сьмерць Госпада – сапраўдная ахвяра за нашыя грахі, што гэтай ахвярай Ён гнеў Божы супакоіў ды прывёў нас у Божую міласьць. Другі здабытак маем таму, што сьмерць Госпада выцерла з Божае памяці ўсе нашыя грахі, дзеля якіх мы не маглі стаць перад аблічам Божым. Праз Сваю кроў Ён скасаваў напісанае супраць нас рукою, як Апостал сказаў: «І вас, мёртвых праз грахі і неабразаньне цела вашага, ажывіў вас зь Ім, дараваўшы нам усе грахі, скасаваўшы напісанае рукою асуджаючае нас, што было супраць нас, і ўзяў Яго з-паміж нас і прыбіў да крыжа» і так далей (Кал. 2: 13-14).

Трэці здабытак са сьмерці Хрыста ў тым, што Ягоная сьмерць утрымлівае нас ад грахоў. Такім звычаем гэта бывае: мы бачым, якія вялікія ды цяжкія пакуты зьведаў Хрыстос дзеля непаслухмянасьці нашага бацькі Адама. Пакуты ж гэтыя дапусьціў на Яго Сам Бог, бо Прарок піша, як Сам Бог пра Хрыста сказаў: «Удару пастыра, і разьбягуцца авечкі статку» (Зах. 13). Калі мы ў гэта верым, кажу, то лягчэй нам зразумець, што Бог вельмі ненавідзіць грэх, бо за яго Ён так жорстка пакараў Свайго Сына, што Той закрычаў: «Божа, мой Божа, чаму Ты мяне пакінуў?» (Мц. 27: 46, Мк. 15: 34) Такі вось гнеў Божы дзеля грэху бачачы, верныя Хрысьціяне сьцерагуцца грахоў, ведаючы, што грэх без пакараньня не застанецца.

Гэта вось здабыткі пакутаў ды сьмерці Госпада нашага Ісуса Хрыста, іншыя бо зараз ня ўзгадваю.

**ПЫТАНЬЕ**

У «Символе, або Зложенью Апостольским», припоменувши погребенье Христа, припоминается съшествие въ адъ, што ты о томъ розумеешь? Што естъ адъ?

**ОТКАЗЪ**

Тое части не вси вспоминають, которіи гасло Апостольское толкують, и тако ся ми видить, иже тые слова не борздо до гасла съборного приложоно. Оное дивнейшаа речь, ижь Іоаннъ Константиноградъскій Епископъ, которого Златоустымъ называють, две беседы на «Апостольскій символъ» написалъ. От которіих въ первой съшествіа въ адъ не пріпоминаеть. Въ второй пакъ и пріпоминаеть, и толкуеть. Але якожкольве естъ, годится от Святого Писаніа розгледети, што естъ адъ, а яко ся съшествіе Христово въ адъ розумееть. Часто бо сее слово «адъ» у Святомъ Писанію находимъ, але не на всякомъ месте одинъ розумъ держить.

Напервей бо розумеется вместо гроба, яко в Псалтире написалъ Давыдъ: «Не оставиши души моея въ аде, ни даси преподобному Своему видети истленія» (Псалом 15). Зде адъ за гробъ Давыдъ положилъ. А тое жь ест: «Не оставиши души моея въ аде», яко естли бы реклъ: «Не оставиши души моея въ гробе». На тот же обычай розумеется оная речь Іакова, которую о Іосифе поведелъ тако: «Сниду къ сыну своему, сетуя, въ адъ» (Быт. 37 ). Опять, тое жь слово розумеется иногды о ономъ месте, на которомъ суть души нечестивыхъ. Яко въ притчи о богатом и о Лазари, Христос поведелъ: «Оумер теже и богатый, и погребоша его. И въ аде възведе очи свои...» (Лук. 16: 19-31). Яко бы реклъ: «На месте осуженыхъ, или нечестивыхъ.»

Што ся пакъ тычеть съшествіа Христова въ адъ, не тако о томъ розумети маемъ, яко неціи, старечьские басьни змысливши, написали, яко бы Христос на онъ часъ, коли тело Его у гробе лежало, мелъ на оное место сніити, где души святыхъ отецъ были, и оттуле оныи души вывести. Нигде бо о томъ не пишеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Кажешь, яко бы съшествія Христова въ адъ нигде же Святое Писаніе не въспоминало, але ся мне опять видить, иже ся о том на многых местех находить. Яко напервей въ первом посланіи святого Апостола Петра явне о томъ пишеть сими словы: «Христосъ единою о гресехъ пострада праведникъ за неправедники, да ны приведе Богови, оумершчвенъ убо быв плотію, ожив же Духомъ, о Нем же и сушчеимъ въ темници Духомъ, съшед проповеда» (1 Петра 3:10-22).

Зде, яко ся мне видить, явне Апостолъ пишеть о съшествіи Спасове въ адъ. Другое место ест у Пророка Захаріа, сими словы: «И ты въ крови завета своего испустилъ еси юзники своя от рова, не имушча воды, сядете въ тверди съвязни сънмишча, и за единъ день пришельствія твоего сугуба въздамъ тобе» (Зах. 9). И зде видить ми ся о

**ПЫТАНЬНЕ**

У «Сымбалі, або Апостальскім вызнаньні» пасьля пахаваньня Хрыста ўзгадваецца Ягонае зыходжаньне ў пекла. Што ты наконт гэтага мяркуеш? Што такое пекла?

**АДКАЗ**

Ня ўсе тлумачальнікі «Апостальскага вызнаньня» ўзгадваюць пра гэтую частку, і мне здаецца, што гэтыя словы далучылі да саборнага вызнаньня пазьней. Яшчэ больш дзіўна тое, што Ян, епіскап Канстанцінопальскі, празваны Златавусным, напісаўшы пра «Апостальскі Сымбаль» дзьве гутаркі, у першай гутарцы пра зыходжаньне ў пекла не ўзгадвае, у другой жа яго і ўзгадвае, і тлумачыць. Але, як бы там ні было, належыць нам разгледзець, што Сьвятое Пісьмо кажа пра пекла ды як разумее зыходжаньне Хрыста ў пекла. Часта бо знаходзім у Сьвятым Пісаньні гэтае слова «пекла», але не на кожным мейсцы яно тое самае значыць.

Перадусім бо яно азначае «магіла», як у Псальмах Давід напісаў: «Бо не пакінеш душы маёй у пекле, не дасі сьвятому Твайму ўбачыць тленьня» (Пс. 15). Тут Давід кажа «пекла» замест «магіла»: «Не пакінеш душы маёй у пекле» азначае тое ж, што і калі б ён сказаў: «Не пакінеш душы маёй у магіле.» Тым жа звычаем разумей словы Якуба, калі ён пра Язэпа так сказаў: «Са смуткам пайду за сынам маім у пекла» (Роду 37). Зноў жа, часам гэтае слова азначае тое мейсца, дзе знаходзяцца душы грэшнікаў, як у прыповесьці пра багацея ды пра Лазара Хрыстос гаварыў: «Памёр таксама і багаты, і быў пахаваны. І ў пекле, церпячы мукі... » (Лк. 16: 22-23), маючы на ўвазе мейсца асуджаных або грэшнікаў.

Што ж датычыцца зыходжаньня Хрыста ў пекла, не павінны мы разважаць пра гэта як тыя, што, старэчыя выдумкі змысьліўшы, напісалі, нібыта Хрыстос у той час, калі Ягонае цела ляжала ў магіле, меўся зыйсьці ў мейсца, дзе былі душы сьвятых айцоў, ды адтуль Ён гэтыя душы вывеў. Нідзе бо пра гэта не напісана.

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажаш, што пра зыходжаньне Хрыста ў пекла Сьвятое Пісьмо нідзе ня ўзгадвае, але мне здаецца, што ў многіх мейсцах пра гэта знойдзем. Перадусім, у першым лісьце сьвятога Апостала Пятра ясна пра гэта напісана ў такія словы: «Хрыстос таксама памёр за грахі, Справядлівы за несправядлівых, каб вас давесьці да Бога, забіты целам, але пакліканы Духам да жыцьця. У Ім пайшоў вясьціць збаўленьне нават духам, замкнутым у вязьніцы» (1 Пт. 3: 18-19).

Тут, як мне здаецца, Апостал дакладна піша пра зыходжаньне Збаўцы ў пекла. Яшчэ адно мейсца знойдзем у Прарока Захарыі ў такія словы: «І ты ў крыві запавету твайго вызвыліў зьняволеных сваіх з рову бязводнага. Вярніцеся ў крэпасьць, вязьні надзеі: сёньня таксама абвяшчаю, што ўзнагароджу цябе ўдвая» (Зах. 9). І тут, як я бачу,

том же съшествии Пророкъ говорить, и сведчить, яко Христос выпустилъ юзники из рова в немъ же не было воды. То естъ, души святых от ада.

У иного тежь Пророка Самъ Богъ обецался ворота адова съкрушити предъ Господемъ, сими бо словы рече: «Аз пред Нимъ пойду, и горы уравнаю, врата меденая съкрушю, и верея железныя сломлю, и дам Ти іменія темная и съкровеная», и прочая (Ісаіа 45). У псалме теже оныя слова: «Возмете врата князи ваша и възмитеся врата вечная, и внидеть Царь славы» (Псалом 23), на кого речены суть, естъли не на князей адовыхъ, егда Христос къ аду пришолъ?

А не только Святое Писаніе, але и богословци съшествіе Христово въ адъ въспомнають, межи которих Дамаскинъ тако пишеть: «Сниде въ адъ душа Божественная, дабы яко на земли сушчии правды въсіа солнцомъ, тако и иже под землею въ тме и сени смертней седяху, светъ да оувидять» (В третіих книгах православныя веры). Откажи ми на тое.

**ОТКАЗЪ**

Ведаю, яко вже от давного часу вкралося сее домниманье межи Христіянъ, иже не толико поспольство, але и наоучени неціи чудно о аде и о съшествіи въ адъ Христове розумеють. Напервей бо кажють, яко адъ ест въ средине земли. Потомъ о Христе тако розумеють, яко душа Его, розделившися с телом и лежашчему Ему въ гробе, съшла з многыми аггелы въ адъ и оттуле вывела души отец святых. И к тому своему домниманью прибераютъ от Святого Писаніа тые сведетельства от посланіа Петрова, от пророчества Захаріина, Ісаіна и иных.

Лечь ся не тако съшествіе Христово въ адъ розумееть. Тые теже Писанія не о томъ пішють. Ведомо бо от Святого Евангеліа, яко Христос, умераючи, не въ адъ обецался ити, але напервей, розбойника покаяне пріимаючи, обецалъся с нимъ того жь дня в раи быти, а потом въ руце Богу предалъ дух Свой. Прото ани при смерти, ани пред томъ не поведелъ то Господь, абы мелъ в адъ сходити. Бо естли бы тако мелъ учинити, предповеделъ бы о том первей ученником, яко и иныя вся дела Своя, яже створити мелъ, а на чом бы оправданіе нашое належало, предповеделъ. Оповеделъ далеко ешче пред томъ, нежели пришло, пойманье Свое. Оповеделъ битье, преданье языком, поруганье, роспятье и тридневное у гробе отпочиванье, из мертвых въскресенье, на небеса възнесеніе, Духа Святого съшествіе. Чого бы для и сего въ адъ съшествіа не оповеделъ?

Бо иже некоторіи говорять, яко Христос оными словы обецался въ адъ снiити душею, где рече къ книжникомъ: «Яко Іона бе въ чреве китове три дни и три ношчи, тако будеть Сынъ человеческій въ сердци земли три дни и три ношчи» (Матф. 12: 38-45), ничого не помагають. Бо тые слова не о съшествіи въ адъ, але о тридневномъ въ гробе лежани Христос поведел. Яко и вси богословци розумеють, а наболей Самъ Христос ознамуеть. Бо бытье оное Свое в земли за знамя обецал книж-

Прарок кажа пра тое ж зыходжаньне ды сьведчыць, што Хрыстос выпусьціў зьняволеных зь ямы, у якой не было вады, значыць, душы сьвятых зь пекла.

Таксама ў іншага Прарока Сам Бог абяцаўся скрышыць брамы пекла перад Госпадам, у такія бо словы прамовіў: «Я пайду перад Табою і паніжу горы, брамы чыгунныя разаб'ю і запоры жалезныя паламаю. І перадам Табе схаваныя скарбы і багацьці сакрытыя» і так далей (Іс. 45). Таксама ў псальме вось гэтыя словы: «Адчыніце, князі, брамы вашыя, адчыніце брамы вечныя, ды ўвойдзе Валадар Славы» (Пс. 23) - да каго іншага былі зьвернуты, калі не да князёў пекла, калі Хрыстос у пекла зыходзіў?

Ды ня толькі Пісьмо Сьвятое, але і багасловы кажуць пра зыходжаньне Хрыста ў пекла, адзін зь іх, Дамаскін, так піша: «Зыйшла ў пекла Боская душа, каб, і на зямлі жывучым, і пад зямлёю, у цемры і ценю сьмерці сідзячым, зазьзяла сонца праўды» (у трэцяй кнізе праваслаўнай веры). Адкажы мне на гэта.

**АДКАЗ**

Ведаю, што з даўніх часоў узьнік сярод хрысьціянаў звычай (ды ня толькі сярод людзей простых, але і сярод вучоных), неяк дзівацкі пра пекла ды пра зыходжаньне ў пекла Хрыста разважаць. Перадусім яны кажуць, што пекла зьмяшчаецца ў сярэдзіне зямлі. Далей, пра Хрыста яны мяркуюць, што Ягоная душа, разьдзяліўшыся зь целам, пакуль цела было ў магіле, зыйшла з анёламі ў пекла і вывела адтуль душы сьвятых айцоў. Да такога свайго меркаваньня яны далучаюць ўзгаданыя сьведчаньні зь Пісьма Сьвятога: зь лісту Пятра, з прароцтваў Захарыі, Ісаі ды іншых.

Але ж ня так трэба разумець зыходжаньне Хрыста ў пекла, ды і гэтыя сьведчаньні зь Пісаньняў не пра пекла кажуць. Вядома бо са Сьвятога Эвангельля, што Хрыстос, паміраючы, абяцаў ня ў пекла зыйсьці, але, перадусім, прыймаючы пакаяньне разбойніка, абяцаў у той жа дзень быць зь ім у раі, а потым у руку Божую аддаў Дух Свой. Ані перад сьмерцю, ані паміраючы не казаў Госпад, што зьбіраецца зыходзіць у пекла. Бо калі б Ён меўся так ўчыніць, прадрок бы гэта найперш вучням, як прадракаў ім усе іншыя Свае справы ды як прадракаў, на чым палягае нашае апраўданьне. Прадрок бо Ён, перш чым тое здарылася, што Яго схопяць, казаў пра пакуты, здраду, зьдзекі, укрыжаваньне, трохдзённае знаходжаньне ў магіле, уваскрасеньне з памерлых, узнясеньне на неба, спасланьне Духа Сьвятога. Чаму б дзеля гэтага і зыходжаньне ў пекла не прадрачы?

А што некаторыя гавораць, нібыта Хрыстос абяцаў зыйсьці душою ў пекла, калі сказаў кніжнікам: «Як Ёна быў у чэраве кіта тры дні ды тры ночы, так будзе Сын Чалавечы ў сэрцы зямлі тры дні ды тры ночы» (Мц. 12: 40), то і яны не даюць рады, бо Хрыстос гаварыў не пра зыходжаньне ў пекла, але пра тое, што будзе ляжаць тры дні ў магіле. Так і ўсе багасловы мяркуюць, але, перадусім, Сам Хрыстос так аб-

никомъ. А естьли знамя, ино потреба, абы было явно. Съшествіе пакъ въ адъ не могло быти явно. А такъ вже каждый розумети можеть, иже сее о душевномъ съшествіи Христове въ адъ домниманье не ест певное, поневажь о немъ Христос ни однымъ словомъ не предповеделъ.

Тое пакъ мовлю не у тотъ обычай, абыхъ съшествіа Христова въ адъ не верил, але иже не таково было, яковое они домнимают. Потому жь и о аде омыляются. Бо тако о ним розумеють, яко бы серед земли замокъ твердый съ железными верейми былъ, у котором души святыхъ, они же до Христа померли, яко вязни замкнены были. Сия суть старечьские басьни. Бо нигде же нам Богъ места, на котором бы адъ былъ, не ознамилъ. Прото и богословци не згожаются, пишючи о томъ. Златоусты, пишючи на оные Христовы слова: «Неключимаго раба ъверзете въ тму кромешную» (Матф. 25:14-30), кажеть, яко неціи домниваются, аду быти не в земли, але кроме или въне света, и того для, поведаеть, Христос не рече: «Въвержете въ тму преисподню», але: «кромешную».

Прото, поневажь намъ Христос места того не ознамилъ, а к тому толковники не згожаются, лепшей того такъ занехати. Доволно нам ведати и верити, яко адовы муки суть оуготованые діаволу и аггеломъ его от века, их же причастники будуть вси нечестивіи (Матф. 25). О место пакъ непотребна речь сваритися. Тым же обычаемъ о душахъ отецъ, они же до Христа померли, не ест речь христіаньская домнивати, абы под рукою бесовскою были. Бо напротиву того мниманья Самъ Христос стоить, где у притчи о богатом и о Лазари явно кажеть, яко по смерти Лазарове донесенъ был черезъ аггелы на лоно Авраамле (Лука 16). Видишь, не рече: «Беси поймали и донесли въ адъ», але: «Аггели на лоно Авраамле». Што пакъ о Лазари поведелъ Господь, тое жь далъ знати о всехъ блаженыхъ душахъ. К тому и у книзе Премудрости написано: «Праведных души в руце Божіей, и не прикоснется имъ мука» (Прем. 3). З молитвы теже славного пророка Иліи розумети можемъ, иже души угодниковъ Божіихъ не въ адъ ани в муки, але в руце Божіе из тела исходили. Тако бо Иліа молится Богу, утекши от лица Іезавеле царице въ пустыню, и рече: «Досыть ми ныне, пріими оуже душю мою от мене, Господи, яко не лепший азъ есмь, нежели отци мои» (3 Цар. 19). Если бы Иліа мелъ въ адъ душю свою предати, яко теперь неціи розумеють, не просилъ бы Бога о смерть, ани бы к Господу рекл: «Пріими душю мою», если бы въ адъ ити мела. Але ведаючи Пророкъ, яко смерть мела ему не муку, но отпочиненье принести и конецъ скорбем оучинити, а наболей, ижь душа его мела в руце Богу ити, того для безпечно о смерть просить. Бо если бы ся таковового житла по смерти надеялъ, яковое тіи поведають, што жь бы Иліа зыскал? Не лепшей ли ему было критися зде и втекати пред царицею, нежели, въ адъ съшедши, въ тме, яко мнихи домнимают, и в везени у діавола быти? Гоненье бо Іезавеле, хотя жь было страшно, але не долго и с нею згинути мело. Надеюся, иже вже с тых доводовъ явно, яко души оныхъ

вяшчае, тое бо Сваё знаходжаньне ў магіле Ён абяцаў кніжнікам як знак. А калі гэта знак, то павінен быць бачным. Зыходжаньне ж у пекла не магло быць бачным. А калі так, то кожны можа зразумець няпэўнасьць гэтага меркаваньня пра зыходжаньне душы Хрыста ў пекла, бо Хрыстос не прадрок яго аніводным словам.

Гавару гэта не таму, што ня веру ў зыходжаньне Хрыста ў пекла, але таму, што не было яно такім, як некаторыя мяркуюць. Разважаючы пра пекла, яны памыляюцца, уяўляючы яго як умацаваны замак з жалезнымі брамамі, у якім, нібы вязьні, зачынены душы сьвятых, што памерлі да Хрыста. Усё гэта старэчыя выдумкі, бо не аб'явіў нам Бог такое мейсца, у якім бы знаходзілася пекла. Дзеля гэтага і багасловы між сабою не згаджаюцца, на гэты конт пішучы. Залатавусны, разважаючы пра словы Хрыста: «А слугу нягоднага ўкіньце ў цемру вонкавую; там будзе плач і скрыгатаньне зубамі» (Мц. 25: 30), кажа, што, паводле некаторых меркаваньняў, пекла знаходзіцца не ў зямлі, але па-за ёю, дзеля таго Хрыстос не сказаў: «Укіньце яго ў цемру падземную», але: «Укіньце яго ў цемру вонкавую».

Дзеля таго, што Хрыстос не адкрыў нам такое мейсца, ды дзеля таго, што і тлумачальнікі між сабой не згаджаюцца, лепш нам гэта так пакінуць. Дастаткова толькі ведаць, што пякельныя пакуты спрадвек падрыхтаваныя д'яблу ды анёлам ягоным ды што ўсе грэшнікі будуць іхнімі супольнікамі (Мц. 25). Пра мейсца, дзе пекла знаходзіцца, ня трэба сварыцца, тым жа звычаем не па-хрысьціянску чынім, калі мяркуем пра душы айцоў, да Хрыста памерлых, што яны знаходзіліся ў руцэ д'ябла. Бо меркаваньне такое Сам Хрыстос абвяргае, калі ў прыповесьці пра багацея ды Лазара ясна сьведчыць, як пасьля сьмерці Лазар быў занесены анёламі на ўлоньне Абрагама (Лк. 16).

Бачыш, Ён не сказаў: «Чэрці схапілі яго ды панесьлі ў пекла», але: «Анёлы занесьлі яго на ўлоньне Абрагама». Што пра Лазара сказаў Госпад, тое ж Ён засьведчыў і пра душы ўсіх справядлівых. Да таго ў кнізе Мудрасьці напісана: «Душы справядлівых у руцэ Божай, і ўсякая пакута іх абміне» (Мудр. 3). З малітвы слыннага прарока Ільлі таксама можам зразумець, што душы справядлівых Божых, пакінуўшы цела, ані ў пекла, ані ў пакуты, але ў руку Божую прыходзілі. Так бо Ільля моліцца Богу, уцёкшы ў пустыню ад валадаркі Езавелі, ды кажа: «Досыць мне зараз, прыймі ўжо душу маю, Госпадзе, бо ня лепшы я за бацькоў маіх» (1 Валад.19).

Калі б Ільля меўся аддаць сваю душу ў пекла, як цяпер некаторыя гэта разумеюць, то не прасіў бы ён сьмерці ў Бога ды не казаў бы Госпаду: «Прыймі душу маю», калі б яна мела ў пекла зыйсьці. Але Прарок ведаў, што сьмерць прынясе яму не пакуты, але адпачынак ды спыніць цярпеньні, і, перадусім, ведаў, што ягоная душа пойдзе ў Божыя рукі, таму і прасіў сьмерці бясьпечна. Бо калі б на такое жытло пасьля сьмерці Ільля не спадзяваўся, як некаторыя гавораць, то што ж бы ён прыдбаў? Хіба ня лепш было б яму тут хавацца, уцякаючы ад

святыхъ отецъ не въ адъ, ани в муки сходили, але по Соломону навращчалися къ Богу. Той бо тако рече: «Навратится прах в землю, откуле былъ, и дух навратится къ Богу, иже далъ и». А поневажь ся оные души къ Богу навращчали, што жь за домниманье оныхъ естъ, которіи поведають, абы по души Адама, Еввы, Авраама, Давыда, Крестителя и иныхъ въ адъ съшолъ Христос? Оуже, мовлю, латве познати сие басьни. Але иже е Писаніем пророкъ и Апостолъ накривают, попытаемъ, къ речи ли сия Писанія пріводять. Бо не досыть на томъ, иже кто Писание приводить, потреба обачити, о чомъ Писание пишеть. Згожает ли ся розумъ его з розумомъ того, он же е приводить?

Святое бо Писмо и діаволь приводити можеть, але къ злому. Яко и Самому Господу от псалъма привелъ: «Аггеломъ Своимъ заповесть о Тебе съхранити Тя, и на руках възмут Тя, да некогда предкнеши о камень ногоу Твою» (Матф. 4:1-11; Лука 4:1-14). Нежели Христос на том Писанію не досыть мелъ, не для того, абы Писанію места не далъ, але иже иный розумъ діаволъ Писанію Святому пришити хотелъ. Псалом бо обецуеть всемъ благочестивымъ аггельскую оборону, егда ходять по путемъ своимъ. То естъ, коли своего позваніа или повинностей своих пилнують. Опять, діаволъ к тому приводилъ, абы Христос в надею тое обороны, летати по воздусе захотелъ. Лечь не той былъ путь Христа, и того для другое письмо Господь привелъ. Где обачи хитрость сатанину, приводячи Писмо, не потому приводить, яко написано, але только оные слова обераеть, которие бы на позоръ его речи служили, а оные минаеть, которие на противу его стоять. Псалом бо рече: «Аггелом Своим заповесть о тобе сохранити тя въ всехъ путех твоих» (Псалом 90). Онъ пакъ не поминаеть путей, абы ся лесть его не явила. Але о том досыть, приступемо къ писму, котором душевное в адъ Христово сшествіе укрепляють.

Напервей приводять Петра Апостола слова, у которых тое напред обачь, иже Апостолъ не пишеть о души Христовой, абы въ адъ съшла, але о Духу Его, о нем же, съшедъ в темници, духомъ сушчеимъ проповедалъ. Далеко бо инаа речь ест души Сына Божіего сниити въ адъ, а иная – Христови силою Духа Своего проповедати, или о Духу въ темницю сходити. Сведчить Петрь, яко Сам Христос, а не душа Его, духомъ проповедалъ. Нежели того для приложилъ оное слово «о немъ», то естъ «о духу», абы кто не домнималъ Христа очевисте къ оным духомъ съшедшаго. Естъ бо обычай Святого Писма, коли не очивисте а не особою кого при чомъ быти ознамити хочеть, прикладаеть сее слово «о духу», или «духомъ». Яко Іоаннъ Богословъ в Откровеніи своимъ пишеть: «Азъ, Іоаннъ, братъ вашь и обешчникъ въ печалехъ и царстве и терпеніи Ісус Христове, бех въ острове, нарицаемом Патме, за Слово Божіе и за свидетельство Ісус Христово, бехъ духомъ в день недельный, и слышах за собою глас великъ» и прочая (Апокал. 1).

Зде о двояком бытью своемъ Іоаннъ пишеть. И о первомъ оубо пишючи, не прикладаеть оного слова «духомъ», но просто рече: «Бех

валадаркі, чым, зыйшоўшы ў пекла, у цемры, як манахі пра тое мяркуюць, стацца вязьнем д'ябла? Перасьлед бо Езавелі хаця і быў страшны, але нядоўгі, ды зь ёю разам меўся скончыцца.

Спадзяюся, ужо з гэтых доказаў бачна, што душы тых сьвятых айцоў ані ў пекла, ані ў пакуты не зыходзілі, але, паводле Салямона, да Бога вярталіся, ён бо так сказаў: «Вернецца парахно ў зямлю, дзе было, а дух вернецца да Бога, Які даў яго». А калі душы сьвятых вярталіся да Бога, то чаго вартае меркаваньне тых, што гавораць, нібыта Хрыстос зыйшоў у пекла па душы Адама, Эвы, Абрагама, Давіда, Хрысьціцеля ды іншых? Лёгка, кажу, можна пазнаць гэтыя выдумкі. Але паколькі яны свае выдумкі апраўдваюць Пісаньнямі прарокаў і Апосталаў, праверым, ці дарэчы яны на гэтыя Пісаньні спасылаюцца. Бо не дастаткова, калі нехта на Сьвятое Пісаньне спасылаецца, патрэбна разгледзець, пра што Пісаньне кажа, ці мае на ўвазе тое ж самае, што і той, хто на яго спасылаецца?

На Сьвятое бо Пісьмо і д'ябал можа спасылацца, але робіць гэта на благое, як і Самому Госпаду ён словы псальма прывёў: «Анёлам Сваім даручыў Бог Цябе, і яны на руках панясуць Цябе, каб часам аб камень не скалечыў нагі Тваёй» (Мц. 4: 6, Лк. 4:10). Аднак Хрыстос тым Пісаньнем не задаволіўся не дзеля таго, што Пісаньню ня верыў, але дзеля таго, што д'ябал хацеў іншы сэнс Сьвятому Пісаньню прыдаць. Псальм бо абяцае абарону анёлаў усім багабойным тады, калі яны ходзяць сваімі шляхамі, значыць, калі пільнуюцца свайго пакліканьня або сваіх абавязкаў. Зноў жа, д'ябал дзеля таго Пісаньне прыводзіў, каб Хрыстос, спадзеючыся на гэтую абарону, захацеў у паветры лётаць. Але ж ня гэта было прызначэньнем Хрыста, дзеля таго Ён іншае Слова зь Пісаньня ўзгадаў. Вось дзе бачыш шатанаву хітрасьць: ён прыводзіць Пісаньне ня так, як напісана, але толькі тыя словы выбірае, што на ягоную карысьць служаць, ды абмінае тыя словы, што супраць яго сьведчаць. Псальм бо кажа: «Анёлам Сваім паручыў Бог цябе, і яны на руках панясуць цябе, каб часам аб камень не скалечыў нагі тваёй на ўсіх шляхах тваіх» (Пс. 90). Д'ябал жа, каб хлусьня ягоная ня выкрылася, пра шляхі не ўзгадвае. Але досыць пра гэта, пяройдзем да ўрыўкаў зь Пісаньняў, што сьведчаць пра зыходжаньне душы Хрыста ў пекла.

Перадусім прыводзяцца словы Апостала Пятра, у якіх, адразу заўваж, Апостал піша не пра зыходжаньне ў пекла душы Хрыста, але пра тое, што Дух Ягоны, зыйшоўшы ў вязьніцу, дабравесьціў іншым духам. Адна бо справа – зыходжаньне ў пекла душы Сына Божага, а зусім іншая – дабравесьце Хрыста моцай Духу Ягонага, або зыходжаньне Ягонага Духа ў вязьніцу. Сьведчыць Пётр, што Сам Хрыстос дабравесьціў тым духам, а не душа Ягоная. Дзеля таго Пётр далучыў тое слова пра Дух, каб ніхто ня думаў, што Хрыстос у целе да тых духаў зыходзіў. Ёсьць бо ў Сьвятым Пісьме звычай: каб паказаць некага прысутным не целам, не ўласнаю асобаю, далучаецца гэтае слова «духам», як і Ян Багаслоў у сваім Адкрыцьці піша: «Я, Ян, брат ваш і

на острове Патме за Слово Божіе». Речію бо былъ в заточеніи на том острове, не в виденіи. Лечъ другое бытье выписуючи, понеже не в речи, але в виденіи было, то для рече: «Бех духомъ». Потому же и Іезекіилъ пророкъ, выписуючи, яко и Духъ взялъ и принесъ в землю Халдейскую, приложилъ на конецъ «духомъ», абы кто о немъ не домнивалъ, ижъ бы его с теломъ Духъ преносилъ (Езек. 11). Тело бо на месте своемъ было, и душа в теле была, але ему Богъ в виденіи оную землю показалъ, не иначе, яко бы тамо теломъ и душею былъ. Прото и Господь нашь, понеже Духомъ въ темници проповедалъ, не может ся о души Его тое розумети, але о Духу Его. То естъ, изявилъ онымъ духом Христос Свое Евангелие, которіи в темници были. Не иже бы к нимъ особою або душею Своею пришолъ, але яко Петрь пишеть, Духомъ, се естъ, силою Духа Своего. А се естъ первый знакъ, иже ся сіа речь Петра Апостола не о том съшествіи розумееть, которое мнихи собою выдумали, яко бы Христос душею по души святыхъ въ адъ исходилъ.

Другую речь ешче в тых таки святого Петра словехъ обачи. Тіи бо, которіи тые слова о съшествіи душевном Христа въ адъ розумеють, тако поведають, иже Христова душа того часу въ адъ съшла, егда тело в гробе лежало. Лечь зде того Апостолъ не кажеть, но ешче противу того поведаеть, яко Христове, Духомъ оживъ, сушчеим въ темници проповедалъ. Ясне видишь, што Апостолъ розумееть, иже Христос тогды сушчеим в темници проповедалъ, коли вже Духомъ ожилъ, то естъ по въскресеніи Своемъ. Бо што рече: «Духом оживъ», тако розумей, яко есмъ вышей выложилъ, иже Христос Духом проповедалъ, се естъ, силою Духа Своего духомъ Евангелие Свое ознамилъ. Тако, мовлю, и зде розумей, где Апостолъ рече: «Христос Духомъ оживъ», то естъ, силою Духа Своего оживъши. Явная речь с тых слов, иже оное в темници проповеданье оуже по въскресеніи было. Прото не может ся тое место о томъ съшествіи душевном, которое николи не было, розуmeти. К тому ешче и тое обачь, иже Апостолъ не о аде, але о темници пишеть. Погреческіи Апостолъ написалъ «ен філаки», то естъ «в темници», не «ен адо». Темницею пакъ зоветь не адъ, але желаніе оных блаженыхъ духовъ, которое имъ въместо вязенья или темници было. Лечь о томъ вже досыть.

Къ пророчеству Захаріну приступлю, который тако пишеть: «И ты въ крови завета твоего испустилъ есь оузники своя от рова, неимушча воды» (Зах. 9). Тако ест у старом преводе из греческого превода, нежели въ еврейских книгахъ на тот обычай пишется сее место: «И ты въ крови завета твоего испустихъ вязни твоя из рова, неимушча воды». Сия слова Захаріа въ особе Божіей къ дшчи Сіонстей того часу говорилъ, коли з неволи Вавилонское вышли, додаваючи имъ доброе мысли и обецуючи имъ певное избавленіе от рова, неимушча воды, се естъ от скорбей и трудностей, которие их потыкати мели. А яко на той час дочасное избавленіе дочце Сіонской пророкъ именемъ Божіимъ обецовалъ, тыми словы, тако, опять тыми жь словы, обецеть Свя-

ўдзельнік у прыгнёце, у валадарстве і вытрыманасьці ў Хрысьце Ісусе, быў на востраве Патмас дзеля Слова Божага і сьведчаньня аб Ісусе. Я быў у захапленьні духа ў дзень Госпадаў і пачуў за сабою зычны голас» і так далей (Адкр. 1:10).

Тут Ян піша пра сваё дваякае быцьцё. Распавядаючы пра першае, ён не далучае слова «духам», але проста кажа: «Быў на востраве Патмас дзеля Слова Божага», бо сапраўды быў на тым востраве ў выгнаньні. Пра другое ж быцьцё распавядаючы, – паколькі было ня яўным, але ў бачаньні, – так кажа: «Я быў у захапленьні духа». Тым жа звычаем і прарок Эзэкіль, кажучы, як быў перанесены духам у зямлю Хальдэйскую, далучыў пад канец «духам», каб ніхто не падумаў, што разам зь целам ён быў перанесены (Эз. 11). Цела бо засталося на сваім мейсцы, душа была ў целе, Бог жа ў бачаньні тую зямлю яму паказаў, нібыта Эзэкіль там знаходзіўся і душой, і целам. Дзеля таго і калі наш Госпад дабравесьціў Духам у вязьніцы, сказана гэта не пра душу, але пра Дух Ягоны, – значыць, тым духам, што былі ў вязьніцы, Хрыстос аб'явіў Сваё Эвангельле. Не прыйшоў Ён да іх у целе або Сваёй душою, але, як піша Пётр, Духам, гэта значыць, моцаю Духа Свайго. А гэта і ёсьць першы доказ, што Апостал Пётр іншым звычаем пра тое зыходжаньне мяркуе, чым манахі, якія выдумалі, нібыта душа Хрыста зыходзіла ў пекла па душы сьвятых.

Ды яшчэ адну рэч заўваж у гэтых словах сьвятога Пятра. Тыя бо, для каго гэтыя словы азначаюць зыходжаньне душы Хрыста ў пекла, гавораць, што душа Хрыста зыйшла ў пекла тады, калі цела ляжала ў магіле. Аднак тут Апостал гэтага ня кажа, але яшчэ і адваротнае сьведчыць: Хрыстос, Духам ажыўшы, дабравесьціў вязьням. Ясна бачыш, што мяркуе Апостал: Хрыстос тады дабравесьціў вязьням, калі ўжо ажыў Духам, гэта значыць, пасьля Свайго ўваскрасеньня. Бо калі сказана: «Духам ажыўшы», так гэта разумей, як я вышэй растлумачыў: значыць, моцаю Духа Свайго аб'явіў Эвангельле іншым духам. Такім звычаем, кажу, і тут мяркуй, калі Апостал сказаў: «Хрыстос, Духам ажыўшы», значыць, ажыўшы моцай Духа Свайго. Ясна відаць з гэтых словаў, што тое дабравесьце ў вязьніцы было ўжо пасьля ўваскрасеньня. Таму нельга гэтае мейсца Пісаньня разумець як зыходжаньне душы ў пекла, бо такога зыходжаньня ніколі не было. Ды яшчэ зважай, што Апостал піша не пра пекла, але пра вязьніцу. Па-грэцку Апостал напісаў «ен філакі», значыць, «у вязьніцы», а не «ен адо». Вязьніцаю ён называе ня пекла, але прагненьне тых багабойных духаў, якое было ім замест кайданоў ці вязьніцы. Але досыць пра гэта.

Перайду да прароцтва Захарыі, які так піша: «І ты ў крыві запавету твайго вызваліў зьняволеных сваіх з рову бязводнага» (Зах. 9). Так сказана ў старым перакладзе з грэцкай мовы, аднак у гебрайскіх кнігах запісана гэтае слова такім звычаем: «І ты у крыві запавету твайго вызваляў зьняволеных тваіх з рову бязводнага». Праз гэтыя словы Захарыі Бог у той час казаў дачцы Сыёнскай, калі з Бабілёнскай няволі

той Церкви вечное избавление от рова сухого, то естъ от роспачи. Прото не о вымышленых ровех тые слова маемъ розумети, але о духовных ровехъ. Пророкъ бо через подобеньство искрушенія и роспачь ровом называеть. Бо яко из рова изыйти человеку самому нельзя, тако из роспачи, греховъ деля, невъзможно, если бы не Богъ пособилъ выбрести. Ровъ пакъ неимушчій воды того для рече, яко в роспачи потехи или охложеніа нетъ.

Ісаіа не маеть никакое трудности. Сия бо слова: «Азъ пред ним пойду, и горы оуравнаю, врата меденая съкрушу» Самъ Богъ къ Кирови рече, яко кажный, чтучи, вырозумети можеть. Тако бо исперва сию главу Ісаіа починаеть: «Сице глаголеть Господь Богъ помазаному Моему Кирови: “Его же дръжах десницю, повинутися предъ нимъ странамъ, и крепость царьску разрушю; отверзу пред нимъ врата, и гради не затворятся”». И по сих словех тые слова реченные Богъ рече: «Азъ предъ нимъ пойду, и горы оуравнаю, врата меденая съкрушу», и прочая. Вся слова о Кире цари розумеются, которому зде Богъ обецуетъ вси страны отдати, городы пред нимъ отмыкати и тако ему шчастити, абы ся ему никто противити не могъ. А хотя ж ся тогда ешче Кирь не родилъ, але ся сіа потомъ вся исполнишя. Яко и сам Кирь писаніем листовъ съзнаваеть. Тако бо о нимъ Езра пишеть: «Въ первое лето Кира, цара Перскаго, дабы исполнится Слову Господню от оустенъ Іереміи Пророка, възбуди Господь духъ Кира, цара Перска, и извести глас въ все царствие свое, и въ писаніи глаголя: Тако рече Кирь, царь Перский: “Вся царствіа земныя дасть ми Господь Богъ небесный”», и прочая (Ездр. 1).

То пакъ мнихи съ иконики вымыслили адъ съ железными враты, просте яко бы на духи телесныхъ замковъ потреба, где жь тіи плоти и костей, яко Господь поведелъ, не мають (Лука 24: 36-53). Але къ псалму вже час приступити. Кто хочеть Писмо Святое неомыльно вырозумети, потреба не за одно слово взятися, але все, што напереде и назаде писано, с пилнистію обачити, роспытати, и к чому ся весь розумъ оного места стягаеть, розгледети, а наболей Духа Божія на помочь призывати. Прото и Самъ Господь, отсылаючи жиды до Писма Святого, не рече просто: «Читайте Писаніа», але рече: «Испытайте Писанія, яко вы мните в них имети живот вечъный и та суть сведетельствуюшча о Мне» (Іоан 5:17-47).

Тое слово надобе было и мнихом памятати, не потому бы Святого Писма пороздерали и тых бы слов Святого Духа бесу не причитали. Тако бо розумеють, яко идушчу Господу въ ад аггели на бесы сия словы възопили: «Возъмете врата князи ваша, и възмитися, врата вечная, да внидеть Царь Славы». А аггелом, дей, беси отказали: «Кто ест Той Царь Славы?» Але яко тое къ речи говорять, обачимъ с преднейших словъ сего псалма. Тако бо Духъ Святый сей псаломъ начинаеть: «Господня ест земля и испольнение ея, вселенная и вси живушчіи на ней» и прочая (Псалом 23). Зде не о съшествіи Сына Бо-

выйшлі, даючы ім надзею ды абяцаючы пэўнае вызваленьне з рову бязводнага, значыць, з пакутаў ды цяжкасьцяў, што іх мелі напаткаць. Ды як тады ў гэтыя словы прарок імем Божым абяцаў дачцы Сыёнскай вызваленьне часовае, гэтаксама зноў, у тыя ж словы, Ён абяцае Сьвятой Царкве вечнае вызваленьне з рову бязводнага, гэта значыць, з роспачы. Дзеля таго не пра выдуманыя рвы кажуць нам гэтыя словы, але пра рвы духоўныя, прарок бо, дзеля падабенства, скруху ды роспач называе ровам. Бо як з рова ня можа чалавек сам выйсьці, гэтаксама і з роспачы, дзеля грахоў, выйсьці ня можа, калі не дапаможа Бог. Пра роў бязводны сказана таму, што ў роспачы няма пацехі або асьвяжэньня.

Ісая таксама ўсё ясна кажа. Гэтыя бо словы: «Я пайду перад табою, і паніжу горы, брамы медныя разаб'ю» Сам Бог да Кіра прамовіў, як кожны, чытаючы, можа зразумець. Так бо гэты разьдзел Ісая пачынае: «Вось што кажа Госпад памазанцу Свайму Кіру: "Я моцна ўхапіў яго за правіцу, каб скарыць яму народы і абяззброіць валадароў, ды адчыніць перад ім брамы, ды каб брамы не зачыніліся"», ды пасьля Бог далей кажа: «Я пайду перад ім, і паніжу горы, і брамы медныя разаб'ю» і так далей. Усе словы гавораць пра валадара Кіра, якому тут Бог абяцае аддаваць усе краіны, адчыняць перад ім гарады і так дабраслаўляць, што ніхто не здолее яму супрацьстаць. Ды хаця тады Кір яшчэ не нарадзіўся, але потым усе гэтыя словы збыліся. Гэта і сам Кір ласкава вызнае, так бо пра яго Эздра піша: «Каб збылося слова Госпада, сказанае Ярэміем, натхніў Госпад дух Кіра, валадара Пэрскага, у першы год панаваньня ягонага, што ён на ўсё валадарства сваё пісьмова абвясьціў такі дэкрэт: «Вось кажа Кір, кароль Пэрсаў: усе валадарствы зямлі даў мне Гопад, Бог нябесны. І Ён загадаў мне пабудаваць Яму дом у Ерузаліме, што ў Юдэі» (Эзд. 1) і так далей.

Гэта бо манахі зь іканапісцамі выдумалі пекла з брамамі жалезнымі, нібыта дух, пра які Госпад казаў, што ані касьцей, ані цела ня мае (Лк. 24: 38), можна на замок зачыніць. Але ўжо час да псальма прыступіць. Хто хоча Сьвятое Пісьмо зразумець правільна, мусіць не за адно слова брацца, але ўсё, што раней ды пасьля напісана, уважліва паглядзець, дасьледаваць ды разгледзець, што тое мейсца цалкам азначае, а болей за ўсё Духа Божага клікаць на дапамогу. Таму і Сам Госпад, адсылаючы юдэяў да Сьвятога Пісьма, не сказаў проста: «Чытайце Пісаньні», але сказаў: «Дасьледуйце Пісаньні, бо праз іх вы думаеце мець жыцьцё вечнае, а яны сьведчаць пра Мяне» (Ян 5: 39).

Гэта слова належала б і манахам памятаць, тады б яны Сьвятое Пісьмо на часткі не дзялілі ды словы Духа Сьвятога д'яблу не прыпісвалі. Яны бо мяркуюць, што гэта анёлы, калі Госпад зыходзіў у пекла, на бесаў закрычалі: «Адчыніце, князі, брамы вашыя, адчыніце брамы спрадвечныя, ды ўвойдзе Валадар Славы». Ды бесы, маўляў, адказалі анёлам: «Хто той Валадар Славы?» Але ці дарэчы манахі так кажуць, пабачым з папярэдніх словаў гэтага псальма. Гэтак бо Дух Сьвяты той

жіа в адъ говорить Духъ Святый яко видишь, але свидельствуеть, яко вся земля ест Господьня. А яко бы проповедуеть, иже не только Іоудейская земля, але и вси языки мели познати Бога, абы ся Ізраильтяне с того не хвалили, иже только у них Храмъ Божий былъ, понеже вся земля ест Господьня и вси языци, або погане, меліся къ Богу навернути.

Розгледишь теперь собе, што бы то за справа, або якый бы чинъ былъ, почавши о навращеніи языков говорити, откинутися и о иншую речь стати выписовати. Иншая бо речь ест навращеніе языков къ Богу, а иншая – съшествіе Христово въ адъ. Лечь того обычая Духъ Святый не имаеть, абы тако речь одну з другою мешалъ. Прото и тотъ псаломъ, яко исперва о всей земли сведчити почалъ, иже ест Господня, се естъ, иже вси живушчіи на земли мели познати Бога, тако и на конци напоминаеть царей, абы взяли а отомкнули врата вечная Царю Славы, или Славному, то естъ Сыну Божіму и науце Его. Называеть пакъ вечными вороты, твердость поганъ, у которой от веков пребываючи, Бога знати не хотели, а яко бы ся пред Нимъ замыкали. Потому жь и на ином месте знойдеши написано: «И ныне, царие, разумейте, накажитеся вси судяшчие земли. Работайте Господеви съ страхомъ» и прочая.

Оже маешь правый того Писаніа розумъ, которое посполите приводять къ оутверженіи съшествіа Христова душею въ адъ. А што ся Дамаскина дотычеть, той понеже не только в том мылилъся, але и в многых иншихъ речах, прото ненадобе на его писаніе дбати.

**ПЫТАНЬЕ**

Какъ же розумети маю о томъ слове у «Зложеніи Апостольскомъ»: надобно ли естъ чи ли не?

**ОТКАЗЪ**

Я тако о томъ розумею, иже у которих церквахъ исперва ешче того слова не былъ обычай говорити у святомъ символе, абы и теперь без него говорили. А которие церкви сее слово здавна мели, абы и тепер его вживали, але того потреба, абы ся не о таковом съшествіи, яковое мнихи выдумали, розумело.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко жь Христос въ адъ зышолъ? Або што ест «сънити въ адъ»?

**ОТКАЗЪ**

Снити въ адъ ест гневъ Божий почути и страховъ адовых оукусити. Яко в псалме написано: «Одержаша мя болезни смертные, и потоци безаконіа смутиша мя. Болезни адовы обыдоша мя, предвариша мя сети смертныя» (Псалом 18). Прото где о Христе исповедуемъ, иже въ адъ снииде, розумеется, иже гневъ Божий напротивъ грехомъ нашимъ, которие на Собе носилъ, почуялъ.

псальм пачынае: «Госпадава зямля і ўсё, што напаўняе яе, сусьвет ды ўсё, што жыве ў ім» і так далей (Пс. 23). Тут, як бачыш, Дух Сьвяты гаворыць не пра зыходжаньне Сына Божага ў пекла, але сьведчыць, што ўся зямля – Госпадава. Таксама Дух Сьвяты абвяшчае, што ня толькі зямля Юдэйская, але і ўсе народы спазнаюць Бога, каб ізраэльцы не хваліліся, што толькі пасярод іх быў Храм Божы. Бо калі ўся зямля Госпадава, то і ўсе народы, або пагане, да Бога навернуцца.

Разваж цяпер сам: што б гэта была за справа або што б гэта быў за такі звычай, пачаўшы казаць пра навяртаньне народаў, тое прэч адкінуць ды пра іншыя справы гаворку павесьці? Адна бо справа – навяртаньне народаў да Бога, зусім іншая – зыходжаньне Хрыста ў пекла. Да таго ж Дух Сьвяты ня мае такога звычаю адну справу з другой блытаць. Таму і псальм, з самага пачатку засьведчыўшы, што ўся зямля – Госпадава, гэта значыць, што кожны, хто жыве на зямлі, Бога спазнае, тым жа звычаем і напрыканцы нагадвае валадарам, каб узялі ды адчынілі брамы вечныя перад Валадаром Славы, або Праслаўленым, — значыць, перад Сынам Божым ды перад навукай Ягонай. «Спрадвечнымі брамамі» названая тут упартасьць паганаў, у якой спрадвек трываючы, ня хочуць Бога спазнаць ды нібыта перад Ім зачыняюцца. Таму і ў іншым мейсцы напісана: «Дык апамятайцеся, валадары, зразумейце перасьцярогу, судзьдзі зямныя! Служыце Госпаду са страхам» ды гэтак далей.

Вось ужо і маеш праўдзівае разуменьне тых Пісаньняў, якія ўсе звычайна прыводзяць, каб сьцьвердзіць, што душа Хрыста зыходзіла ў пекла. А што датычыцца Дамаскіна, то ён ня толькі ў гэтым, але і ў многіх іншых рэчах памыляўся, дзеля таго і нявартa зьвяртаць увагі на ягоныя цьверджаньні.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як жа належыць мне ставіцца да гэтага слова ў «Апостальскім вызнаньні»: ці патрэбна яно ці не?

**АДКАЗ**

Я на гэты конт так мяркую: калі ў нейкіх цэрквах спрадвек не было звычаю казаць гэтае слова ў сьвятым «Сымбалі», то няхай і цяпер яго ня кажуць. Калі нейкія цэрквы здаўна маюць гэтае слова ў вызнаньні, няхай і зараз яго гавораць, але няхай не мяркуюць пра тое зыходжаньне так, як манахі павыдумлялі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як жа Хрыстос у пекла зыйшоў, або што азначае «зыйсьці ў пекла»?

**АДКАЗ**

Зыйсьці ў пекла – значыць гнеў Божы адчуць ды страхі пякельныя зьведаць, як у псальме напісана: «Агарнулі мяне хвалі сьмерці, і віры небясьпечныя стрывожылі мяне. Путы пякельныя аплялі мяне, душаць мяне сьмяротныя петлі» (Пс. 18). Таму, калі мы вызнаём, што Хрыстос зыйшоў у пекла, гэта значыць, што Ён адчуў на Сабе гнеў Божы дзеля нашых грахоў.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми причину того гневу Божіего, для чого и Христос утерпелъ?

**ОТКАЗЪ**

Для нас, абы мы свободни от гнева Божіа были. Ставилъся бо Христос предъ суд Божій страшный, где великий гневъ позналъ, тако иже къ Отцу голосомъ великимъ оные слова възопилъ: «Боже Мой, Боже Мой, въ что Мя еси оставилъ?» (Марк 15: 22-41)

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми тое, понеже Христос яко тепер, тако и на онъ час, не только былъ человекъ, але и Богъ, како на Него тые страхы пріити могли?

**ОТКАЗЪ**

Апостолъ на тое отказуеть сими словы: «Христос, въ зраце Божіемъ Сый, невъсхищеніем непшчева быти равенъ Богу, но Себе изліа зрак раба пріемъ» (Филип. 2: 5-10). Где рече, яко Христос Себе излиялъ, даеть знати, иже тогда не хотелъ на час вельможіа Своего вживати, ани оказовати, але въ всемъ былъ намъ подобенъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Опустивши тое, навернемся къ розберанью иного слова.

**ОТКАЗЪ**

За вызнаньемъ смерти Сына Божіа, исповедуемъ Его из мертвыхъ въскресеніе, яко въ третій день силою Божества Своего ожилъ и всталъ, потому, яко светіи Пророци о Нимъ писали.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для не за того жь, але аже въ третій день Христос из мертвых въскресъ?

**ОТКАЗЪ**

Не Себе для, яко бы не могъ того жь часу въскреснути, але для нас и для упевненья нашое веры. Бо если бы того жь часу Господь ожилъ, инши бы розумелъ, иже бы и не былъ оумеръ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што намъ за пожитки принесло въскресеніе Христово?

**ОТКАЗЪ**

Многые пожитки, а наболе сие, напервей иже певни есмо силы Его против смерти, понеже не могла Его оудержати, и нас не оудержить, коли едино с Нимъ будемъ. Той бо, яко Церкви Его поеть, смертію смерть попра, или потопталъ. Леч не иначе потопталъ, хыба иже от мертвыхъ всталъ, и оттоле намъ справедливость пришла.

Другый пожитокъ, иже взоръ а просте яки заклад нашого въскресеніа и вечного живота маемъ. Бо если Христос ожил, и мы оживемъ.

**ПЫТАНЬНЕ**

Растлумач мне прычыну гэтага гневу Божага: дзеля чаго Хрыстос яго зьведаў?

**АДКАЗ**

Дзеля нас, каб мы былі вольныя ад гневу Божага. Прадстаў бо Хрыстос перад Божым судом, дзе зьведаў такі вялікі гнеў, што да Айца моцным голасам усклікнуў: «Божа Мой, Божа Мой, чаму Мяне пакінуў?» (Мк. 15: 34)

**ПЫТАНЬНЕ**

Скажы мне: калі Хрыстос як цяпер, так і тады быў ня толькі чалавекам, але і Богам, то як на Яго маглі прыйсьці тыя страхі?

**АДКАЗ**

Апостал на гэта адказвае ў такія словы: «Маючы постаць Божую, не лічыў Сваім здабыткам роўнасьць з Богам, але панізіў Сябе Самога, прыймаючы постаць слугі» (Флп. 2: 6-7). Дзе сказана, што Хрыстос панізіў Сябе Самога, гэта значыць, што Хрыстос не хацеў на той час Сваю веліч скарыстаць або паказаць, але ва ўсім стаўся падобны да нас.

**ПЫТАНЬНЕ**

Пакінуўшы гэта, вернемся да тлумачэньня іншага слова.

**АДКАЗ**

Пасьля вызнаньня сьмерці Сына Божага мы вызнаём Яго ўваскрасеньне з памерлых, што на трэці дзень моцаю Боскасьці Сваёй Ён ажыў і паўстаў паводле таго, як пісалі пра Яго сьвятыя Прарокі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго не адразу, але толькі на трэці дзень Хрыстос уваскрос з памерлых?

**АДКАЗ**

Не дзеля Сябе Самога, бо Ён мог уваскрэснуць адразу, але дзеля нас ды дзеля ўзмацненьня нашай веры. Бо калі б адразу ўваскрос наш Госпад, то некаторыя б меркавалі, што Ён і не паміраў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якія здабыткі прынесла ўваскрасеньне Хрыста?

**АДКАЗ**

Шматлікія здабыткі, перадусім вось гэтыя: мы пэўныя, што Хрыстос дужэйшы за сьмерць, бо паколькі сьмерць Яго не ўтрымала, то і нас не ўтрымае, калі мы будзем зь Ім адно. Ён бо, як Царква Ягоная сьпявае, сьмерцю сьмерць перамог або скрышыў. Ды не інакш яе скрышыў, як зь мёртвых паўстаўшы, і з гэтага нам апраўданьне прыйшло.

Другі здабытак у тым, што мы маем узор ды проста заруку нашага

Третій пожитокъ, ижь паметаючи на Христово от смерти въскресеніе, и мы от вины смерти, се ест от хреховъ къ новому животу въставаемъ. О том Апостолъ тако пишеть: «Яко же въста Христос от мертвыхъ славою Отчею, тако и мы въ обновленіи жизни ходити начнемъ» (Рим. 6: 3-10).

**ПЫТАНЬЕ**

Што потом «Гасло, или Зложенье вери» описуеть?

**ОТКАЗЪ**

Въшествие или възнесеніе Христово на небеса.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко о томъ възнесеніи держишь? Тако ли Христос на небеса възнесеся, иже потомъ Его зде на земли нет?

**ОТКАЗЪ**

Особою Своею отшолъ от нас на небо Христос, и вже Его особы телесное нетъ зде. Бо доконавши всего, што былъ от Отца принялъ, и все съвершивши, чого спасеніе нашое потребовало, не было потребы должей Ему межи нами пребывати.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино вже межи нами нетъ Господа нашого?

**ОТКАЗЪ**

Естъ и всегда будеть, яко Самъ вже идучи в небо, рече: «Се Азъ с вами есмъ въ вся дни до скончанія века» (Матф. 28: 16-20). Нежели тое Его бытье не естъ телесное, але духовное. То естъ, теломъ естъ теперъ тольки на небесех, але духомъ везде естъ, яко истинный Богъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што нам за пожитокъ възнесеніа Христова?

**ОТКАЗЪ**

Двой пожитокъ с того маемъ. Первый, яко вже певніи есмо того, иже намъ дорога в небо оуготована, и мешканье. Бо тако Сам Христос поведелъ: «Иду оуготовати вамъ место, и ашче иду оуготовати вамъ место, паки пріду и пойму вы къ Себе, да иде же есмъ Азъ и вы будете» (Іоан 14: 1-10).

Другый пожитокъ, яко вже Ходотая и Заступника маемъ пред лицомъ Божіемъ – Господа нашого Ісуса Христа.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся розумееть, што потом исповедуем се естъ: «Седяшча одесную Отца»? Какова се десница у Бога и како Христос седить?

**ОТКАЗЪ**

Десници Богъ не маеть, яко и всехъ иных удовъ, понеже ест духъ, нижли и Святое Писмо часто тымъ обычаем о Бозе говорить, яко бы

ўваскрасеньня і вечнага жыцьця, бо калі Хрыстос ажыў, то і мы ажывем. Трэці здабытак у тым, што мы, памятаючы пра ўваскрасеньне Хрыста з памерлых, і самі паўстаём ад асуджэньня на сьмерць, значыць, ад грахоў, да новага жыцьця. Пра гэта Апостал так піша: «Як Хрыстос быў уваскрошаны з памерлых славаю Айца, так і мы пачалі жыць абноўленым жыцьцём» (Рым. 6: 4).

**ПЫТАНЬНЕ**

Пра што потым «Пароль, або Вызнаньне веры» кажа?

**АДКАЗ**

Пра ўзыходжаньне або пра ўзьнясеньне Хрыста на неба.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што пра тое ўзьнясеньне мяркуеш: хіба пасьля ўзыходжаньня Хрыста на неба Яго ўжо тут, на зямлі, няма?

**АДКАЗ**

Целам Хрыстос узыйшоў ад нас на неба, і ўжо няма Яго тут у выглядзе цялесным. Бо выканаўшы ўсё, што ад Айца прыняў, і зрабіўшы ўсё, што патрабавала нашае збаўленьне, ня меў Ён больш патрэбы даўжэй пасярод нас заставацца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дык ужо няма пасярод нас Госпада нашага?

**АДКАЗ**

Ёсьць і заўсёды будзе, як Сам, ужо ўзыходзячы на неба, сказаў: «І вось Я з вамі ўсе дні аж да канца сьвету» (Мц. 28: 20). Але ж тое Ягонае быцьцё не цялеснае, але духоўнае, значыць, целам Ён цяпер толькі на небе, але духам, як сапраўдны Бог, ёсьць паўсюль.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што нам за здабытак з узьнясеньня Хрыста?

**АДКАЗ**

Два здабыткі з гэтага маем. Першы здабытак – нашая пэўнасьць у тым, што дарога ў неба нам ўжо адкрыта і мейсца падрыхтавана, бо так Сам Хрыстос казаў: «Іду прыгатаваць вам мейсца, і калі адыйду і прыгатую вам мейсца, зноў прыйду і прыйму вас да Сябе, каб і вы былі там, дзе Я буду» (Ян 14: 2).

Другі здабытак у тым, што мы ўжо маем перад абліччам Божым Пасярэдніка ды Заступніка – нашага Госпада Ісуса Хрыста.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як разумець тое, што мы потым вызнаём: «І сядзіць праваруч Айца»? Што гэта за правіца ў Бога і дзе гэта Хрыстос сядзіць?

**АДКАЗ**

Правіцы ў Бога няма, як няма і ўсіх іншых частак цела, бо Ён – Дух. Аднак Сьвятое Пісьмо часта гаворыць пра Бога тым звычаем, як быц-

мелъ человеческіе оуды или члонки, абы есмо потому лепшей и снадней вырозумети могли. Яко коли нас Писмо упоменути и наоучити хочеть, абы есмо верили, яко ся пред Богомъ утаити нельзя, причитаеть Богу очи. А если нам за таковогo, Бога указати хочеть, котори бы рад просяшчих выслухалъ, приписуеть Ему уши.

Тым же обычаем зде, хотечи ознаимити, яко Христос всякою славою и властию от Бога подарованъ и Господемъ всякому створенью учиненъ, кажеть о Ним «Зложенье веры», яко одесную Отца седить. Тако бо межи людей, наболей у пановъ великих бывает, оных по правой руце сажають, которих собе ровными быти знають, або естли кому свой уряд полецають. Прото где о Христе яко одесную Бога Отца седить исповедуемъ, тако розумеемъ, иже естъ яко еси вже поведелъ, Господаром и Богомъ всей твари.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для такъ просто о Христе не кажеть «Гасло», иже ест Господь и Богъ всей твари?

**ОТКАЗЪ**

Гасло иже ест от Светого Писаніа събрано, прото тыми жь словы ест пописано, которими ся тамо найдуеть. То пакъ сее слово ест прибрано от псалма Давидова, где тако пишеть: «Рече Господь Господеви моему: “Седи одесную Мне”».

**ПЫТАНЬЕ**

Опять, яко маем розумети, где исповедуемъ, иже Христос паки пріидеть въ славе судити живым и мертвымъ? Естли бо судъ Христовъ не будеть, ажь по скончаніи света, што жь тогда за живіи будуть? Наболей иже Апостолъ пишеть, яко всем человеком уставлено единою умрети, потом суду быти (Евр. 9).

**ОТКАЗЪ**

Неціи черезъ живые благочестивых, а через мертвые незбожныхъ розумеют, але Апостолъ право живыхъ розумееть, которих судный день в теле застанеть, а мертвыми оных зоветь, которіи до того часу помрють. Тако бо къ Солуняном пишеть: «Се глаголемъ словесемъ Господнимъ, яко мы живы сушче и лишени въ пришествіе Господне, не имам постигнути оумерши, яко Самъ Господь въ повеленіи, и въ гласе архаггелеве, и въ трубе Божій снидеть съ небесе и мертвіи о Христе въскреснуть преже, потом же и мы живіи и лишени купно с Нимъ въсхитимся на облацехъ» (1 Сол. 4:13-18).

**ПЫТАНЬЕ**

Вижю и розумею, што – мертвіи, а што – живіи, але ешче не вижю, яко сее слово згодится з онымъ, которое вже привелъ есмъ от того жь Апостола. Бо зде пишеть, яко они, которих день судный заста-

цам бы Ён мае чалавечае цела, гэта дзеля таго, каб нам было лепш і прасьцей зразумець. Напрыклад, калі Пісьмо хоча нам нагадаць ды нас навучыць, каб мы верылі, што перад Богам нельга схавацца, тады яно кажа, што Бог мае вочы; калі ж яно хоча паказаць нам такога Бога, Які з радасьцю выслухае тых, хто просіць, тады кажа, што Бог мае вушы.

Тым жа звычаем і тут Пісьмо абвяшчае, што Бог даў Хрысту усю славу і ўладу ды ўчыніў Яго Госпадам усякага стварэньня, таму «Вызнаньне веры» пра Яго кажа, што Ён сядзіць праваруч Айца. Так бо бывае пасярод людзей, перадусім пасярод вялікіх паноў: праваруч садзяць таго, каго лічаць сабе роўным, або таго, каму сваю ўладу перадаюць. Таму калі мы вызнаём пра Хрыста, што Ён сядзіць праваруч Бога Айца, гэта азначае, што Ён, як ужо вышэй я казаў, Госпад і Бог усякага стварэньня.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго «Вызнаньне» так проста пра Хрыста ня кажа, што Ён – Госпад і Бог усякага стварэньня?

**АДКАЗ**

Вызнаньне веры складзена паводле Сьвятога Пісьма, таму напісана ў тыя ж словы, што былі ў Сьвятым Пісьме. Гэтыя ж словы ўзятыя з псальму Давіда, дзе ён так піша: «Сказаў Госпад Госпаду майму: “Сядзі праваруч Мяне”».

**ПЫТАНЬНЕ**

Зноў жа, як мусім разумець тое вызнаньне, што Хрыстос прыйдзе ў славе судзіць жывых ды памерлых? Калі суд Хрыстовы будзе пасьля канцу сьвету, хто ж тады будзе жывы? Тым больш і Апостал піша, што спачатку ўсім людзям пастаноўлена памерці, а потым будзе суд (Гебр. 9).

**АДКАЗ**

Некаторыя мяркуюць, што жывыя – гэта справядлівыя, а мёртвыя – грэшнікі, але Апостал насамрэч кажа, што жывыя – гэта тыя, каго судны дзень у целе застане, а мёртвымі Ён заве тых, што да таго часу памруць, так бо да Салунянаў піша: «Гэта вось кажам вам словам Госпадавым, што мы, якія жывём і пакінутыя да прыходу Госпада, не папярэдзім тых, што паўміралі. Бо Сам Госпад на загад і на голас арханёла ды на гук трубы Божай зыйдзе зь неба, і памерлыя ў Хрысьце ўваскрэснуць першымі. Потым мы, жывыя і пакінутыя, разам зь імі будзем паднятыя ў паветра на аблоках на спатканьне Хрыста» (1 Тэс. 4: 15-17).

**ПЫТАНЬНЕ**

Бачу і разумею, што значыць «мёртвыя» і «жывыя», але яшчэ ня бачу, як гэта згаджаецца з прыведзеным словам Апостала. Бо ён тут піша, што тыя, на якіх прыйдзе судны дзень, «паднятыя будуць у паветра на аблоках на спатканьне Госпада ды так назаўсёды з Госпадам будуць». Калі яны з Госпадам будуць, то не памруць, як жа споўніцца

неть, въсхишчени будуть на облаки въ стретеніе Господне на въздусе, и тако всегда съ Господемъ будуть. Если съ Господемъ будут, ино не умрють, какъ же ся исполнить оное слово: «Оуставлено или лежить человеку единою умрети»? (Евр. 9: 24-28)

**ОТКАЗЪ**

На тое пытанье сам же Апостолъ въ первом посланіи къ Коринфом отказуеть сими словы: «Се же тайну вамъ глаголю: вси убо не оусъпнемъ, вси же изменимся в непресечени, въ мгновеніи ока, в последней трубе» (1 Кор. 15: 47-57). Где кажеть Апостолъ, иже вси изменимся, даеть знати, иже и они, которих день судный застанеть, помруть. Але ижь опять вельми скоро, яко окомъ скинути можеть, оживуть, того для смертію не зоветь, но измененіемъ. А што рече: «Не оусъпнемъ», тое для того приложилъ, иже они, которих день Господень живых найдеть, хотя жь умрют, але иже въ мгненіи ока оживут, не усъпнуть. Се ест, не будуть потому у гробехъ лежати, яко которіи тепер умерають.

**ПЫТАНЬЕ**

Яковъ нам той день будеть: страшен ли, чи веселъ?

**ОТКАЗЪ**

Не можна речь, абы тогды страх великъ на люди пріити не мелъ, егда и земля, и небеса, и вси небесные силы порушатся. Нижли таковые страхы не на благочестивых, но на грешных а нечестивыхъ Богъ пустить, которіи теперь Бога не боятся и о заповеди Его не дбають. Тіи на тотъ час страх великъ пріимутъ.

Опять благоверніи, которіи зде от неверных всяку обиду терпять, розрадуются. Яко и Христос повелеваеть, где рече: «Начинаюшчим же симъ въсклонитеся и въздвигнете главы ваша, яко приближися избавленіе ваше» (Лука 21:12-27). Велить въздвигнути главы, се ест радоватися, веруюшчим. Кто бо наклонивши голову ходить или седить, знати иже смутенъ ест. Опять, кто веселъ, той к горе голову держить.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко маемъ оного дня ожидати?

**ОТКАЗЪ**

Не маем ся опушчати, ани в недбалость или в прожнованье удати, але съ страхомъ и трепетом по Апостолу спасеніе свое съдевати, безпрестанно ся молити, животъ побожный и тверезъ жити, от лихоимства ся блюсти, милостину потребнымъ давати и во всех справахъ спасеніе свое и день остаточный паметовати (Филип 2). Тако бо Сам Христос оучит нас того дня ожидати: «Вънемлете собе да некогда отягчают сердца вашя обядениемъ и пианьством и печаль-

тады тое Слова, што пастаноўлена кожнаму чалавеку памерці? (Гебр. 9: 27)

**АДКАЗ**

На гэта пытаньне сам жа Апостал адказвае ў першым лісьце да Карынцянаў у такія словы: «Вось, абвяшчаю вам тайну: ня ўсе памром, але ўсе будзем перамененыя, адразу, імгненна, на гук апошняй трубы» (1 Кар. 15: 51-52). Калі гаворыць Апостал, што ўсе будзем перамененыя, дае нам знаць, што памруць і тыя, на якіх судны дзень прыйдзе, але зноў вельмі хутка, як вокам кінуць, ажывуць, таму і называе ён гэта ня сьмерцю, але перамяненьнем. А што сказаў: «Не памром», гэта таму далучыў, што тыя, якіх Госпад жывымі знойдзе, хоць і памруць, але ў імгненьне вока ажывуць. Значыць, ня будуць ляжаць у магіле як тыя, што цяпер паміраюць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Які нам той дзень будзе: страшны ці радасны?

**АДКАЗ**

Не магчыма, каб не прыйшоў на людзей вялікі страх тады, калі і зямля, і неба, і ўсе нябесныя сілы зрушацца. Але Бог пусьціць гэтыя страхі не на справядлівых, а на грэшных ды бязбожных, якія цяпер Бога не баяцца ды пра Ягоныя прыказаньні ня дбаюць. Вялікі страх прыйдзе на іх у той час.

Зноў жа, справядлівыя, што ад грэшнікаў тут усялякія крыўды церпяць, усьцешацца, як і Хрыстос загадвае, кажучы: «А калі гэта дзеяцца пачне, углядайцеся і падымайце галовы вашыя, бо набліжаецца адкупленьне вашае» (Лк. 21: 28). Загадвае Ён тут веруючым падняць галовы, значыць, радавацца. Хто бо ходзіць ці сядзіць, галаву схіліўшы, той засмучаны; зноў жа, хто вясёлы, той высока галаву трымае.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як маем на гэты дзень чакаць?

**АДКАЗ**

Ня маем нядбальстваваць ці ленавацца, але са страхам і дрыжаньнем, паводле Апостала, маем пра сваё збаўленьне клапаціцца (Флп. 2), заўсёды маліцца, жыцьцё пабожнае ды цьвярозае весьці, ліхвярства ўнікаць, міласьціну тым, хто ў патрэбе, даваць ды ў-ва ўсіх справах на сваё збаўленьне ды на судны дзень памятаць. Так бо Сам Хрыстос вучыць нас на гэты дзень чакаць: «Сьцеражыцеся, каб часам не абцяжарылі сэрцы вашыя абжорствам і п'янствам, ды клопатам гэтага жыцьця і каб дзень гэты не прыйшоў на вас зьнянацку. Бо ён, як сетка, спадзе на ўсіх, што жывуць на абліччы ўсёй зямлі. Дык чувайце, молячыся ўвесь час, каб былі вартымі ўсьцерагчыся ўсяго гэтага, што мае прыйсьці, ды каб маглі стаць перад Сынам Чалавечым» (Лк. 21: 34-36).

Тым жа звычаем сьвяты Апостал вучыць нас чакаць на гэты дзень, калі да Ціта так піша: «Зьявілася бо ласка Бога, збаўляючы ўсіх лю-

ми житейскими, и найдеть на вы внезаапу день той. Яко сеть бо пріидеть на вся седяшчаа на лици всея земля, бдите убо на всяко время моляшчеся, да сподобитеся оубежати, всех сих хотяшчіих быти и стати пред Сыном Человеческімъ» (Лука 21: 28-36).

На тот же обычай и святый Апостолъ ожидати оного часу учить, где к Тіту тако пишеть: «Просветися благодать Божіа спасительнаа всем человеком, наказаюшче нас да отвергшеся нечестіа и мирских похотей, целомудрно и благоверно поживемъ въ нынешънемъ веце чаюшче (ожидаючи) блаженънаго оупованіа и явленіа славы великаго Бога и Спаса нашего Ісус Христа, иже дасть Себе за нас, да избавить насъ от всякого безаконіа, очистить собе людъ избраны ревнителя добрым деломъ» (Тит. 2: 11-15) и прочая.

Видишь, яко Святое Писмо пришествіа на суд Христова ждати наоучаеть. А не только на сих местех, але и на иных многыхъ. Которие бы вси христіане повинни на каждый час на доброй памяти мети и водле того живот свой справовати. Лечь ся тепер далеко инакъ находить, тако люди живут на сим свете, яко бы николи умрети не мели, або оумерши яко бы на суде Божіемъ станути не мусили. На тое вже вышло, што Сам Господь о остаточном часе поведети сими словы рачилъ: «Оумножится безаконіе, изсякнеть любовъ многых, претерпевый же до конца той спасется» (Матф. 24: 3-13).

Потому же и Апостолъ къ Тимофею пишеть: «Се же вежь, яко въ последная времена настанут времена люта. Будуть бо человеци самолюбци, сребролюбци, оплазиви, горди, хулници, родителем противляшчеся, неблагодарни, непреподобни, нелюбиви, неветохранители, продерзливи, прелогатае, невъздержници, некротци, не боголюбци, предателе, нагли, възносливы, сластолюбци, нежели боголюбци, имушче образъ благочестіа, силы же его отвергъшеся» (2 Тім. 3: 1-9). Страшные речи зде вычитаеть Апостолъ, а предся теперешного часу находятся в людехъ без мала не вси. Прото каждый побожный з великою пилностію мает ся стеречи, дабы у таковыхъ гресех день Господень его не знашолъ. Нам бо Господь рече: «Бдите, яко не весте въ кый час Господь вашь пріидеть» (Матф. 24: 41-51).

Але вже въ третей части святого «Символа».

**ПЫТАНЬЕ**

О чом естъ третяя часть зложеноя веры?

**ОТКАЗЪ**

О третіемъ лицу Божества, се ест о Святом Духу.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко исповедуемъ Святого Духа, говори?

**ОТКАЗЪ**

«Верую и въ Духа Святого истиннаго, животворяшчаго, иже от Отца исходяшчаго, иже съ Отцом и Сыном спокланяема и славима, глаголавшаго пророкы».

дзей, якая вучыць нас, каб мы, выракшыся бязбожнасьці і пажаданьняў сьвету, разважна, справядліва і пабожна жылі на гэтым сьвеце, чакаючы шчасьлівай надзеі і прыйсьця хвалы магутнага Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, Які ахвяраваў Самога Сябе за нас, каб збавіць нас ад усякай спакусы і ачысьціць Сабе народ, выбраны на ўласнасьць, рупны пра добрыя ўчынкі» і так далей (Ціт. 2: 11-12).

Бачыш, ня толькі ў гэтых мейсцах, але і ў многіх іншых Сьвятое Пісьмо вучыць нас, як маем чакаць прыйсьця на Суд Хрыстовы. Усе хрысьціяне павінны кожны час на гэтыя словы добра памятаць ды паводле іх жыць. Гэтага зараз і блізка няма: людзі так жывуць на гэтым сьвеце, як быццам ніколі ня маюць памерці або, памершы, ня мусілі б стаць на Судзе Божым. Дайшло да таго, што Сам Госпад пра апошні час у такія словы распавядаў: «І таму, што ўзрасьце нягоднасьць, астыне любоў у многіх. Але хто вытрымае да канца, той будзе збаўлены» (Мц. 24: 12-13).

Гэтаксама і Апостал да Цімафея піша: «Гэта ведай, што ў апошнія дні настануць небясьпечныя часы. Людзі будуць самалюбныя, хцівыя, ганарыстыя, саманадзейныя, зламоўныя, непаслухмяныя бацькам, няўдзячныя, нягодныя, бессардэчныя, няўстрыманыя, злачынцы, неапанаваныя, жорсткія, непрыхільныя, здраднікі, нахабныя, пыхлівыя, раскошу любячыя больш, чым Бога, маючыя выгляд пабожнасьці, моцы ж Яго выракшыся» (2 Цім. 3: 1-5). Страшныя рэчы пералічвае тут Апостал, аднак за малым усе яны знойдуцца зараз пасярод людзей.

Дзеля гэтага кожны пабожны зь вялікай пільнасьцю мае сьцерагчыся, каб не аказацца ў гэтых грахах, калі прыйдзе дзень Госпада. Нам бо Госпад сказаў: «Дык чувайце, бо ня ведаеце, у якую пару прыйдзе Госпад ваш» (Мц. 24: 42).

Але ўжо разгледзім трэцюю частку сьвятога «Сымбалю».

**ПЫТАНЬНЕ**

Пра што кажа трэцяя частка «Вызнаньня веры»?

**АДКАЗ**

Пра трэцюю асобу Боства, значыць, пра Сьвятога Духа.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары, як мы вызнаём Духа Сьвятога.

**АДКАЗ**

«Веру ў Духа Сьвятога, праўдзівага і жыватворнага, Які ад Айца паходзіць, Які супольна з Айцом і Сынам прыймае пакланеньне і хвалу, Які прамаўляў праз пракокаў».

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці можа Пісьмо Сьвятое паказаць, што Дух Сьвяты ёсьць Богам праўдзівым?

**АДКАЗ**

Можа, і такім чынам зрабілі епіскапы, паўстаўшы супраць Македонія, які блюзьніў на Духа Сьвятога.

**ПЫТАНЬЕ**

Может ли ся Святымъ Писмом показати, иже Духъ Святый естъ Богъ истинный?

**ОТКАЗЪ**

Можеть, и тако оучинили Епископи противу Македоніа духоборца.

**ПЫТАНЬЕ**

Которими Писмы довели того?

**ОТКАЗЪ**

Полно естъ о том и долго бы было, если бы кто вся приводити хотелъ. Я накоротце колько местъ укажю. Напервей Мойсей о Духу Святымъ тако пишеть: «Дух Божій ношаашеся по верху воды» (Быт. 1). Ясное есть в тых словех о Божестве Святого Духа сведество, але бы ешче яснейшое было, если бы тако преведено, яко в книгах еврейских Мойсей написалъ. Бо што мы у своих преводех маемъ: «Дух Божій ношашеся по верху воды» или «водъ», еврейские книги мають: «Дух Божій съгревалъ воды», то естъ давалъ силу водам, абы животъ некій мели в собе. На тотъ обычай святый Василей сее место толкуеть (чти «Шестодневец» и Златаоустаго в Бытію) ачколве неціи иначе выкладають. Лечь сам Мойсей даеть знати, иже не о простом духу пишеть. Не рече бо просто: «Дух ношашеся», але: «Дух Божій ношаашеся по верху водъ».

На тое паметуючи Царь и Пророк Давыд рече: «Словесемъ Господнем небеса утвердишася, и духом уст Его вся сила их» (Псалом 32). Іоиль о Духу Святым тако пишеть: «И будеть по семъ, излію от Духа Моего на всю плоть, и прорекуть сынове ваши и дшчери ваша, и старци ваши сны узрят, и юноши ваша виденіа оувидять. Ибо на рабы Моя и на рабиня Моя въ дни тыи възлею от Духа Моего» (Іоиль 2). Полно естъ таковыхъ сведествъ в пророцех, а ешче достаточнейшие суть сведества оу писме Нового Завета. Яко где Христос посылаючи Апостолы на вес светъ, повелеваеть имъ крестити въ имя Отца и Сына и Духа Святого (Матф. 28:16-20). Если бы Духъ Святый не былъ Творецъ, никако бы Его Сынъ Божій озле Себе и Отца не клалъ, ани бы Его при тако великой святого крешченіа тайни призывати велелъ.

При крешчени теже Христовом явне ся показало, яко Духъ Святый Богъ естъ, а предся иншій нежели Богъ Отецъ. Выписуют бо святіи евангелисти, яко Духъ Святый пришолъ на Христа в образе голуба, а опричь пишуть о Отци, яко въпилъ: «Сей естъ Сынъ Мой възлюбленный о Немъ же благоизволих» (Матф. 3:13-17). Петрь теже Апостолъ ясно Духа Святого Богомъ зоветь. Обличаючи бо Ананію о ложь, тако говорить: «Ананіе, почто исполни сатана сердце твое сългати Духу Святому, утаити от цены села, не сушчее ли твое бе и продано въ твоей области было, что яко положи въ сердци своемъ вешчь сію? Не сългалъ есь человекомъ, но Богу» (Деан. 5: 1-11). Што первей поведелъ, иже Ананіа сългалъ Святому Духу, то у другое рече: «Богу есь солгалъ», ознаймуючи, яко Духъ Святый естъ истинный Богъ.

Естъ и на иных местех много сведествъ, яко Духъ Святый естъ Богъ и Творецъ, але на тотъ часъ опушчаю.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якімі Пісаньнямі гэта давялі?

**АДКАЗ**

Шмат ёсьць пра гэта ў Пісаньнях, і доўга, калі б хто захацеў, іх можна было ўсе прыводзіць. Я коратка некалькі мейсцаў пакажу. Перш Майсей пра Духа Сьвятога так піша: «А Дух Божы ўзносіўся над водамі» (Роду 1). У гэтых словах зьмешчана яснае сьведчаньне пра Боскасьць Святога Духу, але яно было б яшчэ большым, калі б было так перакладзена, як Майсей напісаў у кнігах гебрайскіх. Бо што мы маем у нашых перакладах: «А Дух Божы ўзносіўся над водамі», або: «над вадой», тое ў гебрайскіх кнігах інакш сказана: «Дух Божы саграваў воды», значыць, даваў водам моц мець у сабе жыцьцё. Такім вось звычаем тлумачыць гэтае мейсца сьвяты Васіль, хаця некаторыя інакш вучаць (чытай «Шэстадневец» і Златавуснага пра кнігу Роду). Аднак сам Майсей сьведчыць, што не пра звычайны дух піша, не сказаў бо ён проста: «Дух узносіўся», але: «Дух Божы ўзносіўся над водамі».

На гэта памятаючы, Валадар і Прарок Давід сказаў: «Словам Гоcпада створаны нябёсы і подыхам вуснаў Ягоных усе войскі іх» (Пс. 32). Ёэль пра Духа Сьвятога так піша: «І будзе ў апошнія дні, – кажа Бог,– вылью Духа Майго на кожнае цела; і будуць прарочыць сыны вашыя і дочкі вашыя, і юнакі вашыя будуць бачыць з'явы, і старыя вашыя будуць сьніць сны. І на нявольнікаў Маіх і на нявольніц вылью ў такія дні Духа Майго, і будуць прарочыць» (Ёэль 2). Шмат такіх сьведчаньняў ёсьць у Прарокаў, але яшчэ большыя сьведчаньні ёсьць у Пісаньнях Новага Запавету. Хрыстос, пасылаючы Апосталаў ісьці па ўсім сьвеце, загадвае ім хрысьціць у імя Айца, і Сына, і Духа Сьвятога (Мц. 28:19). Калі б Дух Сьвяты ня быў Творцам, то Сын Божы не ўзгадаў бы Яго побач з Сабой ды Айцом, ды не загадваў бы прызываць Яго падчас такой вялікай таямніцы сьвятога хрышчэньня.

Таксама пры хрышчэньні Хрыста было абвешчана, што Дух Сьвяты – Бог, хаця ж іншы, чым Бог Айцец. Распавядаюць сьвятыя Эвангелісты, што Дух Сьвяты зыйшоў на Хрыста ў выглядзе голуба, ды да таго ж пішуць пра Айца, што Ён усклікнуў: «Гэта Сын Мой умілаваны, Якога Я ўпадабаў Сабе» (Мц. 3: 17). Таксама апостал Пётр ясна называе Духа Сьвятога Богам. Выкрываючы бо хлусьню Ананіі, так ён гаворыць: «Ананія, чаму шатан напоўніў тваё сэрца падмануць Сьвятога Духа, каб схаваць частку атрыманых за поле грошаў? Дык чаму надумаў гэтакую рэч у сэрцы сваім? Ты ж схлусіў ня людзям, але Богу!» (Дзеі 5: 3-4) Перш сказаўшы, што Ананія схлусіў Духу Сьвятому, а потым далучыўшы, што Богу той схлусіў, Апостал абвясьціў, што Дух Сьвяты ёсьць сапраўдным Богам.

Ёсьць і ў іншых мейсцах шмат сьведчаньняў, што Дух Сьвяты – Бог і Творца, але іх зараз ня ўзгадваю.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для Духа Святого животворяшчемъ исповедуемъ?

**ОТКАЗЪ**

Того для иже той насъ въ всякую истину ведеть, от которое вечный животъ маем. Той же тежь неверие в нас губить, а верю укрепляеть, страх заганяеть, любов розжегаеть, а немного говорячи, вси речи от них же живот нам приходить, Духъ Святый в насъ и зачинаеть, и конаеть. Без Его помочи и Сына Божіа добродетельства причастники не бываемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Первей есь поведелъ, иже изъ смеръти Сына Божіа животъ маем, а тепер опять кажешь, иже от Духа Святого живот маемъ. Яко тое розумети маю?

**ОТКАЗЪ**

Правда естъ, ижь намъ Сынъ Божій грехом оставленіе, оправданіе и живот вечны уготовалъ, але мы тако есмо естества скажоного, ижь сами своею силою к тому прійти не можемъ, абы есмо въ Сына Божиего, яко Той ест спаситель нашь, верили, але аже нас Духъ Святый притягнеть, кааніе в нас порушивши и сердце осветивши. Прото Апостолъ пишеть, яко «никто можеть решчи Господа Ісуса, точию Духомъ Святымъ» (1 Кор. 11: 31-12: 6). Естли языком исповедати Господа не можем, далеко меншь сердцем веровати можемъ, або добрие дела чинити без Святого Духа пособленья.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори четвертую часть зложеніа веры.

**ОТКАЗЪ**

«Верую и едину святую, соборную апостольскую церковъ, исповедую едино крешченіе въ оставленіе грехомъ. Чаю въскресеніа мертвым, и жизнь будушчаго века, аминъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Што сее естъ церковъ?

**ОТКАЗЪ**

Церковъ ест събранье, або дружина верных людей, их же Богъ презрелъ в живот вечный.

**ПЫТАНЬЕ**

На котором месте ест святая церкоквъ?

**ОТКАЗЪ**

Церкви Христова не ест къ певному месту пришита, ани можеть быти ограничона. По всей бо земли розсыпалася, и тамо ест, где ся мы не надеемъ. Прото и Сам Господь не рече Апостолом: «Идите въ Антиохію или в Рим, поставите Ми церковъ», але рече: «Идите въ весь миръ проповедуйте Евангелие» (Матф. 28:1-20). А на другом месте

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго мы вызнаём, што Дух Сьвяты – жыватворца?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што Ён вядзе нас да кожнай праўды, зь якой мы маем жыцьцё вечнае. Ён няверства ў нашым сэрцы разбурае, а веру ўзмацняе, страх выганяе, любоў запальвае, ды, каб не гаварыць многа, усе рэчы, якія жыцьцё нам прыносяць, Дух Сьвяты ў нас пачынае і заканчвае. Безь Ягонай дапамогі мы ня можам стацца супольнікамі дабраславенстваў Сына Божага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Перш ты сказаў, што дзеля сьмерці Сына Божага маем жыцьцё, а зараз кажаш, што Дух Сьвяты дае нам жыцьцё. Як мушу гэта разумець?

**АДКАЗ**

Праўда, што Божы Сын заслужыў нам адпушчэньне грахоў, апраўданьне і жыцьцё вечнае. Але нашая прырода настолькі скажоная, што самі, сваёй моцай, мы ня можам прыйсці да веры, што Сын Божы – наш Збаўца, калі Дух Сьвяты нас да гэтага не прывядзе, пакаяньне ў нас узрушыўшы ды сэрца асьвяціўшы. Дзеля гэтага Апостал піша, што ніхто ня можа сказаць: «Ісус ёсьць Госпад як толькі Духам Сьвятым» (1 Кар. 12: 3). Калі языком вызнаць Госпада ня можам, нашмат меней можам верыць сэрцам або рабіць добрыя ўчынкі без дапамогі Сьвятога Духа.

**ПЫТАНЬНЕ**

Гавары чацьвёртую частку вызнаньня веры.

**АДКАЗ**

«Веру пра адзіную сьвятую паўсюдную апостальскую царкву, вызнаю адзіны хрост дзеля адпушчэньня грахоў. Чакаю ўваскрасеньня з памерлых і жыцьця вечнага. Амін».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што такое царква?

**АДКАЗ**

Царква – гэта збор або супольнасьць веруючых людзей, якім Бог прадугледзеў вечнае жыцьцё.

**ПЫТАНЬНЕ**

У якім мейсцы ёсьць сьвятая царква?

**АДКАЗ**

Царква Хрыстова не прывязана да пэўнага мейсца ды ня можа быць абмежавана. Па ўсёй бо зямлі яна пашырылася і там ёсьць, дзе мы і не спадзяемся яе знайсьці. Дзеля таго і Сам Госпад не сказаў Апосталам: «Ідзіце ў Антыёхію ці ў Рым ды пастаўце Мне Царкву», але сказаў:

тако поведелъ: «И де же бо еста двай или трие събрани въ имя Мое, ту есмъ посреде их» (Матф. 18:18-22).

**ПЫТАНЬЕ**

Види ми ся по отказу твоему, иже церковъ Христова естъ невидимая. Бо есь поведелъ, иже церков ест дружина веруюшчих, оных же Богъ къ спасенію прозрелъ. Мы пакъ людие вери видети не можемъ, а по тому же и кого Богъ къ спасенію или в животъ вечный прозрелъ ведати не можемъ?

**ОТКАЗЪ**

Церковъ мусить быти видимая. Бо если бы невидимая была, а яко бы ся оное слово Христово розумело где рече: «Ашче съгрешить к тобе брат твой, иди обличи его межю собою и темъ единем, ашче тебе послушаеть, приобрел есь брата твоего. Ашче ли тебе не послушаеть, пойми съ собою паки единаго или два, да при устехъ двою или трех сведетелей станеть всяк глаголъ. Ашче же не послушаеть их, повежь церкви» (Матф. 18: 1-9).

Понеже поведети пред церквію велить, мусить быти видимая. Бо если бы невидимая была, како ей казати кто можеть? И далей Христос там же поведаеть: «Ашче церкви не послушаеть, буди тобе яко язычник и мытарь». Зде опять видишь, иже церковъ обличаеть, и можеть ее кто хочеть послушати или не послушати. Прото видимая ест церковъ Христова.

Лечь предся и тое ведати потреба, иже отчасти ест невидимая. Бо ачколве церковъ ест з людей исповедуюшчих Христа събрана, але мнози межи нихъ суть лицемери, которіи только оусты Бога исповедують, а сердцомъ далече отстоять. Таковых трудно и право не можна речь познати, аже коли ся делы плотскими сами показують. Бо на позоръ ничимъ от благоверных не суть розныи. Безъ тых николи зде на земли церков быти не можеть (Матф. 13: 44-52). Тем бо и Христос наоуку Свою или церковъ приподобалъ сети или неводу, запушчоному в море и от всякого рода риб събравшу. И въ церкви бо будуть и добрие и злые, аже до скончення света, а тогда розлучатся.

Яко рече Господь: «Изыидуть аггели въ скончаніе века и отлучать злыя от среды праведныхъ, и въвергуть я въ пешчь огньную» (Матф. 13: 44-52). А в другой притчи поведелъ: «Оставите и плевелы и пшеницю расти обое купно до жавты и въ время жатвы реку жателемъ: “Съберете первей плевелы, и свяжете я въ снопы съжешчи я”». И толкуючи сее поведаеть: «Яко събирають плевелы и огнем съжигають я, тако будеть въ скончаніе века сего, послеть Сын Человеческій аггелы Своя, и съберуть вся съблазны от царствіа Его». Прото можемъ ныне Христовую церковъ видети, але ешче яко съ плевелы до жнива пшеницю, а яко в неводе рибы.

**ПЫТАНЬЕ**

По чомъ познати мочи правдивую Христову церковъ?

«Ідзіце па ўсяму сьвету і прапаведуйце Эвангельле» (Мц. 28:19), а ў іншым мейсцы Ён так гаварыў: «Бо дзе ў імя Маё сабяруцца двух або трох, там і Я пасярод іх» (Мц. 18: 20).

**ПЫТАНЬНЕ**

Здаецца мне, паводле твайго адказу, што царква Хрыстова нябачная. Бо ты сказаў, што царква – гэта супольнасьць веруючых, якім Бог прадугледзеў збаўленьне. Аднак мы, людзі, ня можам бачыць веру, а значыць, ня можам ведаць, каму Бог прадугледзеў збаўленьне або жыцьцё вечнае.

**АДКАЗ**

Царква мусіць быць бачнай. Бо калі б яна была нябачнай, як тады зразумець тыя словы Хрыста, калі Ён казаў: «Калі брат твой правініцца табе, ідзі і пасварыся на яго ў чатыры вокі. І калі б паслухаў цябе, здабудзеш брата твайго. А калі б цябе на паслухаў, вазьмі з сабой яшчэ аднаго або двух, каб усякае слова абапіралася на доказе двух або трох сьведкаў. А калі б і іх не паслухаў, скажы царкве» (Мц. 18:17).

Паколькі Хрыстос загадвае засьведчыць перад царквою, то мусіць царква быць бачнай. Бо калі царква нябачная, як хтосьці можа ёй нешта сказаць? І далей, там жа, Хрыстос гаворыць: «А калі б і царквы не паслухаў, хай будзе табе як паганін і мытнік». Тут зноў бачыш, што царква выкрывае, і кожны, хто хоча, можа яе паслухацца або не паслухацца. Дзеля гэтага царква Хрыстова бачная.

Аднак і тое патрэбна ведаць, што часткова яна нябачная. Бо хаця царква сабраная зь людзей, якія вызнаюць Хрыста, але многія сярод іх – крывадушнікі, якія толькі вуснамі вызнаюць Бога, а сэрцам ад Яго далёка. Такіх цяжка ды сапраўды немагчыма пазнаць, пакуль яны самі сябе не пакажуць у справах цялесных, бо на выгляд яны нічым не адрозьніваюцца ад багабойных. Заўсёды тут, на зямлі, такія ў царкве будуць. Хрыстос бо Сваю навуку або царкву параўнаў зь сеткай ці нератам, закінутым у мора, які выцягвае рыбы ўсякіх сартоў (Мц. 13: 47-58). Таксама і ў Царкве будуць і добрыя, і благія аж да сканчэньня сьвету, і толькі тады падзеляцца. Госпад бо сказаў: «Так будзе на канцы сьвету: выйдуць анёлы і вылучаць благіх пасярод справядлівых, ды ўкінуць іх у агністую печ» (Мц. 13: 49-50). А ў іншай прыповесьці Госпад казаў: «Дазвольце і кукалю, і пшаніцы расьці да жніва. А ў час жніва скажу жнеям: “Зьбярыце раней кукаль і зьвяжыце ў пучкі на спаленьне”». Ды, тлумачачы гэта, Ён гаворыць: «Як затым зьбіраюць кукаль ды ў агні паляць, так будзе пры канцы сьвету. Пашле Сын Чалавечы анёлаў Сваіх, і яны зьбяруць у Валадарстве Ягоным усе згаршэньні».

Дзеля гэтага можам зараз Царкву Хрыстову бачыць, але яшчэ як поле з кукалем да жніва пшаніцы ці як нерат з рыбамі ўсякіх сартоў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Паводле чаго можна пазнаць праўдзівую царкву Хрыстову?

**ОТКАЗЪ**

Неціи знаменуются по давности и по чину епископъ, иншіи – по местех, але тые знаки многых омыляютъ. Напевнейшие суть два знаки или сказаніа. Перший ест Слово Божіе. Другый – тайны Христовы. Где бо правдиве Слово Божіе кажется, ничого не отметаючи ани къ нему прибавляючи, тамо ест церковъ Христова. Потому жь и тайны суть певные знаки. Бо где их к тому конци вживают къ нему жь Христос уставилъ, ничого не причинивши ани убавивши, тамо справедливая церкви Христова естъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Але для чого не говоришь: «Верую въ едину святую, съборную и апостольскую церковъ», но просто: «Верую едину святую съборную и апостольскую церковъ»?

**ОТКАЗЪ**

Оуже есмъ о том вышей поведелъ, иже иншая ест речь веровати въ што, а иншая веровати кому, але и тое иншая, веровати якую речь. Прото добре о Бозе мовемъ: «Верую въ Бога». Бо веровати въ Бога розумеется оуповати на Бога. Але иже церковъ ест, яко вже речено, дружина людей верных, того для негожа веровати в церковъ. Бо не годится въ люди веровати. Тое пакъ слово: «Верую едину церковъ» тако ся розумееть, яко бы реклъ: «Верую, иже ест едина церков».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для едину только исповедуемъ церковъ, а не естъ едина, але по розныхъ местех розные суть церквы. Яко и за Апостолъ иншая церковъ была Римская, иншая Коринфская, Галатейская?

**ОТКАЗЪ**

Ачколве многые суть церкви, але иже вси единого Бога и Спаса единомыслено исповедуют, едину теже о Нем верю и надежу маютъ, прото, хотя жь телом от себе далеко отстоят и о собе не ведают, предся съ всех таковых съборов едина естъ церковъ.

Апостолъ называетъ церквами Галатскими христіанъ, которіи были по оной земли Галатской. Потому же и иных от местъ церквами пишеть, не иж бы много церков было, але иже ся единою церквію о вере учинили.

**ПЫТАНЬЕ**

Понеже церковъ естъ, яко есь поведел, дружина или събранье людей, для чого ж ее святою зовешь, гды жь межи всих людей нетъ ни одного без греха. Яко Соломон пишеть: «Несть человека праведнаго на земли, иже творить добро и не съгрешаеть (Екл. 7).

**ОТКАЗЪ**

Правда, иже церковъ Христова естъ з людей. И тое правда, иже вси людие грешніи а без греха нет ни одного. То естъ обычаемъ жи-

**АДКАЗ**

Адны вызначаюць паводле даўнасьці часу ды паводле епіскапскіх чыноў, другія – паводле мейсца, але гэтыя знакі многіх у зман уводзяць. Найпэўнейшыя ёсьць два знакі, або сьведчаньні: першы – Слова Божае, другі – Таямніцы Хрыстовы. Дзе бо праўдзівае Слова Божае кажуць, нічога ад Яго не адкідаючы, ані да Яго прыбаўляючы, – там ёсьць царква Хрыстова. Тым жа звычаем і Таямніцы – пэўны знак. Бо дзе іх дзеля таго ўжываюць, дзеля чаго іх Хрыстос пастанавіў, анічога не далучыўшы, ані адняўшы, – там ёсьць сапраўдная царква Хрыстова.

**ПЫТАНЬНЕ**

Але дзеля чаго ня кажаш: «Веру ў адзіную сьвятую паўсюдную і апостальскую царкву», але проста: «Веру пра адзіную сьвятую паўсюдную і апостальскую царкву»?

**АДКАЗ**

Ужо казаў я вышэй, што адна справа – верыць нечаму, другая – верыць у нешта, а зусім іншая – верыць, што нешта ёсьць. Дзеля таго правільна кажам пра Бога: «Веру ў Бога». Бо верыць у Бога – значыць спадзявацца на Бога. Але ж царква, як ужо гаварылася, гэта супольнасьць веруючых людзей, дзеля таго нягожа верыць у царкву, бо не належыць верыць у людзей. Гэтае ж слова: «Веру пра адзіную царкву» тое самае азначае, што і калі б мы казалі: «Веру, што ёсьць адзіная царква».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго мы вызнаём толькі адзіную царкву, а царква не адзіная, але па розных мейсцах ёсьць розныя цэрквы? Ды і ў часы Апосталаў адна царква была Рымская, другая – Карынцкая, трэцяя – Галяцкая?

**АДКАЗ**

Хаця і шмат ёсьць цэркваў, але ўсе яны адзінадушна вызнаюць адзінага Бога і Збаўцу, адзіную ў Яго маюць веру і надзею. Дзеля таго, хаця і далёка адна ад адной знаходзяцца ды адна пра адну ня ведаюць, аднак з усіх іх складаецца адзіная паўсюдная Царква.

Апостал жа называе царквой Галяцкай хрысьціянаў, што жылі ў зямлі Галяцкай. Тым жа звычаем ён называе іншыя цэрквы паводле іхніх мейсцаў не дзеля таго, каб было многа цэркваў, але дзеля таго, каб яны ўчынілі адзіную ў веры Царкву.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі царква, як ты сказаў, гэта супольнасьць або збор людзей, то дзеля чаго называеш яе сьвятою? Бо пасярод усіх людзей няма аніводнага бяз граху, як Салямон піша: «Няма бо на зямлі чалавека справядлівага, каторы б чыніў дабро і не грашыў» (Экл. 7: 20).

**АДКАЗ**

Праўда, што царква Хрыстова скаладаецца зь людзей. І тое праўда, што ўсе людзі – грэшнікі, ды няма аніводнага без граху. Значыць, у

тья вси грешніи, але опять и з другое стороны тіи жь грешници суть святіи. То ест и з стороны Слова Божія, ему жь веруют, яко Самъ Господь поведаеть ко оучеником: «Оуже вы чисти есте за слово еже рех вам» (Іоан 15: 1-8). За слово или слова деля, не житья деля ани делъ чистыми их рече. От делъ бо никто чистъ не былъ, ани естъ, ани будеть. Яко написано: «Кто похвалится чисто имети сердце, или кто дерзнеть чистъ быти от грех»? (Притч. 20)

Прото церков Христова нареченна естъ святая. Бо наоученіе маеть святое, а всякой лжи не пріимаеть. А не только въ зложеніи вери тое имя ей приписуемъ, але и у Святомъ Писаніи на многых местех Духъ Святый потому жь ю зоветь. Яко где Апостолъ Ефесіомъ пишеть: «Хрістос възлюби церков, и Себе продасть по ней да освятить ю, омывъ банею водною въ Слове, да представить ю Собе славну Церков, неимушчи скверны, или праски, или что таковых, но да ест свята и непорочна» (Ефес. 5: 25-31). Зде о церкви сведчить Апостолъ, яко свята и непорочна, але и того не замолчалъ, откуле сію святить маемь. «Хрістос, – поведаеть, – освятилъ ее и омыл банею, то естъ крешченіемъ Святого Духа, и въ Слове или Глаголомъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для наречена ест съборная церковъ?

**ОТКАЗЪ**

Того для иже не на одном месте, ани межи одного народа людьми, але по всей земли розширилася.

**ПЫТАНЬЕ**

Опять, для чого названа ест апостольская?

**ОТКАЗЪ**

Для того иже на проповеданіи Апостольском ест основана. Яко Апостолъ пишеть: «Несте страніи пришельци, но съграждане и домашніи Божіи, наздани бывше на основаніе Апостолъ и пророкъ» (Ефес. 2: 19-3: 7).

**ПЫТАНЬЕ**

Потреба ли того, абы есмо едину церков исповедали?

**ОТКАЗЪ**

И велика потреба. Бо если бы есмо тому не веровали, иже естъ Божіе на всим свете певное събрание, а што ж бы за пожитокъ был муки или смерти и въскресеніа Господа нашого Ісус Хріста? Для того бо Той кров Свою пролелъ, абы Собе певный людъ вибралъ и очистилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што потом вызнаваемъ в «Символе»?

**ОТКАЗЪ**

Едино крешченіе въ оставленіе грехомъ.

сваім жыцьці ўсе грэшнікі, але, зноў жа, зь іншага боку, гэтыя ж грэшнікі ёсьць сьвятымі паводле Божага Слова, у Якое яны вераць, бо Сам Госпад кажа вучням: «Вы ўжо ачышчаны праз Слова, якое Я гаварыў вам» (Ян 15: 3). Праз Слова або дзеля Слова Госпад назваў іх ачышчанымі, а не дзеля жыцьця або ўчынкаў. Дзеля ўчынкаў бо ніхто не ачысьціўся, не ачышчаецца ды ня будзе ачышчаны, як напісана: «Хто скажа: "Зьбярог я сэрца чыстае ад граху"?» (Прып. 20).

Таму царква Хрыстова названа сьвятой, што мае сьвятую навуку і не прыймае аніякай хлусьні. Ды ня толькі ў вызнаньні веры называем царкву сьвятой, але і ў Сьвятым Пісьме ў многіх мейсцах Дух Сьвяты гэтаксама яе заве. Апостал да Эфэсцаў піша: «Хрыстос любіць Царкву і Самога Сябе выдаў за яе, каб асьвяціць яе, ачышчаючы купальняй воднаю ў слове, каб паставіць Самому Сабе слаўную Царкву, без пляміны ці зморшчыны або чагосьці падобнага, але каб была яна сьвятая і беззаганная» (Эф. 5: 25-27). Тут Апостал засьведчыў пра царкву, што яна сьвятая ды беззаганная, але і пра тое ён не змаўчаў, адкуль яна мае гэтую сьвятасьць. «Хрыстос,– кажа Апостал,– асьвяціў ды ачысьціў яе купальняй воднаю, значыць Словам, ды хрысьціў Духам Сьвятым».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго царква названа паўсюднай?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што не ў адным мейсцы, не пасярод аднаго народу, але па ўсёй зямлі яна пашырылася.

**ПЫТАНЬНЕ**

Зноў жа, дзеля чаго яна названая апостальскай?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што была заснавана прапаведаньнем Апостальскім, як Апостал піша: «Дык таму вы ўжо не чужынцы і прыхадні, але суграмадзяне сьвятых і члены сям'і Божай, угрунтаванай на падмурку Апосталаў і прарокаў» (Эф. 2:19-20).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці патрэбна нам вызнаваць адзіную царкву?

**АДКАЗ**

Вельмі патрэбна. Бо калі б мы не верылі ў тое, што ёсьць на гэтым сьвеце пэўны Божы збор, што б за карысьць была з пакутаў або са сьмерці і ўваскрасеньня Госпада нашага Ісуса Хрыста? Дзеля таго бо Ён кроў Сваю праліў, каб пэўны народ Сабе выбраць ды ачысьціць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што потым вызнаём у «Сымбалі»?

**АДКАЗ**

Адзіны хрост дзеля адпушчэньня грахоў.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для съ оставленіемъ грехов посполе крешченіе положоно?

**ОТКАЗЪ**

Для того, ижь грехы не отпушчаются никому, есъли бы не былъ въ святой церкви, то есть въ единомъ Теле Хрістовомъ. То пакъ въ святую церковъ нельзя внити, только через Святое крешченіе.

**ПЫТАНЬЕ**

Опустивши на час крешченіе, о котором у четвертой части мети будем, розмавляимы о оставленіи грехомъ. Яко маемъ о немъ розумети, то ест для чого, або которим обычаемъ оставляеть нам Бог грехи?

**ОТКАЗЪ**

Розум человечый тако судить, абы тому Богъ грехи отпускалъ, кто за оные чинить досыть милостиною, постом и таковыми иными. Лечь Святое Письмо иншую нам дорогу оуказуеть къ отбытью греховъ. Бо везде сведчить, ижь намъ Богъ грехи отпушчаеть не для якого нагороженья, або досыть оучиненья, але Самъ для Себе, даровне а з ласки, коли ся грешный каеть, недостатокъ свой вызнаваеть, а обетницам Божіимъ веруеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино милостины давати не надобе, ани постов постити?

**ОТКАЗЪ**

Не мовлю, абы ненадобе милостины або постов чинити. Каждый милостину давати и поститися повиненъ, але надежю на милостину або на постъ мети, яко бы для того грехи Богъ отпушчалъ, таковая надежа омыляеть и есть вельми незбожная. Бо тотъ оурядъ ест Самого Сына Божіего, для Сего только единого Богъ грехи людем отпушчаеть, яко Той за оные оутерпелъ и умер. И для тое причины далъ Ему аггелъ имя Іcус, то есть на нашь язык, Спасъ или Спаситель, Той бо, кажеть, людъ Свой спасеть от греховъ их (Матф. 1:18-25). Для того жь Креститель назвалъ И агньцом или бараном, который на Себе взялъ грехи всего света.

Але немного говорячи, Петра апостола послухаимо, яко о Хрісте пред Корниліем кажеть, где тако рече: «Той Хрістос ест нареченный от Бога судити жывым и мертвымъ. О семъ вси пророци сведетелствуют, оставленіе греховъ прияти именемъ Его всякому вероуюшчему во нь» (Деан. 10: 34-43). Прото не мается никто ани на свое, ани на чужое досыть чиненье за грехи спушчати. Окроме единого Сына Божіего досыть учиненья.

**ПЫТАНЬЕ**

Говори далей вызнанье веры.

**ОТКАЗЪ**

«Чаю въскресеніа мертвымъ и жизнь будушчаго века, аминь».

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму дзеля адпушчэньня грахоў патрэбны хрост?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што грахі не даруюцца чалавеку, калі ён не прыналежыць да сьвятой царквы, значыць, да адзінага Цела Хрыстова. А далучыцца да сьвятой царквы можна толькі праз сьвятое хрышчэньне.

**ПЫТАНЬНЕ**

Пакінуўшы пакуль што размову пра хрост, бо пра яго будзе сказана ў чацьвёртай частцы, давай пагаворым пра адпушчэньне грахоў. Як гэта маем разумець: значыць, дзеля чаго або якім звычаем Бог прабачае нам грахі?

**АДКАЗ**

Розум чалавечы так развАжае: Бог прабачае грахі тым, хто за іх досыць міласьціну дае, посьціць ды падобныя справы робіць. Аднак Сьвятое Пісьмо паказвае нам іншы шлях да адпушчэньня грахоў. Яно паўсюль сьведчыць, што Бог прабачае грахі не дзеля нейкай аднагароды або дзеля дасканалых учынкаў, але дзеля Самога Сябе, дарма, з ласкі, калі грэшнік каецца, свае недасканаласьці вызнае ды верыць абяцаньням Божым.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба ані міласьціну даваць ня трэба, ані посьціць?

**АДКАЗ**

Не кажу, што ня трэба даваць міласьціну або посьціць. Кожны павінны міласьціну даваць ды посьціць, але няхай не спадзяецца, што дзеля міласьціны або посту Бог прабачыць грахі, — такая надзея памылковая ды вельмі бязбожная. Бо гэта права Самога Сына Божага, толькі дзеля Яго адзінага Бог дарУе людзям грахі, бо Сын Божы за іх пакутаваў ды памёр. І дзеля гэтай прычыны анёл даў Яму імя Ісус, значыць, на нашай мове,– Спас, або Збаўца,– Ён бо збавіць народ Свой ад грахоў ягоных (Мц. 1:21). Дзеля таго і Хрысьціцель назваў Яго ягнём, або баранкам, Які на Сябе ўзяў грахі ўсяго сьвету.

Але, каб не казаць шмат, паслухаем, як Апостал Пётр кажа пра Хрыста Карнэлю: «Той Хрыстос устаноўлены Богам судзьдзёю жывых і памерлых. І ўсе прарокі сьведчаць гэта, што кожны, хто верыць у Яго, атрымае адпушчэньне грахоў празь імя Ягонае» (Дзеі 10: 42-43). Таму нікому не адпусьцяцца грахі ані дзеля сваіх, ані дзеля чужых учынкаў дасканалых, акрамя адзінага дасканалага ўчынку Сына Божага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажы далей вызнаньне веры.

**АДКАЗ**

«Чакаю ўваскрасеньня памерлых і жыцьця вечнага. Амін».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для тые слова вложоно до «Символа»?

**ОТКАЗЪ**

Для того, абы есмо ведали, ижь блаженство або шчастье нашое не зде, на симъ свете исполнитися маеть. Сиа пакъ ведомость принашаеть намъ два пожитки великіе. Першій, бо ведаючи, яко намъ зде недостояніе, або не отчизна, а мы яко пришельци и гости, не оуплетаемся печальми житейскими. А другый пожитокъ, ижь если на насъ якая трудность или клопоты безвиннее пріидуть, в ни во што их почитаем, но с тихостію терпемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Вси ли встанут мертвіи – и злые, и добрие?

**ОТКАЗЪ**

Не вси бы хотели, але вси мусять встати: и добрие в радость, и злые в муку.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого жь Давыд написал: «Сего ради не въскреснут нечестивіи на судъ, ни грешници въ совет праведныхъ»? (Псалом 1)

**ОТКАЗЪ**

Не тое розумееть Давыд, абы нечестивіи не мели ожити на онъ страшный судъ, але даеть знати, иже судти з добрими не мають. Прото яко бы толкуючи, придалъ: «Ни грешници в советъ праведныхъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Ино розности нет межи добрими и злыми, понеже обой въскреснуть?

**ОТКАЗЪ**

Велика розность межи тыми окажется. Благочествіи бо въскреснут къ славе и вечному животу. Опять, нечестивіи въ муки и на погибель вечную.

**ПЫТАНЬЕ**

Лечь зде въ «Символе» муки грешным не пишеть, только вечную жизнь будушчого века?

**ОТКАЗЪ**

«Символонъ, или Зложеніе вери» не для нечестивых, але для побожных пописано, абы потешеніе мели, прото муки никаковой не приписано. Лечь Писмо Святое на многых местех вспоминаеть муки великие грешным в веку пришлом. Яко и Самъ Хрістос поведел, ижь нечестивіи пойдут в муку вечную (Матф. 25). А на ином месте рече: «Лучше съ единемъ оком внити въ Царствие Божіе, неже две оце имяшчу, въвержену быти въ геенну огньную, идеже червъ их не оумираеть, и огонь не угасаеть» (Марк 9: 42-47). Тое жь ест у пророка Ісаіа (Ісаіа 66). О томъ теже и Богословъ въ Откровеніи своим сими словы

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго гэтыя словы далучаны да «Сымбалю»?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, каб мы ведалі, што нашае шчасьце ня мае прыйсьці тут, на гэтым сьвеце. Такое веданьне прыносіць нам два вялікія здабыткі. Першы – калі мы ведаем, што ня тут нашая спадчына, або айчына, і, як прыхадні і госьці, не спакушаемся жыцьцёвымі турботамі. Другі здабытак – калі мы цяжкасьці або клопаты, што на нас бязьвінна прыходзяць, уважаем за нішто ды трываем іх з пакораю.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці ўваскрэснуць зь мёртвых і благія, і добрыя?

**АДКАЗ**

Ня ўсе б хацелі, але ўсе ўваскрэснуць: і добрыя дзеля радасьці, і благія дзеля пакутаў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму ж Давід напісаў: «Таму і не ўваскрэснуць бязбожныя на суд ды грэшнікі на раду праведных»? (Пс. 1: 5)

**АДКАЗ**

Не мяркуе тут Давід, што грэшнікі не ўваскрэснуць на Страшны суд, але дае знаць, што яны ня маюць судзіцца са справядлівымі. Дзеля таго, нібы тлумачачы, ён далучыў: «Ані грэшнікі на раду праведных».

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба ж ёсьць розьніца паміж добрымі ды благімі, калі ўсе ўваскрэснуць?

**АДКАЗ**

Вялікая розьніца паміж імі выявіцца. Багабойныя бо ўваскрэснуць дзеля славы і жыцьця вечнага. Зноў жа, грэшнікі – дзеля пакутаў ды вечнай пагібелі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Аднак тут, у «Сымбалі», сказана толькі пра вечнае жыцьцё будучага веку, а не пра пакуты грэшнікаў.

**АДКАЗ**

«Сымбаль, або Вызнаньне веры» напісаны не дзеля грэшнікаў, але дзеля пабожных, каб мелі пацяшэньне, таму пра пакуты ня кажа. Аднак Сьвятое Пісьмо шмат дзе ўзгадвае пра вялікія пакуты грэшнікаў у вечным жыцьці. Сам Хрыстос казаў, што бязбожныя пойдуць на вечную муку (Мц. 25), а ў іншым мейсцы гаварыў: «Лепш табе ўвайсьці ў Валадарства Божае аднавокім, чым, маючы два вокі, быць укінутым у пекла, дзе чарвяк іх не паміраe ды агонь не згасае» (Мк. 9: 47).

Пра гэта знойдзем у прарока Ісаі (Іс. 66), таксама Багаслоў у Адкрыцьці сваім піша: «Удзелам палахлівых, няверных, нягоднікаў, за-

пишеть: «Страшивым, и неверным, и проклятымъ, и убійцом и любодеем, и ідоложерцем, и всим лживымъ часть имъ въ езере горяшчей огнем и жупеломъ» (Апокал. 21: 8). Таковъ маеть быти конець всимъ нечестивым. Опять, о радости добрим написано тако: «Их же око не виде и оухо не слыша, и на сердце человеку не възыиде, яже оуготова Богъ любяшчимъ Его» (1 Кор. 2: 9-3: 9, Ісаіа 64).

Господи Ісусе Хрісте, Сыне Божій за нас распятый,
сътвори насъ причастники сим
радостемъ смерти Твоея ради.
АМИНЪ.

## Конець второе части Катихиси

бойцаў, распусьнікаў, чараўнікоў, балванахвальцаў і ўсіх хлусьлівых будзе палымнеючае возера агню і серкі» (Адкр. 21: 8). Такі мае быць канец усім бязбожным. Зноў жа, пра радасьць пабожным напісана так: «Чаго вока не аглядала, ані вуха ня чула, ані сэрца чалавечае не прадчувала, тое Бог прыгатаваў тым, якія любяць Яго» (1 Кар. 2: 9, Іс. 64).

Госпадзе Ісусе Хрысьце, Сыне Божы за нас укрыжаваны,
зрабі нас супольнікамі гэтае радасьці
дзеля сьмерці Тваёй.
АМІН.

## Канец другой часткі Катэхізісу

# ТРЕТЯЯ ЧАСТЬ
# КАТИХИСІ О МОЛИТВЕ ГОСПОДНЕЙ

**ПЫТАНЬЕ**

Што естъ молитва?

**ОТКАЗЪ**

Молитва ест прозба къ Богу, или призыванье Бога.

**ПЫТАНЬЕ**

Повинни ли люди молитися Богу, чи ли пак на их доброй воли ест молитися або не молитися?

**ОТКАЗЪ**

Не далъ того Богъ на волю людем, але приказуеть, абы ся Ему молили. Въ Псалтыри бо тако Богъ росказуеть: «Пожри Богови жертву хвалы и въздай Вышнему молитвы твоя, и призови Мя въ день печали твоея, и збавлю тя и прославиши Мя» (Псалом 49).

Сам теже Господь росказуется безпрестанно молити, и того для поведелъ притчю о судіи неправедъном и о вдовици докучливой, абы есмо ведали, иже ся на всякъ час молити потреба, а николи не престававати (Лука 18). Тое жь Апостолъ повелеваеть Солуняномъ, сиречь непрестанно молитися, а съ всего Богу дяковати (1 Сол. 5:14-28).

**ПЫТАНЬЕ**

О што маемъ Бога просити и Его молити?

**ОТКАЗЪ**

О всякие потребы, которих намъ потреба и зде, на симъ свете, и на томъ. То естъ и о духовные потребы, и о дочасные молити Бога маемъ. Але пильней и первей духовных речи просити маемъ, нежели телесных, по евангельскому слову: «Ишчите прежде Царствіа Божіа и правды его, и сіа вся приложатся вамъ» (Матф. 6: 31-34).

**ПЫТАНЬЕ**

Потреба ли намъ, коли ся Богу молимъ, помочника или Ходотая къ Нему?

# ТРЭЦЯЯ ЧАСТКА
# КАТЭХІЗІСУ ПРА МАЛІТВУ ГОСПАДАВУ

**ПЫТАНЬНЕ**

Што такое малітва?

**АДКАЗ**

Малітва – гэта просьба да Бога або прызываньне Бога.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці павінны людзі маліцца Богу, ці ўсё ж ад іх добрай волі залежыць маліцца або не маліцца?

**АДКАЗ**

Не пакінуў Бог гэта на волю людзей, але загадаў, каб Яму маліліся. У кнізе Псальмаў бо так Бог гаворыць: «Складзі ў ахвяру Богу падзяку і выканай прырачэньні твае Найвышэйшаму. А тады кліч Мяне ў дзень бяды, і Я абараню цябе, і ты будзеш праслаўляць Мяне» (Пс. 49).

Сам Госпад таксама загадваў заўсёды маліцца, і дзеля таго расказаў прыповесьць пра несправядлівага судзьдзю і надакучлівую ўдаву (Лк. 18), каб мы ведалі, што кожны час патрэбна маліцца, ніколі не спыняючыся. Тое ж самае Апостал загадвае Тэсалонцам, — значыць, несупынна маліцца ды за ўсё Богу дзякаваць (1 Тэс. 5:17).

**ПЫТАНЬНЕ**

Пра што маем Бога прасіць ды Яму маліцца?

**АДКАЗ**

Пра кожную нашу патрэбу і тут, у гэтым жыцьці, і ў жыцьці будучым. Значыць, маем Бога маліць і пра духоўныя патрэбы, і пра штодзённыя. Але найпільней ды перш за ўсе павінны Яго прасіць пра рэчы духоўныя, а не пра цялесныя, паводле Эвангельскага слова: «Шукайце перш Валадарства Божае ды праўду яго, і гэта ўсё будзе вам» (Мц. 6: 33).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці патрэбны нам, калі Богу молімся, памочнік або заступнік перад Ім?

**ОТКАЗЪ**

Великая потреба ест нам Ходотая, понеже мы сами грешніи и велми недостойни, абы нас Богъ выслухалъ, але не таковых намъ потреба помочниковъ, яковых собе были вже от колька сотъ летъ предки наши навымышляли. То есть оных, которіи вже або померли, або для Христа помучени, на помочь собе призывали. Лечь тым обычаем не только молитов их Богъ не выслухалъ, але теже вельми былъ къ гневу порушанъ. Одного бо только дал нам Богъ причинцу или Ходатая – Ісус Хріста, Сына Своего. Яко Апостолъ къ Тімофею рече: «Един бо ест Богъ, единъ Ходотай Богу и человеком Ісус Хрістос, давый Себе за избавленіе за всехъ» (1 Тім. 2: 1-14).

Потому же и Петрь поведаеть, рекучи: «Сей Хрістос ест камень оукореный от вас, зиждушчихъ, быв въ главу оуглу, и несть о ином, ни о едином спасеніа. Ни бо имя естъ иное под небесемъ дано въ чловецех о нем же нам спастися» (Деан. 4: 1-11). Тое жь Сам Господь потвержаеть сими словы: «Азъ есмь путь, истинна и живот. Никто же прійде къ Отцу токмо Мною» (Іоан 14:1-10). Опять, на ином месте поведаеть: «Аминь, аминь глаголю вам, яко ашче чего попросите от Отца въ имя Мое, дасть вам. Доселе не просисте ничего же во имя Мое, просите и пріимете» (того жь 16: 23-33).

Естъ и иные места, которіе намъ только на Самого Хріста оуказуют, въ Его же имени Богу молитися маемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што бы завадило хотя бы кто святыхъ на помочь призывалъ, абы ся о нем молили?

**ОТКАЗЪ**

Вельми бы таковъ грешилъ. Бо напервей кто ся святымъ молить, мусить о них веру таковую мети, иже они о его молитве ведаютъ и о каждого, кто ся имъ молить. Бо кто бы тому не верилъ, абы святіи каждого молитву слышели, николи бы их не призывали. Другая – кто ся святымъ молить, або их о причину просить, таковый веровати мусить, ижь они тое оучинити могуть, а тымъ обычаемъ на причину святыхъ оуповают.

Обедве тые речи — то естъ и оуповати на причины святыхъ вже оусопшихъ, и веровати, яко везде и всехъ слышять, — противные суть Писму Святому и Самому Богу кривду чинять. Бо Сам Богъ на всяком месте ест, прото и везде молитвы и прозбы верныхъ Своихъ слышить. А кто тое о человеку розумееть, таковъ силу и славу Божию человеку приписуеть.

Прото Хрістіанин не мается того допушчати, абы або на святых оуповалъ, або ихъ на всяком месте чуючихъ веровалъ. Бо хотя жь бы нетъ ведома, яко святіи были, предся человеци были и тепер суть, и по воскресеніи будуть. А поневажь человеци суть, негожа на них оуповати. Бо написано: «Проклятъ человекъ, иже надею имать на челове-

**АДКАЗ**

Вельмі патрэбны нам заступнік, бо мы самі грэшныя і зусім ня вартыя, каб Бог нас выслухаў. Але не патрэбныя нам тыя памочнікі, якіх ужо колькі стагодзьдзяў таму нашыя продкі сабе навыдумлялі, прызываючы сабе на дапамогу тых, што ўжо памерлі або былі замучаны за веру ў Хрыста. Малітвы такім звычаем Бог ня толькі не выслухоўваў, але і вельмі дзеля іх гневаўся. Адзінага бо толькі даў нам Бог Памочніка або Заступніка – Ісуса Хрыста, Сына Свайго, як Апостал да Цімахвея пісаў: «Бо адзін Бог, і адзін пасярэднік між Богам і людзьмі – чалавек Хрыстос Ісус, які Самога Сябе выдаў дзеля адкупленьня ўсіх» (1 Цім. 2: 5).

Гэтаксама і Пётр казаў: «Той Хрыстос – камень, каторы вы, будаўнікі, адкінулі, а Ён вось стаўся галавою кута. І няма ні ў кім іншым збаўленьня, бо няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у каторым бы мы маглі быць збаўленыя» (Дзеі 4:10-11). Гэта і Сам Госпад сьцьвярджаў ў такія словы: «Я – дарога, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, як толькі празь Мяне» (Ян 14: 6). Зноў жа, у іншым мейсцы Ён сьведчыць: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: пра што будзеце прасіць Айца ў імя Маё, дасьць вам. Дасюль нічога не прасілі ў імя Маё. Прасіце і атрымаеце» (Ян 16: 23).

Ёсьць і іншыя мейсцы, якія нам паказваюць толькі на Самога Хрыста і што ў імя Ягонае мы маем маліцца Богу.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ж шкоднага ў тым, калі нехта сьвятых на дапамогу прызывае, каб за яго маліліся?

**АДКАЗ**

Вельмі такі чалавек грашыць. Бо, па-першае, той, хто моліцца сьвятым, мусіць пра іх мець веру, што яны ведаюць і пра ягоную малітву, і пра кожнага, хто ім моліцца. Бо калі б чалавек ня верыў, што сьвятыя чуюць малітву кожнага, то ніколі б іх не прызываў. Па-другое, хто моліцца сьвятым або просіць іх пра дапамогу, мусіць верыць, што сьвятыя могуць гэта ўчыніць, ды, тым звычаем, спадзяецца на іхнюю дапамогу.

Абедзьве гэтыя рэчы — значыць, і спадзяваньне на дапамогу сьвятых, што памерлі, і вера ў тое, што паўсюль і ўсіх яны чуюць, — супярэчаць Сьвятому Пісьму і крыўдзяць Самога Бога. Бо Сам Бог ёсьць на кожным мейсцы, таму і паўсюль чуе малітвы і просьбы Сваіх верных. А хто так мяркуе пра чалавека, той прыпісвае чалавеку сілу ды славу Божую.

Дзеля гэтага Хрысьціянін ня можа таго дапусьціцца, каб спадзявацца на сьвятых або верыць, што яны на кожным мейсцы яго пачуюць. Бо хаця і невядома, якімі былі сьвятыя, найперш яны былі людзі і цяпер імі ёсьць, і пасьля ўваскрашэньня імі застануцца. А калі сьвятыя – людзі, то няварта на іх спадзявацца, бо напісана: «Пракляты чалавек,

ка» (Ерем. 17). Не годится теже имъ того приписовати, абы о нас або о наших молитвах ведали. Духъ бо Святый Давыдом написалъ: «Не надейтеся на князи, на сыны человеческия, в них же несть спасеніа. Изыдеть дух их, и возвратится в землю свою, в той день погыбнут вся помышленіа ихъ» (Псалом 145).

Зде напред заказуеть надеватися на сыны человеческие. Потом выписуеть причину, для чого не годится надевати на них, бо, поведаеть, погыбнуть вся помышленіа их. То естъ не будут ся нами опекати, ани о нас ведати.

**ПЫТАНЬЕ**

Лечь тое видить ми ся Духъ Святый только о князех сего света и о грешных людех пишеть, абы ся никто на нихъ не надевалъ, а не на тое, абы намъ святыхъ о причину молити боронилъ. Бо ми видится, ижь святіи о насъ ведають и молитвы чують.

**ОТКАЗЪ**

Не можеть никто поведети, абы Авраамъ, о котором Святое Письмо и Нового и Ветхого Завета великие сведества чинить, не былъ святый, по тому жь и о внуце его о Ізраиле, или о Іакове. А предся тако о них Писмо Святое кажеть, ижь о нас ничого не ведають. Тако бо пророкъ Ісаіа оу своей молитве къ Богу говорить: «Обратися, Господи, от небесе и виждь от дому святого Своего и славы Твоея. Где естъ ревень Твоя и крепость Твоя? Где ест множество милости Твоея и шчедрости Твои, яко притръпе намъ? Ты бо есь нашь Отецъ, Авраамъ бо не позна нас, и Ізраиль не оуведе нас, но Ты, Господи, Отецъ нашь, исперва имя Твое на нас ест» (Ісаіа 63).

Ясными словы Ісаіа поведелъ, ижь Авраамъ и Ізраиль, ачкольвек великіи святіи были и суть, предся о потомстве своемъ не ведають. Если Авраамъ не ведалъ, што ся над его потомством дееть, далеко меншь иншіи ведають, што ся с нами чинить.

**ПЫТАНЬЕ**

Если непотребные суть молитвы святыхъ, для чого жь Богъ Авимелеху, Царю Ерарскому, поведелъ, ижь на молитву Авраамлю мелъ живъ быти (Быт. 20)?

**ОТКАЗЪ**

Не тое я мовлю, абы ся святіи, которіи зде ешче на земли живут, не могли за нами молити Бога, але што мовлю, о святыхъ вже оумерших или оусопших розумею. Живый бо святій может ся за живых молити, бо ведаеть, чого им надобе. Опять, коли оусопнеть, ни о чимъ не ведаеть. Тело зде зоставается, а духъ в руце Божіе идеть, Авраамъ живъ будучи на тотъ час, могъ ся за Авимелехом молити. Бо его зналъ, и потребы его ведалъ, и греха его зведом был.

Потому жь Апостолъ Павелъ, где къ Рімляном пишеть сия слова: «Молю вы, братіа, Господемъ нашим Ісус Хрістомъ и за любов духов-

які спадзяецца на чалавека» (Ярэм. 17). Таксама няварта ім прыпісваць, што яны ведаюць пра нас або пра нашыя малітвы, Дух бо Сьвяты праз Давіда прамовіў: «Не спадзявайцеся на князёў, на чалавека, няма ў іх збаўленьня. Выйдзе іхні дух, і вернуцца яны ў зямлю, і той жа дзень прападуць усе намеры іхнія» (Пс. 145).

Тут найперш Дух Сьвяты забараняе нам спадзявацца на сыноў чалавечых, потым тлумачыць прычыну, дзеля якой нявалта на іх спадзявацца: бо, кажа, згінуць усе іхнія намеры. Значыць, ня будуць яны ані пра нас клапаціцца, ані пра нас ведаць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Але ж так, я мяркую, Дух Сьвяты піша толькі пра князёў гэтага сьвету ды пра грэшнікаў, каб ніхто на іх не спадзяваўся, ды не забараняе нам маліць сьвятых пра дапамогу. Бо мне здаецца, што сьвятыя пра нас ведаюць ды малітвы чуюць.

**АДКАЗ**

Ніхто не запярэчыць, што Абрагам, пра якога Сьвятое Пісьмо і Новага, і старога Запавету прыводзіць вялікія сьведчаньні, ня быў свьятым, як і ўнук ягоны Ізраэль, або Якуб. Але пра іх Пісьмо Сьвятое кажа, што яны нічога пра нас ня ведаюць. Так бо прарок Ісая кажа ў сваёй малітве Богу: «Зірні зь нябёсаў ды глянь з жытла Твайго сьвятога і слаўнага! Дзе руплівасьць і моц Твая? Дзе вялікая міласьць і шчодрасьць Твая? Ты ж бо Айцец наш; Абрагам бо ня ведае нас і Ізраэль нас ня знае. Ты ж, Госпадзе, Айцец наш ды спрадвек імя Тваё над намі» (Іс. 63).

Ясна Ісая сказаў, што Абрагам ды Ізраэль, хаця былі ды ёсьць вялікімі сьвятымі, аднак нічога ня ведаюць пра сваіх нашчадкаў. Калі Абрагам ня ведаў, што будзе зь ягонымі нашчадкамі, яшчэ менш іншыя ведаюць, што з намі робіцца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі не патрэбныя малітвы сьвятых, то дзеля чаго Бог сказаў Абімэлеху, каралю Гэрарскаму, што па малітве Абрагама той жывым застанецца (Роду 20)?

**АДКАЗ**

Не кажу я, што сьвятыя, якія яшчэ тут, на зямлі жывуць, ня могуць за нас Богу маліцца, але кажу пра сьвятых, якія ўжо памерлі. Жывы бо сьвяты можа за жывых маліцца, бо ведае, што ім патрэбна. Зноў жа, калі памрэ, ні пра што ведаць ня будзе: цела тут застанецца, а дух пойдзе ў руку Божую. Абрагам жывы быў на той час, ён мог маліцца за Абімэлеха, бо яго ведаў, ды патрэбы ягоныя ведаў, ды пра ягоны грэх быў сьвядомы.

Тым жа звычаем і Апостал Паўла прыстойна чыніць, калі да Рым-

ную, поспешествуйте ми въ молитвах о мне къ Богу» (Рим. 15: 30-33), пристойно чинить, бо живым ся в молитву полецаеть. Годится бо другу за друга Бога молити. Яко Апостолъ повелеваеть: «Молитеся другъ за друга, яко да исцелете. Много бо может молитва праведнаго испоспешествуема» (Іак. 5:10-19).

И на многыхъ местехъ оу Святомъ Писмени находимъ, ижь святіи, докуле зде жили, много молитвами своими помагали. А ведже нигде не писано, абы по симъ животе кому што оупросили.

**ПЫТАНЬЕ**

Што на оныя слова самого Христа речешь, где поведелъ: «Азъ есмъ въскресеніе и животъ, веруяй въ Мя ашче оумреть, оживеть, и веруяй въ Мя ашче не оумреть въвеки» (Іоан 11: 1-46). Явно бо тут Господь сведчить, иж верующчіи во Нь николи не оумерають. А поневажь не оумерають, ино всегды ся молять. Бо есь и самъ поведелъ, яко живіи могут ся молити.

**ОТКАЗЪ**

Двоякая есть смерть – дочасная и вечная. Дочасною смертію мусить каждый оумерети – и верный и неверный. Вечною пакъ смертію сами только нечестивіи оумерають. Прото где Христос верным Своимъ обецуеть, иже не мають оумерети, розумети маешь, ижь вечною смертію не мають оумерати. Бо дочасною смертію поставлено ест всемъ человекомъ единою оумерети, яко Апостолъ рече (Евр. 9: 24-28).

А хотя жь пакъ вечною смертію не помруть верніи, предся не ведают о нас, яко есмъ вже пророкомъ Ісаіею довелъ, ижь Авраамъ и внукъ его Іаковъ не ведают о нас. О которих поведети не можемъ, абы вечною смертію померли. Сам бо Господь о сих рече къ саддукеомъ: «Яко встають мертвіи Мойсей сказа при купине, яко же глаголить Господа Бога Авраамля, и Бога Ісаакова, и Бога Іаковля. Богъ же не ест мертвых, но живыхъ, вси бо Тому живи суть» (Лука 20: 27-45).

Видишь, яко зде Господь сведчить, ижь Авраамъ, Ісаакъ и Іаковъ живи, а предся Ісаіа о нихъ кажеть, ижь о нас не ведають. А поневажъ святіи не ведають о нас и о молитвах наших, ино не потреба ся им молити. А кто бы ся им молилъ, грешить противу Бога. Бо што бы мелъ о Бозе розуметн, тое о Его твари розумееть. А хотя кто святого не просить яко Бога, абы ему што далъ, але только на помочь призываеть, предся тяжко грешить. Бо вместо Сына Божіего, который будучи Богъ и человек ест нашим Ходотаемъ (1 Тім. 2), чинить собе иншие ходотае з людей.

**ПЫТАНЬЕ**

Неподобенство, абы ся за тое мелъ або гневати, або мстити Христос, коли святых Его въ учтивости маемъ. Бо честь, которую святымъ чинемъ, обецалъ тако приняти, яко бы есмо Самому чинили. Тако бо

лянаў піша ў такія словы: «Дык прашу вас, браты, праз Госпада нашага Ісуса Хрыста і празь любоў Духа, каб успамаглі мяне вашымі малітвамі да Бога за мяне» (Рым. 15: 30), бо даручае жывым за сябе маліцца. Належыць бо адзін за аднаго Богу маліцца, як Апостал загадвае: «Дык маліцеся адны за другіх, каб атрымалі здароўе. Бо вялікую сілу мае стойкая малітва справядлівага» (Як. 5:16).

Ды шмат дзе ў Пісьме Сьвятым знаходзім, што сьвятыя, пакуль тут жылі, моцна дапамагалі сваімі малітвамі. Але нідзе не напісана, што яны пасьля сваёй сьмерці некаму нешта выпрасілі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што на тыя словы Самога Хрыста адкажаш, калі Ён гаворыць: «Я ёсьць уваскрасеньне і жыцьцё. Хто верыць у Мяне, хоць бы ён і памёр, жыць будзе. І кожны, хто жыве і верыць у Мяне, не памрэ павек» (Ян 11: 25). Яўна бо Ён тут сьведчыць, што веруючыя ў Яго ніколі не паміраюць. А раз не паміраюць, то і заўсёды моляцца. Бо і ты сам казаў, што жывыя могуць маліцца.

**АДКАЗ**

Дваякая ёсьць сьмерць – часовая і вечная. Часовай сьмерцю мусіць кожны памерці – і той, хто верыць, і той, хто ня верыць. Вечнай жа сьмерцю толькі грэшнікі паміраюць. Дзеля таго, калі Хрыстос абяцае Сваім верным, што яны не памруць, мусіш разумець, што яны не памруць вечнай сьмерцю. Бо пастаноўлена, што сьмерцю часовай усе людзі памруць, як Апостал казаў: «І як устаноўлена людзям раз памерці, а пасьля суд» (Гебр. 9: 27).

І хаця верныя не паміраюць вечнай сьмерцю, аднак пра нас яны ня ведаюць, і ўжо я гэта давёў словамі прарока Ісаі: Абрагам ды ягоны ўнук Ізраэль ня ведаюць пра нас. Ня можам меркаваць пра Абрагама ды Ізраэля, што яны памерлі вечнай сьмерцю, Сам бо Госпад гаварыў пра іх садукеям: «А што памерлыя ўваскрэснуць, дык ужо Майсей паказаў каля куста палаючага, калі назваў Госпада Богам Абрагама, і Богам Ізаака, і Богам Якуба. Бог жа ня ёсьць Бог памерлых, але жывых: бо для Яго ўсе жывыя» (Лк. 20: 37-38).

Бачыш, тут Госпад сьведчыць, што Абрагам, Ізаак ды Якуб жывыя, аднак жа Ісая пра іх кажа, што яны пра нас ня ведаюць. Паколькі сьвятыя ня ведаюць пра нас ды пра нашыя малітвы, то і ня трэба да іх маліцца. А той, хто да іх моліцца, супраць Бога грашыць, бо такі чалавек разважае пра стварэньне як пра Творцу. Ды хаця хто ня просіць сьвятога як Бога, каб нешта даў, але толькі на дапамогу прызывае, усё роўна той цяжка грашыць. Бо замест Божага Сына, Бога і Чалавека, нашага Пасярэдніка, стварае сабе іншых пасярэднікаў зь людзей (1 Цім. 2).

**ПЫТАНЬНЕ**

Не падобна, каб Хрыстос меўся або гневацца, або помсьціцца за тое, што мы шануем Ягоных сьвятых. Бо Ён абяцаў як Сабе Самому

рече: «Понеже сътвористе единому от сих братіи Моих менших, Мне створисте» (Матф. 25: 31-46).

**ОТКАЗЪ**

Иншая не ровно ест речь въ оучтивости мети святыхъ, а иншая – Ходотаи с них чинити. Христос где обецуеть праведным на суде поведети сия слова: «Понеже сътвористе единому от сих братей Моих, Мне створисте»,– не о призыванію тамо на помочь святых говорить, але ижь праведници не будут ся к тому признавати, абы Христа кормили, поили, опратали, ховали або якую послугу чинили. Для того имъ обецуеть поведети, ижь што оубогымъ зде, на земли, чинили, тое Ему чинили. Бо вси веруюшчіи въ Христа уды Его и тело Его суть.

А ведже имъ того нигде же не причитаеть, абы мели ходатаими или причинцами быти. Не припушчаетъ бо никого Христос к Своему вряду. Самъ един ест Ходотаем межи Богом и межи нами человеки. Того бо для есть Богъ и человекъ, абы и Богу и человеку единосушчный будучи, достаточным или съвершеным ходотаемъ былъ. А поневажь никто ины таков быти не можеть, се ест и Богъ и человекъ, како ему ходотаем можно быти межи Богом и человеком? Нестли написано: «Праведник едва спасется» (1 Петра 4: 12-5: 1-6). Если едва спасется самъ, какъ иныхъ спасти возможеть? Прото Христос не до иного кого звалъ, токмо къ Собе: «Пріидете, – кажеть, – къ Мне вси трюждающчійся и обремененій, и Азъ покою вы» (Матф. 11: 27-30).

Потому жь и Апостоли Христови не на себе оуказовали, ани к собе вабили, але къ Хрісту отсылали. Іоаннъ, его же Богословом называють, тако Ходотая оуказуеть: «Чадца моя, сия пишю вам, да не съгрешайте. Ашче кто съгрешить, оутешителя имамы къ Отцу – Ісуса Христа праведника. И Той очишченіе наше есть о гресех нашихъ. Не о наших же токмо, но и о всем мире» (1 Іоан 1: 8-2:6).

Видиш ли, кого за утешителя маемъ держати? Не рече: «Богородицю или Пятницю, Діониса або Бориса», но: «Ісус Христа праведника». Како бо иного кого за оутешителя Апостоли оуказовати могли, поневажь повеленіа о том не мели, абы людей на створенія оуповати оучили? Тем же бы и мы сей поганьский обычай опустити мели, паметуючи на оное слово: «Господу Богу твоему поклонишися и Тому единому послужиши» (Втор. Зак. 6), и на оное: «Славы Моея иному не дамъ» (Ісаіа 42; 48).

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого жь Христос оу Своей къ Оцю молитве оныя слова поведелъ: «Азъ славу юже далъ еси Мне, дах имъ, да будуть едино, яко жь и мы едино есмы» (Іоан 17:17-26)?

**ОТКАЗЪ**

Не тое тамъ Христос розумееть, абы Апостоломъ оную славу, которую съ Отцом от века мелъ и мети будеть безъ конца, хотелъ спустити,

прыймаць пашану, якую мы аддаём сьвятым. Так бо сказаў: «Што зрабілі вы аднаму з гэтых братоў Маіх найменшых, тое Мне зрабілі» (Мц. 25: 40).

**АДКАЗ**

Адна справа – сьвятых шанаваць, зусім іншая – уважаць іх заступнікамі. Хрыстос, абяцаючы сказаць на судзе справядлівым гэтыя словы: «Што зрабілі вы аднаму з гэтых братоў Маіх найменшых, тое Мне зрабілі», – ня мае на ўвазе прызываньне ў дапамогу сьвятых. Ён гаворыць, што справядлівыя ня будуць вызнаваць, як яны Хрыста кармілі, паілі, апраналі, прыймалі ды рабілі іншыя паслугі. Дзеля гэтага Хрыстос абяцае сказаць ім: яны зрабілі Яму ўсё тое, што тут, на зямлі, убогім зрабілі. Бо ўсе, што вераць у Хрыста, ёсьць Ягоныя члены і Ягонае цела.

Аднак нідзе Хрыстос ня кажа, што справядлівыя маюць быць заступнікамі або пасярэднікамі. Не дае бо Хрыстос нікому Сваёй улады: Ён — адзіны пасярэднік паміж Богам і паміж намі, людзьмі. Дзеля таго Ён і Бог, і Чалавек, каб, будучы адзінасутным і Богу, і чалавеку, стацца дастатковым або дасканалым пасярэднікам. А паколькі ніхто іншы такім быць ня можа – значыць, і Богам, і Чалавекам, – як нехта можа быць пасярэднікам паміж Богам і чалавекам? Ці ж не напісана: «І справядлівы ледзь будзе збаўлены?» (1 Пт. 4: 18). Калі справядлівы ледзьве збавіцца сам, то як здолее збавіць іншых? Дзеля гэтага Хрыстос толькі да Сябе, а не да каго іншага зваў: «Хадзеце да Мяне, – казаў, – што працуеце і зьняможаныя пад цяжарам, і Я дам вам сілу» (Мц. 11: 28).

Тым жа звычаем і Апосталы не на сябе паказвалі, не да сябе звалі, але накіроўвалі да Хрыста. Ян, якога называюць Багасловам, так пра пасярэдніка сьведчыць: «Дзеткі мае, пішу вам гэта, каб вы не грашылі. А калі хто і саграшыў, маем Заступніка перад Айцом – Ісуса Хрыста, справядлівага. Ён ёсьць ахвяра перамольная за грахі нашыя, ды ня толькі за грахі нашыя, але таксама за грахі ўсяго свету» (1 Ян 2: 1-2).

Бачыш, каго мусім уважаць за заступніка? Не сказаў Ян: «Багародзіцу або Пятніцу, Дыяніса або Барыса», але: «Ісуса Хрыста, справядлівага». Як жа пра некага іншага як пра заступніка маглі сьведчыць Апосталы, калі ня мелі такога загаду – вучыць людзей спадзявацца на стварэньне? Таксама і мы мусім адкінуць гэты паганскі звычай, памятаючы на Слова: «Госпада Бога твайго бойся і Яму служы» (Паўт. Зак. 6). Ды на гэтае Слова: «Славы Маёй не саступлю нікому» (Іс. 42; 48).

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ж Хрыстос у Сваёй малітве да Айца гаварыў тыя словы: «І хвалу, якую Ты Мне даў, Я перадаў ім, каб яны былі адно, як і Мы адно» (Ян 17: 22)?

**АДКАЗ**

Ня меў Хрыстос на ўвазе, што хоча даць Апосталам тую славу, якую

абы ся им люди молили або их собе на помочь призывали. Не о той ся славе сее слово розумееть. Бо того оуряду Христос никому не спустить, ани къ Собе припустить, абы кто с Нимъ могъ быти Ходатаемъ.

Але тамо Сынъ Божій Отца за ними молить, абы были едино, се есть, едино тело. Розумей, абы были церквию Его. Але поневажь не могли Апостоли безъ освеценья или безъ наоуки быти церквію Божіею, прото поведаеть Христос, иже имъ далъ славу или свет, то есть Слово Свое. А иж бы есь певнейши былъ, обачи оные слова, которие Апостолъ о Моисею пишеть тако: «Ашче служеніе смерти писмяны образованное на каменехъ бысть въ славе, яко немошчи было възрети сыномъ Ізраілевым на лице Моисеови славы ради лица престающчия, како не паче зело служеніе Духа будеть въ славе?» (2 Кор. 3: 4-11)

Зде славою оную ясность зоветь, которая з лица Моисеова светила, коли от Бога принесъ десятеро Божье приказанье на каменных доскахъ написаное. Тем же обычаемъ оную светлость, которую Слово Божіе на сердцахъ наших чинить, славою таки называеть и зде, и мало нижей, где тако пишеть: «Мы же вси откровеном лицемъ славу Господню възираюшче, в той же образъ образуемся от славы въ славу, яко же от Господня Духа» (2 Кор. 3: 12-18).

Потому жь Ісаіа познанье Божіе и Его Слово и светом и славою зоветь, где пишеть: «Светися, светися, Іерусалиме, пріиде бо ти свет и слава Господня на тебе въсіа. Яко бо се тма покриеть землю, и мракъ на языкы, на тебе же явится Господь» (Ісаіа 60), и прочая. Тмою и мраком неведомость о Богу зоветь, а опять, славою или светом росширенье Слова Божіа.

**ПЫТАНЬЕ**

Ешче ми и тое скажи, если ся святіи за нами Богу не молять, для чого жь Моисей у своей молитве припоминаеть Авраама, Ісаака, и Іакова, где рече: «Въспомяни Авраама, Ісаака и Ізраиля, рабы Своя, им же клялся есь Самъ Собою, глаголя: "Розмножю семя ваше яко звезды небесные"» (Исход 32).

**ОТКАЗЪ**.

Не для того припоминаеть Моисей тыхъ святых же бы ся молили, але ижь тымъ Богъ далъ былъ обетницю, яко то и с самыхъ словъ Моисеовых каждый обачити можеть. Бо припоменувши их, тутиевъ и клятву припоминаеть: «Помяни, – рече, – Господи, Авраама, Ісаака, и Ізраиля, им же клялъся еси Сам Собою, глаголя: "Розмножю семя ваше яко звезды небесные, и всю землю сию, о ней же рекох, дамъ семени вашему, и владети будете ею"». Яко бы реклъ Моисей: «Мы есмо семя Авраамле, Ісааково, и Ізраилево, которому ты, Господи, клялъся есь. Паметуй на оную клятву».

**ПЫТАНЬЕ**

А на оные слова што речешь, иде Богъ къ Іеремію рече: «Ашче

Ён разам з Айцом спрадвек меў і будзе мець вечна, каб людзі маліліся Апосталам або прызывалі іх у дапамогу. Не такую хвалу гэтае слова азначае, бо такой улады Хрыстос нікому ня дасьць ды нікога не дапусьціць быць разам зь Ім Пасярэднікам.

Але так Сын Божы просіць Айца за Апосталаў, каб яны былі адно, або адно цела, гэта значыць Ягонай Царквою. А паколькі не маглі Апосталы стацца Божай царквою без асьвячэньня або без навукі, дзеля гэтага і кажа Хрыстос, што даў ім хвалу або сьвет, гэта значыць Сваё Слова. А каб больш у гэтым пераканацца, паглядзі тыя словы, што піша Апостал пра Майсея: «Калі служэньне сьмерці, высячанае літарамі на каменьні, было так слаўным, што сыны Ізраэля не маглі глядзець на твар Майсея дзеля хвалы твару ягонага, якая прамінае, дык ці ня многа больш павінна быць слаўным служэньне Духа?» (2 Кар. 3: 7-8).

Тут «хвалою» названа сьвятло, якім зьзяў твар Майсея, калі ён ад Бога прынёс Дзесяць Божых прыказаньняў, напісаных на каменных дошках. Тым жа звычаем і тое сьвятло, што Божае Слова прыносіць у нашыя сэрцы, Апостал «хвалою» зноў жа і тут называе, калі крыху ніжэй піша: «Мы ж усе з адкрытым воблікам аглядаем хвалу Госпадаву і перамяняемся ў Ягоны вобраз з хвалы ў хвалу за справаю Госпадава Духа» (2 Кар. 3:18).

Гэтаксама Ісая пазнаньне Бога і Ягонае Слова называе сьвятлом і хвалою, калі піша: «Устань, зазьзяй Ерузалім, бо прышло сьвятло тваё і заясьнела хвала Госпада над табою. Бо вось жа цемра ахутвае зямлю і змрок – народы, а над табою заясьнее Госпад і хвала Ягоная зьявіцца над табою» (Іс. 60) і так далей. Цемраю ды змрокам ён называе няведаньне Бога, а, зноў жа, хвалою або сьвятлом – пашырэньне Слова Божага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Яшчэ мне вось што скажы: калі сьвятыя ня моляцца за нас Богу, дзеля чаго Майсей у сваёй малітве ўзгадвае Абрагама, Ізаака ды Якуба, калі кажа: «Памятай на Абрагама, Ізаака і Ізраэля, слугаў Тваіх, каторым запрысяг Ты на Самога Сябе, кажучы: “Размножу патомства вашае, як зоркі на небе”»? (Вых. 32)

**АДКАЗ**

Не дзеля таго Майсей узгадвае гэтых святых, каб мы да іх маліліся, але таму, што Бог даў ім абяцаньне, як гэта кожны можа пабачыць і са словаў самога Майсея. Бо ўзгадаўшы іх, Майсей тут жа і прысягу ўзгадвае: «Памятай, – кажа, – Госпадзе, Абрагама, Ісаака і Ізраэля, якім Ты запрысяг на Самога Сябе, кажучы: “Размножу патомства вашае, як зоркі на небе, і ўсю гэтую зямлю, каторую абяцаў, дам патомству вашаму і завалодаеце ёю назаўсёды”». Нібыта казаў Майсей: «Мы — патомства Абрагама, Ізаака ды Ізраэля, якім Ты, Госпадзе, запрысяг. Узгадай пра тую прысягу».

**ПЫТАНЬНЕ**

А на тыя словы што адкажаш, калі Бог да Ярэміі мовіў: «Нават калі

стануть Моисей й Самоилъ пред лицемъ Моимъ, не естъ душа Моя къ нимъ»,– се естъ къ Іоудеомъ? Видит ся бо, ижь Моисей и Самоилъ молятся Богу.

**ОТКАЗЪ**

Коли бы не тое слово «ашче» было положоно, ешче бы почасти трудный былъ розум тое речи. Коли бы тако Богъ поведети рачилъ: «Моисей и Самоилъ молятся за сими людми, но не оучиню на их молитву», – значило бы ся, яко Моисей и Самоилъ молятся о людех. Ныне же Богъ рече: «Ашче стануть»,– яко бы реклъ: «Не подобна речь, абы Мя кто за ними упросити могъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Яко оным отказати, которіи поведают, ижь земная по небесному, а небесная по земному?

**ОТКАЗЪ**

Которіи тако говорять, о томъ сее розумеют, ижь яко се зде естли кто къ царю или иному государю пріити хочеть, мусить черезъ врядники приступу искати, тако и къ Богу черезъ святыхъ. Леч ся тіи вельми омыляют.

Къ государю бо земскому надобе через его врадники приходити, бо и той человекъ будучи не можеть ведети, што кого долегаеть, аже мусить кто ему розказати. Богъ же каждого не токмо потребу, але и сердце весть первей, нежели сам человекъ. Къ царю не каждого пушчають, обаваючися якое льсти, и того для через врядники слухаеть подданных и судить, але къ Богу всегды отвором дверъ стоить.

Прото оу той мере небесная не по земному. Написалъ бо Пророкъ, яко Богъ рече: «Не сут съвети Мой акы съвети ваши, ни акы путие ваши тако жь путие Мои. Но елико оудаляется небо от земля, тако оудаляется путь Мой от путіи ваших» (Ісаіа 55).

**ПЫТАНЬЕ**

Вже за ласкою милосердного Бога розумею, ижь только единъ естъ ходотай нашь к Богу – Сынъ Божій Ісус Христос. Прото опустивши на сторону тую речь, навернемся опять к молитве. А наболей скажи ми, чого надобе къ молитве.

**ОТКАЗЪ**

Двух речи къ молитве надобе: смиреніа, или покори, и вери. Кто сие две речи маеть, той ся не напрасно Богу молить. О смиреніи Дух Святый тако сведчить: «Призре на смиреніе убогих Господь и неоуничижи моленіа их» (Псалом 101). О сим и Ісус Сираховичь рече: «Молитва покорнаго небеса пройдеть» (глава 35). О вере, опять, Сам Господь поведаеть: «Аминъ, глаголю вам, ашче имате верю и не оусумнитеся, не токмо смоковничное сътворите, но ашче и горе сей речете: “Двигнися и вержися в море”, будеть. И все елика ашче въпросите в молитве верующче, пріимете» (Матф. 21:18-22).

О том же и Апостолъ сведчить тако: «Ашче кто лишен естъ премуд-

Майсей ды Самуэль стануць перад абліччам Маім, ня схіліцца душа – Мая да іх», – гэта значыць, да Юдэяў? Аказваецца бо, што Майсей ды Самуэль моляцца Богу.

**АДКАЗ**

Калі б ня гэтыя словы, далучаныя напачатку, яшчэ цяжэй было б зразумець сэнс той размовы. Калі б так Бог сказаў: «Майсей ды Самуэль моляцца за гэтых людзей, але не ўчыню Я паводле іхняй малітвы», – гэта значыла б, што Майсей ды Самуэль моляцца за народ. Тут жа Бог сказаў: «Нават калі стануць»,– быццам бы хацеў сказаць: «Ніхто ня здолее ўпрасіць Мяне за гэты народ».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што адказаць тым, якія гавораць, што на зямлі – як у небе, а ў небе – як на зямлі?

**АДКАЗ**

Той, хто так гаворыць, мяркуе, што як тут, на зямлі, калі хто захоча прыйсьці да караля або іншага валадара, мусіць шукаць доступу празь ягоных служак, гэтаксама і да Бога прыходзім празь сьвятых. Аднак такі чалавек моцна памыляецца.

Да валадара зямнога трэба прыходзіць празь ягоных служак, бо чалавек можа ня ведаць, што чаго датычыцца, таму нехта мусіць яму гэта растлумачыць. Бог жа лепш за самога чалавека ведае ня толькі патрэбу, але і сэрца. Да караля ня кожнага пускаюць, баючыся якога падману, дзеля таго кароль выслухоўвае ды судзіць падданых праз сваіх урадоўцаў, але да Бога заўсёды дзьверы адчынены.

Дзеля гэтага на зямлі ня так, як у небе. Напісаў бо Прарок, што Бог сказаў: «Мае намеры — ня вашыя намеры, і вашыя дарогі — не Мае дарогі, – кажа Госпад. – Бо як неба высока над зямлёю, так выносяцца дарогі Мае ад дарог вашых, і намеры Мае – ад намераў вашых» (Іс. 55).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ужо ласкаю міласэрнага Бога разумею, што толькі адзін ёсьць у нас Пасярэднік паміж Богам і чалавекам – Сын Божы Ісус Хрыстос. Дзеля таго пакінем гэтую нашу размову ды вернемся зноў да малітвы. Перш за ўсё скажы мне: што трэба, каб маліцца?

**АДКАЗ**

Каб маліцца, патрэбныя дзьве рэчы: пакора і вера. Хто іх мае, той не надарэмна моліцца Богу. Пра пакору Дух Сьвяты так сьведчыць: «Выслухае Ён малітву гаротнікаў і не адкіне іхнія маленьні» (Пс. 101). Пра гэта і Ісус Сырахаў казаў: «Малітва пакорнага пройдзе скрозь аблокі» (Сыр. 35). Пра веру, зноў, Сам Госпад кажа: «Сапраўды кажу вам: каб мелі вы веру і не сумняваліся, зрабілі б гэта ня толькі з дрэвам фігавым, але нават каб сказалі гэтай гары: “Падыміся і кінься ў мора”, сталася б. І ўсё, пра што будзеце прасіць у малітве зь вераю, атрымаеце» (Мц. 21: 21-22).

Пра гэта ж і Апостал сьведчыць: «Калі ж каму не хапае мудрасьці, хай

рости, да просить от Бога, даюшчаго всем просто, и дастся ему, да просить же верою ничтоже сумняся. Сумняяй бо ся оуподобится волненію морскому възметаему от ветръ и развеваюшчюся» (Іак. 1: 1-16).

**ПЫТАНЬЕ**

Коли ся маемъ Богу молити?

**ОТКАЗЪ**

Нетъ того часу, которого бы есмо ласки Божій не потребовали или от неприетеля нашого безпечніи были. Прото повинни есмо ся на всякъ час молитися. Яко Христос Сам и Апостоли велели непрестанно молитися. Але ижь иного часу большие потребы и небезпеченства чуемо, прото коли наибольшую силу врага нашого увидимо, тогды теже наболей молитвы пилными быти маемъ.

Яко намъ на взоръ далъ Христос Самого Себе. Той бо ачьнольвек ся на всякій час Богу Отцю молил, а ведже на онъ час коли ся приближила мука Его и брань, или валка, з неприятелем, пилней ся молилъ, такъ иже ся кровавым потом потилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

О што або о которие речи маем ся Богу молити?

**ОТКАЗЪ**

Яко два животы маеть человекъ: одинъ – здесе, на земли, дочасны; а другый будеть на небесех вечный. А оба залежать на ласце Божіей. Прото винни есмо Бога молити напервей о вечные или о духовные речи, а потом о дочасные. Тако бо Сам Спаситель повелелъ: «Ишчете прежде Царствіа Божіа и правды его, и сіа вся (розумей — дочасная) приложатся вамъ» (Матф. 6: 31-34).

**ПЫТАНЬЕ**.

Заровно ли просити маем дочасных речи яко и вечныхъ?

**ОТКАЗЪ**

Не заровно, але иншим обычаем маем просити духовных а дочасных – иншим. Коли просимъ Бога о дочасные речи, тако просити маемъ, абы есмо предся на Его волю спушчали, абы нам далъ, естли бы Онъ рачилъ. Яко на взорь мети можешь, если кто Бога просить о здоровье, добре чинить, ижь просить, а ведже часом лепшей иному, абы хворь был. Прото кто о здоровье просить, маеть на волю Божію, яко есмъ поведелъ, припустити. Потому ся онъ прокаженый Христу молилъ, егда рече: «Господи, ашче хошчеши, можеши мя очистити» (Матф. 7: 24-8: 4). По тому жь и Сам Господь заховал ся в молитве Своей. Бо ачкольвек молилъся Отцю о отняте муки, а ведже далъ на волю Божію. Тако бо ся молил: «Отче, вся възможна Тобе, мимо неси от Мене чашу сію. Но не еже Азъ хошчю, но еже Ты хошчеши» (Марк 14:10-42).

А што есмъ о прошеніи здоровья поведелъ, тое жь о кажной дочасной речи розумети маешь. Опять, если о вечные речи Бога молимъ, вже

просіць яе ў Бога, Які дае ўсім шчодра і без дакораў, і дасьць яму. Хай жа ён просіць зь вераю, ані крыху не сумняваючыся, бо хто сумняецца, той падобны да марской хвалі, якую вецер падымае і ганяе» (Як. 1: 5-6).

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі маем маліцца Богу?

**АДКАЗ**

Няма такога часу, у які б мы не патрабавалі Божай ласкі або былі б у бясьпецы ад нашага ворага. Дзеля гэтага мусім заўсёды маліцца, бо і Сам Хрыстос, і Апосталы загадвалі, каб мы несупынна маліліся. Іншым часам мы адчуваем вялікія патрэбы ды небясьпеку, таму, калі бачым, што ўзрастае моц нашага ворага, тады таксама маем яшчэ больш маліцца.

Узор нам Сам Хрыстос паказаў: хаця Ён заўсёды маліўся Богу Айцу, але з набліжэньнем Ягонай пакуты і змаганьня, або бітвы, з ворагам, Ён так маліўся, што зь Яго цёк крывавы пот.

**ПЫТАНЬНЕ**

Пра што або пра якія справы мы маем Богу маліцца?

**АДКАЗ**

Два жыцьці мае чалавек: адно – тут, на зямлі, часовае; а другое – на небе, вечнае. Абодва яны залежаць ад ласкі Божай. Дзеля гэтага мы павінны Богу маліцца найперш пра вечныя, або духоўныя справы, а потым ужо – пра часовыя. Так бо Сам Збаўца загадаў: «Дык шукайце перш Валадарства Божага і яго справядлівасьці, а ўсё тое (значыць, часовае) будзе дадзена вам» (Мц. 6: 33).

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці аднолькава маем прасіць за справы часовыя і вечныя?

**АДКАЗ**

Не аднолькава, але адным звычаем мусім прасіць за справы духоўныя, а за часовыя – іншым. Просячы Бога за справы часовыя, мы павінны ўсё на Яго волю аддаваць, каб даў нам, калі будзе на тое Ягоная ласка. Напрыклад, калі нехта просіць Бога пра здароўе, то добра робіць, што просіць, аднак часам лепш яму застацца хворым. Дзеля таго той, хто просіць здароўя, мусіць на волю Божую, як ужо я сказаў, гэта аддаць. Тым звычаем пракажоны Хрысту маліўся, калі сказаў: «Госпадзе, калі хочаш, можаш мяне ачысьціць» (Мц. 8: 2). Тым жа звычаем і Сам Госпад маліўся, бо хаця і прасіў Айца, каб ухіліў ад Яго пакуты, але ўсё аддаў на волю Божую, так бо маліўся: «Абба Ойча! Табе ўсё магчыма, ухілі ад Мяне гэту чашу, аднак ня тое, што Я хачу, але тое, што Ты!» (Мк. 14: 36).

А тое, што я расказаў пра малітву за здароўе, мусіш меркаваць пра кожную часовую справу. Зноў жа, калі за вечныя справы Богу

не потреба с прокаженымъ говорити: «Господи, ашче Ты хошчеши», – але потреба силно и статочно просити. Бо нам тые речи Богъ певне дати обецалъ и на тое нас створилъ, абы есмо животъ вечный мели.

**ПЫТАНЬЕ**

Который ест налепшейшій способъ молитвы?

**ОТКАЗЪ**

Много ест молитовъ людей святых у Святом Писмени, а наболей в псалмех, але мусить быти съ всехъ лепшейша, которую Самъ Христос Сынъ Божій Апостоломъ подалъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Которая ест сіа молитва Господня?

**ОТКАЗЪ**

Сиа ест: «Отче нашь, иже еси на небесехъ, да святится имя Твое, да пріидеть царствіе Твое, да будеть воля Твоя, яко на небеси и на земли. Хлебъ нашь насушчный даждь нам днес, и остави нам долгы наша, яко жь и мы оставляемъ должником нашим. И не въведи нас въ напасть (искушеніе), но избави нас от лукавого. Яко Твое естъ царствіе, и сила, и слава въ векы, аминь» (Матф. 6:1-13; Лука 11:1-8).

**ПЫТАНЬЕ**

Абы порядней и к вырозуменью снадней быти могло, роздель молитву Господню на колко части.

**ОТКАЗЪ**

На осьмь частей может ся розделити молитва Господня, то естъ на предсловіе, на шесть прозбъ и на замкненье.

**ПЫТАНЬЕ**

Што называешь предсловіемъ?

**ОТКАЗЪ**

Першую часть, то естъ овы слова: «Отче нашь, иже есь на небесехъ».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для Бога называемъ Отцомъ, а не Господем?

**ОТКАЗЪ**

Христос для двух прічинъ наоучилъ нас звати Бога Отцом. Напервей, абы есмо моцней верили, иже нас выслухаеть. Бо отецъ борздей оучинить на просбу сына своего, нежели господинъ на чолом битье паробка. Другая причина, абы есмо сее ведаючи яко есмы сынове или дети Божіе, обычаем ся его приподобали. Бо на сыны правдивые а добрими родительми зрожоные, пристоить абы ся обычаевъ отцовских держали. Прото и мы симъ словом напоминаніи бываемъ, абы есмо добрие дела чинили. Бо если бы есмо добрих делъ не мели, детьми Божіеми быти не можемъ.

молімся, ужо ня трэба, як той пракажоны, гаварыць: «Госпадзе, калі Ты хочаш...» , але трэба моцна і ўпэўнена прасіць, бо нам тыя рэчы Бог напэўна даць абяцаў ды дзеля таго нас стварыў, каб мы мелі жыцьцё вечнае.

**ПЫТАНЬНЕ**

Які спосаб малітвы самы лепшы?

**АДКАЗ**

У Сьвятым Пісьме ёсьць шмат малітваў сьвятых людзей, найбольш у Псальмах, але сярод усіх найлепшая тая, якую Сам Хрыстос, Сын Божы, даў Апосталам.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ж гэта за малітва Госпадава?

**АДКАЗ**

Вось яна: «Ойча наш, Каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня; і адпусьці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад ліхога; бо Тваё Валадарства, і моц, і хвала навечна. Амін» (Мц. 6: 9-13, Лк. 11: 2-4).

**ПЫТАНЬНЕ**

Каб было больш прыдатна і проста да разуменьня, падзялі малітву Госпадаву на часткі.

**АДКАЗ**

На восем частак можна падзяліць малітву Госпадаву, гэта значыць, на пачатак, шэсьць просьбаў ды заканчэньне.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што называеш «пачатак»?

**АДКАЗ**

Першую частку, гэта значыць словы «Ойча наш, Каторы ёсьць у небе».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго называеш Бога «Айцец», а ня «Госпад»?

**АДКАЗ**

Хрыстос дзеля двух прычынаў навучыў нас зваць Бога Айцом. Першая – каб мы мацней верылі, што Ён нас выслухае. Бо бацька хутчэй споўніць просьбу свайго сына, чым гаспадар – чалабітную парабка. Другая прычына – каб ведалі, што мы сыны або дзеці Божыя ды трымаліся Ягоных звычаяў. Бо праўдзівым сынам, народжаным добрымі бацькамі, належыць трымацца бацькоўскіх звычаяў. Гэтае слова нам нагадвае, што мы мусім рабіць дабро. Бо калі ня маем добрых учынкаў, то і ня можам быць дзецьмі Божымі.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для говорити нас наоучилъ Хрістос «Отче наш», а не «Отче мой»?

**ОТКАЗЪ**

Для того, абы нас покоры и сполочное любъви наоучил. Бо естли говоришь: «Отче наш», а не «Отче мой», самъ на себе вызнаваешь, иже есь кажному человеку, бы наоубожшому, пред Богом ровен и братъ, поневажь и оубогы або калека по тому жь Бога, яко и ты, Отцомъ зоветь. Прото кто бы для богатества, або для оуроды, або наоуки иными, которіи тыхъ даров не мають, погорделъ, или их за братію свою не ставилъ, тако чинить, яко естли бы Бога за Отца своего мети не хотелъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Чому Бога на небесехъ быти исповедуем, чи ли Его зде на земли и на мори нетъ?

**ОТКАЗЪ**.

Певная речь, ижь Богъ везде естъ: на небеси, на земли, на мори, за морем, под землею и кроме небесъ, яко Пророк рече: «Камо иду от Духа Твоего и от лица Твоего камо бежъдю? Ашче взыду на небо – Ты тамо есь, ашче зниду въ адъ – тамо есь. Ашче возму криле моя рано и вселюся въ последних моря, и тамо бо рука Твоя наставить мя и оудержит мя десница Твоя» (Псалом 138). Соломон теже при обновлени оного славного храма Божія ясно в молитве своей сведчить, ижь не токмо везде Богъ ест, але ижь Его и небеса вместити не могут (3 Цар. 20, 2 Пар. 6). Прото о Богу тако домнимати маемъ и верити, ижь ест на кажном месте.

Леч зде Хрістос наоучилъ нас на небесехъ Бога Отца исповедати, абы есмо певни были, ижь не кого иного Отцомъ призываемъ разве Бога, а не телесного отца. Ешче и для тое причины на небесехъ Отца исповедуемъ, абы есмо памятали на свое повиноватество. То естъ ижь ся земными речми бавити або оуплетати не маемъ, але хотя зде живемъ, предсе о небеских речах всегды мыслити маемъ. Яко Апостолъ рече: «Наше житие на небесехъ ест, отнюду же Спасителя ждемъ Господа Ісус Хріста» (Филип. 3: 20-4: 3). А на ином месте той же Апостолъ пишеть: «Ашче въскреснусте съ Хрістом, вышних ишчете иде же ест Хрістос одесную Бога седя, вышная мудрствуете, а не земная. Оумросте бо, и животъ вашъ съкровен ест съ Хрістом в Бозе» (Кол. 2: 20-3: 3). Тая ест причина.

Прото каждый, кто схочеть сию молитву достойно къ Богу говорити и сыном Божіимъ от правды быти, маеть с собою розмышляти, естли старанья житейская и земная опустилъ, а на тое место духовная принялъ. Бо кто бы ешче небесных речей не любилъ або любити не почалъ, мало право маеть к тому Отцю.

**ПЫТАНЬЕ**

Оуже ми тепер росповежь, яко ся першая прозба розумееть, где мовим: «Да святится имя Твое»? А ведже имя Божіе давно свято.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму Хрыстос навучыў нас гаварыць «Ойча наш», а ня «Ойча мой»?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, каб навучыць нас пакоры ды любові адзін да аднаго. Бо калі ты гаворыш «Ойча наш», а ня «Ойча мой», перад самім сабою вызнаеш, што ты кожнаму чалавеку – нават самаму ўбогам – перад Богам роўны і брат, бо і ўбогі, і жабрак гэтаксама, як і ты, заве Бога «Ойча».

Таму чалавек, які дзеля багацьця, дзеля прыгажосьці або дзеля вучонасьці гардзіць тымі, хто ня мае гэтых дароў, або ня лічыць іх сваімі братамі, і Бога ня хоча мець сваім Айцом.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму вызнаём, што Бог ёсьць у небе? Хіба Яго тут або на моры няма?

**АДКАЗ**

Пэўная справа, што Бог ёсьць паўсюль: у небе, і, акрамя неба, на зямлі, на моры, за морам, пад зямлёю, як Прарок сказаў: «Куды аддалюся ад Духа Твайго? І куды ўцяку ад аблічча Твайго? Калі пайду ў неба – Ты там, калі спушчуся ў цемру – Ты там прабываеш. Хоць бы ўзяў крылы зарніцы, хоць бы апынуўся на канцы мора, таксама і там вяла б мяне рука Твая і трымала б мяне правіца Твая» (Пс. 138). Салямон таксама пры абнаўленьні слаўнага Божага храму ясна сьведчыць у сваёй малітве, што Бог ня толькі паўсюль ёсьць, але што Яго і нябёсы ня могуць зьмясьціць (1 Валад. 20; 2 Крон. 6). Дзеля гэтага пра Бога мусім так меркаваць ды верыць, што Ён ёсьць на кожным мейсцы.

Аднак тут Хрыстос навучыў нас вызнаваць, што Бог ёсьць у небе, каб мы былі пэўныя, што як Айца прызываем Самога Бога, а не айца цялеснага ці некага іншага. Яшчэ і дзеля той прычыны мы вызнаём Айца ў небе, каб памятаць на свой абавязак. Значыць, што ня маем бавіцца або абцяжарваць сябе зямнымі справамі, але што заўсёды маем, хаця мы тут жывём, думаць пра справы нябесныя, як Апостал сказаў: «Нашае ж бытаваньне – у небе, адкуль таксама чакаем Збаўцу, Госпада нашага Ісуса Хрыста» (Флп. 3: 20). А ў іншым мейсцы той жа Апостал піша: «Дык калі ўваскрэсьлі з Хрыстом, шукайце таго, што ўгары ёсьць, дзе Хрыстос сядзіць праваруч Бога, пра ўзгорнае думайце, а не пра зямное. Бо вы памерлыя і жыцьцё вашае пахаванае з Хрыстом у Богу» (Кал. 3:1-3). Вось такая прычына.

Таму кожны, хто захоча належна гэтую малітву да Бога гаварыць ды быць праўдзівым сынам Божым, мусіць у сабе разважыць: ці пакінуў ён клопаты жыцьцёвыя і зямныя ды ці прыняў на іхняе мейсца клопаты духоўныя. Бо той, хто яшчэ ня любіць справы нябесныя або яшчэ не пачаў іх любіць, мала супольнага мае з гэтым Айцом.

**ПЫТАНЬНЕ**

А цяпер мне распавядзі, як разумець першую просьбу, калі мы гаворым: «Сьвяціся імя Тваё». Імя ж Бога заўсёды сьвятое.

**ОТКАЗЪ**

Имя Божіе всегда само в собе без начала от века было, ест и будеть свято, яко Пророк рече: «Свято и страшно имя Его» (Псалом 110). Нежли того просити маемъ, абы ся теже и межи нас святило.

**ПЫТАНЬЕ**

Якъ маю сее слово розумети «святится»?

**ОТКАЗЪ**

На иных местехъ может ся инакъ розумети, але зде положено вместо ведомости. Яко бы есмо тако просили: «Да ведомо будеть всемъ имя Твое».

**ПЫТАНЬЕ**

Которое се ест имя Божие?

**ОТКАЗЪ**

Оныи речи, которихъ есть много, потребуют именъ. Яко ижь мнози суть человеци, надобе, абы кажному опрично было имя, сему – Никифорь, тому – Стефан, иному Александерь. Опять, естли которая речь естъ только сама одна, не надобе ей опричного имени ани прозвишча. Яко солнцю ненадобе другого имени, поневажь только едино ест солнце. Тако жь и Богъ единъ будучи, не потребуеть властивого имени, по котором бы Его знати. Бо хотя жь колько именъ оу Святом Писме Богу находимъ, але предся о них не тако розумети маемъ, абы властывуе имена Богу были. Бо такова имена не тако Бога, яко дела Его нам выписують. Такова имена сут: Адонай, Садай, Егова, Саваоф, Елъ или Елоимъ, Анна, Іа и прочая.

Леч сіа не сут властивая имена Богу, але для нас называется Богъ ими, абы есмо лепшей справы, силу и славу Его розумети почасти могли. Моисей о собе написалъ, ижь коли его Богъ къ царю фараону с посолством посылалъ от оного горяшчого куста, въпросилъ Бога о имя (Исход 3). И Богъ ему отказалъ: «Азъ есмъ иже есть». Іаковъ, коли спыталъ темъ же обычаемъ о имени Господа, рече ему: «Почто въпрашчаеши о имени Моемъ, еже естъ чюдно» (Быт. 32). Прото Богъ властивого имени не маеть ани потребуеть, лечь Слово Его нарицается имя Его. Бо яко по имени познаваемъ человека, тако от Слова Божія познаваемъ Бога.

Ино где просимо, абы ся имя Божіе святило, того просимъ, абы есмо и мы, и вси Бога познали. Не сушчество, ани естество Его, але любовъ, хуть, милость, волю и благодать Его. Бо ся таковым обычаемъ святить имя Божіе, коли о Немъ вемо, ижь милостивый, ласкавый, смерти грешного не хотяй. Ешче и того зде жадаемъ, абы оучители правду проповедали, ереси абы погинули и всякие съблазны или претыканья престали. Абы идолослуженіа, непобожные оученіа, человеческая преданіа и нечестивыя житья вывестися могли.

Прото если хочешь достойне сію молитву говорити, гледи жь, естли от правды жадаешь тых речей. Бо мнози тые слова на всякъ день

**АДКАЗ**

Імя Божае заўсёды, само ў сабе, беспачатна, спрадвек было, ёсьць і будзе сьвятым, як Прарок сказаў: «Сьвятое і страшнае імя Яго!» (Пс. 110) Аднак маем прасіць, каб яно і сярод нас сьвяцілася.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як маю разумець гэтае слова «сьвяціцца»?

**АДКАЗ**

У розных мейсцах Сьвятога Пісьма яно можа па-featnamу разумецца, але тут азначае «быць вядомым», нібыта мы так просім: «Няхай будзе ўсім вядомым імя Тваё».

**ПЫТАНЬНЕ**

Якое ж імя Божае?

**АДКАЗ**

Тыя рэчы, якіх ёсьць многа, патрабуюць імёнаў. Напрыклад, ёсьць шмат людзей, таму і патрэбна, каб у кожнага было сваё імя: гэтаму – Нічыпар, таму – Стэфан, іншаму – Аляксандр. Зноў, калі нейкая рэч ёсьць толькі адна, не патрэбна ёй асобнага імя або назвы. Напрыклад, сонцу ня трэба іншай назвы, бо толькі адно ёсьць сонца. Тым жа звычаем і Бог, Які ёсьць Богам адзіным, не патрабуе ўласнага імя, па якім бы Яго пазнавалі. Бо хаця і знаходзім некалькі імёнаў Бога ў Сьвятым Пісьме, аднак ня мусім іх разумець як уласныя імёны Бога. Бо гэтыя імёны – Аданай, Шадай, Ягова, Сабаот, Эль або Элахім, Анна, Іа ды іншыя – называюць ня столькі Бога, колькі Ягоныя справы.

Гэта ня ўласныя імёны Бога, Бог так называе Сябе дзеля нас, каб мы лепш маглі разумець Ягоныя справы, сілу і славу. Майсей напісаў, што, калі Бог пасылаў яго з даручэньнем да фараона, прамовіўшы з палымнеючага куста, ён спытаўся ў Бога пра імя (Вых. 3). І Бог яму адказаў: «Я – Той, Хто ёсьць». Якуб, калі спытаўся тым жа звычаем Госпада пра імя, пачуў у адказ: «Чаму пытаешся пра імя Маё? Яно дзівоснае» (Роду 32). Дзеля таго Бог ня мае ўласнага імя ды яго не патрабуе, але Ягонае Слова і ёсьць імем Ягоным. Бо як паводле імя пазнаём чалавека, так паводле Божага Слова пазнаём Бога.

Калі ж просім, каб сьвяцілася імя Божае, тое просім, каб і мы, і ўсе іншыя Бога спазналі: ня існасьць або Ягоную прыроду, але Ягоную любоў, прагненьне, міласьць, волю і ласку. Такім чынам сьвяціцца імя Божае, калі мы ведаем, што Бог міласьцівы, добры ды ня хоча сьмерці грэшніка. Яшчэ і тое мы тут жадаем, каб вучыцелі прапаведавалі праўду; каб герэзыі згінулі ды каб усякія згаршэньні або спакушэньні спыніліся; каб зьвяліся балванахвальства, чалавечыя пастановы ды бязбожнае жыцьцё.

Таму, калі хочаш належна гэтую малітву гаварыць, глядзі, ці сапраўды ты ўсяго гэтага прагнеш. Бо многа хто кожны дзень тыя словы гаворыць: «Сьвяціся імя Тваё»,– а сам так пільна, як толькі можа, стараецца імя Божая зьняславіць або патаптаць. Іншы ж, хаця і сам Слова

говорять: «Да святится имя Твое», а сами, яко напилней могуть, о том ся стареють, яко бы имя Божіе загасили або и затоптали, а иншіи, хотя жь сами не затоптываують Слова Божіего, але предся могучи ему пособити абы росло, не пособляють. А якова жь будеть таковых молитва? По тому жь и о оных розумей, которіи рекучи то ради о Божіем Слове говорити, або святые пения и псалмы пети, але житьемъ своемъ Бога и Его слово хулять и безчинствують (Ісаіа 52). О сих написано: «Имя Божіе вас деля хулится въ языцехъ» (Рим. 2:14-27).

Повиненъ бо христіанин не только словом, але и делом иных людей к вере правдивой тягнути. По слову Самого Хріста: «Тако да просветится свет вашь пред человекы, яко да видять ваша добрая дела и прославять Отца вашего, иже есть на небесехъ» (Матф. 5: 14-20). Бо тако посполите бываеть, если коли и поганецъ видить межи Хрістіанъ справедливость, покору, черезвость, милость и друголюбство, мусить добре розумети и под час говорити о Хрістянском законе, а тако святится имя Господне.

Опять, видечи несправедливость, гордость, лакомство, лупество, блудъ, пиансво и иные злости, не можеть безъ того быти, абы ся не съблазнилъ и Закона Божіа не проклиналъ. А тым обычаем хулится имя Божіе. А той, который даеть тому вину или причину, тако виненъ, яко бы самъ хулилъ Слово Божіе. Лечь о том ширей поведелъ есмъ на третее и на четвертое Слово Божіихъ заповедей.

**ПЫТАНЬЕ**

Како ся вторая прозба розумееть, се ест: «Да пріидеть Царствіе Твое»?

**ОТКАЗЪ**

Не один естъ способ Царствіа Божіа. Царствуеть Бог над всяком створеньемъ. Бо все в руках Его ест, и мусить тако чинити, яко Онъ хочеть. Пророк бо пишеть, яко Богъ, рече, велій Господь и Царь велий по всей земли. Яко в руце Его сут вся конца земли, и высоты горь Того сут. Яко Того ест море и Той створи е, и сушю руце Его създасте (Псалом 94). И полно естъ Писмо о том, яко Богъ и небом, и землею обладаеть, которое обладанье естъ царство.

Лечь ся не о томъ царстве зде розумееть, где речемъ: «Да пріидеть Царствіе Твое». Бо непотреба ся о том молити, абы Богъ Царом над всеми былъ, поневажь вже от створенья мира тако ся дееть. Ест прото и иншое Царство Божіе, или способ царствованіа, которим не над всем створеньемъ, але только над Своими избраными духовне царствуеть черезь наоуку Евангельскую.

О тое зде Царство молемъ Бога абы пришло. То естъ абы личба избраных Божих росла, а сила бесовская абы ся вывела и доконца згинула, абы Сам единъ Богъ въ правде Своей царствовалъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Чому о тое потреба просити?

Божага ня топча, але, нават калі можа дапамагчы, каб яно пашыралася, не дапамагае. Дык чаго будзе вартая такая малітва? Тым жа звычаем мяркуй і пра таго, хто радасна гаворыць пра Слова Божае, сьпявае сьвятыя гімны ды псальмы, але сваім жыцьцём зьневажае Бога і Ягонае Слова ды жыве беззаконна (Іс. 52). Пра такіх напісана: «Дзеля вас між паганаў зьневажаецца імя Божае» (Рым. 2: 24).

Павінен бо Хрысьціянін ня толькі словам, але і ўчынкам схіляць іншых людзей да праўдзівай веры, паводле словаў Самога Хрыста: «Так хай сьвеціць сьвятло вашае на віду ў людзей, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі ды хвалілі Айца вашага, Які ў небе» (Мц. 5: 16). Бо так зазвычай бывае: калі хто з паганаў бачыць сярод Хрысьціянаў справядлівасьць, пакору, цьвярозасьць, міласьць, сяброўства, то мусіць на добрае разумець ды нават гаварыць пра Закон Хрысьціянскі, – тады сьвяціцца імя Госпада.

Зноў, бачачы несправядлівасьць, пыху, хцівасьць, разбой, распусту, п'янства ды іншыя грахі, ня можа ня згоршыцца ды Закону Божага не праклясьці – такім звычаем зьнеслаўляецца імя Божае. А той, хто даў падставу зьнеслаўляць Слова Божае, вінаваты ў той жа меры, як і той, хто зьнеслаўляе Божае Слова. Аднак пра гэта я падрабязна казаў пры трэцім і чацьвёртым Божым прыказаньні.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як зразумець другую просьбу, гэта значыць: «Прыйдзі Валадарства Тваё»?

**АДКАЗ**

Не адзін ёсьць спосаб Божага Валадарства. Бог валадарыць над кожным стварэньнем, бо ўсе ў Ягоных руках і мусяць рабіць так, як Ён хоча. Прарок піша: «Бог – магутны Госпад і вялікі Валадар па ўсёй зямлі. У руцэ Ягонай усе глыбіні зямныя і высокія горы Яму належаць. Ягоным ёсьць мора, бо Ён стварыў яго, і зямлю кшталтаваў Ён Сваімі рукамі» (Пс. 94). Шмат кажа Сьвятое Пісьмо пра тое, што Бог валадарыць і ў небе, і на зямлі, — гэта і ёсьць Ягонае Валадарства.

Аднак ня гэтае Валадарства маем на ўвазе, калі гаворым: «Прыйдзі Валадарства Тваё». Ня трэба маліцца, каб Бог над усім валадарыў, бо так ужо ёсьць ад стварэньня сьвету. Ёсьць іншае Валадарства Божае, або спосаб валадараньня, калі не над усякім стварэньнем, але толькі над Сваімі выбранымі Бог валадарыць духоўна праз навуку Эвангельскую.

Вось мы і молім Бога, каб прыйшло гэтае Валадарства. Значыць, каб лічба выбраных Божых расла, а моц д'ябальская каб зьвялася ды ўшчэнт згінула, каб валадарыў адзін Бог у праўдзе Сваёй.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму трэба пра гэта прасіць?

**ОТКАЗЪ**

Бо тое не на силе нашой, але на благодати Божіей залежить.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого ешче в тыхъ словех просимъ?

**ОТКАЗЪ**

К тому што есмъ вже о духовном Царстве Хрістове поведелъ, которое на правдивой Святого Евангелія наоуце залежить, ешче и о таково Царствіе Бога Отца молемъ, абы не только въ всехъ, але и в кажномъ зособна Самъ Богъ противу греха царствовалъ. Абы нами не обладали, яко Апостолъ пишеть, грехи, але Духъ Святый съ всеми дарами Своими. «Да не царствуеть, – рече, – оубо грехъ въ мертвенемъ вашем теле послушати е в похотех его. Ни приставляйте оуды ваша оружіа неправды греху, но приставляйте себе Богови, яко от мертвых живы. И оуды ваша оружіа правде Богови. Грехъ бо вамъ не оудолееть, несте бо под Законом» (Рим. 6: 11-17).

Видишь, яко заказуеть Апостолъ, абы есмо ся под царство грехом не поддавали, але Самому Богу. Але ижь столько силы не маемъ, того для Хрістос нас тое прозбы наоучилъ, абы Царствіе Божіе пришло, то есть, абы намъ далъ Духа Святого, абы в нас добрие дела чинилъ.

Третий способъ Царствіа Божіа будеть в будушчемъ веку, коли вже опричь будуть избрани Божіи в Царстве Небесном. О чомъ Господь тако поведелъ: «Яко събирают плевелы и огнемъ съжигають я, тако будеть въ скончаніе века сего. Послеть Сын Человечьскый аггелы Своя, и съберут вся съблазны от Царствіа Его, и творяшчая безаконіе, и въвергут ихъ въ пешчь огненьную. Ту будеть плачь и скрежеть зубомъ. Тогда праведници процветутся яко солнце в Царстви Отца ихъ» (Матф. 13: 36-43).

Зде видишь велми веселую обетницю справедливымъ, се есть вернымъ. Прото потреба и о тое Бога просити, абы того дня не откладалъ, але ся с нимъ поспешилъ. Бо той день всемъ благовернымъ конецъ бедамъ, гоненью, мукам, смерти, и всемъ скорбемъ принесеть, а радости неизреченные имъ откриеть и подасть. Яко въ Откровеніи Богословъ рече: «Отиметь Господъ всяку слезу от очію их, и смерти не будеть к тому, ни плача, ни вопля, ни болезии не будеть к тому, яко первая мимо идуть» (Апокал. 21).

**ПЫТАНЬЕ**

Чого надобе человеку, абы сію прозбу достойне къ Богу говорилъ?

**ОТКАЗЪ**

Потреба, абы Царство Божіе любилъ и прішествіа его от правды жадалъ, дела добрие чинилъ а о том животе мало дбалъ. Таковъ бо с пожиткомъ сію прозбу говорить.

**АДКАЗ**

Бо гэта залежыць не ад нашай сілы, але ад ласкі Божай.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што яшчэ ў гэтых словах просім?

**АДКАЗ**

Акрамя таго, што ўжо я сказаў пра духоўнае Валадарства Хрыста, якое залежыць ад праўдзівай навукі Сьвятога Эвангельля, яшчэ мы молім Бога Айца і пра такое Валадарства, калі ня толькі над усімі, але і паасобку ў кожным стварэньні валадарыць ня грэх, але Сам Бог. Каб намі валодалі не грахі, але Дух Сьвяты з усімі Ягонымі дарамі, як Апостал піша: «Дык хай жа грэх, — кажа, — не валадарыць у вашым сьмяротным целе, каб вам не служыць пажаданьням яго. Не аддавайце граху члены вашыя на зброю, але аддавайце сябе Богу як вось тыя, што са сьмерці перайшлі да жыцьця, ды члены вашыя аддавайце на зброю справядлівасьці на службе Божай. Грэх няхай не пануе над вамі, бо вы не пад законам, але пад ласкаю» (Рым. 6:12-14).

Бачыш, забараняе нам Апостал аддаваць сябе на службу граху ды кажа служыць Самому Богу. А паколькі мы ня маем столькі сілы, дзеля таго Хрыстос навучыў нас гэтай просьбе: «Прыйдзі Валадарства Тваё»,– значыць, каб Ён даў нам Духа Сьвятога рабіць добрыя ўчынкі.

Яшчэ адзін спосаб Валадарства Божага прыйдзе ў будучым веку, калі ўжо выбраныя Божыя будуць у Валадарстве Нябесным. Пра гэта Госпад так сказаў: «Як затым зьбіраюць кукаль ды ў агні паляць, так будзе пры канцы сьвету. Пашле Сын Чалавечы анёлаў Сваіх, і яны зьбяруць з Валадарства Ягонага ўсе згаршэньні і тых, што дапускаюцца беззаконьня, і ўкінуць іх у печ агністую. Там будзе плач і скрыгатаньне зубамі. Тады справядлівыя будуць ясьнець як сонца, у Валадарстве Айца Свайго» (Мц. 13: 40-43).

Тут бачыш вельмі радаснае абяцаньне справядлівым, значыць, верным. Дзеля гэтага трэба прасіць Бога, каб Ён той дзень надалей не адкладаў, але зь ім пасьпяшаўся. Бо гэты дзень прынясе канец бедам, перасьледам, пакутам, сьмерці і ўсім цяжкасьцям верных, адкрые ды падасьць ім невымоўную радасьць, як у Адкрыцьці Багаслоў сказаў: «І абатрэ Бог кожную сьлязу з вачэй іх, і сьмерці ўжо ня будзе, ані плачу, ані галашэньня, ані болю больш ня будзе, бо гэта ўжо ўсё мінула» (Адкр. 21: 4).

**ПЫТАНЬНЕ**

Што патрэбна чалавеку, каб належна гаварыць гэтую просьбу Богу?

**АДКАЗ**

Патрэбна, каб любіў Валадарства Божае і сапраўды жадаў Ягонага прыйсьця, каб рабіў добрыя справы ды мала дбаў пра зямное жыцьцё. Тады чалавек кажа гэтую просьбу сабе на дабро.

**ПЫТАНЬЕ**

Опять, кто безъ пожитку тую прозбу говорить?

**ОТКАЗЪ**

Они напервей напрасно и съ грехом сію прозбу говорять, которіе о правдивую наоку Святого Евангелія або не дбають, або ее гонят. Потом они которіи отрекшеся на святомъ крешченіи беса съ всеми делы его, допушчают ему опять в собе черезъ розличные грехи царствовати. На остатокъ и они, которіи сесь животъ лепшей за пришлый любять яко молодые люди, лакомци, богатіи, и ини таковіи. Они же бы с того света ити не рады.

Тіи вси напрасно тые слова: «Да пріидеть Царствіе Твое»,– а не только напрасно, але и съ грехом, яко есмъ поведелъ, говорять. И далеко бы лепшей оучинили, абы их николи до оустъ не брали. Бо не можеть большее быти з Бога насмеванье, яко оное речи у Него просити, которое ненавидиши, або жадаешь абы николи не была.

**ПЫТАНЬЕ**

Третяя прозба яко ся розумееть, се ест: «Да будеть воля Твоя, яко на небеси и на земли»?

**ОТКАЗЪ**

Две воли, або два способы воли Божіей суть. Одинъ способъ – который нам ест обявленъ, а другый – который Богъ при Собе держить, ижь чинить натто ест воля или хотеніе Его. О сію волю ненадобе Бога просити, поневажь и без прозбы чинить, што рачитъ. Яко и Давыд рече: «Богъ нашь на небеси и на земли вся елика въсхоте сътвори» (Псалом 113).

Але о оную волю, которую нам Богъ оповеделъ, великая потреба молитися, абы в нас была. То естъ, абы есмо оные дела чинили, которие Онъ чинити велелъ. Бо и в нас ест воля, але наша не Божіа воля. А поневажь мы сами для скажоного прироженья зліи, ино и воля наша мусить быти злая и Божіей противная. Прото потреба молити Бога, абы нашую волю отнявши, Свою нам даровалъ, абыхмо Ему противни не были, але оное на што ест воля Его, чинили.

**ПЫТАНЬЕ**

Воля Божіа, которую нам обявилъ, на што ест або которая ест? Или чого Богъ по насъ хочеть?

**ОТКАЗЪ**

Волею Божіею часом Писмо Святое зоветь Законъ Божій. В нем бо видемо, чого Богъ хочеть абы есмо чинили, або не чинили. Яко где Давыд мовить: «К Тобе прибегох, наоучи меня творити волю Твою, яко Богъ мой еси Ты» (Псалом 142). Потомъ и иншіе суть воли Божіе. Яко где Хрістос рече: «Се же естъ воля пославъшаго Мя Отца, да все еже дасть Ми, не погублю от Него, но въскрешу е въ последный день. Се же ест воля пославшаго Мя, да всяк видяй Сына и веруя в Него,

**ПЫТАНЬНЕ**

Зноў, хто надарэмна гэтую просьбу гаворыць?

**АДКАЗ**

Той, перадусім, надарэмна ды сабе на грэх гаворыць гэтую просьбу, хто або ня дбае пра праўдзівую навуку сьвятога Эвангельля, або яе гоніць. Потым – той, хто падчас сьвятога хросту выракаецца д'ябла ды ўсіх ягоных справаў, а потым праз розныя грахі зноў дазваляе д'яблу ў сабе валадарыць. Нарэшце, і той надарэмна гэтую просьбу кажа, хто любіць гэтае жыцьцё болей за будучае, напрыклад, маладыя людзі, хціўцы, багацеі ды іншыя, хто з гэтага сьвету пайсьці ня рады.

Усе яны надарэмна гавораць тыя словы: «Прыйдзі Валадарства Тваё»,– ды ня толькі надарэмна, але і на грэх, як ужо я сказаў. І нашмат лепш яны б зрабілі, калі б ніколі гэтыя словы не казалі, бо ня можа быць большай насьмешкі з Бога, чым прасіць у Яго тое, што ненавідзіш, ці тое, што ня хочаш, каб сталася.

**ПЫТАНЬНЕ**

Трэцюю просьбу як зразумець, значыць: «Будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі»?

**АДКАЗ**

Ёсьць дзьве волі, або два спосабы Божай волі. Першы спосаб – што нам аб'яўлены, а другі — што Бог у Сабе трымае, калі чыніць тое, на што ёсьць воля або жаданьне Ягонае. Пра гэтую волю ня трэба Бога прасіць, бо і бяз просьбы Ён зробіць тое, што хоча, як Давід сказаў: «Бог наш у небе; усё, што захоча, Ён зробіць» (Пс. 113).

Але пра тую волю, што Бог нам аб'явіў, трэба моцна маліцца, каб яна ў нас была, значыць, каб мы тыя справы рабілі, якія Бог загадаў рабіць. Бо і мы маем волю, але нашая воля – ня Божая воля. А паколькі мы самі, дзеля нашай скажонай натуры, благія, то і воля нашая мусіць быць благая і супярэчыць Божай. Вось таму трэба маліць Бога, каб, забраўшы нашую волю, даў нам Сваю, каб мы Яму не супярэчылі, але рабілі паводле Ягонай волі.

**ПЫТАНЬНЕ**

На што ёсьць воля, якую нам Бог аб'явіў, або чаго Бог ад нас хоча?

**АДКАЗ**

Воляю Божай Сьвятое Пісьмо часам называе Закон Божы. У ім бо мы бачым, што Бог хоча, каб мы рабілі або не рабілі, як Давід кажа: «Навучы мяне спаўняць волю Тваю, бо Ты Бог мой» (Пс. 142). Таксама ёсьць і іншая Божая воля. Напрыклад, калі Хрыстос казаў: «А воля Таго, Які Мяне паслаў, каб Я нікога ня страціў з тых, якіх Ён Мне даў, але ўваскрасіў іх у апошні дзень. Гэта воля Айца Майго, каб кожны, хто глядзіць на Сына і верыць у Яго, меў жыцьцё вечнае; і Я яго ўваскрашу ў апошні дзень» (Ян 6: 39-40). Тут бачыш, што ёсьць Божая воля на тое, каб ніводзін чалавек ня згінуў, але каб усе верылі ў Сына Ягонага ды так мелі вечнае

имать животъ вечный, и въскрешу его Азъ въ последный день» (Іоанн 6: 27-40). Зде видишь, ижь на тое ест воля Божіа, абы ни одинъ не згинулъ человекъ, але абы вси верили в Сына Его, и тако бы вечны животъ мели. О томъ и Апостолъ сведчить, яко Богъ хочеть всем человекомъ спастися, и в разумъ истине пріити (1 Тім. 2: 1-15).

Опять, другая Божіа воля ест, абы есмо оуверивши Святому Еваггелію, добріе дела чинили и весь животъ нашь по заповедемъ Божіим отновили. О таковой воли пишеть Апостолъ: «Тако, – поведаеть, – ест воля Божіа благотворяшчимъ обуздовати безумных человекъ невежество. Яко свободни, а не яко прикровеніе имушче злобе свободу, но яко рабы Божіи вся чтете, братство възлюбете, Бога боитеся, царя чтите» и прочая (1 Петра 2: 1-20). По тому же и другый Апостолъ пишеть: «Се естъ, – кажеть, – воля Божіа, святьба ваша, хранити себе вам от блуда и ведети, комуждо васъ свой сосудъ стежати въ святини и чести, не въ страсти похотней, яко же языцы неведяшчеи Бога, ниже преступати и лихоимствовати вешчи брата своего» (1 Сол. 4: 1-12).

Ова Апостоли сведчать, ижь воля Божія есть, абы каждый злости ся выстерегалъ, и животъ чистъ и побожный жилъ. Ешче и того Богъ по насъ хочеть, абы есмо крестъ, се ест, всякие трудности, которие бы на нас клалъ, вдячне пріимали и на волю Божію все спушчали обычаемъ Самого Христа, Который видячи пред Собою страшную и великую муку, молилъ Бога о отложенье тое муки, але предся пустилъ тое на волю Божію. Тако бо молился: «Отче Мой ашче не можеть сіа чаша мимо ити от Мене, буди воля Твоя» (Матф. 26: 6-56, Марк. 14: 10-42, Лука 22: 39-71). По тому жь и они оученници оучинили, которіи Павла намовляли, абы въ Іерусалимъ не шолъ, оувидевши сталость его, рекли: «Господня воля да будеть» (Деан. 21: 7-25).

**ПЫТАНЬЕ**

Кто с пожиткомъ сию прозбу говорить?

**ОТКАЗЪ**

Кто свое недостоинство и грехи на себе самъ знаеть, грехов ся каеть, въ Христа веруеть, Еваггельскую наоуку пріимаеть, добріе дела чинить, тело свое в чистоте или свободного девства заховуеть, а штокольвекъ на него Богъ допушчаеть, з радостію трънить и Его благодарить.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто сію прозбу напрасно к Богу говорить?

**ОТКАЗЪ**

Онъ, кто себе за справедливаго и невинного пред Богом менить. Або естли грехомъ оставленіа или спасеніа черезъ што иного, нежели черезъ единаго Христа, ишчеть. Ешче кто похотямъ телесным волю даеть. На остатокъ, кто шкоды, хворобы, гоненья для правды, и иныхъ таковыхъ не радъ терпети. Таков каждый не тольки напрасно, але и з грехомъ сію прозбу говорить. Бо своее воли, не Божіей ишчеть.

жыцьцё. Пра гэта і Апостал сьведчыць, што Бог хоча, каб усе людзі збавіліся і прыйшлі да спазнаньня праўды (1 Цім. 2: 4).

Зноў, ёсьць воля Божая, каб мы, паверыўшы Сьвятому Эвангельлю, рабілі добрыя справы і ўсё нашае жыцьцё аднавілі паводле Божых прыказаньняў. Пра такую волю піша Апостал, так кажучы: «Бо такая воля Божая, каб вы добрымі ўчынкамі затыкалі вусны невуцтву неразумных людзей. Як людзі свабодныя рабіце, ды не як тыя, для якіх свабода ёсьць апраўданьнем зла, але як слугі Божыя. Усіх паважайце, братоў любіце, Бога бойцеся, валадара шануйце ...» ды так далей (1 Пт. 2:15-17). Гэтаксама і другі Апостал піша: «Бо воляй Божай, — кажа, — ёсьць сьвятасьць вашая, каб высьцерагаліся распусты, каб кожны з вас трымаў сваё начыньне ў сьвятасьці і ў пашане, а не ў пажадлівасьці юрлівай, як пагане, якія ня ведаюць Бога; каб ніхто не вывышаўся і ня крыўдзіў у справах брата свайго» (1 Тэс. 4: 3-6).

Абодва Апосталы сьведчаць, што ёсьць Божая воля, каб кожны сьцярогся благога ды вёў жыцьцё чыстае і пабожнае. Яшчэ і таго Бог ад нас хоча, каб мы крыж, значыць, усялякія цяжкасьці, што Ён на нас ускладае, удзячна прыймалі ды на волю Божую спадзяваліся, маючы за прыклад Самога Хрыста. Ён бачыў перад Сабою страшную і вялікую пакуту і маліў Бога, каб захаваў Яго ад той пакуты, але наперад Ён усё аддаў у рукі Божыя, так бо маліўся: «Ойча Мой, калі магчыма, ухілі ад Мяне гэты келіх, але не як Я хачу, але як Ты» (Мц. 26: 39; Мк. 14: 36; Лк. 22: 42). Таксама зрабілі і вучні, якія намаўлялі Паўлу не ісьці ў Ерузалім, але, ўбачыўшы ягоную рашучасьць, усе сказалі: «Хай станецца воля Госпада!» (Дзеі 21:14).

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто кажа гэтую просьбу сабе на дабро?

**АДКАЗ**

Той, хто ўсьведамляе свае недасканаласьць і грахі, каецца ў грахах, верыць у Хрыста, прыймае Эвангельскую навуку, робіць добрыя справы, захоўвае сваё цела ў чыстасьці ці ў дабравольна прынятым дзявоцтве, а калі што-кольвек Бог дапускае ў ягоным жыцьці, з радасьцю тое церпіць і Яму дзякуе.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто гэтую просьбу кажа да Бога надарэмна?

**АДКАЗ**

Той, хто ўважае сябе перад Богам за справядлівага і бязьвіннага. Або той, хто шукае прабачэньня грахоў ці збаўленьня ў нечым іншым, а ня толькі праз Хрыста. Яшчэ той, хто дае волю пажаданьням цела. Ды, нарэшце, той, хто ня зносіць цярпліва шкоды, хваробы, перасьледаў за праўду ды падобнага ня церпіць. Кожны такі чалавек ня толькі надарэмна, але і на грэх гэтую просьбу кажа, бо шукае сваю волю, а ня Божую.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого не просто просимъ: «Да будеть воля Твоя»,— але прикладаемъ: «Яко на небеси и на земли»?

**ОТКАЗЪ**

На небеси суть аггели святіи, которіи поневажь не изменили естества своего яко человекъ, для тое теже причины не мают в собе воли злое или Богу противной. Прото где речемъ: «Яко на небеси и на земли» тако ся розумееть, яко бы есмо рекли: «Дай, Боже, абы есмо тако Тобе послушніи были зде, на земли, яко на небеси аггели въ всемъ Тобе суть послушніи».

**ПЫТАНЬЕ**

Чого просимъ в четвертой прозбе, где мовимо: «Хлебъ нашь насушчный дай намъ днесь»?

**ОТКАЗЪ**

Яко в першихъ прозбахъ просимъ Бога о небесные речи, которіе належат къ славе Божіей, тако у сей прозбе просим о речи дочасные. Хлебом бо всякіе живности и вси того живота потребы называемъ, яко подворе, жону, мужа, семью, статок, суседа, господаря, дети, збожія, дождъ, ведро, покой или мирь, здоровье и все, без чого сей живот нашь быти не можеть.

А ведже предся и о духовный хлебъ предъкомъ просимъ. То есть о Слово Божіе, абы его нам Богъ милосерный на всякъ часъ узычалъ. Бо яко съ двухъ речей человекъ ест зложонъ, се есть, з души и с тела, тако потреба двоякого корменіа, или хлеба. Души духовного хлеба, се ест Слова Божіа, телу пакъ телесного, то есть, ести, пити и у чомъ ходити.

**ПЫТАНЬЕ**

Годит ли ся у Бога речей дочасныхъ, или хлеба телесного, просити? Бо ми ся видить, ижь нам того възбраняеть Господь где рече: «Не пецетеся душею вашею, или что пиете, ни телом вашем въ что облечетес» (Матф. 6: 31-34). И опять рече: «Ишчате преже Царствіа Божія и правды его, и сіа вся приложатся вамъ». К тому Давыд припеваетъ: «Възверзи на Господа печалъ свою, и Той тя препитаеть» (Псалом 55). Не рече бо: «Молися Богу о препитаніи», но: «Възверзи печаль свою».

**ОТКАЗЪ**

Где Христос възбраняет печися душею кое теломъ, не тако ся розумеет, абы ся о потребы телесные молити не потреба, але хочеть по нас, абы есмо ся на свой промыслъ не надеяли, абы есмо за таковым опеканьемъ Бога не забыли. Прото не рече: «Не молитеся о том, што бы вамъ ести», але: «Не пецетес». Потому жь и оное слово: «Ишчете преже Царствіа Божіа» не възбраняет молитися Богу о потребы телесные, але оуказуеть яко болшей ся трудити маемъ о Царство Божіе и правду его, нежели о выхованіе. Того для не рече: «Ишчете разве Царствіа Божіа и правды его», но рече: «Ишчите преже Царствіа Божіа».

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго мы ня кажам проста: «Будзь воля Твая»,— але дадаём: «Як у небе, так і на зямлі»?

**АДКАЗ**

У небе жывуць сьвятыя анёлы, якія, у адрозьненьне ад чалавека, не зьмянілі сваю сутнасьць. Дзеля гэтай прычыны яны ня маюць у сабе жаданьняў благіх ці Богу праціўных. Таму, калі мы кажам: «Як у небе, так і на зямлі»,– тое ж самае маем на ўвазе, што і калі б казалі: «Дай Божа, каб мы былі так паслухмянымі Табе тут, на зямлі, як у небе анёлы ва ўсім Цябе слухаюцца».

**ПЫТАНЬНЕ**

Што мы просім у чацьвёртай просьбе, калі кажам: «Хлеб наш штодзённы дай нам сёньня»?

**АДКАЗ**

Як у папярэдніх просьбах мы просім Бога пра рэчы духоўныя, якія належаць да славы Божай, так у гэтай просьбе мы просім пра рэчы мінаючыя. Хлебам бо называем усё жыцьцё і кожную жыцьцёвую патрэбу: падворак, жонку, мужа, сям'ю, статак, суседа, валадара, дзяцей, збожжа, дождж, пагоду, супакой або мір, здароўе ды ўсё іншае, без чаго гэтае нашае жыцьцё на гэтым свеце ня можа абыйсьціся.

Але перадусім просім пра хлеб духоўны, значыць, пра Божае Слова, каб міласэрны Бог даваў яго нам ўсякі час. Бо раз чалавек складаецца зь дзьвюх частак – з душы і зь цела, – то патрабуе двааякага харчу, або хлеба. Душы – духоўнага хлеба, значыць, Слова Божага. Целу – цялеснага, значыць, ежы, пітва ды адзеньня.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці належыць прасіць у Бога рэчы мінаючыя ці хлеб цялесны? Бо мне здаецца, што нам гэта Госпад забараняе, калі гаворыць: «Дык не клапаціцеся таму, кажучы: "Што будзем есьці?", або "Што будзем піць?", або "Ў што будзем апранацца?"» (Мц. 6: 31). Ды далей Ён сказаў: «Дык шукайце ж перш Валадарства Божага і яго справядлівасьці, а ўсё тое будзе дадзена вам». Дарэчы, і Давід сьпявае: «Пакінь бярэмя тваё на Госпада, Ён цябе забясьпечыць» (Пс. 55). Не сказаў бо Давід: «Маліся Богу, каб даў табе есьці», але: «Пакінь бярэмя тваё на Госпада».

**АДКАЗ**

Калі Хрыстос забараняе клапаціцца як пра душу, так і пра цела, Ён ня мае на ўвазе, што ня трэба маліцца пра цялесныя патрэбы, але Ён хоча, каб мы на свой розум не спадзяваліся ды каб мы за сваімі клопатамі не забыліся на Бога. Таму Хрыстос не сказаў: «Не маліцеся пра тое, каб было вам што есьці», але: «Не клапаціцеся». Гэтаксама і тое слова: «Шукайце перш Валадарства Божага» не забараняе нам маліцца Богу пра цялесныя патрэбы, але паказвае нам, што больш працаваць мусім дзеля Валадарства Божага і праўды яго, чым для свайго жыцьця. З гэтай

Паметуй тое слово «преже». Бо для того е Господь приложилъ, абы кто не домнемалъ, яко непотреба николи або робити, або ся о дочасныя молити. «Ишчете, – поведаеть, – преже (или напередъ) Царствіа Божіа и правды его»,– яко бы реклъ: «А опосле искати будете, што вамъ ясти, пити и одеватися». На тот же обычай и речь Давыдову розумей (Псалом 55). Не запрешчает молитися, ани делати, але повелеваеть на Бога надеятися, и от Него выхованья ждати. А для лепшое певности обачь и причины, для которих винни есмо Богу молитися о речи дочасные, потомъ обачь и повеленіе Слова Божіего. Наостатокъ взорь святыхъ, которіи ся молили о дочасные речи.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого бы ся намъ потреба о речи дочасные молити, поневажь Самъ Богъ ведаеть, чого намъ надобе?

**ОТКАЗЪ**

Ачкольвекъ Богъ ведаеть, чого намъ потреба первей, нежели мы сами, а ведже хочеть, абы есмо у Него просили. Не для Себе, але для насъ и для нашого пожитку, который к намъ приходить, коли ся Богу о дочасные речи молимъ.

Первый пожитокъ естъ: коли просимъ о дочасные речи, познаваемъ великій свой недостатокъ и убожество или калечство, ижь в рукахъ своих ничого не маемъ. Тако ижь естли бы не ласка Божіа, мусе ли бы есмо из голоду померети. Пожитокъ, мовлю, той есть немалый, абы есмо о собе высоко не держали, але всю надежю на Бога покладали, и Его благодарили и славили, яко от Него вся маемъ, по Апостолу глаголюшчу: «Что имаши, его ж не принял есь?» (1 Кор. 4: 1-8).

Другый пожитокъ, коли ся о речи дочасные молимъ, ест ижь потому вырозумеваемъ, яко не от шчастья, але от Бога таковых речей надеятися маемъ. Третій пожитокъ или причина, для чого просити Богъ велелъ речей дочасных, ест сиа иже ся темъ обычаемъ вера о благодати Божіей къ намъ острить и оукрепляетъ або ростеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Укажи ми Писмо, где бы намъ повелено дочасныхъ потребъ просити?

**ОТКАЗЪ**

На многых местехъ о том Писмо Святое пишеть, яко Духъ Святый речи дочасныхъ просити велить. Яковые суть мирь или покой, погода, выживенье и прочая. О мире Давыдом речено быс: «Просите яже о мире суть Іерусалиму, и обиліе буди любяшчим тя. Да будеть мирь в силе твоей, и обилие въ столпех твоих» (Псалом 121).

О том же и Апостолъ повелеваеть: «Молю, – кажеть, – преже всего творити молитвы и моленіа, прошеніа, благодареніа за вся человекы. За царя и за вся яже въ власти сушчих, да тихо и безмолвено житие поживемъ» (1 Тім. 2: 1-15). Захаріа известно о дождъ Бога про-

прычыны Хрыстос не сказаў: «Хіба што шукайце Валадарства Божага і праўды яго»,– але сказаў: «Шукайце перш Валадарства Божага».

Памятай на гэтае слова «перш». Дзеля таго Госпад яго далучыў, каб хто часам не падумаў, што ня трэба працаваць і ня трэба маліцца пра рэчы мінаючыя. «Шукайце, – кажа, – перш Валадарства Божага і праўды яго»,– быццам бы хоча сказаць: «А потым шукаць будзеце, што вам есьці, піць і ў што апранацца». Тым жа звычаем і словы Давіда разумей (Пс. 55). Не забараняе ён ані маліцца, ані працаваць, але загадвае спадзявацца на Бога ды ад Яго чакаць падтрымкі. А дзеля большай пэўнасьці разгледзь прычыны, дзеля якіх мы павінны маліцца Богу пра рэчы мінаючыя, потым зваж на загад Слова Божага, ды, нарэшце, на прыклад сьвятых, якія маліліся пра рэчы мінаючыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго мы павінны маліцца пра рэчы мінаючыя? Бог і Сам ведае, што нам патрэбна.

**АДКАЗ**

Хаця Бог ведае перш, чым мы самі, што нам патрэбна, усё адно Ён хоча, каб мы гэта ў Яго прасілі. Не дзеля Самога Сябе, але дзеля нас і дзеля нашага здабытку, які мы атрымліваем, калі молімся Богу пра штодзённыя рэчы.

Першы здабытак — калі мы просім Бога пра рэчы штодзённыя, то дазнаём сваю вялікую недасканаласьць і ўбоства або калецтва, што ў сваіх руках анічога ня маем, ды калі б ня ласка Божая, мусілі б мы з голаду памерці. Здабытак гэты, кажу, не малы, бо тады мы пра сябе высока ня думаем, але ўсю надзею ўскладаем на Бога, Яму дзякуем і Яго славім, бо усе маем ад Яго, паводле Апостала, які кажа: «Ды што ты маеш, чаго б не атрымаў?» (1 Кар. 4: 7).

Другі здабытак — калі мы молімся пра рэчы штодзённыя, тады разумеем, што не ад шанцаваньня, але ад Бога яны паходзяць. Трэці здабытак або прычына, дзеля якой Бог загадаў прасіць пра рэчы штодзённыя, – бо ў нас такім звычаем вера ў ласку Божую вострыцца і ўзмацняецца або расьце.

**ПЫТАНЬНЕ**

Пакажы мне, дзе ў Сьвятым Пісьме нам загадана маліцца пра штодзённыя патрэбы?

**АДКАЗ**

Многія мейсцы Сьвятога Пісьма сьведчаць, што Дух Сьвяты загадвае маліцца пра штодзённыя рэчы: пра мір або супакой, надвор'е, ежу ды іншае. Пра мір Давід казаў: «Прасеце супакою дзеля Ерузаліму! Няхай мір маюць тыя, што любяць цябе. Супакой няхай будзе ў мурох тваіх, мір у харомах тваіх» (Пс. 122).

Пра гэта і Апостал загадвае: «Дык прашу найперш, — кажа, — каб

сити велить, где рече: «Просите от Господа въ время дожда ранна и позна, Господь створи виденіа и дождь» (Зах. 10).

Самъ Господь рече: «Молитеся да не внидете в напасть» (Матф. 26: 6-56). Напасть бо не тольки ест духовная, но и телесная. Прото вже явно, ижь маемъ повеленіе Божіе, абы есмо потребъ дочасныхъ от Бога просили.

**ПЫТАНЬЕ**

Ешче доведи Писмом, естли ся святіи о дочасныхъ речахъ Богу молили, и были выслухани.

**ОТКАЗЪ**

Певная речь, ижь ся молили о дочасные речи святіи Пророци и Апостоли. И всегды Богъ на их молитвы чинилъ, хыба естли с нихъ который не обычайне или непотребне чого просил, таковы не оуслышанъ. Яко Зеведеовым сыномъ речено быс: «Не веста чего просита» (Марк 10: 32-45), а богородицы: «Что естъ Мне и тебе жено?» (Іоан 2: 1-11). Іона ачкольвекъ не просилъ словы, абы Ниневин город пропалъ, але ижь того с хути чаялъ, вместо молитвы хуть его была, но омылился на томъ, не погубилъ бо Господь Ниневина ему к воли (Іона 4).

Але кольки пристойныхъ речей святіи просили, не были опушченіи. Просилъ Моисей о здоровье сестры своей Маріамы, и выслухалъ Богъ прозбу его (Числа 12). Молился той же за людьми Ізраилевыми, и не потребилъ оных Богъ молитвы его для (Исход 32). Той же молитвою победилъ Амалеха (Исход 16). Иліа молился о дождь, и былъ дождь. Езекия царь молился о должеишый животъ, и приложилъ ему Богъ 15 летъ над векъ его. Соломон просилъ абы на него нишчета не пришла, и услышалъ Богъ (Притч. 30).

Не меншей знайдешь и в Новым Завете, яко благочестивіи просили о дочасные речи, и выслухалъ их прозбы Господь. Просилъ сотник здоровья отроку или слузе своему, и исцелилъ его Христос (Матф. 8). Просилъ живота дочце Іаирь, и оживилъ ю Господь (Марк 5). Просили слепци Іерихонскіе прозрети, и прозрели (Лука 18). Просилъ Павелъ и за собою, и за дружиною, абы не погинули на мори, и оуслышалъ его Богъ (Деан. 27), и даровалъ ему всех плаваюшчих с нимъ, ижь ни одинъ не згинулъ.

Прото маючи и повеленіа, и обетници, и святыхъ взори, винни есмо молити Бога не о духовных только, но и о дочасныхъ, понеже по Апостолу «благочестіе или благоверіе обетованіе имат и нынешней, и будушчей жизни» (1 Тім. 4: 4-5: 10). Только нехай кождый на тое, што есмъ вышей поминалъ, паметуеть, абы первей вечныхъ потребъ, нежели дочасныхъ просилъ. Ешче абы на волю Божію спушчалъ. Над то абы оное речи у Бога не просилъ, которая бы або противу Божіа славы, або ближного пожитка была.

заносілі просьбы, малітвы, умольваньні і падзякі за ўсіх людзей. За валадароў і за ўсіх тых, што знаходзяцца пры ўладзе, каб маглі мы весьці жыцьцё спакойнае» (1 Цім. 2:1-2). Захарыя, як вядома, загадвае прасіць Бога пра дождж, калі кажа: «Прасеце ў Госпада дажджу у час раньняе вясны. Госпад блісьне маланкаю і дасьць дождж з хмараў кожнай расьліне ў полі» (Зах. 10).

Сам Госпад казаў: «Маліцеся, каб не папалі вы ў спакусу» (Мц. 26:41). Спакуса ж бывае ня толькі духоўная, але і цялесная. З гэтага ўжо яўна, што Госпад загадвае нам прасіць Яго пра штодзённыя патрэбы.

**ПЫТАНЬНЕ**

Яшчэ давядзі зь Пісьма Сьвятога, ці сьвятыя малілі Бога пра штодзённыя патрэбы і ці былі выслуханы?

**АДКАЗ**

Пэўная рэч, што сьвятыя Прарокі ды Апосталы маліліся пра штодзённыя справы, і заўсёды Бог рабіў паводле іхняй малітвы. Хіба толькі калі хто зь іх прасіў цудаў або штосьці непатрэбнае, тады ня быў выслуханы, як сынам Зэбэдэя было сказана: «Ня ведаеце, пра што просіце» (Мк. 10: 38), а багародзіцы: «Што Мне і табе, жанчына?» (Ян 2: 4). Ёна хаця і прасіў, каб Ніціва загінула, але Госпад ня зьнішчыў Ніціву паводле Ёнінай просьбы. Бо Ёна прагнуў таго па сваёй волі, замест малітвы было ягонае жаданьне, у якім ён памыляўся (Ёна 4).

Але калі сьвятыя прасілі адпаведныя рэчы, заўсёды былі выслуханы. Прасіў Майсей пра здароўе сваёй сястры Мірыям, і выслухаў Бог ягоную просьбу (Лічбы 12), маліўся за народ Ізраэльскі, і ня зьнішчыў Бог народ дзеля ягонай малітвы (Вых. 32). Ён жа малітваю перамог Амалека (Вых. 16). Ільля маліўся пра дождж, і быў дождж. Валадар Эзэкія маліўся пра даўжэйшае жыцьцё, і далучыў яму Бог пятнаццаць гадоў да ягонага веку. Салямон прасіў, каб не дажыцца да жабрацтва, і пачуў яго Бог (Прып. 30).

Ня менш прыкладаў знойдзеш і ў Новым Запавеце, як багабойныя людзі прасілі пра штодзённыя справы, і Госпад выслухоўваў іхнія просьбы. Прасіў сотнік здароўя юнаку, слузе свайму, і аздаравіў яго Бог (Мц. 8). Прасіў Яір жыцьця дачцэ, і ажывіў яе Госпад (Мк. 5). Прасілі сьляпыя ў Ерыхоне, каб бачыць, і адкрыліся іхнія вочы (Лк. 18). Прасіў Паўла і за сябе, і за спадарожнікаў, каб не загінуць на моры, і пачуў яго Бог, і падараваў яму ўсіх, хто плыў разам зь ім, так што ніводзін зь іх не загінуў (Дзеі 27).

Дзеля таго, маючы і загады, і абяцаньні, і прыклады сьвятых, мы павінны маліцца Богу ня толькі пра справы духоўныя, але і штодзённыя, бо, паводле Апостала, пабожнасьць, або багабойнасьць, мае абяцаньне і ў жыцьці цяперашнім, і ў будучым (1 Цім. 4:8) Толькі няхай кожны памятае на тое, што я вышэй узгадаў, ды перш просіць пра патрэбы жыцьця вечнага, а не цяперашняга. Яшчэ хай усё аддае на Божую волю. Ды няхай ня просіць у Бога таго, што шкодзіць Божай славе або карысьці бліжняга.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли у той прозбе просимо хлеба телесного или иныхъ всех того живота потребъ, для чого жь Христос придалъ оное слово «насушчного»? Бо ся мне видить, ижь тое слово того для приложилъ, абы кто о простомъ хлебе не розумелъ.

**ОТКАЗЪ**

Оуже есмъ поведелъ, ижь того не запераю, яко в той прозбе напервей о духовный хлебъ Бога просимо, а потомъ и о земскій или телесный. И дал есмъ того причину, чого для двоякого хлеба просимъ. Тое пак слово «насушчного» не для тое вины Господь приложилъ, абы есмо только духовного хлеба просили, але абы есмо о обеюхъ розумели и обеюхъ просили. Греческое бо слово «епіоусіон» может ся розумети и «насушчный», и «вседневный».

Насушчный бо хлебъ слушно можеть быти названо Слово Божіе, яко большей сушчесътвяного хлеба есть, понеже душю питаеть. Вседневный же хлеб и Слово Божіе, и телесное брашно, или корменіе названо быти можеть. Бо за одно яко души, тако телу ести потреба. Але черезъ яденіе вси потребы розумей, и самый животъ или житіе.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для не наоучилъ нас Господь говорити просто: «Хлеб насушчный дай намъ днес»,– але приложилъ «нашь» – «хлебъ нашь»?

**ОТКАЗЪ**

Не без причины сее слово «НАШЬ» приложилъ Господь. Бо хотя жь о духовный хлебъ, то есть о Слово Божіе просимъ, добре прикладаемъ сее слово «НАШЬ». Бо намъ только человекомъ, намъ, самымъ Христяном, належить. Мають и нечестивіи хлебъ то есть, наоуку, але имъ болшей шкодить, нежели помагаеть. Яко царь и Пророк рече: «Поведаша ми законно преступници глумленіа, но не яко Законъ Твой» (Псалом 118). Прото нашь есть хлебъ Слово Божіе, который ему веруем.

Опять, хотя жь о телесный хлебъ тыми словы просим, предся оное слово «НАШЬ» место свое маеть. Не чужого бо хлеба у Бога просити маемъ, але нашого. Нашь есть хлебъ, естли его потом добываемъ. Чужый, естли безъ працы нашое хитростію только его оуживаемъ. Самъ бо Вседержитель на всего Адама той законъ възложилъ: «В поте лица твоего снеси хлебъ твой» (Быт. 3).

**ПЫТАНЬЕ**

Чого для не просто говоришь: «Хлебъ нашь насушчный дай намъ навеки», але «днесь» или на всякъ день?

**ОТКАЗЪ**

Тако нас Христос говорити наоучилъ, абы есмо только на день хлеба просили. Не иж бы его напотомъ не потреба, але абы есмо собе в симъ животе долгого веку не обецовали, ани ся на земли оу безпеченство вдавали. Але абы есмо сей животъ и светъ вместо гостины почитали.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі ў гэтай просьбе мы молімся пра хлеб цялесны, або пра ўсе жыцьцёвыя патрэбы, дзеля чаго Хрыстос далучыў тое слова «штодзённы»? Бо мне падаецца, што тое слова Ён далучыў толькі таму, каб хто часам не падумаў пра хлеб звычайны.

**АДКАЗ**

Ужо я казаў, і таго не выракаюся, што ў гэтай просьбе мы найперш просім Бога пра хлеб духоўны, потым і пра зямны, цялесны. І паказаў я прычыну, дзеля якой мы просім дваякага хлеба. Тое ж слова «штодзённы» Госпад далучыў не таму, каб мы прасілі толькі духоўнага хлеба, але каб пра дваякі хлеб ведалі ды пра дваякі хлеб маліліся. Грэцкае бо слова «епіусіон» можна разумець і як «неабходны», і як «штодзённы».

Неабходным бо хлебам слушна можна назваць Слова Божае: яно большае за хлеб цялесны, бо насычае душу. Штодзённым жа хлебам можна назваць і Слова Божае, і ежу цялесную, або харчаваньне, бо харчавацца аднолькава патрэбна як душы, так і целу. А ежа цялесная азначае ўсе жыцьцёвыя патрэбы і само жыцьцё.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго не навучыў нас Госпад казаць проста «хлеб штодзённы дай нам сёньня», але далучыў «наш» – «хлеб наш»?

**АДКАЗ**

Не без прычыны далучыў Госпад гэтае слова «НАШ». Хаця мы просім пра духоўны хлеб, значыць, пра Слова Божае, дарэчы далучаем гэтае слова «НАШ», таму што нам толькі, людзям, нам, самім Хрысьціянам, ён належыць. Маюць і грэшнікі хлеб, значыць, навуку, але ім яна больш шкодзіць, чым дапамагае, як валадар ды Прарок сказаў: «Прадставілі мне беззаконьнікі глумленьне, а не Закон Твой» (Пс.118). Таму наш хлеб – гэта Слова Божае, у якое мы верым.

Зноў жа, хаця пра цялесны хлеб мы просім у тыя ж самыя словы, напачатку ставім слова «НАШ». Не чужога бо хлеба маем прасіць у Бога, але нашага. Наш хлеб той, які мы зарабляем потам. Чужы – калі здабываем бяз працы, нашай хітрасьцю. Сам бо Ўсемагутны на ўсяго Адама гэты закон усклаў: «У поце твару твайго будзеш есьці хлеб твой» (Роду 3).

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ты ня кажаш проста: «Хлеб наш штодзённы дай нам на вякі», але «сёньня» або на кожны дзень?

**АДКАЗ**

Хрыстос навучыў нас так гаварыць, каб мы прасілі хлеба толькі на адзін дзень. Не таму, што потым нам хлеб не спатрэбіцца, але таму, каб мы ў гэтым жыцьці не абяцалі самі сабе доўгага веку, ані спадзяваліся на свае даброцьці зямныя. Але каб мы гэта жыцьцё і гэты сьвет разумелі як мейсца часовага прабываньня.

Як бо госьць, знаходзячыся ў заезным доме, не стараецца там

Яко бо гость, будучи у гостине или на господе, не стареется, абы тамо долго пребывалъ, тем же обычаемъ и мы о долгое житье на сим свете стояти не маемъ. Прото и на ином месте тако нас Господь наоучает: «Не печетеся на оутреи, оутрніи бо собою печется. Довлеть дневи злоба его» (Матф. 6: 31-34).

**ПЫТАНЬЕ**

Кто сію прозбу непожиточне говорить?

**ОТКАЗЪ**

Не только непожиточне, але и зле и з грехом сію прозбу они говорят, которіи Словом Божіемъ не користуют, ани оного за брашно душевное или духовное маютъ. По тому ж и в речах дочасных зле тую прозбу говорят, которіи не на Божіе благословеніе, але на свой промыслъ або на работу надеются. Тежь они, оу которих полные житници, гумна, клети, повалуши, погребы, скрини жита, пшеницы, пенезей или грошей, шатъ и иных маетностей. Часомъ и погниют стоги, мяса и прочая, а предся оубогому не оуделяютъ, але ешче большей събераютъ.

О таковыхъ Самъ Господь притчю оную о богатом поведелъ, который егда ему нива обфите зародила, не для оубогыхъ заховал, але про свой збытокъ заховавши, мовилъ: «Душе, имаши многа блага лежашча на лета многа. Поживай, яжь, пій, веселися». Але му Богъ поведелъ: «Безумне, в сію ношчь душю твою истяжют от тебе, а яже оуготовалъ есь, кому будутъ» (Лука 12: 16-31).

А иж бы того кто о одномъ кимъ не розумелъ, для того сіа слова приложилъ Господь: «Такъ събирая и себе, а въ Бога не богатъ». Прото надобе стеречися всемъ, абы таковыми не были. Бо будет ли кто таковъ, не поможеть ему молитва, но болей зашкодить. Ачкольвекъ събереть хлебъ, але его не поживеть, яко и сами посполите на око видимъ, и зде с притчи Христовое розумети можемъ. О чом и при осмомъ слове ширеи было.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто сію прозбу достойне къ Богу говорить?

**ОТКАЗЪ**

Онъ, кто по своему званію робить, а предся не от роботы своея, но от самого Бога поживенья ждеть. Ешче кто на своемъ, што ему Богъ далъ, довлееть, и от трудъ рук своих (Псалом 127, Ефес. 4: 25-32) потребнымъ и нишчимъ оуделяеть, а для житейских речей Бога и Слова Его не опушчаеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Пятая прозба: «Остави нам долгы наша, яко и мы оставляемъ дольжникомъ нашимъ», какъ ся розумееть? Каковые то суть долгы?

застацца надоўга, тым жа звычаем і мы ня можам спадзявацца на доўгае жыцьцё на гэтым сьвеце. Таму і ў іншым мейсцы так нас Госпад вучыць: «Дык не клапаціцеся пра заўтрашні дзень, бо дзень заўтрашні сам пра сябе будзе клапаціцца. Хопіць для кожнага дня свайго ліха» (Мц. 6: 34).

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто гэтую просьбу гаворыць сабе на шкоду?

**АДКАЗ**

Ня толькі на шкоду, але і на благое, і на грэх кажуць гэтую просьбу тыя, што не карыстаюцца Словам Божым ды ня лічаць яго за ежу для душы, або ежу духоўную. Тым жа звычаем і ў справах штодзённых сабе на благое кажуць гэтую просьбу тыя, што спадзяюцца не на Божае дабраславенства, але на свой розум або на сваю працу. Таксама тыя, у якіх жытніцы, гумны, клеці, кладоўкі, скляпы, скрыні поўныя жыта, пшаніцы, грошаў, адзеньня ды іншай маёмасьці. Часам і пагніюць стагі, мяса ці што іншае, але ўсё адно ўбогаму не дадуць, але яшчэ больш зьбіраюць.

Пра такіх Сам Госпад сказаў прыповесьць пра багацея, які, калі ўрадзіла ягоная ніва, захаваў плён не дзеля убогіх, а дзеля свайго прыбытку, мовячы: «Душа, маеш многа даброцьцяў, назапашаных на шмат гадоў; адпачывай, еш, пі, банкетуй». Але Бог сказаў яму: «Дурны, у гэту ноч запатрабуюць ад цябе душу тваю, а тое, што прыгатаваў, чыё будзе?» (Лк. 12: 19-20).

А каб кожны разумеў гэтую прыповесьць як пра сябе самога, Госпад далучыў такія словы: «Так бывае з тым, хто дзеля сябе зьбірае скарбы, а ня ёсьць багаты перад Богам». Таму трэба ўсім сьцерагчыся, каб такімі ня быць. Бо калі хто будзе такім, не дапаможа яму малітва, але больш нашкодзіць. Такі хоць і зьбярэ хлеб, але яго не спажыве, як і мы самі паўсюль тое бачым, і тут, з прыповесьці Хрыста, можам зразумець. Пра гэта і пры восьмым прыказаньні падрабязна гаварылася.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто гэтую просьбу годна да Бога кажа?

**АДКАЗ**

Той, хто працуе паводле свайго пакліканьня ды, перадусім, чакае дабрабыту не ад сваёй працы, але ад Самога Бога. Яшчэ той, хто ў сваім, што яму даў Бог, трывае і ад працы сваіх рук дае ўбогім і жабракам і не адкідае дзеля штодзённых справаў Бога і Ягонае Слова (Пс. 127, Эф. 4: 28).

**ПЫТАНЬНЕ**

Пятую просьбу: «Адпусьці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым» як разумець? Якія гэта правіны?

**ОТКАЗЪ**

Яко в речахъ дочасных оныхъ человекъ за должники личять, которіи от кого добродейство берють. Бо таковіи должни суть онымъ добродеемъ своимъ заслуговати и отдавати. А докуле того пристойне не оучинять, великіи суть должники. По тому жь и в речахъ духовных находемся великими быти должниками пред Богом. А што бо маемъ естли не от Него? От Него душа, тело, розумъ, одеянье, выхованье, светъ, вера и вси речи духовные и дочасные. Великие безъ похыбы добродейства, за которіе Онъ ничого болшь по нас мети не хочеть, разве абы есмо вдячни были и заповеди Его полнили.

То пакъ мы яко есмо вдячни и яко заповеди Его исполняемъ, вже есмо в первой части сее розмовы мели. Тамо есмъ по части довелъ, ижь ни одному слову Божіих заповедей досить не чинемъ. А тые сутъ долгы нашя, ими же есмо вси должни Богу зостали и на всякъ день большей зостаѳаемся. А ижь негде взяти намъ чим бы сія выплатити, бо есмо оную силу, въ которой насъ былъ Богъ створилъ, се есть самовластие, давно, ешче въ Адаме, потерали (Быт. 3), прото наоучилъ нас Господь, абы есмо Бога о оставленіе таковымъ долгомъ, се естъ грехомъ, молили.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого ся можемъ наоучити от сей прозбы?

**ОТКАЗЪ**

Естли бы кто пилно последелъ всіа слова, а наболей естли бы обачилъ кому оные говорити Господь велелъ, таковъ много бы моглъ навыкнути. Напервей вырозумел бы, ижь вси люди суть грешници, а нетъ ни единого человека безъ греха. Не только тепер, але и пред тым не было, и потомъ не будеть. Ешче жь и тое вырозумел бы, ижь вси святіи спасени суть, и теперъ спасаются и напотом которіи по нас будут, спасутся не своею правдою, але милостію и благостію Божіею. А кому бо молютися сію молитвоу Господь говорити велелъ? Не своим ли оученникомъ Петрю, Андрею, Іоанну, Іакову и прочіимъ? Тако бо святый Евангелист Лука пишеть: «Бысть сушчу Господеви на месте некоемъ моляшчуся, и яко преста, рече некый от оученникъ Его к Нему: “Господи, наоучи ны молитися, якожь Іоаннъ наоучи оученики своя.” Рече имъ: “Егда молитеся, глаголите: “Отче нашь, иже еси на небесехъ”» и прочая (Лука 11:1-8).

Зде видишь, ижь не мытары, ниже грешници просили Христа, абы их молитися наоучил, але оученници Его. И Самъ отвешчаючи, не рече: «Егда молятся мытары, да глаголют: “Отче нашь, иже еси”»,– але рече: «Егда молитеся, глаголите». То естъ вы, оученици Мои. Ино вже каждый видить, ижь сію молитву муселъ говорити Петрь, муселъ Андрей, Філиппъ, Варфоломей, Клеопа и прочіи Апостоли и оученици Христови. Мусела тежь тую жь молитву говорити и пречистая сына Божіа мати. А у той молитве не отставляли сее прозбы: «Остави намъ долгы наша, якожь и мы оставляемъ».

**АДКАЗ**

У справах штодзённых лічаць вінаватымі тых людзей, якія зьведалі ад некага дабрадзейства, бо яны мусяць сваім дабрадзеям паслужыць ды ім аддзякаваць. А пакуль тое як належыць ня зробяць, будуць вялікім даўжнікамі. Гэтаксама і ў справах духоўных мы аказваемся вялікімі даўжнікамі перад Богам. Бо што мы маем, чаго б не атрымалі ад Яго? Ад Яго душа, цела, розум, адзеньне, даброцьці, сьвет, вера і ўсе рэчы духоўныя і штодзённыя. Ад Яго вялікія дасканалыя дары, за якія Ён нічога ад нас не патрабуе, адно толькі каб былі Яму ўдзячнымі ды выконвалі Ягоныя прыказаньні.

Ды ўжо ў першай частцы гэтай размовы мы казалі, што значыць быць Яму ўдзячнымі ды выконваць Ягоныя прыказаньні. Там я па парадку давёў, што мы не выконваем дастаткова ніводнае з Божых прыказаньняў. А гэта і ёсьць нашыя правіны, дзеля якіх мы ўсе вінаватыя Богу, ды з кожным днем робімся ўсё больш вінаватымі. Ды паколькі нам няма чым заплаціць за гэтую віну, бо мы тую сілу, якую нам Бог даў пры стварэньні (значыць, уладу над сабой) даўно, яшчэ ў Адаме, страцілі (Роду 3), таму і навучыў нас Госпад, каб мы малілі Бога аб прабачэньні нашых правінаў, значыць, грахоў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму нас можа навучыць гэтая просьба?

**АДКАЗ**

Калі хто ўважліва паглядзіць на ўсе словы, а найбольш калі разгледзіць, каму Госпад загадаў іх казаць, шмат чаму такі чалавек навучыцца. Найперш зразумее, што ўсе людзі – грэшнікі ды што няма ніводнага чалавека без граху. Ня толькі цяпер няма, але і раней не было, і потым ня будзе. Яшчэ і тое зразумее, што ўсе сьвятыя збаўляліся, збаўляюцца ды пасьля нас будуць збаўляцца не сваёй справядлівасцю, а Божай ласкай. Бо каму Бог загадаў так маліцца? Ці не Сваім вучням – Пятру, Андрэю, Яну, Якубу ды іншым? Так бо сьвяты эвангеліст Лука піша: «І сталася, калі на адным мейсцы Ісус маліўся, як скончыў, папрасіў Яго адзін з вучняў Ягоных: “Госпадзе, навучы нас маліцца, як і Ян навучыў сваіх вучняў”. Сказаў ім Ісус: “Калі моліцеся, кажыце: Ойча наш, Які ёсьць у небе”...» і так далей (Лк.11).

Тут бачыш, што ня мытнікі, ня грэшнікі прасілі Хрыста, каб Ён навучыў іх маліцца, але Ягоныя вучні. І Ён Сам не адказаў ім: «Калі моляцца мытнікі, то няхай кажуць: “Ойча наш, Які ёсьць у небе”», але сказаў: «Калі моліцеся, кажыце»,– значыць, – вы, вучні Мае. Ды ўжо кожны бачыць, што гэтую малітву мусіў казаць Пётр, мусіў казаць Андрэй, Піліп, Баўтарамей, Кляопа ды іншыя Апосталы і вучні Хрыста. Мусіла таксама казаць гэтую малітву і прачыстая маці Сына Божага. І ў гэтай малітве не абміналі яны просьбы: «Адпусьці нам правіны нашы, як і мы адпускаем».

Скажаш мне зараз: «Шчыра ці няшчыра яны гаварылі гэтую просьбу:

Скажиш ми теперь: «От правды ли чи не от правды сію прозбу – остави нам долгы наша – говорили?» Не надеюся, абы кто смелъ о Апостолехъ казати, яко бы в них таково лицемеріе было, иж бы не от правды Бога о оставленіе грехомъ молили. Бо не была бы то молитва, але шидерство зъ Бога, естли кто розумеючи о собе, ижь греха на собе не маеть, а предся бы къ Богу сіа слова говорил.

Не маем тако о Апостолех святыхъ розумети, ани о богородици. Ведали бо сіи, яко написано: «Погубиши всехъ, глаголюшчих лжю» (Псалом 5). А како бо не ложь будеть, естли бы иншую реч на сердци, а иншую на языце мели? Прото не полицемерски, але с хути и от правды вси святіи къ Богу сію прозбу говорили: «Остави намъ долгы нашя»,– знаючи до себе свой недостатокъ. А поневажь от правды тые слова по Христову повеленію говорили, ино мели на собе грехи свои, не чужіе.

Розбери жь таки и тое, ижь ачколвекъ святіи грешници были, предся суть спасени. А о чим же? Въистину не о правде своей, ни о добрих делехъ. Бо от видишь, ижь грешници были. Прото не о своей правде, але о Божіей вси спасени суть святіи. Яко Давыдъ въпиеть: «Правдою Твоею изми мя и избави мя» (Псалом 70). Зри, яко не рече: «Правдою моею», но «Твоею». По тому ж и Даніилъ в своей молитве къ Богу рече: «Себе деля, Господи, приклони, Боже мой, слухъ Твой и оуслыши, отверзи очи Твой, и вижь потребленіе наше и града Твоего, в нем же прозвас имя Твое в нем. Яко не нашими правдами мы оупъвающче очишчаемся, ни шчедротою нашею пред Тобою, но къ шчедротамъ Твоимъ многымъ, Господи» (Дан. 9).

А такъ явная речь ест, ижь вси святіи грешни были докуле зде на земли жили. А к тому ижь благодатію Божіею вси, а не заслугами своими, спасени суть. Того ми посведчает Апостолъ, где къ Ефесіомъ рече: «Благодатию есте спасени и верою, и се не от вас, Божій дарь, не от делъ, да некто похвалится. Того бо есмы твореніе, създани о Христе Ісусе в дела блага» (Ефес. 2: 4-13) А не домнимай, абы о самыхъ только Ефесиехъ тако розумелъ, и о собе бо по тому жь рече: «Благодатию Божіею есмъ еже есмъ, и благодать Его яже въ мне, не тшча быст, но паче всех их трудихся. Не аз же, но благодать Божіа яже съ мною» (1 Кор. 15:1-11).

А поневажь такъ ест, ижь вси святіи благодатію Божіею спасени и вечного живота дошли, и мы о собе оуже певни быти можемъ, ижь не инымъ коимъ обычаемъ спастися маемъ, разве по тому жь, се естъ благодатию Божію, естли ю верою живою пріимемъ. Богъ бо не отменяется. И той же ест Христос вчера и днесь, Той же ест и будеть въ векы. (Мал. 3; Евр. 13: 7-16).

**ПЫТАНЬЕ**

Чому не просто и згола оставленіа грехом просимъ, але прикладаем оные слова: «Яко и мы оставляемъ должником нашим»?

"Адпусьці нам правіны нашы"?» Ня думаю, што нехта асьмеліцца казаць пра Апосталаў, быццам бы яны былі настолькі крывадушныя, што няшчыра малілі Бога пра адпушчэньне грахоў. Была б гэта не малітва, але насьмешка з Бога, калі б нехта, мяркуючы, што ня мае на сабе граху, усё адно казаў бы Богу гэтыя словы.

Не належыць нам меркаваць такім чынам ані пра сьвятых Апосталаў, ані пра багародзіцу. Ведалі бо яны, што напісана: «Выгубіш усіх, якія гавораць няпраўду» (Пс. 5). А хіба гэта была не хлусьня, калі б яны адно мелі на сэрцы, а другое вызнавалі вуснамі? Дзеля гэтага не крывадушна, але па сваёй волі ды па шчырасьці яны гаварылі Богу гэтую просьбу: «Адпусьці нам грахі нашы»,— ведаючы сваю недасканаласьць. А паколькі яны шчыра, паводле загаду Хрыста, гаварылі гэтыя словы, значыць, мелі на сабе свае правіны, а не чужыя.

Зваж, аднак, і на тое, што хаця сьвятыя былі грэшнікамі, але яны збавіліся. Дзякуючы чаму? Сапраўды, не дзеля сваёй справядлівасьці, ані дзеля добрых учынкаў. Бо ты бачыш, што яны былі грэшнікамі. Значыць, усе сьвятыя збавіліся не сваёй справядлівасьцю, але справядлівасьцю Божай, як Давід усклікае: «Дзеля справядлівасьці Тваёй ратуй мяне і барані мяне» (Пс.70). Бачыш, не сказаў ён: «Дзеля справядлівасьці маёй», але: «Дзеля справядлівасьці Тваёй». Тым жа звычаем і Данііл у сваёй малітве да Бога казаў: «Нахілі вуха Сваё, мой Божа, і выслухай! Адчыні вочы Свае і пабач спусташэньне нашае і горад, над ім было прызывана імя Тваё! Бо не па справядлівасьці сваёй узносім малітвы свае да Цябе, але спадзеючыся на Тваю вялікую міласэрнасьць» (Дан. 9).

А калі так, то відочна, што ўсе сьвятыя былі грэшнікамі пакуль жылі тут, на зямлі. Да таго ж усе яны збавіліся ласкаю Божай, а не сваімі заслугамі. Пра гэта мне сьведчыць Апостал, калі да Эфэсцаў кажа: «Ласкаю бо вы збаўлены праз веру, і гэта не ад вас, але Божы дар; не праз учынкі, каб ніхто не хваліўся. Бо мы – Ягонае стварэньне, створанае ў Хрысьце Ісусе дзеля добрых учынкаў» (Эф. 2: 8-10). Не мяркуй, што пра адных толькі Эфэсцаў Апостал так разумеў, бо і пра самога сябе гэтаксама казаў: «Але з ласкі Бога ёсьць тым, кім ёсьць, ды дадзеная мне ласка Ягоная не была надарэмнай. Наадварот, працаваў я больш ад іх усіх, не я, што праўда, але ласка Божая са мною» (1 Кар.15: 10).

А калі ёсьць так, што ўсе сьвятыя Божай ласкай збавіліся і вечнае жыцьцё атрымалі, то і мы пра саміх сябе можам быць пэўныя, што ня іншым якім звычаем маем збавіцца, а толькі тым жа самым, значыць, ласкай Божай, калі прымем яе жывой верай. Госпад бо не зьмяняецца (Мал. 3: 6) ды Ісус Хрыстос той самы ўчора, сёньня ды будзе той самы на вякі (Гебр.13: 8).

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму ня проста цалкам, агулам, мы просім, адпушчэньня грахоў, але далучаем словы: «Як і мы адпускаем вінаватым нашым»?

**ОТКАЗЪ**

Вельми пристойно Христос тые слова к той прозбе приложилъ. Бо жадна речь справедлившая быти не можеть, яко абы той отпушчал должником своимъ, который от иного кого долгом своимъ отпушченья просить. Прото и мы, поневажь от Бога отпушченья на всяк час жадаемъ, велми пристойная речь, абы есмо теже ближнымъ нашим, коли нам якую кривду оучинять, отпушчали.

Тако нас и после тое молитвы, яко бы тые слова толкуючи, оучить Господь, где рече: «Ашче бо отпушчаете человеком съгрешеніа их, отпустить и вамъ Отецъ вашь небесный. Ашче ли не отпушчаете человеком съгрешеній их, ни Отецъ вашь отпустить съгрешеній вашихъ» (Матф. 6:14-21). К тому жь и оное слово рече: «Въ ню же мерю мерите, възмерят вамъ» (Матф. 7: 1-11).

**ПЫТАНЬЕ**

Ино на том залежить спасеніе наше или грехом оставленіе, коли собе другъ другу грехы отпушчаемъ?

**ОТКАЗЪ**

Не на том, бо едина токмо ест грехомъ оставленіа и спасеніа нашого вина, си реч страсть и смерть Сына Божіа Господа нашего Ісус Христа. По словеси аггельскому: «Той спасеть люди своа от грех их» (Матф. 1:18-25).

Сее же оставленіе наше должником нашимъ ест толко упевненье а просте знамя оставленіа греховъ наших, и послушества. По тому бо знати человека веруюшчого и на милость Божію оуповаюшчого, естли и онъ не мстится кривдъ своих, але отпушчаеть обидяшчимъ его. Опять, кто над своими должниками помсты ишчеть и отпушчати имъ гневу не хочеть, таковый сам на себе сведчить, ижь от Бога оставленіа грехомъ не ишчеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто достойно сію прозбу говорить?

**ОТКАЗЪ**

Напервей кто Бога верует быти милостиваго, который рад каюшчимся грехы для Сына своего отпушчати. Те же, кто не где инде, але только въ Христе или Хрістом грехом отпушченіа ишчеть, а справедливым ся не чинячи, недостатокъ свой знаеть и исповедует, ближнымъ теже своимъ от правды и съ всего сердца отпушчаетъ, а сам ся от греховъ стережеть, той с пожитком сію прозбу к Богу говорить.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто напрасно ее говорить?

**ОТКАЗЪ**

Онъ, кто бы ся отпушченья грехомъ не для заслуженья Сына Божіего, але для своих делъ или чужіихъ надевалъ. Або кто бы Бога за

**АДКАЗ**

Вельмі належна Хрыстос далучыў такія словы да гэтай просьбы. Бо ня можа быць анічога больш справядлівага, калі той чалавек, які ў іншых просіць адпушчэньня сваім правінам, і сам прабачае сваім вінаватым. Дзеля гэтага і мы, жадаючы на ўсякі час Божага прабачэньня, зробім вельмі абачліва, калі прабачым нашым бліжнім усе крыўды.

Так нас вучыць Госпад і пасьля малітвы «Ойча наш», калі, нібы тлумачачы гэтыя словы, кажа: «Бо калі вы адпусьціце людзям грахі іхнія, дык і ваш Айцец нябесны даруе вам. Але калі вы не даруеце людзям, дык таксама Айцец ваш не адпусьціць вам грахоў вашых» (Мц. 6: 14-15). Да таго ж яшчэ Ён далучыў: «Ды якою меркай вы будзеце мераць, такою вам адмераць» (Мц. 7: 2).

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба на тым залежыць нашае збаўленьне або адпушчэньне грахоў, што мы адзін аднаму адпускаем грахі?

**АДКАЗ**

Не на тым. Бо адна толькі ёсьць прычына нашага збаўленьня і прабачэньня нашых грахоў – гэта пакуты і сьмерць Сына Божага Госпада нашага Ісуса Хрыста, паводле слова анёла: «Ён збавіць народ свой ад грахоў іхніх» (Мц. 1: 21).

Гэтае ж прабачэньне нашым вінаватым – толькі пэўнасьць і проста знак адпушчэньня нашых грахоў, знак паслухмянасьці. Па тым бо пазнаеш, што чалавек верыць ды спадзяецца на міласьць Божую, калі ён ня помсьціцца за свае крыўды ды прабачае сваім вінаватым. Зноў, хто сваім вінаватым помсьціцца ды ня хоча свайго гневу на іх суцішыць, той сам супраць сябе сьведчыць, што не шукае адпушчэньня грахоў у Бога.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто належна гэтую просьбу гаворыць?

**АДКАЗ**

Найперш той, хто верыць у Бога міласьцівага, Які дзеля Свайго Сына Свайго кожнаму, хто каецца, рады грахі адпусьціць. Таксама той, хто не дзе-небудзь, але толькі ў Хрысьце або праз Хрыста шукае прабачэньня грахоў, і, справядлівым сябе ня лічачы, ведае сваю недасканаласьць ды яе вызнае, бліжнім сваім прабачае праўдзіва і ўсім сэрцам, а сам грахоў сьцеражэцца – такі чалавек належна гаворыць да Бога гэтую просьбу.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто надарэмна яе гаворыць?

**АДКАЗ**

Той, хто спадзяецца на адпушчэньне грахоў не дзеля заслугаў Сына Божага, але дзеля сваіх або чужых учынкаў. Або той, хто мае Бога за неміласэрнага, сваім бліжнім не даруе крыўды. Такі чалавек па сваёй

немилостивого мелъ, ближным бы своимъ гневу своего не отпушчалъ. Таковы тоею прозбою не только отпушченіа грехом не упросить, але и Бога къ скаранью себе приведеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко ся розумееть шостая прозба: «Не въведи нас въ искушеніе, но избави насъ от лукавого»? Чого тыми словы просимъ?

**ОТКАЗЪ**

Того, абы нас Богъ от сатоны, от сего света и от похотей тела нашого боронилъ, а Духом Своимъ справовалъ, абы есмо до грехов не упадывали. Тіи бо сут врази наши: тело, светъ, и діаволъ. Сіи нас отводят от Бога и трудностей нам много задаваютъ. Апостолъ бо пишеть, яко тело или плоть похотьствуеть на духъ (Гал. 5:11-21). О Сатоне теже другый Апостолъ рече: «Трезвитеся, яко супостат вашь діаволъ яко левъ рикая ходить, искый кого поглотити» (1 Петра 5: 6-14). А о свете или о мире написано, яко весь въ зле лежить (1 Іоан 4: 20-5: 1-21).

Прото у той прозбе просимъ, абы насъ Богъ от тыхъ врагов наших заховалъ, наболей пакъ от діавола, которого зде Господь лукавым зовет.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли діаволъ въ искушеніе вводить, чому жь мы къ Богу прозбу чинимъ, абы нас Богъ въ искушеніе не велъ, або не въводил?

**ОТКАЗЪ**

Правда естъ, ижь не Богъ насъ приводить в покушенье. Бо и Апостолъ пишеть, яко Богу не искушаеть никого же, але кождый искушается от своея похоти влекомъ. (Іак. 1:1-18). Діаволъ ест правый искуситель, а ведже ижь предся без допушченья и дозволенья Божіего діаволъ ничого не можеть, яко на взоръ маемъ Іова, которому аже взявши от Бога допушченье зашкодилъ. Прото Богу приписуется увоженье в напасть, не иж бы Богъ уводилъ, але ижь діаволу въводити допушчаеть. Тем же обычаемъ и тело нас къ искушенію приводить, але коли намъ Богъ Духа Своего даеть, вже оное искушеніе телесное силы не маеть.

Для тое причины и с тое стороны Бога просимъ, абы насъ не въводилъ въ искушеніе, се ест абы намъ Духа Святого до сердцъ нашихъ даровалъ, который бы похотем телъ наших отпералъ. Тое жь розумей о искушеніи света. Той бо нас искушаеть, коли нас або черезъ сласти от Бога отводить, або через трудности, которіе намъ задаеть, отстрашити хочеть, а ведже мы сіе искушеніе Богу причитаемъ. Бо и светъ ничого над волю Божію учинити намъ не можеть. И просим Бога, абы нас в таково искушеніе не вводилъ. То есть абы светъ в руце Своей деръжалъ, жебы намъ шкодити не моглъ.

просьбе ня толькі адпушчэньня грахоў не атрымае, але і накліча на сябе Божую кару.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як разумець шостую просьбу: «Ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога»? Што мы просім у гэтыя словы?

**АДКАЗ**

Каб Бог бараніў нас ад д'ябла, ад гэтага сьвету ды ад пажаданьняў нашага цела і вёў нас Сваім Духам, каб мы не грашылі. Вось бо ворагі нашыя: цела, сьвет і д'ябал. Яны зводзяць нас ад Бога ды ствараюць нам шмат цяжкасьцяў. Апостал бо піша, што цела працівіцца духу (Гал. 5:17), пра д'ябла іншы Апостал кажа: «Чувайце, бо вораг ваш д'ябал, як леў рыклівы, кружыць, шукаючы, каго зжэрці» (1 Пт. 5: 8), а пра сьвет напісана, што «ён апанаваны ліхім» (1 Ян 5:19).

Таму ў гэтыя словы мы просім, каб Бог захаваў нас ад тых ворагаў, найбольш жа ад д'ябла, якога тут Госпад заве «злы».

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі д'ябал уводзіць нас у спакусу, чаму ж мы просім, каб Бог нас не спакушаў, або ня ўводзіў у спакусу?

**АДКАЗ**

Праўда ў тым, што ня Бог уводзіць нас у спакусу, бо і Апостал піша: «Бог нікога не спакушае, але кожнага зводзіць пажаданьне ягонае» (Як. 1: 13-14). Д'ябал – вось сапраўдны спакушальнік, але бяз допуску і дазволу Божага д'ябал нічога ня можа: за ўзор маем Гіёба, якому д'ябал шкодзіў толькі з дазволу Божага. Увядзеньне ў спакусу прыпісваецца Богу не таму, што Бог спакушае, але таму, што Ён дазваляе, каб д'ябал нас спакушаў. Тым жа звычаем і цела прыводзіць нас у спакушэньне, але калі Бог дае нам Свайго Духа, ужо тое цялеснае спакушэньне ня мае сілы.

З гэтае прычыны мы просім Бога, каб ня ўводзіў нас у спакусу, значыць, каб даў у нашыя сэрцы Духа Сьвятога, Які б супрацьстаў пажаданьням нашага цела. Гэтаксама мяркуй і пра спакушэньне сьвету. Ён бо нас спакушае, калі зводзіць нас ад Бога або праз асалоды, або празь цяжкасьці, якія нам чыніць, хочучы нас запалохаць, а мы прыпісваем гэтую спакусу Богу. І сьвет ня можа нам зрабіць нічога па-над волю Божую. Просім жа Бога, каб нас у такую спакусу ня ўводзіў, значыць, каб сьвет у руцэ Сваёй трымаў ды каб сьвет ня мог нам шкодзіць.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого жь не просто просимъ, абы насъ Богъ въ искушеніе не вътводилъ, але прикладаемъ: «Но избави насъ от лукавого»?

**ОТКАЗЪ**

Тые слова яко бы суть вместо тольку оныхъ словъ: «Не введи нас въ искушеніе». Не зле бо ест искушоному быти, але под искушеніемъ пасти зле естъ. О искушеніи рече Апостолъ, яко съделаваеть оупованіе, а упованіе не посрамить (Рим. 5: 1-9). Той же на ином месте пишеть, ижь намъ Богъ искушеніемъ и сводство, се ест конецъ чинить, абы възможно понести (1 Кор. 10:12-22).

Прото сими словы: «Избави насъ от лукавого»,– не згола о тое просимъ, абы есмо волни от искушеніа, але абы намъ Богъ в таковыхъ искушеніахъ пособлялъ, діаволское силы збавилъ, а добрый конецъ искушенію учинилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто сію прозбу слушне говорить?

**ОТКАЗЪ**

Напервей кто на силоу свою не оупова, але от Бога помочи въ всяком искушеніи ждет. А ешче кто ся самъ въ искушеніе и в сужбу діаволскую не подаеть, але от них оутекаеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто, опять, папрасно сію прозбу мовить?

**ОТКАЗЪ**

Если бы кто на свою силу уповалъ, естли бы теже силу бесовскую легце собе важилъ. Таковъ напрасно тую прозбу говорить. Ешче кто ся самъ в небеспеченства вдавает. Бо таковый Бога искушаеть. Кто з неверными иго тягнеть (2 Кор. 6:11-18). Кто ся самъ в силу діаволскую черезъ греховъ чиненье подаваетъ. Речено бо ест: «Не искусиши Господа Бога твоего» (Втор. Зак. 6).

Той Бога искушаеть, кто могучи без чого быти, сам на себе небезпеченство приводить. Мнози людіе сію прозбу говорять: «Избави нас от лукавого»,– але ижь сами къ лукавому доброволъно приступують, николи избавитися не възмогуть.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого оные слова приложилъ Господь: «Яко Твое естъ Царствіе и сила и слава»?

**ОТКАЗЪ**

Тыми словы ничого не просимы, да ведже не безъ великого пожитку сут приложены. Напред бо потвержают верю в нас. Бо поневажь царь ест Богъ и силенъ, снадне то Ему зведется, дати намъ о што есмо просили. К тому наоучают насъ сіа слова, ижь в молитве нашей не

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго ж ня толькі просім, каб Бог ня ўводзіў нас у спакусу, але і далучаем: «Але збаў нас ад злога»?

**АДКАЗ**

Гэтыя словы дапаўняюць сэнс просьбы «Ня ўводзь нас у спакусу». Блага бо не ў спакушэньні быць, але спакушэньня ня вытрымаць. Пра спакушэньне Апостал кажа, што «яно выклікае надзею, а надзея асароміць ня можа» (Рым. 5: 3-5). Гэты ж Апостал у іншым мейсцы піша, што «Бог не дапусьціць спакушаць больш, чым можам вытрымаць» (1 Кар. 10: 12-13), значыць, пакладзе канец спакушэньню, каб здолелі вытрываць.

Таму ў гэтыя словы: «Збаў нас ад злога»,— мы ня толькі просім, каб нам быць вольнымі ад спакусаў, але і каб Бог у такіх спакусах нам дапамагаў, ад моцы д'ябальскай нас збавіў, добры канец спакушэньню ўчыніў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто гэтую просьбу слушна гаворыць?

**АДКАЗ**

Найперш той, хто не спадзяецца на ўласную моц, але ва ўсякім спакушэньні чакае дапамогі ад Бога. Яшчэ той, хто ў спакусу і ў справы д'ябальскія сам не трапляе, але ўцякае ад іх.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто, зноў, надарэмна гэтую просьбу кажа?

**АДКАЗ**

Той, хто на сваю моц спадзяецца, таксама хто легкадумна ставіцца да моцы д'ябальскай,– такі надарэмна гаворыць гэтую просьбу. Яшчэ той, хто сам у небясьпеку трапляе, бо такі спакушае Бога. Таксама той, хто «запрагаецца зь няверуючымі ў адно ярмо» (2 Кар. 6:14). Той, хто сам трапляе ў пастку д'ябальскую праз чыненьне грахоў, бо сказана: «Не спакушай Госпада, Бога твайго» (Паўт. Зак. 6).

Той Бога спакушае, хто можа без чаго-небудзь абыйсьціся, але ўсё адно сам на сябе кліча небясьпеку. Шмат людзей гаворыць гэтую просьбу: «Збаў нас ад злога»,– але калі самі, дабраахвотна, да злога трапляюць, то ніколі ня змогуць ад яго пазбавіцца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго гэтыя словы далучыў Госпад: «Бо Тваё Валадарства, і моц, і хвала»?

**АДКАЗ**

У гэтыя словы нічога ня просім, але яны далучаныя дзеля вялікай карысьці. Найперш бо пацьвярджаюць нашую веру, бо паколькі Бог – Валадар і мае моц, лягчэй Яму даць нам тое, пра што мы Яго прасілі. Да таго ж гэтыя словы нас вучаць, што ў нашай малітве маем шукаць

нашихъ пожитковъ, ани славы гледети маемъ, але яко бы Царствіе Божіе росло, сила Божіа объявлялася и слава Божіа цвила.

Прото кто бы только для себе а для своих пожитковъ або для одержанья славы оныхъ потребъ, которіе ся в молитве Господней замыкають, просилъ, таковый сих словъ: «Яко Твое ест Царствіе»,– не добре уживаеть и напрасно всю молитву говорить.

**ПЫТАНЬЕ**

А овы слова для чого приложоно: «Въ векы векомъ»?

**ОТКАЗЪ**

Самъ Христос приложилъ велми пристойне, абы Царствіа Божіа, силы и славы Его розность от царествъ, силъ и славъ царей земных показалъ. Мают бо и царіе земскіи, царства силу и славу, але на час толко велми коротокъ. Той пакъ Царь, иже ест Отецъ нашь, царство, силу, славу маеть въ векы векомъ. Аминь.

**ПЫТАНЬЕ**

Што ся розумееть «АМИНЬ»?

**ОТКАЗЪ**

«АМИНЬ» естъ слово еврейское, сказуется на нашь языкъ «въ истинну», яко где Господь глаголеть: «Аминь глаголю вамъ»,– тое жь розумеется, яко бы реклъ: «Въистинну глаголю (или мовлю) вамъ».

Часом теже «Аминь» кладется вместо «будеть» или «да будеть». Прото где в наших псалтирах на концы некоторих псалмов стоить: «Будеть, будеть» (Псалом 40, Псалом 71), то въ еврейских пишеть: «Аминь, аминь».

Лечь зде, при молитве Господней, «Аминь» положилъ Христос вместо упевненья, абы есмо певное надежи были, ижь то все по тому будеть, о што есмо просили.

**ПЫТАНЬЕ**

Оуже за ласкою милосердного Бога розумею молитву Господню, але ми тое ешче росповеж, чи не годится иншою молитвою молити ся Богу, разве тоею?

**ОТКАЗЪ**

Годится иными словы молитися Богу, да ведже потреба гледети, абы ся таковая молитва згожала разумом з молитвою Господнею. Маемъ на взорь Апостолы которіи часу гоненіа молилися Богу, яко Лука пишеть, а предся не тыми словы «Отче нашь, иже есь на небесехъ», да ведже разумъ оное молитвы съгласенъ ест з молитвою Господнею. Тако бо молятся: «Владыко Боже, сътворивый небо и землю, и море, и вся, яже в них ...» и прочая (Деан. 4: 23-37). Которая молитва тое замыкаеть, абы ся Слово Божіе ширило, то есть оные прозбы, которие въ молитве Господней суть: «Да святится имя Твое ...» и прочая.

## Третее части конецъ

ані нашай карысьці, ані славы, але пашырэньня Божага Валадарства, аб'яўленьня Божае моцы і росквіту Божае славы.

Таму той, хто толькі дзеля сябе ды дзеля ўласнай карысьці ці славы просіць за патрэбы, што зьмяшчаюцца ў малітве Госпадавай, такі чалавек на благое ўжывае словы «Бо Тваё Валадарства ...» ды ўсю малітву гаворыць надарэмна.

**ПЫТАНЬНЕ**

А гэтыя словы «на вякі вечныя» дзеля чаго далучаныя?

**АДКАЗ**

Сам Хрыстос далучыў іх вельмі дарэчы, каб паказаць розьніцу паміж Валадарствам Божым, ягонай моцай і хвалой ды паміж валадарствам, моцай і хвалой зямных валадароў. Бо той Валадар, Якім ёсьць наш Айцец, мае Валадарства, моц і хвалу на вякі вечныя. Амін.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што значыць «АМІН»?

**АДКАЗ**

«Амін» – слова гебрайскае, перакладаецца мовай нашай «сапраўды». Калі Госпад гаворыць: «Амін, кажу вам»,— разумей гэта так, нібы Ён гаворыць: «Сапраўды кажу вам».

Часам таксама «Амін» ужываецца замест «станецца» або «няхай станецца». Дзеля гэтага там, дзе напрыканцы некаторых нашых псальмаў стаіць: «Няхай станецца, няхай станецца», у гебраяў пішацца: «Амін, амін» (Пс. 40, Пс. 71).

Тут жа, у малітве Госпадавай, Хрыстос далучыў: «Амін»,— каб нас запэўніць, каб мы мелі пэўную надзею, што ўсё будзе так, як мы прасілі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ужо ласкай міласэрнага Бога разумею малітву Госпадаву, але яшчэ скажы мне вось што: хіба нельга, акрамя гэтай, іншай малітвай Богу маліцца?

**АДКАЗ**

Належыць маліцца Богу ў іншыя словы, аднак трэба глядзець, каб такая малітва згаджалася з малітвай Госпада. Маем за ўзор Апосталаў, якія падчас перасьледу, як Лука піша, маліліся Богу. Ды хаця малітва была ня ў тыя словы: «Ойча наш, Які ёсьць у небе ...», аднак сэнс іхняй малітвы згаджаўся з малітвай Госпада. Так бо яны маліліся: «Госпадзе, Ты, што стварыў неба і зямлю, і мора, і ўсё, што ёсьць на іх ...» і так далей (Дзеі 4: 24-30). Гэтая малітва зьмяшчае просьбы аб пашырэньні Божага Слова, значыць, тыя ж просьбы, што і ў малітве Госпадавай: «Сьвяціся імя Тваё ...» і так далей.

## Трэцяй часткі канец

# ЧЕТВЕРЪТАЯ ЧАСТЬ
# КАТИХИСІ О ТАИНЕХЪ

**ПЫТАНЬЕ**

Ижь к тому пришло, абы есмо четвертую часть наоуки христянское о таинех Христовыхъ розчитали, абы добрим порядкомъ шло, прошю тебе, скажи ми, чого надобе к вырозуменью достаточному таинъ Христовых?

**ОТКАЗЪ**

Вельми слушнаа ест прозба твоя. В каждой бо справе великие пожитки порядокъ чинить. Бо за порядкомъ а за добрим розложеньемъ и трудная речь в собе латвейшаа бываеть, и памяти много помагаеть.

Прото кто бы хотелъ тайны, яко е зовемъ, вырозумети, потреба, абы при их розчитаванью сие чотыри речи обачилъ: што есть тайна; кто оуставил тайны; для чого оуставилъ; и што нам за пожитъки чинять или приношають.

Сіа, мовлю, потреба гараздъ розсмотрети и при всех съборно таинех, и при единокожной от них. А хотя ж бы и большей таковых речей при таинех мог кто положити, але мы на сих доволни будем.

**ПЫТАНЬЕ**

Оуже водле того росписаного порядъку повежь ми, што ест тайна?

**ОТКАЗЪ**

Тайна естъ деаніе или чиненье, зложеное и от земское, или видимое, и от небесное, или невидимое речи по оуставу Христовому.

**ПЫТАНЬЕ**

Скажи ми значней, абых моглъ розумети. Бо не ведаю, што се за деаніе от земной и небесной речи зложеное?

**ОТКАЗЪ**

Нетъ зде никаковое трудности. Деаніемъ зову онъ весь поступокъ или справу, которая ся дееть при Божественных тайнех. Для того потому выписую тайну, абы ся есь з оными не омылилъ, которіи часть тайны за всю тайну поличають, а иных частей занедбавають. Все, мовлю, деаніе, которое по уставу Хрістовому бываеть, есть тайна.

# ЧАЦЬВЁРТАЯ ЧАСТКА КАТЭХІЗІСУ ПРА ТАЯМНІЦЫ

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі ўжо дайшлі мы да разгляду чацьвёртай часткі хрысьціянскай навукі пра таямніцы Хрыстовыя, каб ішло ўсё добрым парадкам, прашу цябе, скажы мне: што трэба дзеля дастатковага разуменьня таямніцаў Хрыстовых?

**АДКАЗ**

Вельмі слушная твая просьба. У кожнай бо справе парадак прыносіць вялікую карысьць. Бо за парадкам ды за добрым тлумачэньнем і самая цяжкая рэч робіцца лягчэйшай ды запамінаецца лепш.

Той, хто хацеў бы таямніцы (як мы іх завём) зразумець, няхай зважае пры іх разглядзе на чатыры рэчы: што такое таямніца; хто пастанавіў таямніцы; дзеля чаго іх пастанавіў і якую карысьць нам прыносяць таямніцы.

Гэта, кажу, трэба добра разгледзець і пры ўсіх таямніцах разам, і пры кожнай зь іх асобна. Ды хаця б нехта мог болей пра таямніцы распавесьці, але мы гэтым задаволімся.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ужо паводле гэтага расьпісанага парадку скажы мне, што такое таямніца?

**АДКАЗ**

Таямніца – гэта дзеяньне або ўчынак, што мае зямны (або бачны) і нябесны (або нябачны) кшталт і складаецца паводле загаду Хрыста.

**ПЫТАНЬНЕ**

Растлумач мне дакладней, каб я мог зразумець, бо ня ведаю, што гэта за дзеяньне, складзенае зь зямнога ды нябеснага кшталту.

**АДКАЗ**

Няма тут ніякай цяжкасьці. Дзеяньнем я называю ўвесь той учынак або справу, які адбываецца падчас Божых таямніцаў. Дзеля гэтага і кажу пра таямніцу, каб ты не памыляўся разам з тымі людзьмі, што адну частку таямніцы лічаць за ўсю таямніцу ды занядбоўваюць іншыя яе часткі. Усё, кажу, дзеяньне, якое адбываецца паводле загаду Хрыстовага, і ёсьць таямніца.

А для лепшейшого вырозуменья розсмотри тайны Закона Мойсеова, и которіе ешче до Закона были, яко Пасха, обрезание и жертвы – певная речь, ижь тайны были. А ведже при деанію Пасхы не самъ онъ агнецъ тайнею былъ, но все оное деаніе, которое при том по повеленію Божіему Ізраилтяне чинили. Тем же обычаемъ при тайне обрезаніа не онъ каменный ножь, ани оная конечная плоть тайна была, але по тому жь вся оная Божественная справа тайна была.

Прото и Нового Завета тайны по тому жь розумеются. Яко напервей тайна святого крешченіа не ест сама только вода, але и вода и до воды погруженіе, Святыя Тройцы призываніе, наоученіе, и вся онаа справа, которую Хрістос чинити велелъ, нарицается тайна. По тому жь и при Вечери Господней не хлебъ только естъ тайна, ани вино, але хлебъ, вино, наоука, молитва, благодареніе или дякованіе, а наостатокъ яденіе и питье или причашченіе з верою и вся оная справа, котораа по Хрістову повеленію бываеть.

Розумей же и паметуй, ижь яко при обрезанью естли бы хотя ножь былъ, а человека бы обрезаемого не было, не может быти тайна. Тако и при справе крешченіа хотя ж бы вода к тому была взята, и молиты бы креститель съделалъ, а никого бы не крешчоно, предся бы оныя воды и молитовъ тайною никто назвати не моглъ.

Тое жь о Вечери Господней розумети маешь. Естли бы хотя столъ и обрусъ или скатерть кто приготовилъ, а надто и хлебъ бы и вино на святый престолъ положилъ, молитву и благодареніе бы съвершилъ, а не было бы причашченіе, яко теперь ест в обычаю, не можеть он хлебъ з вином и з молитвами быти тайна. Не одна бо часть чинить тайну, але вси части.

Прото святіи Евангелисти где выписують тайну, которую Хрістос съ оученники Своими чинилъ, все достаточне припоминають. Напред яко не Сам, але с оученники селъ за столъ. Потом яко страсть Свою оповедалъ. Яко хлебъ принялъ. Яко Бога благодарилъ, разламалъ, оученникомъ подалъ, ясти и пити велелъ. А на остатокъ и оное слово приложилъ: «Се творите въ Мое въспоминаніе» (Лука 21: 37-22: 38).

По тому жь и Апостолъ Павелъ выписуеть, где застановившися, росмотри собе гараздъ, како бы есь мелъ тое слово СЕ ТВОРИТЕ разумети. Нельзя бо его о одной которой части розумети, але о всех речахъ, которіе тогды Хрістос чинилъ. Што пакъ чинилъ оуже есь от Божественных Евангелистъ чулъ. Прото тое слово СЕ ТВОРИТЕ на тотъ розумъ пріймати маемъ, яко бы Хрістос реклъ тако: «Се, што Азъ нине творих, и вы напотом творите в Мое въспоминанье». Хрістос пакъ не только Хлебъ показалъ, але и вси тые речи, которіе святіи Евангелисты припоминають, чинилъ.

А такъ тайна ест все деаніе или твореніе, зложеное от земскыя и небесныя речи по Хрістову повеленію.

**ПЫТАНЬЕ**

Што се за речи земские и небесные быти кажешь, от них же зложены бывають тайны Хрістовы?

А дзеля лепшага разуменьня разгледзь таямніцы Майсеявага Закону ды таямніцы, якія былі яшчэ да Закону. Пэўная рэч: Пасха, абразаньне ды ахвяры былі таямніцамі. Але падчас Пасхі не само тое ягня было таямніцаю, а ўсё тое дзеяньне, што рабілі Ізраэльцы паводле загаду Божага. Тым жа звычаем у таямніцы абразаньня ня той каменны нож, ані тая крайняя плоць былі таямніцай, але ўся тая Боская справа цалкам была таямніцай.

Ды і ў Новым Запавеце таямніцы гэтаксама разумеюцца. Як, перадусім, таямніца Сьвятога Хросту — гэта ня толькі сама вада, але: і вада, і пагружэньне ў ваду, і прызываньне Сьвятой Тройцы, і навучаньне – ды ўся тая справа, якую Хрыстос загадаў рабіць, называецца таямніцай. Тым жа звычаем і пры Вячэры Госпадавай ня хлеб толькі таямніца, ані віно, але: хлеб, віно, навучаньне, малітва, падзяка ды, напрыканцы, ядзеньне і піцьцё, або прычашчэньне зь вераю — уся гэтая справа, якая выконваецца паводле загаду Хрыстовага.

Разумей жа ды памятай, што абразаньне, калі ёсьць нож, а чалавека, якога абразаюць, няма, ня можа быць таямніцай. Тым жа звычаем і хрост: хаця б і вада была, і малітву хрысьціцель прачытаў, а нікога б не ахрысьціў, тую ваду і малітву ніхто ня можа назваць таямніцай.

Гэтаксама мусім разважаць і пра Вячэру Госпадаву. Калі б хтосьці падрыхтаваў стол ды абрус ды, па-над тое, хлеб і віно на сьвяты прастол палажыў, малітву ды падзяку склаў, а не было б прычашчэньня, — як цяпер узялі за звычай, — ня можа той хлеб зь віном і з малітвамі быць таямніцай. Не адна бо частка складае таямніцу, але ўсе часткі.

Дзеля гэтага сьвятыя Эвангелісты, кажучы пра таямніцу, якую Хрыстос складаў са Сваімі вучнямі, узгадваюць усё падрабязна. Найперш, што Ён сеў за стол не адзін, але разам са Сваімі вучнямі. Потым – што пра Свае пакуты гаварыў, як хлеб узяў, Богу дзякаваў, як хлеб разламаў, вучням падаў, загадаўшы есьці і піць, а потым сказаў такія словы: «Гэта рабіце ў Маю памяць» (Лк. 22: 14-22). Гэтаксама і Апостал Паўла піша.

Тут, спыніўшыся, разгледзь сам уважліва, як ты мусіш разумець словы «ГЭТА РАБІЦЕ». Нельга бо іх аднесьці да адной нейкай часткі, але трэба іх аднесьці да ўсяго, што зрабіў тады Хрыстос. А што Ён зрабіў, ты ўжо чуў ад Божых Эвангелістаў. Таму словы «Гэта рабіце» мусім так разумець, нібыта Хрыстос сказаў: «Тое, што Я раблю зараз, і вы потым рабіце ў Маю памяць». Хрыстос жа ня толькі хлеб паказаў, але і ўсё тое зрабіў, што ўзгадваюць сьвятыя Эвангелісты.

А калі так, таямніца – гэта ўсё дзеяньне або ўчынак, што мае кшталт зямны ды нябесны і складаецца паводле загаду Хрыстовага.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што гэта за кшталты зямныя і нябесныя, зь якіх, як ты кажаш, складаюцца таямніцы Хрыстовыя?

**ОТКАЗЪ**

Тайна бо от двух речей складается. Одну речь или вешчь видети можемъ, понеже ест от земли и видимая. Другое речи видети нельзя очима телесныма, занеже ест небеснаа речь и духовнаа. Яко на взорь розсмотри собе тайны все, напред Ветхаго Завета, потым Нового. Жертвы оные Аароне чи не мели земских речей? Каждому зведомо, ижь оные овцы, юнци, овны, телице, вино, птахи, мукоу, соль и прочая не съ небеси брали Іереи или жерци, або свяшченници, але зде, на земли, птаху от птиц, вино от лозы, овци от стада, по томужь и иншая овяда и на оные жертвы избрали.

А ведже ешче на том не досить ижь сіе земские речи изберали, закалали и на жертву приносили, естли бы тамо небесное речи не было. То ест Господа нашого Ісус Хріста. Бо оные жертвы для того Богъ приносити велелъ оным отцом и до Закона и под Закономъ, абы ся тымъ обычаемъ и оупевняли и тешили, ижь оное семя женское в раи ешче обетованное мело прійти и главу змиеву, по Словеси Божіемъ, съкрушити (Быт. 3). А сіа речь была при оныхъ тайнехъ небесная или духовнаа, на которой все залежало. На которую они святіи отци духовныма очима гледели. То есть верили, ижь Сынъ Божій мелъ тело приняти и за грехи всего света утерпети и я кровію Своею очистити.

Но не вси и тогда таковы очы мели. Не каждый оные приношеніа или жертвы за памяти а за образы Хрістовыя страсти чинил и почитал. Лицемери бо не для того жертвы приносили, абы пришествіе Хрістово образовали и себе оупевняли, але оные образы за самую речь почитаючи, от них ся оправданія надеяли. Тіи вельми ся омыляли. Бо оное знаменію приписовали, што самой речи приписовати мели.

Прото часто Богъ через Пророкы гудить жертвы, не для того, иж бы оуставы Своея ненавиделъ, але ижь онъ людъ не у тотъ способъ оны жертвы приносилъ, у который Богъ приносити велелъ. Тако бо были собе в обычай взяли, хотя жь веры о пришлымъ Хрісте не имели, добрих теже делъ прожни были, но паче убійство, лихоимство, блудъ, пианство и таковаа в собе маючи, каятися не дбали, только ся на жертвы надеяли. Тем же оны их жертвы тако Богъ у Пророка шацуеть: «Что Ми множество треб вашихъ, полнъ есмь, всесъжженіа овенъ, и лоя агнечя, и крове юнчя и козля не хошчу». Там же рече: «Теміанъ огнушеніе Ми ест» (Ісаіа 1, Псалом 49).

А чого для Своими требами гнушается Господь? Давецъ Самъ оныя Собе приносити велелъ? Правда ест, ижь Самъ велелъ, но не по тому. Естли бы они таковые жертвы в тот обычай Богу приносили, в который Онъ велелъ, не погорделъ бы ими. То естъ, естли бы не только на земную речь гледели, але бы и на небесное духовныма очима смотрели. Чого для праведнаго Авела принялъ Богъ жертву? Бо написано, яко възрелъ Господь на Авела и на дары его, на Каина же и на дары его не възрелъ.

**АДКАЗ**

Таямніца складаецца з двух кшталтаў: адзін кшталт мы можам бачыць, бо ён зямны і бачны. Другі кшталт ня можам убачыць цялеснымі вачыма, бо ён нябесны і духоўны. Як узор разгледзь усе таямніцы, найперш Старога Запавету, потым і Новага. Ахвяры Ааронавы ці ж ня мелі зямнога кшталту? Кожнаму вядома, што тых авечак, бараноў, ягнятаў, валоў, віно, птушак, муку, соль ды іншае сьвятары бралі ня зь неба, але тут, на зямлі: птушкі – ад птушак, віно – з лазы, авечак ды іншую гавяду – са статку.

Але было б недастаткова браць, забіваць і ў ахвяру прыносіць, калі б не было нябеснага кшталту, гэта значыць, Госпада нашага Ісуса Хрыста. Бо дзеля таго Бог загадаў тым айцам прыносіць ахвяры і да Закону, і пад Законам, каб такім звычаем яны былі пэўныя і цешыліся, што патомства, яшчэ ў раі абяцанае, мелася прыйсьці і галаву зьмею, паводле Божага Слова, сьцерці (Роду 3). І гэты кшталт, на якім усё залежала і на які сьвятыя айцы глядзелі духоўнымі вачыма, быў у тых таямніцах нябесны або духоўны. Значыць, яны верылі, што Сын Божы меўся прыняць цела, і за грахі ўсяго сьвету меўся цярпець, і крывёю Сваёй іх меўся ачысьціць.

Але ня ўсе тады мелі такія вочы. Ня кожны тыя прынашэньні або ахвяры лічыў ды ўважаў за напамін і вобраз пакутаў Хрыста. Крывадушнікі бо прыносілі ахвяры не дзеля таго, каб абвяшчаць прышэсьце Хрыста ды саміх сябе запэўніваць, але, уважаючы тыя вобразы за самую рэч, спадзяваліся імі апраўдацца. Вельмі яны памыляліся, бо тое, што мелі прыпісаць самой рэчы, вобразу прыпісвалі.

Дзеля гэтага Бог праз Пракаў часта ганьбіць ахвяры не таму, што пастановы Свае ненавідзіць, але таму, што народ не ў той спосаб, як Бог загадаў, прыносіў ахвяры. Такі бо ўзялі сабе звычай, што, хаця і ня верылі ў прыйсьце Хрыста, добрых учынкаў таксама ня мелі, але, поўныя забойства, хцівасьці, распусты, п'янства ды падобнага, пра пакаяньне ня дбалі, спадзеючыся толькі на ахвяры. Таму праз Прарока Бог так гаворыць пра іхнія ахвяры: «Што мне з многіх ахвяраў вашых? – кажа Госпад. – Я насычаны і не хачу целапаленьняў бараноў, і тлустасьці кормных цялят, і крыві валоў і ягнят ды казлоў»,– ды там жа яшчэ гаворыць: «Каджэньне агіднае Мне» (Іс. 1, Пс. 49).

А дзеля чаго Госпад грэбуе Сваімі ахвярамі? Даўца, Ён Сам загадаў, каб Яму іх прыносілі. Праўда ў тым, што Ён Сам загадаў ахвяры прыносіць, толькі ня тым звычаем. Калі б народ прыносіў Богу тыя ахвяры так, як Ён загадаў, ня гардзіў бы імі Бог. Значыць, калі б народ ня толькі на зямны, але і на нябесны кшталт глядзеў духоўнымі вачыма. Дзеля чаго Бог прыняў ахвяру справядлівага Абеля? Бо напісана, што зірнуў Госпад на Абеля і дар ягоны, а на Каіна і дар ягоны не зірнуў.

Юдэі ды манахі мяркуюць, што дзеля таго Госпад зірнуў на Абеля, бо, маўляў, ён прынёс у ахвяру тлустую жывёліну. Зноў, на Каіна дзеля таго, маўляў, не зірнуў, што той прынёс горшае жыта. Але гэта старэ-

Жидова и мнихи домнимаются, абы того для Господь возрелъ на Авела, ижь, дей, сытую животину на жертву принесъ. Опять, на Каина для того, дей, не смотрелъ, ижь што горшая жита принес. Лечь то старечьские басни. Не в лой бо кохается или благоволить Господь, но по Пророку, «благоволить Господь на бояшчихся Его и на уповаюшчих на милость Его» (Псалом 146).

Не лой бо, мовлю, залетилъ Богу Авела, але упованіе на милость Божію, котораа ест Сынъ Божій. У которого ижь веровал Авел, полюбил и Богъ, и погледел на дары его. Даеть о томъ знати и Моисей. Бо не рече: «Възрелъ Господь на дары, а потомъ на Авела». Але на отворотъ пишеть, ижь возрелъ Господь на Авела и на дары его. Бо естли бы дары причиною были возреніа на Авела, яко жиды з мнихами розумеють, ино бы написано, яко перъвей на дары Богъ возрелъ.

Але не много ся о томъ бавити потреба. Бо о том Апостолъ известно сведчить, яко не для сытого мяса, але для веры в Сына Божіа полюбилъ Богъ Авела. Тако бо о том пишеть: «Верою приатнейшую жертву Авелъ, нежели Каинъ, принесе Богови» (Евр. 10: 35-11: 7). «Верою» рече, не «сытостію». А вера пакъ мусить мети о што бы ся оуперала. О том вже есмь поведелъ, ижь естъ Хрістос, се естъ небеская или духовная речь. Той естли при которой жертве былъ, то естъ естли они, которіи жертву приносили во Нь верили, то она их жертва достаточная была тайна, не только з речи земное, але теже и з небеское зложена. Бо онъ баран або телица або што инъшого телесная речь была, але над то Хрістос яко духовная речь былъ тамъ же на сердци каждого веруюшчого. Того бо для и тайна наречеся, ижь не только тое в ней естъ, што телесные очи видять, але ся иная речь в ней таить, сие естъ на вере таится духовная речь. Бо не ведаеть никто ничиего сердца, мает ли верю або не маеть.

А што есмь поведелъ о тайнех Ветхого Завета, тое жь и по тому жь розумети маемъ о тайнех Нового Завета. Бо тые по тому жь съ двухъ речей складаются. Естъ в них духовнаа речь, естъ и телесна. Яко тайна святого крешченіа маеть видимую речь или телесную – воду, але надто маеть теже и невидимую или Духа Святого. Креститель крешчаеть водою видимымъ обычаем егда погружаеть и (Хріста? – *Рэд.*) призываеть, но Сам Господь Духомъ Святымъ крешчаеть невидимымъ обычаемъ, естли ся крешчайся сердцомъ веруеть. Так обо Іоаннъ о собе и о всех крестителехъ поведелъ: «Азъ оубо крешчю вы водою в покаяніе, Градый же по мне креплее мене ест, Ему же не есмъ достоин сапогы понести, Той вы крестить Духомъ Святымъ» (Матф. 3:1-12; Іоан 1:18-28).

На тот же обычай и Вечера Господня, телесную речь маеть хлебъ и вино, духовную пакъ или небескую Тело и Кровъ Господа нашого Ісус Хріста, яже хлебъ и вино, речи телесные, образують.

**ПЫТАНЬЕ**

Для того ли только тайны тое имя мають, ижь при них не только телесные, але и духовные суть речи?

чыя выдумкі. Ня лой бо любіць і не да лою бо міласьцівы Госпад, але паводле прарока, «Госпад спагадае тым, хто баіцца Яго» (Пс.146).

Ня лоем, кажу, дагадзіў Абель Богу, але спадзяваньнем на міласьць Божую, якая ёсьць Сын Божы, і ў Якога верыў Абель. Таму Бог палюбіў Абеля і зірнуў на Ягоныя дары. Дае знаць пра гэта і Майсей, ён бо не напісаў: «Зірнуў Госпад на дары, а потым на Абеля»,— але, наадварот, піша: «Зірнуў Госпад на Абеля і на дары яго». Бо калі б дары былі прычынай таго, што Госпад зірнуў на Абеля, як юдэі з манахамі мяркуюць, то было б напісана, што Бог зірнуў перш на дары.

Але ня трэба наконт гэтага шмат бавіцца, бо Апостал ясна сьведчыць, што Бог палюбіў Абеля ня дзеля тлустага мяса, але дзеля веры ў Сына Божага. Так бо ён піша: «Празь веру Абель прынёс Богу лепшую ахвяру, чым Каін» (Гебр. 11: 4). «Празь веру» тут сказана, а не: «Дзеля тлустага мяса». А вера мусіць на нешта абапірацца, а гэтае апірышча, як ужо я казаў, Хрыстос, – значыць, нябесны або духоўны кшталт. Калі Ён быў падчас нейкай ахвяры, — значыць, калі чалавек, што прыносіў ахвяру, верыў у Хрыста, — то такая дасканалая ахвяра была таямніцай, складзенай ня толькі з кшталту зямнога, але таксама і з кшталту нябеснага. Той вол, або ягня або што іншае мела кшталт цялесны, але, акрамя таго, Хрыстос як кшталт духоўны быў там жа, у сэрцы кожнага веруючага. Дзеля таго бо і названая такая справа таямніцай: у ёй ёсьць ня толькі тое, што бачаць цялесныя вочы, але і схаваны ў ёй яшчэ адзін кшталт – гэта значыць, кшталт духоўны, заснаваны на веры. Да таго ж ніхто ня ведае, ці мае нечае сэрца веру, ці ня мае.

А што сказаў я пра таямніцы Старога Запавету, тое самае і тым жа звычаем мы маем разумець пра таямніцы Новага Запавету. Бо таямніцы Новага Запавету таксама складаюцца з двух кшталтаў: ёсьць у іх кшталт духоўны, ёсьць і цялесны. Напрыклад, таямніца Сьвятога Хросту мае кшталт бачны або цялесны – ваду, але па-над тое мае таксама і кшталт нябачны або духоўны – Духа Сьвятога. Хрысьціцель хрысьціць вадою бачным звычаем, калі ў ваду акунае і прызывае (Хрыста? – *Рэд.*), але Сам Госпад хрысьціць Духам Сьвятым у нябачны звычай, калі той, хто хрысьціцца, верыць сэрцам. Так бо Ян сказаў пра самога сябе і пра ўсіх хрысьціцеляў: «Я вас хрышчу вадою дзеля навярненьня, але Той, Хто прыйдзе па мне, дужэйшы, чым я. Яму я ня варты насіць сандаляў. Ён будзе хрысьціць Духам Сьвятым» (Мц. 3:11, Ян 1: 27).

Тым жа звычаем і Вячэра Госпадава мае цялесны кшталт – хлеб і віно, духоўны ж або нябесны кшталт – Цела і Кроў Госпада нашага Ісуса Хрыста, якія хлеб і віно – кшталты цялесныя – азначаюць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці толькі дзеля таго таямніцы называюцца таямніцамі, што яны складаюцца ня толькі зь цялесных, але і з духоўных кшталтаў?

**ОТКАЗЪ**

Не одно для тое причины, але и для иных знаменій тайных называются тайны. Кажда бо тайна маеть в собе колько тайных образовъ, которыми нас або к доброму житью, або къ крепкому веранью приводить. Яко обрезанье образовало или знаменовало, ижь каждый верный маеть быти обрезаного сердца: то естъ повиненъ похоти вонъ с него выкинути. На тотъ обычай и самъ Мойсей толкуеть, где рече: «Обрежите обрезки сердецъ ваших, и шии вашихъ незатвержайте к тому» (Втор. Зак. 10).

При той же тайне былъ и инший образъ с того, ижь певного оуда бывало обрезаніе, сиречь роднаго оуда, абы обрезаюшчеися на обетованіе в раи Богомъ оучиненое паметали: «Семя женско съкрушить, тобе, змие главу» (Быт. 3). И на оное Аврааму оучиненое: «О семени твоем благословятся вси языцы» (Быт. 22, Гал. 3: 8-12).

Ешче и тое ся при обрезаніи образовало, ижь без пролитиа крови не бывало, абы ведали, яко вылитьемъ Пресвятое Крови Господа нашего Ісус Хріста очишчени быти мели. По тому жь и о Нового Завета тайнех розумети маемъ. Яко святое крешченіе не только тое образуеть, ижь крешчени бываемъ Духомъ Святым, абы есмо гнева Божіа и преступленіа Адамова простіи, але к тому напоминаеть нас, абы есмо грехомъ умерли, а в добрих делех жили. Тако бо розумеется ова справа, коли человека тремижды у воде погружають и от воды выймають. О том Апостолъ широко к Римляном пишеть, а межи иными словы тако рече: «Елици крестихомся в Хріста Ісуса, въ смеръть Его крестихомся. Съпогребохомся оубо с Ним крешчениемъ въ смерть, да яко же въста Хрістос от мертвых славою Отчею, тако и мы въ объновленней жизни ходити начнем» (Рим. 6: 3-10).

Видишь, какова тайна в святом крешченіи? По тому жь и тайна Тела и Крови Господа нашого многые таинства в собе маеть, которіе образуеть и которих бы немало поведати надобе, але на тотъ час оную только припомену, которую теже Апостолъ сими словы назначилъ: «Хлебъ, иже ломимъ, не обшченіе ли Телу Христову ест? Яко един хлебъ, едыно тело есмы. Вси бо от единаго хлеба причашчаемся» (1 Кор. 10:12-22).

Розгледи сія слова, а оувидишь, ижь тайна Тела Христова образуеть, яко мы вси едино тело есмо. Чого деля любовъ промешку себе заховати должни есмо.

**ПЫТАНЬЕ**

Оуже по части розумею, што ест тайна и для чого тое имя маеть. Але скажи ми, кто тайны установилъ а естъли теперь кто причиняти их можеть?

**ОТКАЗЪ**

Все Святое Письмо Нового и Ветхого Завета явне сведчить, ижь никто инший, разве Сам Богъ, тайны уставилъ или подалъ. Яко напервей ешче в раи Адамоу оные дерева Самъ Богъ в тайну уставилъ, одно – дерево живота посреди раю, а другое – уменіа добра и зла

**АДКАЗ**

Ня толькі дзеля гэтай прычыны, але і дзеля іншых нябачных знакаў. Кожная бо таямніца мае ў сабе некалькі нябачных вобразаў, якія нас прыводзяць або да справядлівага жыцьця, або да моцнай веры. Напрыклад, абразаньне азначала або паказвала, што кожны верны мусіць мець абрэзанае сэрца, значыць, павінен зь яго выкінуць вон пажаданьні. Тым звычаем і сам Майсей гэта тлумачыць, калі кажа: «Дык абрэжце сэрца вашае і цьвёрдасьць карку вашага» (Паўт. Зак. 10).

У гэтай жа таямніцы быў і яшчэ адзін вобраз – абразаньне пэўнага органа, гэта значыць, дзетароднага, каб той, хто абразаецца, памятаў на абяцаньне Бога, дадзенае ў раі: «Патомства жанчыны скрышыць табе, зьмей, галаву» (Роду 3), і на абяцаньне, учыненае Абрагаму: «І атрымаюць дабраславенства ў патомстве тваім усе народы зямлі» (Роду 22, Гал. 3: 8). А тое, што абразаньне не магло быць без праліцьця крыві, азначала, што праз праліцьцё найсьвяцейшай крыві Госпада нашага Ісуса Хрыста мы мелі быць ачышчаныя.

Гэтаксама мы маем разумець і таямніцы Новага Запавету. Напрыклад, Сьвяты Хрост значыць ня толькі тое, што мы хрысьцімся Сьвятым Духам, каб вызваліцца ад гневу Божага ды граху Адама, але і тое нам нагадвае, што мы памерлі дзеля граху і ажылі дзеля добрых ўчынкаў. Так бо трэба разумець тую справу, калі чалавека тройчы ў ваду пагружаюць ды з вады вынімаюць. Пра гэта і Апостал падрабязна піша да Рымлянаў, ды, між іншага, так кажа: «Мы ўсе, ахрышчаныя ў Ісуса Хрыста, ахрышчаныя ў сьмерць Ягоную. Таму праз хрост мы разам зь Ім пахаваныя ў сьмерць, каб, як Хрыстос быў уваскрошаны з памерлых славаю Айца, так і мы пачалі жыць абноўленым жыцьцём» (Рым. 6: 3-4).

Бачыш, якая таямніца Сьвятога Хросту? Гэтаксама і таямніца Цела і Крыві Госпада нашага шмат знакаў у сабе зьмяшчае, пра якія нямала трэба было б сказаць, але зараз толькі той узгадаю, які таксама Апостал вось так вызначыў: «А хлеб, які ломім, ці ня ёсьць удзелам у Целе Хрыстовым? Калі адзін хлеб, таму мы, многія, творым адно цела, бо ўсе мы дзелімся тым самым хлебам» (1 Кар. 10: 16-17).

Разгледзь гэтыя словы і ўбачыш: Таямніца Цела Хрыстова значыць, што ўсе мы ёсьць адно цела. Дзеля гэтага мусім захаваць паміж сабой любоў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ужо пакрыху разумею, што такое таямніца і дзеля чаго яна так завецца. Але скажы мне, хто пастанавіў таямніцы ды ці можа хто іх зараз пастанаўляць?

**АДКАЗ**

Усё Сьвятое Пісьмо Новага і Старога Запавету яўна сьведчыць, што не хто іншы, але Сам Бог пастанавіў або даў таямніцы. Як, найперш,

(Быт. 2). Тым же обычаемъ по потопе Самъ Богъ далъ Ноеви тайну и всему потомству – се ест дугу на облацех.

Теже и под Закономъ никто власти не имелъ тайны поставляти. А кто ся того на онъ часъ чинити важилъ, ведаемъ, яко таковых Богъ тяжко каралъ. Не минулося бо онымъ Ізраилтяномъ, которіи не маючи повеленіа Божіего, тайну собе нарядили. Ачкольвекъ Самому Богу образъ были учинили, предся были смертію скарани (Исход 22). Не хочеть бо Богъ, абы Ему кто по своей воли служилъ, але хочеть, абы Ему по тому вси служили, яко Онъ Сам оуказалъ и постановилъ. «Не приложите жь, — рече, — къ словом сим, еже глаголю вам, ничтоже и ни отнимайте от них» (Втор. Зак. 4). А на иномъ месте рече: «Елико азъ заповедаю вамъ, тое чините Господу Богу. И да не приложите к сим и не уменшайте от них» (Там же, 12).

Недобре ся стало Надаву и Авиуду, ижь чужий огонь принесоша пред Господа (Левіт 10). Скаралъ Богъ Саоула царя, иже ся над волю Господню догадывалъ собою от користей неприятельских зоставити на жертву, чого Богъ зоставити не велелъ (1 Цар. 12). Иншие вельми многые приводы опушчаю.

От Нового Завета оное слово за великий довод стоить, которое Апостолъ Павелъ пред выписаньемъ Вечери Господней къ Коринфомъ тако написалъ: «Азъ приняхъ от Господа, еже передахъ вамъ, яко Господь Ісус в ношчь в ню же предан бысть» (1 Кор. 11: 23-30). Розсмотри а помни, што Апостолъ пишеть. Не мей за тое, абы сія слова напрасно Апостолъ вместо предсловія положилъ. Великую убо наоуку в собе мають. Бо если такъ великому Апостолу в небеси учоному не годилося не рекучи тайнъ собою установити, але и уставеное отменяти або поправити, далеко ся мней кому другому годить.

Прото оные только тайны мають быти за тайны почитаны, которие намъ Сам Богъ или Сынъ Его подалъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Естли ся тайнъ никому иному, окроме Самого Бога, уставляти не годить, чому жь Авелъ, праведенъ будучи, жертву Господу принес (Быть 4), хотя жь ешче жертвы Богом не были уставлены?

**ОТКАЗЪ**

Ачкольвекъ того явне не выписано, абы Богъ Адаму или сыном его Каину и Авелю жерътву приносить велелъ, но предся з Писанья святого Апостола къ Евреомъ досыть значно, ижь не сами Каинъ и Авелъ собою жерътвъ принести Богу догадали. Бо Апостолъ пишеть о Авеле, яко верою множайшую жертву Богови принесъ, нежели Каинъ (Евр 10: 35-11: 7). Розсмотри же собе што бы за вера могла въ Авелу быти, естли бы не мелъ от Бога о приношеніи жертвы повеленіа? Мусить бо вера мети на чом бы ся садила. То естъ вера правдиваа мусит ся садити на Слове Божіемъ. Бо естли бы того основаніа не мела, не можеть быти верою.

яшчэ ў раі Сам Бог даў Адаму як таямніцу тыя дрэвы: адно – дрэва жыцьця пасярод раю, другое – дрэва пазнаньня дабра і зла (Роду 2). Тым жа звычаем пасьля патопу Сам Бог даў Ною і ўсяму ягонаму патомству таямніцу – значыць, вясёлку ў небе.

Таксама і пад Законам ніхто ня меў улады пастанаўляць таямніцы. А калі хтосьці ў той час адважваўся гэта учыніць, ведаем, што Бог цяжка такога караў. Не мінулася бо тым Ізраэльцам, якія, ня маючы Божага загаду, пастанавілі сабе таямніцу. Хаця яны стварылі выяву Самога Бога, аднак усё роўна былі пакараныя сьмерцю (Вых. 32). Ня хоча бо Бог, каб яму хтосьці паводле ўласнай волі служыў, але Ён хоча, каб мы Яму так служылі, як Ён Сам паказаў ды пастанавіў: «Не дадавайце нічога да таго, што я вам кажу, ані адымайце ад яго» (Паўт. Зак. 4). А ў іншым мейсцы сказаў: «Што загадваю вам, тое беражыце і рабеце, нічога не дадаючы і не адымаючы» (тамсама, 12).

Нядобра сталася Надабу і Абігу таму, што прынесьлі чужы агонь перад аблічча Госпада (Сьвят. 10). Пакараў Бог валадара Саўла, бо той вырашыў, насуперак волі Госпадавай, пакінуць на ахвяру зь непрыяцельскай здабычы тое, чаго Бог не загадваў (1 Сам. 12). Іншыя вельмі многія прыклады ня ўзгадваю.

У Новым Запавеце за важны доказ уважаецца слова, якое Апостал Паўла перад апісаньнем Вячэры Госпадавай так да Карынцянаў выклаў: «Бо я гэта атрымаў ад Госпада і перадаў вам, што Госпад Ісус у тую ноч, калі меў быць выдадзены» (1 Кар.11: 23).

Разгледзь ды памятай, што піша Апостал. Не ўважай, што гэтыя словы Апостал далучыў проста так, замест прадмовы: яны зьмяшчаюць вялікую навуку. Калі такому вялікаму Апосталу, дасьведчанаму ў духоўных справах, не належала ня толькі самому пастанаўляць таямніцы, але і пастаноўленыя таямніцы адмяняць або папраўляць, тым больш нікому іншаму не належыць.

Дзеля таго толькі тыя таямніцы мусяць уважацца за таямніцы, якія нам даў Сам Бог або Ягоны Сын.

**ПЫТАНЬНЕ**

Калі таямніцы нікому іншаму, акрамя Самога Бога, не належыць пастанаўляць, чаму ж Абель, будучы справядлівым, прынёс ахвяру Госпаду Богу, хаця ахвяры яшчэ не былі Богам пастаноўленыя (Роду 4)?

**АДКАЗ**

Хаця і не напісана, што Бог загадаў Адаму або ягоным сынам – Каіну і Абелю – прыносіць ахвяры, аднак зь ліста сьвятога Апостала Паўлы да Гебраяў дастаткова зразумела, што Каін і Абель ня самі здагадаліся прынесьці Богу ахвяры. Бо Апостал піша пра Абеля, што той вераю прынёс Богу ахвяру большую за Каінаву (Гебр.11: 4). Сам разгледзь: ці меў бы Абель веру, калі б ён не атрымаў ад Бога загаду прынесьці ахвяру? Мусіць бо вера на нешта абапірацца. Гэта значыць, праўдзівая вера мусіць абапірацца на Божае Слова, бо калі вера ня

А како бо кто веру крепкую о деле своемъ мети можеть, ижь оное дело его естъ Богу любо, естли бы не мелъ повеленіа Божіего о оном деле? Тогды бо можеть человекъ верити, ижь Богъ любить дело его, коли ест певен, ижь оное дело, которое чынить, Богъ чинити велелъ. Прото поневажь по Апостольскому сведетельству Авель мелъ веру о своей жертве, иже ся мела Богу полюбити, явная речь, иже ему и Каину былъ Богъ жертвы приносити велелъ. Бо естли бы не тако, нельза бы Авелю веры мети. Але бы муселъ сомнитися о своей жертве, естли бы Богу люба или не люба.

К тому явнаа речь от Святого Писанья, ижь Адамъ скоро по гресе своимъ ешче в раи взялъ обетованіе от Бога (Быт. 3), яко мело семя женьское съкрушити главу змеову. Естли Адаму далъ Богъ обетованіе, подобенство указуеть, ижь ему далъ и тайну, которою бы собе оное обетованіе на память приводилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Для которихъ причинъ Богъ тайны постановилъ?

**ОТКАЗЪ**

На початку сее розмовы поведелъ есмъ, ижь Богъ для того человека створити рачил, абы Его зналъ, любилъ, Ему служилъ а потом с Ним навеки жилъ. Ино жизнь вечная на познанью Бога залежить, по Апостолу, иже пишеть, яко «Богъ всемъ человекомъ хошчеть спастися и в разумъ истины прійти» (1 Тім. 2: 1-15). Прото абы сію речь человекъ могъ мети, черезъ которую к вечной жизни прійти маеть, далъ Богъ ему Слово Свое и тайны. Абы черезъ сіа къ познанью Бога и Его воли приходилъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Чому Богъ заразомъ тако разумнага человека створити не рачил, абы безъ наоукы и тайн Его зналъ и любилъ?

**ОТКАЗЪ**

Пристойна речь Богу была таковомъ створити человека, яко есь поведелъ. И маешь ведати, яко изначала таковогo былъ Богъ въ истинну отца нашого Адама и Еву матку сворилъ. Бо Святое Писмо сведчить, ижь Богъ по образу и подобію Своему створилъ былъ человека, то естъ яко Богъ вечный, премудрій святый, праведенъ (Быт. 1), тако и человекъ былъ създанъ бесмертный, разуменъ, святъ, и праведенъ, к тому и самовластенъ.

Таковъ, мовлю, былъ нашь отецъ, и мы таковыя же быти мели. Но, завистію порушенъ, діавол привел родителей нашихъ, иже заповедь Божію разрушили, и от оного древа заповеданого укусили, зачим онъ образъ Божій утратили. Се есть всяких добродетелей Божіих сутъ лишени и мимо тое и самовластиа позбыли. Ведомость теже о Бозе малая вельми в них осталася. О чомъ Духъ Святый тако поведелъ: «Человекъ внегда въ чти сый неразуме, оуподобися скотомъ несмысленнымъ и приравняся имъ» (Псалом 48).

мае такой падставы, то і ня можа ўжо быць вераю.

А як бо хтосьці пра сваю справу можа мець моцную веру, што ягоная справа Богу любая, калі ён ня мае Божага загаду наконт той справы? Тады бо можа чалавек верыць, што Бог любіць ягоную справу, калі ён пэўны, што справу, якую ён робіць, Бог рабіць загадаў. Калі ж, паводле сьведчаньня Апостала, Абель меў веру, што ягоная ахвяра спадабаецца Богу, відочная рэч, што яму і Каіну Бог загадаў прыносіць ахвяры. Бо калі ня так, ня мог бы Абель мець веру, але мусіў бы сумнявацца, ці спадабаецца Богу ягоная ахвяра, ці не.

Да таго ж Сьвятое Пісьмо ясна кажа, што Адам у хуткім часе пасьля свайго граху, яшчэ ў раі, атрымаў ад Бога абяцаньне, што семя жанчыны скрышыць галаву зьмея (Роду 3). Калі Бог даў Адаму абяцаньне, падобна, Бог даў Адаму і таямніцу, якая б гэтае абяцаньне прыводзіла Адаму на памяць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля якіх прычынаў Бог пастанавіў таямніцы?

**АДКАЗ**

На пачатку гэтай размовы я сказаў, што Бог дзеля таго стварыў чалавека, каб чалавек Яго спазнаў, любіў, Яму служыў, а потым зь Ім жыў навечна. Вечнае жыцьцё, паводле Апостала, залежыць ад спазнаньня Бога, бо Апостал піша: «Бог хоча збавіць усіх людзей і давесьці іх да спазнаньня праўды» (1 Цім. 2: 4). Дзеля таго, каб чалавек мог мець спазнаньне праўды, праз якое мае прыйсьці да жыцьця вечнага, Бог даў яму Сваё Слова ды таямніцы, – каб праз іх прыходзіў да спазнаньня Бога ды Ягонай волі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму Бог адразу не стварыў чалавека такім разумным, каб той без навукі ды таямніцаў Яго ведаў і любіў?

**АДКАЗ**

Належала Богу стварыць чалавека такім, як ты сказаў. І маеш ведаць, што сапраўды ад пачатку такім Бог і стварыў айца нашага Адама і матку Эву, бо Сьвятое Пісьмо сьведчыць, што Бог стварыў чалавека на Свой вобраз і падабенства (Роду 1). Гэта значыць, як Бог – вечны, мудры, сьвяты, справядлівы, так і чалавек быў створаны несьмяротным, разумным, сьвятым, справядлівым, да таго ж надзеленым уладай над самім сабой.

Такім, кажу, быў наш Айцец і мы такія ж мелі быць. Але, поўны зайздрасьці, д'ябал прывёў нашых бацькоў да таго, каб яны парушылі Божае прыказаньне ды елі з забароненага дрэва, пасьля чаго яны страцілі той вобраз Божы. Гэта значыць, яны пазбавіліся ўсіх Божых цнотаў і згубілі ўладу над сабой. Таксама і пазнаньне Бога засталося ў іх вельмі малое, пра што Дух Сьвяты так сказаў: «Чалавек у славе ды без развагі падобны да жывёлы, што на зарэз» (Пс. 48).

Видишь ли, к чому пришолъ человекъ: от образа и подобиа Божіего в подобие скота несмышленного? А ведже Богъ – у Него ест неизреченная милость, и много избавленіе (Псалом 129) — помиловалъ человека, и, хотячи его опять къ перъвому образу привести, далъ ему обетницу о Хрісте, далъ тежь и Слово Свое, и притомъ Божественныя тайны, абы тымъ обычаемъ могъ в познаніе или в разумъ пріити, яко вже вышшей ест речено.

**ПЫТАНЬЕ**

Гаразд кажешь, але чого жь для и в раи ешче до Адамова съгрешеніа, хотя жь ешче былъ Божіего образа, или правды не оутратилъ, предся Богъ далъ былъ человеку тайну, се естъ оные дерева (Быт. 2)?

**ОТКАЗЪ**

Ачкольвекъ на онъ часъ Адамъ мел правую ешче ведомость о Бозе, и самовластие въ всемъ здраво, але ижь предся плоть, или тело, имелъ, потреба ему было видимыхъ тайнъ. А естли на онъ часъ было потреба, далеко большей теперь ест потреба, в тако великимъ нашимъ недостатъку и темностехъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Какие пожитки маемъ с таковыхъ тайнъ?

**ОТКАЗЪ**

Великие воистинну пожитки веруюшчіи, коли тайнъ достойне поживають, беруть. Наперъвей бо бывають оупевнени о ласце Божіей къ собе. Бо тайны приводять нам на память Божіе добродейства, которие намъ учинилъ або за сыны Свои насъ пріймуючи, або Сына Своего насъ для даровавши. Другый пожитокъ, иже намъ припоминають нашое повиноватество. Але таковые пожитъки лепшей можем познати и обачити при каждой тайне выписаніи.

**ПЫТАНЬЕ**

Колько естъ тайнъ у Хрістианъ?

**ОТКАЗЪ**

Две только – Святое Крешченіе и Вечера Господня.

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого брака или женитьвы не почитаешь за тайну, по тому жь и покаанія, масломъ мазанья, и в попы поставленіа?

**ОТКАЗЪ**

Женитва, каяніе, и на оучительство избраніе, ачкольвекъ суть речи святые, але их предся ненадобе межи тайнъ личити. Каяние бо розумеется под Святымъ Крешчениемъ. Изберание пакъ на пастырство или на презвитерство и на діаконію не на всехъ, але на певные особы приходить. Опять, жененье или женитва не ест тайна, але санъ або станъ святый, который Самъ Богъ установилъ не для того, абы есмо

Бачыш, да чаго прыйшоў чалавек: ад вобразу ды падабенства Божага да вобразу неразумнай жывёлы. Але міласэрны Бог, у Якога «ласка і шчодрасьць збаўленьня» (Пс. 129), зьлітаваўся над чалавекам ды, хочучы зноў вярнуць яму першы вобраз, даў чалавеку абяцаньне пра Хрыста, даў яму таксама і Слова Сваё, а пры ім – Божыя таямніцы, каб такім звычаем чалавек мог прыйсьці да спазнаньня або да разуменьня, як ужо вышэй было сказана.

**ПЫТАНЬНЕ**

Добра кажаш, але дзеля чаго яшчэ ў раі, да Адамавага саграшэньня, калі чалавек меў Божы вобраз і падабенства, Бог усё адно даў чалавеку таямніцу, гэта значыць, тыя дрэвы? (Роду 2)

**АДКАЗ**

Хаця на той час Адам яшчэ меў праўдзівае пазнаньне Бога ды сваёй воляй ва ўсім кіраваўся справядліва, але, паколькі меў цела, яму былі патрэбныя таямніцы відочныя. А калі на той час была такая патрэба, значна большая яна цяпер, пры такіх вялікіх нашых недасканаласьцях ды цемнаце.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якую карысьць мы маем з такіх таямніцаў?

**АДКАЗ**

Сапраўды вялікую карысьць маюць веруючыя, калі годна ўдзельнічаюць у таямніцах. Найперш бо запэўніваюцца ў Божай міласьці да саміх сябе, бо таямніцы прыводзяць нам на памяць Божыя дабраславенствы, якія Ён нам учыніў, прыймаючы нас як Сваіх сыноў ды аддаўшы дзеля нас Свайго Сына. Да таго ж таямніцы нагадваюць нам пра нашыя правіны. Але гэтую карысьць мы можам лепш спазнаць ды пабачыць, разважаючы пра кожную таямніцу асобна.

**ПЫТАНЬНЕ**

Колькі ёсьць таямніцаў у Хрысьціянаў?

**АДКАЗ**

Дзьве толькі – Сьвяты Хрост ды Вячэра Госпадава.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго шлюб, або сужонства, ня лічыш за таямніцу, ды да таго ж і споведзі, памазаньня алеем ды пастаўленьня на сьвятарства?

**АДКАЗ**

Сужонства, пакаяньне ў грахах, абраньне на вучыцельства – справы сьвятыя, але ня трэба іх лічыць за таямніцы. Пакаяньне бо прыналежыць да Сьвятога Хросту. Абраньне на пастырства або прэсьвітэрства ды на дыяканства датычыцца ня ўсіх, але пэўных асобаў. Зноў жа, шлюб, або сужонства, ня ёсьць таямніца, але сан, або сьвяты стан, устаноўлены Самім Богам не дзеля таго толькі, каб мы злучаліся паміж сабой так, як злуча-

съвокупленіе свое, которое з Богомъ маемъ, образовали, але для иншихъ далеко причинъ. То есть напервей, ижь недобро быти человеку единому (Быт. 2). Потомъ абы ся тымъ обычаемъ людие множили. А ешче для устереженья блуда, яко Апостолъ повелеваеть, кождому свою жену мети (1 Кор. 6: 20-7: 12).

Што ся пакъ маслом помазыванья дотычеть, не токмо таково помазованіе тайна не ест, але таки згола от оучителей быти не маеть. Бо ачкольвекъ Апостоли, яко пишеть Марко, мазали масломъ многыхъ недужныхъ исцеляли (Марк 6: 7-13), але се только на час для потверженіа наоуки Евангельское, яко и вси иныя чюдеса, от Христа были взяли. А поневажь оуже чюдесъ не надобе, ино и мазанье масломъ не маеть быти. Наболей для тое причины, абы люд простый не домнималъ, яко для помазаніа маслом отпушчаеть Богъ грехы. Потому бо оуже начали о масле мудрствовати. Посланіе Іаковле велить теже немошчныхъ масломъ мазати, але тамъ черезъ масло розумеется лекарство, яко и у Пророка Ісаіа, где рече: «Нес пластыре приложити, ниже масла, ниже обязаніа» (Іак. 5:10-20, Ісаіа 2).

Прото тайнъ хритианскихъ нетъ болшей, разве две, которіе Сам Хрістос установилъ, – Святое Крешченіе, мовлю, и Вечера Господня. О которихъ вже зособна о каждой пытати можешь.

## А напервей
## О ТАЙНИ СВЯТОГО КРЕШЧЕНІЯ

**ПЫТАНЬЕ**

Выложь ми напервей, што ест Крешченіе?

**ОТКАЗЪ**

Крешченіе естъ видимый знакъ, се естъ въ воде погруженіе с призываніемъ Святыя Тройце. Або, по Апостолу, Крешченіе естъ баня пакы бытия и обновленіе Духа Святого, еже излиа на нас Богъ обилно Ісус Хрістомъ Спасителемъ нашимъ (Ефес. 5: 25-32).

**ПЫТАНЬЕ**

Для чого ся не згожаеть перъшое выписание или выложение з выписаніемъ Апостолъским? Тамо бо воду припоминаешь, а зде – Духа Святого?

**ОТКАЗЪ**

Нетъ никаковое незгоды. Бо вже есм вышей поведалъ, ижь тайна каждая ест зложена от речы духовныя и земныя. Земная речь ест знакъ или образъ, духовнаа пакъ ест самая речь, на которой все залежить.

**ПЫТАНЬЕ**

Што жь вода знаменуеть?

**ОТКАЗЪ**

Наперъвей значить грехомъ оставленіе, потом – духовно отроженіе.

емся з Богам, але і дзеля многіх іншых прычынаў. Гэта значыць, найперш таму, што нядобра быць чалавеку аднаму (Роду 2). Потым дзеля таго, каб тым звычаем памнажаўся род людзкі. А яшчэ каб сьцерагчыся блуду, як Апостал загадвае, каб кожны меў сваю жонку (1 Кар. 7: 2 ).

Што ж датычыцца памазаньня алеем, ня толькі такое памазаньне не таямніца, але і ўвогуле яно ня можа быць скарыстана вучыцелямі. Бо хаця ж Апосталы, як піша Марк (Мк. 6: 13), мазалі алеем многіх хворых і іх аздараўлялі, але гэта, як і ўсе іншыя цуды, паводле прыкладу Хрыста, яны рабілі толькі на той час дзеля пацьвярджэньня Эвангельскай навукі. А паколькі ўжо ў цудах няма патрэбы, то і памазаньня алеем больш ня трэба. Перадусім дзеля той прычыны яно не патрэбна, каб люд просты ня думаў, што праз памазаньне алеем Бог прабачае грахі. Таму што пачалі ўжо пра алей мудраваць. У лісьце сваім Якуб таксама загадвае мазаць алеем хворых, але ён разумее пад алеем лекі, як і прарок Ісая, калі той кажа: «Раны неабмытыя і неперавязаныя, і алеем не разьмякчаныя» (Як. 5: 14-15; Іс. 1: 6).

Дзеля гэтага таямніцаў хрысьціянскіх болей няма, адно толькі тыя дзьве, якія Сам Хрыстос пастанавіў, – Сьвяты Хрост, кажу, ды Вячэра Госпадава. Пра кожную зь іх асобна можаш спытацца.

## А найперш
## ПРА ТАЯМНІЦУ СЬВЯТОГА ХРОСТУ

**ПЫТАНЬНЕ**

Выкладзі мне напачатку, што ёсьць Хрост?

**АДКАЗ**

Хрост – гэта бачны знак, ён азначае пагружэньне ў ваду з прызываньнем Сьвятой Тройцы. Або, паводле Апостала, Хрост – гэта водная купальня і абнаўленьне праз Духа Сьвятога, Якога Бог шчодра выліў на нас у Ісусе Хрысьце, Збаўцы нашым (Эф. 5: 26-27).

**ПЫТАНЬНЕ**

Дзеля чаго не супадае першы выклад, або тлумачэньне, з выкладам Апостальскім? Там бо ваду ўзгадваеш, а тут – Духа Сьвятога?

**АДКАЗ**

Няма тут аніякай нязгоды. Бо ўжо вышэй я казаў, што кожная таямніца складаецца з кшталту духоўнага і зямнога. Зямны кшталт – гэта знак або вобраз, духоўны кшталт – самы галоўны, на якім усё залежыць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ж вада азначае?

**АДКАЗ**

Перадусім азначае вырачэньне грахоў, а потым – духоўнае нараджэньне.

**ПЫТАНЬЕ**

Што маеть вода за подобенство къ грехом оставленію? Сут ли подобные речи?

**ОТКАЗЪ**

Вельми собе суть подбные речи. Бо яко коли тело умарается, вода омываеть, тако и душа от греховъ оставленіемъ ихъ очишчается.

**ПЫТАНЬЕ**

А отраженіе или знову, або у другое роженіе, што до воды маеть?

**ОТКАЗЪ**

Кто бы ся знову родити хотелъ, мусить первей жизнь першую зложити, то ест умерети (Іоан 3:1-12). Бо естли бы не оумеръ, мусить в первом роженію жити. По тому жь и духовное роженіе розумеется. Хотячи бо отродитеся духомъ, винен оумершчвяти первую жизн, се ест похоти плотскыя, потом маеть въскреснути къ новому животу, то естъ к добримъ деломъ (Рим. 6: 3-10).

А ижь тое вода образуеть при Крешченіи, того для подобнаа ест новому рожденію. Крешчаючи бо, погружает креститель под воду человека, а тое ест смерть, и опять скоро на светъ выриваеть, а се образуеть новороженіе.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто маеть крестити?

**ОТКАЗЪ**

Хрістос, иже сію тайну установилъ, онымъ крестити велелъ, которимъ Слово проповедати, то ест самымъ Апостоломъ, а по нихъ – оучителемъ. Бо о том тако в Матфею написано: «Едининадесяте оученици идоша в Галилею въ гору ямо же повеле имъ Ісус, и видевше Его, поклонишася Ему, ови же усъмнишяся. И приступлъ Ісус рече имъ, глаголя: “Даст Ми ся всяка власть на небеси и на земли. Шедше и оучите вся языки крестяшче их въ имя Отца, и Сына, и Святого Духа”...» (Матф. 28: 16-20).

Зде явне ся значить, ижь тотъ маеть крестити, кто научаеть. Прото злый обычай Римъскаа церковъ маеть, въ ней же и бабы святы крешченіемъ служять.

**ПЫТАНЬЕ**

Чого надобе тому, кто креститися хочеть?

**ОТКАЗЪ**

Три речи таковй долженъ мети: верю въ Христа, исповеданіе и покаяніе. О покаяніи написано, ижь «крешчени Іоанном исповедали грехы своя» (Матф. 3: 1-12). Лука теже в Деяніах пишеть, яко пытаюшчимся Іоудеомъ святых Апостолъ што бы чинити мели, Петрь сими словы отказалъ: «Покайтеся и да крестится кождо васъ въ имя Ісу Христа въ оставленіе грехомъ» (Деан. 2: 38-47).

**ПЫТАНЬНЕ**

Як вада можа значыць прабачэньне грахоў? Хіба ж падобныя гэта рэчы?

**АДКАЗ**

Вельмі гэта падобныя рэчы. Бо як вада змывае бруд зь цела, так і душа праз вырачэньне грахоў ад іх ачышчаецца.

**ПЫТАНЬНЕ**

А нараджэньне нанова, або другое нараджэньне, што мае да вады?

**АДКАЗ**

Калі б хтосьці хацеў нарадзіцца нанова, перш мусіў бы скончыць ранейшае жыцьцё, гэта значыць, памерці (Ян 3:1-12). Бо калі не памрэ, мусіць жыць ранейшым жыцьцём. Гэтаксама трэба разумець і духоўнае нараджэньне. Калі хтосьці хоча нарадзіцца духам, павінен памерці дзеля ранейшага жыцьця, гэта значыць, дзеля пажаданьняў цела, потым мусіць уваскрэснуць да новага жыцьця, гэта значыць да добрых справаў (Рым. 6: 3-10).

А паколькі менавіта гэта азначае вада пры Хросьце, таму і падобны Хрост да нараджэньня нанова. Хрысьцячы бо, пагружае хрысьціцель чалавека пад ваду, – а гэта азначае сьмерць, – ды хуткім часам выймае яго з вады на сьвет, – а гэта і ёсьць нараджэньне нанова.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто мае хрысьціць?

**АДКАЗ**

Хрыстос, Які пастанавіў гэтую таямніцу, тым хрысьціць загадаў, хто Слова прапаведаваў, — гэта значыць, Апосталам, а пасьля іх – вучыцелям. Так бо пра гэта у Мацьвея напісана: «А Адзінаццаць вучняў пайшлі ў Галілею, на гару, як ім загадаў Ісус. І, убачыўшы Яго, пакланіліся Яму, а некаторыя сумняваліся. Ісус жа, падыйшоўшы, сказаў ім: "Дадзена Мне ўся ўлада на небе і на зямлі. Дык ідзіце і рабіце вучнямі ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа"...» ды так далей (Мц. 28: 16-20).

Тут зразумела сказана: той мае хрысьціць, хто вучыць. Дзеля гэтага Рымская царква мае шкодны звычай, бо ў ёй і жанчыны служаць Сьвятым Хростам.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што патрэбна таму, хто хоча хрысьціцца?

**АДКАЗ**

Такі чалавек павінен мець тры рэчы: веру ў Хрыста, вызнаньне веры ды пакаяньне ў грахах. Пра пакаяньне напісана, што «хрышчаныя Янам вызнавалі свае грахі» (Мц. 3: 6). Лука таксама ў Дзеях піша: калі Юдэі спыталіся ў Апосталаў, што маюць рабіць, Пётр адказаў у такія словы: «Пакайцеся, і няхай кожны з вас прыйме хрост у імя Ісуса Хрыста на адпушчэньне вашых грахоў» (Дзеі 2: 38).

О вере, иже надобе крешчаемому мети, Самъ Христос рече: «Иже верю иметь и крестится, спасенъ будеть» (Марк 16: 9-19). А не только на серци верю мети, але и оусты ее исповедати надобе, а затым маеть быти Крешченіе.

Того взоръ достаточный маемъ в Деаніахъ Апостольскихъ. Пишеть бо Лука, ижь Филиппъ діаконъ моляшчому и каженику, абы его окрестилъ, сими отказалъ словы: «Ашче веруеши от всего сердца своего, мошчно ти естъ» (Деан. 8: 26-39). И, отвешчав, каженикъ рече: «Верую Сына Божіа быти Ісус Хріста». Зде видишь и о вере пытанье, и оное достаточное вызнанье. Прото негараздъ теперь некоторіе чинять, они же жидовъ, турчиновъ, татар и иныхъ поганъ, не наоучивши ани житья ихъ дознавши, крестять.

**ПЫТАНЬЕ**

Досыть ли на тот час, то есть до Крешченіа, веру мети, оную исповедати и каятися?

**ОТКАЗЪ**

Не досыть. Бо Крешченіе не ест дочасное примирье, но вечный мирь или заветъ межи Богомъ и нами. На ним же Богъ пріимуеть нас за Своя чада, а мы подвязуемся Ему въ всемъ послушними детьми на весь животь быти. Тако бо розумеются оныя слова, которія креститель, погружаючи человека, говорить: «Крестится рабъ Божій въ имя Отца, и Сына, и Духа Святого, аминъ» (Матф. 28:16-20). Просте яко бы реклъ: «Пріимуеть Богъ сего человека за сына и за слугу Своего». А онъ теже обецуеть Бога мети вместо Отца и Господа своего.

Прото винен таковый человекъ не только до Крешченіа, але наболей по окрешченіи по воли Божіей жити, и все, што Крешченіе образуеть, деломъ полнити. О чомъ вышшей поведано. И добрь ест обычай съборныя церкви, ижь дорослыхъ людей крестячи, пытаеть креститель и о вере, и о том, естли ся отрекаеть сатаны и делъ его, и естли ся обецаеть Хрісту.

**ПЫТАНЬЕ**

А естли пакъ напотом упадеть крешчоный въ грехъ, што маеть чинити?

**ОТКАЗЪ**

Надобе бо не упадати, но крепъко напротиву грехомъ стояти, наболей помочи от Бога просити (Ефес. 6:10-17). Бо естли Той силы придасть, оудобно будеть не оупадати. А ведже если бы ся кому от недуга плоти своея упасти пригодило, не маеть таковъ сънмнитеся о оставленіи. Написано бо, яко Богъ не хочеть смерти грешнаго, но да навратится и живеть (Іезек. 18).

И маемъ въ Деяніяхъ о Симоне волхве, иже былъ въ великий грех упал, хотелъ бо за сребро дары Святого Духа от Апостол купити, а предся Петрь, обличившы его о том, наостатокъ поведелъ ему: «Покайся о злобе

Пра веру – што яе неабходна мець тым, хто хрысьціцца, — Сам Хрыстос сказаў: «Той, хто будзе мець веру і ахрысьціцца, будзе збаўлены» (Мк. 16:16). Ды ня толькі сэрцам верыць, але і вуснамі вызнаць веру трэба, і толькі потым мае быць Хрост.

Добры гэтаму праклад ёсьць у Дзеях Апосталаў. Піша бо Лука, што дыякан Піліп на пытаньне эўнуха, ці можна яму ахрысьціцца, так адказаў: «Калі верыш усім сэрцам, дык можна» (Дзеі 8: 26-40). Ды, адказваючы, эўнух сказаў: «Веру, што Ісус Хрыстос – Сын Божы». Тут бачыш і пытаньне пра веру, і дастатковае яе вызнаньне. Таму няправільна цяпер некаторыя робяць, калі хрысьцяць юдэяў, туркаў, татараў ды іншых паганаў, перш іх не навучыўшы ды не дазнаўшыся пра іхняе жыцьцё.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці досыць толькі ў той час – гэта значыць, перад Хростам – мець веру, яе вызнаваць ды каяцца?

**АДКАЗ**

Ня досыць. Бо Хрост – гэта не часовае замірэньне, але вечны мір або запавет паміж Богам ды намі. З Хростам Бог прыймае нас як Сваіх дзяцей, а мы на ўсё жыцьцё бяром абавязак быць Яму ва ўсім паслухмянымі дзецьмі, бо менавіта гэта азначаюць словы, якія кажа хрысьціцель, пагружаючы чалавека ў ваду: «Хрысьціцца слуга Божы ў імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, амін» (Мц. 28:16-20). Прасьцей тыя словы тлумачацца так: «Прыймае Бог гэтага чалавека як сына і як Свайго слугу». А чалавек таксама абяцае мець Бога за свайго Айца ды Госпада.

Таму павінен такі чалавек ня толькі перад Хростам, але найболей пасьля Хросту жыць згодна з воляй Божай ды ўсё, што Хрост азначае, выконваць на справе. Пра гэта вышэй сказана. І добры ёсьць звычай у саборных цэрквах, калі хрысьціцель, хрысьцячы дарослых людзей, пытаецца ў іх і пра веру, і пра тое, ці выракаецца чалавек д'ябла ды справаў ягоных і ці пасьвячае сябе Хрысту.

**ПЫТАНЬНЕ**

А калі ахрышчаны потым саграшыць, што мае рабіць?

**АДКАЗ**

Трэба ня толькі не грашыць, але і рашуча супрацьстаяць граху, а найболей прасіць дапамогі ў Бога (Эф. 6:10-17). Бо калі Бог дасьць моцы, лягчэй будзе не грашыць. Але калі ўсё ж хтосьці саграшыць дзеля нядужасьці свайго цела, ня мае баяцца, што будзе пакінуты. Напісана бо, што ня хоча Бог сьмерці грэшніка, але няхай той пакаецца ды жыве (Эз. 18).

Ды чытаем у Дзеях пра Сымона-чараўніка, які моцна саграшыў, бо хацеў за срэбра купіць у Апосталаў дары Сьвятога Духа, аднак Пётр спачатку яго выкрыў, а потым сказаў яму: «Дык пакайся за гэтую сваю

сей, и помолися Богу, ашче ти отпустится оумышленіе сердца твоего» (Деан. 8: 17-22). Прото слушне Кафари или Новатиане за еретики давно осужени, они же естли кто принявши Святое Крешченіе съгрешилъ, николи покааніа его не пріимали. Симонъ бо окрешчонъ съгрешилъ, а предся ему Апостолъ на покааніе оуказуеть (Деан. 8:17-22).

И много ест о том в Писме Святымъ таковыхъ местъ, которие абы ся не продолжило, опушчаю. Нежли тое мовлю, иж яко оному кто до греха упалъ, ненадобе съмнитеся о милости Божіей, але скоро от него вставати, каатися и плакати. Тако онымъ, которіи стоять, не надобе в надею милосердіа Божіего грешити. Апостолъ бо рече, яко волею съгрешаюшчимъ намъ по приатію разума истинны к тому о гресех не обретается жертва, но страшно некое чаание суда (Евр. 10:19-31).

**ПЫТАНЬЕ**

Поведелъ есь, ижь крешчаемый повиненъ ест три речи мети: покааніе о своих гресехъ, веру въ Хріста и ее исповеданіе. Лечь нынешныхъ часовъ неразумные детьки у нас крестять. Како жь таковые без розума и памети веру, безъ языка или речи исповеданіе мети могут? Ешче на што имъ каанье, понеже ни добра, ни зла не оучинили? Видится, яко бы напрасно дети крестятся?

**ОТКАЗЪ**

Што есмъ о покаании, и о вере а о ее вызнаніи поведелъ, иже сія креститися хотяй виненъ мети. Не о всехъ крешчаемых сее маешь розумети, но о самых лет дорослыхъ. Яко естли бы жыдъ, або бесурмянинъ мелъ быти крешчонъ, про таковогo я мовлю, ижь нескоро крестити его потреба, але ажь веру Христову достаточне вырозумееть и значне исповедати зумееть, а к тому аже житьемъ своемъ побожнымъ, иж ся первого нечестиа каеть, окажеть.

Лечь людей Хрістянскихъ детки могуть без того креститися, хотя жь для молодости веры не розумеють, ани вызнавають, только бы напотом, пришедши к розуму, тые речи приняли и побожный живот жили, што Крешченіе знаменуеть, и ведали и чинили.

**ПЫТАНЬЕ**

Доложи ми того от Святого Писаніа. Бо не розумею, яко то быти может, ижь человекъ дорослый повиненъ мети веру и оную исповедати, естли ся крестити схочеть, а опять, детя безъ всего того креститися можеть?

**ОТКАЗЪ**

По тому выразумеешь. Напервей сее веси, ижь тайны Завета Старого ровную силу съ тайнами Нового Завета мели. Бо Апостолъ пишеть, ижь отци вси то же брашно духовное с нами ели, и то же питие духовное пили. (1 Кор. 9:19-10: 4). Бо акькольвекъ инъшие речи видомые онъ люд мелъ при тайнехъ, а мы – иншие, але тое жь их тайны, што и нашие, знаменовали.

нягоднасьць і малі Бога, можа, Ён даруе табе ліхі твой намер» (Дзеі 8: 22). Дзеля гэтага слушна Кафары, або Наватыяне, здаўна лічацца за герэтыкоў: яны бо, калі чалавек, прыняўшы Сьвяты Хрост, саграшыў, ніколі не прыймалі ягонага пакаяньня. Сымон бо ахрышчаны быў і саграшыў, аднак Апостал загадаў яму пакаяцца (Дзеі 8: 14-25).

Ды шмат ёсьць такіх прыкладаў у Сьвятым Пісьме, якія, каб не зацягнуць размову, прапускаю. Зноў жа скажу, што чалавеку, які саграшыць, ня трэба сумнявацца ў міласьці Божай, але трэба хутчэй з граху ўстаць, каяцца ды плакаць. Таксама і тым, хто стаіць, ня трэба, спадзеючыся на міласьць Божую, грашыць, Апостал бо сказаў: «Калі бо мы дабраахвотна грашым, маючы пазнаньне праўды, дык няма ўжо ахвяры за грэх, але толькі нейкае страшнае чаканьне суду» (Гебр. 10: 26-27).

**ПЫТАНЬНЕ**

Сказаў ты, што чалавек, які хрысьціцца, павінен мець тры рэчы: пакаяньне ў сваіх грахах, веру ў Хрыста ды яе вызнаньне. Аднак цяперашнім часам малых дзетак у нас хрысьцяць. Як жа яны, не прыйшоўшы да розуму ды памяці, могуць мець веру ды яе вызнаньне? Яшчэ: навошта ім каяцца, калі не зрабілі ані добрага, ані благога? Здаецца мне, надарэмна дзяцей хрысьцяць.

**АДКАЗ**

Што я сказаў пра пакаяньне, веру ды яе вызнаньне – мусіць усё гэта мець той, хто хоча хрысьціцца. Але не пра ўсіх, хто хрысьціцца, маеш ты так меркаваць, а толькі пра дарослых. Калі б часам юдэй або мусульманін меўся хрысьціцца, пра такога я кажу: не адразу трэба яго хрысьціць, але калі дастаткова зразумее веру ў Хрыста ды здолее яе вызнаць, а да таго і сваім пабожным жыцьцём пакажа, што ў ранейшых грахах каецца.

Аднак дзеці Хрысьціянаў могуць і бяз гэтага хрысьціцца, нават калі з-за малога ўзросту не разумеюць веры ані яе вызнаюць. Толькі б надалей, прыйшоўшы да розуму, тыя ўмовы прынялі, вялі пабожнае жыцьцё, ведалі, што азначае Хрост ды ўсё гэта выконвалі.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дакажы мне гэта са Сьвятога Пісьма. Бо не разумею, як гэта можа быць: дарослы чалавек, калі захоча хрысьціцца, павінен мець веру ды яе вызнаваць, а, зноў жа, дзіця бяз гэтага можа хрысьціцца?

**АДКАЗ**

Так гэта зразумееш: перадусім ты ведаеш, што таямніцы Старога Запавету мелі роўную сілу з таямніцамі Новага Запавету, бо Апостал піша, што «ўсе айцы спажывалі тую самую духовую страву і пілі тое самае духовае пітво» (1 Кар. 10: 3-4). І хаця тады народ меў адны бачныя знакі падчас таямніцаў, а мы маем іншыя, – але іхнія таямніцы азначалі тое самае, што і нашыя.

А поневажь такъ ест, ижь их тайны одны суть з нашими, прото яко к нашимъ тайнамъ, тако на онъ часъ къ их, кто хотелъ приступити, потреба было, абы мелъ веру. Того для и Авраамъ коли мелъ обрезаніе приняти, певная речь, ижь мелъ веру, яко Писмо сведчить. Бо естли бы веры не мелъ, не велелъ бы ся ему Богъ обрезати. Але ижь мелъ веру, того для принялъ, яко Апостолъ рече, знаменіе обрезанія, яко печать оное веры, которую и до обрезанія имелъ. Опять, коли тотъ же Абраамъ сына своего Ісаака обрезати далъ, тое жь ти было обрезаніе или тайна, которая Аврааму тая жь Ісааку, а предся Ісаакъ, не маючи веры, обрезанъ, а Абраамъ бы былъ не обрезанъ, естли бы веры в собе не мелъ.

Оуже видишь, ижь дорослии винни мети веру до принятья тайнъ, а дети могуть первей тайну приняти, нежели веру. Прото и тепер дети могут ся крестити, хотя жь бы веры не мели. А ведже не всякие дети, но только оных же родители суть от церкви. Неверныхъ пакъ дети не маютъ быть крешчоны. Сами бо верни маютъ оную обетницу, которую Богъ поведелъ Абраму: «Буду, – рече, – тобе Богъ, и племени, или семени, твоему по тобе» (Быт. 17).

**ПЫТАНЬЕ**

Доведи того естли дети грехъ маюоть?

**ОТКАЗЪ**

Правда, ижь дети своихъ греховъ не маютъ, але природный грехъ маютъ. А о том ест много в Светомъ Писме. Напервей в Псалме Давыдъ тако о собе сведчить: «Се въ безакони зачатъ есмъ, и въ гресехъ роди мя мати моя» (Псалом 50). Тым же обычаемъ Іов рече, яко пред Богомъ несть чисто и единого дня детя, Апостолъ бо рече: «Ашче корень, святъ, то и ветви» (Рим. 11: 13-24). Естли бы родители наши, се есть Адамъ и Евва, пребыли въ онымъ образе Божіемъ, на который създани были, то бы и дети их родилися по тому жь образу, але ижь оного образа за грехъ свой лишени, того для и дети их не могуть разве грешными родитися.

Яко и Моисей о Сифе пишеть, яко «и Адамъ сплодилъ по образу своему и по подобию» (Быт. 5). Чому не пишеть «по образу Божіему», только иже вже былъ Адамъ утратилъ образъ Божій, се ест справедливость, чистость и бесмертность? А ижь самъ праведливости не мелъ, како потомкы его мети могуть? Прото съ Апостоломъ замкнемъ: «Вси съгрешиша и лишаются славы Божіа». Если вси, ино и дети.

**ПЫТАНЬЕ**

Яко о оныхъ детехъ розумети маемъ, которые безъ Крешченія умерають?

**ОТКАЗЪ**

По тому жь, яко о оныхъ Ізраильских детехъ, которие предъ осмымъ днемъ безъ обрезанья умерали.

А калі ёсьць так, што іхнія таямніцы аднолькавыя з нашымі, то было патрэбна, каб чалавек меў веру, прыступаючы ці да нашых таямніцаў ці на той час да іхніх. Дзеля гэтага і Абрагам, калі меўся прыняць абрэзаньне, пэўная справа, меў веру, як Пісьмо сьведчыць. Бо калі б ён ня меў веры, не загадаў бы тады яму Бог абрэзацца. Але раз Абрагам меў веру, таму і прыняў, як кажа Апостал, знак абрэзаньня як пячатку той веры, якую меў і перад абрэзаньнем. Зноў жа, калі Абрагам даў абрэзаць свайго сына Ізака, тое было абрэзаньне, або таямніца, як Абрагаму, так і Ізаку, хаця Ізак ня меў веры і быў абрэзаны, а Абрагам ня быў бы абрэзаны, калі б ня меў у сабе веры.

Ужо бачыш, што дарослыя павінны мець веру да прыняцьця таямніцы, а дзеці могуць перш таямніцу прыняць, а потым паверыць. Таму і цяпер дзеці могуць хрысьціцца, хаця і ня маюць веры. Але ж ня ўсе дзеці, але толькі тыя, чые бацькі ў царкве; дзеці ж няверуючых ня могуць быць ахрышчаныя. Самі бо веруючыя маюць тое абяцаньне, якое Бог даў Абрагаму: «Буду, – сказаў, – табе Богам і патомству, або семені твайму пасьля цябе» (Роду 17).

**ПЫТАНЬНЕ**

Растлумач, ці маюць дзеці грэх?

**АДКАЗ**

Праўда, што дзеці ня маюць сваіх грахоў, але маюць грэх першародны. Пра гэта шмат сказана ў Сьвятым Пісьме, найперш у псальме Давід так пра сябе сьведчыць: «Вось жа я ў граху нарадзіўся і ў беззаконьні пачала мяне маці мая» (Пс. 50). Тым жа звычаем Гіёб казаў, што перад Богам грэшнае нават немаўля, Апостал бо сьведчыць: «Калі корань сьвяты, то і галіны» (Рым. 11: 16). Калі б бацькі нашыя – значыць, Адам ды Эва – захавалі той вобраз Божы, на які былі створаны, то і дзеці іхнія нарадзіліся б на той самы вобраз. Але раз яны таго вобразу праз свой грэх пазбаўлены, дзеля гэтага і дзеці іхнія могуць адно толькі грэшнымі нараджацца.

Ды і Майсей пра Сэта піша, што Адам нарадзіў яго на вобраз свой ды падабенства (Роду 5). Не напісаў ён: «На вобраз Божы», бо ўжо страціў Адам вобраз Божы, гэта значыць, справядлівасьць, чыстасьць ды несьмяротнасьць. Калі ж Адам сам ня быў справядлівым, то як жа ягоныя нашчадкі могуць быць справядлівымі? Таму разам з Апосталам так скончым: «Усе саграшылі ды пазбаўленыя славы Божай». Калі ўсе, то і дзеці.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як маем меркаваць пра тых дзяцей, якія бяз Хросту паміраюць?

**АДКАЗ**

Гэтаксама, як пра тых ізраэльскіх дзяцей, якія перад восьмым днём без абрэзаньня памiралі.

**ПЫТАНЬЕ**

Але Господь поведелъ: «Ашче кто не родится водою и Духомъ, не можеть внити в Царствіе Божіе» (Іоан 3:1-12).

**ОТКАЗЪ**

Ижь зде не о видимой воде розумееть Хрістос, можешь з оныхъ словъ, которие тамо при тыхъ же словехъ поведаеть, догадатися. Тако бо рече: «Роженое от плоти, плоть ест, а роженое от Духа, Духъ естъ» (Іоан 3: 1-12). Естли бы въ оныхъ першихъ словех вода воду видимую значила, ино бы ся и зверховная справа въ тыхъ словехъ Хрістовыхъ замыкала. Лечь погледевши на всю речь Хрістову, снадно обачишь, иже Господь о духовномъ рожденіи и о духовныхъ речахъ розмавляет. Но ешче и от верхныхъ речи къ духовным отводить.

Прото где рече: «Ашче кто не родится водою»,– розумей не сію воду видимую, которая человека знову родити не можеть, але розумей Духа Святого. Той бо часто нарицается от Пророкъ и от Самого Хріста водою. Бо яко вода и обмываеть нечистыя, гасить огонь, и холодить упаленья, тако Духъ Святый омываеть грехы, гасить похоти и съвесть в сомненіи холодить.

А тые суть великие пожитки Святого Крешченія. А ижь такъ ест, розумей, ижь водою Хрістос Духа Святого зоветь, зъ оного места обачиш, где Іоаннъ пишеть тако: «Стояшче Ісус и зваше глаголя: "Ашче кто жаждеть, да пріидеть къ Мне и пиеть. Веруяй в Мя яко же рече Писаніе, рекы от чрева его истекуть воды жывы". Се же рече о Дусе» (Іоан 7: 37-8: 2). От ясный довод маешь, ижь водою Хрістос Духъ Святъ зоветь, яко и тамо рече: «Ашче кто не родится водою и Духомъ»,– первей воду поменилъ, потом Духа, якобы толъкуючи, што се за вода доложилъ.

## О ВЕЧЕРИ ГОСПОДНЕЙ

**ПЫТАНЬЕ**

Што ест Вечера Господня?

**ОТКАЗЪ**

Естъ тайна Тела и Крови Господа нашого Ісуса Хріста.

**ПЫТАНЬЕ**

Кто сію тайну и для чого уставилъ?

**ОТКАЗЪ**.

Оуже есмъ пред том поведелъ, ижь тайнъ нельзя никому иному уставляти, окроме Бога или Сына Его. Бо естъли бы кто иный уставилъ, не была бы тайна, але суета и мерзость, по оному слову: «Всуе чтуть Мя учашче оученіа заповеди человеческы» (Матф.14: 35-15: 11). Прото и сія тайна того для ест тайна, иж ее Самъ Богъ уставилъ. Причи-

**ПЫТАНЬНЕ**

Але Госпад сказаў: «Хто не народзіцца з вады ды з Духа, ня можа ўвайсьці ў Валадарства Божае» (Ян 3: 5).

**АДКАЗ**

Што Хрыстос тут кажа не пра бачную ваду, ты можаш здагадацца са словаў, якія там жа Ён далучае, так гаворачы: «Тое, што нарадзілася зь цела, ёсьць целам, а што нарадзілася з Духа, ёсьць дух» (Ян 3: 6). Калі б у тых папярэдніх словах вада азначала ваду бачную – гэта б значыла, што Хрыстос меў на ўвазе цялесную справу. Але, паглядзеўшы на ўсю прамову Хрыста, лёгка здагадаешся, што Госпад гаворыць пра духоўнае нараджэньне ды пра духоўныя справы, пераходзячы ад рэчаў бачных да рэчаў духоўных.

Таму, калі Ён кажа: «Хто не народзіцца з вады»,– мяркуй не пра ваду бачную, якая ня можа нарадзіць чалавека нанова, але мяркуй пра Духа Сьвятога. Часта бо Пракрокі ды і Сам Хрыстос называюць Духа Сьвятога вадою. Бо як вада змывае бруд, тушыць агонь і халодзіць апёкі, гэтаксама Дух Сьвяты змывае грахі, тушыць пажаданьні ды сумленьне ў сумненьнях халодзіць.

Вось гэта і ёсьць вялікія дабраславенствы Сьвятога Хросту. А што так сапраўды ёсьць, значыць, што Хрыстос называе Сьвятога Духа вадою, убачыш у тым мейсцы дзе Ян так піша: «Стаў Ісус і казаў у голас: "Калі хто смагне, хай прыходзіць да Мяне і п'е. Хто верыць у Мяне, як кажа Пісаньне, у таго рэкі жывой вады пацякуць зь яго нутра". А так казаў пра Духа» (Ян 7: 37-39). Цяпер ты маеш ясны доказ, што вадою Хрыстос называе Духа Сьвятога, гэтаксама як і калі Ён сказаў: «Хто не народзіцца з вады і з Духа»,– спачатку ўзгадаўшы ваду, а потым – Духа, нібы тлумачачы, што гэта за вада.

## ПРА ВЯЧЭРУ ГОСПАДАВУ

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ёсьць Вячэра Госпадава?

**АДКАЗ**

Гэта таямніца Цела і Крыві Госпада нашага Ісуса Хрыста.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хто і дзеля чаго пастанавіў гэтую таямніцу?

**АДКАЗ**

Ужо казаў я раней, што ніхто, акрамя Бога ці Ягонага Сына, ня можа пастанаўляць таямніцы. Бо калі б пастанавіў нехта іншы, была б гэта не таямніца, але марнасьць ды мярзота, паводле слова: «Дарэмна пашану аддаюць, калі вясьцяць навукі і пастановы людзкія» (Мц. 15: 9). Таму гэтая таямніца ёсьць таямніцай, што яе Сам Бог пастанавіў з

на пакъ того была недостатокъ нашь. Зведомъ Богъ нашь, яко скоро добродеаніей Божіихъ забываемъ, и невдячни их бываемъ, для того яко бы забегаючи тому, уставилъ тайну сію и повелелъ оную на на въспоминанье Своея смерти чинити. То ест видимые речи хлебъ и вино ести и пити, Богу Отцу и Самому Господу за таковое добродейство дяковати, абы тымъ обычаемъ не только уши, але и очи и иные чувства мели, што бы им смерть Господню оповедало и яко бы отновяло. Сія есть преднейшая вина, для которое Господь сію тайну уставилъ. Другая пака бы есмо на оное единое сушчество, которое с Хрістомъ маемъ, памятали. Ижь есмо плоть от плоти и кость от костей Его (Ефес. 5: 25-32). Третяя вина, абы тымъ обычаемъ любовъ межи насъ росла. О чимъ нижей ешче услышимъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Чому сію тайну хлебомъ и виномъ Господь справовати велелъ?

**ОТКАЗЪ**

Того для, ижь яко хлебъ оукрепляеть тело человеку, а вино веселить сердце, тако тело Хрістово и кров Его укрепляють и оувеселяють душу веруюшчего, и оным ся причашчаюшчому.

**ПЫТАНЬЕ**

Како тое причашченіе розумеешь? Чи емо тело Хрістово, или Кровъ Его пиемо?

**ОТКАЗЪ**

Есть такъ. Бо поневажь на том зависло наше спасеніе, абы оно послушество, которое Хрістос Богу учинилъ, за нашое властивое было намъ почитано, яко бы есмо е мы сами оучинили. Прото потреба абы есмо едино съ Хрістомъ тело и едина кровъ были. Бо естли бы не такъ, се есть, естли бы есьмо въ собе Хріста не мели, а в Него ся не преизменили, не была бы Его справедливость нашою справедливостію. А где бы такъ было, конечне бы есмо въ гневе Божіемъ загинути мусели. По слову Самого Хріста: «Аминь, аминь глаголю вам, ашче не снесте плоти Сына Человеческаго и не спиете крови Его, живота не имате в себе» (Іоан 6: 49-55).

**ПЫТАНЬЕ**

Таково съвъкупленіе с теломъ Хрістовымъ, чи не на вере залежить?

**ОТКАЗЪ**

Такъ есть, ижь верою пріимаемъ Хріста и обшчение с Нимъ маемъ. Но не только того потреба верити, ижь Хрістос умеръ за грехы наши, и въсъкресъ оправданіа нашого для (Рим. 4: 13-25). Але тежь потреба, абы есмо чули, ижь въ нас живеть и пребываеть, а ешче надобе, абыхмо с Нимъ съвъкуплени яко оуды или чланки всего тела съ своею головою. Тымъ бо обычаемъ вси выслуги Господа нашого бывають нашие.

прычыны нашай недасканаласьці. Вядома нашаму Богу, як хутка мы забываемся на дабраславенствы Божыя, як бываем за іх няўдзячнымі. Каб гэтага пазьбегнуць, пастанавіў Ён такую таямніцу ды загадаў яе чыніць на ўспамін пра Ягоную сьмерць. Значыць, бачныя хлеб і віно есьці і піць, Богу Айцу ды Самому Госпаду за такія дабраславенствы дзякаваць, каб тым звычаем ня толькі вушы, але і вочы ды іншыя пачуцьці дасьвядчалі сьмерць Госпада ды перажывалі яе нанова. Гэта – першая прычына, дзеля якой Госпад пастанавіў такую таямніцу. Другая прычына – каб памяталі, што мы з Хрыстом – адно цела, цела ад цела ды косьць ад касьцей Яго (Эф. 5: 30). Трэцяя прычына – каб такім чынам любоў паміж намі ўзрастала. Пра гэта яшчэ далей пагаворым.

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму гэтую таямніцу Госпад загадаў абвяшчаць праз хлеб і віно?

**АДКАЗ**

Дзеля таго, што як хлеб узмацняе цела чалавека, а віно пацяшае сэрца, так Цела Хрыста і Кроў Яго ўзмацняюць ды пацяшаюць душу веруючага, які прычашчаецца.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як ты разумееш гэтае прычашчэньне? Хіба мы ядзім Цела Хрыста ці хіба Ягоную Кроў п'ём?

**АДКАЗ**

Так ёсьць. Бо нашае збаўленьне залежала на тым, што паслухмянасьць Хрыста перад Богам была прызнаная нам за нашую асабістую паслухмянасьць, як быццам бы мы самі тое зрабілі. Дзеля гэтага неабходна, каб мы з Хрыстом былі адно цела і адна кроў. Бо калі ня так – значыць, калі мы ня маем у сабе Хрыста ды ў Яго не перамяняемся, — ня будзе Ягоная справядлівасьць нашай справядлівасьцю. Тады мы пэўна мусім згінуць у гневе Божым, паводле слова Самога Хрыста: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: калі вы ня будзеце есьці цела Сына Чалавечага ды ня будзеце піць крыві Ягонай, ня будзеце мець жыцьця ў сабе» (Ян 6: 53).

**ПЫТАНЬНЕ**

Такая лучнасьць зь Целам Хрыста ці не ад веры залежыць?

**АДКАЗ**

Так ёсьць, што верай прыймаем Хрыста ды маем зь Ім лучнасьць. Але трэба ня толькі верыць, што Хрыстос памёр за нашыя грахі ды ўваскрос дзеля нашага апраўданьня (Рым. 4: 25), але таксама патрэбна, каб мы адчувалі, што Ён унутры нас жыве ды трывае, ды яшчэ патрэбна, каб мы мелі зь Ім еднасьць, як члены аднаго цела з галавою. Гэтым вось звычаем усе заслугі нашага Госпада становяцца і нашымі заслугамі.

**ПЫТАНЬЕ**

Чи оуживаньемъ Вечери Господней таковое обшчованіе съ Хрістомъ маемъ?

**ОТКАЗЪ**

Не только оуживаньемъ Вечери, але Святым Евангеліемъ, коли Ему веруемъ, приходимъ къ таковому съединенію съ Хрістомъ. А ведже и видимая справа много веруюшчому помагаеть.

**ПЫТАНЬЕ**

Которымъ обычаемъ маеть быти Вечеря Господня справована?

**ОТКАЗЪ**

Не маеть быти иншимъ обычаемъ справована, разве яко ее Хрістос Сам справилъ и справовати велелъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Хрістос пакъ которимъ обычаемъ справовалъ?

**ОТКАЗЪ**

Ознаимили намъ сее святіи Евангелисты и апостолъ Павелъ, где о Вечери Господней тако пишють, яко «Господь Ісус в ношчь в ню же предан быс, принял хлебъ, и благодаривъ преломи и рече: "Пріимите и ядите, се ест тело Мое, Еже за вы ломимое. Се творите въ Мое въспоминаніе". Тако же и чашю по вечери, глаголя: "Сіа чаша Новы Завет ест о Моей крови, Яже за вы проливается въ оставленіе греховъ" (Матф. 26, Марк 14, Лука 22, 1 Кор. 11). По тому Господь Вечерю Свою, или Тайну Тела и Крови Своея, и Самъ справовалъ, и Своимъ справовати велелъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што потреба в том выписанью обачити?

**ОТКАЗЪ**

Много речей сее короткое выписанье в собе замыкаеть, але две суть преднейшие. Напервей убо обачити потреба што и яко Хрістос чинилъ, потомъ для чого тое чинилъ. Иле ся того дотычеть, што бы то было, оуже ведаемъ, ижь Вечера Господня. К тому и тое ведаемъ, ижь для того чинилъ, абы есмо мели тайну или видимую речь, которая бы нам смерть или въскресеніе Хрістово на память приводила. Але о томъ оуже было, прото оное только надобе розсмотрети, што ест сее, што Господь чинилъ. Если тое гараздъ розгледемъ, латве ложные наоукы и всякие мерзости, которих теперь ест много при уживаніи Вечери Господней, познати възможемъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Што се ты за ложные наоуки и мерзости кажешь при Вечери Господней?

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба мы маем такую еднасьць з Хрыстом праз спажываньне Вячэры Госпадавай?

**АДКАЗ**

Ня толькі праз спажываньне Вячэры, але і празь Сьвятое Эвангельле, калі яму верым, прыходзім да такой еднасьці з Хрыстом. Але ж і рэчы бачныя вельмі дапамагаюць веруючаму.

**ПЫТАНЬНЕ**

Якім звычаем мае адбывацца Вячэра Госпадава?

**АДКАЗ**

Ня можа адбыцца інакш, чым Сам Хрыстос яе ўчыніў ды нам чыніць загадаў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хрыстос жа якім чынам яе справіў?

**АДКАЗ**

Аб'явілі нам гэта сьвятыя Эвангелісты і Апостал Паўла, пра Вячэру Госпадаву так пішучы: «Госпад Ісус у тую ноч, калі меў быць выдадзены, узяў хлеб і, склаўшы падзяку, сказаў: “Гэта ёсьць Цела Маё, якое за вас даецца. Рабіце гэта ў Маю памяць!” Падобным чынам па вячэры Ён узяў келіх і сказаў: “Гэты келіх ёсьць Новым Запаветам у Крыві Маёй, якая за вас праліваецца дзеля адпушчэньня грахоў”» (Мц. 26, Мк. 14, Лк. 22, 1 Кар. 11). Такім звычаем Госпад Сваю Вячэру, або Таямніцу Цела і Крыві Сваёй, і Сам справіў, і Сваім загадаў спраўляць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што патрэбна нам разгледзець у гэтым аповядзе?

**АДКАЗ**

Шмат чаго зьмяшчае ў сабе гэты кароткі аповяд, але ёсьць тут дзьве найважнейшыя рэчы. Найперш бо трэба разгледзець, што і як Хрыстос учыніў, а потым – дзеля чаго. Калі разглядаць, што гэта было, то ўжо ведаем, што была гэта Вячэра Госпадава. Да таго ж ведаем, што Хрыстос учыніў яе дзеля таго, каб мы мелі таямніцу, або бачную рэч, якая б нам нагадвала сьмерць і ўваскрасеньне Хрыста. Але пра гэта ўжо гаварылі, таму толькі тое патрэбна разгледзець, што азначае ўчыненае Госпадам і як Ён гэта ўчыніў. Калі гэта добра разгледзім, лёгка здолеем пазнаць фальшывыя вучэньні ды ўсялякую мярзоту, якіх цяпер шмат пры ўжываньні Вячэры Госпадавай.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што гэта за фальшывыя вучэньні ды мярзота падчас Вячэры Госпадавай, пра якія ты кажаш?

**ОТКАЗЪ**

Чи не годится, прошю тебе, оное наоуки ложною наоукою назвати, естли кто иншимъ обычаемъ о которой речи наоучаеть розумети, нежели Самъ Господь розумети велелъ? Домнимамъ, ижь ми того каждый допоможеть. Тым же обычаемъ чи не великая мерзость естъ оная речь, которую кто вместо Бога или Сына Его маеть?

**ПЫТАНЬЕ**

Страшные речы кажешь быти при Вечери Господней. Але доведи того, естли такъ естъ?

**ОТКАЗЪ**

Долго бы было вси мерзости вычитати и Словомъ Божіемъ обличати, и потреба бы на тое опричное розмовы. А ведже на коротце сее явно учиню, ижь сего веку и вже от кольки сотъ летъ неправо о Вечери Господней Хрістяне розумеють, и не к тому е и уживають, к чому Хрістос уставилъ и древлейшая церковъ вживала.

**ПЫТАНЬЕ**

Како тепер о Вечери мудртвують или розумеють, а како первая церков и розумела?

**ОТКАЗЪ**

Першая церковъ за тайну, по тому жь яко и Святое Крешченіе, Вечерю Господню мела, ныне же ачкольвекъ ее тайною зовуть, але надто за жертву оную розумеють и, рекучи то, приносять, и на тое попы, діаконы, падіаконы и инших постригають.

**ПЫТАНЬЕ**

Да ведь ешче и сперва за Апостолъ были попы или свешченницы и діакони?

**ОТКАЗЪ**

Естли ся попъ за тое жь розумееть, яко свешченникъ или жрецъ, могу смеле поведети, ижь о том нигде же в Новомъ Завете не найдешь. Подъ Законом бо былы жертвы, которие Богъ былъ чинити велел на знак жерътвы, которую Хрістос мелъ принести на очишченіе всего света греховъ. По тому жь и до Закона было. И для таковыхъ жертвъ были жерци, Іерее, или свешченници и под Закономъ и до Закона. Лечь скоро Хрістос, единый по чину Мелхиседекову свешченник пришолъ, оуже всемъ жертвамъ видимымъ конецъ учинилъ, такъ ижь черезъ тое не ест потреба ни жерцовъ, ни жертвъ (Евр. 5).

**ПЫТАНЬЕ**

Поведаешь, абы в Новым Завете или под Евангелиемъ поповъ непотреба, ани их было, кажешь, за Апостолъ. Лечь писмо Апостольское на многых местехъ попы припоминаеть. Яко где Павелъ къ Титу пишеть: «Сего ради оставих тя въ Крите, да недоконачаннаа исправиши, и устроиши по всех градехъ попы» (Тит 1:1-14).

**АДКАЗ**

Хіба ня варта, запытаюся ў цябе, назваць фальшывымі тыя вучэньні, калі хтосьці пра разуменьне некай справы вучыць ня так, як загадаў Госпад, але ў іншы спосаб? Мяркую, кожны наконт гэтага са мною пагодзіцца. Тым жа звычаем хіба не вялікая мярзота тая справа, якую хтосьці мае замест Бога або Сына Ягонага?

**ПЫТАНЬНЕ**

Страшныя справы, ты кажаш, адбываюцца падчас Вячэры Госпадавай. Але давядзі мне, хіба гэта так?

**АДКАЗ**

Доўга трэба было б тую мярзоту пералічваць ды выкрываць Словам Божым, і патрэбна на гэта асобная размова. Але ўсё ж коратка пакажу, што і зараз, і ўжо колькі соцень год дагэтуль Хрысьціяне няправільна разумеюць Вячэру Госпадаву ды не дзеля таго яе ўжываюць, дзеля чаго яе Хрыстос пастанавіў ды першая царква ўжывала.

**ПЫТАНЬНЕ**

Як цяпер пра Вячэру разважаюць, або як яе разумеюць, ды як першая царква яе разумела?

**АДКАЗ**

Гэтаксама як і Сьвяты Хрост, першая царква лічыла Вячэру Госпадаву за таямніцу. Зараз жа, хаця Вячэру Госпадаву і называюць таямніцай, але лічаць яе за ахвяру, і, кажучы так, яе складаюць ды дзеля гэтага пастрыгаюць у папы, дыяканы, падзячыя.

**ПЫТАНЬНЕ**

Дык жа ад пачатку, у часы Апосталаў, былі папы, або сьвятары, і дыяканы?

**АДКАЗ**

Калі меркаваць, што поп – тое самае, што і сьвятар, то сьмела магу сказаць: нідзе ў Новым Запавеце нічога пра іх ня знойдзеш. Бо пад Законам былі ахвяры, якія Бог загадаў прыносіць на знак той ахвяры, што Хрыстос меўся прынесьці, каб увесь сьвет ачысьціць ад грахоў. Гэтаксама і да Закону было. І каб прыносіць такія ахвяры, — і падчас Закону, і да Закону, — былі ярэі, або сьвятары. Але як толькі прыйшоў Хрыстос – Адзіны сьвятар на ўзор Мэльхісэдэха – адразу палажыў канец усім бачным ахвярам, так што няма ўжо патрэбы ані ў сьвятарах, ані ў ахвярах (Гебр. 5).

**ПЫТАНЬНЕ**

Распавядаеш, што ў Новым Запавеце, або пад Эвангельлем, папы не патрэбныя ды што ў часы Апосталаў іх не было. Аднак у Апостальскіх лістах шмат узгадваецца пра папоў, як, прыкладам, Паўла да Ціта піша: «Дзеля таго пакінуў я цябе на Крыце, каб ты ўсе неўпарадкаваныя справы наладзіў і каб паставіў у гарадах папоў» (Ціт 1: 5).

**ОТКАЗЪ**

Знаю тое, ижь на многыхъ местех припоминають Апостольскаа посланія и Лука въ Деаниях попы. Але не вместо свешченников или іереовъ. Се есть не в томъ разуме, яко теперь розумеють. Ныне бо попомъ жерца зовуть, се ест кто жертву приносит. Но Апостолъ таковых попов Титу устроити повелеваеть, они же бы жертву якую видимую приносили, але велить ему у каждом городе поставити оучителя или Епископа не для жертв приношеніа, але для наоученіа. Яко тамъ Апостолъ докладаеть где рече: «Подобаеть бо Епископу бес порока быти, яко Божію приставніку, пособствуюшчю по вернемъ словеси оученіа, да силенъ будеть и утешити в здравом оученіи, и противяшчихся обличити» (Тит 1:1-14).

Видишь на око, ижь што первей назвалъ попомъ, то потомъ Епископомъ. Прото тое жь естъ попъ, што Епископъ. Видишь теже урядъ Епископъский или поповский. Ни одным словомъ не припоминаеть Апостолъ, абы Епископъ мелъ литургію или службу събором служити, але только оурядъ его быти кажеть, абы пособствовати по верном словеси ученіа оумелъ и противляюшчихся обличати. Такови бо попы мають быти под Евангеліемъ Хрістовымъ.

Да ведже и тое потреба ведати, ижь где в нашихъ книгах преводникы «попы» преводять, Апостоли «презвитерми», се ест старцами или старейшины пишуть. Прото лепшей бы тые места водле грецьских книгъ исправити, наболей ижь теперь не старца или презвитера, але того, што сплешом обедню служить, попомъ зовуть. Тым же обычаемъ розумети маешь о діаконех. Ныне бо діаконми оных называють, которіи попом обедни служити пособляють, Еванъгелие читають, на оглашеных (их же от кольки сотъ летъ оуже нетъ) абы ис церкви выходили, въпиють, кадять, и иные таковые безлепицы чинять. Таковыхъ діаконовъ ани Апостоли, ани давешніи Хрістяне не знали, або по тому их знали, яко и их службу, которая ся в колько сотъ летъ по них зачала, а потом ся в тисеч летъ оуродила.

О діаконехъ естъ известно у Луки выписано, за якую нужю или потребу были избрани и яковъ ест их оурядъ. Тако бо пишеть Божественный Лука: «Въ днех же сих оумножившимся оученикомъ, быс роптаніе еллиномъ къ евреомъ, яко презрени бываху въ служеніи повседеннемъ вдовица их. Призвавше же Дванадесять множество оученикъ реша: “Не оугодно ест намъ, оставльшимъ Слово Божіе, служити трапезамъ. Усмотрите убо, братіе, мужа от васъ свидетельствованы седмь, и полнь Духа Святога и премудрости, их же поставимъ над потребою сею, мы же в молитве и служеніи Слова пождем”» (Деан. 6:1-7).

От же маешь Святого Духа выписаніе на яко дело діакони избрани были: не рече, абы кадили, але абы трапезамъ или столомъ служили. То есть абы милостину съберали, а з оное вдовы старые и самыхъ Апостолъ выховывали. Таковъ былъ діаконъ Стефанъ, Фи-

**АДКАЗ**

Ведаю, што шмат у якіх мейсцах у Апостальскіх лістах узгадваюцца папы, ды Лука ўспамінае іх у Дзеях, але не замест сьвятароў або ярэяў. Гэта значыць, ня ў тым сэнсе, як цяпер разумеюць. Зараз бо папом завуць сьвятара, гэта значыць таго, хто складае ахвяру. Аднак Апостал загадвае Ціту паставіць не такіх папоў, якія складаюць бачную ахвяру, але загадвае яму паставіць у кожным горадзе вучыцеля, або епіскапа, каб вучыў, а не ахвяры складаў. Як потым там жа Апостал тлумачыць, кажучы: «Належыць бо, каб епіскап быў беззаганы як распарадзіцель Божы, які трымаецца праўдзівае навукі, вернай Слову, каб здатны быў ён схіляць да праўдзівай навукі нават тых, якія выступаюць супраць» (Ціт 1: 7-9).

Бачыш на ўласныя вочы: той, хто спачатку названы папом, потым названы епіскапам. Дзеля гэтага «поп» азначае тое самае, што і «епіскап». Бачыш таксама і абавязкі епіскапскія, або папоўскія. Ніводным словам Апостал ня ўзгадвае, што епіскап мае літургію, або службу, саборам служыць, але толькі кажа, што епіскапскі абавязак – схіляць да праўдзівай навукі, вернай Слову, ды тых, якія выступаюць супраць, выкрываць. Такімі мусяць быць сьвятары Эвангельля Хрыстовага.

Ды, зноў жа, патрэбна ведаць: дзе ў нашых кнігах перакладчыкі пішуць «папы», Апосталы пісалі «прэсьвітэры», гэта значыць, «старшыя, або старшыні». Таму было б лепей выправіць тыя мейсцы згодна з кнігамі, па-грэцку напісанымі, перадусім таму, што цяпер папом завуць не старшага або прэсьвітэра, але таго, хто абедню служыць.

Тым жа звычаем маеш меркаваць і пра дыяканаў. Цяпер бо дыяканамі тых называюць, што дапамагаюць папам служыць абедні, чытаюць Эвангельле, на аглашоных (іх ужо колькі соцень гадоў няма) крычаць, каб з царквы выходзілі, кадзяць ды падобнае глупства робяць. Такіх дыяканаў ня ведалі ані Апосталы, ані першыя Хрысьціяне, бо звалі іх дыяканамі паводле іхняй службы, што пачалася праз колькі соцень год пасьля Апосталаў, але потым перапынілася.

Вядома, як пра дыяканаў у Лукі напісана: дзеля якой патрэбы былі абраныя ды якімі былі іхнія абавязкі. Так бо піша багабойны Лука: «У тыя дні, калі лік вучняў узрастаў, пачалі Геленісты наракаць на Гебраяў, што ў штодзённым служэньні іхнія ўдовы былі крыўджаны. Тады Дванаццаць, склікаўшы грамаду вучняў, сказалі ім: “Не выпадае нам пакінуць Слова Божае і заняцца абслугай сталоў. Таму вось, браты, нагледзьце з-паміж сябе сем мужоў, маючых добрае сьведчаньне і поўных Духа і мудрасьці, якім мы даручым гэтую работу. А мы ўсьцяж будзем на малітве і паслузе Слова”» (Дзеі 6: 1-7).

Вось жа маеш сьведчаньне Сьвятога Духа, на якія справы былі абраныя дыяканы: не кадзіць, але займацца абслугай сталоў. Значыць, міласьціну зьбіраць, а зь яе забясьпечваць старых удоваў ды саміх Апосталаў. Такімі былі дыяканы Стэфан, Піліп ды іншыя. Ня

липпъ и прочіи. Не знали тіи ораровъ, кадилницъ, не умели ся тіи владыкомъ кланяти ани оныхъ басенъ непотребныхъ обычаемъ кугларскимъ чинити.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино тако ты розумеешь, же Хрістіане никаковое жерътвы не мають, ани поповъ или свешченниковъ?

**ОТКАЗЪ**

Хрістяне мають предся и жертвы, и свешченство, но не таковые, яко до Закона или под Закономъ, се естъ не телесные, ни видомые жертвы, але духовные. По тому ж и свешченници суть у Хрістіанъ, но не яко первей от одного колена Левиова. Едино каждый бо Христіанинъ маеть быти свешченник. Тако бо Петрь Апостолъ пишеть: «Понеже вкусисте, яко благъ Господь, к Нему же приходяшче камені живу, от человекъ убо не ключеванъ, от Бога же изъбранъ и чтенъ, и сами, яко каменіе живо, зиждетеся въ храм духовенъ строительство свято, възнести жертвы духовны благоприатны Богови Ісус Хрістомъ» (1 Петра 2: 3-5).

А мало далей пишеть: «Вы же (розумей о всехъ) – родъ избранъ, царско свешченіе, языкъ святъ» (1 Петра 2: 9). От явно пишеть, яко слышишь, ижь и вси есмо светители и вини смы Богу духовные жертвы приносити. Которие бы пак жертвы духовны были, выписует другый Апостолъ, где рече: «Не имамы зде пребываюшчаго града, но грядушчаго взыскаемъ. Его же ради възносимъ жертвы благодареніа выну (всегда) Богови, сиречь плод оустенъ исповедаюшчеся имени Его» (Евр. 13: 7-16).

На иномъ теже месте тако той же Апостолъ о жертвахъ хрістианских пишеть: «Молю вас, братіа шчедротами Божіими, представыти телеса вашя жерътву живу, святу, благородну Богови словесное служеніе ваше. И не съобразуюшчетеся веку сему, но преобразуйтеся обновленіем оума вашего, исушати вамъ что ест воля Божіа блага и угодна и съвершена» (Рим. 12:1-3). Ешче на иномъ месте той же къ Филипписиомъ пишеть: «Исполнихся приемъ от Епафродита, яже от васъ воню благооуханіа жертву приатну оугодну Богу» (Филип. 4: 10-23).

От сихъ словъ святыхъ Апостолъ выразумети можешь, якие жерътвы мають Хрістиане. Тыхъ бо жертвы суть молитвы, исповеданіе, тела оумершчвеніе, милостины оучителемъ и нишчим складаніе, смиреніе и на серци умиленье, каянье, а наостаток коли кто для Слова Божіа муку или смерть пріиметь, за жертву Богъ поличаеть. Того для и Апостол к Тімофею пишучи, смерть свою жерътвою зоветь. Тако бо рече: «Трезвися о всем злопостражи, делосътво и Евангелиста, служеніе свое извести. Азъ бо жренъ бываю, и время моего отшествіа наста» (2 Тім 4: 5-8). Таковые прото жерътвы мають Хрістяне, а черезъ тые иныхъ не знають.

А такъ и Вечера Господня не ест жерътва, але тайна. Далеко бо

ведалі яны, што такое арары, кадзільніцы; ня ўмелі яны ўладыкам кланяцца ды іншых непатрэбных глупстваў не рабілі крывадушным звычаем.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба ты мяркуеш, што Хрысьціяне ані ахвяраў ніякіх ня маюць, ані папоў або сьвятароў?

**АДКАЗ**

Хаця Хрысьціяне маюць і ахвяры, і сьвятарства, але не такія, як да Закона або пад Законам, – значыць, не цялесныя, бачныя ахвяры, але духоўныя. Дзеля гэтага ў Хрысьціянаў ёсьць сьвятары, але яны не паходзяць, як раней, з аднаго калена Левія. Кожны Хрысьціянін мае быць сьвятаром, так бо Апостал Пётр піша: «Бо вы пакаштавалі, як салодкі Госпад. Прыступаючы да Яго, жывога каменя, адкінутага людзьмі, але выбранага Богам і каштоўнага, і вы самі, як жывыя камяні, будуйцеся ў дом духовы, у сьвятарства сьвятое, каб складаць духовыя ахвяры, мілыя Богу празь Ісуса Хрыста» (1 Пт. 2: 3-5).

А крыху далей ён піша: «Але вы (мяркуй – «усе») – выбранае племя, валадарскае сьвятарства, сьвяты народ» (1 Пт. 2: 9). Вось, як бачыш, ясна напісана, што ўсе мы – сьвятарства і павінны прыносіць Богу духоўныя ахвяры. Што гэта за духоўныя ахвяры, распавёў іншы Апостал, калі сказаў: «Ня маем тут трывалага гораду, але шукаем будучага. Дык празь Яго заўсёды складайма ахвяру хвалы Богу, гэта значыць, плод вуснаў, праслаўляючых Ягонае імя» (Гебр. 13: 15).

У іншым мейсцы той жа Апостал так піша пра хрысьціянскія ахвяры: «Дык прашу вас, браты, празь міласэрнасьць Божую аддавайце целы вашыя ў ахвяру жывую, сьвятую, мілую Богу, на разумнае служэньне вашае. І не ўпадабняйцеся гэтаму сьвету, але перамяняйцеся праз аднаўленьне розуму, каб умелі пазнаць, што ёсьць воля Божая, што добрае і прыемнае Богу ды дасканалае» (Рым. 12: 1-2). Яшчэ ў іншым мейсцы ён жа да Філіпянаў так піша: «Атрымаўшы ад вас праз Эпафрадыта тое, што вы прыслалі, салодкі пах, ахвяру прыемную, мілую Богу» (Флп. 4: 18).

З гэтых словаў сьвятых Апосталаў можаш зразумець, якія ахвяры маюць Хрысьціяне. Іхнія бо ахвяры – малітвы, сьведчаньне, мярцьвеньне цела, міласьціна вучыцелям і жабракам, паслухмянасьць ды замілаванасьць сэрца, пакаяньне, а напрыканцы – калі хтосьці дзеля Слова Божага прыйме пакуту або сьмерць – як ахвяру Бог гэта лічыць. Дзеля гэтага і Апостал, да Цімахвея пішучы, сваю сьмерць называе ахвярай, так бо сказаў: «Ты ж пільнуйся ва ўсім, працуй, выконвай справу эвангеліста, службу тваю выконвай. Я вось гатовы стацца ахвярай, і час майго адыходу набліжаецца» (2 Цім. 4: 5-6). Такія вось ахвяры маюць Хрысьціяне ды, акрамя гэтых, іншых ня маюць.

А калі так, то і Вячэра Госпадава не ахвяра, але таямніца. Адна бо справа – таямніца, а зусім іншая – ахвяра. Ахвяра – гэта тое, што мы

иншая речь есть тайна, а иншая – жертва. Естъ бо жертва оное што мы Богу даемъ. Тайна пакъ естъ што намъ Богъ даеть. Але ижь Вечеру не мы даемъ Богу, но Богъ намъ даеть Тело и Кровъ Сына Своего, прото не ест жертва. Ачколвекъ святіи давешніи учители называють Вечерю Господню жерътвою, но не у тот обычай, яко теперешныи попы и мнихи. Они бо Вечерю Господню литургіею или службою и жертвою называють для молитовъ, умиленія и исповеданіа, которое при Вечери Господней бывають.

Лечь тымъ обычаемъ не власне ест Вечера Господня жертва. Тем же Іоаннъ Златоустъ тако въ посланіе къ Евреомъ пишеть: «Се, еже мы творимъ, въ вспоминаніе оубо оного бываеть, еже единою бысть, не иноу жертву, но тую дже выну творимъ, паче же въспоминаніе жертве съделаваемъ» (Беседа 16). А мало повышшей в той же беседе рече: «Едина естъ сіа жертва, не многыя. Кимъ образомъ едина ест, и немногыя? Яко единою принесеся, принесеся въ Святая Святымъ. Сіа же жертва взоръ есть оныя юже присно приношаемъ».

Видиш ли, яко и отци ачколвек жерътвою Вечерю Господню звали, але только для того, яко есмъ поведелъ, ижь при ней молитвы приносимъ, або яко зде Златоустый пишеть, для того, ижь ест взоръ или образъ оное жерътвы, которую Хрістос на кресте учинилъ. Але на што намъ Златооустого или коего сведество? Чому не Павла въ небеси оучоного о томъ послышимъ. Той бо рече: «Освяшчени есмо приношениемъ тела Ісус Хрістова единою. И всякъ убо первосвешченикъ стоить на всякъ день služа, и тыя же множицею приносить жертвы яже никогда же могуть отъяти грехи. Он же единою о гресехъ принесе жертву, и седя одесную Бога» (Евр. 10:1-18).

Паметай тое слово «единою». Тот же ешче рече: «Единымъ приношениемъ съверши вину освяшчаемыхъ». Прото Вечера Господня не естъ жертва, которую бы Богу мели попы или свешченникы приносити на оставленіе греховъ, але ест тайна, которую въспоминаниемъ жерътву Хрістову единою за насъ на кресте принесену.

Тое, яко есмъ поведелъ, и по Самого Хріста справе вырозумети можемъ, коли обачимъ, што, яко и для чого уставилъ. Явно бо, ижь тайну или въспоминанье муки и смерти Своей, а не жертву уставилъ. И Самъ бо не рече: «Пожрете Ми»,— но рече: «Се творите въ Мое въспоминанье». Где рече: «Се творите»,— повелеваеть сее жь, што Самъ чинилъ, а не иного што чинити. Што ижь Онъ чинилъ? Не видить ми ся, абы кто поведети деръзнулъ, яко Хрістос онъ хлебъ и вино въ жертву Богу приносилъ. Мусить бо каждый вызнати по Евангельскому Писанію, ижь Хрістос не жертвою Богу хлебъ и вино приносилъ, але ученикомъ ести и пити подалъ, абы так напотом смерть Его припоминали и с того Бога и Его благодарили.

На тотъ обычай и Апостолъ Вечерю Господню толкуеть, где рече Коринфіаномъ: «Елижди ашче ясте хлебъ сій и чашю сію пиете,

даём Богу. Таямніца – гэта тое, што нам дае Бог. А паколькі Вячэру ня мы даём Богу, але Бог дае нам Цела і Кроў Сына Свайго, таму гэта не ахвяра. Хаця ранейшыя сьвятыя вучыцелі і называлі Вячэру Госпадаву ахвяраю, але ня тым звычаем, як цяперашнія папы і манахі. Яны бо называюць Вячэру Госпадаву літургіяй (або службай) і ахвярай дзеля малітвы, замілаваньня сэрцаў ды вызнаньня веры, якія бываюць падчас Вячэры Госпадавай.

Аднак такім звычаем сама Вячэра Госпадава ня ёсьць ахвярай. Ян Залатавусны так у лісьце да Гебраяў піша: «Тое, што мы робім, адбываецца на ўспамін пра адзіную, ужо складзеную ахвяру. Ня новую, але тую ж самую ахвяру мы заўсёды складаем, ды, перадусім, напамін пра ахвяру чынім» (Гутарка 16). І крыху вышэй у той жа гутарцы ён сказаў: «Адна гэта ахвяра, а не ахвяры многія. Якім чынам яна адна і чаму гэта не ахвяры многія? Бо аднойчы была прынесена ў Сьвятое зь Сьвятых. Гэтая ахвяра сталася ўзорам ахвяры, якую мы сёньня складаем».

Ці бачыш, што айцы называлі Вячэру Госпадаву ахвярай толькі таму, як ужо я сказаў, што падчас яе мы ўзносім малітвы, або, як тут Залатавусны піша, дзеля таго, што яна – узор або вобраз той ахвяры, якую Хрыстос прынёс на крыжы. Але навошта нам сьведчаньне Залатавуснага ці яшчэ каго іншага? Чаму не паслухаць нам на гэты конт Паўлу, дасьведчанага ў справах духоўных? Ён бо сказаў: «На моцы той волі асьвечаны мы назаўсёды праз ахвяру цела Ісуса Хрыста. І кожны сьвятар штодзень служыць і часта ахвяроўвае тыя самыя ахвяры, якія ніяк ня могуць ачысьціць ад грахоў. Ён жа, склаўшы адну ахвяру за грахі, навек сядзіць праваруч Бога» (Гебр. 10: 10-12).

Памятай жа пра тое слова «адну». Той жа Апостал яшчэ казаў: «Вось, Ён адной ахвяраю ўдасканаліў на вякі тых, якія асьвечаны». Дзеля гэтага і Вячэра Госпадава – не ахвяра, якую папы або сьвятары маюць прыносіць Богу дзеля адпушчэньня грахоў, але гэта – таямніца, якая нагадвае нам пра адну ахвяру Хрыста, прынесеную за нас на крыжы.

Гэта, як ужо я казаў, і па ўчынках Самога Хрыста можам зразумець, калі разгледзім, што, як і дзеля чаго Ён пастанавіў. Відавочна бо, што Ён пастанавіў не ахвяру, але таямніцу, або ўспамін пра Свае пакуты і сьмерць. І Сам бо не казаў: «Ешце Мяне»,— але сказаў: «Гэта рабіце ў Маю памяць». Калі сказаў: «Гэта рабіце»,— загадваў рабіць тое ж самае, што Сам рабіў, а ня што іншае. Што ж Ён рабіў? Ня думаю, што нехта асьмеліцца сказаць, што Хрыстос тыя хлеб і віно прыносіў Богу ў ахвяру. Мусіць бо кожны вызнаць, паводле Эвангельскага Пісаньня, што Хрыстос не прыносіў хлеб і віно ў ахвяру Богу, але даў есьці і піць вучням, каб такім чынам потым узгадвалі Ягоную сьмерць ды Сьвятому Богу і Яму дзякавалі.

Тым жа звычаем і Апостал тлумачыць Вячэру Госпадаву, калі піша да Карынцянаў: «Бо колькі разоў будзеце есьці гэты хлеб і піць гэты келіх, будзеце абвяшчаць сьмерць Госпада, пакуль ня прыйдзе»

смерть Господню възвешчаете дондеже прідеть» (1 Кор. 11). Зри, яко не рече: «Елижды жрете»,— але: «Ясте и пиете». Прото Вечера Господня не ест жертва, але тайна Тела и Крови Господа нашого Ісус Хріста.

**ПЫТАНЬЕ**

Поведелъ есь, ижь поповъ непотреба, кто жь маеть тайну сію служити?

**ОТКАЗЪ**

Тот же, кто и Крешченіемъ. То есть кто служить Словом, тотъ и Вечерю роздавати маеть. Бо тыхъ двухъ речей – Слова и тайнъ – разлучити нельзя.

**ПЫТАНЬЕ**

Чи одинъ служитель за всехъ тайну служити или ясти и пити маеть?

**ОТКАЗЪ**

Яко другъ за друга Крешченіа не пріймаем, тако и Вечери Господней не годится одному за всехъ або за друга пріимати. Господь бо не одинъ поживалъ, але всемъ подалъ. И Апостолъ написалъ тако: «Братиа моя, сходяся ясти, другъ друга ждете» (1 Кор. 11: 31-12: 6).

**ПЫТАНЬЕ**

Поведаешь, ижь Вечера Господня по тому мает быти справована, яко Хрістос справовалъ. Чому жь и вы не въ всемъ справы Хрістовы заховуете? Хрістос бо вечоромъ сію тайну уставил и едшимъ ученникомъ роздавалъ, а вы рано до обеда причашчаетеся. Надто вы при Вечери псалъмы и песни поете, а Господь никакова пеніа при оной справе не уживалъ.

**ОТКАЗЪ**

При Вечери Господней не вси справы сут собе ровны. Бо не некоторихъ болшей, а на иныхъ меншей залежить. Безъ некоторих быти не можеть, а некоторие могут быти и не быти. Яко, на взоръ, хлеб, вино, исповеданье, благодаренье, смерти Господней вспоминанье, телу Хрістову и крови Его причашченіе сут таковые речы, которих при Вечери Господней опустити нельзя, ани без них Вечера тайна быти можеть.

Опять: песни, часъ, место, причашчаючихся число, постъ и таковая на воли суть и на свободе нашей, ани бо насъ на тое обовязуеть Слово Божіе або устава Хрістова. Бо не рече: «Тогды або о сей поре творите», или: «Зде творите», або: «Тако творите», але рече: «Се творите»,– то ест сію речь, которую Азъ творю, вы творите.

Досить прото, ижь самую речь творимъ, хотя жь не того часу, не под оною личбою, не на оном месте. Бо яко есмъ поведелъ, тые справы на свободе Хрістянской суть. Хрістос в ночи по вечери раздавалъ тайну, мы теперечи порану, ешче не едши, справуемъ не

(1 Кар. 11). Бачыш, не сказаў Апостал: «Колькі разоў будзеце ахвяраваць»,— але: «Колькі разоў будзеце есьці і піць». Дзеля гэтага Вячэра Госпадава не ахвяра, але таямніца Цела і Крыві Госпада нашага Ісуса Хрыста.

**ПЫТАНЬНЕ**

Сказаў ты, што папы не патрэбныя, дык хто ж мае служыць гэтую таямніцу?

**АДКАЗ**

Той жа, хто і хрысьціць – значыць, хто служыць Словам,— той і Вячэру мае раздаваць. Бо тых дзьвюх рэчаў – Слова і таямніцы – разьдзяліць нельга.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці мае адзін служыцель за ўсіх таямніцу складаць, або есьці ды піць?

**АДКАЗ**

Як адзін за другога мы не прыймаем Хросту, так і Вячэру Госпадаву не належыць прыймаць аднаму за ўсіх або аднаму за другога. Госпад бо не адзін яе спажываў, але ўсім даў, ды Апостал напісаў так: «Браты мае, калі зьбіраецеся есьці Вячэру, пачакайце адзін на другога» (1 Кар. 11: 33).

**ПЫТАНЬНЕ**

Кажаш, што Вячэра Госпадава тым жа звычаем мусіць складацца, як Хрыстос яе складаў. Чаму ж і вы не ва ўсім захоўваеце справы Хрыстовыя? Хрыстос бо ўвечары гэтую таямніцу пастанавіў ды вучням раздаваў, а вы зранку, перад абедам, прычашчаецеся. Да таго ж вы падчас Вячэры сьпяваеце псальмы ды песьні, а Госпад ніякіх сьпеваў пры той справе не пастанаўляў.

**АДКАЗ**

Падчас Вячэры Госпадавай ня ўсе справы аднолькава важныя, бо на адных залежыць болей, а на другіх – меней. Без адных Вячэра адбыцца ня можа, а другія могуць быць і могуць ня быць. Напрыклад, хлеб, віно, вызнаньне, падзяка, успамін пра сьмерць Госпада, прычашчэньне Цела Хрыста і Крыві Ягонай – гэта такія рэчы, што пры Вячэры Госпадавай абмінуць нельга, ды бязь іх Вячэра ня можа быць таямніцай.

Зноў: сьпевы, час, мейсца, колькасьць тых, што прычашчаюцца, пост ды іншае —залежаць на нашай волі і ў іх мы свабодныя, бо да гэтага нас не змушаюць ані Слова Божае, ані пастанова Хрыста. Ён бо не сказаў: «Тады», або: «У пэўны час рабіце», або: «Тут рабіце», або: «Так рабіце», але сказаў: «Гэта рабіце», – значыць, гэтую справу, якую Я раблю, і вы рабіце.

Дзеля гэтага досыць, што саму справу робім, хаця і ня ў той жа час, ня ў той жа колькасьці, не на тым жа мейсцы. Бо як ўжо я сказаў,

прото, абы неволъно вечорь справовати, але ижь заутріе къ всем справамъ пристойнейшое. А ведже Лука пишеть, ижь ученници съшлися въ едину от суботъ преломити хлебъ, и даеть знати, ижь то деалося в ночи, бо пишеть, ижь Павелъ продолжилъ слово даже до полуношчи (Деан. 20: 7-15).

Прото и теперь, естли бы якая нужа, можеть святаа Вечера быти в ночи. Псалмы, ижь за Апостолъ въ обычаю были, явно с писма святого Павла, пишеть бо: «Егда сходитеся, кождо васъ псалом имать» (1 Кор. 14: 26-40). А на ином месте рече: «Слово Хрістово да вселяеться в васъ богатно, въ всякой премудрости, учашче и наказаюшче, себе въ псалмех и пеніихъ, и въ песнехъ духовныхъ» (Кол. 3:12-16). Мимо сее Матфей, где о Вечери Господней пишеть, тако наостанце замыкаючи, рече: «И, въспевъше, изыдоша въ гороу Елеоньскоу» (Матф. 26: 6-56). Прото не чинимъ въ той мере противу уставу Христову.

**ПЫТАНЬЕ**

Мает ли быти давана Вечера Господня малымъ детемъ або ешче лет недорослым людемъ?

**ОТКАЗЪ**

Не потреба таковымъ давати. Бо сіа тайна потребуеть, абы ся онъ искусилъ, што кто ее участникомъ быти хотелъ, по Апостолскому слову: «Да искушает же человек сам себе, и тако от хлеба да ясть и от чаши да пиеть» (1 Кор. 11: 23-30). Але ижь ся дети искушати не могуть, прото не маеть имъ Вечера Господня давана быти.

**ПЫТАНЬЕ**

На чимъ таково искушеніе залежить?

**ОТКАЗЪ**

На попытанью самого себе. Бо кто к тому столу ити хочеть, маеть росъсмотрети, если же ест справедливый члонокъ Хрістовъ. То ест естли веру о Хрісте маеть, ижь Его заслугою спасенъ будеть, если ся греховъ каеть, любовъ къ ближному заховуеть, врагом своим отпушчаеть, гневу никакового не держить, обидяшчим его зла не хочеть, а свой недостатокъ знаеть. Таковый добре ся искушаеть и можеть з верою и съ страхом к той Вечери приступити и причастенъ быти.

Опять, естли ся кто грехов не каеть, або ся безъ нихъ быти разумееть, любви не творить, гневъ на кого держить, таковый за сесъ святый столъ садитися не маеть, ани Святыхъ Даровъ причастенъ быти можеть, абы не былъ повинен Тела и Крови Ісус Хріста. Тако бо Апостолъ рече: «Иже ясть хлеб сій и пиеть чашею Господню недостойне, повиненъ будеть Телу и Крови Господня» (1 Кор. 11: 23-30).

гэта залежыць на нашай хрысьціянскай свабодзе. Хрыстос уначы пасьля вячэры спраўляў таямніцу, мы цяпер – раніцай, яшчэ ня еўшы, спраўляем не таму, што ня можам увечары спраўляць, але таму, што раніца на ўсе справы больш прыдатная. Але Лука піша, што вучні зыйшліся ламаць хлеб у першы дзень па субоце (Дзеі 20:7-12), ды паведамляе, што гэта адбывалася ўначы, бо піша, што Паўла зацягнуў сваё слова аж да поўначы.

Таму, калі будзе такая патрэба, можа Сьвятая Вячэра адбывацца ўначы. А тое, што псальмы былі зазвычай і ў часы Апосталаў, ясна зь лісту сьвятога Паўлы, ён бо піша: «Калі зьбіраецеся разам, кожны з вас мае псальм» (1 Кар. 14: 26), а ў іншым мейсцы ён сказаў: «Хай шчодра прабывае ў вас Слова Божае, каб з усёю мудрасьцю адны адных навучалі і напаміналі ды каб у ласцы ў сэрцах вашых сьпявалі вы Богу псальмы, гімны і песьні духоўныя» (Кал. 3:16). Апроч гэтага Мацьвей, калі піша пра Вячэру Госпадаву, так пад канец кажа: «І, адгаварыўшы гімн, пайшлі на Аліўную гару» (Мц. 26: 30). Таму і не парушаем мы ў гэтым пастановы Хрыста.

**ПЫТАНЬНЕ**

Ці належыць даваць Вячэру Госпадаву малым дзецям або яшчэ не дарослым людзям?

**АДКАЗ**

Ня трэба такім Вячэру даваць. Бо гэтая таямніца патрабуе, каб той, хто хоча быць яе ўдзельнікам, сябе выспрабаваў, паводле Апостольскага слова: «Дык хай выспрабуе чалавек сябе самога, і тады хай есьць хлеб той ды п'е з келіха таго» (1 Кар. 11: 28). А паколькі дзеці ня могуць сябе выспрабоўваць, таму і не належыць ім даваць Вячэру Госпадаву.

**ПЫТАНЬНЕ**

На чым такое выспрабоўваньне залежыць?

**АДКАЗ**

На выспрабаваньні самога сябе. Бо той, хто хоча ісьці да гэтага стала, мусіць разгледзець, ці сапраўдны ён член цела Хрыстова. Значыць, ці мае ён веру ў Хрыста, што Ягонымі заслугамі будзе збаўлены; ці каецца ў грахах; ці захоўвае любоў да бліжняга; ці прабачае сваім ворагам; ці ня мае аніякага гневу; ці не жадае благога сваім крыўдзіцелям ды ці ведае пра сваю недасканаласьць. Такі чалавек добра сябе выспрабоўвае і можа зь вераю ды са страхам да тае Вячэры прыступіць ды прычасьціцца.

Зноў: калі чалавек ня каецца ў грахах або мяркуе, што грахоў ня мае; бліжняга ня любіць або гнеў на кагосьці трымае, — такі чалавек ня мае садзіцца за гэты сьвяты стол, ані Сьвятых Дароў прычашчацца, каб ня быць вінаватым Цела і Крыві Ісуса Хрыста. Бо, паводле Апостала: «Хто нягодна есьць хлеб ды п'е зь келіха, той вінаваты што да Цела і Крыві Госпадавай» (1 Кар. 11: 27).

**ПЫТАНЬЕ**

А если бы кто недостоинъ к тому столу пришолъ, чи маеть ему пастырь Святые Дари подати?

**ОТКАЗЪ**

Пастырь, естли одинъ только ведаеть до человека некое прегрешеніе, не маеть отлучати от святого причашченіа. Але естли кто явно съблазнъ учинилъ, не маеть припушчон к Святым Тайнамъ быти. Яко на взорь маемъ Іоуду предателя и Коринфіанина, который мачеху за жену былъ взялъ. Сего бо Павелъ отсечи велелъ, ижь явный грех былъ сътворилъ, Іоуду пакъ Господь терпелъ, яко Самъ единъ съвести его зведомъ былъ.

**ПЫТАНЬЕ**

Ино естли кто явне съгрешить, можеть то пастырь отлучити?

**ОТКАЗЪ**

Не одного пастыра ест урядъ отлучати, але всея церкви. Яко и Апостолъ не одинъ оного блудника отлучилъ, але тое всей церъкви Коринфянъ злетилъ. Рече бо: «Събравшимся вамъ и моему духу, силою Господа нашего Ісус Хріста предати таковогo Сатане».

**ПЫТАНЬЕ**

Которимъ се обычаемъ церков чинити маеть?

**ОТКАЗЪ**

Тымъ обычаемъ, яко Хрістос указалъ. То есть не скоро человекъ з недуга упадеть отлучити его от святое церкви, але первей упоминати. Тако бо о том Господь повелеваеть: «Ашче съгрешить к тебе братъ твой, иди обличи его межу собою и темъ единемъ. Ашче тебе послушаеть, приобрелъ есь брата твоего. Ашче ли тебе не послушаеть, пойми съ собою паки единаго или два, да при усты двою или трех сведетелей станеть всякъ глаголъ. Ашче же не послушаеть их, повежь церъкви. Ашче же и о церкви нерадити начнеть, буди ти якоже язычникъ и мытарь» (Матф. 18:10-22).

**ПЫТАНЬЕ**

Како ся сее слово розумееть: «Ашче съгрешить к тебе братъ твой»?

**ОТКАЗЪ**

Некоторіи тако разумеють, яко бы зде Хрістос о свою только обиду обличати брата велелъ, а не о чужую, ижь рече: «К тобе»,– але ся не тако розумееть. Бо на иномъ месте свою кривду велить отпушчати. И Апостолъ пишеть, яко «любовь не ишчеть своихъ» (1 Кор. 13). Прото сее слово «К ТОБЕ» розумей, яко бы реклъ: «С твоего ведомостию».

**ПЫТАНЬЕ**

Чому рече: «Брат твой», а не: «Всякъ человекъ»?

**ПЫТАНЬНЕ**

А калі хто недастойна да гэтага стала прыйшоў, ці мае яму пастар даць Сьвятыя Дары?

**АДКАЗ**

Калі адзін толькі пастар ведае нейкае прыграшэньне чалавека, ня мае адлучыць яго ад сьвятога прычашчэньня. Але калі хтосьці адкрыта грэх учыніў, ня можа быць дапушчаны да Сьвятых Таямніцаў. За ўзор маем здрадніка Юду ды Карынцяніна, які мачаху ўзяў за жонку. Яго бо Паўла загадаў адлучыць, бо ён яўны грэх зрабіў, Юду ж Госпад цярпеў, бо Ён адзін сумленьне ягонае ведаў.

**ПЫТАНЬНЕ**

Хіба толькі пастар можа адлучыць таго, хто яўна саграшыць?

**АДКАЗ**

Не адзін толькі пастар можа адлучаць, але і ўся царква, як і Апостал не адзін адлучыў таго распусьніка, але гэта даручыў усёй царкве Карынцкай, кажучы: «Сабраўшыся разам з вамі і з духам маім, магутнасьцю Госпада нашага Ісуса Хрыста, аддаць такога шатану».

**ПЫТАНЬНЕ**

Якім звычаем царква мае гэта рабіць?

**АДКАЗ**

Тым звычаем, як Хрыстос паказаў. Значыць не адразу, як чалавек саграшыць, адлучаць яго ад царквы, але перш яго выкрыць. Так бо Госпад загадвае: «Калі брат твой правініцца табе, ідзі і пасварыся на яго ў чатыры вокі. І калі паслухае цябе, здабудзеш брата твайго. А калі цябе не паслухае, вазьмі з сабой яшчэ аднаго або двух, каб усякае слова абапіралася на доказе двух або трох сьведкаў. А калі іх не паслухае, скажы царкве. А калі і царкву не паслухае, хай будзе табе як паганін і мытнік» (Мц. 18: 15-17).

**ПЫТАНЬНЕ**

Як разумець гэтыя словы: «Калі брат твой правініцца табе»?

**АДКАЗ**

Некаторыя мяркуюць, што Хрыстос загадаў выкрываць брата толькі ва ўласных крыўдах, а не ў чужых, бо Ён сказаў: «Правініцца табе»,– але ня гэта тут маецца на ўвазе. У іншым слове Хрыстос загадвае дараваць уласную крыўду, ды Апостал піша, што «любоў не шукае свайго» (1 Кар. 13). Таму гэта слова «ТАБЕ» разумей таксама, калі б Хрыстос сказаў: «З твайго ведама».

**ПЫТАНЬНЕ**

Чаму Ён сказаў «брат твой», а ня «кожны чалавек»?

**ОТКАЗЪ**

Братом только Хрістіанина зоветь, о том ся тако старати велить, яко о своимъ спасеніи. Невернымъ пакъ ачькольвекъ спасеніа зычити маемъ, але их обличати не тако есмо должни. Яко и святый Апостолъ рече: «Что ми ест внешнимъ судити? Не внутрнымъ ли вы судите? А вънешнымъ же Богъ судить» (1 Кор. 5: 12-6: 20). Научати бо и напоминати оныхъ, которіи въне суть, маемъ, але не обличати.

Брата пакъ, то ест Хрістіаніна, дольжни есмо обличати тыми степеньми Хрістомъ указаными с нимъ поступуючи. Прото грешать вси, которыи видячи брата не по заповедехъ Божіихъ ходячого, не дбають о нимъ, ани злостей его обличають.

**ПЫТАНЬЕ**

Што есть церьковъ, которой Хрістос поведети брата непослушного велить?

**ОТКАЗЪ**

Церьковъ на иныхъ местехъ всехъ верьныхъ – старыхъ и молодыхъ – значить, але зде старьцевъ, или презвитеровъ, або, яко Златоустый рече: «Предстояшчихъ въ церкви», Хрістос церквію зоветь. То ест оныхъ, которіи на томъ в церькви седять, абы обычаевъ всехъ, в церькви будучихъ, дозиряли.

Двои бо предъ тымъ старци въ церкви были. Иншіи иже Слово Господне проповедали. Иншіи пакъ обычаевъ дозиряли. Естъ сихъ ешче знакъ в монастырехъ, где ихъ съборьными старьцами и теперъ зовуть. Але о томъ иншого часу.

Богу нашому слава ныне, и всегда, и въ веки вековъ, аминь.

Катихиси, или Оглашенію, конецъ.

ДОКОНАНА ЕСТ СІА КНИГА, ЗОВЕМАЯ Греческимъ языком «Катихисіс», а по словеньски «Оглашеніе» Богу ко чти и посполитым людемъ языка Роуского к наказанью и доброму ученью накладом боголюбивых мужей Пана Матфіа Кавечинского, Наместьника Несвижкого; Сімона Будного, Лавърентіа Крышковъского. На городе Несвижкимъ. Подъ леты от воплошченіа Спасова тисеча пятисотъ шестьдесятъ второго, Месеца Іюніа десятого дня.

**АДКАЗ**

Хрыстос называе братам толькі Хрысьціяніна і загадвае клапаціцца пра яго гэтаксама, як і пра сваё ўласнае збаўленьне. Няверуючых, – хаця і мусім зычыць ім збаўленьня, – не такім звычаем мы павінны выкрываць, як і сьвяты Апостал казаў: «Бо як жа мне судзіць тых, што навонкі? Ці ж ня тых, што пасярод вас, судзіце вы? Тых жа, што навонкі, судзіць Бог» (1 Кар. 5: 12-13).

Маем бо тых, што навонкі, не выкрываць, але навучаць ды напамінаць. Брата ж, значыць, Хрысьціяніна, мы павінны выкрываць, абыходзячыся зь ім так, як Хрыстос паказаў. Дзеля гэтага грашаць усе тыя, што, бачачы брата, які ня ходзіць паводле Божых прыказаньняў, пра яго не клапоцяцца ды грахоў ягоных не выкрываюць.

**ПЫТАНЬНЕ**

Што ёсьць царква, якой Хрыстос загадвае сказаць пра непаслухмянага брата?

**АДКАЗ**

«Царква» ў іншых мейсцах азначае ўсіх верных — старых і маладых, – але тут Хрыстос заве царквою старшых, або прэсьвітэраў, ці, як казаў Залатавусны, «стаячых на чале царквы», — значыць, тых, што займаюць гэтае мейсца ў царкве, каб сачыць за ўсімі царкоўнымі звычаямі.

Раней бо ў царкве было два кшталты старшых: адны прапаведавалі Слова Госпада, другія сачылі за царкоўнымі звычаямі. Ёсьць яшчэ пра іх напамін у манастырах, дзе іх і цяпер завуць саборнымі старцамі. Але пра гэта іншым часам.

Богу нашаму слава і цяпер, і заўсёды, і на вечныя вякі. Амін.

Катэхізісу, або Абвяшчэньню, канец.

ЗАВЕРШАНА ГЭТАЯ КНІГА, ЗВАНАЯ па-грэцку «Катэхізіс», а па-славянску «Абвяшчэньне», на хвалу Богу, простым людзям мовы Беларускай дзеля настаўленьня і добрай навукі на сродкі богалюбівых мужоў пана Мацьвея Кавячынскага, намесьніка Нясьвіскага; Сымона Буднага, Лаўрэна Крышкоўскага ў горадзе Нясьвіскім у год ад нараджэньня Збаўцы тысяча пяцьсот шэсьцьдзесят другі, месяца чэрвеня дзесятага дня.

# ДАДАТАК

## Сымон Будны

## КАРОТКІЯ НАТАТКІ ПРА ХРЫШЧЭНЬНЕ ДЗЯЦЕЙ: пра пачатак спрэчкі вакол першай таямніцы – менавіта Сьвятога Хросту – у Княстве Літоўскім, а потым і ў Польшчы

У год ад нараджэньня Сына Божага 1558 было неўраджайнае лета, таму ў літоўскай дзяржаве і ў той год, і ў наступны быў голад, але не такі моцны, як потым, у гадах 1570 і 1571, калі людзі елі адзін аднаго. Голад быў такім цяжарам для паспалітага люду, што бацькі аддавалі сваіх дзяцей-падлеткаў у няволю, а малых дзяцей некаторыя кідалі ў ваду ды тапілі, а некаторыя клалі на вуліцах у вялікіх гарадах (асабліва ў Вільні) ды так іх пакідалі.

Здарылася тады аднаго дня, што падчас моцных маразоў нехта пакінуў двух дзетак перад дваром алыцкага і нясьвіскага князя Мікалая Радзівіла. Зьлітаваўся над дзецьмі служыцель Віленскае царквы С.Б., які жыў і навучаў пры тым двары. Ён загадаў узяць тых дзяцей, хочучы іх выхоўваць. Якраз у той час прыехаў прэсьвітэр тае ж царквы Ганс Катэрля і ўзяў аднаго з тых немаўлятак.

Потым праз колькі тыдняў прэсьвітэр спытаўся ў таго згаданага служыцеля, калі той зьбіраецца ахрысьціць свайго знайдзенца (гэтак ён зваў тых хлопцаў), бо, маўляў, і ён загадае тады прынесьці свайго да Хросту. Служыцель адказаў, што ня ведае, як хрысьціць дзяцей, пра бацькоў якіх нічога ня ведама.

Выглядае, аднак, што тыя бацькі няверучыя, бо кінулі сваіх дзяцей. Таму што вернік, нават калі б быў наймацнейшы голад, ня кінуў бы свайго дзіцяці. Адказаў на гэта прэсьвітэр: “Свайго ты можаш хрысьціць або не хрысьціць, але майго мусіш”. На гэта сказаў служыцель: “Ня мушу, і ня буду хрысьціць ня толькі гэтых дзяцей, але і ўвогуле ўсіх дзяцей ад няверуючых бацькоў. Таму і ня ведаю, паводле якога мейсца са Сьвятога Пісьма мусім хрысьціць вашага”.

Прэсьвітэр палічыў гэта благім і, разгневаўшыся, паведаміў гэтую навіну некаторым братам. Служыцель таксама не ставіўся легкадумна да сказанага і рыхтаваўся абараняць сваё меркаваньне. Бо напэўна чакаў, што прэсьвітэр абвінаваціць яго перад братамі, і не памыліўся.

Назаўтра пасьля казані прэсьвітэры, запрасіўшы служыцеля, прыгадалі ягоныя словы, што не жадаў хрысьціць тое знойдзенае дзіцятка. Але ён трапна ім адказаў, узгадаўшы адно мейсца зь Пятра Вірэта: “Калі дзіця прынесена ад няверучых бацькоў, лёгка дапусьціцца несапраўднага хрышчэньня”.

Былі ў той час у грамадзе некаторыя французы, напрыклад, Пэтрус Гарньерус ды іншыя, згодныя зь Вірэтам, таму і іншыя браты добра паставіліся да выказваньняў служыцеля. Тады пастанавілі ад гэтага часу не дапускаць да хрышчэньня дзяцей ад няверучых бацькоў. Бо да гэтага часу нават папежнікі, асабліва бедныя, былі рады хрысьціць сваіх дзетак у нас, каб нічога за гэта не плаціць, як яны мусяць плаціць у сваіх плябанаў. Катэрля, ня ведаючы, як ахрысьціць свайго знайдзенца, прыняў яго за сваё дзіця, пасьля чаго служыцель мусіў дзіця ахрысьціць.

Так справа і скончылася, а ўсё ж сумленьне таго служыцеля не магло супакоіцца. Бо ён пачаў думаць ня толькі пра дзяцей ад няверуючых бацькаў, але і пра ўсіх немаўлятак: ці іх можна хрысьціць, ці не. І калі ён пільна гэтым заняўся, выявіў шмат сьведчаньняў, што адмаўлялі хрышчэньне дзяцей.

Перш за ўсё, выразны загад Сына Божага: “Ідзіце і навучыце ўсе народы, хрысьцячы іх”. Таксама ўчынкі сьвятога Яна Хрысьціцеля, які хрысьціў тых, што выходзілі і вызнавалі свае грахі. Таксама ўзоры або прыклады сьвятых апосталаў ды іхніх вучняў. Акрамя таго, меркаваньні даўнейшых тэолягаў: Юстына, Тэртуліяна ды іншых. Нарэшце, абрады: грэцкі, лацінскі, армянскі, славянскі. Усе гэтыя сьведчаньні ставілі пад сумнеў хрышчэньне дзяцей, і гэты служыцель дайшоў да таго, што быў бы рады (калі б толькі гэта было магчыма) пазбыцца свайго служэньня.

Падчас гэтых падзеяў нарадзіўся ў таго служыцеля (тамсама ў Вільні) першародны сын, і стаў ён трывожыцца, што яму трэба рабіць. Ён быў бы рады пакінуць дзіця нехрышчоным, але ў такім вялікім горадзе і ў такой царкве гэта было немагчыма: тое нехрышчонае дзіцятка два тыдні і тое ледзьве сьцярпелі.

Бо вышэйзгаданы прэсьвітэр гэта заўважыў і зноў абвінаваціў служыцеля перад братамі, кажучы, што той адкладае хрышчэньне ня толькі дзяцей ад няверучых бацькоў, але і хрышчэньне свайго сына. Браты, сабраўшыся, паклікалі служыцеля і вельмі яго дакаралі, так што ён мусіў дазволіць хрысьціць свайго сына. Бо хоць сам разумеў, што хрышчэньне дзяцей ёсьць адна брыдота Антыхрыстава, але, гледзячы на такі вялікі шэраг знакамітых людзей, хацеў сумнявацца хутчэй у самім сабе, чым амаль ва ўсім сьвеце.

У той час нейкі Пётра з Ганёндзу, чалавек вучоны і бывалы ў далёкіх краінах, наведаўшы цэрквы ў Маравіі, прыйшоў у Літву і напісаў кнігі супраць хрышчэньня дзяцей. Некаторыя служыцелі, чытаючы тыя кнігі, прыйшлі ў гэтай справе да спазнаньня праўды і хуткім часам пачалі адмаўляцца ад хрышчэньня дзяцей.

Тады ж і Марцін Чаховіч, малады вучоны, які пэўны час кіраваў школай пры Віленскай царкве, быў абраны на служэньне да Вэндрагоўскага і езьдзіў наконт гэтай справы ад князя алыцкага Мікалая Радзівіла ў Жэнэву (што ў Савойскай дзяржаве).

Быў нейкі мэдык, родам зь Італіі, Георгі Бляндрата, які ўперад дзеля рэлігіі выехаў зь Італіі, але, жывучы ў Жэнэве, прасякнуўся навукай Мігеля Сэрвэта, таму мусіў і адтуль выехаць і прыехаў у Літву ды быў у вялікай пашане ў князя Радзівіла. Даведаўшыся пра гэта, Кальвін і там не захацеў Бляндрата цярпець, бо, выдаўшы свой камэнтар да Дзеяў Апостальскіх, ахвяраваў яго князю Радзівілу і там жа, у лісьце, абвінаваціў Бляндрата.

Радзівіл моцна любіў царкву Божую, таму, каб пазьбегнуць нязгоды між такімі вялікімі асобамі, паслаў да Кальвіна у пасольстве Марціна Чаховіча, служыцеля Віленскае царквы, каб той пагадзіў і замірыў Бляндрата з Кальвінам. Марцін, хаця і не замірыў, як хацеў, тых двух мужоў, але, бываючы ў людзей вучоных, такіх, як Охін ды іншыя, даведаўся ад іх нямала пра найпершую праўду — пра Бога і Ягонага Сына. Чаховіч езьдзіў туды тройчы і ў Літву вярнуўся сэрвэцыянінам. Таксама зразумеў шмат добрых пачаткаў пра Сьвяты Хрост і, прыехаўшы, пачаў іх распаўсюджваць.

Другі ягоны сябра, віленскі служыцель Мікалай Вэндрагоўскі (бо тады ўжо Буднага паслалі да слуцкага князя працаваць у кірылічнай друкарні), падобна, чытаючы кніжкі Пятра з Ганёндза, зразумеў праўду пра хрышчэньне, і яўна адмаўляў хрышчэньне дзяцей ды голасна нагадваў братам, каб не сьпяшаліся хрысьціць дзяцей. Але ягоны калега Марцін пайшоў яшчэ далей, і калі яму давялося хрысьціць дзяцей, не захацеў гэта рабіць, кажучы, што яму не дазваляе сумленьне. Быў у той час і трэці служыцель у Віленскай царкве, Войцех Касьценскі, які таксама ганіў хрышчэньне дзяцей.

Вось так Марцін не хацеў хрысьціць дзяцей, Касьценскі таксама да гэтага заклікаў, а Вэндрагоўскі яўна выказваўся супраць хрышчэньня дзяцей. Тады падштурхнуў шатан некаторых прэсьвітэраў тае царквы, якія, баючыся перасьледу, зьвялі Вэндрагоўскага — чалавека палахлівага — ад праўдзівага погляду. Таксама і Марціна адгаварыць хацелі, але моцна памыліліся, бо той не хацеў ім саступаць і моцна ўплываў на Вэндрагоўскага.

Дзеля гэтага было тады немалое рознагалосьсе ня толькі паміж служыцелямі, але і паміж усёю царквою, і віленскія браты захацелі, каб усе літоўскія служыцелі сабраліся на зьезд у Вільні і разгледзелі гэтае пытаньне. І гэтак у 1564 годзе, у студзені месяцы, зьехаліся 26 служыцеляў і некаторыя шляхцічы. Там спачатку віленскі прэсьвітэр Якуб Курніцкі задаў такое пытаньне: “Ці ёсьць грахом хрысьціць немаўлятка, ці не?”

Па гэтым пытаньні было вырашана галасаваць, і спачатку нейкі Адам Вірхоўскі падаў голас, сьцьвярджаючы, што дзяцей хрысьціць —

рэч слушная. Гэтак жа казалі і іншыя 12 служыцеляў. Але другія, якіх таксама было шмат, сьцьвярджалі супрацьлеглае, і асабліва Марцін Чаховіч, Войцех Касьценскі, Лаўрэн Крышкоўскі ды іншыя.

Тады, калі прыйшла чарга галасаваць Вэндрагоўскаму, той папрасіў, каб яму далі дазвол падаць голас пісьмова, што яму дазволілі. І назаўтра падаў ён свой голас на пісьме, нязгодны са сваёй ранейшай пазыцыяй, супраць чаго потым пісаў Марцін, паказваючы яму і выгаворваючы, што ён пайшоў супраць праўды. Тым часам, зважаючы, што галасы абодвух бакоў разьмеркаваліся па роўну, зьезд пастанавіў, каб справа была адкладзена да большага зьезду, а да гэтага каб кожнаму вольна было хрысьціць або не хрысьціць і каб з гэтай прычыны адзін адным не пагарджалі.

Але калі ўсё гэта дайшло да князя Радзівіла, які ў той час быў найпершым апекуном усіх літоўскіх цэркваў, ён успрыняў гэта непрыхільна і напісаў вельмі строгі ліст да Мікалая Вэндрагоўскага, ганячы яго за частыя зьмены ў царкве, таксама згадваў і сваіх прапаведнікаў Крышкоўскага і Буднага ды пагражаў ім выгнаньнем. Зьвярнуўся князь Радзівіл і да сваіх нясьвіскага і клецкага старостаў, каб нагадвалі служыцелям тых цэркваў ды каб пад пагрозай строгага пакараньне спынялі навізну.

У той час Марцін Чаховіч напісаў “Трохдзённыя размовы” пра хрышчэньне і даслаў іх князю Радзівілу, які жыў тады ў Барысаве, бо ў Вільні быў жудасны мор. Князь, прачытаўшы “Размовы”, стаў трохі ласкавейшы да сваіх прапаведнікаў і канчаткова надумаў сабраць вялікі зьезд з вучоных людзей абодвух бакоў, якія б разьвязалі гэтую спрэчку Словам Божым. Але хуткая сьмерць не дала яму гэтага выканаць, бо ён памёр у траўні 1565 году.

У той час быў зьезд у Бжэзінах на Памрожу, на які езьдзілі некаторыя літоўскія служыцелі: Марцін Чаховіч, Вэндрагоўскі, Крышкоўскі, Сымон Будны ды іншыя – ды паведамілі пра гэтую справу польскім братам. Але тады зрабілі мала, бо польскія браты былі яшчэ мала знаёмыя з тым пытаньнем, апрача Станіслава Паклепкі, люблінскага служыцеля, і Ежы Шомана. Такім чынам прызначылі на конт той жа самай справы зьезд у Вэнграве на 27 сьнежня. Тады Паклепка памёр падчас пошасьці ў Любліне, пакінуўшы адмысловы тэстамэнт, бо быў мужам вучоным і пабожным.

Калі прыйшоў час, прызначаны для зьезду, зьехалася ў Вэнграў нямала польскіх служыцеляў, але віленскія служыцелі, якія мелі пільную патрэбу, даслалі толькі ліст з прабачэньнямі, што палічылася ім за кепскі тон. На гэтым зьезьдзе выдатны муж Станіслаў Лютамірскі спачатку моцна настойваў на хрышчэньні дзяцей, але потым саступіў праўдзе, пераможаны сьведчаньнямі Пісьма Сьвятога і даўнейшых тэолягаў.

На тым зьезьдзе ўсе служыцелі згодна пастанавілі не хрысьціць немаўлятак ды таксама забаранілі ўдзел у другой таямніцы – значыць,

Вячэры Сына Божага – тым, хто не прыняў першую таямніцу Сьвятога Хросту. Гэта было пасьля пацьверджана ў 1567 годзе на другім зьезьдзе ў Скшыне.

Але за год перад гэтым падчас вялікай пошасьці памёр, напісаўшы тэстамэнт, віленскі служыцель Мікалай Вэндрагоўскі. У тэстамэнце ён ухваляў праўдзівае хрышчэньне дарослых людзей ды ганіў хры-шчэньне дзяцей. Але ягоныя слухачы аніяк пра гэта ня дбалі і да гэтага часу аніводнай памылкі ня выправілі. Ды чым далей, тым болей іх трымаюцца, апроч Войцеха Касьценскага: ён прызнаў памылковым хрышчэньне дзяцей, але пасьля зноў да свайго цьвержданьня вярнуўся. Пасьля, напалоханы настаўленьнем Вэндрагоўскага, якое той, паміраючы, зрабіў, Касьценскі зноў адмовіў хрышчэньне дзяцей і, пакінуўшы віленскую пасаду, зьехаў у Польшчу. А Марцін Чаховіч яшчэ за год перад сьмерцю Вэндрагоўскага выехаў зь Вільні на Куявы, і ягонымі намаганьнямі Куяўская царква хутка прыйшла да разуменьня патрэбы ў Сьвятым Хросьце.

У той жа час некаторыя літоўскія браты (дзеля частых угавораў нейкага Якуба Каліноўскага) у 1569 годзе паехалі зь Літвы разам з жонкамі і дзецьмі і аселі ў Малой Польшчы ў новым мястэчку Ракаве. Там таксама хутка зразумелі патрэбу Сьвятога Хросту, але потым усё хутка развалілася і ўсе разьехаліся. Куяўцы, людзі знакамітыя, таксама амаль у той жа час паехалі са сваёй айчыны і аселі ў Любліне ды ягоных ваколіцах. Там яны і да гэтага часу жывуць і маюць, з ласкі Сына Божага, царкву, добрую ў навуцы і ў дысцыпліне хрысьціянскай.

Нейкі Павал, родам зь Візны, супэрінтэндант віленскі, знаходзячыся ў Літве, быў пагарджаны тымі, што абралі яго на гэтую пасаду. Таму ў 1568 годзе ён выехаў на Валынь і заклаў царкву ў Валошчычах – у мястэчку князя Ўладзіслава Збараскага. Але сам ён неўзабаве паехаў дзеля выданьня Бібліі ў Нясьвіж ды там памёр.

Як відаць, усе верныя служыцелі або былі зь Літвы выгнаныя, або з добрай волі ехалі, як паведамлялася, у Польшчу і на Валынь. Таму і царква была невялікая, і да Сьвятога Хросту толькі цяпер, у Лоску, 18 траўня 1578 году, дайшло.

А гэта я сьцісла напісаў дзеля таго, каб нашчадкі баяліся Бога і пазьбягалі ўсялякай няўдзячнасьці, ведаючы, што дзеля яе Бог адбірае Сваё Слова ды дае Яго іншым народам. Ды яшчэ каб ведалі: справа аб вырачэньні ад хрышчэньня дзяцей ані абыякая, ані з дрэннай якой матывацыі, але ёсьць неадменная і трывалая і пачата, і скончана з Божай дапамогай.

*Паводле Szymona Budnego relacja o poczatkach i rozwoju anabaptyzmu w zborze mniejszym. Odrodzenie i Reformacja w Polsce, t. XXXI, 1986, s.102-109.*

# ЗЬМЕСТ

Сымон Будны і “Катэхізіс” 1562 г. .................................................. 5

Хрысьціянскае вучэньне ў пытаньнях і адказах .............................. 7

ПРЕДЪСЛОВІЕ ВЪ КАТИХИСІЮ ........................................... 18
ПРАДМОВА ДА КАТЭХІЗІСУ ................................................. 19

КАТИХИСІСЪ ... коротко выложена ............................................... 26
КАТЭХІЗІС ... коратка выкладзены .............................................. 27

ВТОРАЯ ЧАСТЬ КАТИХИСІ О ВЕРЕ ...................................... 136
ДРУГАЯ ЧАСТКА КАТЭХІЗІСУ ПРА ВЕРУ .............................. 137

ТРЕТЯЯ ЧАСТЬ КАТИХИСІ О МОЛИТВЕ ГОСПОДНЕЙ .................. 206
ТРЭЦЯЯ ЧАСТКА КАТЭХІЗІСУ ПРА МАЛІТВУ ГОСПАДАВУ ............ 207

ЧЕТВЕРЪТАЯ ЧАСТЬ КАТИХИСІ О ТАИНЕХЪ ............................ 258
ЧАЦЬВЁРТАЯ ЧАСТКА КАТЭХІЗІСУ ПРА ТАЯМНІЦЫ ..................... 259

КАРОТКІЯ НАТАТКІ ПРА ХРЫШЧЭНЬНЕ ДЗЯЦЕЙ ......................... 306

*Навуковае выданьне*

**Катэхізіс**

Помнік беларускай Рэфармацыі
XVI стагодзьдзя

*2-е выданьне*

Адказны за выпуск *С. Акіньчыц*

Рэдактары *В. Л. Леанідаў, Т. Л. Шумейка*
Камп'ютэрная падрыхтоўка
*А. В. Ганчарэнка, М. І. Лазук*
Дызайн *В. Л. Леанідаў*

Падпісана да друку 19.10.2005. Фармат 60х84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура Прагматыка.
Ум. друк. арк. 18,1. Ул.-выд. арк. 17,25.
Наклад 2000 (1-шы завод 500). Замова 729.

Выдавецтва ЗАТ «Юніпак»
ЛИ № 02330/0056911 ад 01.04.2004
Друкарня ЗАТ «Юніпак»
ЛП № 02330/0148762 ад 30.04.2004
Вул. Кастрычніцкая, 19, Мінск, 220030, Рэспубліка Беларусь
Тэл./факс: 210-43-34, 227-54-87
E-mail: info@unipack.by; http://www.unipack.by

## Уваскрэшаны Катэхізіс

«Катэхізіс» Сымона Буднага, выдадзены ім у Нясвіжскай друкарні ў 1562 г., дасюль перавыдаваўся толькі аднойчы – у 1628 г. у Стакгольме. І вось знакамітая кніга, пра якую са школьных гадоў усе чулі, але ніхто не бачыў і тым больш не чытаў, праз 443 гады другі раз з'явілася на свет на Беларусі – у Мінску, у выдавецтве «Юніпак».
Адзначым, што, быццам у пацвярджэнне горкага выслоўя «няма прарока ў Айчыне сваёй», ніводнага арыгінальнага «Катэхізіса» Буднага не захавалася ў нашай краіне.
22 чэрвеня прэзентацыя «Катэхізіса» адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Яшчэ адзін наш літаратурны помнік вернуты з нябыту.

*«Культура», 25 чэрвеня – 1 ліпеня 2005 г.*

Не будзе памылкай сказаць, што «Катэхізіс» Сымона Буднага – гэта кніга, звернутая ў будучыню. А ў іерархіі каштоўнасцяў беларускага пісьменства яна стаіць адразу за Скарынавай «Бібліяй». Гэта сапраўдная народная кніга XVI стагоддзя – «залатой пары» беларускай дзяржавы, беларускай культуры.

*«Народная Воля», 25 чэрвеня 2005 г.*

UNIPACK
ИЗДАТЕЛЬСТВО И ТИПОГРАФИЯ

ISBN 985-6745-54-3
9789856745549

# КАТЭХІЗІС

Помнік беларускай Рэфармацыі XVI стагодзьдзя